Л. Дучыц, І. Клімковіч

# ЯЗЫЧНІЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСАЎ



НЕИЗВЕСТНАЯ ИСТОРИЯ

НЕИЗВЕСТНАЯ
ИСТОРИЯ

Людміла Дучыц
Ірына Клімковіч

# ЯЗЫЧНІЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСАЎ

Минск
Харвест

**УДК 257.7(=161.3)+398.4(=161.3)**
**ББК 86.31-402(=411.3)+63.5(=411.3)**
**Д859**

*Серыя «Неизвестная история» заснавана ў 2009 годзе*
*Заснавальнік серыі А. Е. Тарас*
*Афармленне серыі Б. Г. Клюйко*

*У кнізе выкарыстаны працы мастакоў К. Альхімовіча, М. Андрыёлі, У. Аржавіцкага, С. Багенскага, В. Бачкова, М. Высоцкай, Б. Забірохіна, А. Зіменкі, А. Каждайліса, В. Кульваноўскага, Т. Мяснiковай, А. Навіцкага, М. Праснякова, В. Славука, В. Сташчанюка, М. Сухарава*

**Дучыц, Л., Клімковіч, І.**
Д859 Язычніцтва старажытных беларусаў / Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч. — Мінск : Харвест, 2014. — 368 с.; 287 іл. — (Неизвестная история).
ISBN 978-985-18-3427-9

Кніга прысвечана этнічнай рэлігіі старажытных беларусаў. Міфы, паданні, легенды і вераванні нашых продкаў расказваюць пра іх светаўспрыманне, лад жыцця і духоўны свет, звычаі і абрады, прымхі і забабоны, багоў і легендарных герояў, татэмных жывёл і сакральныя расліны. Чытач даведаецца, якімі абярэгамі і амулетамі карысталіся нашы прадзеды, якія магічныя практыкі выконвалі падчас каляндарных абрадаў і ў паўсядзённым жыцці. Сучасніку будзе цікава пазнаёміцца з разнастайнымі духамі жытла, гаспадарчых пабудоў і прыродных абшараў, з ведзьмакамі і чараўніцамі, вешчунамі, пярэваратнямі, ваўкалакамі і іншымі дэманічнымі істотамі.

**УДК 257.7(=161.3)+398.4(=161.3)**
**ББК 86.31-402(=411.3)+63.5(=411.3)**

© Л. Дучыц, І. Клімковіч, 2014
© Афармленне. ТАА «Харвест», 2014

**ISBN 978-985-18-3427-9**

# ПРАДМОВА. ШТО ТАКОЕ ЯЗЫЧНІЦТВА?

Паняцці «язычніцтва» і «язычнікі» паходзяць ад стараславянскага слова «языцы» (іншыя народы), раўназначнага старажытнагрэцкаму «барбарос» (варвары) і старажытнажыдоўскаму «гвім» (чужынцы). Гістарычна склалася так, што паняцце «язычнікі» пазначае людзей, чые вераванні і рэлігійныя культы процілеглыя хрысціянству, а паняцце «язычніцтва» (або «паганства») — увесь комплекс іх вераванняў і культаў.

На лаціне язычнікаў звалі «paganus», што літаральна пазначае «сяляне». Рэч у тым, што хрысціянства першапачаткова распаўсюджвалася ў гарадах Рымскай імперыі, тады як жыхары вёсак праз доўгі час (некалькі стагоддзяў) заставаліся прыхільнікамі нехрысціянскіх вераванняў і культаў.

У адрозненне ад юдаізму, хрысціянства, ісламу, дзе ў цэнтры веры і культу знаходзіцца адзіны бог (напрыклад: «няма бога апроч алаха і Магамет — ягоны прарок»), вераванні старажытных плямёнаў існавалі ў форме анімізму, татэмізму і фетышызму, а з цягам часу гэтыя вераванні пераўтвараліся ў палітэізм.

Анімізм (ад лацінскага «animus» — дух, душа) — гэта вера ў існаванне самастойнай душы не толькі ў людзей, але таксама ў жывёл, раслін, прыродных аб'ектаў (напрыклад, у камянёў, азёр, рэчак) і ў прыродных з'яў (напрыклад, у ветру, грому, агню і г.д.)

Татэмізм (ад ангельскага «totem», у сэнсе «яго род») — гэта вера ў звышнатуральнае паходжанне роду або племені ад якой-небудзь жывёлы (напрыклад, ад мядзведзя), ад расліны (напрыклад, ад дуба), ад іншага аб'екта прыроды (напрыклад, ад гары) або ад прыроднай з'явы (напрыклад, ад грому). Такі міфічны продак лічыўся татэмам племяні.

Язычніцкія жрацы імкнуліся дамагчыся літасці ад гэтага продка, для чаго прыносілі ахвяры каменным або драўляным яго выявам (ідалам) або спрабавалі ўздзейнічаць на яго сродкамі магіі, каб ён дапамог племені ў вырашэнні важных практычных задач.

Фетышызм (ад партугальскага «fetico» — чараўніцтва) — вера ў тое, што пэўныя прадметы (так званыя амулеты) валодаюць магіч-

най сілай і здольныя ахоўваць іх уладальнікаў ад хвароб, раненняў, няшчасцяў, злога вядзьмарства і іншых бед.

Палітэізм (ад грэцкіх слоў «полі» — шмат і «тэос» — бог, боства)— вера ў шматлікіх багоў, а таксама духаў. Дадамо, што палітэізм не адмаўляе ні анімізму, ні татэмізму, ні фетышызму, яны ў тым альбо іншым выглядзе абавязкова захоўваюцца ў кожным яго варыянце.

Па меркаванні навукоўцаў, для язычніцтва (апроч анімізму, татэмізму і фетышызму) характэрныя наступныя дзевяць агульных асаблівасцяў.

1) Вера ў тое, што ўсімі бакамі жыцця прыроды і грамадства «кіруюць» пэўныя звышнатуральныя жывыя істоты, агульны лік якіх досыць вялікі. Гэтая ідэя наўпрост вынікае з міфалагічнага спосабу мыслення. Дадамо, што сутнасць міфалагічнага мыслення палягае ў тым, што увесь свет прыроды ўспрымаецца як велізарная сукупнасць жывых істот.

Насупраць, тэізм (вера ў адзінага бога) заўсёды мае сваёй асновай рацыянальнае мысленне. Насамрэч, ідэя, паводле якой Бог з'яўляецца першапрычынай усяго існага, і пры гэтым сутнасць самог Бога застаецца непасціжнай для людзей, такая ідэя ёсць вынік досыць складаных абстрактных разваг.

2) Боствы язычнікаў увасабляюць у сабе ідэю касмічнай гармоніі і парадку, таму яны пазбаўленыя індывідуальнай волі. Кожны такі бог (або багіня) «адказвае» за пэўную функцыю ў забеспячэнні касмічнага парадку, і ў гэтым сэнсе ён (або яна) выконвае сваё прызначэнне падобна людзям.

3) Для язычнікаў усе прыродныя з'явы ўзаемазлучаныя і ўраўнаважваюць адна адну, таму галоўным патрабаваннем да чалавека з'яўляецца мера ва ўсім і захоўванне «адвечнага» парадку. Кожны чалавек абавязаны трымацца свайго лёсу, наканаванага яму пры нараджэнні. Адпаведна, герой той, хто пражыў жыццё менавіта такім чынам, а не той, хто спрабаваў бунтаваць супраць свайго лёсу, гэта значыць — супраць волі багоў, якія вызначылі яго.

Спробы чалавека жыць выключна сваім розумам і сваімі жаданнямі (самому абіраць свой лёс), не звяртаючы ўвагі на божае прызначэнне, багі абавязкова перапыняюць і караюць.

4) Багі язычнікаў — гэта не асобы, якія чыняць як ім хочацца (што кіруюцца сваімі асабістымі жаданнямі). Яны заўсёды з'яўляюцца ўвасабленнем той або іншай стыхіі (вады, агню, зямлі, сонца, ветру...) альбо нейкай функцыі (нараджэння, смерці, лекавання, палявання, вайны, хваробы, земляробства...).

5) Язычніцкія боствы антрапаморфныя або зоаморфныя, гэта значыць маюць цела з галавой, падобныя чалавечым або звярыным. Гэтыя асаблівасці цела і галавы падкрэсліваюць галоўную функцыю той або іншай боскасці (адна боскасць прыгожая, іншая — агідная, адна вечна маладая, іншая — вечна старая, і гэтак далей).

6) Сваіх багоў язычнікі могуць пры вызначаных умовах бачыць і чуць. Гэтыя багі ўдзельнічаюць у жыцці народа або племені (напрыклад, у іх войнах), могуць уступаць у сэксуальныя і іншыя адносіны з людзьмі (напрыклад, складаць з імі пэўныя дамовы).

7) Вера ў багоў у язычніцтве не ёсць інтымны (патаемны) стан душы. Таму ў язычніцкіх культах галоўнае дзеянне — не малітва, а рэгулярнае выкананне рытуалаў (прынашэнне ахвяр пэўным богам на пэўных падставах), а таксама ўдзел у калектыўных абрадах — агульных для ўсіх чальцоў роду-племені, і ў таемных, напрыклад, толькі для ваяроў, або толькі для паляўнічых, або толькі для аратаяў, або толькі для маладзіц, або толькі для пэўнай сям'і...

8) Язычніцтва вельмі шчыльна звязанае з магіяй (ад грэцкага «магейя» — вядзьмарства, чараўніцтва). Магія — гэта рытуальныя дзеянні, накіраваныя на тое, каб багі, духі і іншыя звышнатуральныя істоты задавальнялі тыя або іншыя жаданні людзей. Напрыклад, прадказвалі ім падзеі, якія абавязкова адбудуцца ў недалёкай будучыні; пазбаўлялі ад хваробы; даравалі добры ўраджай або прыплод быдла; абаранялі ад ворагаў... У гэтым плане язычнікі не чакаюць цудаў, іх узаемаадносіны з багамі больш падобныя да стасункаў узаемадапамогі: «я — табе, а ты — мне». Калі ж боства не выканала просьбу, значыць, чалавек кепска чараваў (не ведаў як правільна гэта робіцца) або ягоная ахвяра выявілася як недастатковая.

9) Агульны эмацыйны фон язычніцтва ў большасці выпадкаў бадзёры, пазітыўны. Калі хрысціянства можна назваць рэлігіяй скрухі і плачу, дык язычніцтва — гэта рэлігія радасці і смеху. Прокл, філосаф канца антычнай эпохі (V стагоддзе нашай эры), пісаў з гэтай нагоды: «Плачуць богі не вечна, смяюцца ж безупынна, бо слёзы іх ставяцца да апекі аб рэчах смяротных і тленных, і часам яны ёсць, а часам іх няма, смех жа багоў азначае вечнасць якая знаходзіцца ў поўнасці сусветнага быцця... Смех мы залічым да роду багоў, а слёзы — да стану людзей і жывёл».

***

Хрысціянства, якое прыйшло ў Еўропе на змену язычніцтву (паганству), уключыла шматлікіх язычніцкіх багаў і духаў у свой пантэон, але пры гэтым панізіла іх да ўзроўня «нячыстай сілы».

Захаваліся таксама шматлікія язычніцкія сімвалы, абрады і святы, якім было дадзена новае тлумачэнне. Напрыклад, крыж — гэта вельмі старажытны сімвал сонца. Яйка — гэтак жа старажытны сімвал касмагенэзу. Афарбоўка велікоднага яйка ў чырвоны колер азначае кроў; язычнікі фарбавалі ў чырвоны колер лоб параненым, парадзіхам і нованароджаным з мэтай павярнуць іх да жыцця. Вялікдзень — гэта ранейшае свята вясновага абуджэння прыроды. Яблычны Спас — аграрнае свята збору ураджаю з дрэў. Паняцце Тройцы адлюстроўвае элементы старажытнага анімізму ў сваце Сёмухі — святога дрэва, святой травы і святога збожжа...

Усё прыведзеныя вышэй заўвагі маюць прамое дачыненне да зместа прапануемай кнігі.

*Анатоль Тарас, рэдактар*

# УВОДЗІНЫ

Са старажытных часоў нашы продкі задавалі сабе пытанні пра Сусвет:

Як ён уладкаваны, што акаляе чалавека? Калі і з чаго была створана Зямля? Чаму на ёй існуюць горы і рэкі, балоты і лясы? Чаму свеціць Сонца, гараць зоркі, ідзе дождж, грыміць гром? Хто такі чалавек і адкуль ён узяўся? Чаму людзі паміраюць, і што з імі адбываецца пасля смерці?

Шмат якія з гэтых пытанняў нельга лічыць да канца вырашанымі. Мы ўжо звыкнуліся з тым, што цяпер на іх адказваюць навукі — фізіка і медыцына, біялогія, астраномія і геалогія, археалогія, палеанталогія і шмат якія іншыя.

Міфалогія адказвае на тыя ж пытанні, што і навукі, але са свайго пункту гледжання. Як і навуковыя, міфалагічныя веды маюць сваю логіку, проста яны іншыя, адмысловыя. І прадугледжваюць існаванне побач з чалавечым светам — свету памерлых і яшчэ ненароджаных, свету, адкуль з'яўляецца і куды сыходзіць усё жывое. У народзе гэта месца называецца *тагасвет*, *той свет*, *іншасвет*.

Старажытны чалавек кіраваўся ў паўсядзённым жыцці тымі ведамі, якія ён атрымаў у спадчыну ад продкаў. Ён ўспрымаў сябе як частку прыроды, а ўсё яго жыццё суправаджалася магічнымі дзеяннямі. За кожным прыродным аб'ектам былі замацаваны свае павер'і, свае рытуальныя дзеянні, пра кожны з іх існавалі міфалагічныя ўяўленні. Менавіта ў міфалогіі хаваюцца пачаткі філасофскіх ведаў, рэлігіі і мастацтва.

Трэба заўважыць, што ўзровень і сэнс міфалагізацыі на розных этапах развіцця грамадства быў неаднолькавым. Хрысціянскія рытуальныя формы за тысячу гадоў адаптаваліся з традыцыйнай дахрысціянскай культурай, але яна ўсё-такі захавалася як цэласная мадэль да нашых дзён. Больш таго, сімбіёз хрысціянскага светаўспрымання і язычніцкай міфалогіі садзейнічаў нараджэнню багатага беларускага фальклору. Нягледзячы на тое, што вера ў вышэйшых багоў сінтэзіравалася з вераваннямі ў хрысціянскага адзінага Бога, ніжэйшыя міфалагічныя персанажы, якімі народнае ўяўленне насяліла зямную прастору, засталіся амаль без зменаў. Вера ў хатніх духаў, русалак, якія выходзяць з рэк і бегаюць па жыце, нябожчыкаў, што

па начах падымаюцца са сваіх магіл, вядзьмарак, якія адбіраюць у кароў малако і псуюць як людзей, так і свойскую жывёлу, працягвала існаваць у свядомасці народа.

У этнакультурных адносінах тэрыторыя Беларусі з'яўляецца адной з самых архаічных зон Еўропы. Нават дакументы часоў позняга Сярэднявечча падаюць шмат язычніцкіх імёнаў, кшталту Даждзьбог, Дадзібог, Багдан, Богумір, Ярамір, Хвалібог, Волас, а ў наш час існуюць такія прозвішчы, як Ідаловіч, Перуноўскі, Багуслаўскі, Бажымоўскі, Валасовіч, Валатоўскі, Каляда. З далёкіх часоў існавала перакананне, што пры атрыманні імя чалавек трапляў пад нагляд таго ці іншага боства. Такі самы звычай пераняло і хрысціянства, калі з яго прыняццем пачалі даваць імёны святых.

Тэрмін «язычніцтва», або «паганства» (лацін. paganus — сялянскі, вясковы), узнік у асяродку першых носьбітаў хрысціянскай рэлігіі і азначаў дахрысціянскія і нехрысціянскія вераванні. Царкоўныя дзеячы стараліся выкараняць народныя вераванні. Міфалагічных персанажаў замянялі біблейскімі, але пад хрысціянскай абалонкай захоўваўся культ паганскіх багоў Перуна і Вялеса, а дахрысціянскай багіні-дзеве стала адпавядаць Божая Маці.

Хрысціянскія ідэолагі паступова падпарадкоўвалі сабе і такія спрадвечныя абрады, як ушанаванне вадаёмаў, камянёў, дрэў, змагаліся з *«богамерзкімі ігрышчамі»*. Выдаваліся нават указы пра забарону розных старажытных звычаяў. Так, існавала табу скакаць праз агонь на Купалле, абліваецца вадой на Вялікдзень, збірацца на ігрышчы і спяваць песні, і г.д.

Потым, ужо ў савецкія часы, камуністы знішчалі хрысціянскія храмы і змагаліся з народным хрысціянствам, якое на працягу стагоддзяў фарміравалася на падставе сінтэзу язычніцкіх вераванняў і знешняй хрысціянскай абраднасці. Камуністычная ўлада, як і ранейшая царкоўная, забараняла шэсці да паклонных прыродных аб'ектаў, разбівала святыя камяні, спальвала святыя дрэвы, засыпала святыя крыніцы. Старажытныя святкаванні збору ўраджаю хрысціянская рэлігія атаясамлівала са святам Божай Маці, а камуністы — з Днём калектывізацыі ці Днём калгасніка. Але людзі ўпарта трымаліся звычаяў сваіх продкаў, таму шмат архаічных вераванняў і абрадаў дажылі да нашага часу. Менавіта такая народная памяць і з'яўляецца адной з адметных рысаў беларускай ментальнасці.

Мэта дадзенай кніжкі сцісла і папулярна паказаць, як нашы продкі ўяўлялі свет і сябе ў ім, як яны судакраналіся з прыродай, і тыя праявы міфалагічнай свядомасці, што захаваліся ў народных святах, абрадах, звычаях і легендах.

# Раздзел І

# СТАРАЖЫТНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ПРА СУСВЕТ

## Глава 1

## КАСМІЧНЫЯ СТЫХІІ: ЗЯМЛЯ, ВАДА, ПАВЕТРА, АГОНЬ

Нашы продкі ва ўсе часы шанавалі зямлю. Урадлівасць зямлі, здольнасць нараджаць хлеб і насычаць усё жывое рабілі яе ў вачах людзей клапатлівай маці-карміцелькай. У прыказках і добрых пажаданнях зямлю называюць святой і лічаць сімваламі багацця: «*Будзь багаты, як зямля святая!*» У некаторых месцах Беларусі галаўны боль дагэтуль лечаць зямлёю, прыкладаюць яе да хворага месца і кажуць: «*Як здарова зямля, так і мая галава будзе здаровая*».

Зямля ўспрымалася як жывая істота, і менавіта жаночага роду. Яна, як жанчына, у вызначаныя часы апладняецца, цяжарыць і нарэшце нараджае — дае новы ўраджай. Таму зямлю трэба паважаць, ушаноўваць, ні ў якім разе нельга яе біць ні бізуном, ні розгамі, ні каламі, нават калупаць нагою. Як усё жывое, зямля нараджалася («адмыкалася») вясной, а памірала («замыкалася») увосень. Таму існавала забарона чапаць зямлю падчас яе зімовага сну — ад Пакравоў і да Радаўніцы. Інакш, як казалі, «*можа быць смерць у сваёй сям'і або неўраджай*».

У нашых міфах пра апладненне зямлі гаворыцца што неба і зямля — муж і жонка, што неба апладняе зямлю дажджом. У адной старажытнай замове прамаўляецца: «*Ты, неба, бацька, ты, зямля, маці*». Рэшткі такіх поглядаў захаваліся ў пазнейшых вераваннях. Дзе-ндзе ў нас лічыцца, што калі на вяселлі пойдзе дождж, маладых чакае шматлікае патомства. Адпаведна перасохлая, няплодная зямля параўноўваецца з удавой. Архаічнае ўяўленне пра неба і зямлю як

шлюбную пару захавалася і ў загадцы: «*Высокі татка, нізенька матка*».

Увогуле, старажытныя міфы распавядаюць пра тое, што некалі Бацька-Неба і Маці-Зямля былі непадзельнымі, і іх боскім дзецям было цесна і цёмна без прасторы ды святла. Тады яны вырашылі раз'яднаць сваіх бацькоў. А зрабілі гэта Вецер і Дрэва. Святое дрэва моцна ўперлася сваімі каранямі ў зямлю, а кронаю трымала неба, каб яно не ўпала на зямлю і не расціснула ўжо створаны свет. Вось тады паміж небам і зямлёю з'явілася паветра.

Паветра, паводле ўяўленняў продкаў, з'ўлялася адным з чатырох элементаў будовы Сусвету разам з зямлёй, вадой і агнём; неабходнай умовай узнікнення і існавання ўсяго жывога. Верылі, што паветра — гэта тая стыхія, дзе знаходзяцца розныя душы і нябачныя дэманічныя істоты, якія могуць або шкодзіць людзям, або прыносіць ім карысць. Прастора, запоўненая паветрам, лічылася шырэйшай і па памерах большай, чым зямля. Нават казалі, што на паветры «*трымаецца неба*».

Зямля была асноўнай касмічнай стыхіяй, першаэлементам, з якога стварыўся Сусвет. І нават чалавек. Як вядома з легенд, цела чалавека створана з гліны. Адсюль і павер'е, што пасля смерці яно вяртаецца назад у зямлю, а душа трапляе ў верхні свет. Таму зямля для старажытных беларусаў была адвечнай калыскаю: «*Зямля святая, яна наша маці, яна нас жывых корміць, а па смерці да сябе прыхіляе*». Гэтае ўяўленне адлюстравана ў абрадах пахавання і каляндарных святах, звязаных з ушанаваннем продкаў. Да прыкладу, перад пахаваннем нябожчыка трэба было абавязкова абмыць і пераапрануць ва ўсё чыстае і новае. Таму што смерць і пахаванне разглядалі як вяртанне ў матчына ўлонне.

Згодна з легендамі, зямля была створана Богам разам з ягоным паплечнікам, які паступова ператвараецца ў суперніка. Гэты паплечнік-супернік у розных варыянтах легенды можа насіць імя Сатаны, Д'ябла, Лукавага, Чорта. Вось што кажа народнае паданне:

«Калісь господзь хадзіў па воздуху. Бача — пузыр вісіць, і ў пузыры штось пішчыць. Господзь спрашуя:

— Што ты там такое пішчыш у пузыры?

А ён гавора:

— Бог!

— А хто ж я?

— А ты, — кажа, — над багамі бог, — у пузыры атвет дае.

— Ну, калі ж я над багамі бог... — узяў і разадраў пузыр.



*Гара Талерка, вёска Саннікі (Дзятлаўскі р-н., Гродзенская вобл.)*



*Рабінавы Камень, вёска Малыя Таронкавічы (Лепельскі р-н., Віцебская вобл.)*

Вышаў адтуль чалавек, з пузыра, і ідзе поплеч з ім. Ідзе. І цяперака гавора гасподзь:

— Як бы нам з табою зямлі атыскаць? Патаму хоць нам без зямлі тожа можна жыць, а па-настаяшчаму няльзя. Ё, — гавора, — у акіяне бязэдным зямля — ідзі ты дастань адтуль: ты ета можаш здзелаці.

Гасподзь гавора таму ўжэ таварышу свайму. Ну, той палез, узяў зямлі ў рукі і попрыч у рот; і тую, з рук, богу аддаў, а тую затаіў ад бога.

Потым гасподзь гавора:

— Ну, мы ж ету зямельку пасеям.

Гасподзь зямельку пасеяў, зямелька стала росць. І ў ягонага таварыша ў роце стала росць. Яму стала трудна тагды ўжэ. Потым ён з трудоў тых кінуўся ад бога і давай харкаць, із рота зямлю выкідаць. І дзе харкане з рота паболей, там горы, курганы дзелаюцца, — і дзе зямлі больш выкінецца з рота, і дзе трохі харкане, там раўней; і дзе плюне — там мохі, балоты...»

З гэтай легенды бачым, што ў стварэнні зямлі прымае ўдзел не толькі Бог, але і ягоны паплечнік — нейкі таямнічы персанаж, які называе сябе таксама богам, толькі меншым, і які дапамагае яму ў нялёгкай справе пабудовы свету. Але гэтаму памагатаму надаецца незайздросная доля — стварэнне няроўнага і нязручнага для чалавека ландшафту. Яму прыпісваецца паходжанне гор, курганоў, лагчын і балот.

У другім падобным аповядзе загадкавы памагаты называецца проста чортам і надзяляецца цалкам адмоўнымі рысамі:

«Рабіў бог зямлю. Выгладзіў, выдзелаў — люба паглядзець. Гладзенькая, кругленькая, як шпакова яйка. Адляцеў троху воддаль дый дзівіцца з сваёй працы, што добра ўдалося.

Тым часам чорт ужо быў, сядзеў ён за кустом і ад злосці аж троссся. Зайздрасць яго брала, што бог гэтак добра зрабіў. Як толькі бог схаваўся за нябеснымі брамамі, а іх цэлых сем, чорт давай са злосці кіпцямі зямлю дзярці ды кідаць. Куды кіне — гара, куды са злосці плюне — балота. Зрабіў зямлю такой, як мы зараз бачым. Сам зарыўся глыбока ў зямлю і зрабіў пад зямлёй сваё княства.

Зямлю бог перарабляць не захацеў, бо былі ўжо людзі, іх некуды было выганяць пад час рамонту. Так і засталося да нашых часоў».

Па іншай версіі, Бог, ствараючы зямлю, варыў яе, і пухіры, якія з’явіліся пры гэтым, пасля астывання ператварыліся ў горы. А яшчэ распавядаюць, што ў пачатку стварэння зямля была вадкай, Бог з Д’яблам сціскалі яе з двух бакоў, каб адціснуць лішнюю вільгаць, і



*Альманскае балота, вёска Альманы (Столінскі р-н, Брэсцкая вобл.)*



*Рака Шчара (Мастоўскі р-н., Гродзенская вобл.)*

тая зямля, якая выступіла ад моцнага ціску, ператварылася ў горы.

З антаганістам Бога звязана легенда і пра Чортаву Гару на берагах Віліі, якая з'явілася ад таго, што Чорт, які спужаўся спеваў пеўня, не данёс да ракі мех пяску і высыпаў яго непадалёк.

Пра тое, адкуль узяліся на зямлі камяні, таксама распавядаюць па-рознаму. Часцей за ўсё кажуць, што камяні раней былі жывымі істотамі, маглі хадзіць, усё адчувалі, памнажаліся, раслі, як трава, і былі мяккімі. З тых часоў на камянях і засталіся сляды розных стварэнняў: ад жывёл і чалавека да розных міфалагічных істот. У часы хрысціянства сталі лічыць, што сляды на валунах пакінулі Бог або Божая Маці, святыя, нячыстая сіла. З часам камяні спынілі свой рост. А адбылося гэта тады, калі Бог пракляў людзей і зямлю за грахі. Зноў звернемся да легенды:

> «Хадзіла Божая Маці па зямлі і зачапілася нагой аб камень, які вырас на дарозе. Яна моцна параніла нагу, раззлавалася і сказала камяням: «Не расці вам больш!» З тых часоў камяні і не растуць».

Другая легенда таксама згадвае суперніка Бога:

> «Д'ябал, вечны супарат і антаганіст Бога, задумаў яму перашкодзіць. Паслаў ён на зямлю дождж з камення і загадаў камяням расці да тае пары, пакуль не пакрыюць яны сабою ўсё скрозь, і такім чынам, людзям і жывёлам не будзе на зямлі месца. Бог, само сабою, раззлаваўся на такія ўчынкі свайго супарата, скінуў яго з неба ў пекла, а камяням забараніў расці».

Асабліва буйныя валуны і каменныя глыбы лічаць у народзе акамянелымі людзьмі, жывёламі або казачнымі асілкамі, пакаранымі такім чынам за працу на свята (звычайна на Вялікдзень), распусту, дзёрзкасць, забойства, ляноту або які іншы грэх. Вось як тлумачыць паданне паходжанне сямі камянёў каля вёскі Дзярэчын Зэльвенскага раёна, што ў народзе завуцца Акамянелым Вяселлем:

> «Вяселле вярталася з вянчання ў царкве і па дарозе сустрэла чарадзея. Але з ім не павіталіся як трэба. Чарадзей страшэнна пакрыўдзіўся і пракляў вяселле, пасля чаго ўсе ўдзельнікі, а іх было шасцёра, скамянелі. Коні і вазы, якія былі ў вясельнай працэсіі, праваліліся скрозь зямлю. Сёмы ж камень, які знаходзіцца трохі воддаль, — гэта былы музыка».

У беларускіх замовах сустракаецца нейкі чароўны белы камень на імя Алатыр, які выступае сімвалічным цэнтрам свету, падмуркам сусветнага дрэва, дзе знаходзіцца прычына ўсяго існага, як дабротаў,



*Дзявочае возера каля вёскі Парэчча (Лепельскі р-н, Віцебская вобл.)*

так і няшчасцяў, у тым ліку хвароб. Да прыкладу, у замове супраць немачы і шалу ёсць такія словы:

«На сінім моры-акіяне стаіць дуб, пад тым дубам ляжыць Латыр-камень, пад тым камянём ляжыць чорная руна, у той руне жывець змяя Скурапея» або «На моры, на лукамор'і ляжыць белы камень, на тым камні сядзіць дзедзька-белабарэдзька. Прашу цябе, дзедзька-белабарэдзька, што б ты вынімаў шал...».

Такі камень прысутнічае і ў беларускім этнаганічным міфе, які суадносіцца з часамі першастварэння і тлумачыць паходжанне зямлі і ўсяго жывога на ёй:

«Калісь яшчэ свет толькі зачынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада, а пасярод вады тырчэў нібы камень, нібы што. Адзін раз пярун як разыграўся і давай пыляць стрэламі ў гэты камень. Ад яго стрэлаў выскачыла тры яскаркі: белая, жоўтая і чырвоная. Упалі тыя яскаркі на ваду; з гэтага ўся вада скаламуцілася, і свет памуціўся, як хмары. Але па некаторым часе, як усё высвятлілася, дык і адзначылася — дзе вада, дзе зямля. А яшчэ па некаторым часе завялося і ўсякае жыццё і ў вадзе, і на зямлі. І лясы, і травы, і звяры, і рыбы, а пасля і чалавек завёўся: ці ён прыйшоў адкуль, ці вырас тутака...»

Рэкі на нашых землях з'явіліся нібыта дзякуючы птушкам:

«Як стварыў Гасподзь наш свет, дык уся вада была ў вадном месцы. Вось і сабраў Гасподзь усіх птушак і сказаў ім: «Птушачкі мае, работнічкі мае! Саберыцеся вы ўсе на ўсе і разнясіце вы ваду гэту дый па ўсяму свету, разліце вы яе ў рэчкі бягучыя, у азёры стаячыя, у крыніцы халодныя».

Паводле іншай версіі, рэкі і азёры ўзніклі ад колішняй дзейнасці легендарных волатаў:

«Гэта тыя веліканы папракопвалі рэкі, павытопвалі зямлю, пааралі яе карчамі, што і да тых часоў на том месцы стаяць азёры ды рэкі».

У ваколіцах Мінска запісаны паданні, якія сцвярджаюць, што рэчышчы пракладзены асілкамі або выкапаны звярамі ці птушкамі. Так, да прыкладу, лічыцца, што рака Волма выцекла з галавы волата, які быў забіты ворагам, а рака Багатырка на Расоншчыне ўтварылася з вады, якая пацякла з цэбраў, што несла міфічная багатырка.

Цікавае паданне запісана пра ўзнікненне ракі Віліі і легендарнага Сцёп-Каменя на яе берагах паміж вёскамі Краснікі і Баяры ў Докшыцкім раёне:

«На тым месцы, дзе цяпер выток ракі Віліі, калісьці жыла сям'я — маці, сын і дачка. Сын быў надта непаслухмяны, а дачка разбэшчаная. Маці пракляла сваю дачку, і тая разлілася ракой, якую назвалі Віліяй. А сын зрабіўся каменем, падобным да чалавека».

Паходжанне азёраў тлумачыцца падобным чынам. Так, паданне пра ўтварэнне Святога возера каля вёскі Дубяні Барысаўскага раёна нагадвае біблейскі сюжэт пра старажытныя Садом і Гамору. Толькі тут замест жонкі Лота дзейнічае звычайная беларуская жанчына, якая прытуляе на ноч самога Бога, што вандраваў па краіне пад відам жабрака. Яна ў адрозненне ад сваіх аднавяскоўцаў, якія адмовілі ў прытулку беднаму падарожнаму, гасцінна сустрэла старца-жабрака і падзялілася з ім апошнім кавалкам хлеба. Каб аддзячыць жанчыне, старац нараніцу прапанаваў ёй пакінуць вёску і ісці за ім, але пры адной умове: ні ў якім разе не азірацца назад, што б там ні было. Сыходзячы з вёскі, жанчына пачула ззаду сябе невыносныя енкі і плач. Яна азірнулася, і ўмомант ператварылася ў каменную глыбу, а на месцы вёскі з'явілася возера.

Як бачым, вада ў міфалогіі беларусаў, як і ў многіх іншых міфалогіях, звязваецца з пачаткам стварэння Сусвету, дзе яна сімвалізуе хаос. У індаеўрапейскай і балта-славянскай міфалогіях вада дзеліцца на зямную і нябесную. Так, дождж лічыцца нябеснай вадой і пасы-

лаецца Грымотнікам (Перуном). У зямных водах хаваюцца Змей ці пазнейшы хрысціянскі Чорт. Ён жа ў шэрагу беларускіх міфаў з'яўляецца праціўнікам Грымотніка і гаспадаром зямных вод: крыніц, азёр. А яны ў сваю чаргу маюць сувязь з падземнымі і нябеснымі водамі. Узгадаем, што зямлю з дна сусветнага акіяна дастае менавіта Чорт.

Ён жа адказвае і за водны баланс на зямлі, можа наслаць ваду або за непаслушэнства пакараць людзей — прыпыніць яе:

> «Д'ябал нёс камень здалёку, каб запрудзіць Дзвіну, але запяяў певень, і Д'ябал кінуў камень у балота».

Падобныя паданні запісаны і адносна Віліі і Нёмана. Так, пра камяністае дно Віліі на Смаргоншчыне існуе паданне, што гэта рэшта запруды, зробленай чортам, які хацеў *«зусім заваліць рэчкі»*.

З часам вобраз Змея або Чорта ў паданнях і легендах замяняецца міфічнай ці сапраўднай княгіняй, каралевай, цыганкай, габрэйкай або вядзьмаркай. Звычайна гэта легенды пра зачараваныя і высахлыя рэкі або азёры. Прычынай іх высыхання робяцца праклёны пералічаных вышэй жаночых персанажаў за тое, што вада забрала жыццё дарагіх ім людзей. Так, у Пружанах зафіксавана паданне, дзе распавядаецца пра каралеву Бону:



*Святая крыніца ў лесе, вёска Турэц (Чэрвенскі р-н., Мінская вобл.)*

«Разам з дзіцём каралева пераязджала мост цераз Мухавец, і раптам яны зваліліся ў раку. У вадзе жыў змей, які і праглынуў дзіця. За гэта Бона пракляла Мухавец, за што цераз яе праклён ён зышоў на мезены палец».

Тое самае тычылася і сутокаў рэк, ручаёў і крыніц. Як, да прыкладу, у мястэчку Поразава на Свіслаччыне, дзе ў цыганкі ўтапілася дзіця. Яна ўзяла авечай поўсці, кінула ў выток ручая і загадала яму больш не цячы.

Згодна з легендай, першы агонь на зямлі таксама распаліў Чорт:

«Бог убачыў вогнішча, распаленае Чортам, і паслаў да яго архангела Міхаіла з жалезнай паліцай, каб здабыць сябе агню. Прыйшоў Міхаіл і пачаў размаўляць з Чортам пра тое, пра сёе, а сам незаўважна ўтыркнуў канец паліцы ў вогнішча. Калі паліца ад гэтага як след накалілася, архангел Міхаіл выхапіў яе і кінуўся бегчы. Чорт кінуўся за ім і ўжо ледзь не схапіў яго, але тут Бог крыкнуў архангелу «Кідай паліцу!» Міхаіл кінуў, паліца грымнулася аб камень і высекла іскры, з якіх запаліліся першыя вогнішчы. Так людзі навучыліся разводзіць агонь».

З'яўленне агню, паводле гэтай легенды, таксама адбываецца пры дапамозе іскарак, як і ў легендзе, калі Пярун кідаў стрэлы ў камень Алатыр пасярод мора. І, відаць, гэтая легенда больш ранняя, яшчэ дахрысціянская. Агонь нашы продкі лічылі адной з асноўных стыхій Сусвету. Ягоная сімволіка мае падвойны характар. З аднаго боку — гэта грозная стыхія, якая нясе смерць і знішчэнне, з другога — стыхія святла і цяпла, крыніца жыцця.

У народнай касмагоніі існуе ўяўленне пра нябесны, падземны і зямны агонь, якія суадносяцца з асноўнымі ўзроўнямі светабудовы. Дзякуючы нябеснаму агню нарадзіліся сонца, месяц і зоркі. Нябесны агонь «*падае*» на зямлю ў выглядзе маланкі, грамавой стралы, вогненнага дажджу, каметы і з'яўляецца боскай адзнакай або знакам боскай кары.

Падземны агонь лічыцца «*пякельным*», «*д'ябальскім*», «*чартоўскім*». Ён можа быць чырвонага, сіняга або зялёнага колеру. Апроч гэтага, такі агонь халодны і яго немагчыма згасіць. Згодна з паданнямі, падземны агонь можна ўбачыць на некаторых культавых горках, гарадзішчах, курганах, могілках, там, дзе схаваны зачараваны скарб. Паводле народных павер'яў, Чорт запальвае такі агонь на месцы грашовых скарбаў і такім чынам прасушвае грошы.

Зямны агонь у народзе заўсёды лічыўся «*жывым*», і каб здабыць яго, трэба было пацерці адзін кавалак дрэва аб другі. Такі агонь на-

зывалі таксама «*новы*», «*малады*», «*божы*», «*святы*», «*цар-вагонь*». Існавала практыка падтрымання яго ў доме на працягу года. Але штогод і такі агонь трэба было абнаўляць, замяняць «*стары*» агонь на «*новы*». Гэта адбывалася ў Вялікі чацвер або ў суботу перад Вялікаднем. Рабілі гэты абрад адмысловым чынам і пры адпаведных умовах.

Каб засцерагчыся ад розных хвароб, такі агонь таксама выкарыстоўвалі пры розных эпідэміях. Пасля эпідэмій таксама здабывалі «*малады*» агонь, бо «*стары*», як думалі, ужо няздатны быў засцерагчы ад злых духаў. З маладога агню раскладалі вогнішча, праз якое пераходзілі ўсе дарослыя, а хворых і дзяцей пераносілі.

## Глава 2
## НЕБА: СОНЦА, МЕСЯЦ, ЗОРКІ

Паводле беларускіх паданняў, нашу зямлю стварылі Бог і Чорт. Узгадаем паданні пра стварэнне гор і балот, дзе нароўні з Богам дзейнічае Чорт або Д'ябал, менавіта яму Усявышні даручае падняць са дна сусветнага акіяну кавалак глебы, з якой і стварае зямлю.

Што тычыцца неба, то яго зрабіў Бог. І зрабіў ён яго нібыта на тое, каб жыць там разам са сваімі памагатымі — анёламі і душамі святых людзей, таму на небе заўсёды ясна і прыгожа. Беларусы Падзвіння нават той частцы неба, дзе жыве Бог, далі спрадвечную назву — Багонь. Заўважым, што нашы продкі сваё вярхоўнае бостава — стваральніка неба і зямлі, называлі проста Бог, які лічыўся адным з персанажаў дахрысціянскага пантэону. Гэты вярхоўны Бог быў вышэй за Перуна і Вялеса, але пад уладу апошняга аддаў зямны свет. Пазней, пад уплывамі новай рэлігіі, уладар зямных нетраў ператварыўся ў ліхога духа — Чорта, або Д'ябла.

Ва ўяўленнях старажытных беларусаў неба — аграмадная паўсферычная столь, зробленая з серабра або шкла, лёду. Зямля ж недзе канчаецца, хутчэй за ўсё на даляглядзе, там, дзе сыходзяцца зямная і паўсферычная нябесная прасторы. Верылі, што менавіта тут знаходзіцца міфічны канец свету, і далей ніхто не жыве. Таму ў замовах сюды адсылаюцца розныя хваробы: «*...дзе неба з зямлёю спаткаецца, няхай звіх змінаецца*». Таксама верылі, што ўваход на неба знаходзіцца ў тым месцы, дзе ўзыходзіць сонца.

Пра канец, або край, свету існуюць розныя ўяўленні. Кажуць, што ў першапачатковыя часы неба не было аддзелена ад зямлі, і людзі маглі вольна на яго ўзыходзіць. Як той салдат з беларускай казкі, які заблукаўшы, дайшоў да месца, дзе канчаецца зямля, і, па-



*Старажытнае ўяўленне пра Сусвет (гравюра 1550 г.)*

бачыўшы, што далей ужо няма куды ісці, вырашыў адпачыць там. Дзеля гэтага *«ён убіў у неба гвозд і павесіў свой клунак. Ці праўда, ці не — ён нават хадзіў на неба, але яму там не спадабаласо, бо на небе не знайшоў ні тутуну, ні гарэлкі»*.

Па другіх уяўленнях нашых продкаў, на краю зямлі жывуць звычайныя людзі, вось толькі тамтэйшыя жанчыны, калі мыюць бялізну, свае пранікі кладуць на край неба, а бялізну, каб абсохла, вывешваюць на рогі маладзіка. Падобныя ўяўленні пра неба захаваліся і ў чарадзейных казках, дзе галоўны герой для дасягнення сваёй мары лёгка вандруе на неба па дапамогу да нябеснага народу. Так бы і хадзілі людзі на неба і надалей або выкарыстоўвалі яго для сваіх патрэбаў, пакуль аднойчы яны нечым не ўгнявілі Бога, і той вырашыў аддзяліць неба ад зямлі, закрыць усім жывым туды дарогу. Верагодна, так продкі беларусаў і вызначылі міфалагічны пераход ад язычніцтва да хрысціянства.

Нашы прадзеды верылі, што апроч бачнага ўсімі неба існуе некалькі нябачных нябёсаў, адлегласць паміж якімі ў дванаццаць разоў большая, чым паміж зямлёй і ніжнім небам. Гэтыя ўяўленні часткова захаваліся ў народных казках, дзе прыгадваюцца тры, сем ці адзі-

наццаць нябёсаў. Па адных уяўленнях, самае першае неба — цвёрдае, або каменнае; пасля яго ідзе воднае, якое яшчэ называюць «хлябі нябесныя». Другія паданні сцвярджаюць, што менавіта першае неба ўтрымлівае ваду, якую выцягвае вясёлка з нашых азёраў, рэчак, балот. Ёсць яшчэ шкляное, крышталёвае, меднае, жалезнае і гэтак далей нябёсы. На самым апошнім небе (звычайна на сёмым) на залатым прастоле сядзіць сам Бог. Нездарма ў народзе кажуць: «*на сёмым небе ад шчасця*». Народнае паданне сцвярджае:

> «Неба зроблена так, што яно мае сем сталак, ці пёнтраў. Мы бачым толькі першае неба. А Бог жыве аж на сёмум. З чаго зроблена неба — ніхто не ведае».

На сярэдніх нябёсах жывуць анёлы, на ніжніх — душы святых і бязгрэшных людзей. А трапляюць душы такіх людзей туды па асаблівай дарозе — Млечным, або Птушыным, Шляху. Вядома, згадкі пра анёлаў і богаабраныя душы — гэта ўжо пазнейшае хрысціянскае напластаванне. У той жа час неба — месца, дзе жывуць яшчэ ненароджаныя дзеці. Узгадаем такія выразы, як «*з неба ўпаў*», «*Гасподзь з неба скінуў*», «*мой бацька сеяў авёс, а я ўпаў з нябёс*».

Часам уначы ніжняе неба адчыняецца, і за ім можна ўбачыць верхняе — яскравае, як сонейка. Але згледзець яго могуць толькі самыя бязгрэшныя і святыя людзі. Неба можа адчыняцца і ў іншыя часы, да прыкладу, падчас грому і навальніцы, на вялікія святы або напярэдадні нейкай важнай з'явы ці агульнага няшчасця — паморка, голаду, вайны.



*Падвеска-амулет са знакам сонца, XIII ст. Гарадзішча каля вёскі Маскавічы (Браслаўскі р-н., Віцебская вобл.)*



*Фібула (зашпілька) з выявай свастыкі III–IV стст., вёска Тайманава (Быхаўскі р-н, Магілёўская вобл.)*



*Выява васьміпраменнай зоркі на вышыўцы*

Пра тое, што сабою ўяўляе галоўнае нябеснае свяціла — сонца, няма адзінага погляду. Лічыцца, што сонца ўзыходзіць з аднаго краю зямлі ранкам, коціцца на захад і ўначы адпачывае ў сваіх палацах за морам, з адваротнага боку зямлі. Увогуле, сонца раней, як расказваюць старажытныя паданні, свяціла круглы год, і ўдзень, і ўначы.

«Як бог стварыў свет, то вялеў сонейку свяціць на добрых і на ліхіх. Сонейка не хацела свяціць на ліхіх і пачало жаліцца богу, што яму цяжка заўжды свяціць. Тады бог пашкадаваў сонейка й вялеў яму свяціць толькі ўдзень, а ўночы, як гуляюць ліхія, не свяціць, а аддыхаць».

Але недзе на краі зямлі, дзе яна сыходзіцца з небам, застаўся куточак былога выраю. Там сонца па-ранейшаму свеціць заўсёды і ніколі не хаваецца ні за морам, ні пад зямлю.



*Знак сонца на карцы, пач. XX стст.*



*Гліняны гаршчок са знакамі свастыкі, пач. I тыс., з раскопак пахавання каля вёскі Нача (Воранаўскі р-н., Гродзенская вобл.)*

У народнай культуры існуе і шмат іншых уяўленняў пра тое, што такое сонца. Адны лічаць яго касмічным вогнішчам, якое грэе неба, каб там было цёпла. Другія называюць агромністай свечкай, якую запальваюць анёлы, каб на зямлі было светла. Трэція думаюць, што сонца — вялізнае кола, якое можна дастаць рукою, калі яно апускаецца за далягляд. Пра гэта кажа загадка: «*Цацілася катушка, ні звер, ні птушка...*». Чацвёртыя сцвярджаюць, што сонца — Божае Вока, якое ўвесь дзень сочыць за людзьмі, таму Бог ведае ўсё, што адбываецца на зямлі.

Сакралізаваліся народам і такія паняцці, як усход і заход сонца. Вядома народнае ўяўленне аб тым, што ўсе цёмныя і ліхія сілы, якія панавалі ўначы, знікаюць на досвітку. Так, уначы да ўсходу сонца ў жыце танчаць русалкі, а вядзьмаркі ператвараюцца ў розных

істот, каб нашкодзіць звычайным людзям. Да сонца на Юр'я сяляне спяшаліся выгнаць карову ў поле, каб яна паспела схапіць юраўскай расы. У гэты час збіраліся лекавыя зёлкі на Яна, а каб не хварэць або паправіць сваё здароўе, знахаркі і чараўнікі бралі ваду з крыніц і рэчак. Падчас сухменю цнатлівыя дзяўчаты ці ўдовы да ўзыходу сонца мусілі ўліць у тры калодзежы свянцонай вады, а ў выпадку знікнення малака ў каровы таксама бралі з трох калодзежаў ваду і абціралі ёю вымя. А калі паселішчу пагражаў паморак або халера, перад узыходам сонца адбывалася рытуальнае абворванне і абыход вёскі з ручніком-абыдзённікам.

Існавалі свае прымхі і забабоны ў перыяд, калі сонца набліжалася да небакраю, але яшчэ было бачнае на небе. У такі час нельга было класці дзіцёнка спаць, каб сонца *«не забрала яго з сабой»*, не калыхалі немаўля ў калысцы і не падносілі яго да люстэрка, бо там можна было ўбачыць нячысціка.



*Свастыка (сонца) на ручніку, пачатак XX ст. (музей традыцыйнага ткацтва беларускага Паазер'я)*

І ўвогуле пасля заходу сонца не пачыналі ніякай важнай справы, не выносілі смецце з хаты, не пазычалі такія рэчы, як агонь (пазней — запалкі), зерне для пасеву, рэшата, не пяклі хлеб — *«бо злыдух прыйдзе і зысьць яго ў ночы»*, заканчвалі ткацтва, не пакідалі кросны, аснову на сцяне, інач *«у вёсцы з'явяцца ваўкі»*. У некаторых мясцінах Беларусі існавала нават забарона смяяцца ў гэты час: *«Ек будзеш смяяцца после заходу сонца, то зелёна жаба зубы пашчытае»*, гэта значыць неўзабаве памрэш. Негатыў гэтага часу адлюстраваўся і ў беларускіх праклёнах: *«Закацісь ты жаркім сонцам пад кустом»*, *«штоб ты на захад сонца ішоў»*. Асабліва небяспечным і разам з тым таямнічым лічыўся адрэзак часу пасля заходу сонца да спеву першых пеўняў. Тады пачыналі дзейнічаць не толькі злыдухі, але і душы продкаў. У гэты час запальвалі купальскія вогнішчы, пачыналася святочная вячэра на Дзяды, адбываўся кантакт з тагасветам.

Пра другое свяціла — месяц — таксама існуюць розныя меркаванні. Прынамсі лічыцца, што ўшанаванне месяца нашымі про-

дкамі адбывалася ў больш старажытныя часы і папярэднічала шанаванню сонца. Нават рух гэтага свяціла па небакраі спарадзіў назву каляндарнага часу — месяц. Часцей за ўсё Месяц у народных паданнях увасабляе жаніха Сонца, дзе Сонца — жаночы пачатак, а Месяц — мужчынскі. Так, у калядных і валачобных песнях Сонца выступае як руплівая гаспадыня, а Месяц ідэальны гаспадар. Зоркі ж, адпаведна, лічацца іх дзеткамі. А падворак нябеснай пары ўспрымаецца ў народным уяўленні як узорна ўпарадкаваны Сусвет.

Але і ў такім ідэальным сямействе здараюцца парушэнні, дзе віноўнікам аказваецца непастаянны і пераменлівы Месяц. Астранамічнае збліжэнне Месяца і Зоркі Венеры ў нябеснай сферы тлумачылася ў народных вераваннях тым, што ідэальны муж забывае пра свае абавязкі і пачынае заляцацца да Заранкі, або Вечарніцы, — Зоркі Венеры ў яе ранішняй або вечаровай бачнасці. Гэтая зорка з'яўляецца на небасхіле ў той момант, калі сонца ўжо заходзіць або яшчэ не ўзышло, і свеціць даволі ярка, чым канкурыруе ў прыгажосці з дзённым свяцілам. Падобныя паводзіны Месяца не падабаюцца Перуну — богу маланак і навальніцы, які сам мае шлюбныя інтарэсы да Зоркі Венеры і таму сувора карае начное свяціла: крышыць яго на зоркі. Пасля пакарання ідэальны парадак узнаўляецца, але Месяц пачынае безупынна нараджацца і паміраць. У астраноміі такое завецца квадрамі месяца і дзеліцца на чатыры фазы: маладзік, поўня, сход і ветах.

Паводле беларускіх вераванняў, асабліва папулярным лічыўся маладзік. Прынамсі, масавае ўшанаванне такой цікавай з'явы ў беларускай народнай культуры як «прошчы», адбывалася менавіта на маладзік. Прошчамі называлі прыродныя месцы масавага малення боству — узгоркі, камяні, крыніцы. Звычайна размяшчаліся яны на месцы былых свяцілішчаў, дзе потым, ужо ў часы хрысціянства, будаваліся храмы або капліцкі.

Паводле другіх вераванняў, Месяц лічыцца малодшым братам Сонца. Гэта адлюстравалася ў загадцы: *«Сястра да брата ў госці ідзе, а брат ад яе хаваецца»*, адгадка: Сонца і Месяц. У такім выпадку абавязкам Месяца было асвятляць Зямлю ўначы, калі Сонейка адпачывае:

> «Месяцу Бог вялеў свяціць людзям уночы, покуль Сонейка сапачывае. Толькі Месяц вельмі гультаяваты, ён кепска свеціць, затое Бог вялеў, каб ён кожныя чатыры нядзелі перараджаўся. От затым ён адну нядзелю малады, другую расце аж да поўна, трэцюю поўны, а чацвёртую саўсім прападае».

Тут ролю Перуна выконвае сам Бог, які таксама крышыць яго на зоры, але толькі тады, калі Месяц састарэе:

«...адзін кавалачак кладзе ў дзяжу, на закваску. Зоры ападаюць туды, з іх пачынае рабіцца рошчына, цеста падыходзіць і пераліваецца цераз край. Гэтак і нараджаецца месяц».

Адкуль і чаму з'явіліся зоркі, таксама расказваецца па-рознаму. Як прыгадвалася вышэй, зоркі аказваюцца дзецьмі Маці-Сонца і Бацькі-Месяца. Пра гэта гаворыць фальклорны тэкст:

*«Стаіць цяром вышы ўсіх харом.*
*А ў тым цераме да чатыры ўглы,*
*Чатыры ўглы да чатыры акны...*
*У адным акне — ясён месіц,*
*У другім вакне — красна сонца...*
*Красна сонца — жана яго...*
*А ў трэцім акне — дробныя звёзды,*
*Дробныя звёзды — яго дзеткі,*
*А ў чацьвёртым акне — цёмная ночка.*
*Цёмная ночка — уся яго сям'я».*

Згодна з другімі ўяўленнямі, зорак на небе столькі, колькі людзей жыве на зямлі. Прычым кожны чалавек мае сваю зорку, яна запаль-



*Выява сонца на франтоне хаты, вёска Гаўрыльчыцы (Салігорскі р-н., Мінская вобл.)*

ваецца ў момант ягонага нараджэння і падае з неба, калі чалавек памірае. Адсюль існуе такое паняцце, як «зоркі падучыя». У некаторых кутках Беларусі такія зоркі ўспрымаліся як душы няхрышчаных дзяцей, якія ляцяць у пекла. І, каб выратаваць такую бязвінную душу, трэба было за кароткі час бачнага палёту зоркі перахрысціць яе і хутка сказаць:

*«Ва імя 'тца й сына,*
*Даю табе імя:*
*Калі пан, будзеш Ян,*
*Калі панна, будзеш Ганна».*

Існуе меркаванне, што зоркі — гэта душы памерлых бязгрэшных немаўлят і праведнікаў, якія з неба ўважліва сочаць за дзеяннямі сваіх родных. А яшчэ параўноўваюць зоркі з нябеснымі свечкамі, якія штовечар запальваюцца Богам або анёламі. Старажытныя вераванні продкаў чуюцца і ў назвах сузор'яў. Да прыкладу, Вялікая Мядзведзіца называецца ў нас Возам або Калясніцай, а Плеяды — Сітам, бо сам абрыс, утвораны зоркамі, даў падставы для такога атаясамлення.

Выкарыстоўвалі зоркі і ў народнай магіі. Да прыкладу, шмат зорак на першую куццю прадказвалі багаты ўраджай — як збожжа і мёду, так і грыбоў з ягадамі ў лесе. Спрыяла добрым справам і святло ясных зорак, якое ў народзе атрымала назву «Божая Страха». У гэтую пару пад зорнае неба выстаўлялася прыгатаванае для сяўбы насенне і чацвярговая соль.

## Глава 3

# ПРЫРОДНЫЯ З'ЯВЫ: ВЕЦЕР, ДОЖДЖ, ЗАСУХА, ВЯСЁЛКА, НАВАЛЬНІЦА, ГРОМ, МАЛАНКА, СНЕГ, ЛЁД, РАСА

Духоўны свет старажытных беларусаў сфармаваўся на падставе непарыўных узаемаадносін з прыродай, ўяўленняў пра ўплыў прыродных і касмічных сіл на жыццё і лёс чалавека. Таму беларусы стварылі асаблівы свет, дзе сэнсавым цэнтрам заўсёды выступае Прырода як вялікая ўсёнараджаючая сіла. Прырода ўспрымалася як жывы арганізм, у якога ёсць душа. І адзін з галоўных законаў, якія адкрылі нашы дзяды і прадзеды — гэта закон гарманічнага суіснавання з прыродай. Яны ўспрымалі сябе дзецьмі Маці-Прыроды.

Усе прыродныя стыхіі лічыліся адухоўленымі і валодалі ўнікальнай касмічнай сілай. Чалавек назіраў асаблівую мудрасць у прыродзе і прыйшоў да высновы, што ў ёй усё заканамерна.

Такую з'яву прыроды, як вецер, продкі ўспрымалі дваіста. З аднаго боку — гэта магутная стыхія, супрацьпастаўленая нячыстай сіле, з другога — яе спараджэнне і ўвасабленне. У першым выпадку яго называлі *«добрым»*, *«святым»*, у апошнім — вецер надзяляўся дэманічнымі якасцямі. Вецер жыве ў таямнічых і недасяжных месцах. Гэта глухі лес, далёкая выспа ў акіяне, высокая гара, чужая краіна па другі бок мора... А палешукі ўяўлялі вецер у вобразе жахлівага і пузатага чалавека з доўгімі вусамі, вялікімі, падобнымі да дзюбы, вуснамі і лупатымі вачыма: *«А сёння лупаты дзьме ды дзьме»*, *«у ветра лупы, як каўбасы тоўстыя»*.

Уяўленне пра вецер як пра адухоўленую асобу, што рухаецца па паветры, выяўлялася і ў жаданні чалавека запрасіць вецер да сябе ў тых выпадках, калі ён неабходны для гаспадарчых і другіх патрэб. Самым распаўсюджаным спосабам выклікаць вецер лічыўся свіст, радзей — спевы. Беларусы лічылі, што млынар павінен умець *«запрагаць вецер»*, выклікаць яго ў патрэбны час, кідаючы жменямі муку ўгору.

Уяўлялі, што ў ветры хаваюцца дэманы і душы несупакоеных грэшнікаў. Моцны вецер азначаў нечую гвалтоўную смерць, а халодны, як думалі, заўсёды дзьме з таго боку, дзе патануў чалавек. Шкадлівым і небяспечным ветрам лічыўся *віхор* — стоўп паветра, што круціцца вакол уласнай восі і, калі рухаецца па вадзе і зямлі, захоплівае разам з сабою розныя рэчы, чым прыносіць разбурэнне і знішчэнне. Як думалі ў народзе, такі вецер узнікае тады, калі чэрці выскокваюць з пекла і дурэюць або калі яны ўцякаюць ад грому. Віхор закручваецца і тады, калі хто павесіцца ці зарэжацца, а чэрці, цягнучы душу, каламуцяць паветра. Але найбольшы віхор робіць самы галоўны чорт — Шатан. *«Калі кінуць у віхор канчаты нож, то можна трапіць у чорта, бо на нажы будзе кроў»*. Паводле народных павер'яў, пасля такога дзеяння можа з'явіцца чорт з нажом, уторкнутым у нагу, і паабяцае служыць да смерці, калі гэты нож вымуць.

Самым жа шкадлівым і стратным ветрам, што прыносіць з сабою хваробы і *«ветравое ліха»*, лічыўся *падвей* — як натуральны, так і насланы чараўніком ці вядзьмаркай. Ад такога ветру ў чалавека нібыта магло скруціць галаву, руку ці нагу, адняць мову. На падвей насылалі сурокі, ляк, каўтун і проста злыя намеры: *«а той вецер, каго пападзе, — скруце, зламае, неўма што стане, і забярэцца нячысты дух»*. У замовах ад падвею гаворыцца пра дванаццаць вятроў, альбо дванац-



*Вецер (мастак Б. Забірохін)*

цаць віхроў. Але ў беларускім фальклоры сустракаецца толькі вядомыя нам *віхор*, *падвей*, ды яшчэ бура, буйны вецер ды *вея*. Апошняя назва сімвалізуе моцны зімовы вецер, які стварае завіруху і замятае ўсе сляды і сцежкі, хаця шкадлівай і не лічыцца.

Каб задобрыць шкадлівы вецер, ці наадварот, запрасіць яго на дапамогу, старажытны чалавек «*карміў*» яго хлебам, мукою, крупамі, мясам, рэшткамі святочных страў. А ў Заходняй Беларусі, на мяжы з Польшчай, вецер запрашалі падчас спёкі і абяцалі аддаць яму ў падзяку дзяўчынку: «*Падуй, ветрык, падуй, дамо табе Ганусю*».

Такія атмасферныя з'явы як дождж і засуха непасрэдна звязаны паміж сабою. Здаўна вядома: ад наяўнасці дажджу залежыць рост раслін і ўраджай. Згодна з рэканструкцыяй асноўнага міфа, дождж ідзе пасля перамогі вярхоўнага бога Грымотніка, або Перуна, над Змеем. Часам Перуна называюць яшчэ богам Навальніцы.

Гэты міф, які захаваўся амаль без зменаў, быў запісаны ў Чашніцкім раёне і датычыць культавага каменя, што знаходзіцца там каля вёскі Гогалеўка. Згодна з ім, у камяні жыў Змей, які час ад часу ператвараўся ў прыгожага хлопца і кахаўся з мясцовай дзяўчынай. Аднаго разу ён прыснуў на каленях дзяўчыны і не заўважыў, што на небе з'явіліся хмары. Неўзабаве бліснула маланка, потым другая, пачалася навальніца. Раптоўна грымнуў Пярун і забіў Змея, пасля чаго пачалася страшэнная залева. Далей апавядаецца пра тое, што каб спыніць дождж, людзі спрабавалі закапаць мёртвага Змея, але тры дні ім гэта ніяк не ўдавалася зрабіць, і ўсе гэтыя дні працягваўся няспынны дождж. Калі нарэшце Змея ўсё ж такі пахавалі, дождж спыніўся.

Прыведзены міф вельмі сімвалічны. Ён адлюстроўвае язычніцкае светаўспрыманне, згодна з якім усё, што адбываецца ў свеце, а ў дадзеным выпадку — з'яўленне маланкі, грому і дажджу — залежыць ад барацьбы двух бостваў: верхняга — Грымотніка (Перуна) і ніжняга (Змея). Ніжняе боства нейкім чынам утрымлівае ў сабе зямныя запасы вады, і яны вызваляюцца ў выніку двубою паміж Грымотнікам і Змеем. Безумоўна, што дадзены міф глыбока ўвайшоў у свядомасць беларусаў і нават дагэтуль захаваўся ў выглядзе забабонаў і павер'яў наконт выклікання дажджу падчас засухі. Згодна з імі, спыніць засуху і выклікаць дождж можна пры ўмове забойства вужа або змяі ці іншай хтанічнай жывёлы (жабы, чарвяка, смаўжа) і пахавання іх з прытворнымі галашэннямі. Іншымі словамі, трэба вярнуцца ў міфічны час і паўтарыць сакральныя дзеянні верхняга боства.

У вышэйпрыведзеным аповедзе пра двубой ніжняга і верхняга бостваў міфічны Змей жыве за возерам і, каб патрапіць да сваёй каханай, якая пасвіць статак на другім беразе вадаёма, ператвараецца ў вясёлку:

> «Ён (змей) бывала абернецца так, дугой, над возерам над Лукомскім, ды так і цягнець ваду. А як толькі на зямлю апусціцца, дык і здзелаецца ў чалавечае аблічча, — паніч такі, што хоць куды».



*Завіруха*



*Засуха*

Відаць, дзякуючы такім старадаўнім уяўленням, пазней у народнай свядомасці замацавалася перакананне, што вясёлка *«п'е»* ваду з мора ці возера, балота, ракі або калодзежа накшталт змея. Таму гэтую прыродную нябесную з'яву вельмі часта называюць *цмокам, смокам* (ад слова смактаць) або змяёй: *«яна апусціць сваё джала ў ваду, назбірае ваду ў сябе, а потым выпусціць, адсюль і дождж»*. Часам у народзе лічылі, што разам з вадою вясёлка высмоктвае жабак і рыбак, якія пазней пры вялікай навальніцы падаюць з неба далёка ад таго месца, дзе былі высмактаны ў паветра. На ўсходзе Беларусі вясёлку параўноўвалі з дзяўчынай, што нясе ваду на неба. У другіх раёнах гэтая атмасферная з'ява лічылася рэгулятарам надвор'я, там былі ўпэўнены, што вясёлка злучае зямлю і неба.

Засуху як атмасферную з'яву лічылі боскім пакараннем за людскія грахі, у тым ліку за невыкананне імі нейкіх рэлігійных табу, або вядзьмарскім насланнём. На думку продкаў, справакаваць засуху можа гарадзьба платоў і парканаў да свята Благавешчання, несвоечасова пастаўлены помнік на магіле, калі зямля яшчэ спіць і турбаваць яе ні ў якім разе нельга. І каб ліквідаваць прычыну засухі, разбуралі «няправільныя» агароджы і платы, зносілі іх у балота ці ў возера, пераварочвалі помнікі ці крыжы, пакуль не пойдзе дождж.

Таксама верылі, што ўладу над дажджом, як і другімі атмасфернымі з'явамі, маюць насельнікі «таго свету» — памерлыя продкі і асабліва тыя, якія памерлі раптоўнай або гвалтоўнай смерцю. Так, паводле вераванняў, сухмень можа выклікаць пахаваны тапелец, якому ўвесь час *«не хапае вады»*, таму ягоную магілу падчас засухі палівалі вадой ці ставілі на насып пасудзіну з вадкасцю. Вінаватым у прыродным катаклізме лічылі і самагубцу, пахаванага насуперак народным забабонам на тэрыторыі могілак, а не па-за імі. У некаторых выпадках такую магілу разрывалі, а труп кідалі ў раку.

Калодзежы, крыніцы і ўсе вадаёмы ўвогуле, паводле народных уяўленняў, звязаны з нябеснымі водамі. Таму апошнія можна *«адкрыць»* пэўнымі культавымі дзеяннямі каля водных аб'ектаў. І, каб

задобрыць стыхіі вады, падчас засухі кідалі ў вясковыя калодзежы ахвяраванні ў выглядзе маку, семені льну ці канапель або скрадзены ў суседзяў гаршчок (часам з баршчом). Водгук гэтага абраду захаваўся ў дзіцячай палескай песеньцы:

> «Дошчыку, дошчыку, звару тобі боршчыку. Мені каша, тобі борщч, каб ішоў гусцейшы дошч».

І калі дождж быў боскім падарункам, ад якога залежала пладнасць зямлі, то навальніца і град лічыліся боскім пакараннем. Галоўныя атрыбуты навальніцы — маланка і гром. Паводле беларускага фальклору, маланка, як і сонца — від нябеснага агню, таму з'яўляецца грознай зброяй Перуна або прарока Іллі супраць Змея, пазней Чорта, нячысціка. Лічылі, што маланка нараджаецца ад каменя — узгадаем міф пра Перуна, калі ад удару пярунава ў камень над мёртвай вадою выскачылі тры іскаркі. У народзе так і казалі: «*калі бог Пярун хоча кагосьці пакараць, то ён разбівае скалы і праз гэта пускае на зямлю агонь-маланку*». Паводле іншага павер'я, Пярун адным ударам свайго каменнага молата разбівае хмары, і апладняль-



*Жанчына кідае ў калодзеж ключ ад старога замка, каб «адкрыць» дождж*



*Маланка*

ная вада ліецца на зямлю. Таксама існавала думка, што ў Грымотніка ёсць вялізныя жорны, і час ад часу ён трэ імі і стукае адзін аб адзін, ад чаго ўзнікае гром і маланка. Пры гэтым аскепкі жорнаў, якія адскочылі ад udaраў і ўпалі на зямлю, з'яўляюцца *«перуновымі стрэламі»*.

Разам з тым маланку ў замовах называлі *«правялікай гаспадыняй»*, або маці, сыны якой — вятры, могуць прыносіць людзям розныя няшчасці.

Верылі, што хаваючыся ад маланкі, нячысцік можа знаходзіцца ў самых разнастайных месцах і пераўвасабляцца ў розных жывых істот — чорнага казла, свінню, котку, сабаку, саву. Таму хатніх жывёл падчас навальніцы выганялі з хаты. Маланка можа паразіць і *«нячыстае»* месца — замак, палац або карчму, якія пасля гэтага знікаюць на дне возера. Б'е маланка і ў тых людзей, у каго схаваўся нячысцік. А трапляе ён да чалавека праз адкрыты рот, у ягоны капялюш, закасаны прыпол, пад андарак... Сыходзячы з такіх уяўленняў, не было завядзёнкі ратаваць пацярпелых ад удару маланкі-грому, гэтаксама як і ратаваць будынкі, што загарэліся ад маланкі, калі толькі выкарыстаць пры тушэнні пажару салодкае малако. З другога боку, існавалі такія святыя месцы, куды маланка і гром звычайна не траплялі — да прыкладу, у хату з буслянкай, асабліва калі ўжо вывеліся бусляняты, ці ў пчаліны вулей.

Гром, паводле народных уяўленняў, — гэта апладняльная сіла, звязаная з нябеснай вільгаццю — дажджом. Вельмі шанаваўся першы вясновы гром, які лічыўся прадвеснем новага гаспадарчага году, абуджэння зямлі, пачаткам земляробчага сезону, калі зямля адкрываецца і гатовая прыняць у сябе ваду і, такім чынам, апладніцца. З першымі грымотамі звязваецца нават народнае свята Грамніцы, калі нашы продкі ад першага грому і маланкі запальвалі святыя ачышчальныя вогнішчы і выкарыстоўвалі іх супраць нечысці і непатрэбных ужо зімовых, а таму шкодных сіл.

Град успрымаўся выключна як Божае пакаранне за людскія грахі ці парушэнне звычайнага парадку. Часцей за ўсё прычынай градабою лічылі парушэнне маральных норм, напрыклад нараджэнне дзяўчынай пазашлюбнага дзіцяці або ягонае забойства. Так, палешукі казалі, што ўвесь год будзе біць град уздоўж той дарогі, па якой жанчына несла забітага ёю дзіцёнка. Каб не дапусціць або спыніць град, трэба было абавязкова знайсці труп немаўляці, выкапаць яго з зямлі або выцягнуць з вады. Думалі, што град мог пачацца і ад таго, што людзі парушалі забарону працаваць у так званыя «*градавыя*» дні. Звычайна гэта была *Градавая серада*: тая, што папярэднічала Сёмусе (Тройцы) і першая пасля яе, а таксама пасля Вялікадня.

Абарона ад градабою праяўлялася яшчэ ў тым, што за парог дома выносілі рэчы, звязаныя з агнём: хлебную лапату, качаргу, вілкі. Часцей за ўсё іх выносілі перавернутымі, каб такім чынам адвярнуць градавую хмару. Калі ўсё-такі град пачынаўся, яго намагаліся спыніць тым, што перакусвалі або глыталі некалькі першых градзін, або кідалі іх у распаленую печ. А зрабіць гэта павінен быў першы ці апошні дзіцёнак у сям'і. Жанчыны ж скідвалі з сябе вопратку або задраўшы спадніцы, абягалі тройчы вакол хаты, каб напужаць хмару і спыніць град, а мужчыны здымалі шапкі і размахвалі імі. Адмысловым жа магічным прадметам уздзеяння на навальнічную хмару з'яўлялася палка, якою ўдавалася адагнаць змяю ад жабы ў той момант, калі яна прагнула праглынуць апошнюю. Для абароны палёў ад



*Грамавы знак на доме*



*Вясёлка*

града іх абворвалі два браты-блізнюкі на двух валах-блізнюках, або аралі поле крыж-накрыж.

Цікава, што снег у народным уяўленні — «*змёрзлы дождж*», які лічыўся патэнцыйнай вадой, а значыць, плоднай сілай: «*Многа снегу — многа хлеба*», «*У снежны мароз і снег вышэй хаты — год будзе багаты*». Разам з тым снег быў звязаны з іншасветам, з духамі продкаў. Язычнікі-беларусы нават думалі, што снег заключаў у сабе душу як асобнага чалавека, так і ўсяго роду. З другога боку, снег у сукупнасці з ветрам утвараў такія з'явы, як мяцеліца ці завіруха, што лічылася ўжо д'яблавымі праявамі: «*Мяцеліца не ад Бога, да ад чорта*», «*Калі падае снег да круціць завіруха, то гэта чэрці з ведзьмамі спраўляюць шабас*». Дзе снег, там і лёд. Абедзве гэтыя з'явы як атрыбуты зімы выконваюць ахоўную функцыю. Найперш таму, што лёд як зменёная вада захоўвае ў сабе яе плодную сілу: «*Калі зімою часты галалёд, то чакай вялікі ўраджай на ўсялякую пашню*». Разам з тым лёд успрымаўся і негатыўна, таму што паралізуе магчымасці вады і таму лічыцца «*мёртвай вадою*».

З нябеснай і зямной вільгаццю цесна звязана і такая атмасферная з'ява, як раса. Продкі былі ўпэўнены, што Бог дае расу толькі ў тым выпадку, калі няма дажджу. А ў вельмі даўнія часы з'яўленне расы на зямлі тлумачылася яе апладненнем старажытным богам Ярылам, боствам плоднасці і веснавой сексуальнай энергіі. Менавіта насыча-

насць зямлі расой сведчыла пра абуджэнне яе ўрадлівасці і прадуктыўнасці пасля зімы. Пазней Ярылу замяніў Святы Юр'я. Сюжэт апладнення захаваўся ў юраўскіх абрадавых песнях, якія выконваліся падчас аднайменнага абрада-свята:

*«Юры, уставай рана,*
*Адмыкай зямлю,*
*Выпускай расу*
*На цёплае лета,*
*На буйное жыта».*

Шанавалі не толькі юраўскую расу, лічылі, што сваімі магічнымі здольнасцямі яна валодае да самага Купалля, калі дасягае цудадзейнага піку. Часам нават само Купалле называлі Раса і верылі, што ў гэты перыяд нябесная вільгаць мае свае максімальныя ачышчальныя і лекавыя здольнасці. Людзі былі ўпэўнены, што ўмыванне купальскай расой да світанку засцерагае ад скураных хвароб і галаўнога болю, вылечвае «рожу» і хворыя вочы. А калі хадзіць басанож па такой расе, будзеш здаровым на працягу ўсяго года.

Старадаўняе павер'е распавядае, што раней, калі намачыць цадзілку ў купальскай расе, з яе лілося сапраўднае малако. Зразумела, што даўней з юраўскай і купальскай расой праводзіліся пэўныя магічныя практыкі. І, хутчэй за ўсё, ладзілі тыя абрады спецыяльна навучаныя жанчыны, якіх пазней сталі называць чараўніцамі і вядзьмаркамі. У сувязі з гэтым менавіта ім і сёння прыпісваюць шкодныя дзеянні. Так, лічылася, што на Юр'я або Купалле ведзьмы, каб павялічыць надоі сваіх кароў за кошт іншых, да ўзыходу сонца збіралі кавалкам палатна або ручніком расу на чужых палях і межах, а потым выціскалі яе і давалі піць



*Вядзьмарка варыць расу ў гаршчэчку*

сваёй жывёле. А калі ў каго-небудзь з вяскоўцаў не зарадзілася жыта, верылі, што ў гэтым вінавата таксама чараўніца, якая здолела ў купальскую ноч незаўважна абтрэсці расу з жытнёвага палетку.

Яшчэ лічылі, што чараўніцы выкарыстоўвалі расу каб пераадолець мяжу паміж тым і гэтым светам. Дзеля гэтага вядзьмаркі збіралі купальскую расу, варылі яе ў гаршчэчку на асінавых дровах, спажывалі, а потым атрымлівалі здольнасць лёгка падняцца ў паветра і паляцець на свой шабас на Лысую Гару.

## Глава 4

# ТАГАСВЕТ: ЯК УЛАДКАВАНЫ, ДУША, ЯЕ ШЛЯХ НА ТОЙ СВЕТ, НАЎІ

У аснове кожнай міфалогіі ляжыць перакананне, што існуюць два сусветы, якія судакранаюцца адзін з адным. Адзін з іх той, дзе жывем мы — людзі, і тагасвет — той свет, куды сыходзяць душы памерлых, дзе знаходзяцца міфалагічныя істоты.

Нібыта з прадстаўнікамі тагасвету чалавеку даводзілася мець справу кожны дзень. Іх можна зрабіць літасцівымі або прымусіць служыць на сябе. Гэтыя сілы не заўсёды жадаюць чалавеку ліха, але заўсёды небяспечныя ўжо таму, што належаць да свету памерлых. І хаця той свет нябачны для людзей у іх паўсядзённым жыцці, ён цесна звязаны са светам жывых, а ў пэўныя часы мяжа паміж сусветамі адкрываецца, і кожны чалавек з дапамогай магіі можа пабачыць душы, якія наведваюць у гэтае імгненне зямлю. Мяжа паміж сусветамі, як верылі, касуецца падчас сезонных раўнадзенстваў: увесну, улетку, увосень і ўзімку або падчас святкавання Сёмухі, Купалля, Уздзвіжання і Калядаў.

У беларусаў з архаічных часоў існавала паняцце душы — таямнічай субстанцыі, якая знаходзіцца ў сярэдзіне чалавека і забяспечвае яму жыццё. Пазней, пад уплывам хрысціянскіх поглядаў, уяўленне пра душу трохі памянялася, але яго аснову дагэтуль захавала народная традыцыя.

Людзі былі ўпэўненыя, што душы ненароджаных людзей захоўваюцца ў Бога, але дзе канкрэтна, невядома. Душу ў чалавека ўкладае Бог яшчэ ва ўлонні маці, і адразу пасля гэтага дзіцёнак пачынае варушыцца там. Калі новы чалавек атрымлівае душу, на небе запальваецца новая зорка. На працягу жыцця і росту чалавека расце і яго-ная душа.

Існавала меркаванне, што душа — двайнік чалавека пры ягоным жыцці. Пасля смерці душа пакідае цела ў выглядзе ветру, пары, дыму або матылька, птушкі, мухі. Таму, калі іх бачаць, яшчэ і цяпер кажуць: «*Вось нечыя душа лётае*». Пад выглядам мухі душа памерлага вылятае з рота чалавека падчас перадсмяротнай агоніі і з'яўляецца перад роднымі памерлага ўначы пасля пахавання. Таму доўгі час захоўваўся такі звычай, як начное пільнаванне душы пасля пахавання. Дзеля гэтага ў хаце памерлага збіраліся старыя жанчыны, ставілі на стол мёд, разведзены вадой і чакалі, калі душа памерлага ў выглядзе мухі прыляціць пачаставацца. Таму муху, якая кружляла над нябожчыкам, забаранялася забіваць ці адганяць. Чалавечай душой лічылі і тую муху, якая зімавала ў хаце. А бывала і наадварот, лічылі, што мухі — душы жывых людзей, і таму мух у хаце павінна зімаваць столькі, колькі людзей у сям'і. Што тычыцца ўяўленняў пра душу-вецер, то верылі: калі ў коміне скавыча вецер, то такім чынам душа памерлага родзіча нагадвае пра сябе і патрабуе памінання.

Часам душу ўяўлялі як бязгрэшнага і бесцялеснага дзіцёнка або маленькага чалавечка з празрыстым целам:

> «Душа — гэта маленькі чалавек. Калі чалавек памірае, то яна застаецца на зямлі і ходзіць, але людзям не паказваецца».



*Душа ненароджанага дзіцёнка (фотакалаж)*

Старажытныя беларусы ўяўлялі душу як самастойную жывую істоту, што знаходзіцца або ў чалавечым сэрцы, або ў грудзі, у жываце, пячонцы, крыві, горле, справа пад пахай (атаясамліваецца з важнымі для чалавечага жыцця органамі). На працягу жыцця душа харчуецца парай ад той ежы, якую спажывае чалавек. І калі душа жывога чалавека і пакідае ягонае цела, то толькі ў сне, таму людзям і сніцца, што яны вандруюць і трапляюць у незвычайныя месцы.

Верылі таксама, што калі чалавек звязаны з нячыстай сілай, то душа, пакідаючы яго ў сне, робіць featured рознае ліха. Так, цела вядзьмаркі застаецца нерухомым, покуль яе душа з'яўляецца перад людзьмі ў

розных абліччах і крадзе ў чужых кароў малако ці зоркі з неба. І калі ў гэты момант перавярнуць цела ведзьмы тварам да зямлі, то яе душа пасля начных вандраванняў не зможа патрапіць у сваю цялесную абалонку і будзе лётаць вакол зладзейкі ў выглядзе курыцы, гускі, пчалы, мухі. Адсюль, відаць, пайшло павер'е, што чараўнікі і вядзьмаркі маюць дзве душы, адну з якіх прадаюць Д'яблу.

Душа часта прымае выгляд птушкі, асабліва голуба або ластаўкі. Прычым душы добрых людзей з'яўляюцца ў выглядзе белых галубоў, а ліхія ператвараюцца ў чорных крукоў. Душы дзяцей ластаўкамі наведваюць сваіх бацькоў. Палешукі, калі бачылі ластаўку падчас вяселля, верылі, што гэта чыясьці душа з памерлай радні прыляцела паглядзець на маладых. Адсюль, відаць, бярэ пачатак звычай сыпаць зерне на магілах для птушак, асабліва ў першыя сорак дзён пасля пахавання.



*Душа ў выглядзе галубоў на магільным помніку*

Часта пасля пахавання на падвоканні або на стале спецыяльна рассыпалі муку ці попел, каб убачыць птушыныя сляды — сведчанне наведвання душы памерлага. Яшчэ беларусы для душ памерлых спецыяльна тапілі лазню, каб тыя ў ёй мыліся. Там для іх пакідалі ручнікі і абавязкова пасыпалі падлогу попелам. Калі раніцай на попеле знаходзілі сляды птушак, верылі, што продкі сапраўды прыходзілі мыцца. Такі звычай захоўваўся яшчэ ў пачатку XX ст.

Дарэчы, у беларускай язычніцкай традыцыі душы памерлых месцамі называлі *наўі* або *наўцы*. Так, «Аповесць мінулых гадоў» пад 1092 годам паведамляе пра падзеі ў Полацку, якія, паводле летапісца, сталі прадвесцем шматлікіх бед. У «Аповесці...» гаворыцца, што палачане былі напалоханы вялікай колькасцю наўяў, якія з моцным тупатам і грукатам скакалі па вуліцах горада на конях. Але ўбачыць іх было немагчыма, заставаліся толькі сляды ад коней. Жыхароў Полацка, якія выходзілі падзівіцца на іх, наўі надзялялі невядомымі язвамі, ад якіх тыя неўзабаве паміралі. Летапіс сведчыць, што пасля

гэтых падзей нават нарадзілася прымаўка: «*Наўі пабіваюць палачанаў*». Няма сумневу, што ў летапісным апавяданні захавалася інфармацыя пра нейкую страшэнную тагачасную эпідэмію, якая потым была персаніфіцыравана мясцовымі людзьмі як нашэсце наўяў і набыла міфалагічныя абрысы.



*Нашэсце наўяў на Полацк (фрагмент мініяцюры з Радзівілаўскага летапісу, XV – пач. XVI стст.)*

У наўях бачылі душы недобразычлівых людзей або тых, якія памерлі не сваёй або небяспечнай смерцю. Лічылі, што такія душы ходзяць пасля смерці ў сваім целе і высмоктваюць кроў з людзей накшталт вупыра ці вампіра. Але больш верагодна, што наўямі называлі душы ўсіх памерлых і нават ушаноўвалі іх. Пра гэта гаворыць і ўзгаданы вышэй звычай тапіць для іх лазні, і тое, што ў нашых продкаў захавалася нават спецыяльная свята, якое прысвячалася наўям. Яго і цяпер называюць Наўскі Вялікдзень, або Наўская Пасха, Нябожчыцкі Вялікдзень і спраўляюць у чацвер пасля Вялікадня або ў аўторак на паслявялікодным тыдні.



*Вупыр (мастак Б. Забірохін)*

Народ наш верыў, што душы людзей, памерлых маладымі, прарастаюць на могілках дрэвамі, кветкамі, травамі... Вось чаму ні ў якім разе нельга рубіць на магілах дрэвы і зрываць кветкі — там адпачываюць душы памерлых. А яшчэ лічылі, што

маладыя жанчыны пасля смерці робяцца таполямі, асабліва пашыраны баладны сюжэт, калі такая жанчына з'яўляецца нялюбай нявесткай і праз праклён ці заклятце свякрухі ператвараецца ў гэтае дрэва:

*«Зрабіся ты ў полі, у полі тапалёю*
*Тонкаю, высокай, караням глубокай.*
*Ехаў сын із лесу, ён тое ўвідзеў,*
*Што на іхнім полі вырасла тапопя.*
*— Ой, мамачка, мамка, што-та за навіна,*
*Што на нашым полі вырасла тапопя?*
*— Бяры, сын, сякеру, та й зрубі тапопю,*
*Штоб корні не пускала, голле не трасла.*
*Узяў сынок тапора да й паехаў у поля.*
*Секануў першы раз — ажно цело бело,*
*Другі раз ударыў — і кроў закіпела,*
*Трэці замахнуўся — жана атвячае:*
*— Ой, мужу мой, мужу, што ж ты, мужу, робіш?*
*Не тапопю рубіш — сваю жану губіш,*
*А твая ж маці мяне ізрабіла.*
*Мяне ізрабіла ў полі тапалінай.*
*І цябе паслала ізрубіць тапопю».*

У скрыпучым дрэве бачылі пакутніцкую душу, і калі яго зрубіць, душа будзе вымушана шукаць сабе другі прыстанак. А калі прыснуць пад такім дрэвам, можна ўбачыць у сне таго небараку, чыя душа пакутуе ў дрэве. Таксама думалі, калі ствапіны дрэў пераплятаюцца адзін з адным, то на гэтым месцы былі загублены душы закаханых:

«Па дарозе ў Нясвіж растуць, абняўшыся, два дрэвы — дуб і сасна. Кажуць, было гэта яшчэ за князем Радзівілам. У князя была прыгожая дачка, і пакахала яна пастуха. І пастух яе таксама кахаў. Але пажаніцца яны не маглі, князь і слухаць не хацеў аб гэтым. І вось яны вырашылі ўцячы з замка. Даведаўшыся аб гэтым, князь разгневаўся, кіламетраў за шэсць дагнаў іх са сваёю світаю. Не пашкадаваў князь са злосці ні дачкі, ні пастуха: там жа пакончыў іх жыццё. На тым месцы вырас дуб і сасна, якія і зараз растуць, навекі абняўшыся».

Народ часта распавядае паданні пра дудачкі і дуды, зробленыя з дрэва, што вырасла на магіле забітага і сваёй мелодыяй паведамляе пра забойцу.

Смерць чалавека — гэта пераход душы з гэтага свету, дзе яна *«гасцявала»*, у тагасвет — *«да хаты»*, «на вечнае жыццё». Нездарма і

труну ў народзе называюць *«дамавінай»*. У палескім пахавальным плачы дачка звяртаецца да памерлай маці:

> «Ой, мая мамачка... Ой куды ж Вы сабраліся? У такую хатачку цёмную ды нязграбную, дзе няма ні аконца, не відно сонца!».



*Дуб і сасна, якія зрасліся (Нясвіж)*

Паводле старажытных вераванняў, чалавек і на тым свеце працягваў весці сваё звычайнае жыццё, захоўваў свае звычкі. Таму памерламу ў труну клалі тыя рэчы, якія, на погляд сваякоў, яму спатрэбяцца пасля смерці. Археалагічныя даследаванні паказваюць, што такі звычай існаваў у нашых продкаў з пракаветных часоў. Пры раскопках разам з косткамі памерлага знаходзяць ягоную зброю, гаршчэчкі з ежай, рэшткі каня і другіх жывёл.

Калі хавалі людзей высакародных, надзеленых уладай, разам з імі на той свет ішлі іх слугі. Вось як Ян Чачот паэтычна апісаў пахаванне легендарнага ліцвінскага князя Свінтарога, натхніўшыся матэрыялам з «Хронікі...» Мацея Стрыйкоўскага і «Гісторыі літоўскага народа» Тэадора Нарбута:

*«Бы ў паход яго прыбралі —*
*Шабля, лук, кап'ё пры боку.*
*Выжлаў двух, хартоў звязалі,*
*З імі сокала звысоку.*
*Потым ястраба з-пад неба*
*І каня з сядлом — як трэба.*
*Гэта ўсё на стос — вам дзіва?*
*— Узвялі. З слугой адданым!*
*Падняслі агонь імкліва,*
*Міг — і ўсё ў віры агняным!*
*Кінулі ў агонь — да высяў —*
*Кіпцюры мядзведзеў, рысяў.*

*Меркавалі: так жа будзе,*
*Як на гэтым, на тым свеце.*
*Так жа там ваююць людзі,*
*Так палююць, ладзяць сеці.*
*А караскацца на неба*
*Па крутых гарах там трэба...»*

Прыведзены кавалак верша паказвае абрад пахавання праз спальванне, але ён мала чым адрозніваўся ад абраду закопвання ў зямлю — тыя ж звычаі і ўяўленні пра той свет.

У магілу клалі і грошы, таму што былі ўпэўнены, што яны спатрэбяцца памерламу каб аплаціць пераправу праз раку ці мора на шляху ў іншасвет. Вера ў тое, што душа на той свет перапраўляецца праз водную перашкоду, знайшла адбітак у старажытнарускім пахавальным абрадзе: памерлага неслі да места пахавання ў ладдзі, потым спальвалі яе на пахавальным вогнішчы, або падпаленую лодку пускалі па вадзе. У беларускай міфалогіі фігуруюць ладдзя смерці і ладдзя ўваскрэсення. Матыў пахавальнай ладдзі захаваўся ў загадцы: «*Воз без калёс, дарога без пяску, свішчом паганяе, на смерць паглядае*».

Да таго ж рэкі і азёры ў вераваннях продкаў заўсёды выступалі як мяжа паміж гэтым і тым светам або як дарога туды. Вельмі часта, калі паселішча знаходзілася на адным беразе ракі, могілкі ладзіліся на другім беразе або, калі гэта было возера, людзей хавалі на выспе пасярод вадаёма. Такое светаўспрыманне выявілася ў звычцы класці праз невялікую рэчку ці балаціну кладку-мосцік з выразаным на ёй следам ступні памерлай жанчыны пасля яе пахавання. Тлумачылі гэта тым, што такім чынам нябожчыцы будзе лягчэй знайсці дарогу на той свет.

Каб палепшыць паміраючаму чалавеку пераход у іншасвет, вызваліць яму дарогу, у хаце адчынялі ўсе вокны і дзверы, засланкі ў коміне, здымалі абручы з бочак, адкрывалі ўсялякія накрыўкі. З вокнаў вывешвалі ручнікі, па якім душа памерлага магла сысці з хаты, а затым пры жаданні такім чынам вярнуцца назад. Апроч ручніка на падвоканне ставілі шклянку з вадой, каб душа памерлага магла ўмыцца, высушыцца і чыстай з'явіцца на той свет. Калі паміраў чараўнік або знахар, падчас ягонай агоніі здымалі частку даха або рабілі падкоп пад парогам. Лічылі, што грэшная душа можа выйсці толькі праз такія адтуліны.

На думку некаторых навукоўцаў, раней такім чынам — праз вакно ці спецыяльны пралом у сцяне — выносілі ўсіх нябожчыкаў. У му-

раваных сценах шматлікіх сярэднявечных гарадоў праломвалі нават спецыяльныя вароты, якія выкарыстоўваліся выключна для вынасу цел памерлых. Згодна з летапісам, калі памёр вялікі князь кіеўскі Уладзімір (15 ліпеня 1015 года), у сцяне, што злучала дзве клеці, зрабілі пралом і завернутае ў дыван цела князя на вяроўках спусцілі долу, паклалі ў сані і павезлі ў царкву. Так рабілі для таго, каб памерлы не змог знайсці зваротнай дарогі і больш не вяртаўся да жывых. Цікава, што ў летапісу прыгадваюцца сані, у той час, калі дзейства адбывалася ўлетку. А тлумачыцца гэта тым, што амаль ва ўсіх усходніх славян некалі існаваў старажытны звычай везці нябожчыка на могілкі ў санях, незалежна ад пары года. Сані — адна з першых павозак, якія выкарыстоўваліся не толькі для бытавых патрэб, але і ў асаблівых сакральных выпадках, у тым ліку і пахаванні.

Пра тое, дзе знаходзіцца той свет, існавалі розныя ўяўленні. Па адным з іх, ён месціцца на зямлі, часцей за ўсё на яе ўскраіне і аддзелены ад свету жывых людзей якімі-небудзь натуральнымі перашкодамі: непраходнымі гарамі, глыбокімі ярамі або рэкамі.



*Узыходжанне душы памерлага па шкляной гары з дапамогай лапы мядзведзя (мастак А. Каждайліс)*

Другія верылі, што на той свет трэба караскацца па крутой і непрыступнай шкляной або крышталёвай гары, гладкай, як яйка. Прасцей гэта зрабіць таму, хто пры жыцці не выкідваў астрыжаныя пазногці, а складаў іх у спецыяльны мех. Пасля смерці астрыжаныя пазногці прырастуць, і чалавек лёгка пераадолее гару. Той жа, хто пры жыцці выкідваў пазногці, не зможа гэтага зрабіць і будзе вымушаны вярнуцца на зямлю, каб адшукаць тыя абстрыжаныя пазногці. Часам, каб дапамагчы памерламу, у труну клалі яшчэ і лапу мядзведзя або рысі. Узгадаем прыведзены вышэй верш Яна Чачота, дзе ў пахавальнае вогнішча Свінтарога былі кінуты кіпцюры менавіта гэтых жывёл, што, відаць, і дапамагло ўзняцца яму на крутую гару на Божы суд.

Верылі, што разам з пазногцямі трэба ўсё сваё жыццё збіраць і астрыжаныя валасы. Таму што ў тагасвет чалавек павінен быў вярнуцца «цэлым», з усім тым, што яму было дадзена на ўсё жыццё. А

калі якая-небудзь частка ягонага цела будзе адсутнічаць, яго прымусяць вярнуцца назад на пошукі гэтай часткі.

Дарога на той свет можа быць накіравана ўверх або ўніз. Уверх — гэта карасканне па шкляной або жалезнай гары. Вертыкальная дарога ўяўлялася і ў выглядзе прыступак, па якім душа паднімаецца на працягу сарака дзён пасля смерці. Яе сімвалізуе пшанічная «лесвіца», якую выпякаюць на саракавіны па памерламу. Апроч гэтага патрапіць уверх можна і пры дапамозе дрэва або сцябла расліны. Яны лічыліся часовым прыстанкам душы — да канчатковага пахавання цела. Птушка на вяршаліне дрэва сімвалізавала душу, што накіроўваецца ў іншасвет. Месцамі нават вешалі на могілкавыя дрэвы вяроўкі, каб дапамагчы душы падняцца на неба. Рэшткі гэтых вераванняў можна знайсці ў некаторых звычаях і абрадах, да прыкладу, прыносіць у дом зялёныя галінкі на Сёмуху ці Тройцу, каб душам памерлых, якія прыйшлі наведаць сваіх родных, было дзе прытуліцца.

Як паведамлялася вышэй, згодна з самымі старадаўнімі ўяўленнямі, свет падзелены на дзве часткі — свет жывых і свет памерлых. Гэта не проста два розных светы — яны супрацьстаяць адзін аднаму, як супрацьстаяць жыццё і смерць, святло і цемень, дзень і ноч, космас і хаос, белае і чорнае, правае і левае. Свет жывых людзей заўсёды звязаны з правым бокам, усходам або поўднем, іншымі словамі — з сонечнымі бакамі. Свет жа памерлых, наадварот, звязаны з левым бокам і месціцца на захадзе або поўначы — там, дзе сонца хаваецца або дзе яно зусім не бывае. Яшчэ свет жывых — гэта свет парадку, які падзяляе жыццё на роўныя перыяды, якія час ад часу чаргуюцца: хвіліны, гадзіны, суткі, гады, стагоддзі. У іншасвеце няма ні часу, ні календара, ні святла, ні жыцця.

У тых уяўленнях не было яшчэ ні пекла, ні раю, ні чыстца. Яны з'явіліся пазней, у часы хрысціянства, разам з разуменнем граху і грэшных душ. Амаль да XIX ст. існавала вераванне, што да Страшнага суда ўсе душы знаходзяцца ў адным цёмным месцы, недзе паміж пеклам і раем. Яны там не пакутуюць, але не бачаць ні святла, ні радасцяў. Падобным чынам старажытныя грэкі ўяўлялі сабе краіну сваіх памерлых — Аід.

А слова «грэх» хаця і існавала ў язычніцкія часы, але мела іншы сэнс — крывізны, няправільнасці, адыходу ад нормы. З язычніцкага пункту гледжання, грэшны — гэта той, хто няправільна сябе паводзіць, жыве не так, як след. А парушэнні традыцыйных абрадавых і побытавых правіл паводзін вядуць да парушэння гармоніі паміж чалавекам і сіламі прыроды. Гэта пагражае няшчасцем не толькі самому парушальніку, але і грамадству, дзе ён жыве. Так, з пункту гле-

джання язычніка, смерць у выніку самагубства і няшчаснага выпадку — гэта аднолькава «няправільная» смерць, таму што ў абодвух выпадках чалавек не пражыў адпушчаны яму тэрмін жыцця. Як вынік усяго гэтага — ён не можа перайсці ў тагасвет і робіцца «закладным» нябожчыкам, які вельмі і вельмі небяспечны для жывых.

Адно з самых старых уяўленняў пра тагасвет захавалася ў павер'ях пра вырай — міфічнай падземнай або заморскай краіне, куды сыходзяць пасля смерці душы памерлых. Шлях туды таксама пралягае праз ваду: раку, возера, балота... Увосень у вырай злятаюць птушкі, усялякія казуркі і чамяра, сыходзяць змеі, а ўвесну ўсе яны вяртаюцца адтуль.

У беларускім фальклоры пашыраны матыў *«замыкання»* і *«адмыкання»* выраю Богам або ягонымі намеснікамі: пчалой, жаваранкам, ластаўкай. Замыканне выраю на зіму адбываецца 27 верасня на Уздзвіжанне (Узвіжанне, Здзвіжанне) і супадае з восеньскім раўна-



*Гусіная Дарога на той свет (мастак Т. Мяснікова)*

дзенствам, калі птушкі і змеі займаюць сваё месца ў выраі. Адмыканне выраю прыпадае на Саракі і Дабравест і звязана з вясновым раўнадзенствам і прылётам птушак, выпаўзаннем змей. Прычым адрознівалі птушыны і змяіны вырай. Першы знаходзіцца ў кроне Сусветнага дрэва, другі — у ягоных каранях. Згодна з іншымі вераваннямі, змяіны вырай — вялікая яміна, якая знаходзіцца ў лесе і куды на зіму спаўзаюцца змеі, якія пераплятаюцца там у кубло. У гэты дзень забаранялася хадзіць у лес, каб разам са змеямі не патрапіць у змяіны вырай. Калі ўсё ж нехта трапляў у гэтую яміну, то быў вымушаны прымусам правесці там час да вясны ці нават цэлы год. Вось што распавядае палеская легенда:

> «Неяк адзін хлопец на Узвіжанне пайшоў у лес па грыбы. А гэта такое свята, калі нельга хадзіць у лес. І не заўважыў, як патрапіў у глыбокую яміну ці нару, куды спаўзаюцца ўсе вужы. Ён і сам зрабіўся вялікім і тлустым вужам, яго нават прызначылі галоўным над усімі астатнімі вужамі, а карзінка ягоная з грыбамі засталася каля яміны. Так ён і пражыў там да вясны, пакуль да яго зноў не спаўзліся ўсе вужы і не прапанавалі выйсці вонкі. Ён вылез на зямлю і зноў зрабіўся чалавекам, узяў сваю карзіну з грыбамі, якія засталіся цэлымі і непашкоджанымі і накіраваўся да хаты. Там яго з радасцю сустрэлі ягоныя родныя і сталі пытацца, дзе ён правёў зіму. Ён і распавёў ім, як зімаваў у яміне разам з вужамі і як яго прызначылі начальнікам, і што тая яміна была падобна на пакой, дзе стаяў стол і гарэла лямпа, як у людзей».

У гэтым паданні захавалася старадаўняе ўяўленне пра паходжанне людзей ад татэма-змяі, а таксама пра існаванне так званага змяінага цара, пад кіраўніцтвам якога змеі сыходзяць на зіму ў вырай і вяртаюцца адтуль увесну. Дарэчы, чароды птушак і статкі змей таксама ў народзе могуць называцца выраем. Гэта непарыўна звязана з уяўленнямі пра тое, што душы памерлых ператвараюцца ў птушак і змей. Так, у беларускім пахавальным плачу па памерламу гаворыцца: «*Усе птушачкі ў вырай паляцелі, і ты следам за імі*».

А дарога, па якой душы памерлых трапляюць у вырай у выглядзе птушак, насіла ў нашых продкаў назву «Птушыны шлях». Яшчэ яе называлі *Гусіна дарога*, або *Вялікі слуп*. Верылі, што птушыны шлях зрабіў на небе з зорак сам Бог, каб птушкі (гусі) ведалі дарогу ў вырай, які дастаўся ім пасля таго, як людзі сталі грэшнымі і ўжо не маглі патрапіць туды.

# Глава 5

## СУСВЕТНАЕ ДРЭВА ЯК СІМВАЛ ТРОХ ПРАСТОР: ВЕРХНЯЙ, СЯРЭДНЯЙ І НІЖНЯЙ

Уяўленне пра касмічнае — Сусветнае — дрэва прысутнічае амаль ва ўсіх старажытных культурах. Падобнае дрэва знаходзіцца ля вытокаў усіх вядомых цывілізацый і насамрэч з'яўляецца адным са старажытнейшых сімвалаў, які бярэ свой пачатак ад уяўлення пра архетып цэнтра, арганізацыі сусветнай прасторы, яе стабільнасці. Іншымі словамі, гэта сімвал сусветнай восі, якая працінае ўсе слаі светабудовы і складае ягонае сэрца.

Гэтая шматпавярховая сістэма ўключае ў сябе некалькі самастойных сусветаў, аддзеленых адзін ад аднаго рознымі перашкодамі. У той жа час сусветы не цалкам ізаляваны, яны кантактуюць паміж сабою. Так, з зямлі можна патрапіць на неба або ў апраметную. Робіцца гэта пры дапамозе так званай сусветнай восі, што з'яўляецца галоўным апорным слупам, які замацоўвае аграмадны космас. Натуральна, што ў розных міфалогіях яна мае розную форму. Аднак у народнай фантазіі самы папулярны яе вобраз — Сусветнае дрэва або Сусветная гара. У некаторых выпадках яны ўзаемазамяняльныя. У беларусаў культ такога дрэва заўсёды быў часткай агульнага абагаўлення прыроды.



*Збручскі ідал, дзе паказаны верхні, сярэдні і ніжні ўзроўні светабудовы (Галіцыя, Украіна)*

Вяршаліна Сусветнага дрэва сягае нябёсаў, камель і галіны арганізуюць зямную прастору і злучаюць неба з падзем'ем, дзе знаходзяцца карані гэтага дрэва. Такое дрэва адным з першых з'яўляецца на кавалку зямлі, здабытым са дна першаснага акіяну. Пад ягонай

кронай робяць свае першыя крокі міфічныя першапродкі людзей. І натуральна, што пад Сусветным дрэвам, у самым цэнтры Сусвету, нараджаюцца багі, героі і валадары.

Рэшткі падобных уяўленняў захаваліся ў беларускіх прымхах і забабонах, паданнях і легендах. Адна з іх распавядае пра паходжанне знакамітага роду Радзівілаў, дзе гаворыцца, як бяздзетны князь Нарымунт у час палявання знайшоў у гняздзе чароўнага дрэва маленькага хлопчыка. Немаўлятку князь палічыў за падарунак бога Перуна і ўсынавіў. Пазней з хлопчыка вырас знакаміты жрэц і вяшчун, празваны Ліздзейка (ад *«лідза»* — гняздо). А ад слова *«радзіць»* Ліздзейку дадалася яшчэ адна мянушка: Радзівіл.

Апроч гэтага ў міфах і гара, і дрэва заўсёды выступаюць разам з жывёламі. Прычым каля каранёў дрэва або падэшвы гары, як правіла, змяшчаецца хтанічная істота, якая сімвалізуе сабой зямлю, вільгаць, цемру, злыя сілы. Часцей за ўсё гэта змяя або жаба, або чарапаха, часам рыба, калі дрэва ці гара ўзвышаюцца сярод вады.

На вяршаліне восі Сусвету міфы распавядаюць пра птушак, часцей за ўсё арла ці ворана, якія асацыіруюцца з небам, сонцам, дабром. Зразумела, што нябесныя птушкі і хтанічныя жывёлы сімвалізуюць у міфах розныя касмічныя ўзроўні Сусвету, ягоныя полюсы — верх і ніз, дабро і ліха, жыццё і смерць. Таму яны часта малююцца варожымі адзін да аднаго. З беларускага фальклору вядома мноства сюжэтаў пра барацьбу, да прыкладу, арла, які жыве на вершаліне Сусветнага дрэва ці Сусветнай гары і «падкалоднага» змея, які хаваецца ў каранях дрэва ці ў пячоры пад гарой. Часта птушка і змяя сімвалізуюць розных бостваў, адпаведна верхні нябесны бог Пярун выступае ў вобразе птушкі, часцей арла, а ніжні, бог падземнага царства Вялес — змея ці змяі.

Да прыкладу, вось замова ад змяінага яду:

> «На сінім Буяне, на сінім акіяне стаіць кіт-дрэва на ста карнях, на ста вярхах, на ста какатках. Там жыве сама гадзіна Кацярына. Сабірай свой яд, вынімай свой гад із краснай краві, із жоўтага мяса, із скаціны серай. Слухайце, гадзюкі: махавая, гнаявая, падтынная, межавая, балотная, мінутная, часовая, на хвасце стаячая і харошы муж — бязврэдны ўж. А не будзеш, гад, сабіраць свой яд, будзе цябе Пярун маланнёй паліць і громам біць».

У старажытных міфах беларусаў на правым і левым баку ад Сусветнага дрэва месцяцца жывёлы сярэдняга, або зямнога, узроўню. У гэтай ролі выступаюць конь, вавёрка, мядзведзь ці другія звяры. Іх галоўная функцыя —сувязь паміж істотамі верхняга і ніжняга ўз-

роўняў і аб'яднанне тым самым Сусвету ў адзінае цэлае. Атрымлівaецца, што ідэальны Космас ва ўяўленнях продкаў сімвалізаваўся трыма жывымі істотамі: птушкай, рэптыліяй і жывёлай сярэдняга свету. Пазней у беларускіх міфах ролю пасрэднікаў паміж сусветамі сталі выконваць самі людзі, дакладней, людзі звышнатуральных здольнасцяў: спачатку язычніцкія святары, потым вясковыя чараўнікі і ведзьмакі, якія падчас пэўных абрадаў быццам пераўвасабляліся ў жывёл сярэдняга свету.

Адсюль, відаць, пайшло такое павер'е, што па цудадзейным дрэве можна патрапіць у іншыя сусветы. Больш за тое, па ім нібыта апус-



*Вобраз Дрэва Жыцця, хтанічная жывёла ўнізе (рэканструкцыя)*

каецца і падымаецца сам Бог і нават душа памерлага, якая падчас гэтага працэсу ператвараецца ў таго ці іншага звера. Узгадаем «Слова пра паход Ігараў», дзе распавядаецца пра міфічнага народнага героя — Баяна, які валодае чароўнай здольнасцю ператварацца ў разнастайных жывёл і ў такім выглядзе вандраваць па нейкім фантастычным дрэве. Дарэчы, у гэтым творы Баян паслядоўна ператвараецца ў трох жывёл: арла, вавёрку («мысь») і ваўка. І гэта невыпадкова, бо лічба тры цесна звязана з вобразам Сусветнага дрэва і адпавядае траістасці самога міфічнага сусвету. Так, арол суадносіцца з небам, вавёрка — з сярэднім узроўнем, а воўк, як хтанічная жывёла, належыць дольнаму свету.

Да Сусветнага дрэва беларусаў вельмі блізкі касмічны ясень Ігдрасіль з скандынаўскай міфалогіі. Каранямі і шатамі гэтае дрэва абдымае ўвесь свет, менавіта на ім трымаюцца неба, аблокі і зоркі. Там збіраюцца на раду багі і багіні, каб упарадкаваць свет. Ля самых каранёў дрэва ляжыць касмічны змей Нідхёг, на вяршаліне сядзіць мудры арол, а па камлі бегае прарочая вавёрка. Тут добра бачна паралель з дрэвам у «Слове пра паход Ігараў».

Яскравае ўяўленне пра язычніцкі сусвет дае «Збручскі ідал», знойдзены ў Галіцыі. Гэта чатырохгранная каменная скульптура арыентавана па баках свету. Кожны яе бок падзелены на тры ўзроўні — нябесны, зямны і падземны. На нябесным узроўні выявы бостваў, на зямным — два мужчыны і дзве жанчыны, як і боствы, а ў самым нізе — нейкая хтанічная істота, якая трымае на сябе зямлю.

У старажытных беларусаў у якасці Сусветнага выступалі разнастайныя дрэвы. Адным з такіх сакральных дрэў быў дуб, верхняя частка якога належала Богу, святлу, дабрыні і ведам, а пад каранямі знаходзіўся ўваход у іншасвет. Таму ў шмат якіх раёнах Беларусі да культавых дубоў прыходзілі на Радаўніцу, ахвяравалі ім памінальныя стравы, на галінках развешвалі ручнікі і стужкі. Невыпадкова і тое, што многія курганныя могільнікі ў нас часта месцяцца менавіта ва ўрочышчах пад назвамі *Дубкі*, *Дубняк*, *Дубішча*, *Дубавіца*, *Дубовы Грудок* і іншыя. Згодна з міфалагічнымі ўяўленнямі, дубы існавалі яшчэ да нараджэння Сусвета. Пра гэта спяваецца ў каляднай песні:

*«А на тым моры ды два дубочкі.*
*На тых дубочках два галубочкі...*
*Сталі радзіці, як свет сатварыці...».*

У беларускіх казках часта сустракаецца эпізод, калі па дрэве, часцей па дубе, герой трапляе ў нябеснае царства. Тое самае адбываецца, паводле народных павер'яў, з нябожчыкамі, душы якіх меліся

пасля смерці падняцца па міфічным дубе на неба да сваіх продкаў. Як у беларускай прыпеўцы:

*«Як гуляла, дык гуляла,*
*Дык гуляла вельмі,*
*Зачыніла міленькага*
*Дубовымі дзвермі».*

Нездарма ў нашай мове захаваліся фразеалагізмы і словы кшталту *глядзець у дуб*, *даць дуба*, *адубець* і г.д. Так у народзе казалі пра безнадзейна хворых, якія меліся хутка памерці.



*Багі і ўладары*
*на галінах Сусветнага дрэва*
*(сярэднявечны малюнак)*

Згодна з фальклорнымі творамі продкаў, у прыватнасці, з прыведзенай вышэй замове ад змяінага яду, у цэнтры Сусветнага акіяну месціцца востраў Буян, дзе таксама ў цэнтры знаходзіцца камень Алатыр (Латыр) або расце сакральны Дуб. Ягоную вершаліну ўпрыгожвае прарочая птушка, а пад дрэвам месціцца змей — уладар падземнага свету. Прыкладам, каб пазбавіць свойскую жывёліну ад такой хваробы, як чэмер, прамаўлялі:

«Ідзе мора, сярод мора стаіць востраў, на тым востраві стаіць дуб, на тым дубі сядзіць воран — медзяныя крылля, сярэбраная дзюбка, залатыя кокці. Ён к скаціне прылятая, садзіцца на грыву, чэмер выбірая, з грыўку ў спінку, з спінкі ў хвосцік, каб быў конік просцік».

Або: «На моры на сінім стаяў дуб дубаваты. Пад тым дубам ляжаў гад гадаваты. Гад-гадзіца, гадавая царыца, я вас усіх знаю, усіх на імя называю... і ўсім вам яд замаўляю».



*Стылістычная выява Сусветнага дрэва. Вышыўка*



*Стылістычная выява Сусветнага дрэва. Аплікацыя*

Як Сусветнае дрэва ў беларускім фальклоры часта ўспамінаецца і явар. З ім нават звязваецца станаўленне свету ў той час, калі не было яшчэ ні неба, ні зямлі, а толькі шырокае мора, дзе і з'явіўся «явар зялёны». У валачобных песнях явар таксама выступае цэнтрам Сусвету ў закрытай прасторы аднаго ідэальнага і шчаслівага гаспадара:

*«...Ой, чый жа той двор,*
*што зялезны тын,*
*Што зялезны тын, медзяныя варата,*
*Падвароцейка пазалочанае?*
*Ой, на том дварэ да стаіць явор.*
*Ой, на том явары да сядзіць сакол.*
*Па двару ходзя молад Якаўка...».*

З часам вобраз Сусветнага дрэва ўскладніўся і ўзнікла ўяўленне, што апроч зямнога Сусветнага дрэва існуе яшчэ і нябеснае, карані якога знаходзяцца ў нябёсах, а макаўка звешваецца да зямлі. Пра такое сакральнае дрэва гаворыцца ў старай замове, дзе згадваецца чарадзейная бяроза, якая расце *«на моры-акіяне ўверх каранямі»*. Адсюль і перавернутае ўспрыняцце выраю, які быццам ляжыць пад каранямі Сусветнага дрэва. Згодна з іншымі павер'ямі, дрэва — гэта тая дарога, па якой увосень змеі сыходзяць у міфічную краіну — вырай.

Апроч звязвання сусветаў у адно цэлае, важнай функцыяй Сусветнага дрэва было тое, што яно ў канцэнтраванай форме ўвасобіла ў сабе ідэю ўрадлівасці. А ў выніку

— невычарпальную жыццёвую энергію, вечнае абнаўленне і адраджэнне. Для ўдалага ўраджаю збожжа, багатай здабычы дзічыны, паспяховай гадоўлі свойскай жывёлы чалавек заўсёды прасіў у багоў дапамогі.

Усё гэта ў дастатку было пад Сусветным дрэвам. Лічылі, што там б'юць жыватворныя крыніцы, якія прыносяць сілу і бессмяротнасць, буяюць і выспяваюць разнастайныя расліны і плады, мірна пасвіцца ўсялякая жывёліна. Прыклад такога незвычайнага дрэва ў каляндарна-абрадавых песнях — сасна, якая там таксама мае трох'ярусную структуру: корань, сярэдзіну (ствол) і верхавіну. Прычым кожнаму з ярусаў адпавядаюць пэўныя даброты:

*«А з гэтае сосны*
*Было б тры ўгоды,*
*У коране сосны*
*Ды густое жыта.*
*У сярэдзіне сосны*
*Ды ярыя пчолы.*
*У вярхушках сасны*
*Ды звонкія гуслі».*

Незвычайны вобраз Сусветнага дрэва сустракаецца не толькі ў замовах, каляндарна-абрадавых песнях, але і ў будаўнічых абрадах. Да прыкладу, калі пачыналі ўзводзіць новую хату, у яе будучым цэнтры ставілі невялікае дрэўца, рабілі застолле, замовамі і ахвяраваннямі ўшаноўвалі яго і толькі потым працягвалі будаўніцтва. Пазней гэты абрадператварыўся ў звычай ставіць у доме калядную елку. Прыклады Сусветнага дрэва ёсць на беларускіх вышыўках, дзе яно мае схематычную выяву.

Як бачым, уся касмічная светабудова ўяўлялася нашым продкам як адзіны цэласны арганізм, нягледзячы на яе разнастайныя, а часам і палярныя якасці.

# Раздзел II

# ПАГАНСКІЯ БОСТВЫ, МІФІЧНЫЯ ПЕРШАНАСЕЛЬНІКІ І ГЕРОІ

## Глава 1

## МУЖЧЫНСКІЯ БОСТВЫ: БОГ, СВЕТАВІТ, ТРЫГЛАЎ, СВАРОГ, ДАЖБОГ, ПЯРУН, ЯРЫЛА, ВЯЛЕС

Язычніцтва — гэта шматбожжа. Старажытнаму чалавеку было патрэбна, каб усе віды яго дзейнасці — гаспадарчая, вайсковая, сямейная, грамадская — знаходзіліся пад апякунствам вышэйшых сіл.

Першыя пісьмовыя звесткі пра славян (VI ст.) сведчаць пра існаванне шматузроўневай рэлігійнай сістэмы, дзе боствы валодалі найвялікшай сілай і ўладай. За кожным боствам замацоўваліся пэўныя функцыі — як агульныя, так і адмысловыя. Адны кіравалі прыроднымі з'явамі, другія апекаваліся гаспадарчай дзейнасцю людзей, трэція дапамагалі ваяваць, пад уладай чацвёртых былі грамадскія адносіны. Ад волі бостваў залежалі жыццё і дабрабыт чалавека. Таму багам ставілі драўляныя і каменныя ідалы («куміры»), іх ушаноўвалі, ім прыносілі ахвяры.

Яшчэ ў канцы XIX ст. некаторыя навукоўцы выказвалі думку, што славяне сваё вярхоўнае бства, якое лічылі адначасова і богам неба, называлі проста ***Бог***. Ён быў вышэй за Перуна, але пад уладу апошняга аддаў зямны свет. Паводле народнай традыцыі, Бог з'яўляецца ў выглядзе сівога барадатага старога, які жыве на небе і часам вандруе па зямлі адзін або ў суправаджэнні святых — Міколы, Пётры... Падчас свайго вандравання Бог засцерагае людзей ад бяды, павучае іх, здзяйсняе цуды і прароцтвы, але можа і караць за п'янства, пых-

лівасць, скнарлівасць, нядобразычлівасць і г.д. Тут можна ўзгадаць паданні пра ўзнікненне культавых азёр і камянёў на тэрыторыі Беларусі, дзе галоўны персанаж — гэтае самае вярхоўнае боства.

Дарэчы, слова «бог» паходзіць ад індаіранскага *bhaga*, у першасным значэнні — «ўдача», «доля». Да таго ж ёсць падставы лічыць, што для азначэння вярхоўнага боства першапачаткова ўжывалася імя ад індаеўрапейскага *div* («свяціць, ззяць»). У старажытнаіндыйскай міфалогіі быў бог Дзьяўс (Dyaus), а ў літоўцаў і латышоў самым старажытным і галоўным з багоў быў Дзіевас (Dievas) — бацька багоў, які азначаў светлае дзённае неба і сонца.



*Выява вярхоўнага Бога*

Акрамя гэтых багоў, вярхоўным боствам неба, увасабленнем сонца ў некаторых рэгіёнах Беларусі лічыўся ***Светавіт***. Але найбольш поўныя звесткі пра гэтага бога захаваліся ў прыбалтыйскіх славян, дзе ён быў галоўным богам іх пантэону, і свяцілішча якога знаходзілася на востраве Руген у горадзе Аркона. Цяпер гэта Нямеччына. Храм стаяў на чатырох слупах, а ў сярэдзіне знаходзілася скульптурная выява Светавіта. Яна была значна вышэйшая за чалавечы рост, мела чатыры барадатыя галавы, што разам са слупамі суадносілася з чатырма напрамкамі свету і чатырма порамі году. Гэта ўсход і поўдзень — царства дзённага святла, вясны і лета, а захад і поўнач — уладаранне начной цемры, восені і зімы. У адной руцэ Светавіта быў вялікі рог з віном, якое абнаўлялі восенню кожнага года, і па якім святар-жрэц варажыў пра будучы ўраджай. У другой руцэ — спушчаны лук. Тут жа віселі сядло, муштук і агромністы меч. Усё гэта сведчыла пра тое, што боства апекавалася як урадлівасцю, так і ваяўнічасцю.

Светавіту прыносілі ахвяраванні з усіх славянскіх плямён. Нават купцы, якія прыплывалі на востраў Руген гандляваць, не маглі пачаць сваю справу, пакуль не паднасілі боству дарагую рэч. Апрача звычайных ахвяр, боству прыносілі часам і крывавыя чалавечыя, галоўным чынам палонных хрысціян, якія шкодзілі славянам-язычнікам. Сімваламі Светавіта былі два колеры — чырвоны і белы. Напрыклад, белага каня жрацы вадзілі недзе ўначы, каб ранкам было



*Статуэтка Трыглава з храма ў Рэтры — горада свяцілішча палабскіх славян (цяпер Нямеччына)*



*Каменная галава ідала, знойдзеная ў г. Свентаборзе (Данія)*

відаць, што боства нібыта ездзіла на ім каб агледзець і засцерагчы свае ўладанні. Каня выкарыстоўвалі і пры варажбе, да прыкладу, калі сумняваліся: пачынаць вайну ці не. Тады перад храмам уторквалі ў зямлю крыж-накрыж тры пары дзідаў. Галоўны жрэц падводзіў да іх каня, і калі той пераступаў праз іх правай нагой, гэта было добрым знакам, калі левай —ваенны паход пераносілі на іншы час.

Сцены ў свяцілішчы завешвалі пунсовымі фіранкамі, а ўсё ўбранне было чырвоным. Імя Светавіт пераклікаецца са старажытнымі імёнамі Святаслаў, Святагор... Дый і само сонца ў славян часта называлася святым.

Абрад варажбы пры дапамозе коней звязаны з боствам, якое ў балтыйскіх славян называлася ***Трыглаў***. Лічылі, што тры ягоныя галавы сімвалізавалі ўладу над трыма царствамі — небам, зямлёй і ніжнім светам. Іншымі словамі, пасляі доўна звязаны з траістай сімволікай. Казалі, быццам Трыглаў падарожнічае ўначы, таму што баіцца сонечнага свету. Храм Трыглава знаходзіўся ў Шчэціне на самым высокім і галоўным з трох узгоркаў, дзе стаяў трохгаловы ідал. Ягонымі атрыбутамі былі вараны конь і стрэлы. Абрад варожбаў нагадваў той, які праводзілі каля свяцілішча Светавіта ў Арконе. Толькі ў Шчэціне каня, заўважым — чорнага, тройчы вадзілі праз дзевяць дзідаў, пакладзеных на зямлю.

Боствам неба славяне лічылі і ***Сварога*** — ад санскрыцкага *svarga* — «неба». Мяркуецца, што Сварог спачатку быў адзіным вярхоўным боствам, валадаром свету, прабогам. У гэтай іпастасі Сварог з'яўляўся бацькам сонца і агню, увасаб-

леннем неба і святла. Таксама культ Сварога звязаны з гадавымі цыкламі прыроды і вылучаецца ваяўнічым духам, які дае мужнасць і мужчынскую сілу. Гэтым Сварог нагадвае Перуна.



*Сімвал Сварога (твор дэкаратыўнага мастацтва)*

Сынам Сварога ва ўсходніх славян лічылі ***Дажбога*** (***Дажджбога***) — бога сонца. Вось што паведамляе Іпацьеўскі летапіс за 1114 год: «*...имнем Сонца, его же наричають Дажьбогъ. Солнце же царь сын Свароговъ еже есть Даждьбог*».

Ёсць падставы лічыць, што Дажбог з'яўляўся міфічным родапачынальнікам нашых продкаў. У «Слове пра паход Ігаравы» яны так і названы: Дажбогавы ўнукі. У беларускіх пісьмовых крыніцах XV–XVII стст. сустракаюцца імёны Даждзьбог, Дадзібог і імя па бацьку Дажбогавіч. Лінгвісты ж імя бога тлумачаць проста: Дажбог — бог, які дае долю, багацце. Боства сонца дае жыццё ўсяму на зямлі, ад яго залежыць ураджай і дабрабыт.



*Выява Дажбога (мастак М. Праснякоў)*

Вярхоўным боствам продкаў быў ***Пярун***, бог грому і маланкі. Менавіта ён узначальвае спісак багоў кіеўскага князя Уладзіміра, і менавіта ягоны ідал, адзіны з усіх, падрабязна апісаны ў летапісах Нестара. Ідал Перуна быў драўляным з сярэбранай галавой і залатымі вусамі.

Месцазнаходжанне Перуна — неба, ён уладарыць нябесным агнём, ягоная зброя — камень або каменныя сякеры. Ён кідае іх з неба на зямлю, адсюль і навальніца.

Імя гэтага боства перайшло нават на назвы культавых аб'ектаў. Па ўсёй Беларусі сустракаюцца назвы *Пярун-Камень*, *Перунова Гара*, *Перунова Поле*. Паводле павер'яў, у гэтых месцах заўсёды б'е Пярун, калі палюе на свайго суперніка, які хаваецца або пад каменем, або каля падэшвы гары, або ў самім чалавеку. Безумоўна, назвы сведчаць пра знаходжанне капішчаў і свяцілішчаў, прысвечаных Перуну, дзе праводзіліся адпаведныя абрады ўшанавання вышэйшага боства, адбываліся ахвярапрынашэнні. У летапісу пра богаслужэнне Перуну гаворыцца: «*Ему же яко богу жертву приношаху, и агонь неугасающий за дубового древия непрестанно паляху*».

З цягам часу функцыі грымотніка ў народнай культуры перайшлі на Іллю-прарока, і ён зрабіўся хрысціянскім займеннікам Перуна. Ва ўсходніх славян і ў XX ст. захавалася перакананне, што навальніца адбываецца ад таго, што Святы Ілля едзе па небе на вогненнай калясніцы, таму чуецца гром, і сыпле на зямлю грамавыя стрэлы — маланкі. Ад Перуна Ілля-прарок пераняў і такі міфалагічны матыў: у народзе лічыцца, што падчас навальніцы Ілля сваімі стрэламі забівае нячысцікаў. А тыя дрыжаць ад жаху і імкнуцца схавацца дзе-небудзь, нават у чалавека пад вопраткай. Можна і сёння пачуць: «*Калі Пярун, дык гэта Ілля нячысціка б'е*».



*Сімвал Перуна на прасніцы*

Дзень Перуна — чацвер, у палабскіх славян чацвер так і называўся «Перуноў дзень». А ўвогуле ёсць нават каляндарнае свята, прысвечанае гэтаму боству — 20 ліпеня па старым стылі, па новым — 2 жніўня. У гэты дзень язычнікі прыносілі ахвяры. У летапісу сказана, што ў 983 годзе за тыдзень да Перунова дня ў Кіеве пачалі рыхтаваць да ахвярапрына-

шэння «*мечем жребий на отрока и девицю...*». Але найбольш распаўсюджанай ахвярай быў певень. Па вялікіх святах ахвяравалі быка, даволі рэдка — мядзведзя або казла. Жывёлу забівалі і з'ядалі падчас агульнага застолля, каб атрымаць яе моц і здароўе, падараваныя боствам, і каб сіла бога перайшла на ўсіх.

Вядома таксама, што Пярун — ваяўнічы бог, які апекаваўся вайсковымі справамі князя і ягонай дружыны. Летапісы сведчаць, што кіеўскія воіны пры заключэнні дамовы з Візантыяй, згодна з дзедаўскімі звычаямі, кляліся зброяй сваёй і «*Перуном — богам сваім*».

У літоўскіх тэкстах згадваецца дзевяць іпастасяў Пяркунаса. А ў адным з усходнеславянскіх рукапісаў XV ст. гаворыцца, што «*Перун есть многъ*», іншымі словамі, мае шмат іпастасяў. Адной з іх лічыўся бог ***Ярыла***. І хаця ў старажытных летапісах не захавалася сведчанняў пра яго, гэты бог пакінуў значны след у народных вераваннях. На аснове зафіксаваных у нашых продкаў каляндарных абрадаў у ягоны гонар, магчыма даволі дакладна аднавіць вобраз боства. Няма сумненняў, што Ярыла ўвасабляе вясеннае сонца, адраджэнне і росквіт прыроды. Яго параўноўвалі з нябесным ключнікам, які адмыкае вясновае неба і вызваляе для будучага ўраджаю дождж і расу.

Вобраз Ярылы можна аднавіць і па тых словах, якія захаваліся ў сучаснай беларускай мове. Так, старажытны корань «*яр*», аснова імя боства, заўсёды азначаў вясну, а таксама стан кахання і плоднасці ўсяго жывога. Да прыкладу, слова «*яркі*» азначае эпітэт асляпляльнага па сваім святле вясновага сонца, а слова «*яркнуць*» — дзеяслоў «ззяць, зіхацець». Слова ж «*яравы*» мае два азначэнні: гэта і палявыя вясновыя работы — яравая сяўба, і сельскагаспадарчая культура, што высяваецца і прарастае вясной. А прыметнікі «*яры*» і «*ярасны*» разам з назоўнікам «*ярасць*» гавораць пра раз'юшанасць, азлобленасць, лютасць ваяра на полі боя. Да таго ж дзеясловы з коранем «*яр*» у некаторых мовах славян маюць значэнне «*распаляцца, апладняць, спарвацца*» і сімвалізуюць жарсць падчас любоўных ігрышчаў.



*Вясновы Ярыла на кані (фрагмент беларускай вышыўкі)*

Захавалася апісанне беларускага свята ў гонар Ярылы, якое адзначалася 27 красавіка (па старым стылі), і якое святкавалі яшчэ ў



*Пячаткі XIII—XIV стст. з выявай Ярылы (правобраз «Пагоні»)*

сярэдзіне XIX ст. Нягледзячы на тое, што Ярылу нашы продкі ўяўлялі маладым прыгожым мужчынам, басанож, з галавой чалавека ў правай руцэ і жытнёвымі каласамі ў левай, у прысвечаным яму свяце ўдзельнічалі дзяўчаты. Выбіралі прыгожую дзяўчыну, апраналі яе ў белае адзенне, клалі на галаву вянок з кветак і садзілі на белага каня, прывязанага да слупа, а вакол другія дзяўчаты, таксама ў вянках, вадзілі карагод, часам так рабілі сярод засеянай нівы. Падчас абраду спявалі песні пра Ярылу як апекуна ўрадлівасці, прычым як раслінны, так і чалавечай.

Пасля прыняцця хрысціянства сталі адзначаць увесну свята Юр'я, які ўвабраў у сябе многія рысы Ярылы і мае блізкае па гучанні імя. Сёння католікі святкуюць гэта свята 23 красавіка, а праваслаўныя 6 траўня. Белы колер адзення Ярылы атаясамліваецца з белым адзеннем Святога Юр'я.



*Воіны князя Алега клянуцца Перуном і Вялесам (змяёй) (мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу)*

У юраўскіх песнях падкрэсліваецца, што гэты святы *«...будзе вас сабіраць і меччу галовы адсякаць»*. Цікава, што наўгародскі абраз «Чудо Георгия о Змие» пачатку XV ст. мае выяву Святога Юр'я, які трымае шчыт у выглядзе сонца з чалавечым тварам у фас. Некаторыя навукоўцы бачаць у гэтым далейшае развіццё вобраза Ярылы як сонечнага боства. Пра гэта гаворыць і залаты колер шчыта Яравіта, якога можна паставіць побач з белым адзеннем Ярылы. Узгадаем, што белы колер мае і конь, на якім раз'язджае вершнік Ярыла і ягоны пераемнік Святы Юр'я. Да таго ж белы конь у вераваннях многіх народаў лічыўся сакральнай жывёлай, якую выкарыстоўвалі ў варожбах і святочных абрадах, і які ў міфах сімвалізаваў сонца і нябеснае боства.

Знакаміты старажытны герб беларусаў Пагоня таксама мае выяву вершніка на белым кані. Некаторыя даследчыкі бачаць у ім правобраз Святога Юр'я, цесна звязаны з язычніцкім богам Ярылам і культам Перуна. У той жа час другія навукоўцы лічаць, што правобразам нашага вершніка мог быць і Светавіт, які па сваім характарыстыкам вельмі нагадваў Ярылу.

У народным кульце Святога Юр'я можна ўгледзець рысы Ярыліных ігрышчаў. Напрыклад, палешукі ўвесну на Юр'я куляліся, качаліся парамі — хлопец з дзяўчынай — з боку на бок па засеянай ніве. Тлумачылі гэта так:

> «Качаліся на Юр'я па жыту. Рана, да ўсходу сонца. З хлопцам трэба пакачацца — каб любіў, каб «прыкачаўся» да мяне, каб ажаніўся са мной».

Народ прыпісваў Святому Юр'ю апякунства над ураджаем і плоднасцю хатняй жывёлы. Выганялі гэтых жывёл на раллю першы раз якраз на *«вясновага Юр'я»*, а заганялі на *«восеньскага»* — 26 лістапада (па старым стылі). Вясновы Юр'я пачынаў лета. Лічылі, што ў яго, як і ў Ярылы, захоўваюцца ключы, якімі ён адмыкае вясну, скаваную зімнімі халадамі. Да яго так і звярталіся:

> «Падай, Юр'я, звонкі ключы, адамкнуць красну весну, цёплае лета».

***Вялес***, або ***Волас***, — таксама адзін з галоўных багоў язычніцкага пантэону, вельмі шанаваны на Беларусі. Вядома, што ў Кіеве ідал Перуна стаяў на гары, а Вялеса — у ніжняй частцы горада, на Падоле, на беразе ракі, і ўжо тым быў супрацьпастаўлены Перуну. Гэта суадносілася з уяўленнямі нашых продкаў пра Сусвет, дзе ў верхняй частцы ягонай прасторы, на небе, валадарыў Пярун, а ў ніжняй і ў падземнай частцы — Вялес.


*Вялес, кераміка (мастак А.Зіменка)*

Старажытнарускія крыніцы ўвесь час называюць Вялеса *«скотьим богам»*, з чаго вынікае, што гэты бог апекаваўся гаспадаркай і перадусім жывёлагадоўляй і багаццем. У продкаў свойская жывёла, як і хлеб, была асновай жыцця, адлюстроўвала плоднасць, багацце, а таксама з'яўлялася важным аб'ектам гандлю. Пра багацце і стан чалавека ў грамадстве судзілі па памерах ягонага статку. Атрымліваецца, што Вялес быў не толькі богам жы-

вёлагадоўлі, але і богам гандлю і дастатку. У кульце Вялеса галоўную ролю грала поўсць, валасы — сімвалы багацця, дабрабыту, плоднасці. Тут варта ўзгадаць старабеларускі вясельны абрад садзіць маладых на кажух, вывернуты поўсцю наверх, а таксама ладзіць шлюбны ложак на скурах жывёл, каб муж і жонка жылі багата і мелі шмат дзетак. Беларускія сяляне апошні пук нязжатых каласоў спецыяльна пакідалі ў полі як падарунак боству плоднасці і называлі яго «Вялесавай бародкай».

У некаторых раёнах Беларусі доўгі час захоўвалася свята «Валоссе», якое традыцыйна адзначалі дзеля таго, каб у гаспадарцы заўсёды вялася здаровая хатняя жывёла і быў добры ўраджай ільну. Свята прыпадала на адзін з дзён Масленкі. Цяглавая жывёла ў гэты час вызвалялася ад працы, а сяляне аб'язджалі бычка ці жарабца. Хаця на масленічным тыдні і забаранялася есці мяса, тым не менш да свята «Валоссе» рыхтавалі шмат тлустых мясных страваў, частавалі імі сваякоў і суседзяў. Яшчэ ў гэты дзень пяклі *«бліны ды аладкі, каб валы былі гладкі»*.

Дзе-нідзе ў Беларусі Вялеса ўяўлялі ў вобразе мядзведзя, таму што лічылі апошняга гаспадаром усіх звяроў, які да таго ж сімвалізаваў багацце і дабрабыт. Амулеты ў выглядзе мядзведжай галавы, лап, ягоных кіпцюроў, поўсці было заведзена вешаць у хлявах, каб хатняя жывёла была больш плоднай і каб засцерагчы яе ад ліхіх сіл.

Часам Вялеса паказвалі ў вобразе змея. Прыкладам, у Радзівілаўскім летапісу ёсць мініяцюра, дзе воіны князя Алега клянуцца Перуном і Вялесам, прычым выява ідала Перуна мае выгляд чалавека, а Вялеса — у выглядзе змея, які ляжыць каля ног княскіх дружыннікаў. Гэтая акалічнасць дала падставу даследчыкам міфалогіі звязваць Вялеса з ніжнім і левым полюсам сусветнай прасторы. А паколькі ніжнія полюсы звязаны з нечым халодным, вільготным і мокрым, то Вялес меў дачыненне да зямных водаў і крыніц, у тым ліку да азёр, рэк і іх вытокаў. Так, у беларускіх і літоўскіх казках вярхоўнае боства — бог навальніцы і грому, пераследуе свайго суперніка — падземнае боства, якое ў выглядзе Цмока або хрысціянскага чорта хаваецца менавіта ў зямных водах. І літоўскі Вельняс звязаны з вадой.

Па ўсёй Беларусі існуюць культавыя камяні, прысвечаныя Вялесу. Звычайна яны знаходзяцца ў паніжаных і забалочаных мясцінах. Такія сакралізаваныя камяні маюць назвы кшталту *Вол*, *Валы*, *Быкі*, *Вужыныя і Змеевы камяні*, *Чортавы камяні-краўцы* і *Чортавы камяні-шаўцы*.

Паколькі Вялес быў богам падземнага свету, то ён таксама лічыўся богам памерлых і смерці. Апроч таго, ён быў богам клятвы, да-

мовы, міру, апекаваўся абшчынна-родавай арганізацыяй. Да яго маюць дачыненне паганскія жрацы — вешчуны.

У павер'ях нашых продкаў менавіта Вялес быў магутным супернікам Перуна. Так сцвярджаюць даследчыкі, што займаюцца рэканструкцыяй «асноўнага міфа». А прычыну канфлікту бостваў яны бачаць у суперніцтве за прыхільнасць адзінага нам вядомага жаночага боства — Мокашы. Яе і лічаць жонкай грамавіка Перуна. Дарэчы, такога кшталту гіпотэза амаль цалкам пабудавана на параўнанні славянскіх бостваў з персанажамі балцкай міфалогіі, а ў славянскіх вераваннях яна практычна не сустракаецца.



*Двубой бостваў (лубок XIX ст.)*

Пазней, у хрысціянскія часы, функцыі Вялеса перайшлі ў асноўным да Святога Мікалая — даволі дэмакратычнага і даступнага народнага святога. На нашых землях здаўна лічылася, што ён апякае падарожнікаў, земляробаў, пчаляроў, дзяцей і маладых дзяўчат. На Беларусі адзначаюць двух Міколаў (па новым стылі): вясновага 22 мая і зімовага 19 снежня. Зразумела, што ўзімку яго ўшаноўвалі як боства, звязанае з ніжняй, хтанічнай сферай зямлі, з холадам, маразам, зімой. У гэты час праводзіліся шматлікія варожбы і абрады: людзі імкнуліся даведацца пра сваю будучыню, прасілі моцна не лютаваць з маразамі і не пашкодзіць гаспадарку, захаваць дабрабыт і здароўе. На Міколу вясновага жанчыны збіралі першыя травы, адварам якіх лячыліся ад розных хвароб. Па дапамогу да Міколы звярталіся і вясковыя чараўнікі падчас магічных дзеянняў, што гаворыць пра датычнасць старажытнага Вялеса да магіі і чараўніцтва.

# Глава 2
# ЖАНОЧЫЯ БОСТВЫ: ВЯЛІКАЯ БАГІНЯ-МАЦІ, МОКАШ, ЛАДА, ЛЁЛЯ, ЦЁЦЯ, МАРА

У старажытных рэлігіях і міфах свету існуе агромністая колькасць жаночых бостваў. Яны неверагодна разнастайныя як па геаграфічным распаўсюджванні, так і значна расцягнуты па часе ўзнікнення. Але ўсе гэтыя боствы аб'ядноўвае тое, што першапачаткова яны з'яўляюцца ўвасабленнем прыроды і асацыіруюцца з вытокам жыццядайных сіл, якія, у сваю чаргу, памнажаюць раслінны і жывёльны свет, працягваюць чалавечы род.

Галоўным жаночым боствам, якое прысутнічала ва ўсіх старажытных абрадах, з'яўляецца ***Вялікая Багіня-Маці***, Прародзічка ўсяго жывога. Некаторыя навукоўцы менавіта яе вобраз лічаць самай першай праявай сутнасці боства як такога. Архаічныя рэлігіі розных народаў ушаноўвалі Багіню-Маці як крыніцу стварэння свету. Саму карціну гэтага стварэння ўяўлялі як працэс спарвання і апладнення Маці-Зямлі Бацькам-Небам. Такія боскія адносіны сталі і надалей правобразам любоўных зносін паміж людзьмі. Надзеленая сакральнай рысай стварэння, багіня нараджала не толькі свет, але і розных жывых істот, у тым ліку другія боствы, людзей, жывёл і нават пачвар.



*Выява Багіні-Маці, касцяная фігурка з Браншчыны (Палеаліт)*

Стваральніца і ахоўніца сусветнага парадку, маці розных багоў і герояў, цудадзейная ўладарка кіравала на ўсемагчымых узроўнях. Яна валодала сіламі зямлі, месяца і вады, была непарыўна звязана як з самім жыццём, так з вайной і разбурэннем. Таму яе функцыі здаюцца супярэчлівымі і падвойнымі, паколькі яны адказваюць не толькі за стварэнне і нараджэнне, але і за разбурэнне, хваробы і смерць. Пазней, з надыходам новай рэлігіі, рысы і функцыі Багіні-

Маці распаўсюдзіліся на другія жаночыя боствы, а яе вобраз і культ распаўся на мноства абрадаў ушанавання гэтых самых бостваў.

У беларусаў да самага старажытнага земляробчага культу Маці-Зямлі можна аднесці агульнаславянскае боства ***Мокаш*** (***Макош***) — багіню зямлі, ураджаю, жаночай долі, Вялікай Маці ўсяго жывога. Апроч гэтага, яна ўладарка цемры і ніжняй часткі свету. Яе імя асацыіруецца з вільгаццю і вадой. Мокаш апекавалася ўсімі жаночымі заняткамі, асабліва прадзеннем і ткацтвам. І ўшаноўвалі яе пераважна жанчыны.



*Мокаш. Вышыўка на жаночай кашулі*

Пятніца была любімым днём тыдня багіні. Таму, каб не пакрыўдзіць яе, жанчыны ў гэты дзень не займаліся прадзівам і ткацтвам, не дакраналіся ані да калаўрота, ані да верацяна. За парушэнне табу багіня магла цяжка пакараць: знявечыць кабету, пакалоць яе верацяном і прымусіць прасці па начах. Нават пасля хрышчэння жанчыны збіраліся на тайныя зборышчы, дзе ўшаноўвалі Мокаш і прыносілі ёй у ахвяру жыта і мёд. Як багіня плоднасці Мокаш прысутнічае на вышыўках у выглядзе выявы жанчыны з вялікай галавой і паднятымі ўверх рукамі, што сімвалізуе сувязь зямлі і неба. Пра важнасць гэтай багіні сведчыць і «Аповесць мінулых гадоў», дзе ў спісе багоў, ідалы якіх былі пастаўлены Уладзімірам у Кіеве, згадваецца Мокаш.

Некаторыя навукоўцы лічаць, што пры рэканструкцыі асноўнага міфа, можна выявіць сувязь Мокашы з Перуном. Таму гэтую багіню лічаць ягонай жонкай. У той жа час у міфах выяўляецца матыў

здрады Мокашы Грымотніку з ягоным праціўнікам — падземным боствам. Міф распавядае, што ў пакаранне за здраду яна пазбаўляецца боскага і сямейнага статуса, ссылаецца з неба на зямлю, у хтанічныя воды. У доказ гэтаму міфу на Беларусі сустракаюцца тапонімы *Мокшава балота*, *Мокіш*. Напэўна, таму ў старажытнарускіх тэкстах ушанаванне багіні супастаўлялася з блудам. Гэта вынікае са «Слова некоего Христолюбца»: «И Мокошь чтут... и роучьный блоудъ велми почитают». Уяўленне пра Мокаш як пра ўвасабленне нястрыманай сексуальнасці, захавалася і ў падмаскоўных гаворках, там слова «макосья» азначае жанчыну лёгкіх паводзін.

Пасля ўсталявання хрысціянства многія функцыі язычніцкай Мокашы ўзяла на сябе ***Святая Параскева***. Менавіта яна стала ахоўнікам урадлівасці зямлі, шчаслівых шлюбаў, жаночых клопатаў і дзявочага лёсу. Перайшла на гэтую святую і забарона жаночых прац у пятніцу, таму яе сталі называць ***Параскевай Пятніцай***. Новая апякунка жанчын, як і старадаўняя Мокаш, была цесна звязана з вадой і вільгаццю. Захаваўся амаль да нашых часоў старажытны звычай кідаць у калодзеж прадзіва ў якасці ахвяры Параскеве. Сярод нашага народа існуе мноства легенд пра тое, што абраз Параскевы Пятніцы нейкім цудоўным чынам прыплывае па рацэ або яго знаходзяць каля ручаёў ці крыніц, вада з якіх пасля гэтага здарэння робіцца лекавай.

У народным календары беларусаў вызначаўся дзень 28 кастрычніка (па старым стылі), калі Параскеву Пятніцу асабліва ўшаноўвалі. У розных рэгіёнах краіны гэтае свята называлі па-рознаму: *Параска, Параскева Пяценка, Параскімка, Параскоўя, Параскева-Льняніца* і да т.п. Апошняя назва замацавалася за святой таму, што яна была апякункай прадзіва і лёну, які жанчыны пачыналі апрацоўваць і рыхтаваць да прадзіва менавіта ў кастрычніку. І назва месяца пайшла ад таго, што ў гэты час пачыналі мяць лён і аддзяляць ад яго кастрыцу.

Але ў народным календары святкавалі не толькі кастрычніцкі дзень Параскевы Пятніцы, а таксама і тыя пятніцы, якія ішлі перад галоўнымі гадавымі святамі. Такіх пятніц было 12, і народнае ўяўленне малявала іх жывымі жанчынамі-сёстрамі, да якіх можна было звяртацца з малітвамі і просьбамі. Прычым «Дзесятая Пятніца», або «Дзесятуха», лічылася сярод усіх астатніх старэйшай і разам з «Дзевятухай» перадавалася на неба малітвы раней за астатніх «пятніц». Галоўным зместам ушанавання Параскевы Пятніцы ў такія дні з'яўлялася выкананне забаронаў на жаночыя працы, а таксама ахвяraпрынашэнні каля крыніц і калодзежаў. А калі ў якой-небудзь мясцовасці здаралася засуха і няўрод, або туды прыходзіла жахлівая хвароба, якая пагражала жыццю ўсяго наваколля, жанчыны з малітвамі

да сваёй апякункі Параскевы Пятніцы выконвалі абрад прадзення ручніка-абыдзённіка. Дзеля гэтага некалькі жанчын збіраліся ў адной вясковай хаце, прыносілі туды кужаль і пралі з яго ніткі, потым па чарзе ткалі ручнік, а затым абносілі вакол вёскі. Такім чынам ствthaаралася ахоўнае магічнае кола, якое, як верылі нашы прабабулі, абараняла іх ад усялякіх прыродных катаклізмаў і эпідэмій, прычым такі абрад выконваўся ў пэўную пятніцу. Беларускія жанчыны прытрымліваліся такіх звычаяў яшчэ ў XIX ст.

І хаця новая святая мела хрысціянскую афарбоўку, у народным уяўленні яна заставалася грознай багіняй, якая за непаслушэнства жорстка карае людзей. За тое, што жанчына займалася прадзівам у забароненыя дні, Параскева магла не толькі зблытаць яе ніткі і папсаваць усю работу, але нават садраць з кабеты скуру, паралізаваць рукі, кінуць у вакно сорак верацён і прымусіць няшчасную прасці да раніцы. А карала Параскева так жорстка таму, што сама, паводле народных вераванняў, пакутавала ад забароненых работ непаслухмяных жанчын. Верылі, што ў такія дні «*ў Параскевы запыляюцца вочы, а цела пакрываецца крывёю ад уколаў спіц і верацёнаў*».



*Багіня Лада (скульптур В. Бачкоў)*

У беларускіх легендах святая звычайна мела выгляд старой, апранутай у дзіравую світку, сівая галава якой была пакрыта старызнай. У такім выглядзе старая хадзіла па дварах і назірала за паводзінамі жанчын.

Апроч Мокашы, у розных пісьмовых крыніцах даўніны і славянскім фальклоры сустракаюцца імёны Лады і яе дачкі Лёлі або Лялі. Гэта жаночыя боствы, якія звязаны з урадлівасцю. ***Лада*** ўшаноўвалася як апякунка шлюбаў, кахання і прыгажосці. Яе малявалі ў выглядзе маладой прыгожай

жанчыны з залатымі валасамі ў ружовым вянку. Аўтары самых ранніх работ па язычніцкай міфалогіі славян разглядалі Ладу, як і Ярылу, адлюстраваннем вясновых вегетатыўных сіл прыроды: жаночай і мужчынскай. Песні ў гонар Лады выконваліся ў асноўным увесну і на пачатку лета. Першыя песні, звернутыя да Лады, спяваліся на так званых Красных Горках у сакавіку падчас абраду «*гукання вясны*». Менавіта ў Лады пыталіся дазволу «*гукаць*» (запрашаць) вясну. У больш познія часы да Лады звярталіся з маленнямі пра дождж, прасілі захаваць першыя парасткі маладых каласкоў жыта.

Шмат песен, прысвечаных Ладзе, выконвалася і падчас «*зялёных святак*» — свята маладой зеляніны і раслiннасці, якое пачыналі святкаваць з Тройцы. Пасля Купалля песні ў гонар Лады прыпыняюцца да наступнай вясны. Выключэннем могуць быць калядныя варожбы пра замуства і некаторыя моманты вясельных абрадаў, дзе без багіні шлюбу немагчыма было абысціся.

Такім чынам, Лада ў нашай міфалогіі грала значную ролю. Мяркуецца, што багіня Лада мае выяву на адной з граняў Збручскага ідала: боства з пярсцёнкам у руцэ быццам і ёсць Лада — багіня шлюбу і сямейнага жыцця, апякунка дзяўчат і кабет. Вядома таксама свяцілішча Лады на Лысай Гары непадалёк ад польскага горада Кельцы. Паводле легенды, на гэтай гары быў пабудаваны храм трох ідалаў: Лады, Боды і Лёлі. Кожны год у першы дзень мая ім прыносілі багатыя ахвяраванні.

***Лёля*** ў параўнанні з Ладай займае больш сціплае месца ў язычніцкай міфалогіі. Але таксама лічылася багіняй вясны, апякункай дзяўчат шлюбнага ўзросту. Захаваліся апісанні святкавання Ляльніка ў беларусаў. Нашы продкі малявалі багіню маладой, стройнай і прыгожай дзяўчынай. Пра найбольш прывабных дзяўчат так і казалі: «*Прыгожая, як Ляля!*»

Таму падчас святкавання Ляльніка, які адбываўся 7 мая (па старым стылі 25 красавіка), на ролю Лялі дзяўчыны выбіралі са свайго асяродку самую прыгожую. Потым яе апраналі ў белую кашулю, упрыгожвалі зелянінай, на галаву ўскладалі вянок з вясновых кветак. Пасля дзяўчыну-Лялю ўсаджвалі на ўзвышэнне, засланае зялёным дзірванам, і ёй як увасабленню боства прыносілі ахвяраванні ў выглядзе зялёных вянкоў, хлеба, яек, масла, тварагу, малака, смятаны. Затым астатнія дзяўчаты вадзілі вакол Лялі карагод і спявалі песні, дзе прасілі цёплай вясны і багатага ўраджаю. Напрыканцы свята Ляля адорвала дзяўчат вянкамі і разам з імі частавалася прынесенымі стравамі. Вянкі і травы, што ляжалі каля Лялі, захоўваліся пасля свята цэлы год да наступнага Ляльніка.

З вобразам Лёлі-Лялі звязаны цікавыя філалагічныя паралелі. Так, слова *«ляля»* у шэрагу славянскіх моў азначае немаўля, дзіця, лялька, люлька (дзіцячая калыска), а рускае слова *«лелеять»* адпавядае словам «песціць, калыхаць, лашчыць, беражліва насіць дзіця». Да таго ж бусла, які, паводле распаўсюджанага павер'я, прыносіць дзяцей, у беларусаў называлі лелекай (так называюць бусла і цяпер па-ўкраінску). У літоўскай мове *lele* азначае ляльку, а таксама дзіцячую калыску або нядаўна народжанае дзіця. У некаторых рэгіянальных гаворках Беларусі «лёля» — гэта цётка, а ў літаратурнай мове Кіеўскай Русі *лелья* — сваячка, цётка.

Багіняй лета была ***Цёця***, якая лічылася старэйшаю за багіню вясны Лёлю. Праўда, згадванне гэтай багіні зафіксавана не ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны. Беларусы ўяўлялі яе поўнай і мажной жанчынай, вельмі прывабнай, чыя галава ўпрыгожана спелым калоссем. Яна апекавалася сялянамі, яе заўсёды прасілі пра доўгачаканы дождж і багаты ўраджай. Некаторыя навукоўцы лічаць, што менавіта яна заняла месца старажытнай Мокашы. І менавіта яна як багіня плоднасці і ўрадлівасці разам з Лёляй магла ўтвараць жаночую пару — маці-дачка. Прыкладам, як у Старажытнай Грэцыі — Дэметра і Персефона — багіні, якія апекаваліся ўрадлівасцю зямлі.

Ёсць і другія міфы, звязаныя з гэтай багіняй. Паводле некаторых меркаванняў, Цёця лічылася жонкай Перуна і называлася яшчэ ***Перуніцай*** або ***Грамаўніцай***. Усім нам вядома такая атмасферная з'ява, як грымоты напрыканцы зімы, бляск маланак, завірухі і мяцеліцы. Нашы продкі нават зафіксавалі гэту з'яву як свята ў народным календары пад назвай Грамніцы — у гонар багіні.



*Багіня Цёця (мастак В. Славук)*

Чаму? Згодна з міфам, штогод на Каляды цяжарная багіня сыходзіла з нябёсаў і хавалася ў зарасніках вербаў, каб неўзабаве, напрадвесні, нарадзіць новае Божышча-Сонца — Дажбога. Менавіта перад зімовым сонцаваротам падземны цар, боства зімы і маразоў Карачун, прадчувае, што павінен нарадзіцца Божыч і імкнецца знішчыць дзіця. Таму што сваім нараджэннем маладое боства святла і сонца нясе смерць падземнаму ўладару цемры і холаду. Тады Карачун пад выглядам мядзведзя разам са зграяй ваўкоў-мяцеліц ганяецца за Грамаўніцай-Цёцяй.

Але багіня, нягледзячы на перашкоды, нараджае новае вясновае боства і нават наважваецца паказаць яго свайму ворагу. Тым самым яна дае зразумець, што час холаду і цемры скончыўся, і яму на змену павінна прыйсці цеплыня і росквіт прыроды. Каб такія агледзіны былі больш пераканаўчымі, Цёця суправаджае іх раскатамі грымотаў і бляскам маланак.

На Украіне гэтую багіню называлі Паляніцай, як і рытуальны хлеб, які гаспадыні выпякаюць у гонар асаблівых свят. Шмат у якіх казках і песнях — гэта яшчэ і вобраз Дзевы-Ваяркі, уладарнага і моцнага боку жаночага пачатку. У народнай фантазіі Дзеву Перуніцу ўяўлялі з залатой «грамавой» дзідай, асабістай зброяй, якую яна скіроўвала супраць сваіх ворагаў.

Наступнае жаночае боства шмат якія цяперашнія навукоўцы лічаць персанажам ніжэйшай міфалогіі таму, што народныя легенды малявалі яе толькі ў негатыўным і адмоўным сэнсе. Гэта ***Мара***, або ***Марэна***. Так, у заходніх рэгіёнах нашай краіны Марай называлі персаніфікацыю эпідэміі халеры і ўяўлялі яе ў выглядзе касцістай жанчыны з кашчавымі пальцамі. Верылі, што яна ўсялякімі праўдамі і няпраўдамі імкнецца пранікнуць у людское паселішча, каб накінуцца на чалавека падчас сну і задушыць яго да смерці. Вось як распавядалі пра гэта ў народзе:

> «Мары мучаць сонных, не перапыняючы іх сну. Звычайна Мара садзіцца на грудзі ці на горла соннаму чалавеку і пачынае душыць, прычым, перашкаджаючы дыхаць, яна час ад часу адпускае ахвяру, каб нацешыцца яшчэ большымі яе пакутамі пасля перадыху. Ахвяра, імкнучыся выратавацца, падымае руку, каб адагнаць мару ці перахрысціцца, але тут вяртлявая Мара прытрымлівае занесеную руку, якая млее, чым прыносіць новыя пакуты...».

Таксама верылі, што Мара вельмі юрлівая асоба і любіць забаўляцца з мужчынамі, даводзячы іх да хваробы ці да смерці. Марай называлі таксама прывід ці здань.

Разам з тым, у славянскіх міфах і легендах часта сустракаюцца персанажы кшталту такіх, як Мара, Маря, Марыя, Маруха, Марэна, Марана, Маржана і да т.п. Усе яны маюць агульны індаеўрапейскі корань «*мар/мор*» і звязаны з увасабленнем смерці, а таксама сезоннымі рытуаламі паміраньня, а затым і адраджэння прыроды. Так, у вясновых абрадах Марэнай называлі саламянае пудзіла — увасабленне смерці і зімы, якое тапілі або расцярушвалі і спальвалі. Лічылі, што такім чынам забяспечваецца добры ўраджай і плоднасць усяго жывога. Гэта дае падставы лічыць, што некалі гэты персанаж меў статус боства ўрадлівасці і плоднасці. Ва ўсялякім разе хроніка XV ст. атаясамлівае польскую Маржану з рымскай багіняй падземнага свету Цэрэрай, якая адказвала за вытворчыя сілы зямлі, рост і ўраджай злакаў, шлюбныя адносіны людзей.



*Мара (мастак М. Сухараў)*

Старадаўнія аўтары, якія апісвалі боствы славян-язычнікаў, параўноўвалі Марэну з грэцкай Дземетрай — багіняй плоднасці і земляробства.

Латышы таксама маюць падобную багіню, якую завуць Мара, яна жонка бога навальніц, маланак і дажджу Пэрканса. Мара апекавалася каровамі, у яе прасілі малака, сыру, цялят. Яе свяцілішчы ладзіліся на ўзгорках. Узгадаем беларускія культавыя ўзгоркі з назвамі Мар'іна Горка або Марыліна Гара, Маруленя-Гара. Каля вёскі Пярэжыр Пухавіцкага раёна раней ляжалі культавыя камяні Мар'я і Дзям'ян. Калі ўшаноўвалі першы з іх валун, у яго прасілі пазбавіць ад хвароб, даць нарачонага і добры ўраджай.

У той жа час у беларускіх замовах супраць змей сустракаюцца імёны Марэя, Марына, Мархва, якія можна параўнаць з Мар'яй-Марай. У рускіх Мару завуць яшчэ Марухай або Кікімарай, яна ўва-

сабленне смерці і паморку. Санскрыцкае *mara* азначала «вільгаць», а таксама «хвароба» і «смерць». Сінонімы дзеясловаў «марыць» і «мроіць» — «трызніць, блюзніць, бачыць галюцынацыі». Узгаданая вышэй італійская багіня Цэрэра, якую параўноўвалі з Маржанай-Марэнай, апроч усяго іншага насылала на людзей вар'яцтва. Уяўленне пра Мару як пра начны кашмар зафіксавана ў польскім *zmora*, французскім *cauchemar*, англійскім *nightmare*. Як бачым, шмат у якіх народаў існуюць назвы падобных істот і паняццяў, якія паходзяць ад аднаго кораня.



*Спальванне саламянага пудзіла Марэны*

Але згодна з іншымі павер'ямі беларусаў, наша Мара адлюстроўвала не столькі начны жах, колькі ўвасоблены лёс, які прадказвае людзям іх долю і будучыню. Яна багіня-пралля, якая тчэ павуціну чалавечых лёсаў. Верылі, што Мара таемна шые і прадзе па начах пры святле месяца, дапамагае гаспадыні хутчэй скончыць працу.

Такім чынам можна зрабіць выснову, што Мара-Марэна — адно з самых загадкавых бостваў нашага пантэона, дзе адлюстраваўся старажытны архетып, звязаны не толькі са смерцю, але і з нараджэннем і ўрадлівасцю.

Некаторыя навукоўцы лічаць, што міфалагічныя персанажы з імёнамі на «mar» з'яўляюцца рэліктамі вельмі старадаўняга вобраза Вялікай Багіні, некалі адзінага боства, адказнага за абнаўленне Жыцця на Зямлі.

# Глава 3
# МІФІЧНЫЯ ПЕРШАНАСЕЛЬНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ: БАЙ, ВОЛАТЫ І ВАЛАТОЎНЫ, АСІЛКІ

Кожны народ у сваёй гісторыі праходзіў этап этнічнага самаасэнсавання, імкнуўся сакралізаваць сваё паходжанне і зацвердзіць права на тэрыторыю. Згодна з этнагенетычным міфам, родапачынальнікам беларускага этнасу з'яўляецца князь ***Бай*** або ***Бой, Буй***. У міфалогіі фігуруе славяна-скандынаўскае боства сілы і навальніцы Буй-Тур. Адсюль не выключана сувязь скандынаўскага бога Тора і беларускага князя Бая.

Паводле этнаганічнага міфа беларусаў, які тлумачыць паходжанне зямлі і ўсяго жывога на ёй, напачатку была толькі вада, пасярод якой тырчаў адзін камень. Пярун стаў біць у камень, выбіў тры іскры, і ўсё ў свеце змяшалася, а калі прасвятлела, то апынулася, што вада і зямля адасобіліся. Потым з'явілася жыццё на зямлі і ў вадзе. З'явіўся і чалавек — магутны асілак, князь Бай. Ён меў многа жонак і дзяцей, а таксама любімых сабак — ***Стаўры*** і ***Гаўры***. Апроч гэтага, ён быў і нашым першапродкам: ад ягонага сына Белаполя пайшлі ўсе мы — беларусы.

Пасля смерці князя ягоныя сабакі засталіся Белаполю. Па бацькоўскаму запавету сабак тых трэба было пусціць у розныя бакі, і колькі зямлі ўдзень яны аббягуць, столькі і будзе яе ў Белаполя. Там ён можа сяліцца і пладзіцца. Каб выканаць наказ Бая, аднойчы на паляванні злавіў Белапаль дзвюх птушак, адну з паўднёвага мора, а другую з заходняга. Потым, патрымаўшы іх некаторы час, выпусціў на волю, а за імі нацкаваў сваіх сабак. Кожная птушка паляцела ў свой бок, за імі пабеглі Стаўры і Гаўры.

Па слядах сабак пацяклі рэкі Дзвіна і Дняпро. У іх абшарах пасяліўся Белапаль, а ад розных жонак яго *«развяліся розныя пляменя пад прозвішчам Беларусы. Яны і да гэтага часу там ходзяць, зямельку скародзяць ды жыта сеюць»*.

Паводле падання, Стаўры і Гаўры былі пахаваны на беразе Дрысы, каля сучаснай вёскі Краснаполле Расонскага раёна на Віцебшчыне. Людзі іх ушаноўвалі раз на год, і гэты дзень сталі называць Стаўроўскія Дзяды. На месца пахавання прыносілі ежу, пітва і праводзілі час да позняй ночы. Рэшткі страў кідалі ў вогнішча з заклікамі: *«Стаўры, Гаўры, гам, прыхадзіце к нам!»* Яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. навукоўцы зафіксавалі, што каля Докшыцаў у глухім месцы

сяляне хавалі ад паліцыі нейкага ідала. Каля яго збіраліся, таньчылі і паўтаралі *«Стаўры, Гаўры — гам»*. Тое самае кажуць у многіх вёсках Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці яшчэ і сёння, калі спраўляюць на год шэсць *Дзядоў*.

Бай быў не толькі першым насельнікам нашай зямлі, але і першым памерлым, які стаў валадаром царства мёртвых. Гэтымі рысамі князь Бай і ягоныя сабакі вельмі нагадваюць адпаведныя персанажы другіх індаеўрапейскіх міфалогій. Вядома, што ў міфах такога кшталту царства памерлых таксама ахоўваюць сабакі. Узгадаем грэчаскага Кербера (Цэрбера) і паляўнічага пса Індры, чые дзеці ахоўваюць шлях у царства Ямы.



*Гліняная культавая статуэтка сабакі, пачатак 1-га тыс. (гарадзішча каля вёскі Мыслі, Капыльскі р-н., Мінская вобл.)*

Папулярны шматлікія беларускія паданні пра волатаў, асілкаў, багатыроў. Гэта міфічныя істоты незвычайнага росту, сілы і антрапаморфнага аблічча. Паводле міфалагічных уяўленняў, саманараджэнне ***волата*** адбываецца ў пачатковых водах:

«Ішоў Спас па сіняму мору, бачыць — мора пачынае пеніцца і біць незвычайна моцныя хвалі, з'явіўся аграмадны вадзяны стоўб. Спас падыходзіць да гэтага стаўба паглядзець і бачыць у сярэдзіне яго жывога волата, які паварочваецца, але не можа ўстаць. Спас узяў гэтага волата і выкінуў на бераг. З'явіўся такі прыгажун, што прыгажосці яго здзівіўся сам Спас...»

Згодна з паданнямі, волаты былі такога росту, што цяперашнія людзі не даставалі б ім і да калена. Галовы іх былі як вялізныя цэбры. Яны ўтваралі рэкі, вытоптвалі азёры, перасоўвалі горы. У паданнях расказваецца, што волаты кідалі вялізныя камяні, якія па памерах нагадвалі жорны, маглі ўзяць на далонь аратага з канём і вупражжу. А калі веліканы зліваліся і пачыналі біцца паміж сабой, узнікалі буры і непагадзь. Волат мае сувязь з богам Вялесам і пазнейшым Чортам. Як сцвярджаюць павер'і, крыніцай надзвычайнай сілы волата з'яўляецца наяўнасць у яго *«чортавага рабра»*. Так называлі ў народзе трынаццатае, суцэльнае, *«бы абруч»*, *«лішняе»* рабро. Яно прыпісвалася міфічным веліканам і вельмі моцным людзям: *«задужыя, бо маюць чортава рабро»*. Калі волаты паміралі, іх клалі на зямлю і насыпалі ўзгоркі. Такія ўзгоркі сталі называць *валатоўкамі*.

Валатоўкі — гэта народная назва пахаванняў нашых продкаў канца I — пачатку II тысячагоддзя. Назва такіх археалагічных помнікаў у асноўным супадае з арэалам рассялення крывічоў. Паданні звязваюць валатоўкі з магіламі паганскіх воінаў-вялікалюдаў, а таксама з закапанымі скарбамі, якія нарабаваў волат. Адзін з вялікіх насыпаў у курганніку каля вёскі Валынеж Касцюковіцкага раёна на Магілёўшчыне яшчэ не так даўно называлі *Волатава Магіла*. Расказвалі, што тут жылі два браты-асілкі. Яны забаўляліся тым, што перакідваліся каменнымі сякерамі, падхопліваючы іх у паветры. Аднойчы ў час такой гульні малодшы брат забіў старэйшага і пахаваў у кургане.

Варыянтамі назваў курганных могільнікаў з'яўляюцца таксама Вілатоўка, Вілаватка, Валатовачкі, Калатоўкі, Латоўкі, Малатоўкі, Талатоўкі і іншыя.

У паданнях часта фігуруюць ***валатоўны*** — вялізныя жанчыны, надзеленыя надзвычайнай сілай. З жаночым культам звязаны многія горы і гарадзішчы, у першую чаргу з назвамі кшталту *Дзявочая* або *Дароціна*, *Бабіна Гара*. Так, у Мсціславе гарадзішча *Дзявічая Гара* або *Дзеўя Горка*, *Дзявічы Гарадок*, нібыта нанасілі фартухамі дзяўчаты-багатыркі, калі засыпалі магілу багатыра, якога ўсе яны аплаквалі, а потым ва ўрочны дзень спраўлялі па ім трызны і ладзілі тут ігрышчы. Пра Дароціну Гару на Полаччыне гаварылі, што ў купальскую ноч валатоўна Дарота перакідвалася бярвёнамі з чараўніцай Княгіняй, якая жыла на Піруновай Гары на востраве Асвейскага возера.

Пра Багатыр-Гару на мяжы Полацкага і Расонскага раёнаў паданне расказвае, што там жыла жанчына велізарнага росту і гэтакай жа сілы. Ваду на гару яна насіла за дзесяць вёрст з возера Нешчарда і адразу па два цэбры, у якія ўлазіла па дзесяць вёдзер. Каромыслам ёй служыў дубовы вочап. Аднойчы яе затрымалі татары і спыталі: як бліжэй патрапіць у Полацк. Жанчына адказала, што не чула пра такі горад, а між тым з гары была бачна Святая Сафія. Татары раззлаваліся і накінуліся на багатырку. Яна сваім каромыслам бадай што ўсіх перабіла, але адна з татарскіх стрэлаў трапіла ёй у сэрца. Жанчыну пахавалі на гары, і адсюль пайшла назва Багатыр-Гара. З цэбраў пацякла вада і ўтварылася рэчка Багатырка.

У паданнях жанчыны-багатыркі маюць непасрэднае дачыненне і да камянёў. Да прыкладу, некалі на беразе Свіслачы ляжаў валун пад назвай След Валатоўны, які быццам пакінула дзяўчына, калі пераступала праз раку. А недзе каля Віцебска ў рэчышчы Дзвіны раней існаваў камень Дзявочы след, пра які расказвалі, што след на камяні належаў таксама валатоўне.

Вядомае паданне пра Сіні Калодзеж, што побач са Слаўгарадам, былым Прапойскам, распавядае пра багатырку Кацярыну. Да яе сваталіся два багатыры — Сцяпан і Марка, але ёй падабаўся больш Сцяпан, хаця ён быў і не такі дужы, як нялюбы Марка. Кацярына сказала, што пойдзе замуж за таго, хто далей кіне валун з высокага правага берага Сажа на луг. Нялюбы Марка кінуў камень якраз туды, дзе цяпер вёска Кліны, а любы, але слабейшы Сцяпан кінуў не так далёка. Каб не пайсці за нялюбага Кацярына стала на ягоны камень і сказала: «*Лепш пайду вадой служыць, чым з нялюбым жыць*». Потым падскочыла, грымнулася аб валун, разлілася вадой і выскачыла з-пад зямлі вёрстаў за пяць ад Прапойска, дзе і ўтварыўся Сіні Калодзеж. Пасля гэтага на Маркавым камяні застаўся след нагі Кацярыны, а на Сцяпанавым — сляды пальцаў ягонай рукі.

У многіх паданнях валатоўна выступае як жанчына-воін або дзева-багатырка накшталт скандынаўскіх валькірый. На Лепельшчыне расказваюць, што нібыта багатырка перамагла волата і яго войска, а затым перакуліла і паставіла ўверх каранямі вялізную елку. Паводле другога падання, багатырка падымала высока над галавой коней і ішла «*валяць чужаземнае войска*». На Браслаўшчыне занатавана паданне, што курганы засталіся ад старадаўняй вайны, дзе войскі ўзначальвалі дзве родныя сёстры-ваяркі.

Яшчэ ў XIX ст. у ваколіцах Гомеля было шырока распаўсюджана паданне пра Гецьманку. Расказвалі, быццам адзін селянін у лесе ўбачыў вялізнага росту жанчыну ў залатым адзенні. Яна ехала вярхом на кані ў поўным узбраенні. Чалавек са страху залез на дрэва. Гецьманка яго не заўважыла, спынілася на адпачынак і заснула. Мужык злез з дрэва і забіў багатырку. У Петрыкаўскім раёне на Гомельшчыне яшчэ не так даўно гаварылі пра Хімкіны Горы. Нібыта там жыла багатырка Хіма. Яе цяжка было ўбачыць: яна ўзбіралася на дрэвы і хавалася ў лістоце. У Хімы быў лук са стрэламі, і ніхто не наважваўся падыйсці і загаварыць з ёй, таму што мог быць забіты.

А вось жыхароў гарадзішчаў у паданнях звычайна называюць асілкамі, а не волатамі. Гэтыя веліканы нібыта самі ўзводзілі гарадзішчы і сяліліся там. Для пабудовы гарадзішча дрэвы з лесу цягалі разам з каранямі. Кажуць, што інструменту ў іх ніякага не было, толькі на ўсіх адна сякера, «*ды і тая не жалезная, а якаясь медзяная*». Таму асілкі перакідвалі тую сякеру з гарадзішча на гарадзішча, «*бо не хацелі траціць часу на хаджэнне*». Другія паданні запэўніваюць, што яны перакідваліся паміж сабой камянямі і каменнымі сякерамі.

Заснаванне некаторых гарадоў таксама прыпісваецца асілкам. Так, Мінск быццам заснаваў разбойнік-асілак Менеск, які быў зна-

харом і млынаром. Згодна з паданнем, ён пабудаваў на Свіслачы вялікі мураваны млын з сям'ю коламі, дзе мука малолася не са збожжа, а з камянёў. Менеск быў чараўнік і зрабіў так, што яго ніхто ніколі не бачыў, толькі ўначы на млыне былі чутны нейкія незразумелыя крыкі, кшталту гікання, музыка і скокі. Ды яшчэ апоўначы чулі, як Менеск раз'язджае на сваім млыне па навакольных дарогах ды збірае сабе ў дружыну дужых і храбрых людзей, ад якіх потым тут і ўтварыўся асобны народ.



*Волат (мастак В. Славук)*



*Жалезны волат, ахоўнік балот (мастак В. Славук)*

Дружыннікі Менеска былі яшчэ і хаўруснікамі ў ягоных разбойных справах: разам яны рабавалі ў наваколлі. У тутэйшых жыхароў захавалася нават прымаўка: «*Не пайду я да Менска ад шляху Віленска, а (калі) пайду па шляху Віленскім, спаткаюся з Менескам*». Нарэшце людзям надакучыла рабаўніцтва Менеска і яны звярнуліся па дапамогу да яшчэ больш магутнага чараўніка. Той і сапраўды дапамог: спаліў небяспечны млын, прагнаў назаўсёды Менеска, але памяць пра яго захавалася ў назве горада.

У паданні пра Магілёў распавядаецца, што на месцы сённяшняга горада стаяў цёмны і непраходны лес, там жыў страшны разбойнік Машэка. Ён валодаў неверагодна моцнай фізічнай сілай, як асілкі і волаты:

> «адною рукою спыняў экіпаж з васьмерыком коней на ўсім скаку, ухапіўшыся за калясо, і за раз вырываў з карэннем высокія сосны, а хадзіў ён у мядзвежай скуры, поўсцю наверх. Машэка наводзіў жах на ўсе навакольныя селішчы. Не раз выходзілі супроць яго цэлымі палкамі; але ён жыў у такой непраходнай пушчы, што ніхто не знаходзіў не толькі яго бярлогі, але і дарогі назад, і ўсе або паміралі з голаду, або гінулі ад удару кісцянём».

Калі Машэку напаткала смерць ад каханай жанчыны, яго пахавалі ў пушчы разам з касцямі ягоных ахвяр, насыпаўшы над імі велізарную гару. Потым высокую Машэкаву магілу сталі зваць «Магілай льва». З часам на гэтым месцы з’явіўся горад Магілёў.

На гарадзішчы каля вёскі Ніз Слонімскага раёна таксама жылі асілкі, якія вырывалі з каранямі хвоі і хадзілі, абапіраючыся на іх. Таўшчыня калена ў велiканаў дасягала аднаго аршына.

Даволі частыя паданні пра асілкаў, якія жылі на гарадзішчах па розных берагах ракі і перакідваліся камянямі, жорнамі, каменнымі

або меднымі сякерамі. Напрыклад, багатыры гарадзішча Замак у вёсцы Каменка Смалявіцкага раёна біліся з багатырамі Юзэфаўскага замка праз балота, па якім цячэ рака Усяжа. У Веткаўскім раёне непадалёк ад вёскі Вялікія Нямкі ёсць Чэнчыкава і Серыкава горы. Паводле легенды, на гарах жылі асілкі Серык і Чэнчык, якія час ад часу перакідваліся паміж сабой каменнымі сякерамі. На гары Літоўка каля вёскі Чарнавокі Верхнядзвінскага раёна нібыта *«ў час даўняй вайны жылі асілкі-літоўцы»*, якія кідалі каменныя сякеры на гару Заточынку каля вёскі Дабраплёсы, месца святкавання Купалля. Верылі, што адно з невялікіх азёраў на захадзе Беларусі ўтварылася ад падзення на зямлю вялікага каменя, які кінуў волат.

Шмат паданняў пра асілкаў, што перакідваліся сякерамі і іншымі рэчамі, існуе на Смаленшчыне. Напрыклад, адзін велікан жыў на гарадзішчы каля вёсак Яршы і Ладыжыцы, а другі на гарадку каля Саборнай плошчы ў самім Смаленску. Нібыта яны перагаворваліся па трубе і перакідваліся сякерамі. Каля Гнёздава на адным з гарадзішчаў пасялілася шэсць братоў. Яны перакідваліся сякерамі і жалезнымі рыдлёўкамі з шасцю сваімі братамі-багатырамі, якія жылі на суседнім гарадзішчы. А багатыр, жыхар вёскі Гарадок, час ад часу выязджаў на кані і перакідваўся сякерай з багатыром суседняга гарадзішча.

Навукоўцы лічаць, што міфічныя асілкі і іх перакідванне паміж сабой камянямі або каменнымі сякерамі атаясамліваюцца з богам навальніцы Перуном. Яны, як і бог карыстаюцца ягонай зброяй — каменнымі сякерамі і жорнамі. У той жа час асілкі з'яўляюцца супернікамі Вялеса ў ягоным хтанічным пераўва-



*Менеск і ягоны млын (мастак В. Кульваноўскі)*

сабленні. Ва ўсялякім разе пра гэта сведчаць іншыя беларускія легенды, паданні і казкі, дзе асілкі набываюць рысы культурных герояў — міфічных кавалёў ці аратаяў.

Так, паводле падання, Камянецкую вежу пабудаваў вялізарны каваль, легендарны князь Радар і, седзячы ў ёй, чакаў прыходу агромністага змея Крагавея, які служыў у польскага караля Ляха і панадзіўся ва ўладаннях каваля губіць жывёлу. Але Радар не проста сядзеў, а пры дапамозе свайго гіганцкага молата стварыў агромністы плуг. І, калі Крагавей, прыцягнуты незвычайнымі ўдарамі молата, прыляцеў, каваль-князь разам са сваёй дружынай прымусіў яго ўпрэгчыся ў плуг. Потым Радар пачаў араць на змеі, а калі дайшлі да ракі, загадаў: «*Гайда, бух*!», каб той кінуўся ў раку. Змей жа паспеў вырвацца, затое ўтапіў плуг, жалезныя лемяшы якога, паводле падання, яшчэ доўга тырчалі з вады. Напалоханы змей прыбег да свайго гаспадара Ляха і, канаючы, паспеў крыкнуць: «*Помні, ляша, па Бух наша*!» З таго часу мяжа з Польшчай стала праходзіць па Бугу (Буху), а пабудаваная Радарам вежа дагэтуль стаіць у Камянцы.



*Помнік легендарнаму асілку (г. Свіслач, Гродзенская вобл.)*

З асілкамі-волатамі звязваюць многія вялікія валуны. Прыкладам, камень каля вёскі Васевічы Дзятлаўскага раёна называюць Камень-Багатыр. Пра Князь-Камень каля Плешчаніц Лагойскага раёна расказваюць, што ім нібыта граў асілак. Акамянелымі мужчы-

намі-веліканамі лічацца камяні каля вёсак Горкі ў Чэрвеньскім раёне (Камень Волат) і Бярозаўшчына (Божы Дар) у Барысаўскім раёне (Князь-Камень). Пра камень каля вёскі Ратынцы Валожынскага раёна паданне гаворыць, што аднойчы волат ішоў на бітву праз лес. Старыя ворагі яго падпільнавалі і забілі. Мёртвы волат упаў на зямлю і ператварыўся ў камень.

З асілкам Янкам паданне звязвае камень каля вёскі Якімавічы Слонімскага раёна. У Янкі была нявеста-прыгажуня. Пра дзяўчыну даведаўся двухгаловы Змей і прыляцеў, каб забраць яе. Асілак стаў біцца са Змеем. Меч Янкі прытупіўся, і ён у адчаі выгукнуў: «*Эх, і патачыць няма чым! Хоць бы камень які пад рукой аказаўся!*». Раптоўна перад ім вырасла скала. Змей не змог дастаць асілка сваім мячом і сакануў па камяні. Скала раскалолася і выбіла цмокаў меч. Пасля гэтага хлопец дабіў Змея.



*Волат*
*(выява на пячатцы г. Вільні)*

Змей і асілак таксама фігуруюць у паданні пра адно з азёраў у Дубровенскім раёне. Апавядаецца, што калісьці на возеры жыў Змей-Волат, які еў жывёлу і людзей. Людзі доўга змагаліся з ім і ніяк не маглі перамагчы. І вось з'явіўся асілак. Ён забіў Змея і рассек яго на тры часткі: галаву, тулава і хвост. Кожную частку закапаў у асобную магілу. Утварыліся тры курганы, якія сталі называць Змяінкі.

Яшчэ ў нядаўнія часы рэшткі волатаў-асілкаў, або як іх яшчэ называлі — *вялікалюдаў*, бачылі ў знойдзеных костках мамантаў і іншых вымерлых жывёл. Такія косткі стараліся захоўваць. Іх трымалі не толькі ў дамах, але і замках, ратушах, храмах. У вёсцы Сідорак былога Раслаўскага павету на Смаленшчыне ў капліцы ляжала вялікая костка, якую лічылі «*тапарышчам ад сякеры*» велікана — заснавальніка вёскі. З выкапнёвых костак саскрабалі парашок і пілі яго з вадой як лекі.

# Глава 4

# СВЯЦІЛІШЧЫ І СВЯТАРЫ, ЖРАЦЫ, ВАЙДЭЛОТЫ

***Свяцілішчы***, або ***капішчы***, ***трэбішчы***, ***кумірні***, ***храмы ідальскія*** — месцы маленняў і ахвярапрынашэнняў старажытных людзей. Паводле сваёй значнасці, яны былі родавыя або для аднаго паселішча, а маглі належаць аднаму ці некалькім суседнім плямёнам. Найчасцей свяцілішчы месціліся на ўзвышшах, выспах і мысах сярод балот, на беразе рэк і азёр, каля крыніц і вытокаў рэк.

Па сваёй канструкцыі гэта былі штучныя насыпы ў выглядзе круглай або авальнай пляцоўкі з прыўзнятым або ўвагнутым цэнтрам. Дыяметр пляцоўкі ў розных выпадках вагаўся ад 4 да 30 м. Тут стаялі пад адкрытым небам ідалы і ахвярнікі, сюды прыходзілі маліцца. Археолагамі зафіксаваны рэшткі рытуальных вогнішчаў у гонар бога Сонца — попельнікі і глінабітныя ахвярнікі, якія датуюцца XIII–XI стст. да н.э. Пазней такія месцы сталі агароджваць і пакрываць дахам, так узнікалі ідальскія храмы ці вялікія дамы.

У старажытнасці існавалі своеасаблівыя абсерваторыі — так званыя ***капішчы-календары***. У эпоху энеаліту на тэрыторыі сённяшняй Англіі была ўзведзена пабудова, якую пазней празвалі Стоўнхендж. Яна ўяўляе сабой два канцэнтрычных кола, якія складаюцца з 38 пар вертыкальна пастаўленых камянёў. Трэцяя пабудова ўключае ўкапаныя ў зямлю камяні, перакрытыя каменнымі плітамі. Гэта самая старажытная астранамічная пабудова ў Еўропе для назірання ўсходу і заходу нябесных свяцілаў, неабходных для вызначэння часу. Падобная пабудова знойдзена навукоўцамі і на тэрыторыі Румыніі.

Сляды старажытнай абсерваторыі з камянёў выяўлены на высокім беразе Янавага возера каля вёскі Бікульнічы, што паблізу Полацка. Насупраць гэтага ўзвышша гара Валатоўка, дзе і цяпер на Купалле запальваюць вогнішчы. Дзве каменныя кампазіцыі мелі П-падобную форму. У цэнтры малой кампазіцыі знаходзіўся паўтараметровы валун. Калі назіраць з яго вяршыні на верхавіну такога ж па абрысах буйнога каменя ў вялікай кампазіцыі, то прасочваецца кірунак на ўзыход сонца.

Каляндарна-астранамічным комплексам магла быць група валуноў каля вёскі Сцебіракі Вілейскага раёна. Тут пяць абцясаных валуноў з выбітымі выявамі складаюць адзін за адным кампазіцыю па лініі поўдзень — поўнач. На чатырох камянях выбіты сімвалы рагоўрытонаў і шост з трохкутнікам або паўколам на яго вяршыні. Сім-

воліка рога звязана з атрыбутыкай бостваў. Гэта сімвал плоднасці і ўрадлівасці. Рогі-рытоны сустракаюцца на скульптурных выявах язычніцкіх ідалаў па абшарах Еўразіі. Ёсць яны і на знакамітым Збручскім ідале. Некаторыя навукоўцы лічаць, што выява шаста з трохкутнікам можа суадносіцца з палярнай зоркай, у славян гэта кол-зорка.

Пасля прыняцця хрысціянства на месцах многіх язычніцкіх свяцілішчаў узводзілі хрысціянскія храмы. Так, падчас археалагічных раскопак было выяўлена, што пры будаўніцтве Віленскага катэдральнага касцёла яго галоўны алтар узвялі на тым месцы, дзе гарэў агонь паганскіх часоў.

Каля вёскі Прудок на Браншчыне выяўлена круглая ў плане пабудова дыяметрам 5 м. Там знойдзена егіпецкая пячатка пачатку н.э. з блакітнай пасты і выявай льва. Побач адкапана яшчэ адна пабудова, дзе быў посуд з магічнымі знакамі.

Круглая пляцоўка дыяметрам 6 м, абкружаная слупамі, якія стаялі праз 20–35 см, выяўлена на гарадзішчы-сховішчы другой чвэрці I тысячагоддзя каля вёскі Тушамля на Смаленшчыне. У цэнтры пляцоўкі захавалася яма ад драўлянага ідала. Да гэтага ж часу адносіцца язычніцкі культавы аб'ект на гарадзішчы каля вёскі Карабанавічы Дубровенскага раёна на Віцебшчыне. Тут некалі была круглая пляцоўка з раўкамі па коле. У цэнтры таксама зафіксавана ямка ад ідала. Рэшткі ахвярнага комплексу выяўлены на гарадзішчы трэцяй чвэрці I тысячагоддзя побач з вёскай Банцараўшчына каля Мінска. Тут на пляцоўцы паміж камянямі былі складзены косці розных жывёл, а ўздоўж краёў стаяла 20 гліняных пасудзін з абвугленымі зярнятамі пшаніцы, гароху і проса.

Больш вядома пра свяцілішчы канца I — пачатку II тысячагоддзяў. Уявіць іх можна па выніках раскопак у Ходасавічах Рагачоўскага раёна і Верхаўлянах Бераставіцкага раёна. Ходасавіцкае свяцілішча знаходзілася на ўскраіне тагачаснага паселішча на беразе возера Святое (Добрае). Яго цэнтральную частку складала круглая ў плане пляцоўка дыяметрам 7 м, вакол яе ішла канаўка, дзе стаяў вастракол, а пасярод пляцоўкі ў паглыбленні знаходзіўся ідал. З чатырох бакоў ад краю свяцілішча месціліся серпападобныя ямы, арыентаваныя па баках свету, там падчас язычніцкіх рытуалаў запальвалі вогнішчы. Лічыцца, што свяцілішча было прысвечана Перуну, але не выключана, што і Хорсу — богу Сонца. Падставай для такога меркавання служыць назва ўрочышча — Хоршава.

Верхаўлянскае свяцілішча ў народзе завецца Гарадзішча. Вал і роў, якія з трох бакоў абкружалі яго, выконвалі сакральную функ-



*Рэканструкцыя свяцілішча*
*X – пач. XVII ст. каля вёскі Верхаўляны*
*(Бераставіцкі р-н, Гродзенская вобл.)*



*Рэканструкцыя свяцілішча (канец X ст.)*
*каля вёскі Ходасавічы (Рагачоўскі р-н,*
*Гомельская вобл.)*

цыю. Пры археалагічных раскопках на дне рва прасочаны сляды вогнішча, знойдзены фрагменты глінянага ганчарнага посуду, жалезны нож, апрацаваны крэмень, косткі жывёл. Свяцілішча выкарыстоўвалася яшчэ і ў часы Сярэднявечча. Непадалёк ад свяцілішча — урочышча Перунова Поле. Паводле павер'яў, калі хто апынецца там у час навальніцы, у таго абавязкова ўдарыць маланка. На падставе гэтых фактаў даследчыкі звязваюць Верхаўлянскае свяцілішча з Перуном. Падобны па форме аб'ект знаходзіцца каля вёскі Хільчыцы Жыткавіцкага раёна на Палессі. Тут вяршыня вала на некалькі метраў ніжэй пляцоўкі гарадзішча. Побач выяўлены сляды паселішча канца I — пачатку II тысячагоддзяў.

Функцыі свяцілішчаў маглі выконваць і многія гарадзішчы, у першую чаргу тыя, што носяць назвы *Перунова Гара*, *Дзявочая Гара*, *Капішча*, *Паненская Гара.* Напрыклад, ёсць Пірунова (Перунова) Гара на востраве Асвейскага возера. На тым жа востраве існавала царква Багародзіцы. Лічылася, што яна пабудавана на месцы язычніцкага капішча. На гарадзішчы каля вёскі Радагошча Навагрудскага раёна, што на левым беразе ракі Неўда (прыток ракі Сэрвач, упадае ў Нёман), таксама магло існаваць свяцілішча. Цікава, што назва вёскі аднайменная з назвай культавага цэнтра палабскіх славян. Непадалёк ад гарадзішча ёсць урочышчы Бабіна Гара і Крашчаніца. Тут знойдзены скарб бранзалетаў канца I тысячагоддзя. Увогуле, пра шматлікія гарадзішчы захаваліся паданні пра закапаныя

там скарбы, якія ўначы выходзяць на паверхню і свецяцца агеньчыкамі. Сярод навукоўцаў існуе меркаванне, што такія гарадзішчы таксама маглі быць некалі свяцілішчамі. Так, пра Варганскую Гару ў Докшыцкім раёне расказваюць не толькі пра скарб, які аб'яўляецца ў розных выглядах, але і пра закапаную там трохпудовую жабу. А на тураўскім гарадзішчы нібыта закапана мядзведжая скура з золатам. Менавіта тут археолагамі выяўлены сляды язычніцкага свяцілішча.

Побач з вёскай Кіявец Крупскага раёна сярод балота знаходзіцца невялікае гарадзішча пад назвай *Капказ*. Яшчэ не так даўно тут спраўлялі Вялікдзень і Купалле, а таксама існавала традыцыя, калі маладым пасля рэгістрацыі шлюбу трэба было абавязкова ехаць на гару і там выпіць шампанскае. Гара *Каўказ* ёсць і каля вёскі Стукаўшчына непадалёк ад Лынтупаў у Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці. Побач з гарой урочышча Падбаба, дзе знаходзяцца святая крыніца, камень-следавік і камень-ахвярнік. Сугучнай з'яўляецца назва горада *Капыль*, дзе ёсць гарадзішча. Назвы кшталту Капказ, Капыль, Ка́ўказ і да таго падобныя зусім не выпадковыя. Старажытнаславянскае слова «*кап*» азначае выяву (статую) бога. Слова «*kaukas*» у перакладзе з літоўскай мовы азначае «*чорт*», або хтанічную дабрачынную істоту. Да таго ж, Чорт у балцкай міфалогіі з'яўляўся боствам ніжняга свету.

Яшчэ ў XII ст. Кірыла Тураўскі наракаў на мясцовых жыхароў, што тыя «*клалі трэбы горам*». Пра пакланенне ўзгоркам сведчаць летапісы XVI ст. У гістарычнай і краязнаўчай літаратуры XIX ст. сустракаецца шмат інфармацыі пра маленні на ўзгорках. У Рэчыцкім павеце пра ўзгорак Святая Грыва людзі казалі, што там «*тварыліся ідальскія трэбы*», а на Чорнай Гары каля Невеля — «*стаяла паганская кумірня і прыносіліся паганскія ахвяры*». У Навагрудку мясцовыя жыхары былі ўпэўнены, што каля падножжа Замкавай Гары некалі знаходзілася капішча Перуна. Паводле фальклорных дадзеных, капішча існавала і на гарадзішчы каля вёскі Войстам Смаргонскага раёна, там нават стаяў ідал. Язычніцкая малельня была і на гарадзішчы ў Крычаве. Ёсць згадкі пра існаванне капішча Перуна і Бабы Ягі на беразе возера Валовае каля Полацка. Пра Малібоўскую Гару каля вёскі Быстрыца Капыльскага раёна казалі, што «*на гары была кумірня*».

Шэраг свяцілішчаў асноўным паклонным аб'ектам мелі вялікі камень ці камень незвычайнай формы. Так, на Аршаншчыне каля вёскі Сімахі на беразе Дзевінскага возера ёсць высокая гара, дзе стаяла цэркаўка. Побач курганны могільнік, і на адным з ягоных насыпаў яшчэ ў 1920-я гг. быў ідалападобны камень. На ўзгорку пад

назвай Гай каля вёскі Воўкаўшчына Мёрскага раёна Віцебшчыны выяўлена выбрукоўка з вялікіх камянёў. З аднаго боку ад узгорка гарадзішча, а з другога камень-следавік.





*Свяцілішча з каменем на беразе Віліі каля вёскі Ашмянец (Смаргонскі р-н., Гродзенская вобл.)*

Каля вёскі Ашмянец Смаргонскага раёна на высокім беразе Віліі і сёння ляжыць камень, а побач курганны могільнік, дзе пры раскопках знойдзены рэчы XIII ст. Пра гэты камень існуе шмат паданняў. Расказваюць пра закапаную каля яго павозку ці човен з золатам, пра начныя ззянні на камені. Адна з версій падання распавядае, што ў Жодзішках пачалі будаваць касцёл і для гэтага сабралі камяні. Чэрці ж вырашылі перашкодзіць будаўніцтву і сталі скідваць камяні ў Вілію, каб перагарадзіць раку. Рабілі гэта ноччу. Пад раніцу, калі адзін чорт нёс самы вялікі камень, праспяваў певень. Чорт выпусціў валун, і той упаў на бераг ракі. Існуе і другое паданне, дзе расказваецца пра аднаго чалавека, які каля каменя сустрэў прыгожа апранутую дзяўчыну з доўгімі русымі валасамі. Яна папрасіла яго прыйсці да каменя менавіта ў дванаццаць гадзін апоўдні, калі ладзіцца касцельная імша. Назаўтра чалавек прыйшоў у прызначаны час і ўбачыў на камяні вужа. З перапуду ён прамовіў: «*Згінь ты, прападзі!*». Змей адказаў: «*Пракляў ты*

*мяне навекі!»* і знік. У народзе лічаць, што ў абліччы вужа была тая самая дзяўчына, якую сустрэў чалавек.

Вядома, што такія персанажы падання, як Чорт і Змей, маюць адносіны да тагасвету таму, гэта дае падставы лічыць месцы, звязаныя з імі, былымі капішчамі Вялеса або Вяльняса, які ў беларускіх старажытных вераваннях з'яўляўся апекуном мёртвых і замагільнага свету. Ён таксама загадваў багаццямі. Таму і невыпадковыя паданні пра закапанае каля каменя золата.

Так, Вялес мае адносіны і да капішча з каменем каля вёскі Валэйкішкі Астравецкага раёна. Паводле падання, каля каменя жыў цмок Вяль. Ён перакідваў валун, забіраў у сялян жывёлу, а яны ніяк не маглі перамагчы яго. Тады адзін чалавек узяў скуру авечкі, набіў яе саломай і серкай і падсунуў Вялю. Той палічыў, што гэта сапраўдная авечка і праглынуў. Потым зароў і здох.

Яшчэ не так даўно на ўзвышшы сярод Пеннага балота паблізу вёскі Лапухова Слонімскага раёна святкавалі Купалле. Узвышша ўяўляла сабой груд, абнесены ровам, на вяршыні якога быў некалі насып з вялікіх камянёў. Па аднаму з паданняў, тут стаяў горад і ў адзін момант праваліўся пад зямлю. Паводле другога падання, была вёска, і яе спаліў Змей. Трэцяя версія распавядае пра вялізны Чортаў камень, што ляжаў на той гары, на ім былі сляды дзіцячай нагі, авечкі і другіх жывёл. У народзе верылі, што каля каменя некалі збіраліся і таньчылі чэрці. На жаль, у 1970-я гг. падчас меліярацыі гэты камень знішчылі.

На паганскім свяцілішчы каля Мар'інай Горкі (цяпер гэта цэнтр Пухавіцкага раёна) некалі ляжаў паклонны камень. Легенда сцвярджае, што хрысціянскі святар закляў гэта месца. Камень быццам раскалоўся і праваліўся.

Яшчэ ў пачатку XX ст. валун Дзед, або Стары, з'яўляўся асноўным сакральным аб'ектам на капішчы пад назвай *«Малельня ля каменя»* на беразе Свіслачы ў Мінску.



*Паклонны камень з трыма паглыбленнямі, вёска Юршышкі ў Воранаўскім раёне Гродзенскай вобл. (малюнак В. Шукевіча, пачатак XX ст.)*



*Свяцілішча на беразе возера Цётча (у сучаснай Віцебскай вобласці). Рэканструкцыя В. Сташчанюка па дадзеных Э. Ляўкова*

Камень палівалі малаком, мёдам, віном, абвівалі ручнікамі, палотнамі, фартухамі. Тут была крыніца і рос дуб, жалуды з якога лічыліся цудадзейнымі. Побач існавала царква. Хадзілі і ў храм, і да каменя. Царкоўнікі стараліся ўпэўніць, што гэта месца паганае, там жыве ведзьма і збіраюцца чэрці. Апекаваўся капішчам язычніцкі святар Севасцей, ён памёр у канцы XIX ст. Папы і ксяндзы праклялі яго, забаранілі хаваць на могілках. Пазней яго замяніў сын. Малельня была разбурана толькі напярэдадні руска-японскай вайны 1905–1907 гг. Але патаемна капішча працягвала існаваць, яго даглядаў Севасцей малодшы, які быў рэпрэсіраваны ў 1930-я гг.

Да нашага часу дажыло ўшанаванне Святому, або Дажджбогаваму, каменю каля вёскі Крамянец Лагойскага раёна. І цяпер падчас засухі каля яго збіраюцца 9 удоў, падкладаюць калочкі пад камень і на іх прыўздымаюць валун. Лічаць, што праз тры дні абавязкова павінен пайсці дождж. Вакол каменя зроблена выбрукоўка па баках свету. У некалькіх метрах знаходзіцца калодзеж-крыніца, які ўжо

амаль перасох. Яшчэ напачатку XX ст., побач стаяла драўляная капліччка. Некалькі разоў на год, асабліва на Іллю, тут ладзілі святы.

Некалі на некаторых свяцілішчах пакланяліся такім сакральным дрэвам, як дуб, у драўніну якіх былі ўбіты сківіцы дзікоў. Такія дубы знойдзены ў Дняпры і Дзясне, куды тысячу гадоў таму назад іх скінулі хрысціянскія місіянеры. Па дадзеных радыёўглероднага аналізу, такая знаходка з Дзясны датуецца менавіта 980-мі гг.

Прамых дадзеных пра існаванне на нашых землях язычніцкіх храмаў, падобных на тыя, што былі ў заходніх славян, пакуль не знойдзена. Але існуюць думкі, што ідалы маглі стаяць або захоў-



*Язычніцкае капішча на беразе Свіслачы ў Менску (святы зніч Жыжа, камень Дзед і дуб Волат) /Рэканструкцыя В. Сташчанюка па дадзеных Э. Ляўкова*



*Свяцілішча заходніх славян у выглядзе стадолы (рэканструкцыя)*

вацца ў невялікіх стадолах, магчыма, і на слупах. Сведчаннем таго, што стадолы ці гумны былі месцамі пакланення паганскім боствам, можа служыць звычай, які існаваў яшчэ ў XIX ст. на Дзяды напярэдадні Сёмухі. У некаторых вёсках гаспадар браў у адну руку ручнік і кубак піва, а ў другую — посуд са стравамі і ішоў у гумно. Там слаў ручнік, на яго канцы ставіў ежу і пітво. Пасярэдзіне ручніка станавіўся на калені, маліўся, а потым пакідаў усё прынесенае продкам як ахвяру.

Рэліктамі ідалапаклонства з'яўляюцца бажніцы ў пярэднім, ці *красным*, куце сялянскай хаты. Пра гэта ў XIX ст. пісалі многія святары і этнографы. Напрыклад, адзін са святароў у наваколлі Полацка адзначаў, што бажніца ў хаце ўяўляе сабой паліцу, на якой расстаўлены «богі». Гэта іконы, лубачныя маляванкі і драўляныя скульптуркі, апранутыя ў сарафаны з каляровых анучак. Усё гэта накрыта набожнікам (ручніком). Перад такой бажніцай штодня моляцца. У некаторых хатах скульптуркі стараліся трымаць за абразамі, а на пытанні святароў адказвалі, што гэта цацкі.

Ролю язычніцкіх свяцілішчаў выконвалі і пячоры. Былі яны і на тэрыторыі Беларусі. Прыкладам, пячора каля былога маёнтка Гедэйкі паблізу вёскі Стульгі Ашмянскага раёна яшчэ ў XIX ст. лічылася былой царквой і мела назву Царкоўе. У той жа час было зафіксавана паданне пра пячору каля мястэчка Масты на Гродзеншчыне

і пустэльніка, які жыў у той пячоры пад гарой і карміўся з жабрацтва. Ён выходзіў на дарогу з сваім столікам, маліўся каля яго, а калі заўважаў каго з вандроўных, дык адразу хаваўся ў лес. На столік, які ён пакідаў пры дарозе, людзі клалі свае ахвяраванні. Жабрака і столахвярнік можна параўнаць з язычніцкім капішчам і адмысловым жрацом-святаром.

Службы на капішчах правілі язычніцкія святары — так званыя ***жрацы*** або ***вайдэлоты***, ***вешчуны***. У першую чаргу яны лічыліся захавальнікамі свяшчэннага агню. Агонь ахоўвалі як мужчыны, так і жанчыны. Калі па іх віне свяшчэнны агонь затухаў, то іх саміх спальвалі на новым вогнішчы.

Яны сачылі таксама за каляндарна-астранамічнымі зменамі, за правядзеннем абрадаў варажбы, за рэлігійнымі святамі, займаліся знахарствам, былі складальнікамі, спевакамі і захавальнікамі эпічных твораў. У Тураве запісана паданне «Пра папа ідальскага», дзе апавядаецца пра святара ў свяцілішчы каля горада. Той дапамагаў хворым людзям, але потым князь забараніў шанаваць паганскіх багоў, і святар спыніў сваю дзейнасць.

Некалі вярхоўным святаром на значнай частцы сучаснай Беларусі лічыўся Крыве-Крывейтэ або *жрэц жрацоў*, якога уяўлялі ў вобразе старога з сімвалам улады — крывой палкай (жэзлам), аздобленай двума жалезным крукамі наверсе. Постаць жраца была сямікратна абвязана поясам з белага тонкага палатна. Падчас абрадаў на ягонай галаве быў высокі ўбор або мітра. Спачатку яго асноўнае свяцілішча было ў Ромаве на тэрыторыі Прусіі, потым у Кернаве, а затым у Вільні. Крыве-Крывейту выбіралі ўсе астатнія жрацы, якія называліся *крыве* ці *крэве*.



*Вайдэлоты – ахоўнікі святога агню (мастак М. Рэрых)*



*Крыве-Крывейтэ (рэканструкцыя)*

З Крыве-Крывейтэ атаясамлівалі Ліздзейку, якога называлі найвышэйшым *«паганскім біскупам»*, *«варажбітом»*, *«папом паганскім»*. Постаць Ліздзейкі авеяна паданнямі. Кажуць, ён быў знойдзены ў арлiным гняздзе князем Віценем, бацькам Гедыміна. Такое паданне адпавядае агульнаеўрапейскім казачным матывам пра цудадзейнае паходжанне галоўнага героя. Пры двары князя Ліздзейка зрабіўся варажбітом астранамічных з'яў і тлумачальнікам сноў. Так, ён змог разгадаць сон Гедыміна пра жалезнага ваўка, які той прысніў падчас палявання на Туравай Гары. Згодна з тлумачэннем, на гары трэба пабудаваць горад Вільня, які і стане сталіцай дзяржавы. Гэтае паданне пераклікаецца з падобным паданнем пра ўзнікненне Турава.

Захавальніц свяшчэннага агню называлі таксама вайдэлоткамі. Найчасцей гэта былі прыгожыя дзяўчаты са знакамітых і знатных радоў. Паводле звычаю, яны мелі права адслужыць жрыцамі пэўны час, а потым маглі вяртацца да свецкага жыцця. Але тыя, хто вырашыў прысвяціць усё сваё жыццё гэтай пачэснай справе, абавязаны былі да смерці захоўваць зарок цнатлівасці. Старых вайдэлотак не было, у сталым веку яны перасяляліся ў пустынныя мясціны, дзе займаліся знахарствам і варажбой. Паводле летапісных звестак, жонка вялікага князя Кейстута Бірута таксама была вайдэлоткай. Ён выкраў яе і ажаніўся.

Адгалоскі гэтага факта адлюстраваліся ў сюжэце падання, распаўсюджанага ў XIX ст. на берагах Нёмана. Расказваецца, што адна вайдэлотка была абвінавачана ў сувязі з невядомым рыцарам і прысуджана да пакарання. Калі яе везлі на дзвюх чорных каровах, каб зашыць у мех разам з кошкай, сабакам і змяёй, а потым утапіць у Нёмане, нечакана з ракі выскачыў конны рыцар у чорных латах і шлеме, вызваліў святарку і загадаў абвянчаць іх на беразе ракі.

Потым абняў вайдэлотку, ускочыў з ёю на каня, пасля чаго яны зніклі ў вадзе. Услед ім кінулі мех з жывёламі. Расказваюць, што з тых часоў вада ў гэтым месцы пачала круціцца і кіпець. А нябожчыца пры невыразным святле месяца пад лямант кошкі, лай сабакі і сычэнне змяі з'яўляецца на беразе з дзіцёнкам на руках і спявае жалобныя песні. Часам рыбакі бачаць яе ў суправаджэнні чорнага рыцара.

Сустракаюцца ўзгоркі з назвамі кшталту *Дзявочая Гара*, *Дзявіч-Гара*, *Дзеўчына Гара* і інш. Такія горы звязаны з культам багіні кахання і ўрадлівасці. Пра іх існуюць разнастайныя паданні. На Дзявочай Гары каля вёскі Дуброва Маладзечанскага раёна ляжаў камень і захавалася каля двух дзесяткаў курганных пахаванняў XI–XII стст. Археалагічнымі раскопкамі выяўлена, што ў вялікіх курганах пахаваны мужчыны, але ў асноўным гэта магілы жанчын. Існуе меркаванне, што гэта магілы жрацоў і вайдэлотак. Паводле падання, на вяршыні гары жывой закапана дзяўчына і разам з ёй пахаваны два хлопцы, якія загінулі ў час спаборніцтва за права стаць яе мужам. Дзяўчына нібыта сядзела на камяні, калі хлопцы дужаліся. Яшчэ не так даўно на гары святкавалі Купалле.



*Язычніцкі святар Лідзейка з дачкой на руінах храма Перуна (мастак К. Альхімовіч)*

Статус жрацоў надоўга захавалі так званыя *старцы* або *жабракі*, *божыя ці падарожныя людзі*. Гэта тычыцца як мужчын, так і жанчын. На працягу ўсіх хрысціянскіх часоў у светаўспрыманні беларусаў яны надзяляліся магічнымі здольнасцямі, накшталт знахарства або варажбы. На шматлікіх кірмашах, якія адбываліся падчас рэлігійных свят, старцы садзіліся каля царквы, але ў саму царкву ніколі не заходзілі. Людзі прыносілі ім розныя падарункі і прасілі памаліцца за здароўе, а таксама «*за скацінку*» і «*за памерлых*». Ім давяралі больш, чым хрысціянскім святарам.

Гэта пацвярджаюць і многія беларускія паданні, дзе Бог пад выглядам жабрака-старца ходзіць па нашай зямлі і выпрабоўвае людзей на дабрадзейнасць, павагу і гасціннасць да падарожнікаў. А калі ён бачыць адваротнае, то насылае на паселішча розныя бедствы.

# Глава 5
# ІДАЛЫ

Язычніцтва ў першую чаргу атаясамліваецца з ідалапаклонствам — пакланеннем скульптурным выявам паганскіх багоў. Іх рабілі з дрэва, каменю, пясчаніку, косці, металаў.

Слова *«ідал»* больш ужываецца ў навуковым сэнсе. У народнай памяці і ў летапісах фігуруюць назвы — *балваны*, *богі*, *істуканы*, *куміры*, *стоды*, *ёлупы*, *каменныя бабы*. Часам сам ідал называўся капішчам або трэбішчам, ад гэтага старажытнага слова ў сваю чаргу пайшло слова «трэба». Існавала ў старажытных славян і кніга выканання трэб — пералік абрадаў і рытуалаў, якія здзяйснялі на капішчы — Трэбнік.

Храналагічны дыяпазон бытавання ідалаў вельмі шырокі — ад эпохі неаліту да XI–XII стст., а ў многіх мясцінах і значна пазней. Так, выявы мужчынскіх галоў, адна з дрэва, другая з рога, знойдзены пры раскопках паселішча эпохі неаліту і ранняга бронзавага веку каля вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна на Віцебшчыне.

Асноўная колькасць вядомых нам вялікіх каменных ідалаў адносіцца да канца I — пачатку II тысячагоддзя. Менавіта тады адбываліся спробы ўвесці язычніцтва ў ранг дзяржаўнай рэлігіі. Пра ідалаў ёсць згадкі ў «Аповесці мінулых часоў». На адной з мініяцюр Радзівілаўскага летапісу паказаны ідал, які змешчаны на невысокай калоне. Варта нагадаць, што многія навукоўцы лічаць месцам стварэння гэтага летапісу Полаччыну ці сам Полацк.

Атаясамліванне знойдзеных у наш час ідалаў з канкрэтнымі боствамі немагчыма. Але ў дамове князя Ігара з грэкамі 944 (945) г. згадваецца ідал бога Перуна ў Кіеве: «*Приде Игорь на холм, дзе стояше Перун...*», і там разам з дружынаю кляўся перад ім. Яшчэ адзін гістарычны дакумент — Пачатковы Летапіс ад 980 года — распавядае, што пасля таго, як князь Уладзімір пачаў княжыць у Кіеве, ён «*пастави кумири на холму вни Двора Теремного*». Далей гаворыцца, што гэта былі ідалы Перуна, Хорса, Дажбога, Стрыбога, Сімаргла і Мокашы.

Як сведчаць другія старажытныя летапісы, звычайна ідалаў ставілі на пагорках, як гэта было ў Кіеве, а таксама на берагах рэчак і азёр, капішчах, у святых гаях, язычніцкіх храмах. Паводле паданняў, на ўзгорках мястэчка Свір Мядзельскага раёна, у Крычаве, на беразе возера Валовае каля Полацка некалі пакланяліся Перуну. На тэрыторыі Беларусі сустракаецца шмат высокіх горак пад назвай Перу-

нова Гара. Але паблізу такіх гор ідалаў пакуль што не знайшлі. У сярэдзіне XIX ст. каля Кобрына адзін з пагоркаў называлі *Капішча Мажаны*.

Сёння на тэрыторыі Беларусі вядома больш за 30 знаходак язычніцкіх ідалаў, у асноўным каменных. Гэта пагрудныя чалавечыя выявы, слупы ў выглядзе чалавечых фігур і слупы з высечанымі наверсе тварамі, крыжападобныя выявы.

У экспазіцыі Нацыянальнага музея ў Мінску знаходзіцца ідал з акамянелага пясчаніку, знойдзены ў 1963 годзе каля Шклова на правым беразе ракі Серабранка, якая ўпадае ў Дняпро ва ўрочышчы Зязюлін роў. Гэта пагрудная выява мужчыны без рук. Са спіны фігура абчасана і мае выгляд слупа. Вышыня яго 1,2 м, вага — 250 кг.



*Фігурка чалавека з Усвяцкага тарфяніка на Віцебшчыне (эпоха неаліту)*

На Гарадзеншчыне ў Слонімскім краязнаўчым музеі захоўваецца ідал, высечаны з валуна чырвона-шэрага колеру, таксама ў выглядзе мужчынскага торсу без рук. Вышыня яго каля паўметра, а ніз скульптуры, таксама як і шклоўскай, клінападобны. Гэта сведчыць пра тое, што такія ідалы мелі яшчэ і пастамент з выемкай. Твар у слонімскага ідала плоскі, з завостранай бародкай, але без вусоў, нос шырокі і з гарбінкай, вочы і рот выразна прашкрабаныя. Гэ-



*Драўляная выява ідала, эпоха неаліту і бронзы, вёскаАсавец (Бешанковіцкі р-н., Віцебская вобл.)*

тага ідала знайшлі ў 1934 годзе на ўскраіне горада, калі пракладалі Альберцінскую вуліцу. Непадалёк на беразе Шчары ёсць урочышча Божымаў, дзе, паводле меркаванняў навукоўцаў, і магло знаходзіцца свяцілішча.

Пра гэтыя дзве язычніцкія скульптуры спецыялісты гавораць як пра помнікі, блізкія да надбалтыйскага гісторыка-культурнага абшару XI–XII стст. Гэта пацвярджаецца выразнымі паралелямі з тэрыторыі Памор'я, гістарычных Прусіі і Яцвягіі.

Некалькі каменных ідалаў захоўваецца ў музеі горада Себеж, які раней уваходзіў у склад Віцебскай губерні. На адным з іх выразна бачна шапка з адваротам. Себежскія ідалы былі знойдзены ў балотах.



*Ідал, знойдзены ў 1963 г. каля Шклова (Магілёўская вобл.)*

Два каменныя ідалы знаходзяцца ў Брэсцкім абласным музеі. Туды яны былі перавезены ў 1970-я гг. з вёсак Залуззе і Грабаўцы Жабінкаўскага раёна, дзе стаялі каля дарог і лічыліся святынямі. Меркаваць пра тое, калі яны там з'явіліся, складана. Хутчэй за ўсё, гэта было другаснае выкарыстанне ў часы Сярэднявечча. Ідал з Залуззя стаяў на поўдзень ад вёскі, непадалёк ад трасы Жабінка — Кобрын. Выява зроблена з валуна чырвона-шэрага колеру, вышынёй каля 90 см. На прадаўгаватым твары выразна відаць вочы і нос. Ад падбародка ідуць дзве лініі, якія абазначаюць рукі. На грудзях прашкрабаны крыж, што сведчыць пра колішнія асвячэнні. Ідал, які стаяў пры дарозе з Грабаўцаў на Стрэлле, блізкі па памерах, мае крыжападобную форму. Ён зроблены з валуна чырвона-попельнага колеру. Верх нагадвае галаву ў каптуры. Пад падбародкам таксама высечаны крыж.

Крыжападобны ідал вышынёй каля метра быў знойдзены ў 1986 годзе археолагамі паблізу вёскі Буцькі Пружанскага раёна. Яго выявілі на старых могілках побач з курганнымі пахаваннямі. На верхняй акругленай частцы выразна

прасочваюцца вочы, нос і рот, на грудзях высечаны крыж у крузе, рукі абазначаны невялікімі бакавымі выступамі.

Яшчэ адзін крыжападобны ідал вышынёй крыху больш за метр да канца XX ст. стаяў каля дарогі непадалёк ад мястэчка Даўгінава (каля хутара Мягчылы) Вілейскага раёна. Цяпер ён знаходзіцца ў Музеі валуноў у Мінску. На месцы «жывата» выбіта выпуклая выява маленькага крыжа-дзіцяці, якая нагадвае абрысы самаго крыжа-ідала. З адваротнага боку высечаны чатыры васьміканцовыя крыжы. Падобны ідал, толькі без рук, быў знойдзеныкаля Брэста (дзе ён знаходзіцца цяпер, пакуль што невядома).

Напрыканцы XIX ст. у літаратуры згадваюцца каменныя ідалы, якія стаялі пры дарогах каля вёскі Грыцавічы Бераставіцкага раёна, вёскі Чаплі на Пружаншчыне, на беразе возера Крывое каля вёскі Янава Ушацкага раёна, на гарадзішчы паблізу вёскі Войстам Смаргонскага раёна.



*Крыжападобны ідал з вёскі Буцькі (Пружанскі р-н., Брэсцкая вобл.)*

Ёсць звесткі пра знаходкі каменных ідалаў у выглядзе слупа з высечанай зверху галавой, або проста тварамі. Такія ідалы нагадваюць сусветна знакамітага Збручскага ідала, які быў знойдзены ў 1848 годзе у рэчцы Збруч (прыток Днястра). Мяркуюць, што ягонае першапачатковае месца было на гарадзішчы-свяцілішчы Богіт, што на Цярнопальшчыне. Гэты ідал уяўляе з сябе чатырохгранны слуп з шэрага вапняку, вышынёй 2,67 м, увенчаны выявай чатырохлікага боства пад адной шапкай. Навукоўцы суадносяць Збручскі ідал са шматгаловымі язычніцкімі боствамі, напрыклад з балта-славянскім чатырохгаловым Свентавітам, які сімвалізаваў сувязь і ўладу над усімі чатырма бакамі свету.

Аналагі гэтага ідала вядомы ўсім славянскім рэгіёнам, у тым ліку на Беларусі. Так, у 1887 годзе ў лесе непадалёк ад вёскі Ульянавічы Сенненскага раёна быў знойдзены чатырохгранны каменны слуп з выразнай галавой наверсе. Яго перавезлі і ўсталявалі на могілках. Вядома таксама, што нейкі чатырохтвары ідал яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. стаяў на ўзгорку пры дарозе паміж Рэчыцай і Бабруйскам, у да-

ліне Дняпра. Да Другой сусветнай вайны фота гэтага ідала захоўвалася ў архіве Беларускага дзяржаўнага музея, але ў 1941 годзе разам з іншымі матэрыяламі было вывезена ў Кёнігсберг.

Сустракаюцца і трохтварыя ідалы, якіх суадносяць з богам балтыйскіх славян — Трыглавам (ён уладарыў над трыма царствамі: небам, зямлёй і ніжнім светам). У Беларусі маленькі каменны трохтвары ідал (вышыня ўсяго 7,5 см) быў знойдзены каля вёскі Багуслаўка на Пружанчшыне і перададзены ў Варшаўскі археалагічны музей. У гэтым музеі таксама захоўваецца малюнак трохтварага ідала (вышыня 165 см), які раней знаходзіўся побач з каменнымі курганамі блізу вёскі Млыны Камянецкага раёна. Каля вёскі Бярвішчы



*Збручскі ідал, выява з чатырох бакоў (Заходняя Украіна)*

Уздзенскага раёна ва ўрочышчы Царкавішча некалі стаялі каменныя слупы, якія мелі выгляд чалавечых фігур. Пазней іх выкарысталі як падмуркі. У краязнаўчай літаратуры існуюць паведамленні пра каменныя слупы з высечанымі на іх тварамі, якія сустракаліся ў глухіх лясах па цячэнні Случы, Бярэзіны і Прыпяці.

На востраве Богінскага возера на Браслаўшчыне яшчэ сто гадоў таму назад стаяў ідал, высечаны з шэрага граніту, але з адбітай галавой. Скульптура была вышынёй у палову чалавечага росту і са складзенымі на грудзях рукамі. Потым яе скінулі ў ваду. Магчыма, тут

было і больш скульптур. Пра гэта сведчаць успаміны жыхароў бліжэйшых да возера вёсак, якія ў 1980-я гг. казалі, што *«раней на востраве стаялі літоўскія богі»*.



*Слонімскі ідал, знойдзены ў 1930-я гг.*

Прыхільнікі старой веры доўгія стагоддзі хавалі сваіх куміраў у глухіх балоцістых мясцінах, куды маглі прабірацца толькі людзі вузкага кола. У многіх раёнах ідалы захаваліся аж да XX ст. Ёсць паведамленні, што ў сярэдзіне XIX ст. каля Докшыцаў на Віцебшчыне мясцовае насельніцтва хавала ідала ад паліцыі і святароў. Далейшы лёс гэтага ідала невядомы. Архіўныя дакументы за 1924 год паведамляюць, што каля возера Святцэ паблізу вёскі Юр'ева Смалявіцкага раёна ляжыць у балоце затоплены *«язычніцкі істукан»*. У тым жа раёне ў 1980-я гг. у вёсцы Слабада людзі ўспаміналі, што на іх памяці ў 1930-я гг. стаяў каля вёскі каменны ідал, якога звалі *«Цар Давід»* і на якім выразна было бачна адзенне, падпяразанае поясам.

Ёсць звесткі пра каменных ідалаў на старых могілках: Хожава і Хоўхлава Маладзечанскага, Міжэвічы Ваўкавыскага, Юхнавічы Слонімскага раёнаў і іншых. Каменнага ідала з могілак каля вёскі Клепачы Слонімскага раёна перанеслі ў царкву ў вёсцы Івашкавічы Зэльвенскага раёна, дзе ён стаяў да канца XX ст. і якому насілі ахвяраванні. Каля вёскі Елізаравічы Рэчыцкага раёна на Гомельшчыне калісьці знайшлі *«каменную бабу»* і паставілі ў капліцу на могілках. Яе далейшы лёс невядомы.



*Ідал, знойдзены ў балоце каля г. Себеж (цяпер Пскоўская вобл.)*

Як апынуліся ідалы на могілках — цяпер меркаваць цяжка.

Яшчэ ў часы супрацьстаяння язычніцтва і хрысціянства прыхільнікі старой веры маглі такім чынам выратоўваць сваіх куміраў, таму што могільнікі заўсёды лічыліся недатыкальнай сакральнай прасторай. У народзе верылі: калі хто забярэ іх адтуль, таго чакае смерць.

Вылучаюцца тры моцна стылізаваныя ідалы з акамянелага пясчаніку. Адзін з іх вышынёй каля метра знойдзены ў 1925 годзе ў балаціне каля гарадзішча ў самім Ваўкавыску. Хутчэй за ўсё гэтага ідала калісьці скінулі з гарадзішча. Сёння ён захоўваецца ў Гродзенскім музеі. У сярэдзіне XIX ст. каля Навагрудка быў знойдзены ідал, таксама зроблены з акамянелага пясчаніку, пазней яго перадалі ў Віленскі музей старажытнасцяў. Далейшы ягоны лёс невядомы.



*Металічны ідальчык, знойдзены каля вёскі Стайкі (Валожынскі р-н, Мінская вобл.)*

Як і паўсюдна, большасць ідалаў рабілі з дрэва, таму яны да нашага часу не дайшлі. Але не выключана, што ў нашых вадаёмах могуць знаходзіцца закансерваваныя тысячагадовыя драўляныя ідалы, асабліва зробленыя з дубу. Могуць там быць і каменныя ідалы. У летапісах гаворыцца:

«Добрыня же идолы сокруши, древянии сожгоша, а камении изломав в реку ввергоша и бысть нечестивым печаль велика...»

Сустракаюцца і металічныя ідалы. У 1860-я гг. у лесе каля ракі Поня (прыток Бярэзіны) на тэрыторыі былога Барысаўскага павету сяляне ссеклі стары дуб, у дупле якога апынуліся два ідальчыкі — адзін сярэбраны, другі бронзавы. Іх забраў памешчык, далейшы лёс знаходак невядомы.

Да таго ж, у нашых продкаў было шмат розных ідалаў, у тым ліку хатніх, іх пільна хавалі ад чужых вачэй. Вядома, што купцы, каб ім паспрыяла ў гандлі, вазілі сваіх бажкоў з сабою ў падарожжы, а ваяры бралі на вайну для дапамогі ў вайсковай справе. Так, некалькі разоў у літаратуры згадваецца пра віцебскую знаходку 1684 года, калі ў разваліна старога будынка знайшлі залатога ідала на падстаўцы. Яго рассеклі на кавалкі і частку паслалі Папе Рымскаму. У сярэдзіне

XIX ст. каля Пінска і каля вёскі Багданава на Вілейшчыне былі знойдзены невялічкія металічныя статуэткі. Паводле заключэння Віленскай археалагічнай камісіі, пінская знаходка ўяўляе сабой выяву бога вайны Кавоса, а багданаўская — выяву літоўскай багіні Праўрымы. Ёсць таксама звесткі, што каменныя і бронзавыя ідалы захоўваліся ў музеі Полацкага кадэцкага корпуса.

У літаратуры XIX ст. маюцца згадкі пра ідалаў на Сярэбранай Гары каля вёскі Чыжы былога Бельскага павета Гродзенскай губерні (цяпер на тэрыторыі Польшчы). Паведамляецца, што там быў язычніцкі ахвярнік і стаялі пазалочаныя і пасярэбраныя *богі*. Аднаго з іх у народзе звалі Леляк.

На жаль, пакуль што цяжка атаясамліваць знаходкі ідалаў з пэўнымі боствамі, якіх яны ўвасаблялі.

# Раздзел III

# ЧАЛАВЕК — АД НАРАДЖЭННЯ ДА СМЕРЦІ

## Глава 1

## ЧАЛАВЕК ЯК МІКРАКОСМ І ЧАСТКА ПРЫРОДЫ

Тое, што чалавек з'яўляецца часткай прыроды і непарыўна звязаны з ёю, людзям вядома вельмі даўно. Нашы далёкія продкі добра адчувалі сваю сувязь і адзінства з прыродным светам. Таму не дзіўна, што чалавечы вобраз надаваўся не толькі боствам і духам, але і ўсяму космасу ў цэлым. Маецца на ўвазе папулярнае ў свой час касмалагічнае ўяўленне, згодна з якім Сусвет ёсць не што іншае, як агромністае касмічнае цела. Характэрнае для архаічнай свядомасці імкненне адухаўляць і ачалавечваць прыроду знайшло сваю лагічную выснову: Сусвет і ўвогуле ўвесь Космас не проста надзелены тымі ці іншымі чалавечымі якасцямі, а наўпрост падобны на самога чалавека. Такое бачанне прывяло да ўяўленняў пра першачалавека, з частак цела якога ўтварыўся Космас.

Гэта пацвярджаюць архаічныя казанні старажытных Індыі і Грэцыі. Іх уяўленні пра Сусвет, які нібыта створаны ад нейкага гіганта, знаходзяць аналогію ў сярэднявечных еўрапейскіх хрысціянскіх легендах. Там апавядаецца, як з цела далёкага першапродка ўзнікла зямля, з крыві — мора, з костак — камяні, з валасоў — трава. З цягам часу стварэнне чалавечага цела пачало цалкам атаясамлівацца са стварэннем космасу. У тых жа ведах чытаем: «*З пяці частак складаецца чалавек. Ягонае цяпло — святло. Адтуліны — прастора. Кроў, слёзы і семя — вада. Цела — зямля. Подых — паветра*».

Старажытнабеларускія ўяўленні таксама маюць адносіны да ідэі антрапаморфнага космасу. Да прыкладу, пераўтварэнне частак цела

прысутнічае ў нашым тапанімічным фальклоры. Чалавекападобныя назвы цэлай групы вёсак у Клецкім раёне звязваюць з паданнем пра разбітую статую. Згодна з расповедам, кожная частка статуі легла ў аснову тапонімаў *Галавачы*, *Зубкі*, *Чарапы*, *Грудкавічы*, *Цыцкавічы*, *Пузава*, *Руковічы*.

Антрапаганічныя, этыялагічныя і касмаганічныя легенды, старажытныя вераванні і абрады, якія захаваліся ў нашай традыцыйнай культуры, дазваляюць сёння правесці паралель паміж чалавекам і Космасам.

Пачнём з ***галавы***. Як і іншая частка цела, галава мае яскравыя сімвалічныя аналогіі ў мікракосме Сусвету і ландшафце. Яе касмічны адпаведнік — неба, ягоныя галоўныя аб'екты — Сонца, Месяц, зоркі. Калі параўноўваць галаву з ландшафтам, найперш вылучаецца гара. Напрыклад, як у загадцы: «*А на гары гай, пад гаем маргай, пад маргаем шмаргай, пад шмаргаем хапай*». Адгадка — валасы, вейкі, нос, рот. Галава побач з сэрцам лічыцца месцам знаходжання душы чалавека. З гэтым уяўленнем звязаны намаганні па знішчэнні вампіраў: асінавы кол, жалезны цвік, нож і г.д. забівалі ў ягоную галаву або ўвогуле яе адсякалі.



*Галава віцязя (парк у Нямеччыне)*

А вось ***валасы*** чалавека сімвалічна суадносяцца з дажджом, які па ўяўленнях нашых продкаў абуджае зямлю пасля першага веснавога грому і апладняе яе. У «Рыгведзе» сонечны прамень называецца «*залатавалосым*». У беларускай мове гэтаму адпавядае выраз «*косы сонца*». Узгадаем Янку Купалу: «*Ты хапаў за косы сонца*» (верш «На смерць Сцяпана Булата»). Беларускі фальклор сведчыць, што валасы з'яўляюцца жыццядайным асяродкам, дзе злучаны фізічныя і духоўныя сілы чалавека. Да таго ж, яны выступаюць самым актыўным каналам, праз які чалавек сілкуецца ад космасу. Так, падчас такіх важных для старажытнага чалавека дзеянняў, як вяселле дзяўчыны, пры родах, падчас чараўніцтва і гадання, жанчыны зазўсёды распускалі валасы.

Своеасаблівай візітнай карткай чалавека з'яўляецца ***твар***. Гэта адлюстраванне ягонай душы, настрою, эмоцый і здароўя. Сімва-

лічна твар у многім супадае з сімволікай галавы, але ёсць свае асаблівасці. У народных уяўленнях гэтая частка чалавечага цела суадносіцца з небам і нават Богам. Існуюць і такія архаічныя павер'і, што паверхня зямлі лічыцца яе тварам. Адсюль забарона кідаць свае валасы на зямлю: *«...інакш на тым свеце па твары будуць поўзаць вошы»*. На Брэстчыне захаваліся вераванні, што смерць пры падыходзе да паміраючага паступова закрывае ягоны твар сваім чорным палатном. Спачатку рот, затым нос і, нарэшце, вочы, пасля чаго чалавек памірае.



*Возера Чортава Вока (Браслаўскі р-н., Віцебская вобл.)*

Сімволіка ***вачэй*** цесна звязана са шмат якімі пазіцыямі мовы і культуры. Вядома, што Сонца, Месяц і зоркі амаль ва ўсіх міфалогіях, у тым ліку і беларускай, успрымаліся як вочы боства. Шматлікія беларускія азёры і балоты маюць назвы *Богава* ці *Чортава вока* або проста *Чортава вакно*. Дарэчы, паводле беларускіх традыцыйных вераванняў, сімвал вакна ў сялянскай хаце мае тую самую этымалогію, што і вочы людзей, а сам Сусвет асэнсоўваўся як велізарны дом, дзе неба лічылася столлю. Таму не дзіва, што ў народных павер'ях вочы ўспрымаліся як уваход у цела чалавека і, адпаведна, выхад. Так, паводле некаторых вераванняў, лічылася, што ў вачах месціцца душа,

а ў момант смерці пакідае цела менавіта праз вочы. Але не толькі душа абірала сабе такое месца, там мог пасяліцца і нячысцік. У такім выпадку ўсялякія анамаліі на вачах, як і другія цялесныя недахопы, успрымаліся негатыўна і лічыліся знакам прыналежнасці да дэманічнага свету.

Гаворачы пра вочы, трэба сказаць і пра ***слёзы***. У беларускім фальклоры са слёз людзей і міфалагічных істот утвараюцца рэкі, азёры, крыніцы, некаторыя віды раслін і насякомых. У вядомым паданні пра паходжанне ракі Віліі апавядаецца пра прыгажуню Вялляну, ад слёз якой з'явілася гэта рака. У другім паданні гаворыцца, што слёзы русалак зліваюцца ў адзіны струмень, і на балоце ўтвараецца крынічка. Слёзы адной прыгожай дзяўчыны, якая сядзела на камяні пасярод мора, робяцца пчоламі. Паводле вераванняў беларусаў, крушына вырасла на тым месцы, куды ўпалі слёзы скінутага з неба Чорта. І менавіта колер гэтых ягад — чорна-чырвоны — маюць чортавы слёзы.

***Рот*** метафарычна суадносіўся з дзвярыма ў хаце. Так, на Віцебшчыне верылі: каб пачатая справа ўдала завяршылася, трэба на нейкі час зачыніць у доме дзверы і вокны. Тады ў людзей, якія маглі нейкім чынам нашкодзіць справе «*зачыніліся і раты й языкі на перасуды*». Сваё жытло старажытны чалавек таксама асэнсоўваў з часткамі цела. Таму сцены, дзверы, дах і вокны былі тымі першымі межамі, якія аддзялялі сваё ад чужога.

Лічылі, што праз адкрыты рот у чалавека, як і праз адкрытыя вокны ці дзверы, маглі патрапіць нячыстыя духі і хвароба. Да прыкладу, у палескіх замовах пры лекаванні хвароб гаворыцца: «*Праз роту ўлез, праз дупу вылез*». Таму заўсёды забаранялася доўгі час трымаць рот разяўленым. Асабліва падчас навальніцы, калі чорт хаваецца ад удараў грому, якія яго пераследуюць, і можа заляцець у адкрыты рот чалавека.



*Боскае вока, кулон (твор дэкаратыўнага мастацтва)*

Існавала перакананне, што з апошнім выдыхам паміраючага чалавека з яго выходзіць і душа — у выглядзе пары, матылька ці не-

каторых іншых насякомых. Праз рот як камунікат з тым светам маглі перадавацца і магічныя веды. У беларускіх казках і міфах расказваецца пра тое, як галоўнага героя паглынае нейкая міфічная жывёла (рыба, жаба, змей, сабака і г.д.), пасля чаго ён авалодвае сакральнымі ведамі і чарамі.

***Зубы*** таксама звязаны з паняццем жыццёвай сілы, узросту і надпрыроднымі здольнасцямі. Больш таго, зуб у фальклоры ўспрымаўся як эквівалент чалавека. Гэта наглядна паказана ў тлумачэнні сноў, дзе зуб, які выпаў, прадказвае чыюсьці смерць. Рот лічыўся самай небяспечнай часткай чалавека, бо праз яго ў цела магла пранікнуць розная нечысць, таму зубы ў роце выконвалі апатрапейныя (ахоўныя) функцыі. Асабліва гэта тычылася дзяцей, якія найбольш баяліся сурокаў. Каб першыя зубы лёгка і без праблем з'яўляліся, дзецям вешалі на шыю воўчы або заячы зуб ці давалі дзіцёнку іх пагрызці. Такія амулеты, дарэчы, археолагі знаходзяць у старажытных пахаваннях. Асаблівая крэпасць зубоў або іх анамалія былі адзнакай дэманічнай прыроды чалавека. Лічылася, што дзіцёнак, які нарадзіўся з двума зубамі, мог зрабіцца чараўніком або ведзьмаком, вупыром ці двудушнікам. Паводле народных прыкмет, такія міфалагічныя істоты маюць падвойны шэраг зубоў або яны ў іх увогуле жалезныя.



*Воўчы зуб, амулет (сучасная праца)*

***Сліна***, як і іншыя чалавечыя выдзяленні, таксама атаясамліваецца са сферай чужога і нячыстага. У легендах і паданнях пра стварэнне гор, камянёў і балот, менавіта з-за чортавага харкавіння ўзнікаюць гэтыя ландшафтныя асаблівасці. А там, куды патрапіла чортава слюна, замест ячменю, жыта, пладовых дрэваў і гаючых зёлак выраслі маларослыя дрэвы і пустазелле:

> «Добрую расліну Бог даў на патрэбу людзям, а ўсялякае паганае зелле чорт уплюнуў, да так, што аж дзіва».

Мала таго, чорт апляваў і самога чалавека, якога Бог зрабіў з гліны і паставіў сушыцца на сонцы. Каб неяк выправіць сітуацыю,

Бог вывернуў сваё стварэнне навыварат так, што ўсё нячыстае апынулася ў сярэдзіне, у сэрцы, і дало пачатак шмат чаму дрэннаму, што ёсць у чалавеку, у тым ліку хваробы і саму чалавечую сліну. Затое ад пляўкоў Бога, сцвярджае павер'е, узніклі грыбы.

***Сэрца*** разглядаецца як крыніца эмацыйна-пачуццёвага жыцця чалавека, дзе месціцца любоў, каханне, сум, вера і страх. Беларусы верылі, што ў сэрцы таксама лакалізуецца душа: «*Душа чалавека месціцца ў сэрцы, а сыходзіць ротам*».

Часам сэрца робіцца сінонімам характару, а таксама азначае самога чалавека. Прыгадайце выраз кшталту «*заячае сэрца*» пра пужлівага і баязлівага чалавека. У народнай магіі існаваў звычай падчас цяжкай хваробы прымушаць хворага з'есці сырое сэрца толькі што забітай жывёлы: мядзведзя, ваўка, крата, каб «*напужаць*» хваробу, прымусіць яе адступіць. Старажытныя павер'і сцвярджаюць, што той, хто з'есць сэрца змяі, пачне разумець мову раслін або атрымае незвычайную сілу, а хто спажыве сэрца ворана, зробіцца злодзеем.

***Мацярынскае малако*** валодае сакральнай адзнакай. Вельмі распаўсюджана ў нашай культуры малочнае пабрацімства, як і шэраг іншых відаў рытуальнага сваяцтва. У беларускай традыцыі малако падтрымлівае сувязь з небам і атмасфернымі з'явамі — дажджом і маланкай. Яшчэ старажытныя індаеўрапейцы лічылі дождж малаком нябесных кароў-хмар. Адсюль і вераванне, што пажар можна згасіць толькі малаком ад чорнай каровы. Таксама месяц і ягонае святло ў фальклоры асацыіруецца з малаком і жыццядайнай вільгаццю, расой.

Па другім варыянце, месяц у фазе росту прымае ў сябе душы памерлых, а пры ўбыванні пралівае іх на зямлю ў выглядзе дажджу. Так, у палескай замове гаворыцца: «*Прыбывай, малако, з поўнага месяцу, з яснай зары, залатой гары*». Паводле другіх вераванняў, крыніца цудадзейнага малака знаходзіцца на міфічнай Чорнай Гары. З казак вядома, што малочныя рэкі цякуць у царства памерлых, а Млечны Шлях — гэта дарога на той свет. Асацыяцыя малака з месяцам вядома і па загадцы: «*Над дварам-дварам стаіць чаша з малаком*» — месяц.

Аднымі з жыццёва найважнейшых органаў цела чалавека з'яўляюцца ***жывот*** і ***пуп***. У беларускім фальклоры разам з галавой і сэрцам жывот лічыцца сімвалам жыцця. Нездарма ў лекавых замовах гавораць: «*Каб і сэрца не сушылі, і жывата не крушылі*». Разам з тым, цэнтр жывата — пуп — з'яўляецца сярэдзінай чалавека, ягонай сілай: «*Пуп усяму чалавеку дзіржава*». Калі параўноўваць чалавека і Космас, узгадаем выслоўе: «*пуп зямлі*». У той жа час існуе сцвер-

джанне «*чалавеку дарагі той куток, дзе яму рэзалі пупок*», што гаворыць аб ўяўленні нашых продкаў пра сакральны цэнтр свету, які асацыіраваўся з месцам ягонага нараджэння.

***Рука*** сімвалізуе дзейнасць, працу, ахвярапрынашэнне, сілу і ўладу чалавека. Вельмі часта параўноўваюць такія паняцці, як «рука» і «ўлада». Да прыкладу, зямным уладарам — князям, каралям, царам або жрацам-святарам, як намеснікам багоў, заўсёды прыпісваліся магічныя здольнасці. Яны маглі ўплываць на ўраджай, плоднасць людзей і жывёл, перамогу ў бітвах, лекаваць хворых, нават прадказваць будучыню. А найбольш дзейснай сілай валодала рука ўладара, якою ён бласлаўляў на тое ці іншае дзеянне.



*Воты з выявамі сэрцаў, ног і рук на абразе святога ў слонімскім касцёле Святога Андрэя*

Рука ў народнай культуры беларусаў успрымалася і як канал кантактнай магіі і перадачы сакральных ведаў. Шырока вядомы аповяд пра цяжкую смерць чарадзея ці вядзьмаркі, чые пакуты цягнуцца некалькі дзён або нават тыдняў. Нарэшце знаходзіцца чалавек, які згаджаецца падаць руку паміраючаму, пасля чаго вядзьмарскія здольнасці, што трымалі чараўніка на мяжы гэтага і таго свету, пераходзяць на новапасвечанага. У фальклоры гіпертрафіраваныя рукі прыпісваюцца ўсялякім прадстаўнікам тагасвету — нячысцікам: у лазніка рука вялікая і бухматая, у хатніка рукі быццам пакрыты аўчынай, у ведзьмы Лоймы — хударлявыя і кашчавыя, у чартоў на руках і нагах вялікія кіпцюры. Хатка Бабы Ягі ў казках замест дзвярэй у брамцы мае чалавечыя ногі, замест запораў — рукі, а замок нішто іншае, як рот з вострымі зубамі. Да таго ж на лясную вядзьмарку працуюць адразу тры пары рук.

***Пальцы*** ў фальклоры беларусаў выступалі не толькі сімвалам чалавечай сутнасці і актыўнага пачатку, але і адыгрывалі важную ролю ў засваенні чалавекам навакольнай прасторы. У казках адсяканне пальца ў галоўнага героя заўсёды з'яўляецца сімвалічнай заменай цэлага і выступае адзнакай умоўнага ахвярапрынашэння. Такую з'яву прыроды, як белемніты — акамянеласці, падобныя на пальцы, — беларусы лічылі «*чортавымі пальцамі*», якія некалі Пярун быццам адцяў у нячысцікаў. У загадках усе разам пальцы азначаюць сям'ю: «*Пяць братоў у адну ноч радзіліся, а ростам не роўныя*» або «*У дзвюх матак па пяць хлапчанятак, кожнаму сыну адно імя*».

З дапамогай пальцаў, часцей за ўсё мезенага, ажыццяўляўся кантакт з тым светам. Той, хто знайшоў папараць-кветку, укладваў яе пад скуру разрэзанага мезенца, пасля чаго чалавек быццам атрымліваў дар яснабачання. Крывёю з мезенца правай рукі падпісвалі дамову з чортам, калі прадавалі яму душу. Апошняе дзіця ў сям'і называлі «*мізінчык, мазынец, мазінны*». І менавіта гэтае дзіця, якое канцэнтруе ў сабе ўсю магічную моц бацькоў і асаблівыя здольнасці тагасвету, у казках валодае незвычайнымі надпрыроднымі магчымасцямі. Апроч усяго, праз пашкоджаны палец у цела чалавека пранікае і разбурае яго здароўе міфічны чарвяк «*валасень*».

Канцэнтрацыя жыццёвых сіл чалавека месцілася ў ***пазногцях***. У магічных практыках продкаў яны нароўні з валасамі, зубамі, потам і слінаю ўспрымаліся як займеннік чалавека. Да прыкладу, каб пазбавіць дзіцёнка ад сурокаў, яму забаранялася да года стрыгчы пазногці, маці павінна была абкусваць іх зубамі. Таксама пазногці разам з валасамі прыносіліся ў ахвяру лесуну і хатніку.

У беларусаў была завядзёнка збіраць пазногці пад пахай або ў спецыяльны мяшэчак, а пасля смерці класці іх у труну. Па-першае, лічылася, што на той свет, у вырай трэба караскацца па высокай шкляной або жалезнай гары, і зрабіць гэта будзе лягчэй таму, у каго захаваліся ягоныя пазногці, якія пасля смерці прырастуць да пальцаў. Па-другое, існавала меркаванне, што ў царства памерлых не прымуць чалавека, які пры сваім жыцці раскідваў састрыжаныя пазногці, і ён павінен будзе хадзіць па зямлі да таго часу, пакуль не збярэ іх.

Адна з самых міфалагізаваных частак цела чалавека — ягоныя ***ногі***. Яны звязаныя з хтанічным пачаткам, паколькі больш за другія часткі бліжэй да зямлі і з ёю судакранаюцца. Адсюль вераванні ў тое, што менавіта праз ногі, асабліва праз іх ніжнюю частку, чалавек мае небяспеку кантакту з хтанічнымі стварэннямі. У прыватнасці, такім чынам у чалавека і жывёлу трапляе хвароба. У замовах гаворыцца:

«*Ішлі пералогі* (хвароба хатняй жывёлы) *па шырокай дарозе да каню ў ногі, а з ног у морду, а з морды ў ноздры...*», а таксама і зваротны працэс, калі хвароба пакідае цела жывёлы праз ногі і сыходзіць прочкі: «*Пайшла та kроў у рогі, а з рог у ногі, да ўпала і прапала*». Узімку кантакт ног з зямлёю таксама лічыўся небяспечным, таму існавала табу хадзіць людзям па зямлі басанож, а таксама выганяць пасвіцца жывёлу да Вялікадня або Юр'я — каляндарнай мяжы паміж зімой і летам.

Семантыка ног мае вялікае значэнне і ў пахавальных абрадах. Дагэтуль існуе практыка выносіць нябожчыка з дому наперад нагамі, каб ён сышоў канчаткова і не вяртаўся, каб не звёў за сабой другіх. Таксама памерлых хаваюць у новым абутку, каб яны маглі пераадолець доўгі цяжкі шлях з гэтага свету ў той.

Нячыстую сілу ў беларускім фальклоры можна вызначыць па адметнасці іх ног. Так, магутны лясун мае тоўстыя, нібы ствалы дубоў, ногі. Касцяную канечнасць мае Баба Яга, як прадстаўніца краіны нябожчыкаў. Чэрці ж вызначаюцца казлінымі нагамі з капытамі, якія захоўваюць такі самы выгляд нават пасля пераўтварэння іх у людзей. Дарэчы, паводле народных уяўленняў, даведацца пра пры-



*Камень са следам чалавечай нагі (След Ісуса) каля вёскі Бабры (Лідскі р-н., Гродзенская вобл.)*

хадня з таго свету можна па ягоным конскім капытам або птушыных лапах. Узгадаем сляды наўяў, пакінутыя імі на попеле ў лазні. Анамаліі ног маюць і жывёлы, якія, паводле легенды, былі ўтвораны ад чалавека. Такія, да прыкладу, ногі ў бусла і лапы ў мядзведзя, а пярэднія лапы крата выглядаюць як чалавечыя далоні.

Цікавую адметнасць мелі ***дзетародныя органы мужчын*** і ***жанчын***. Прыкладам, дэманстрацыя геніталій у аграрных абрадах стымулявала плоднасць і бараніла будучы ўраджай ад шкоданоснай магіі. Так, калі засявалі пшаніцу ці лён гаспадар абавязкова здымаў штаны, а каб зарадзіла тая ці іншая культура, трэба было пахадзіць голым па гародзе. На Лепельшчыне падчас засявання агуркоў казалі: «*Расціце, агурочкі, як мужчынскія...*». У народнай культуры беларусаў сімволіку мужчынскага дзетароднага органа маюць тыя прадметы хатняй гаспадаркі, якія прызначаны для рознага роду засоўвання, ці ўтыкання ўнутр. Гэта барана і таўкач, грэбень і хлебная лапата, качарга і нож, голка і шыла, і г.д. Да прыкладу, у адной з вясельных песняў шыла прама пазначана як мужчынскі палавы орган:

*«А ў нас сягодня нешта было,*
*Чатыры каленцы радам было.*
*А пятае шыла*
*Гарэлку саладзіла».*

Жаночыя геніталіі мелі ахоўную функцыю. Калі дзіцё хварэла, маці падкрэслена пераступала праз яго і выцірала яму твар або падолам сподняй кашулі, або дзіцячай рукою, папярэдне правёўшы ёю між сваіх ног са словамі: «*Чым радзіла, тым адхадзіла*».

Жаночыя дзетародныя органы мелі аналогіі ў розных культурных кодах. Прыказка: «*Усе прайшлі праз той лажок, дзе на горачцы гаёк*» параўноўвала іх з навакольным ландшафтам. Таксама яны асацыіраваліся з дзвярыма і варотамі, як у прыказцы: «*І мы з тых варот, адкуль увесь народ*». Гэта праяўлялася і ў радзіннай абраднасці: каб роды прайшлі без перашкод, у хаце адчынялі ўсе дзверы і вокны.

Існаваў такі рытуал, як «*перапяканне дзіцёнка*», калі хворае дзіця на лапаце садзілі ў печ, тым самым сімвалічна вярталі яго назад ва ўлонне, каб ён змог зноў нарадзіцца «новым» і здаровым. Тут жаночыя геніталіі і чэрава жанчыны метафарычна параўноўваліся з печчу. Разам з тым жаночыя палавыя органы ўспрымаліся як таямнічы і загадкавы пачатак, як уваход у тагасвет, адкуль усё прыходзіць і куды ўсё сыходзіць. Таму дэфларацыя маладой лічылася адкрыццём шляху да сваіх продкаў, і ад будучай нявесты патрабавалі строгай цнатлівасці, іначай можа адбыцца сустрэча з незнаёмымі небяспеч-

нымі сіламі. Нездарма ў народных вераваннях толькі што народжанага дзіцёнка ўспрымалі як пасланца чужога свету.

Сімвалам жыцця і ўвасабленнем яе сілы лічылася ***кроў чалавека***. Таксама па некаторых вераваннях у крыві чалавека знаходзіцца ягоная душа. Гэта бачна па чарадзейных казках, дзе пакінутая дома часцінка крыві героя чарнее, калі ён памірае ці калі ён забіты. Або браты даведваюцца пра лёс адзін аднаго, уторкваючы нажы ў дрэва: калі адзін з іх жывы, з камля цячэ кроў, калі мёртвы — вада. Узгадаем фальклорныя сюжэты пра кроў раслін і пра тое, як з крыві забітых людзей ці нейкіх міфалагічных персанажаў на свет з'яўляюцца тыя ці іншыя ландшафтныя аб'екты, дрэвы і кветкі, а з крыві багатыроў узнікаюць рэкі. Чырвоны колер алешыны паходзіць нібыта ад крыві параненага чорта, а ягады рабіны — ад крывавых слёз Евы.



*Рэльеф у выглядзе жанчыны (фотакалаж)*

Згуба крыві заўсёды ў фальклоры ўспрымаецца як згуба жыццёвай сілы і патрабуе неадкладнага прыпынення. У замовах гэта рэалізуецца матывам зашывання, замыкання, запякання крыві, упадаблення яе каменю. Так, у магічных практыках беларусаў, крывацёк з носа прыпыняўся навешваннем на шыю хворага замка ці цяжкога каменя. Вупыры, ведзьмы і другія нячысцікі п'юць кроў чалавека, каб пазбавіць яго здароўя, укараціць ягонае жыццё або забіць яго, тым самым папоўніць асабістыя жыццёвыя сілы. Чырвоны колер месяца і сонца тлумачыўся тым, што яны нібыта напіліся чалавечай крыві падчас войнаў.

Зусім іншае стаўленне было да жаночай менструальнай крыві падчас ***рэгул***. на працягу гэтых дзён жанчыну лічылі нячыстай і адкрытай да кантакту з тым светам, а значыць, і з небяспечнымі ягонымі наведвальнікамі. Падчас месячных жанчыне забаранялася прысутнічаць у храме і другіх сакральных мясцінах, быць кумой, дружкай, наведваць могілкі, браць удзел у асобных відах гаспадарчай дзейнасці. Нельга было займацца гародам, здымаць плады з дрэваў, квасіць капусту і г.д. Верылі, што пры парушэнні табу ў жанчыны можа вырасці барада, а рэгулы будуць на кожнае свята.

Такім чынам, традыцыйныя погляды нашага народу, якія сыходзяць сваімі каранямі ў глыб стагоддзяў, сталі асновай для незвычайна папулярнай у старадаўнія часы канцэпцыі мікракосму. Ягоны змест грунтуецца ў прызнанні цела і душы чалавека нейкай замкнёнай і цэльнай сістэмай, якая пабудавана разумна і мэтанакіравана і, самае галоўнае, з'яўляецца люстраным адбіткам сусвету — макракосму. Згодна з гэтай ідэяй, мікракосм такі ж цэласны і завершаны, як і вялікі свет. А мікракосм уяўляўся ў выглядзе чалавека, які можна зразумець толькі ў межах паралелізма «*малага*» і «*вялікага*» сусветаў.

Іншымі словамі, чалавек раней думаў, што ўсё, што ёсць у ім, чым ён жыве і што ведае — тое і ёсць увесь свет. Свет і чалавек — гэта адно і тое ж. Чалавек — маленькі свет, а свет — вялікі чалавек. Выснова: усё, што ёсць у свеце, ёсць патроху і ў чалавеку.

## Глава 2
## МУЖЧЫНА І ЖАНЧЫНА

У шматлікіх сусветных міфах чалавек ствараецца з розных матэрыялаў. Але найбольш распаўсюджаным матэрыялам з'яўляецца гліна і зямля. З гліны стварыў людзей Праметэй у старажытных грэкаў, з гліны Энкі і ягоная жонка Нінмах у шумерскай міфалогіі, Мардук і Эйя ў акадскай, Хнум у егіпецкай, Амма ў міфалогіі дагонаў, Іоскеха ў іракезаў і другія багі розных народаў.

Беларуская традыцыя захавала пазнейшае павер'е пра паходжанне чалавека. Як і легенды пра стварэнне зямлі, апавяды пра стварэнне чалавека пазнейшага паходжання і ў сваёй большасці пазычаны з кніжных казанняў. У гэтых казаннях вылучаецца дуалістычны матыў удзелу Д'ябла ў стварэнні чалавека:

> «Бог узяў гліну, замясіў яе і зляпіў чалавека па свайму вобразу і падобію. Аднак невялікі кавалак гліны застаўся, і Бог, не ведаючы, куды яго падзець, прыляпіў яго чалавеку паміж ног. Вось так атрымаўся мужчына. І зразумеў Бог, што цяпер яму давядзецца рабіць жанчыну. Зляпіўшы першых мужчыну і жанчыну з гліны, Бог паставіў іх сушыцца, прытуліўшы да паркана, а Сам паляцеў на неба за душой. Каб у Ягоную адсутнасць Д'ябал не змог сапсаваць людзей, Бог пакінуў ахоўваць іх сабаку. Сабака першапачаткова быў без поўсці і моцна мерз. Д'ябал паабяцаў яму футра за тое, каб ён падпусціў яго да людзей. Сабаку ён пакрыў поўсцю, а людзей апляваў і выпэцкаў нечыстотамі. Бог, калі ўбачыў апляваных людзей, вывернуў іх знешнім бокам у сярэдзіну, каб усе пляўкі апынуліся ў чалавечым

целе і не пэцкалі зямлю. Вось чаму чалавек хварэе, плюецца і кашляе. Але, выварочваючы жанчыну, Бог злёгку папсаваў яе, таму частка нечыстот у яе час ад часу выцякае вонкі. Зрабіўшы людзей навыварат, Бог сем дзён мачыў іх у памыях, каб вымачыць з іх усе грахі. Калі грахі былі змыты, Бог прасушыў людзей на сонейку, дунуў і ўдыхнуў у іх душу, назваўшы іх Адамам і Евай».

У шматлікіх сусветных міфах стварэнне мужчыны папярэднічае стварэнню жанчыны. Беларускія легенды распавядаюць пра тое, што першапачаткова мужчына і жанчына былі злучаны нейкай кішкай ці хвастом. Д'ябал спакусіў жанчыну і адарваў яе ад мужчыны, адсюль у людзей нібыта і палавыя адрозненні.

Другая легенда кажа, што падчас сну Адама Бог узяў у яго рабрыну і таксама паставіў яе сушыцца, але сабака, які прабягаў побач, схапіў рабрыну і пачаў яе грызці. Бог ледзь паспеў адабраць у яго агрызак, з якога стварыў Еву. Яшчэ адзін варыянт легенды распавядае, што рабрыну скраў не сабака, а Чорт. Бог дагнаў яго, але пад руку яму трапіўся замест рабрыны хвост Чорта. Той з Адамавай рабрынай паспеў збегчы, а адарваны хвост застаўся ў руках Бога, які і стварыў з яго жанчыну. Таму ўсе жанчыны хітрыя і каварныя. А чэрці з тых часоў засталіся куртатымі, хаця раней у іх былі доўгія хвасты.



*Паходжанне людзей з яек (фотакалаж)*

Сустракаецца архаічная легенда пра паходжанне мужчын і жанчын з яек, знесеных Евай. Бог раздзяліў іх на дзве паловы і кінуў на зямлю. На зямлі з адной паловы ўтварыўся мужчына, а з другой — жанчына. Мужчыны і жанчыны, створаныя з паловаў аднаго яйка, знаходзяць адзін аднаго і ствараюць сем'і. Некаторыя паловы ад першых людзей патрапілі ў балота ці глыбокі яр і там загінулі. Таму іх другія паловы не могуць знайсці сабе пары і жывуць у адзіноце.

Разглядаючы пазнейшыя міфы пра стварэнне людзей, нельга не заўважыць, што галоўную ролю ў іх адыгрываюць мужчыны. Так,

мужчына — гэта і першы чалавек, які падобны да самога Бога, у ягоным вобразе паўстаюць усе сакральныя функцыі першатворцы і дэміурга. У народнай культуры асаблівы статус надаваўся і такім мужчынскім прафесіям, як паляўнічы, ганчар, млынар, цясляр, каваль, шавец і кравец, араты і сейбіт, чые заняткі наўпрост параўноўвалі з актам першастварэння.

Мужчынскія вобразы каляднікаў і валачобнікаў таксама ўспрымаліся як сакральныя істоты, душы продкаў. Калі гэтыя хадакі з'яўляліся на чым-небудзь двары, сустрэць іх павінен быў менавіта гаспадар, таму што праз іх ён уступаў у кантакт са светам продкаў і прымаў ад іх добрыя пажаданні для ўсёй сям'і і гаспадаркі. Яшчэ абавязкамі гаспадара падчас Калядаў было клікаць Мароз на куццю, запрашаць душы продкаў на Дзяды, рыхтаваць пачастункі для дамавіка і г.д.

Мужчыне належаць і касмаганічныя будаўнічыя функцыі. Адным з важных заняткаў мужчыны лічылася будаўніцтва дому: ён выбіраў аптымальнае месца для пабудовы, будаваў сам або пры дапамозе іншых, граў галоўную ролю ва ўсіх абрадах, якія суправаджалі розныя этапы будаўніцтва, аж да самага наваселля. Погляд на мужчыну як на гаспадара і дэміурга адлюстроўваўся і ў той пашане, якая аказвалася яму на працягу жыцця і пасля смерці. Так, мужчына займаў ганаровае месца ў хаце, калі сядзеў за сталом пад абразамі, у культавых абрадах, і на вуліцы, калі ішоў наперад жанчыны, а тая не мела права пераходзіць яму дарогі.

Але прадуцыруючая роля мужчыны ярчэй за ўсё рэалізоўвалася падчас земляробства. На гаспадару заўсёды быў клопат пра ворыва



*Скульптурныя рэканструкцыі жыхароў Беларусі XI—XII стст.*

і пасеў. Прычым, дзеянні сейбітаў традыцыйна ўспрымаліся ў народнай культуры як полавыя стасункі з зямлёю, якая ў дадзеным выпадку надзялялася жаночымі рысамі, і сімволіка пасеву азначала яе ідавочнае апладненне. Апроч таго, што мужчына-сейбіт здзяйсняў сваю працу з непакрытай галавой і басанож, ён яшчэ агаляў і дзетародныя органы. Да прыкладу, каб упэўніцца ў гатоўнасці зямлі да ворыва, мужчына садзіўся на яе голым задам, а калі той пацеў, лічылася, што можна пачынаць сеў. Тое самае тычылася і пасеву гуркоў: гаспадара запрашалі на гарод і прасілі голым пабегаць сярод градак.

Але мужчыне строга забаранялася мець дачыненне да жаночых прац, нават да прыладаў гэтых прац. Забаранялася глядзець на дзяжу— перастануць расці вусы і барада, чапаць верацяно, а тое можна згубіць мужчынскую сілу, а вазы з сенам пачнуць куляцца. Пагрозай для мужчын было і выкарыстанне жаночай вопраткі. У адваротным выпадку мужчына будзе адчуваць страх перад ваўкамі або, яшчэ горш, стане слугой Д'ябла.

Жанчына ж у беларускай міфалогіі проціпастаўлена мужчыне як адмоўнае станоўчаму, як левае праваму, як мокрае сухому. Таму ў некаторых месцах каб лета не было занадта дажджлівым — гнілым, жыта зачынаў мужчына. Узгадайце старадаўняе павер'е пра непажаданасць сустрэчы на вуліцы з жанчынай, калі накіроўваешся па нейкай важнай справе. Прыкладам, калі жанчына траплялася на шляху гаспадара, які ішоў сеяць збожжа, ён мусіў вярнуцца назад.

Такое стаўленне да жанчыны і тыя вераванні, якія звязаны з ёю, узніклі, хутчэй за ўсё тады, калі памяняліся рэлігійныя ўяўленні. Безумоўна, у часы матрыярхату падобных поглядаў на жанчыну не існавала. Наадварот, тады жанчыне прыпісвалі магічныя ўласцівасці, якія былі падмуркам сакральнай сувязі жаночага пачатку з жыццядайнымі і прадуцыруючымі функцыямі зямлі. З таго архаічнага перыяду менавіта за жанчынамі захаваліся шматлікія знакавыя рытуалы і абрады, звязаныя з вырошчваннем ураджаю, вяселлем, цяжарнасцю, нараджэннем, здароўем, хваробай і смерцю чалавека, аховай ягонага жыцця і дабрабыту.

Да сферы жаночых абавязкаў уваходзіў догляд за хатняй жывёлай і птушкамі, вырошчванне, збор і апрацоўка лёну і канапель. Жанчыне належала і такая стваральная функцыя, як прадзенне і ткацтва, якія на сакральным узроўні тлумачыліся як метафара «стварэння свету».

І ў гадавым цыкле жанчына займала галоўнае месца ў большасці каляндарных святаў і звычаяў. Узгадаем такія жаночыя абрады як ткацтва ручніка-абыдзённіка і абыход з ім вакол вёскі. Гэты абрад

быў накіраваны на прадухіленне стыхійных бедстваў і эпідэмій. Яго выконвалі падчас эпідэмій халеры, засухі, градабою, калі хварэлі дзеці ў доме, жывёла ў гаспадарцы, падчас войнаў — «*каб вёску не спалілі*», «*каб хлопцы жывымі прыйшлі з вайны*».

Жанчыне належыць галоўная роля ў захаванні традыцый ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку духоўнай. У каляндарнай і сямейнай абраднасці месца жанчын асабліва важнае ўжо толькі таму, што святочная і паўсядзённая кухня ўваходзіць у жаночыя абавязкі.

На працягу язычніцкага і раннехрысціянскага каляндарнага года існавала вялікая колькасць так званых «бабскіх святаў», накіраваных на ўшанаванне пэўных жаночых міфалагічных персанажаў, тых, ад якіх залежалі жыццё, здароўе і дабрабыт чалавека. Гэта і «Бабін дзень», і памінальны дзень «Баба», наступны пасля «Дзядоў», і ўшанаванне раннехрысціянскай святой Параскевы Пятніцы напрыканцы кожнага тыдня і г.д. Усе гэтыя святы су-



*Малюнкі мужчыны на костках жывёл. З паселішча эпохі бронзы каля возера Вячэра (Любанскі р-н., Мінская вобл.)*



*Выява жанчыны на гліняным посудзе, ранні жалезны век (гарадзішча каля вёскі Івань, Слуцкі р-н., Мінская вобл.)*

праваджаліся пэўнымі рытуаламі і абрадамі, падчас якіх жанчыны ўстрымліваліся ад такіх жаночых прац, як прадзенне і ткацтва, агародніцтва і прыгатаванне ежы.

Жанчына — перадусім маці, якая працягвае жыццё роду. Але жанчына падтрымлівае і сувязь са светам продкаў, пра гэта сведчаць шматлікія пахавальныя абрады і тэксты галашэнняў прафесійных плакальшчыц. Менавіта таму сфера магіі, чараўніцтва і знахарства заўсёды ў народнай традыцыі належала галоўным чынам жанчыне. Асаблівую ролю ў гэтым прыпісвалі дзяўчатам, удовам і бабулям. Так, нявінная дзяўчына здольная была аблегчыць роды, пераступіўшы праз парадзіху. З фальклорных аповедаў пра жанчын-багатырак мы ведаем, што найбольшай ваяўнічай энергіяй валодалі дзяўчыны-воі.

Дзяўчына-падлетак удзельнічала ў такіх сакральных дзеяннях, як сёмушныя карагоды, калі адбываўся абрад кумлення з бярозкамі, купальскіх аграрных абрадах, звязаных з урадлівасцю зямлі і плоднасцю ўсяго жывога, зімовых дзявочых вячорках і агледзінах перад сватаннем. У такіх дзеяннях дзяўчына праходзіла абрад ініцыяцыі і набывала статус асобы, гатовай да замуства і працягу роду. Асаблівую ролю адводзілі дзяўчыне падчас русальнага тыдня, дзе выконваліся



*Беларускія абрадавыя лялькі плоднасці*

вельмі архаічныя абрады, звязаныя са шматлікімі прымхамі і забабонамі.

Жанчына, якая страціла мужа, таксама набывала пэўныя магчымасці і валодала сакральнымі ведамі. Але асаблівай адзнакай удавы была яе рытуальная «чысціня» і бязгрэшнасць, якая палягала ў адсутнасці палавых стасункаў. Такія жанчыны, паводле народных вераванняў, былі блізкія да замагільнага свету, таму бралі актыўны ўдзел у пахавальных цырымоніях, іх запрашалі абмываць нябожчыкаў.


*Дзяўчына ў вянку*

Падчас засухі ўдовы распраналіся дагала, кралі ў каго-небудзь з вяскоўцаў барану і аралі ёю засохлае рэчышча ракі, або збіралі каноплі і ткалі з іх абыдзённік. Калі ў каго-небудзь балела рука, навязвалі на нітку дзевяць вузельчыкаў, пры гэтым на кожны з іх называлі імя знаёмай удавы. Потым той ніткай перавязвалі хворую руку. У вёсцы Стараселле Шклоўскага раёна ёсць камень, які называюць Удовіным і расказваюць, што некалі да яго хадзілі жанчыны, якія хацелі пазбавіцца ад сваіх нялюбых мужоў.

Асаблівым статусам і ведамі валодала старая жанчына. Такою жанчына лічылася пасля таго, як яе апошняе дзіця заводзіла сям'ю, і жанчына пасля гэтага не мела права нараджаць, іншымі словамі, яна павінна была адмовіцца ад палавых стасункаў. Калі яна парушала гэтае табу, яе ганебна называлі «*бабічкай*», а яе мужа ці дзіцёнка «*бабічам*».

Калі ўдава нараджала дзіцёнка, ён таксама атрымоўваў ганебную мянушку «*бабіч*», а яна сама — «*бабічка*». Калі такое здаралася, каб выкупіць яе грэх, уся вёска ткала агромністы ручнік, якім апаясвала сваё паселішча.

Старыя жанчыны ўспрымаліся як рытуальна чыстыя. Яны ўдзельнічалі ў абрадавых танцах, гайданнях на арэлях, чым садзейнічалі добраму ўраджаю льну і канапель. Старыя, як і ўдовы, прымалі самы актыўны ўдзел у пахавальным абрадзе, аплаквалі нябожчыка, абмяталі ягоную хату, каб той не вярнуўся з могілак, ахоўвалі

мёртвае цела ад нячыстых духаў. Дзейнічалі бабулі разам з удовамі і падчас засухі ў абрадзе выклікання дажджу. У вельмі архаічныя часы, калі дзейнічаў абрад чалавечых ахвярапрынашэнняў, падчас эпідэмій, імкнуліся закапаць жывую старую, каб уміласцівіць дух хваробы.

Са зменай матрыярхату на патрыярхальныя вераванні памяняліся і адносіны да жанчыны. І яе фізіялогія, і яна сама абвяшчаліся нячыстымі і грахоўнымі. У першую чаргу гэта тычыцца перыяду рэгул, якія ў народзе называлі *«на бяллі»*, *«свой час»*, *«сваё»*, *«краскі»*.

У гэты час жанчына лічылася асабліва небяспечнай, і на яе накладаліся розныя табу, якія абмяжоўвалі сацыяльную і гаспадарчую дзейнасць. Так, «нячыстай» жанчыне забаранялася быць кумой, удзельнічаць у розных святочных рытуалах і абрадах, яна не павінна была наведваць могілкі, прымаць удзел у сяўбе і ворыве, вырошчванні і зборы ўраджаю. У адваротным выпадку, нованароджаныя дзеці маглі цяжка захварэць ці ўвогуле памерці, а засуха і неўраджай наваліцца на паселішча.

На Беларусі шмат дзе сустракаюцца назвы *Дзявочая* або *Дзявіч-Гара*, *Дзявочы Камень*, *Дзявіц-Магілы*, *Дзявічае* або *Дзевінскае Возера*, *Дзяўчына-Калодзеж*, *Дзявочы карагод*, *Дзеўчына Даліна* і г.д. Існуюць найменні са словамі *«баба»*, *«ведзьма»*, *«русалка»*, *«паненка»*. Усюды трапляюцца назвы кшталту *Баб'я Горка* або *Баба-Гара*, *Паненская Гара*, *Крыж-Баба*, *Русальчын Востраў*, курганны могільнік *Бабейка*, святыя азёры *Бабінец*, *Жаночае*, ручай *Бабка*, культавы камень *След Валатоўны*, рака *Ведзьма*... Усё гэта сведчыць не толькі пра сакральнасць гэтых мясцін, але і пра тую культавую ролю некаторых жаночых персанажаў, якую яны адыгрывалі ў дадзеным ландшафце.

# Глава 3
# ЦЯЖАРНАСЦЬ І НАРАДЖЭННЕ

Сітуацыя цяжарнасці і народзінаў дзіцяці займае асаблівае месца ў светапоглядзе кожнага чалавека і ў культуры наогул. Па-першае, гэты працэс звязаны з памежным станам людской псіхікі, які ў міфалагічнай карціне свету заўсёды асацыіруецца з небяспекай і адметнай адчувальнасцю для чалавека. Па-другое, цяжарнасць і народзіны — асаблівыя пераходныя абрады, пасля здзяйснення якіх новы статус набывае не толькі дзіця, але і ягоная маці. І тут вельмі важныя традыцыйныя ўяўленні для кожнай дадзенай культуры, падчас якіх выяўляецца шэраг абавязковых абрадавых дзеянняў, накі-

раваных на забеспячэнне ўдачы і поспеху для немаўляці і парадзіхі.

Як беларусы ўспрымалі цяжарную жанчыну? З аднаго боку, цяжарнасць і нараджэнне нашчадкаў з'яўлялася галоўнай мэтай шлюбу, а цяжарная жанчына ўшаноўвалася як адлюстраванне плоднасці. Ёй надавалася магічная прадуцыруючая сіла, ахоўныя, лекавыя і другія дабрачынныя якасці.

З другога боку, цяжарнасць лічылася небяспечным станам, часам нават «*нячыстым*», як для самой цяжарнай, так і для ўсіх астатніх, з кім яна кантактавала. У першую чаргу гэта было звязана з уяўленнямі пра двудушніцтва цяжарнай і яе блізкага знаходжання на мяжы жыцця і смерці — у яе чэраве знаходзіўся «*госцік*» з таго свету. Гэта пацвярджалася і павер'ямі, што будучую цяжарнасць прадказваюць жывёлы птушкі і рыбы — веснікі іншасвету. Так, верылі, калі над чыёй-небудзь хатай лятае і крычыць сава — там зацяжарала жанчына. Згодна з народнымі назіраннямі, да цяжарнай жанчыны заўсёды лашчыцца хатняя жывёла, і «*на чараватую не брэшуць самыя паганыя сабакі*».

І як небяспечная асоба, і як не абароненая перад нячыстай сілай, цяжарная жанчына была вельмі абмежавана ў сваіх сацыяльных функцыях. Так, ёй забаранялася быць хроснай маці, іначай памрэ або яе будучы дзіцёнак, або хрэснік. І не дай Божа, калі на вяселлі яна будзе сваццяй ці дружкай, ці ўвогуле будзе прысутнічаць пры навязванні нявесце чапца — жыццё маладых дакладна ўжо не зладзіцца. Для абароны ад нячыстай сілы цяжарная павінна была заўсёды насіць фартух і мець пры сабе такія абярэгі, як чырвоныя ваўняныя ніткі, павязаныя вакол рукі, шыі або пояса, іголкі, нож, трэскі ад разбітага маланкай дрэва, вугельчыкі з хатняй печы, соль і другія рэчы, без якіх яна не выходзіла з дому.

Паводзіны цяжарнай жанчыны былі абумоўлены мноствам прымхаў і забабонаў. Каб забяспечыць паспяховую цяжарнасць, лёгкія роды і добрае здароўе будучага дзіцёнка, ёй забаранялася стаяць на парозе ці мяжы, пераступаць праз венік, аглоблю, сякеру, вілы, граблі, паваленае бурай дрэва, паляўнічую зброю, пералазіць праз паркан, вакно, канаву. Шырока выкарыстоўвалася забарона зашываць што-небудзь на сабе, а таксама ўвогуле шыць, прасці, плесці, браць у рукі вяроўку ці пераступаць праз яе. Іначай пупавіна абматаецца вакол шыі дзіцёнка і задушыць яго. А каб дзіцё не нарадзілася калекам, строга забаранялася цяжарным працаваць у вялікія святы, асабліва на Каляды. Цяжарнай нельга было дражніць картавага, заіку, нямога, гугнявага, шапялявага і нават жывёл, прыкладам, імітуючы крык пеўня, брэх сабакі, роў каровы і да т.п. Лічылася, што



*Малюнак каменнага ідала «Маці і дзіця», знойдзенага каля Брэста*

дзіця пяройме ў голасе тыя недахопы, над якімі смяялася маці. Тое самае тычылася передражнівання кульгавых, гарбатых, касавокіх і крываруkіх. Нельга было насіць вопратку навыварат, апранаць мужчынскую, лічылі, што ў адваротным выпадку дзіця ў будучым можа памяняць пол або ўвогуле зрабіцца двуполым.

Разам з тым цяжарную жанчыну лічылі здатнай да перадачы магічнай плоднасці і ўрадлівасці. Да яе звярталіся жанчыны, якія былі бясплоднымі. Верылі, што дастаткова цяжарнай проста зайсці ў новы дом, каб у ім заўсёды нараджаліся дзеці, пладзілася хатняя жывёла і птушкі, а на палетках і садах быў багаты ўраджай. Вялікая роля адводзілася цяжарным жанчынам пры абрадзе выклікання дажджу. Так, падчас засухі іх аблівалі вадой, або самі яны кідалі ў калодзеж мак ці мылі ў рацэ хлебную лапату. Калі ж цяжарная жанчына раптам памірала, ёй у труну клалі пялюшкі, лічылі, што памерлая адразу ідзе ў рай.

Непасрэдна самі роды або народзіны ў традыцыйнай культуры — складаны і шматпланавы абрад. Па сваёй глыбіннай сутнасці ён азначаў выхад (шлях) дзіцёнка са свету памерлых у свет жывых. Адсюль і роды ўспрымаліся як аналаг смерці, а сам абрад народзінаў меў шмат паралеляў з абрадам пахавання. Так, да пачатку народзінаў парадзіха развітвалася з мужам, сваякамі і ўсім белым светам: «*Прасці мяне, белы свет! Прасці мяне, маці сыра зямля! Я па табе хадзіла, шмат грахоў стварыла: адну душу прасці, а другую на свет пусці!*» Падобна нябожчыку, парадзісе давалі ў рукі запаленую свячу. Паводле вераванняў, яшчэ сорак дзён захоўвалася сувязь парадзіхі і немаўляткі з іншасветам, таму на працягу гэтага тэрміну яны лічыліся «*нячыстымі*». Разам з тым само народжанае дзіця ўспрымалася не толькі пасланцам таго свету, але і «*дарам Божым*»: «*Бог да нас чужаземца прыслаў, ён з далёкіх стран прыбуваў*».

Роды як рытуал вымагаў мінімальную колькасць ягоных удзельнікаў. Прысутнасць староннiх людзей, асабліва дзяцей і моладзі лічылася непажаданым, таму што магла абцяжарыць як самі народзіны дзіцёнка, так і пашкодзіць ягонаму будучаму здароўю. Таму

шмат дзе на Беларусі народзіны трымаліся ў сакрэце. Верылі, калі падчас родаў у хату зойдзе маладая дзяўчына, то яны будуць праходзіць вельмі цяжка. А калі ўсё-такі гэта здарыцца, і дзяўчына выпадкова апынецца ў хаце, дзе адбываюцца роды, яна павінна расплесці сваю касу, набраць у рот вады і даць парадзісе выпіць яе. Казалі, што жанчына будзе пакутаваць столькі гадзін або ў яе будзе столькі схватак, колькі староннiх чалавек ведае пра народзіны. Каб палегчыць роды, нашы жанчыны ў старадаўнія часы апаясвалі сябе рамянямі са скур зуброў і тураў.

Асаблівы статус надаваўся і месцу народзінаў. У народным светапоглядзе беларусаў — гэта тая кропка прасторы, той пажаданы цэнтр, дзе адбываецца з'яўленне чалавека і стварэнне мікракосму. Звычайна першыя роды праходзілі ў хаце бацькоў жанчыны або ўвогуле за межамі хаты — у памежнай прасторы — у лазні, хляву, гумне, стадоле, паддашшы... Шчаслівым месцам лічылася месца без столі, лепшым — на голай зямлі: на гародзе, у падполлі. Калі народжаны дзіцёнак быў слабым і часта хварэў, адбывалася яго перараджэнне, абрад якога адбываўся ў сакральным месцы яго сапраўдных народзінаў. Падчас гэтага абраду дзіця працягвалі праз ворат матчынай кашулі зверху ўніз.

На месцы народзінаў таксама адбываліся самыя важныя абрадавыя дзеянні: нованароджанага абмывалі, змываючы з яго ўсё *«нечалавечае»*, перавязвалі пупавіну пасмачкай чыстага лёну ці суворай ніткай, а паслед — *«дзіцячую пасцель»* — загортвалі ў кавалак тканіны разам з хлебам і соллю і закопвалі пад вугал хаты, пад печчу, пад жорны, у садзе пад фруктовае дрэва.



*«Маці і дзіця». Каменны крыж, які раней стаяў каля дарогі паблізу вёскі Даўгінава (Вілейскі р-н Мінскай вобл.) Цяпер у мінскім Музеі валуноў (фота В. Вінакурава)*

У народзе верылі, што народжанае дзіця не мае полу, і таму, каб вызна-

чыць яго і далейшы занятак дзіцёнка, пупавіну хлопчыка перавязвалі на тых рэчах, якія сімвалізавалі мужчынскі занятак. Звычайна гэта была сякера. Пупавіну дзяўчынкі перавязвалі на верацяне. А каб хлопец быў моцным і трывалым, ягоную пупавіну часам перабівалі камянямі. У некаторых рэгіёнах пупавіну нованароджанага доўгі час захоўвалі і аддавалі яе пасля таго, як хлопец ішоў у войска, а дзяўчына замуж. Лічылася, што пасля гэтага чалавеку «*пашчасціць*». Замацоўвалі пол дзіцёнка і абрадавыя дзеянні з паследам. Так, пры нараджэнні хлопчыка паслед закопвалі на куце або на гарышчы, а дзяўчынкі — адпаведна ля пячы. Такім чынам далучалі немаўлятку і да бацькоўскай хаты.

Натуральна, калі дзіцёнак з'яўляўся на гэты свет, бацькі імкнуліся як мага надзейней забяспечыць ягонае здароўе, абараніць ад розных напасцяў і бед. Дзеля гэтага адразу пасля нараджэння дзіцёнка спавівалі не абы якой пялюшкай, а вопраткай бацькоў. Звычайна для дзяўчынкі гэта была кашуля маці, а для хлопчыка — бацькава кашуля або штаны: «*Каб такі быў крэпкі, як твой бацька крэпкі*». Такая пялюшка лічылася не толькі абярэгам і ахоўвала немаўлятка ад нячыстай сілы, але і забяспечвала правільнае наследаванне сямейных каштоўнасцей. Дачцэ перадаваліся маральныя і фізічныя якасці маці, а сыну — бацькавы.

Каб засцерагчы дзіця ад небяспечных і варожых уплываў, яго «*свяцілі праз парог*». У сітуацыі, калі немаўля яшчэ не лічылася канчаткова сфармаваным чалавекам, парог як мяжа паміж сваёй (хатняй) прасторай і чужой (неасвоенай) адыгрываў лёсавызначальную ролю. Так, пасля першага купання дзяўчынкі ваду адмыслова вылівалі за парог, каб тая ў свой час выйшла замуж. Перад тым, як везці на хрост хлопчыка, на парог таксама клалі сякеру або далато, а калі везлі дзяўчынку — лён або верацяно. Верылі, што ў будучым гэта паспрыяе развіццю ў дзіцяці ўмельства ў пэўнай галіне. Пасля хросту кумаўя, вяртаючыся з царквы, клалі малечу на парог ягонай хаты, а бацька, стоячы ў хаце за парогам, прымаў дзіця. Гэты абрад сімвалізаваў далучэнне дзіцяці да сферы культуры, і яно афіцыйна атрымлівала імя.

На Палессі доўгі час захоўваўся такі абрад, як ***Кувада***. Ён палягаў у тым, што ў народзінах прымаў самы непасрэдны ўдзел бацька будучага дзіцёнка. Так, ён не толькі прыносіў у дом ваду і награваў яе, чым, безумоўна, падтрымліваў сваю жонку, але і сімвалічна «*нараджваў*»: стагнаў і крычаў разам з парадзіхай, беручы на сябе частку яе болю. Інфарматары прыводзяць у прыклад такія словы мужчыны: «*Я за цябе пастагну, што б мне было гэтай болі нямножка*».

Яшчэ мужчына падчас родаў сваёй жонкі, каб аблегчыць і паскорыць іх, імітаваў пакуты парадзіхі. Дзеля гэтага ён клаўся на палаці, за адчувальнае месца яму прывязвалі нітку, якая цягнулася да ложа парадзіхі. Калі жанчына стагнала ад родавых пакут, то бабка-павітуха, якая сядзела побач, торгала за нітку, што выклікала і стогны мужчыны. Калі роды былі цяжкімі, то муж паіў жонку са свайго роту, нібыта голуб галубку.

Згодна з легендай, якая тлумачыць паходжанне гэтага звычаю, у мінулыя часы ўсе мужы ўмелі браць на сябе пакуты жонак:

> «Вітахмоўць, кажуць, калісьці былі чарадзеі. Перад родамі муж доўга глядзеў жонцы ў вочы, а потым знікаў з хаты і ішоў у пушчу, і там крычаў, біўся аб дрэва. І жонкі раджалі лягчэй, а мужчыны, кажуць, нават адчувалі боль, яны нібыта бралі частку пакут на сябе. Потым, як заўсёды, ад гэтага засталася адна абалонка. Ніхто амаль не ўмеў «браць на сябе», але ў пушчу ўсё адно ішлі...»

З часам Кувада стала існаваць у аслабленым варыянце. Муж і жонка станавіліся па розныя бакі парога і першы паіў другую вадой із рота. Або парадзіха тройчы пераступала праз ногі свайго мужа ці праз ягоную вопратку: штаны, пояс. Нарэшце, каб стымуляваць схваткі, мужа маглі прымусіць зрабіць, *«што і заўсёды»*, іншымі словамі, *«перастпаць»* з жонкай. Роды *«на дваіх»* павінны былі хаця б першапачаткова абараніць дзіцёнка ад нячыстай сілы і падмены. Таму што бацькі ў час народзінаў адчувалі амаль фізічны страх перад ліхімі духамі з іншасвету і зайздроснымі людзьмі з гэтага. Да таго ж, бацькоўскія *«роды»* гарантавалі законнасць нованароджанага і ягоную прыналежнасць да дадзенага біялагічнага роду.



*Традыцыйная лялька «Парадзіха» (майстра М. Высоцкая)*

Верагодна, карані такога звычаю ідуць з часоў пераходу ад матрыяр-



*Маці і дзеці (Рэчыцкі павет. Фота І. Сербава, пачатак XX ст.)*

хальных каштоўнасцей да патрыярхальных.

Вельмі важнай і нават неабходнай была прысутнасць на родах ***бабкі-павітухі***. Так называлі жанчыну, старэйшую за 50 год, чыя роля палягала ў тым, каб дапамагчы дзіцёнку з'явіцца на свет і стаць паўнапраўным членам грамадства, а маладой маці — паўнавартаснай жанчынай. Тым не менш, успрыманне павітухі ў народнай культуры было супярэчлівым. З аднаго боку, небяспека народзінаў, прыналежнасць іх да нячыстых духаў іншасвета прымушаюць лічыць работу павітухі таксама небяспечнай і нячыстай. З другога — яна пасрэднік паміж зямной і сакральнай сферай тагасвету, у чыіх руках знаходзіцца плоднасць жанчыны, а яшчэ яна продак, які дае жыццё маладому пакаленню.

Запрашэнне прыняць роды ўспрымалася як гонар, і адмовіцца ад яго было вялікім грахом. Каго запрашалі ў павітухі? Вельмі часта ўся вёска звярталася да адной жанчыны, якая валодала рэпутацыяй «вядунні», у другіх выпадках запрашалі сваячак. Разам з тым бабка-павітуха, як жанчына сталага веку, не мела права на сексуальныя адносіны, і ўвогуле магла быць толькі рытуальна «чыстай» (пасля менапаўзы), было нават пажадана, каб роды прымала ўдава.

Дапамога, якую аказвала павітуха пры родах, насіла перадусім магічны характар і складалася з агучвання замоў і ажыццяўлення абрадавых дзеянняў. Тэксты радзільных замоў паказваюць павітуху як пасярэдніцу паміж парадзіхай і тагасветнымі сіламі, а яе магічная сіла мае боскае паходжанне: «*Не я прыступаю, Сам Гасподзь прыступае, Свае рукі падкладае*». Разам з тым, палешукі лічылі, што ў сваіх замовах-малітвах павітуха звяртаецца не столькі да Бога і святых, колькі да чорта і хатніка. На гэтую тэму на Палессі распаўсюджаны сюжэт падання, дзе бабка-павітуха прымае роды ў чарціхі, пасля чаго атрымлівае падарункі або дар бачыць нячыстую сілу ў яе сапраўдным выглядзе.

Але галоўнай задачай павітухі было паспрыяць хуткім і нармальным родам. Так, для стымуляцыі родаў, яна прымушала парадзіху хадзіць вакол дзяжы або стала, церціся жыватом аб куты хаты, аб-

курвала парадзіху янаўскімі зёлкамі, абгортвала яе жывот гарачым ручніком. Да таго ж, павітуха павінна была «*раскрыць*» цела парадзіхі. Дзеля гэтага яна здымала з яе пярсцёнкі і завушніцы, распляцала косы, расшпільвала на яе вопратцы ўсе гузікі і засцежкі, развязвала вузлы, адмыкала ў хаце замкі і куфры, засланкі, вокны і дзверы. Тое самае павінен быў зрабіць муж парадзіхі і ўсе тыя, хто выпадкова апынуўся пры народзінах.

Пасля таго, як выходзіла дзіцячае месца, павітуха пачынала «*бабіць*» дзіця: пераразала і перавязвала пупавіну. Гэтае дзеянне было найбольш сімвалічным і часта яго даручалі выканаць другой жанчыне, якая атрымоўвала назву «*бабка-пупарэзніца*». Яна ж потым ушаноўвалася як сапраўдная павітуха і рабілася хроснай маці дзіцёнка.

Як пасрэднік паміж тым і гэтым светам павітуха адыгрывала важную ролю ў пазбаўленні нованароджанага ад слядоў тагасветнага паходжання, засцерагала яго ад будучага ліха, а таксама надзяляла яго доляй і імем. Такім імем, дадзеным «*бабкай*» яшчэ да хросту ў царкве, бацькі называлі малога ў далейшым ягоным жыцці.

Павітуха была абавязана надаць дзіцёнку правільную форму, таму яна падчас першага ягонага купання сімвалічна «*выцягвала*», «*сціскала і распраствала*» ягонае цельца. Выконвала яна гэта з дапамогай замоў і быццам «*дароблівала*» дзіцёнка. Яна ж прадказвала лёс нованароджанага па ягонай знешнасці, паводзінах, па абста-



*Калыска з г. Буда-Кашалёва (Гомельская вобл.)*



*Дзеці ў традыцыйных строях*

вінам нараджэння. Каб немаўля было ў далейшым багатым і шчаслівым, павітуха ніколі не прымала дзіця голымі рукамі, а карысталася спецыяльным ручнікам-радзільнікам.

Павітуха не толькі дапамагала пры родах, але таксама турбавалася аб парадзісе і немаўляці на працягу першых дзён ягонага жыцця, а часам і ўсяго шасцітыднёвага перыяду. У яе абавязкі ўваходзіла арганізацыя хрэсьбін дзіцёнка: запрашэнне гасцей, хросных, купанне нованароджанага, перадача яго хросным бацькам. Часам яна сама выступала ў ролі хроснай маці, прыкладам, у выпадку пазашлюбнага дзіцёнка. На гэтых мерапрыемствах павітуха выступала ў якасці гаспадыні дома. Усюды быў распаўсюджаны звычай, калі бабка-павітуха на хрэсьбінах гатавала галоўную рытуальную страву — *бабіну кашу* і раздавала яе гасцям у канцы абеду. А тыя ў абмен на гэта дарылі ёй грошы.

Усе прынятыя павітухай падчас народзінаў дзеці лічыліся яе ўнукамі і былі цесна звязаны з ёю аж да свайго вяселля ці провадаў у войска. Яны павінны былі ўшаноўваць яе ў пэўныя каляндарныя дні. Павітуху ўшаноўвалі напрыканцы хрэсьбін, яе наведвалі, калі дзіцёнку спаўняўся год. На Палессі свята павітух прыходзілася на ўвесь велікодны цыкл, дзе адзін з дзён быў цалкам прысвечаны ёй і насіў назву «*Бабін дзень*». На кожным такім свяце бацькі, хросныя і павітыя ёю ўнукі адорвалі «*бабку*»螺 рознымі падарункамі. У асноўным гэта былі кавалкі тканіны, стужкі, пялюшкі, хусткі, рушнікі, фартухі. Пасля смерці павітухі тыя самыя падарункі ёй клалі ў труну ці на яе магілу, таму што лічылі, што і ў іншым жыцці яна будзе займацца сваім рамяством.

Асаблівае значэнне меў фартух. Так, лічылася абавязковым пакласці ў труну менавіта яго, каб на тым свеце *бабцы* было куды змяс-

ціць перарэзаныя ёю пупкі тых дзетак, якім яна дапамагла з'явіцца на гэты свет.

Павітуха адорвала *«абабленага»* ёю дзіцёнка грашыма *«на шчасце»* пры першым яго купанні, а на саракавы дзень пасля народзін прыносіла яму ў якасці падарунка пояс і апаясвала яго са словамі: *«Як гэты пас доўгі, так і жыць табе доўга»*. Верылі, што калі павітуха не падорыць свайму ўнуку пояс, то пасля смерці будзе вымушана на тым свеце пераходзіць уброд раку. У супрацьлеглым выпадку ёй дапамогуць прайсці па кладках ўнукі, якія памерлі раней за яе.

Ведала павітуха і як вылечыць хворага дзіцёнка. А калі ў сям'і часта памiралі дзецi, яна пры дапамозе спецыяльнай замовы замыкала замок і клала яго памерламу дзіцяці ў дамавіну. Залежала ад павітухі і далейшая нараджальнасць жанчыны, якая не хацела больш мець дзяцей: адразу пасля родаў бабка пераварочвала пасцель парадзіхі на другі бок.



*Фартух бабкі-павітухі са Случчыны*

# Глава 4
# ВЯСЕЛЬНЫЯ АБРАДЫ

Здаецца, што беларускае вяселле далёкіх часоў — гэта ўсеагульнае гулянне з выпіўкай і танцамі, радасць і свята для ўсіх і кожнага. На самой справе вясельны абрад ўяўляў сабой цалкам прадуманы парадак дзеянняў, заўчасна прапісаны звычаямі продкаў. Гэта дапамаглі высветліць летапісы, матэрыялы гісторыкаў і некаторыя археалагічныя знаходкі. Але і яны дазволілі скласці толькі агульную карціну.

У сівых міфах даўніны вясельная ўрачыстасць сімвалізавала нябесны шлюб паміж Месяцам і Сонцам. Месяц выступаў у ролі жаніха, а Сонца — нявесты. Такім чынам у абрадах вяселля адлюстроўвалася ідэя пра плоднасць прыроды і працягу роду.

Вядома, што адным са старажытных спосабаў здабывання сабе жонкі было гвалтоўнае выкраданне (умыканне) нявесты, якое дзе-

нідзе існавала на Беларусі яшчэ да XVII ст. «Аповесць мінулых часоў» XII ст. узгадвае пра некаторыя ўсходнеславянскія плямёны, якія *«умыкиваху ў воды девиця»*, *«умыкаху жёны собе»*. Такія паводзіны не былі разбэшчанасцю, наадварот, яны толькі адлюстроўвалі тыя боскія дзеянні, якія здзяйсняліся на нябёсах. Да прыкладу, у фальклоры захаваліся міфалагічныя песні пра шлюб Месяца, які выкрадае сабе ў жонкі дзяўчыну непасрэдна з рытуальных арэляў падчас ігрышчаў на Ярылу вешняга (вясноўага Юр'я). Вясенне-летнія моладзевыя зборы часцей за ўсё адбываліся на высокіх берагах рэк або на Красных (Прыгожых) горках. Летапіс не апісвае дэталёва, як адбываўся вольны выбар партнёраў на ігрышчах, але мы можам ускосна даведацца пра гэта з абрадавых песень і чарадзейных казак, дзе лёсавызначальныя сустрэчы адбываюцца каля рэчак ці азёр.



*Сімвал кахання, элемент вышыўкі*

Другі старажытны спосаб знайсці сабе жонку — купля нявесты як узаемны абмен паміж родамі. Ва ўсялякім разе арабскі купец Ібрагім ібн Якуба сведчыў у X ст. пра куплю жонак у славян за асаблівую плату — вено. Пра гэтую плату кажа і «Аповесць...» пад 983 і 1043 гг. У пазнейшых вясельных абрадах былі яскрава ўвасоблены як першы спосаб, так і другі, а таксама старадаўнія міфалагічныя ўяўленні пра тое, што нявеста пераходзіць з «чужога» роду ў «свой». І не проста пераходзіць, яе трэба было або заваяваць, або выкупіць. Сляды куплі жонкі захаваліся ў сімвалічных абрадах выкупу нявесты ў яе брата і продажы яе касы перад вяселлем, у прамовах свата: «*У вас тавар, у нас — купец*».

А тое, што нявесту некалі выкрадалі або заваёўвалі сведчыць такі факт. Вясельная працэсія жаніха (вясельны поезд), якая адпраўлялася за нявестай на вянчанне малюецца ў нашым фальклоры як ваенная дружына князя, дзе апошнім выступае сам жаніх. А ўсе ўдзельнікі вясельнага поезда маюць назву таксама адпаведна з ваеннай сімволікай. Гэта «*тысяцкі*», «*харонжы*», «*маршалак*» і г.д. Удзельнікі поезда жаніха збіраюцца за нявестай як у вайсковы паход, клянуцца адзін аднаму ва ўзаемнай вернасці. У вясельным абрадзе выкарыстоўваюцца такія вайсковыя атрыбуты, як меч, шабля, страла, сцяг. А вясельныя песні, якія співаюць госці падчас падрыхтоўкі да шлюбу маладых, таксама нагадваюць матывы заваёвы і палону дзяўчыны, асады яе двара.

Пазней вайсковая сімволіка нівеліравалася, набыла жартаўлівы сэнс і стала прысутнічаць у вясельных абрадах чыста намінальна. Прычым такую самую «дружыну» мае ўжо і нявеста, а самі маладыя пасля заручын завуцца *князем* і *княгіняю*. І калі раней на старадаўнім вяселлі галоўную ролю граў тысяцкі — старажытны военачальнік, які кіраваў тысяччу ваяроў, то ў больш познія часы яго замяняе ўжо *«дружка»*. Яго маладыя выбіралі з кола сваіх знаёмых і сваякоў, часцей гэта быў хросны бацька з боку жаніха і старэйшая сяброўка з боку нявесты.

Дружка, як і ранейшы тысяцкі, выконваў ролю галоўнага арганізатара вясельнага абраду, ягоным указанням падпарадкоўвалася ўся «дружына» і жаніха, і нявесты. Дружка валодаў такімі якасцямі, як вясёлы нораў, дасціпнасць, веданне старажытных звычаяў і фальклорных тэкстаў. Ад гэтых ведаў залежала паспяховае правядзенне шлюбных і вясельных абрадаў. Ягонымі атрыбутамі былі: вясельны ручнік, які ён перакідваў праз плячо, і пуга (бізун) для засцерагання маладых і адпужвання ад іх ліхіх духаў. Аднак і надалей дзе-нідзе ў Беларусі дружку працягвалі называць па-вайсковаму: *маршалак, маршал, ваявода, баярын*. Адпаведна з боку нявесты гэта былі *баярка* і *маршалка*. Калі дружку даручалася несці вясельны сцяг ці вясельнае жазло, яго называлі *харонжы* ці *харонга*. Харонжы — таксама вайсковая пасада, якая па сэнсе азначала сцяганосца.



*Абрад сватаўства (Украіна)*

Вяселлі ў старажытнай Беларусі звычайна пачыналі гуляць пасля Пакравоў або пасля Вадохрышча. Доўгая, расцягнутая на некалькі тыдняў, вясельная ўрачыстасць распачыналася сватаннем і заручынамі. Сям'я жаніха выбірала сватоў і адпраўляла іх у дарогу, што суправаджалася старажытнымі абрадамі, якія дапамагалі правесці паспяховы паход у «чужы» род за нявестай. Так, каб увайсці ў дом нявесты, сватам трэба было выканаць шэраг умоўнасцей. Пры ўваходзе ў хату сват павінен быў перанесці праз парог спачатку правую нагу і ў дадатак стукнуць ёю аб парог пяткай, каб нявеста не адступілася. Калі сваты ўваходзілі ў дом, яны станавіліся пад цэнтральнай бэлькай хаты — маціцай. Пазней выраз *«стаць пад маціцу»* стаў азначаць *«пасватацца»*. Каб засцерагчыся ад ганьбы ў выпадку адмовы, сваты звычайна прыходзілі або пад вечар, калі сцямнее, або на досвітку, калі яшчэ цёмна. Часта чакалі маладзіка або поўні, верылі, што гэта паспрыяе поўнаму і багатаму жыццю маладых, а іх шчасце будзе расці і павялічвацца, як расце месяц і ўзнімаецца над зямлёю сонца.

Калі ўсё было добра, сваты дамаўляліся з бацькамі нявесты пра згоду на шлюб і пасаг за нявесту, пра ўзаемныя падарункі і другія вясельныя траты, пра дзень і парадак вяселля, пра колькасць гасцей на гэтым мерапрыемстве. Таму дадзены абрад у Беларусі называлі *змовінамі*. Калі ўсё было абгаворана, маладыя сядалі за стол і клалі свае правыя рукі на хлеб, а бацька або хросны нявесты абвязваў іх хусткай або стужкай. Адсюль другая назва гэтага абраду — *заручыны*.

Нарэшце замацаванне дамовы здзяйснялася шляхам узаемнай трапезы і выпіўкай — *«прапіваннем»* нявесты. Гэты абрад здзяйсняўся ў некалькі этапаў: каб дамовіцца пра ўсе падрабязнасці вяселля, сваты наведваліся ў дом нявесты некалькі разоў. Таму ў розных рэгіёнах Беларусі гэта называлася па-рознаму: ***запоіны, першыя і другія (вялікія) заповіны, запэвыны, запіткі, запіўкі, запой, перапой, малая*** і ***вялікая гарэлка,*** і г.д. Выпіўку звычайна прывозіў сват жаніха: ***«Я сват прысланы, каб быў стол засланы»***.

У канцы запоінаў нявеста дарыла жаніху напоўненую жытам бутэльку, закручаную ў палатно і абвязаную поясам сваёй працы, што пацвярджала яе канчатковую згоду на шлюб. З дадзенага моманту дзяўчына лічылася засватанай, яна атрымоўвала новую назву — *«княгіня»* ці *«заручоная»*. І ніхто, як з боку жаніха, так і з боку нявесты пасля гэтага моманту не меў права змяніць сваё рашэнне. У чарку нявесце клалі манету, якую яна потым забірала сабе. У якасці закускі бацькі маладой падавалі яешню або сыр. Адсюль і выраз: *«запілі дзяўчыну, заелі яешняй»*. Як бачым, характар запоінаў зноў-такі на-

гадваў звычайную гандлёвую аперацыю, паспяховы вынік якой заканчваўся абрадам запоінаў.

Перад самым вяселлем, у суботу вечарам, у доме нявесты ладзілі «*зборную суботу*» або «*дзявочы*» ці «*паненскі вечар*». Дзявочы вечар быў своеасаблівай мяжой у жыцці і сацыяльным статусе дзяўчыны. Яна развітвалася са сваім маладым жыццём, са сваімі сяброўкамі. Развітваючыся са сваім мінулым і родным домам перад вяселлем, нявеста аплаквала дзявочае жыццё. Прычым плакаць трэба было абавязкова, таму што плач лічыўся рытуальным. І чым гучней, тым лепш, верылі, што пасля гэтага далейшае жыццё дзяўчыны будзе больш весялейшым.



*Вяселле. Фота з Мотальскага музея (Іванаўскі р-н., Брэсцкая вобл.)*

Змена сацыяльнага статусу нявесты сімвалічна параўноўвалася са смерцю ў мінулай якасці і нараджэннем у новай. Паколькі нявесце даводзілася пераходзіць на чужы бок, у новую сям'ю, гэты працэс быў для яе больш актуальным, чым для жаніха. Таму большасць абярэгаў і забабонаў, якія пачыналі дзейнічаць пасля сватаўства, тычыліся менавіта нявесты. Сюды ўваходзяць і рытуальныя дзеянні, звязаныя з валасамі чалавека — крыніцай сувязі і сілкавання з Космасам і са светам продкаў. Так, да шлюбу будучая нявеста павінна была насіць дзявочы вянок, які пакідаў адкрытай макушку галавы, а яе валасы былі заплецены ў адну касу.

Напярэдадні вяселля, перад вянчаннем, касу маглі абрэзаць і «прадаць» жаніху, але часцей расплята лі і пераплята лі ў дзве, якія ўжо ўкладаліся па-жаночы — у «гняздо». Мяняўся і галаўны ўбор, дзявочы на жаночы, які цалкам закрываў валасы нявесты. Гэта быў *павойнік*, *намітка* або *чапец*. Гэтым дзеяннем дзяўчыне сімвалічна перакрывалі сувязь з яе продкамі, з яе родам. На Магілёўшчыне этнографы зафіксавалі такі звычай: падчас расплятання касы твар маладой таксама накрывалі наміткай або хустачкай. А рабілі так таму, каб «*не сурочыць*» маладую, засцерагчы яе ад нядобрага вока, таму што твар, а найперш вочы — асноўны канал узаемаадносін з людзьмі і гасцямі. Відаць, адсюль і пайшла сучасная фата, якая ў мінулым закрывала галаву і твар маладой і тым самым ахоўвала яе ад ліхіх сіл. Пасля вянчання і змены прычоскі нявесту пачыналі зваць *маладзіцай*.

Калі жанчына доўга не бралася шлюбам або нараджвала пазашлюбнае дзіця, яна не мела права насіць ні дзявочы галаўны ўбор, ні жаноцкі. Лічылі, што іначай можна выклікаць град. А яе галаўны ўбор называлі «*пакрытка*».

Старажытнае ўяўленне пра нявесту як пра істоту, якая знаходзіцца паміж светам жывых і светам памерлых, сваімі каранямі сыходзіць у эпоху дакласавых грамадстваў. У беларускай вясельнай абраднасці яно праяўляецца часта і ярка. Так, пры пераездзе са свайго роднага дома ў дом жаніха, для нявесты было вельмі важным пераадольванне такіх прасторавых меж, як парог роднай хаты, мяжа сваёй вёскі, пераправа праз раку і г.д. Іншымі словамі, ёй трэба было паспяхова і без перашкод пакінуць прастору сваіх продкаў, свайго роду і перайсці ў «чужую» прастору дзеяння продкаў жаніха.

Прыкладам, каб быць шчаслівай у шлюбе, нявеста перад ад'ездам да вянчання пераступала парог сваёй хаты правай нагой, павярнуўшы галаву да сонца. А праехаўшы свае палеткі, яна разрывала і кідала хустку, якой да гэтага выцірала слёзы. Лічылася, што такім чынам яна пакідае тут назаўсёды свае слёзы і сум. Вельмі важнай была і водная перашкода. Як вядома, вада ў старадаўняй абраднасці заўсёды выступала мяжою паміж тым і гэтым светам. Таму, даехаўшы да першай вады, нявеста прыносіла ахвяру: кідала ў ваду грошы, хлеб або што-небудзь са свайго адзення, а каля млына прасіла адкрыць запруду і выпусціць ваду, іначай нельга было ехаць далей. Часам наадварот, каб жыццё маладой не круцілася колам, яна прасіла спыніць млынавае кола.

Дэманічныя якасці нявесты, далучанасць яе да свету памерлых праяўляліся і пры пераездзе яе да жаніха. У гэты адказны момант ня-

веста ўспрымалася як *«нячысты»* чалавек. Таму, каб не нашкодзіць родным, жаніх пераносіў нявесту, як істоту не зусім яшчэ «сваю», праз парог хаты на руках. А ў вясельных песнях расказваецца, як маці жаніха, сустракаючы нявестку пасля вянчання, не можа адразу зразумець, хто перад ёю: *«чорт з балота»* ці *«ваўчыца з цёмнага лесу»*, а сама маладая *«на народ як глянець, дык народ аж вянець»*.

Матыў непазнавальнасці нявесты ў яе новай якасці стасуецца з этымалогіяй самога слова «nevesta», як «невядомая». У той жа час у вырашальны перыяд «пераходнага абраду» нявеста надзялялася сак-



*Падрыхтоўка вясельнага каравая, вёска Моталь (Іванаўскі р-н., Брэсцкая вобл.)*

ральнымі функцыямі і звышнатуральнымі якасцямі. Верылі, што яна можа таксама сурочыць другіх людзей, паўплываць на іх лёс, валодае дарам прадбачання, уплывае на прыроду — можа выклікаць засуху і г.д. А калі дзяўчына памірала заручонай, але цнатлівай і яшчэ не павянчанай, то ператваралася ў русалку.

У вясельнай традыцыі продкаў вельмі небяспечным лічылася сустрэча дзвюх нявест, калі яны на сваіх вясельных фурманках ехалі на вянчанне або калі вярталіся пасля яго. Гэты момант адлюстраваны ў шматлікіх легендах і паданнях, дзе распавядаецца, што пасля такой сустрэчы ніхто з абодвух бакоў не хоча саступаць адзін аднаму дарогі, таму паміж імі пачынаецца бойка. У выніку ўсе ўдзельнікі вя-



*Вясельныя караваі (малюнкі канца XIX ст. Слуцкі і Барысаўскія паветы)*

сельнай працэсіі, як з аднаго боку, так і з другога, ператвараюцца ў ваўкоў ці ўвогуле — у камяні. Лічылася, што такая сустрэча пагражала нявесце і яе будучым дзецям усялякімі няшчасцямі, цяжкай хваробай або заўчаснай смерцю. Паводле старажытных вераванняў, адна з дзвюх нявест абавязкова забярэ ў другой *«яе дні»*, шчасце і ўдачу, або зробіць яе бяздзетнай. Таму, каб нявесты не пабачылі адна другую пры сустрэчы, іх замотвалі хусткамі ці пакрывалі чым-небудзь чырвоным, прымушалі іх абменьвацца пярсцёнкамі, шпількамі, заколкамі або іншымі металічнымі рэчамі.

Важным этапам вясельнага дзейства быў *пасад* (*пасаг*) маладой ці абодвух маладых. Сэнс гэтага абраду ў тым, што бацькі жаніха і нявесты благаслаўлялі сваіх дзяцей, і ў знак шлюбнага злучэння і з'яднання садзілі іх на самае ганаровае месца ў хаце. Звычайна гэта была дзяжа або лава, засланая жытнёвым снапом ці вывернутым кажухом. Лічылася, што ў такім выпадку маладыя будуць багатымі і шчаслівымі. Пры гэтым маладых звязвалі поясам ці наміткай, якой потым павівалі нявесту. Нават існаваў такі тэрмін — *пасагаці*, што азначала: узяць шлюб. Прычым на пасад саджалі толькі ў тым выпадку, калі нявеста захоўвала цнатлівасць. У адваротным выпадку маладыя мусілі садзіцца на непакрытую лаўку або голую калоду.

Адным з кульмінацыйных момантаў вясельнага абраду, які афармляў шлюб разам з заручынамі і пасадам, было вянчанне. З гістарычнай і краязнаўчай літаратуры вядомы яго хрысціянскі варыянт, які захаваў у сабе некаторыя архаічныя рытуалы. Прыкладам, калі маладыя прыязджалі ў храм, яны тройчы абыходзілі вакол аналоя ці алтара па сонцу, і станавіліся перад алтаром на адмысловы чырвоны пояс. Пасля святар бласлаўляў маладых і замацоўваў іх шлюб вясельнымі вянцамі ці каронамі, трымаючы іх над галовамі

суджаных. Потым па прыездзе да дому жаніха маладыя таксама тройчы па сонцу абыходзілі вакол ягонага дому, клеці або калодзежа, а ў самім доме — вакол пячы.

Вядома, што яшчэ ў 1950-я гг. у Маларыцкім раёне маладыя па дарозе ў царкву спачатку заязджалі ў лес і ў абавязковым парадку спыняліся каля старога дуба. Можна ўзгадаць і вясельныя песні, якія тычацца вянчання і дзе прыгадваецца матыў Сусветнага дрэва — залатой вярбы ў мора. З усяго гэтага вынікае, што ў вельмі далёкія часы пасля ўмыкання або куплі-продажу нявесты маладыя вянчаліся на капішчах пад сакральным дрэвам, тройчы абыходзячы вакол яго. Да нашага часу захавалася жартаўлівае прыслоўе:

> «Абвёў вакол елі, і чэрці ім пелі. Абвёў вакол дуба, дык няхай будзе люба!»

Пасля вянчання наступаў яшчэ адзін вельмі важны этап абрадавага «пераходу» — шлюбная ноч. Адсюль ўяўленні пра розныя небяспекі гэтага моманту і шматлікія абярэгі, табу і прадпісанні. Звычайна такая ноч адбывалася ў доме жаніха. Месца для шлюбнай ночы выбіралі адмысловае. Часта гэта было асобнае памяшканне ў доме: нежылы халодны пакой, камора, гарышча, клець або асобная пабудова ў двары — лазня, гумно, ёўня, стадола.

Абрад укладання маладых на шлюбны ложак атрымаў назву «*ўкладзіны*». Ён адбываўся адразу пасля застолля, дзе жаніх і нявеста амаль не дакраналіся да ежы. Ложак перад гэтым слалі звычайна маці і сястра жаніха. Яны ж з мэтай абярэга глядзелі, каб у пасцель не падкінулі зламаныя іголкі, косткі ды сабачую поўсць, змяшаную з кашэчай. Так рабілі недобразычліўцы, каб нашкодзіць маладым і ўнесці ў новую сям'ю сваркі. Затое, каб у сям'і нараджалася шмат дзяцей, у сам ложак або пад яго клалі некалькі паленцаў і такія фалічныя сімвалы, як палку ці таўкач, каб мець першай дачку — жаночы абутак, а каб сына — мужчынскую шапку, для будучага багацця — грошы, а для ўзаемнага кахання — зёлкі любісты.



*Вясельны каравай (фота канца XX ст.)*

Перад укладзінамі быў шырока распаўсюджаны абрад разування жаніха нявестай. Абрада-

вае дзеянне палягала ў тым, што нявеста здымала з жаніха боты або другі абутак часта толькі з правай нагі, за што атрымоўвала грошы, пакладзеныя папярэдне ў бот. У другі бот часам клалі бізун. У некаторых рэгіёнах Беларусі нявеста пасля таго, як здымала бот, ударала ягонай халявай жаніха. Пасля ўкладання ў ложак маладых звязвалі ручніком, а спачывальню запіралі на замок. Згодна з прыкметамі, хто першы з іх засне, памрэ раней за другога. Госці ж у гэты час працягвалі весяліцца, таньчыць і спяваць эратычныя песні.

На працягу шлюбнай ночы маладых час ад часу наведваў дружка нявесты. Па-першае, каб прынесці маладым пачастунак, па-другое, каб праверыць ці «*спазналіся*» яны, інакш кажучы, як закончыўся шлюбны акт. Месцамі па Беларусі сустракалася табу на дэфларацыю нявесты ў першую шлюбную ноч. Так, на Брэстчыне гэта не дапускалася, покуль маладыя не забяруць у бацькоў карову або не наведаюць у першы раз пасля вяселля царкву. У выпадку імпатэнцыі жаніха або ягонай недасведчанасці дэфларацыю здзяйсняў бацька жаніха ці ягоны старэйшы брат.

Раніцай аглядалі шлюбную пасцель і правяралі нявесту на цнатлівасць. «Нячэсную» нявесту лічылі прычынай усялякіх няшчасцяў, засухі і неўраджая. Потым адбываўся абрад умывання ці мыцця маладых — абрад ачышчэння, які здзяйсняўся звычайна пасля шлюбнай ночы ў спачывальні.

Вельмі важным і неабходным дзеяннем пасля шлюбнай ночы лічыўся абрад дзяльбы каравая. Увогуле вясельны абрад распачынаўся з выпякання каравая, што сімвалізавала пачатак вяселля, а ягонае размеркаванне паміж гасцямі сведчыла пра заканчэнне вясельнага дзейства. Каравай у гэтым абрадзе сімвалізаваў сабой «новую» долю, якая надавалася маладым самім Богам і якою яны павінны былі дзяліцца з астатнімі. Так, у вясельнай песні спяваецца: «*Сам Бог каравай месіць, Прачыстая свеціць, Месяц у печ саджае, Сонейка запякае...*». Будучую сям'ю чакалі беды і няшчасці, калі камусьці з гасцей на вяселлі не хапала каравая, лічы — ягонай часткі долі.

Потым на працягу ўсяго свайго жыцця сям'я выдаткоўвала прызначаную ім боскую долю: у першую чаргу, муж і жонка павінны былі нарадзіць і выгадаваць дзяцей і тым самым працягнуць свой род, а потым ужо выконваць астатнія абавязкі. Нарэшце людзі падыходзілі да таго, што ім трэба было рыхтавацца да смерці, якая ўсведамлялася ў народзе як «*жаніцьба з сырой зямлёй*» і абрад праваджэння якой меў агульныя паралелі з вясельным абрадам.

# Глава 5

# СМЕРЦЬ, НЯБОЖЧЫК, ПАХАВАЛЬНЫ АБРАД

У светапоглядзе беларусаў не было абсалютнай смерці-знікнення, а толькі завяршальны этап чалавечага існавання, пераход у іншы свет — краіну нябожчыкаў. Міфалагічна смерць успрымалася як вiток жыцця, які садзейнічае перыядычнаму аднаўленню прыроды і грамадства. Існавала таксама павер'е, што кожны чалавек мае сваю зорку, якая запальваецца ў момант нараджэння і падае на зямлю ў момант смерці. У народзе кажуць:

> «Як толькі памрэ чалавек, яго зорка зрываецца з месца і знікае ў прасторы. Памрэ праведнік — зорка ляціць угору і ў бакі, грэшнік — зорка падае ўніз».

Саму смерць уяўлялі бледнай худой жанчынай, вышэйшай за дрэвы, у белым покрыве, з вогненным вянком на галаве і з акрываўленай хустачкай у руцэ. Гэтая міфічная істота называлася ў народзе Белая Баба. Дзе яна ступала, там з'яўляліся святыя магілы, куды махала хустачкай — там пусцелі паселішчы, а калі ў акно прасоўвала руку — там не заставалася ніводнай жывой душы. У некаторых мясцінах Беларусі смерць уяўлялі ў выглядзе аграмаднага чалавека ў белым адзенні з касой ці сякерай у руках. Цікава, што абрадавая лялька, якая спальвалася на Масленіцу, таксама мела жаночае ўвасабленне і называлася «*Смерць*». Увасабленне смерці як нейкай жывой істоты перайшло з міфалогіі ў казачны фальклор. Шмат у якіх казках расказваецца пра тое, як салдат (па другім варыянце каваль), перахітрыў Смерць і пасадзіў яе ў мех.

Лічылі, што смерць з'яўляецца да людзей з прадказаннем хуткага набліжэння іх скону ці ў момант развітання чалавека з жыццём. Верылі, што смерць забірае людзей не па свайму выбару, а тых, каго Бог ёй прызначыць. Смерць любіць прыходзіць перад узыходам сонца, у гадзіны, кратныя тром — а 9-й і 12-й раніцы і а 3-й, 6-й, 12-й увечары. З апоўначы і да світанку яна не прытрымліваецца канкрэтных тэрмінаў і можа забраць чалавечае жыццё ў любы момант.

Нябожчыкаў адносілі да «*чыстых*» і «*нячыстых*». Першымі лічыліся людзі, якія пражылі свой век да старасці, памерлі натуральнай смерцю і былі пахаваны па існуючых у пэўнай грамадзе нормах. Іх у народзе называюць дзядамі. «Нячыстымі» лічылі тых, хто памёр выпадкова і гвалтоўна, да прыкладу, ад празмернага п'янства, змёрз або



Курган X ст. «Чорная Магіла», Чарнігаў (рэканструкцыя ўзвядзення насыпу)

згарэў у пажары, а таксама тапельцы, самагубцы і тыя, хто знік без звесткі.

Галоўнай адзнакай «*няправільнай*» смерці з'яўляецца тое, што памерлы не пражыў свой век да канца вызначанага тэрміну або жыў непаўнавартасна. Гэта мёртванароджаныя дзеці або дзеці, загубленыя сваімі маткамі ці памерлыя няхрышчанымі. «Нячыстымі» нябожчыкамі робяцца і тыя, хто пры жыцці меў справу з нячыстай сілай — вядзьмаркі, чараўнікі і тыя, каго праклялі бацькі. Усіх гэтых памерлых лічылі вельмі небяспечнымі, верылі, што пасля смерці яны ператвараюцца ў такіх «*хадзячых*» нябожчыкаў, як вупыры, русалкі і кікімары. Таму іх хавалі па-за межамі могілак і без звычайнага абраду пахавання; памінак па такім памерлым не ладзілі.

Што тычыцца «*чыстых*» нябожчыкаў, былі ўпэўнены, што яны і на тым свеце працягваюць актыўнае жыццё. Зразумела, што пахавальнаму абраду як галоўнаму абраду «*перахода*» з нашага свету ў свет памерлых старажытны беларус заўсёды надаваў вялікую ўвагу. Жанчыны задоўга да смерці пачыналі ткаць сабе кашулю-саван са сваіх валасоў або звычайнае палатно, якое пасля смерці слалі ёй у труну. Таксама маглі пакласці ў дамавіну папярэдне вытканы пояс, верылі, што на той свет нябожчык павінен з'явіцца падпяразаным. Падчас пахавальнага абраду нябожчыка мылі, апраналі ў новае святочнае адзенне, а калі гэта былі дзяўчына ці хлопец дашлюбнага ўзросту — у падвянечныя строі. На Брэсцкім Палессі перад галавой памерлага, якога б узросту ён не быў, ставілі вялізны бохан хлеба.

Тым падкрэслівалі, што чалавек памёр не ад голаду і беднасці, а па волі Божай.

Калі хавалі мужчыну, каля галавы клалі шапку, калі жанчыну — хустку або чапец, цяжарнай — пялюшкі і дзіцячыя цацкі, краўцу — іголку, шаўцу — шыла, цясляру — сякеру. Калі паміраў дзіцёнак, яму ў дамавіну клалі нітку, якой папярэдне вымяралі рост ягонага бацькі, каб ён ведаў, да якіх памераў яму трэба вырасці ў «тым» жыцці. На Піншчыне пасля смерці суродзіча каля брамы ягонага двара распальвалі вогнішчы, каб *«нябожчык пагрэў ногі»*. Правільна здзейснены пахавальны абрад і памінальныя рытуалы лічыліся ўмовай захавання жывых, існавання ўсяго калектыву. Верылі, што душы памерлых адыходзілі на вяршыню Сусветнага дрэва, а памерлы чалавек мог ператварацца ў жывёл, птушак, насякомых, дрэвы і расліны.

Труна лічылася жытлом нябожчыка на «тым свеце». А каб памерлы не выходзіў і не ўмешваўся ў справы жывых, яна была без акон і дзвярэй. Звычайна дамавіну рабілі на двары нябожчыка, але, калі ў гаспадарцы меліся чорны певень або сівы вол (сімвалы смерці), тады ў іншым месцы. Дошкі для труны гадамі высушваліся на гарышчах хат. Трэскі, якія заставаліся ад вырабу, спальвалі на месцы працы або іх пускалі па бягучай вадзе ці клалі ў труну. «Нячыстых» нябожчыкаў хавалі без труны і за межамі могільніка. Калі хавалі дзяўчыну-нявесту, труну абвязвалі чырвоным поясам ці хусткай. Тым, хто ішоў за такой дамавінай падчас пахавання, бацькі раздавалі простыя рознакаляровыя паясы, зробленыя нябожчыцай. Калі нябожчыка неслі праз паселішча, то ўсюды будзілі спячых, а немаўлятам і малым дзецям у якасці абярэгаў клалі каля галавы шчотку, а ў нагах нож. На Заходнім Палессі стараліся знайсці чорнага вала з белай плямай на ілбе, каб ён велічна завёз труну на могілкі.



*План курганнага пахавання XI—XII стст.*

Могільнікі мелі сваіх ахоўнікаў. Напрыклад, на Магілёўшчыне і Міншчыне захавальніцай могільнікаў лічылася Знічка — жоўта-бледная, худая, раскудлачаная жанчына невысокага росту, апранутая ў празрысты белы саван, які свяціўся ў цемрадзі. Ноччу яна плакала над магіламі пахаваных. Былі ўпэўнены, што гэтай міфічнай істоце падпарадкоўваліся розныя магільныя духі, прывіды і страшыдлы.

У народнай культуры вялікае месца займае культ продкаў. Ён грунтуецца на веры ў непарыўнае адзінства жывых пакаленняў з іх памерлымі продкамі, якіх ушаноўваюць як адразу пасля смерці, так і падчас каляндарных абрадаў. Пасля пахавання спраўлялі хаўтуры або памінкі. Некалі гэта адбывалася на могілках, а пазней у хатах. Католікі праз 30 дзён, а праваслаўныя праз 40 і цяпер спраўляюць памінальны абрад. У праваслаўных гэты звычай вядомы як Сарачыны. Лічылася, што ў дзень памінання душа нябожчыка перад тым, як адляцець на неба, наведвала родную сядзібу. Памінальны жалобны стол паходзіць ад старажытнай язычніцкай трызны. Яшчэ ў пачатку XX ст. у Ельненскім павеце на Смаленшчыне да магілы памерлага, на 40 дзень пасля пахавання, запрашалі святара з прытчам. Магілу спачатку пакрывалі авечай скурай, а потым абрусам і запальвалі свечку. Пасля заканчэння паніхіды святар здымаў з сябе рызу і таксама накрываў ёю магілу.

«Аповесць мінулых часоў» гаворыць: «*А калі хто паміраў, спраўлялі трызну па яму*». Пад трызнай мелася на ўвазе сумесная трапеза, а калі нябожчык быў воінам, асабліва высокага рангу, то ў трызну ўваходзілі яшчэ і спаборніцтвы ў гонар памерлага. Гэта былі або ваенная гульня, або конныя турніры, або кулачныя баі, або стральба з лука і такім чынам ладзілі своеасаблівы парад, які прымаў нябожчык. На вяршыні кургана складалі яго зброю і даспехі, там жа ўрачыста сядалі суддзі. Хутчэй за ўсё, адгалоскам такой трызны з'яўляецца ўшанаванне самага вялікага кургана ў магільніку XI ст. каля вёскі Княжая Магіла (цяпер пас. Чапаева непадалёк ад г.п. Урэчча) Любанскага раёна. Там яшчэ напачатку XX ст. вешалі на дрэва, якое расло на кургане, драўляную стрэльбу і шаблю. Так рабілі нібыта ў памяць пра загінуўшага ў бітве князя.

Аднымі са старадаўніх памінальных абрадаў, якія дайшлі да нашага часу, з'яўляюцца восеньскія Дзяды і вясновая Радаўніца. Што тычыцца Дзядоў, іх адзначалі раней па ўсёй Беларусі, а Радаўніцу ў асноўным на ўсходзе краіны. Але апроч гэтага, існуе яшчэ шмат такіх памінальных дзён, як перад ці пасля многіх каляндарных свят, у тым ліку перад Сёмухай і пасля Вялікадня.



*Каменны курган XIII ст. (малюнак В. Шукевіча, пач. XX ст.) Тэрыторыя былога Лідскага павета*

Дзяды — гэта памінальная рытуальная вячэра ў памяць памерлых родзічаў, якая адзначалася ў хаце. Да яе пачыналі рыхтавацца яшчэ вясной, калі гаспадар выбіраў са свайго статку якую-небудзь свойскую жывёлу і прызначаў яе да рытуальнага стала. Калі скаціна не дажывала да гэтага часу або ішла на другія мэты, лічылася, што продкі маглі пакараць сям'ю. Калі ж гаспадары ўвогуле забудуцца ад-




*План пахавання ў каменнай магіле XIII—XIV стст. каля вёскі Перавоз (Глыбоцкі р-н., Віцебская вобл.)*

значыць гэты вечар, у іх хаце абавязкова здарыцца няшчасце: захварэе або памрэ нехта з сямейнікаў, а на скаціну нападзе мор.

Перад вячэрай адчынялі заслонкі ў печы, дзверы ці вокны, запальвалі свечку. Верылі, што менавіта ў гэты час памерлыя выходзяць з магіл і ідуць у свае хаты на памінальную трапезу. У самым пачатку застолля гаспадар рабіў магічнае абкурванне: з запаленай свечкай тройчы абыходзіў вакол стала. Потым усе садзіліся есці. Хлеб не рэзалі, а ламалі. Пасля вячэры душы выправаджвалі: ад стала да дзвярэй палівалі вадой падлогу, выкідвалі гаршчок з куццёй і зачынялі дзверы. На паўночным усходзе Беларусі перад вячэрай трэба было абавязкова памыцца ў лазні і пакінуць там ваду і рэчы для дзядоў.

Самыя раннія пахаванні на тэрыторыі Беларусі вядомы з эпохі неаліту. У Краснасельскіх крамянёвых шахтах у Ваўкавыскім раёне выяўлена пахаванне старажытнага шахцёра. Побач са шкілетам знойдзена касцяная іголка, а каля ног гліняны гаршчок. Паблізу вёскі Пархуты Дзятлаўскага раёна на Гарадзеншчыне адкрыта пахаванне з каменнай сякерай, крамянёвай пласцінай і гліняным гаршчком. Пазней, у эпоху бронзы і ранняга жалезнага веку, суіснавалі два віды пахаванняў: абрад крэмацыі (трупаспалення) і інгумацыі (трупапалажэння). У асноўным гэта тычыцца паўднёвых раёнаў Беларусі. Былі як грунтовыя пахаванні, так зрэдку і курганныя. Археалагічныя назіранні сведчаць, што на грунтовых могільніках рубяжа нашай эры пахаванні пазначаліся нейкімі драўлянымі збудаваннямі. Пра гэта гавораць сляды ямак ад слупоў, што засталіся на пахаваннях.

На тэрыторыі цэнтральнай і паўночнай Беларусі пра пахаванні гэтага часу амаль нічога не вядома. Мяркуецца, што спаленыя косткі загортвалі ў тканіну, бяросту ці змяшчалі ў гліняны посуд і апускалі ў вадаёмы або ў дуплы дрэў, ці закопвалі ў валах гарадзішчаў. Сінхронныя могільнікі выяўлены ў вадаёмах на суседніх тэрыторыях Літвы і Латвіі. Аднак ёсць і невялікая колькасць знаходак спаленых костак у каменных агароджах, якія нагадваюць скрыні, а таксама ў гліняных вёдрападобных сасудах, накрытых зверху глінянай патэльняй. Гэта ў ваколіцах Лагойска, Вілейкі, вёсцы Казлоўцы Мёрскага раёна і іншых.

У другой палове I тысячагоддзя на большай частцы тэрыторыі Беларусі пачаў распаўсюджвацца курганны абрад пахавання, які праіснаваў да часоў хрысціянізацыі. Як рэлікты язычніцтва сустракаліся выпадкі вяртання да курганнага абраду пахавання і ў часы позняга сярэднявечча. Прыкладам, у Чамярах і Чурылаве Мёрскага,



*Курганны насып XI ст. з каменнай абкладкай, вёска Селішча (Лагойскі р-н., Мінская вобл.)*



*Надмагільная канструкцыя XII ст. каля вёскі Дакучын (Крупскі р-н., Мінская вобл.)*



*Надмагільныя камяні са знакамі (Панямонне)*

Крапіўне Аршанскага, Крамянцы Лагойскага раёнаў і іншых месцах.

У міфалагічных уяўленнях курганы суадносяцца з легендарнымі першапродкамі — волатамі або з чужынцамі-ворагамі — татарамі, шведамі, французамі... Інтэрпрэтацыя ў народнай свядомасці з волатамі ўзнікла з-за велічыні насыпаў, вышыня якіх часам дасягае да трох і нават да пяці метраў, а іх дыяметр ад 15 да 20, асабліва на паўночным усходзе Беларусі. Большасць жа курганных насыпаў мае вышыню каля метра і дыяметр каля пяці метраў. Велічыня кургана сведчыць пра сацыяльны статус пахаванага, а таксама пра тое, наколькі доўга трымалася памяць пра чалавека. Існаваў звычай штогод у памінальныя дні падсыпаць курганы.

Можна пачуць паданні пра пеўняў, якія апоўначы спяваюць на курганным насыпу, пра рознакаляровыя агеньчыкі, рыцара на белым кані, белага быка, старца з доўгай барадой, прыгажуню з распушчанымі валасамі і г.д. Асабліва авеяны паданнямі вялікія курганныя насыпы. Сустракаюцца шматлікія назвы кшталту *Асілкава Магіла*, *Дзявічая Магіла*, *Змеява Магіла*, *Кацярынін Курган*, *Княжая Магіла*, *Магіла Міндоўга* і іншыя.

Абрады трупаспалення і трупапалажэння на працягу ўсёй нашай гісторыі чаргаваліся. Напачатку II тысячагоддзя на тэрыторыі Беларусі гэтыя два абрады суіснавалі. На захадзе краіны яшчэ ў XIV ст. ліцвінскіх князёў спальвалі. Падчас курганнага абраду пахавання насып звычайна рабілі над глінянай урнай з прахам, якую ставілі ў выкапаную ямку ці проста на зямлю. Вакол кургана капалі неглыбокі равок, дзе разводзілі агонь, або ўзводзілі агароджу з брамай. Агароджу таксама потым спальвалі. Затым штогод у памінальныя дні курган дасыпаўся. Пазней пераходзілі паступова да абраду трупапалажэння ў яміне, але яшчэ доўга і доўга над магілай насыпалі курган. Зафіксаваны таксама каменныя агароджы вакол урны з прахам, драўляныя хаткі, якія ў народзе называлі *церамок*, *бдын*, *буда*, *галубец* і г.д.

Разам з нябожчыкам часта хавалі і жывёл. Напрыклад, у вёсцы Гарадок Маладзечанскага раёна ў кургане VI–VII стст. побач са спаленым нябожчыкам у яміне ляжаў шкілет каня. У кургане VIII–IX стст. каля вёскі Дарахі Гарадоцкага раёна спалены былі і нябожчык, і конь. А ў вёсцы Замошша Талачынскага раёна каля шкілета чалавека знойдзены рэшткі спаленага каня.

На пахавальных помніках Глыбоччыны разам з нябожчыкам знаходзілі чарапы казлоў, авечак, бараноў. У Нісімкавічах Чачэрскага раёна побач са шкілетам чалавека ляжаў цэлы шкілет двухгадовай свінні. Вельмі частыя знаходкі ў курганных пахаваннях курыных костак, сустракаюцца і косткі рыб. Затое костак дзікіх жывёл і птушак не выяўлена. Паводле старажытных вераванняў, калі разам з чалавекам пахаваць косткі хатніх жывёл і птушак, гэта паспрыяе на тым свеце іх адраджэнню, захаванню плоднасці і багацця.

Паколькі верылі, што памерлы працягвае сваё жыццё ў іншым свеце, то яму там шмат што спатрэбіцца. Таму ў магілы клалі розныя рэчы і абярэгі ад злых сіл, да прыкладу, нажы, сярпы, замкі, шматлікія амулеты. У некаторых курганах паблізу вёсак Укля Браслаўскага, Перавоз Глыбоцкага, Каласы Рагачоўскага раёнаў каля ног нябожчыц былі пакладзены бранзалеты, скроневыя кольцы, каралі. А



*Магілы XIX ст. з камянямі па перыметры, вёска Асецішча (Докшыцкі р-н., Віцебская вобл.)*

ў пахавальных гаршчках знаходзілі часам і васковыя свечкі. На тэрыторыі Усходняй Еўропы пахаванні са свечкамі датуюцца 970-мі гг. X ст., а гэта значна раней афіцыйнага хрышчэння Русі.

Драўляныя збудаванні (церамкі), падобныя курганным, толькі ўжо над звычайнымі магіламі, у многіх раёнах Падняпроўя, Пасожжа і Палесся ўзводзілі яшчэ да сярэдзіны XX ст., напрыклад у вёсках Боркі і Арэхаўка Клічаўскага, Сінкевічы Лунінецкага, Хорастаў Салігорскага, Любонічы Кіраўскага раёнаў і інш. Такія збудаванні выглядалі як хаткі, памерамі звычайна 2 × 1,5 м і вышынёй 0,5–0,8 м. У хатак двухскатны дах і адно акенца, праз якое ў дні *дзедкаванняў* ставілі ежу. Лічылася, што акенца прызначана для выхаду душ памерлых на гэты свет. Падобныя збудаванні вядомы ад эпохі бронзы і да XX ст.

Цікава, што хаткі з адным акенцам часта фігуруюць у паданнях і казках, узгадаем хатку на курыных ножках, дзе жыве Баба Яга. У вёсцы Горная (былая Дзіракі) Вілейскага раёна пра ўрочышча Мар'янкін Луг расказваюць, што там знаходзіцца праклятая рэчка, і на яе беразе ў хаце з адным акенцам некалі жыла варажбітка Мар'янка. Адно акенца фігуруе і ў паданнях пра сакралізаваныя камяні-краўцы і камяні-шаўцы. Праз гэта акенца рабілі заказ на пашыў адзення і абутку і атрымоўвалі гатовы выраб. Культавыя камяні звязаны з цэлым комплексам народных уяўленняў пра тагасвет. Звычайна яны знаходзяцца ў нізінных і забалочаных мясцінах, што, паводле старажытных вераванняў, звязаны з хтанічнай сферай, якая ў далёкія часы абагаўлялася нашымі продкамі і лічылася месцам знаходжання душ памерлых.

Дарэчы, у памінальныя дні праз акно звычайнай хаты ажыццяўляўся «кантакт» з душамі памерлых: вывешвалі з акна ручнік, хустку або кавалак тканіны, а на падвоканні ставілі шклянку вады, каб душа магла прыйсці памыцца і выцерціся. Таксама праз вакно праводзілі душы пасля памінальнай вячэры.

Да нашых дзён на некаторых старых могілках можна ўбачыць архаічныя надмагіллі — драўляныя калоды рознай формы: акруглыя, у выглядзе чатырохграннага бруса, часам з пакінутым суком. Такія надмагіллі ёсць у вёсках Гацькаўшчына Аршанскага, Багданаўка Лунінецкага, Хатынічы Ганцавіцкага, Парэ Пінскага раёнаў і г.д. У розных месцах іх называюць па рознаму: *нарубы*, *дубы*, *грабы*, *гурбакі*, *прыклады*, *прыхораны* і інш. Звычайна надмагіллі ўзводзілі перад восеньскімі Дзядамі, а сам абрад меў назву *прыкладзіны*. У гэты ж дзень на магілу ставілі бліны, арэхі, гарэлку. Паводле павер'яў, гэта рабілі для таго, каб нябожчыкі падчас сваёй вандроўкі па свеце маглі



*Графічная рэканструкцыя «доміка мёртвых» (ранні жалезны век)*



*Надмагілле ў выглядзе церамка. Узведзена ў 1929 г., вёска Баркі (Клічаўскі р-н., Магілёўская вобл.)*



*Дзіцячыя пахаванні на палескіх могілках (1930-е гг.)*

прысесці і адпачыць. Пасля абраду прыкладзінаў пахаваны пераходзіў ужо ў статус «дзядоў».

Памінальныя абрады, якія продкі ладзілі пасля пахавання, у памяць памерлага вылучаліся сваёй разнастайнасцю. Так, яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. у вёсцы Гняздзілава Докшыцкага раёна на могілкі ў дзень памінання прыводзілі казла, рэзалі яго, смажылі і елі. Таксама ў памінальныя дні на могілкі прыносілі ячную кашу і аддавалі хлопчыкам, якія павінны былі есці яе голымі рукамі. Такі абрад зафіксаваны ў XIX ст. на беларуска-літоўскім памежжы.



*Надмагільны «наруб» на могілках каля вёскі Хатынічы (Ганцавіцкі р-н., Брэсцкая вобл.)*

Былі выпадкі, калі на магілах пакідалі розныя рэчы. Напрыклад, напачатку 1930-х гг. у Чавускім раёне на Магілёўшчыне бачылі, як да надмагілля адной дзяўчыны прывязалі вялікую касу з кудзелі. Зразумела, што ў больш архаічныя часы каса была з сапраўдных валасоў. Падобны абрад захаваў рэлікты вельмі архаічнага звычаю, калі нябожчыку ягоныя сваякі ахвяравалі свае валасы і верылі, што разам з імі яны перадаюць памерламу магічную сілу для захоўвання сувязі паміж усімі суродзічамі.

# Раздзел IV

# ВЕРА Ў ЗВЫШНАТУРАЛЬНУЮ РОДНАСЦЬ З ПРЫРОДАЙ

## Глава 1

## САКРАЛІЗАВАНЫЯ ЖЫВЁЛЫ

Амаль ва ўсіх міфапаэтычных традыцыях свету жывёлы з'яўляюцца абавязковым элементам сістэмы вераванняў і магічных рытуалаў. Прычым іх роля — самая разнастайная. Яны могуць быць як боствамі і сакральнымі героямі, так і іх памочнікамі, і перавернутымі людзьмі, нарэшце — татэмнымі продкамі. У дачыненні да міфалагічнага Сусветнага дрэва з верхам звязваюцца ў асноўным птушкі, з сярэдзінай — наземныя жывёлы, а з нізам — хтанічныя. Гэта паўзуны, рыбы, бабры і выдры.

Вельмі часта пры выкананні розных абрадаў і рытуалаў сакральныя жывёлы выступалі ў якасці ахвяраў. Да прыкладу, на Палессі напярэдадні Купалля адбывалася спальванне костак каня, каровы і авечкі. Асаблівую ахвярную ролю гралі некаторыя жывёлы пры ўзвядзенні розных будынкаў. У некаторых рэгіёнах Беларусі такая традыцыя захоўвалася яшчэ на пачатку XX ст. Пазней традыцыйны звычай змяніўся на больш лагодны — бяскроўны. Так, перад засяленнем гаспадара ў новы дом, у першую ноч у ім павінны былі начаваць певень і курыца, у другую — кот або котка, у трэцюю — парася, у чацвертую — авечка, у пятую — карова, у шостую — конь. І толькі на сёмую ноч, калі ўвесь негатыў новага месца сыходзіў на жывёл, у дом засяляўся сам гаспадар.

На Беларусі шырока вядомыя валуны, якія лічацца ператворанымі жывёламі. Шмат дзе на гарадзішчах і былых свяцілішчах археолагамі знойдзены амулеты з некаторых частак культавых жывёл. Немалую ролю адыгрывалі жывёлы і ў пахавальным абрадзе, пра



*Касцяная праколка з заамарфнай галоўкай (курганнае пахаванне X—XI стст. каля вёскі Укля, Браслаўскі р-н., Віцебская вобл.)*



*Замок у выглядзе барана (позняе Сярэднявечча, Гродна)*

што сведчаць знаходкі ў старажытных пахаваннях.

Увогуле, ***карова***, ***бык*** і ***вол*** — самыя сакралізаваныя жывёлы ў нашай міфалогіі. Паводле звесткі Пракопія Кесарыйскага (VI ст.), славяне верылі ў вярхоўнага бога-грамавіка, а ў ахвяру яму прыносілі быка і другіх сакральных жывёл. На тэрыторыі Беларусі культ быка прасочваецца яшчэ з часоў позняга неаліту. Косці быка разам з рэшткамі людзей сустракаюцца ў курганных пахаваннях. Шмат дзе на Беларусі падчас археалагічных раскопак знойдзены культавыя круглыя металёвыя падвескі з выявай быка.

У беларускай міфалогіі пашырана супрацьпастаўленне вала (аблегчанага быка) і паўнавартаснага быка, і адпаведна іх адносіны да розных полюсаў свету. ***Бык*** як асноўная ахвярная жывёла Перуна заўсёды звязваўся з ягоным культам і верхнім полюсам бінарных апазіцый. Прынясенне быка ў ахвяру грамавіку захавалася і ў пазнейшыя, ужо хрысціянскія часы. Толькі ахвярапрынашэнне здзяйснялася на Іллю, у свята Іллі-прарока, які замяніў сабою Перуна. У гэты дзень вясковыя мужчыны збіраліся на братчыну, заколвалі быка, якога дагэтуль вырошчвалі ўсёй грамадой, варылі або смажылі жывёлу на вогнішчы і калектыўна з'ядалі або раздавалі ягонае мяса ўсім вяскоўцам.

У беларускіх загадках бык выступае як сімвал надыходу новага дня, што мае непасрэдную сувязь з верхнім светам і ўзыходам сонца: «*Сівы бык у акенца шмык*» (світанне), «*Белы бык у акно тык*» (дзень).

***Вол*** жа ў тых самых загадках атаясамліваецца з марозам, холадам і ніжнім светам: «*Прыйшоў вол, выпіў вады дол*», «*Адзін сівы вол выпіў вады дол*». Вядома таксама, што бог падземнага свету — Вялес мог

ператварацца ў вала або быка і апранаць валовую скуру. Шмат дзе на Беларусі знойдзены культавыя валуны, якія, паводле паданняў і павер'яў, з'яўляюцца ператворанымі ў камень валамі за працу на Вялікдзень і маюць адносіны да бога Вялеса.

Вельмі важнай і сакральнай жывёлай для беларускіх сялян была ***карова***. Яно і не дзіва, бо яна была для іх і карміліцай, і сімвалам урадлівасці і плоднасці, і надавала пэўны статус гаспадарцы, удзельнічала ў рытуалах першага вясновага выгану на пашу, а таксама ў ініцыяцыі хлопчыкаў-пастушкоў. Гэтая жывёла знаходзілася пад пільным доглядам гаспадынь. Каб забяспечыць добрыя надоі і павялічыць плоднасць кароўкі, нашы прабабулі ведалі шмат магічных рытуалаў і замоў. Так, выводзячы на Юр'я карову ў поле, трэба было сказаць:

*«Ідзі, мая кароўка,*
*У зялёную дуброўку,*
*Каб пад сонейкам хадзіла,*
*Пад месячыкам не блудзіла,*
*Шаўковую травінку з'ядала,*
*Крынічную вадзіцу співала.*
*Прынясі, Божа, з поўнымі цыцамі,*
*з густым малаком.*
*З Богам, кароўка, на пашу!*
*Будзь здарова цэлы год, як зямля і лёд».*

З мэтай абярэгу кароў ад хвароб і сурокаў, абыдзённае палатно ткалі за адзін дзень усе жанчыны вёскі і праганялі ўвечары статак праз яго.

Але яшчэ задоўга да быка, вала і каровы вялікай пашанай у нашых продкаў карыстаўся вымерлы цяпер бык — ***тур***. Старажытныя паляўнічыя лічылі гэтага моцнага звера ўвасабленнем сакральнага продка, душа якога прыняла зоаморфны выгляд. Адзін толькі рык дзікага быка наводзіў на людзей жах, таму што ўспрымаўся як голас боства. Некаторыя навукоўцы лічаць, што



*Падвескі-амулеты з выявай галавы быка, знойдзены ў курганах радзімічаў XI—XII стст. на Гомельшчыне*

тур цесна звязаны з Перуном. Пра гэта гаворыць і загадка: «*Тур ходзіць па гарах, турыца па далах; тур то свісне, турыца то мігне*» (гром і маланка).

У далёкія часы паляванне на тура было забароненым, але пасля ўмацавання хрысціянства, у XI–XIV стст. ён зрабіўся прамысловай жывёлінай і ў далейшым быў знішчаны як від. Паляванне на тура заўсёды было вельмі рызыкоўным, бо жылі гэтыя жывёлы ў непраходных лясах і пушчах. Таму ўпаляваць тура было надзвычай цяжкай справай і лічылася воінскім подзвігам, на які здатны былі толькі людзі, надзеленыя ўладай. Нездарма захаваліся вусныя і летапісныя паданні пра заснаванне нашых старажытных гарадоў, дзе асновай сюжэту з'яўляецца паляванне князя на тура.

Узгадаем заснаванне Вільні, дзе князь Гедымін пасля забойства тура засынае на гары і бачыць прарочы сон пра славу будучага горада. Пазней гара, дзе адпачываў Гедымін, атрымае назву Туравай. Палюе на тура і легендарны князь Тур. Падчас ловаў ён са сваёй дружынай трапляе ў багатыя дзічынай мясціны і, стаміўшыся, таксама засынае на гары. У сне князь бачыць сябе на паднятым возе, а навокал розныя гарады. Князь успрымае гэта як прарочы знак на пабудову новага горада. Збудаваны горад атрымоўвае імя Тураў. Аднак, вобраз легендарнага князя Тура мог быць абагульняючым, так маглі называць жрацоў або ўладароў, якія спавядалі культ звера, а назва горада была месцам ушанавання боства Тура. Дагэтуль у розных мясцінах Беларусі захаваліся так званыя Тур'і горы — былыя сакральныя мясціны. Прыкладам, гэта Турская Гара каля Рагачова і Тураўская Гара каля вёскі Тураўшчына Докшыцкага раёна.



*Выява галавы барана з косці (курганнае пахаванне XI ст., Докшыцкі р-н Віцебскай вобл.)*

Не меншай папулярнасцю ў беларусаў карыстаўся ***конь***. Конь, як і качка, асацыіраваўся з сонцам. Нашы продкі звязвалі з гэтай жывёлай уміранне і нараджэнне сонечнага боства. Археалагічныя знаходкі пацвярджаюць тыя вераванні старажытных беларусаў, згодна з якімі сонца ўдзень падарожнічае па небе ў калясніцы, запрэжанай конямі, а ўначы праплывае падземнымі рэкамі з дапамогай качак. Конь — верны памочнік багоў і герояў, на кані ці на каляс-

ніцы ездзяць многія багі. У нас гэта перш за ўсё Пярун, бог навальніцы і маланкі. Цесна звязаны конь і з сонечным богам Ярылам, якога ў Беларусі ўшаноўвалі аж да XIX ст. У хрысціянскія часы функцыі Ярылы перайшлі да Святога Юр'я, або Ягорыя, які лічыўся апекуном коней і свята якога адзначалася ўвесну. Дзень той беларусы называлі «конскім святам» і верылі, што Святы Юрый у гэты момант адмыкае зямлю, выпускае на палі расу і заціскае зубы ваўкам, каб яны не елі коней.



*Металічныя падвескі-конікі XIII стст. Падзвінне*

Нашы продкі пры будаўніцтве сваіх хат вельмі часта выкарыстоўвалі каня як ахвяру. Адпаведна і дахі будынкаў былі ўвенчаны выявай галавы каня, так званымі *«конікамі»*. Дарэчы, у беларускіх хатах галоўную частку жытла — пячны слуп, называлі *«канём»*. Такі стоўп мае непасрэдныя адносіны да хатняга вогнішча і душ памерлых продкаў. Гэта пацвярджаецца тым фактам, што ў некаторых пахаваннях разам з рэшткамі чалавека знаходзяць шкілеты або косткі каня. Такі конь павінен быў перанесці нябожчыка на той свет і служыць гаспадару там. Таму ў чарадзейнай казцы распавядаецца пра памерлага бацьку, які дорыць малодшаму сыну-дурню некалькі валаскоў з конскай грывы, у другім варыянце — аброць, з дапамогай якіх можна паклікаць каня незвычайнай прыгажосці і сілы. Гэты матыў захаваўся ў казцы яшчэ і таму, што раней існаваў звычай на знак жалобы па памерламу зразаць з грывы і хваста ягонага каня пучкі валосся і закапваць непадалёк ад магілы.

У глыбокай старажытнасці каня як пасярэдніка паміж тым і гэтым светам выкарыстоўвалі ў рэлігійных абрадах і варожбах. Старадаўнія пісьмовыя крыніцы апісваюць белага каня, які быў у палабскіх славян пры храме Светавіта — бога зямных пладоў і ваеннай здабычы. Гэты конь належаў боству, даглядаць за ім і сядаць на яго мог толькі паганскі святар. На кані варажылі перад пачаткам важнай справы або напярэдадні вырашаючай бітвы. Тое, што конь прымаў удзел пры варожбах у нашых продкаў, гаворыць слова «жэраб'і». Яно азначала назву прадметаў, што выкарыстоўваліся падчас гэтай магічнай падзеі. Сувязь са словам «жарабя» цалкам празрыстая.

А такія жывёлы, як ***авечка***, ***баран*** і ***свіння*** ігралі вельмі важную ролю ў ахвярапрынашэнні. Раней вепрука — дзікую свінню — ахвяроўвалі Навіне — архаічнаму святу ўраджаю ў верасні, на восеньскае раўнадзенства. Пазней, калі свінню прыручылі, яе пачалі прыносіць у ахвяру падчас зімовага сонцавароту. Да прыкладу, нават цяпер перад Калядамі ў Беларусі забіваюць адкормленых свіней і завуць іх у народзе «калядой»:

*«Дзедка свінушку ўбіў,*
*Дзедка беленькую,*
*Спінку пегенькую,*
*Ай, да бож'я каляда,*
*Прылятай к нам звысака».*

Паводле народных паданняў, авечку, як і свінню, Бог зляпіў з гліны, але голаў яе — са смалы. Таму яна заўсёды хаваецца ад спякотнага сонца ў прахалоду. Авечка прыносілася ў ахвяру як крывавым спосабам — шляхам заколвання, так і бяскроўна, ёй састрыгалі воўну. Авечае руно выкарыстоўвалі ў магічнай практыцы розных народаў. У беларускіх паданнях пашыраны сюжэт пра тое, як чараўніца ці цыганка пры дапамозе авечай воўны робіць заклятымі тыя рэчкі і азёры, дзе ўтапіўся яе дзіцёнак. Блізу вёскі Рэчкі на Шаркаўшчыне зафіксаваны абрады ахвярапрынашэння бараноў. Там у ноч на Дзяды збіраліся на могілках, прыводзілі з сабой казла або барана, распальвалі вогнішча, рэзалі жывёліну, варылі яе і ў капліцы з абрадавымі песнямі рабілі памінальную вячэру. У 1870-я гг. за правядзенне гэтага абраду больш за 40 сялян былі сасланы ў Сібір.

Распальвалі вогнішча ў гонар барана і на Варганскай Гары каля вёскі Варганы Докшыцкага раёна. Згодна з беларускім фальклорам, у вобразе барана можна ўбачыць закляты скарб, які знікае з вачэй



*Гліняная фігурка свінні. XIII ст. Гарадзішча каля вёскі Маскавічы (Браслаўскі р-н., Віцебская вобл.)*

пры спробе наблізіцца да яго, або нячыстую сілу, якую час ад часу сустракаюць падарожныя, і якая прымушае іх блукаць уначы. Вядомы культавыя камяні, звязаныя з баранам. Так, пра Барашкаў камень, што непадалёк ад вёскі Гудзяняты, існуе паданне пра шведскіх салдат, якія падчас шведска-рускай вайны смажылі на гэтым камяні барана. Пасля таго, як яго з'елі, усе яны масава аслеплі і блукалі вакол каменя, гінулі ў багне. Даследчыкі лічаць, што культ барана звязаны з культам урадлівасці і плоднасці.

Недзе ў канцы сакавіка беларусы ў мінулым адзначалі незвычайнае свята — Камаедзіцу, прысвечаную ***мядзведзю***. Лейтматывам свята было абуджэнне прыроды, нараджэнне лета. Да таго ж прадзеды лічылі гэтую жывёлу сваім першапродкам, духам-ахоўнікам, увасабленнем душы і, як наступства гэтага — боствам. Амулеты з іклаў мядзведзя сустракаюцца на многіх нашых гарадзішчах і свяцілішчах жалезнага веку, зуб і кіпцюры мядзведзя знойдзены ў адным з радзіміцкіх курганаў. А на адным са свяцілішчаў адшукалі вялікую гліняную пасудзіну ў выглядзе галавы мядзведзя з шырока разяўленай пашчай. Пасудзіна месцілася каля аднаго з цэнтральных ідалаў багіні. Відавочна, што культ мядзведзя на Беларусі распачаўся вельмі даўно.



*Гліняная фігурка жанчыны-мядзведзіцы (эпоха неаліту)*

Старажытныя людзі верылі ў тое, што іх аддаленымі продкамі былі дзікія жывёлы, якія валодалі надпрыроднымі магічнымі здольнасцямі. Такіх жывёл лічылі вялікімі боствамі і ўшаноўвалі іх татэмы — сакральныя ўвасабленні бога ў выглядзе звера. Потым часткі забітай жывёлы, да прыкладу, яе галава, лапы або кіпцюры і іклы з'яўляліся абярэгамі таго ці іншага племені. Перажыткі гэтага светапогляду праглядаюцца ў звычцы яшчэ напрыканцы XIX — пачатку XX стст. вешаць у стайнях галаву мядзведзя, а ў хатах захоўваць ягоную лапу як абярэг ад нячыстай сілы і ліхіх чараў. Некалі

беларусы пры спальванні памерлага разам з ім клалі ў курганны насып мядзведжыя кіпцюры, верылі, што з дапамогаю іх нябожчык ускараскаецца на высокую гару да Бога. У некаторых рэгіёнах Беларусі такую лапу называюць *«скоцім богам»*. У той жа час вядома, што ў міфалогіі ўсходніх славян такое азначэнне меў адзін з галоўных багоў — Вялес. Навукоўцы лічаць, што сваімі каранямі ўшанаванне Вялеса сыходзіць у старажытны паляўнічы культ мядзведзя.



*Ліштва з выявамі мядзведзяў, вёска Старыя Пышачы (Крупскі р-н., Мінская вобл.)*

У беларускай міфалогіі Вялес на Каляды ператвараецца ў мядзведзя і разам са зграяй ваўкоў, якія сімвалізуюць мяцеліцу з завірухай, ганяецца за жонкай Перуна, якая павінна нарадзіць суперніка Вялеса — сонечнае боства. Тут мы бачым, як з часам адбываюцца пэўныя метамарфозы: мядзведзь, чыё абуджэнне сімвалізавала раней для нашых продкаў нараджэнне сонечнага цяпла, паступова ператвараецца ў цёмныя падземныя сілы холаду і змроку. Тым не менш, сапраўднае імя самага магутнага звера і гаспадара старажытнага лесу назаўсёды згублена, таму што не агучвалася і, бясспрэчна, было вядома толькі жрацам. У звычайным жыцці людзі называлі свайго бога *«мёдаед»*, адкуль і пайшла назва *«мядзведзь»*. Беларусы часта клічуць мядзведзя чалавечымі імёнамі: *Мішка*, *Міхаіл*, *Марцін*, а мядзведзіцу — *Маруха*. Магчыма, гэта звязана з тым, што Маруха паходзіць ад імя багіні Мары, хтанічнай багіні нараджэння і смерці.

У шматлікіх беларускіх паданнях паходжанне мядзведзя звязана з чалавекам. Так, нібыта чалавек быў ператвораны Богам у мядзведзя ў пакаранне за забойства бацькоў або за тое, што як млынар ён падманваў людзей, выкарыстоўваючы фальшывую мерку. Захавалася шмат паданняў пра сумеснае жыццё мядзведзя з жанчынай, якая заблукала ў лесе, або мядзведзіцы з паляўнічым. Як вынік такіх саюзаў у фальклоры розных народаў згадваецца катэгорыя напаўлюдзей-напаўмядзведзей. Так, *Мядзведжае Вушка*, *Мядзведка*, *Бедмедзь*, *Ведмідзь*, *Медвядовіч*, *Медвядзюк* — героі беларускіх, украінскіх і расійскіх казак, якія нараджаюцца ад сувязі мядзведзя з чалавекам. Такі мядзведжы сынок ростам з волата, з чалавечым тварам, да пояса ён чалавек, а ніжэй — мядзведзь або мае звярыную скуру. Часам у яго толькі мядзведжае вуха. Волат гадуецца не па днях, а па гадзінах і

яшчэ ў дзяцінстве здольны вывернуць з коранем дубы, выламіць бярвенне ў хаце.

Сваім першапродкам, боствам і духам-ахоўнікам беларусы лічылі і ***ваўка***, які ў міфалогіі цесна звязаны з мядзведзем і сабакам. Вобраз ваўка сустракаецца ў казках, легендах і паданнях, прымаўках і прыказках, абрадах і народных святах. Шмат дзе ў фальклоры воўк звязаны з сонцам і з'яўляецца пасярэднікам паміж светам жывых людзей і памерлых. Вобраз ваўка цесна звязаны з мужчынскімі вайсковымі брацтвамі і практыкамі язычніцкіх святароў. Існавалі так званыя «воўчыя святы» і ўяўленні пра ваўка-жаніха, які скраў нявесту (узгадаем вясельны абрад). Вядомы па ўсім свеце міфалагічны сюжэт пра тое, як воўк робіцца родапачынальнікам пэўнага племені ці звязаны з пабудовай гарадоў. Вышэй мы ўзгадвалі паданне пра заснаванне Вільні, калі Гедымін упаляваў на месцы зліцця рэк Вяллі і Вільні тура. Далей паданне распавядае, што пасля ўдалага палявання князь вырашыў заначаваць непадалёк ад старажытнага свяцілішча Швінтарог. У сне ён убачыў закутага ў жалезныя латы ваўка, які выў як сотня ваўкоў. Раніцай вярхоўны паганскі святар Ліздзейка растлумачыў сон: на месцы палявання трэба закласці горад, слава якога, як выццё жалезнага ваўка, разляціцца па ўсім свеце. Так быў заснаваны горад, які атрымаў назву ад ракі Вільні.

Яшчэ адна легенда сцвярджае, што назва другога нашага горада — Ваўкавыск — пайшла ад служылых людзей вялікага князя, якія падчас палявання вылі па-воўчы, і тым самым прывабліваі ваўкоў. Нездарма выява ваўка на блакітным фоне ўпрыгожвае герб Ваўкавыска з XVI ст.



*Ваяр у воўчай скуры (рэканструкцыя)*

У міфах і казках воўк увасабляе не толькі лютасць, а таксама смеласць і ўменне перамагаць. Гэта нашы продкі заўважылі вельмі даўно. Таму некаторыя з іх выбралі ваўка сваім татэмам і адпаведна боствам, у гонар якога праводзіліся абрады ініцыяцыі, або абрады пасвячэння юнакоў у паляўнічых ці воінаў-ваўкоў. Асноўнай задачай абраду было авалодванне майстэрствам паляўнічага і воіна — тымі якасцямі, якімі валодаў татэмны першапродак, сакральны звер — воўк. Яшчэ вельмі важным мо-

# Гербы Ваўкавыску



магдэбурскі герб
1503 г.



расейскі герб
1845 г.



сучасны герб
2001 г.

*Гербы Ваўкавыска розных часоў*

мантам ініцыяцыі было набыццё рэлігійнага досведу шляхам уступлення неафіта ў кантакт з духамі-продкамі і з духам татэмнага продка-ваўка. Пасля абраду юнак дапускаўся ў мужчынскае братства ваўка і меў права насіць ягоную скуру. Гэтая асаблівасць нашай даўней традыцыі, якая адлюстравана Герадотам у «Гісторыі» аб неўрах, знайшла адбітак у шматлікіх беларускіх легендах і паданнях пра ваўкалакаў і пярэваратняў. Але пра іх мы пагаворым пазней. Заўважым толькі, што легенды пра заснаванне Вільні і Ваўкавыска ўзніклі дзякуючы менавіта абраду ініцыяцыі юнакоў.

З сівой даўніны ў міфалагічных уяўленнях не толькі беларусаў, але і шматлікіх іншых народаў вобраз ваўка быў звязаны з культам уладара баявой дружыны ці бога вайны і родапачынальніка племені. Воіны старажытных індаеўрапейцаў часта ўяўлялі сябе ў выглядзе ваўкоў, называліся імі, таму апраналіся ў воўчыя скуры. У такім выпадку галава ваўка прыкрывала шалом воіна, а астатняя частка скуры — ягоныя плечы. У старажытных беларусаў былі так званыя «*слугі бога-ваўка*», якія лічылі сябе сапраўднымі ваўкамі і складалі адну з самых актыўных адзінак войска. Узгадаем нашага знакамітага ваяра — полацкага князя Усяслава Брачыславіча (1029–1101). Паводле паданняў, ён таксама мог прымаць вобраз ваўка і, як гаворыцца ў «Слове пра паход Ігаравы», «*рыскаць ваўком у начы*».

Цяпер ужо дакладна невядома, каго нашы старажытныя ваяры ўяўлялі тым боствам, што час ад часу ператваралася ў ваўка. Магчыма, гэта быў Ярыла, якога ў часы хрысціянства замяніў Святы

Юр'я — у пазнейшых беларускіх паданнях валадаром ваўкоў лічыцца менавіта ён і падобна Ярылу скача на белым кані. А яшчэ Юр'я замыкае пашчы дзікім звярам, пасля чаго тыя менш нападаюць на скаціну. Нават існуе такая прымаўка: «*Пад Юр'еву апеку здаецца жывёла на ўсё лета*». Драпежныя звяры, найперш ваўкі, лічыліся ў народзе служкамі гэтага святога і маглі ўзяць са статка толькі тое, што ён дазволіць. А яшчэ беларусы, каб ушанаваць Юр'ю і ягоных слуг — ваўкоў, прыносілі яму ў ахвяру казу. Звычайна ў адну з начэй снежня яе вялі ў лес і там прывязвалі да дрэва, а раніцай глядзелі, ці прыняты падарунак. Сустракаюцца паданні, дзе гаворыцца, што Святы Юр'я скача верхам не на кані, а на белым ваўку. У той жа час беларускія паданні распавядаюць нам пра асаблівага вялікага белага ваўка — «*царыка*», надзеленага асаблівай магічнай сілай, які ўладарыць над усімі дзікімі звярамі ў лесе і з'яўляецца іх гаспадаром. На Смаленшчыне ўпэўнены, што «белы царык» (белы воўк) водзіць воўчыя зграі: «*Тэй белы царык, калі зачэпіць чалавека, то і ўсі на яго накінуцца, а не зачэпіць, то ні водзін ні-ні*».

Адно з важных месцаў калектыўнага падсвядомага беларусаў займае вобраз ***змея***. Адносіны да змея ў беларускім фальклоры вельмі разныя, а часам і зусім супрацьлеглыя — ад увасаблення сусветнага ліха да вобраза касмічнай мудрасці. Важная адзнака змяі — яе хтанічная прырода, якая адлюстравана нават у аднолькавым маўленні слоў «*змяя*» і «*зямля*». Змяя ўвасабляе ў сабе мужчынскую і жаночую, водную і вогненную сімволіку, адмоўны і станоўчы пачатак. Ёй уласцівы апатрапейныя і шкодніцкія якасці, яна можа атруціць і вылекаваць, гэта нячыстае стварэнне, крыніца ліха і ў той жа час яна дорыць чалавеку цудадзейныя здольнасці, мае функцыя апякункі.

Шырока вядомы ўяўленні пра хатнюю Змяю — апякунку вясковай хаты. У беларусаў гэтую ролю выконвае ў асноўным такі мужчынскі персанаж міфалагічных паданняў, як Вуж. Ён ахоўвае сялянскую гаспадарку, надае ёй дабрабыт і дастатак, дзякуючы яму пладзіцца хатняя жывёла. Некалі сяляне трымалі вужоў пад парогам або печчу. Гэта тлумачылася тым, што яны верылі, быццам вуж з'яўляецца ўвасабленнем душы памерлага гаспадара дадзенага дома



*Касцяная фігурка змяі.*
*Стаянка эпохі неаліту каля вёскі Асавец*
*(Бешанковіцкі р-н., Віцебская вобл.)*



*Пярсцёнак у выглядзе змейкі. Могільнік X–XI ст. каля вёскі Казлоўцы (Міёрскі р-н., Віцебская вобл.)*

і паказваецца на вочы жывым насельнікам толькі перад смерцю каго-небудзь з іх. Таму такой змяі заўсёды пакідалі малако ў збанку і рэшткі рытуальнай вячэры.

У змей ёсць цар або царыца, якіх называюць па-рознаму: «*гадзючы цар*», «*цар-вуж*», «*царыца-вужыца*», «*змяіная маці*» і г.д. У такой змяі на галаве карона або каштоўны камень, або залатыя рожкі ці грэбень пеўня. Яна вызначаецца вялікімі памерамі, белым, чорным ці бліскучым колерам, прыгажосцю, уладай над іншымі змеямі, якіх збірае разам сваім свістам. Царства такой істоты знаходзіцца ў падземным свеце, у воднай стыхіі, пад каранямі Сусветнага дрэва, пад Белым ці Сінім каменем — часам на востраве пасярод мора або балота. У валачобнай песні гаворыцца: «*Ляжыць камень бялюсенькі, пад тым каменем — люта гадзіна*», а ў замове ад урокаў: «*У сінім моры ляжыць белы камень, на тым камяні сядзіць змяя, крэкча, выкрактывае, (імя) урок выгаварывае*».



*Бранзалеты са стылізаванымі змяінымі галоўкамі (знаходкі з курганных пахаванняў XI ст. на тэрыторыі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл.)*

У пэўныя дні года змяіная царыца збірае ўсіх змей, абуджае іх ад зімняга сну і прызначае кожнай змяі яе ахвяру, а ў канцы лета выслухоўвае споведзь пра тое, як змеі выканалі яе загады і даручэнні. Верылі, што вужыны цар або каралева вужоў можа надзяліць чалавека цудадзейнымі якасцямі і прадметамі. Прыкладам, каб заваладаць змяінай каронай ці залатымі рожкамі, неабходна перад незвычайнай змяёй разаслаць на зямлі абрус або ручнік-абыдзённік, або пояс і нізка пакланіцца ёй. Тады змяя прапаўзе па разасланаму і пакіне там сваю карону ці рожкі. Авалодаўшы такім чароў-

ным прадметам, чалавек пачынаў разумець мову жывёл і птушак, ведаць гаючыя якасці розных раслін і дзе знаходзяцца схаваныя скарбы.



Змяя Шкурапея (мастак Б. Забірохін)

Шмат дзе ў сусветнай міфалогіі распаўсюджаны сюжэт пра захоп Змеем або Цмокам якойнебудзь жанчыны. Вядома, што ў нашых міфах і паданнях старажытны бог падземнага свету Вялес мог прымаць выгляд Змея. Каб павялічыць плоднасць жывёлы і палеткаў, ад якой у асноўным і залежаў дабрабыт у гаспадарцы, некалі гэтаму боству прыносілі чалавечыя ахвяры. Паводле паданняў, дзеля гэтага сярод паселішча выбіралі самую прыгожую дзяўчыну і ў якасці жонкі падземнага боства кідалі яе ў раку, возера ці балота — месца знаходжання Вялеса ў выглядзе Змея.



*Кафля з выявай вужынага караля. Палац Вялікіх князёў у Вільні*

З часам гэты жудасны звычай знік, але згадка пра яго засталася ў міфах і паданнях. Дзякуючы фальклору, з'явіліся казачныя персанажы — *Змей Гарыныч* і *Цмок*, якія ўвесь час шукаюць сабе жонак сярод людзей, таму выкрадаюць розных каралеўнаў і ца-



*Паляванне на цмока (сярэднявечны малюнак)*

рэўнаў. Так, паводле падання, на ўзвышшы Каменная Горка паблізу Бабруйска Змей трымаў у зняволенні нейкую княжну, якая згубіла пярсцёнак. А легенды пра вужынага караля і дзяўчыну, якую ён забраў з сабою ў сваё падводнае каралеўства, сталі асновай многіх казак.

Старажытныя звычаі і вераванні адлюстраваліся і ў тых паданнях, дзе Змей выступае міфалагічным каханкам зямной жанчыны, якая моцна сумуе па сваім сапраўдным памерлым мужы. Змей у выглядзе вогненнага шара ўлятае ў хату праз комін, бразгаецца аб падлогу і ператвараецца ў прыгожага хлопца ці мужчыну, які сваім выглядам вельмі нагадвае жанчыне яе страчанага мужа. Але ад сексуальных адносін са Змеем жанчына пачынае сохнуць, моцна хварэе і нарэшце памірае. Смерці можна і пазбегнуць, калі жанчына або дзяўчына своечасова раскажа староннім пра сваю ненатуральную сувязь. Існуюць паданні, дзе зямныя жанчыны нараджаюць ад Змея дзяцей, апошніх лічаць героямі, юнакамі, якія валодаюць цудадзейнымі якасцямі: аграмаднай сілай, здольнымі адганяць градавыя хмары, забіваць розную нячыстую сілу. Так, быліна пра Волха Усяславіча



*Вогненны Змей нясе свайму гаспадару скарб (мастак Б. Забірохін)*

апавядае пра тое, як маці нарадзіла яго ад Змея. У вобразе Волха даследчыкі бачаць гістарычнага полацкага князя Усяслава, які, паводле легендаў і паданняў, валодаў незвычайнай сілай і здольнасцю ператварацца ў розных жывёл.

Згодна з паданнямі, вогненны змей можа быць не толькі палюбоўнікам, але і прыносіць свайму гаспадару рознае багацце. Толькі спачатку такога змея трэба выгадаваць. Дзеля гэтага трэба дачакацца, калі чорны певень знясе своеасаблівае яйка, якое трэба пакласці пад паху і насіць там шэсць тыдняў. З таго яйка выводзіцца маленькі змей, вельмі падобны на вужаня, толькі з крыламі і залатога колеру. Каб змеянё вырасла вялікім і моцным, яго трэба ўзмоцнена карміць яйкамі і малаком. Асабліва, як кажуць, змей любіць яешню. Потым, калі змей вырасце вялікім, ён па загадзе гаспадара лётае па ўсім свеце, шукае скарбы і прыносіць у хату. Нездарма пра людзей, якія раптам разбагацелі, у народзе кажуць: «*Яму Змей багацце носіць*».

У XI–XII стст. на нашай тэрыторыі былі шырока распаўсюджаны металічныя бранзалеты і фібулы са стылізаванымі канцамі ў выглядзе змяі. Вельмі шмат у Беларусі і так званых Змеявых і Вужыных камянёў. Гэтыя валуны некалі былі прысвечаны ўшанаванню хтанічных істотаў. Шмат у нас і Змеявых узгоркаў. Так, у Крэве на Смаргоншчыне знаходзіцца *Гара Змея Валя*, таксама каля вёскі Млыны Камянецкага раёна ёсць *Змеева Гара*, а каля вёскі Ваўкалаты Докшыцкага раёна — гара *Змяёўка*.

## Глава 2
## САКРАЛІЗАВАНЫЯ ПТУШКІ

Паводле міфалагічных уяўленняў, птушкі з'яўляюцца сімвалам верхняй прасторы — неба, сонца, ветру. На вяршыні Сусветнага дрэва — сімвала светабудовы нашых продкаў — знаходзяцца ***арол***, ***сокал*** і ***воран***. Менавіта гэтыя птушкі адлюстроўвалі божую існасць неба, сонца і грому, свабоды, жыцця, урадлівасці і багацця, былі сувязнымі паміж касмічнымі зонамі.

Увогуле ўсе птушкі цесна судакранаюцца з каляндарным цыклам, па іх паводзінах прадказваюць надвор'е. Менавіта іх уклад жыцця і паводзіны, асабліва пералётных, з'яўляюцца фактарам, якія закладзены ў структуры народнага календара. Сваім прылётам яны вызначаюць вясну, а адлётам восень.

Існуе шмат паданняў пра ўдзел птушак у стварэнні Сусвету: быццам раней вада была ў адным месцы, і птушкі разносілі яе па зямлі



*Касцяныя падвескі-качачкі IX ст. Падзвінне*

або разам са звярамі яны выкапалі рэкі і азёры. З пракаветных часоў зарадзіліся вераванні пра тое, што душы памерлых перасяляюцца ў птушак. Таму ў народных песнях і баладах да птушак звярталіся з просьбамі наведаць родных, перадаць звесткі пра жывых. У вераваннях пра птушак яскрава выяўляецца апазіцыя чыстага — светлага, добрага і нячыстага — цёмнага, злога. Да так званых «*чыстых*» птушак адносяцца голуб, ластаўка, бусел, салавей, жаўранак, а да «нячыстых» — воран, сарока, верабей, сава, зязюля. Арол і сокал займаюць памежнае становішча.

Але раней за другіх нашы продкі пачалі сакралізаваць ***качак***. У светапоглядзе беларусаў гэтая птушка заўсёды асацыіравалася з першабытнымі водамі і пачаткам касмагенэзу. Менавіта яйка качкі выступіла тым першародным элементам, дзякуючы якому з'явіўся сам Сусвет. Потым гэта замацавалася ў фальклоры і казках, дзе гаворыцца пра тое, што жыццё, да прыкладу, Кашча Бесмяротнага, знаходзіцца ў качыным яйку. Археолагі знайшлі разнастайныя аб'ёмныя выявы качак, зробленыя з косці і крэмню. Напрыклад у вёсках Юравічы Калінкавіцкага і Галоўск Сенненскага раёнаў выяўлены малюнкі гэтых птушак на гліняным неалітычным посудзе. Знаходкі ў Гарадоцкім раёне на Віцебшчыне і Рагачоўскім на Гомельшчыне сведчаць, што ў канцы I — пачатку II тысячагоддзяў былі шырока распаўсюджаны падвескі-абярэгі ў выглядзе качачкі. Рэлікты культу качкі дайшлі і да нашага часу ў звычаі ўпрыгожваць вясельны каравай фігуркамі качара і качачкі, а вакол выкладаць колцы з яек.



*Гліняная чаша XI ст. з выявай вадаплаўнай птушкі на донцы, вёска Крыўск (Буда-Кашалёўскі р-н., Гомельская вобл.)*

У беларускім фальклоры творцам Сусвету выступае і ***гусь***. Ён таксама ўдзельнічаў у стварэнні нашай планеты — падымаў са дна сусветнага акіяна першыя кавалкі зямлі. Гусак або гуска, як качка і качкур, вызначаюцца шлюбнай сімволікай. Так, вясельны каравай вельмі часта ўпрыгожвалі выявамі гэтых птушак, зробленых з цеста. А ў беларускім Палессі ў выпадку «*нячэснасці*» нявесты,нараніцу пасля шлюбнай ночы на стол перад яе бацькамі з ганьбай ставілі вялікага гусака і качан капусты: мужчынскі і жаночы эратычныя сімвалы. Пры раскопках курганнага пахавання рубяжа X–XI стст. каля вёскі Новы Крыўск на Рагачоўшчыне знойдзены гліняны гаршчок, на дне якога кляймо ў выглядзе гуся. Выразна прамаляваны шыя, крылы і нават пёры.



*Драўляны карэц у выглядзе качкі, XIX—пач. XX ст. (былы Клімавіцкі павет)*

Вялікае месца ў вераваннях беларусаў са старажытных часоў займаюць ***певень*** і ***курыца***. Певень — сімвал сонца, урадлівасці, жыццёвай сілы. Нездарма ў шматлікіх паданнях распавядаецца пра тое, як на світанку пасля спеву пеўня знікае ўсялякая нечысць, сімвал цемрыва і змроку. Прыкладам, у вёсках Камень і Ратынцы Валожынскага, Стары Пагост Мёрскага, Наносы Мядзельскага раёнаў, паводле мясцовых паданняў, чорт нёс камень і хацеў перагарадзіць раку або знішчыць храм. Але праспяваў певень, і чорт выпусціў валун, а сам быў вымушаны ўцякаць. У пеўняў, згодна з павер'ямі, нават ёсць свой кароль — Будзімір.

Яшчэ да параўнальна нядаўняга часу розным сілам прыроды прыносілі ў ахвяру менавіта пеўняў, іх кідалі ў агонь, ваду або закопвалі ў зямлю. Калі закладалі новы будынак, пеўня або толькі ягоны голаў выкарыстоўвалі ў якасці будаўнічай ахвяры. Гэта рабілася дзеля забеспячэння трываласці збудавання, а таксама здароўя і дабрабыту ягоных насельнікаў. Чорнага пеўня ахвяравалі вадзяніку, калі ўзводзілі млын і мост. Лічылі, што менавіта певень чорнага колеру звязаны з вадой і падземным светам.

З пеўнем як з сімвалам сонца спалучаецца сімволіка ўваскрашэння з мёртвых і адраджэнне жыцця. Таму невыпадкова на працягу



*Птушкі, вышыўка на ручніку (Ганцавіцкі р-н., Брэсцкая вобл.)*



*Вышыўка з пеўнем*

стагоддзяў у нас захоўваўся звычай падчас пошасці закопваць жывога пеўня. Так, у 1860 годзе ў Рэчыцкім павеце, каб спыніць падзеж жывёлы, сяляне прынеслі ахвяру: закапалі жыўцом чорных пеўня, цёлку і ката.

У 1891 годзе старажылы вёскі Астапкавічы Гарадоцкага раёна ўзгадвалі выпадак эпідэміі халеры ў іх вёсцы: каб спыніць пошасць, у адну з магіл тады зарылі жывога пеўня. Жыхары вёскі сцвярджалі, што нібыта і цяпер апоўдні можна пачуць адтуль петушыны спеў.

Да нашага часу захаваўся шэраг памінальных звычаяў, дзе фігуруе певень. Прыкладам, у Докшыцкім раёне на Віцебшчыне і сёння святкуюць Петушыныя Дзяды, дзе абавязковая страва — мяса пеўня. Людзі тлумачаць такое святкаванне як ахоўнае магічнае дзеянне, кажуць: *«каб каршун курэй не драў»*. У Глыбоцкім раёне яшчэ не так даўно перад восеньскімі Дзядамі птушыны галаў клалі на магілу мужчыны. З архаічным дзеяннем выклікання дажджу звязаны абрад арання вясковай вуліцы на пеўніках. А забітага міфалагічнага Змея-страшыдлу маглі за-

сыпаць толькі той зямлёй, якую дзеці вазілі ў стаптаным лапці, запрэжаным пеўнем.

Калі певень увасабляў мужчынскі пачатак, то ***курыца*** — жаночы. Сярод навукоўцаў ёсць думкі, што раней курыца і певень маглі быць увасабленнем нейкага вельмі старажытнага боства. Месцамі на захадзе Беларусі ў XIX–XX стст. на памінальны стол па гаспадару рэзалі пеўня, а па гаспадыні — курыцу. Курыца, як і певень, адганяла злых духаў. Таму, калі перасяляліся ў новы дом, у першую ноч туды запускалі пеўня або курыцу. Зафіксаваны звесткі пра адгалоскі звычаю прыносіць у ахвяру пеўняў і кураў некаторым культавым камяням, асабліва камяням-краўцам, як напрыклад, Змееву каменю каля вёскі Віркаў Чашніцкага раёна. У некаторых паданнях падкрэсліваецца, што людзі бачылі як такую ахвяру здзяйсняе старац.

Народныя паданні часам узгадваюць пра спевы пеўня, якія можна пачуць апоўначы на курганах. Пры археалагічных раскопках курганных могільнікаў сустракаюцца курыныя косткі, часам іх знаходзяць у гліняным гаршчку. Гэта сведчанні нейкіх вельмі архаічных рытуалаў. З пеўнем звязаны і назвы некаторых прыродных сакральных аб'ектаў, кшталту ўзгорак Петухоў Гаршчок або Камень Пеўнік.

Пра многіх птушак існуюць павер'і, быццам раней яны былі людзьмі. У першую чаргу гэта белы ***бусел*** або *бацян*, *буська*. Легенда сцвярджае, што некалі гэтая птушка была чалавекам, якому даручылі выкінуць мех з сабранымі гадамі ў мора, але ён вельмі хацеў паглядзець, хто знаходзіцца ў торбе. А калі развязаў мех, то ўсе гады распаўзліся па зямлі. Бог раззлаваўся і ператварыў гэтага чалавека ў птушку, загадаўшы збіраць паўзуноў. Цяпер бусел вымушаны гэта рабіць усё сваё жыццё, але ён памятае, што некалі быў чалавекам, таму селіцца побач з людзьмі. З-за ягонай блізкасці да чалавека нарадзілася шмат павер'яў. Так, у народзе ўпэўнены, што бусел з'яўляецца птушкай бога Грымот-



*Кафля з Мірскага замка з выявай арла, герба Радзівілаў*

ніка і засцерагае ад маланкі і пажару, апякуецца нябеснымі стыхіямі і распараджаецца ўраджаем. Забіць бусла заўсёды лічылася вялікім грахом.

У адрозненне ад белага бусла чорны бусел селіцца ў аддаленых ад чалавека месцах. Таму чорных буслоў называюць «*ляснымі манахамі*». Паводле падання, чорны бусел некалі быў белым, але нейкі ліхі чалавек разбурыў ягонае гняздо і скінуў буслянят. Ад гора і крыўды той бусел счарнеў, паляцеў у пушчу і пасяліўся на высокім дубе. Калі вывеліся птушаняты, то яны апынуліся белымі. Бацькі расказалі ім пра крыўду ад людзей, і тыя апрануліся ў чорнае жалобнае адзенне. На заходнім Палессі чорнага бусла лічаць каралём усіх буслоў.



*Выявы птушак на вясельным дыване (Ганцавіцкі р-н., Брэсцкая вобл.)*

Традыцыйныя ўяўленні пра паходжанне ***дзятла*** таксама звязаны з чалавекам. Паданне гаворыць: Бог ператварыў у дзятла пчаляра-бортніка за тое, што той працаваў у нядзелю — выдзёўбваў сасновую борць. Цёмнае апярэнне гэтай птушкі, яе «чырвоная шапачка» і знаходжанне ў глухіх лясах нарадзілі ўяўленне пра сувязь дзятла з чарадзейным зеллем — разрыў-травой, пры дапамозе якой можна адкрываць любыя замкі без ключоў. Каб здабыць такое зелле, трэба абгарадзіць гняздо дзятла з яйкамі асінавымі пруткамі, і ён, каб патрапіць да птушанят, на другі дзень прынясе магічную траву.

Шмат павер'яў існуе пра вялікага чорнага дзятла — жаўну. Верылі, калі ён дзяўбе сценку ці вугал хаты, дзе знаходзіцца хворы чалавек, то гэта да нябожчыка, таму што дзяцел ужо «*прадзёўбаў*» яму магілу. Узімку тое самае дзеянне птушкі тлумачылася надыходам мяцеліцы. Увесну дзяўбанне па прысядзібнай агароджы абяцала надыход «чарвівага» лета, і што народзіцца шмат грызуноў.

Пра ***зязюлю*** расказваюць, што гэта ад праклёну маці ператвораная ў птушку дзяўчына або жанчына-грэшніца. Напрыклад, у вёсцы Рожан Салігорскага раёна занатавана паданне пра нейкага міфічнага Дзядка, якога ў вёсцы не пусцілі пераначаваць, і ў пакаранне ён усю вёску ператварыў у камяні. Дзяўчыну ж з гэтай вёскі, якая

патаемна прынесла яму хлеба, Дзядок спачатку пашкадаваў. Але потым, калі яны ўцякалі разам, дзяўчына не паслухалася ягоных перасцярог: не азірацца, азірнулася і ператварылася ў зязюлю.

Вельмі пашыраны ў нас і ў суседняй Літве сюжэт паданняў і чарадзейных казак, дзе ў зязюлю ператвараецца дзяўчына, якая стала жонкай вужынага караля. Гэтага адбываецца пасля таго, як вужа забіваюць яе браты. Відаць, таму гэтай незвычайнай птушцы прыпісваюцца хтанічныя рысы. У народзе верылі, што яна зімуе ў зямлі і з'яўляецца ўвесну адначасова з зямнымі гадамі. Ёсць павер'і, што ўвосень зязюля ператвараецца ў каршуна. Зязюля лічыцца прадвесніцай даўгалецця. Яе кукаванне звязваюць з пачаткам вясны. На Палессі, пачуўшы першую зязюлю, абыходзяць хату і б'юць па ёй альховымі галінкамі, вераць, што такім чынам можна вывесці прусакоў, клапоў і блох.

Згодна з павер'ямі, ***сава*** таксама некалі была жанчынай, але за пэўную правіну пакарана Богам. Яна з'яўляецца сімвалам удавы і адзінокай жанчыны. Да таго ж, праз свае драпежныя схільнасці і начны лад жыцця сава адносіцца да дэманічных істот і птушак іншасвету. Яна жыве ў міфічнай лясной прасторы, куды адсылаліся хваробы і нячысцікі, і ў народнай свядомасці асацыіравалася са смерцю. Судачыненне з душамі продкаў з'яўляецца крыніцай яе дасведчанасці і невыпадкова саву лічылі птушкай ведаў і мудрасці. Яе звычка хавацца днём тлумачыцца тым, што некалі сава была голай. Потым, каб апрануцца, пазычыла ў птушак па аднаму пёрку. Ад таго, кажуць, і пёры ў яе розныя. Але сава не аддала пазычанае. Таму яна ўпэўнена, што калі птушкі ўбачаць яе, то пачнуць патрабаваць свае пёры назад. Беларуская дзіцячая песенька параўноўвае саву з ведзьмай:

*«Пайшла сава па лесу,*
*Паляцела да бесу,*
*Совушку злапалі,*
*Як ведзьму, звязалі».*

Сакральнасць надавалася нават пёрам птушак. Да прыкладу, каб зберагчы ад «*дурнога вока*», пёры забітай у першы дзень сакавіка сарокі клалі пад курыцу, качку ці гуску, якая сядзіць на яйках. На Віцебшчыне пёры бусла ўторквалі ў падлогу і ў сцены ад блох.

Многія птушкі ў народных вераваннях і паданнях сімвалізуюць жаніха або воіна. У першую чаргу — ***сокал***. Так, у валачобных песнях ён магічным чынам дапамагае малойцу-воіну або паляўнічаму: ладзіць пераправы праз водныя прасторы, спрыяе ў пошуку нявесты.

Сімвалам маладзёна лічыцца ***салавей***. Паводле аднаго з варыянтаў падання, салавей з'яўляецца сынам жанчыны, якая была жонкай вужа і гадавала дзяцей у падводным царстве. Пасля забойства мужа яна ператварылася ў зязюлю, сын стаў салаўём, а дачка — жабкай. Часта беларускі фальклор падае салаўя і зязюлю як шлюбную пару.

Актыўны мужчынскі пачатак сімвалізуе журавель. Як апякунпродак ён разам з буслам фігуруе ў гурце калядоўшчыкаў. Згодна з павер'ямі, поле, дзе сядуць жураўлі, дасць добры ўраджай. А ў асобных вёсках Гомельшчыны Млечны шлях называўся «*жураўліная дарога*».

Жаночы пачатак звязваецца з ***лебедзем***, ***ластаўкай***, ***перапёлкай***, ***курапаткай***, ***цяцеркай***. Гэтыя птушкі з'яўляюцца сімвалам дзяўчыны, асабліва нявесты. Так, у вясельных песнях перапёлка выступае ў пары з сокалам і вераб'ём: «*Там у бары перапёлачка, для верабейкі была б жоначка*» і «*Я к табе, Ғануля, сакалом прылячу, я к табе, Якушка, перапёлачкай*». Існуюць павер'і, што звітае гняздо ластаўкі забяспечвае дому шчасце.

Сімвалам вернасці ў каханні з'яўляюцца лебедзь і голуб. Лебедзь — вобраз, звязаны з божымі персанажамі, сімвал адраджэння.

Асобае месца ў старажытных веравання беларусаў адводзілася ***варану,*** яго яшчэ называлі *крук, крумкач, груган*. Ён лічыўся мудрым вешчуном, захавальнікам скарбаў, валодаў таямніцамі жывой і мёртвай вады. Па вантробам ворана жрацы прадказвалі будучыню, калі прыносілі яго ў ахвяру на язычніцкіх капішчах. Верылі, што гэтая птушка вылечвала хворых. А яе выгляд магло прымаць бостава з зоаморфнымі і антрапаморфнымі рысамі адначасова, якое мела сувязь з першапачатковымі водамі і са светам памерлых. Але галоўнай функцыяй гэтага боства было назіраць за тым, правіль-



*Выявы птушак на скроневых упрыгажэннях з Вішчанскага скарбу пач. XIII ст. (Рагачоўскі р-н., Гомельская вобл.)*



*Хата з буслянкай у вёсцыАздамічы (Столінскі р-н., Брэсцкая вобл.)*

на або няправільна жывуць людзі, і ў адпаведнасці з гэтым караць ці мілаваць іх. Шмат хто з даследчыкаў звязвае крумкача з богам Вялесам.

Да птушак іншасвету і дэманічных істот належаць таксама ***сарока***, ***варона***, ***верабей***. Забітую сароку выкарыстоўвалі ў якасці ахоўнага прадмета. Прыкладам, каб ведзьмы не адбіралі малако ў кароў, гэту птушку вешалі ў хлеве, а для адпалохвання драпежных птушак — на двары. Пра сароку існуе легенда, быццам яна адмовілася чысціць мора разам з усімі птушкамі, а потым прыйшла да Бога, запэцканая брудам, і ўзвяла ілжывае абвінавачванне на каршуна. За такі грэх гразь назаўсёды прыстала да яе і зрабіла птушку стракатай.

Хтанічнай істотай з'яўляецца ***верабей***. На Палессі яго нават залічаюць да тых гадаў, якія былі некалі сабраныя Богам у торбу на знішчэнне, але адзін чалавек па неасцярожнасці выпусціў іх, за што Бог і ператварыў яго ў бусла. Вядома, што навальнічную ноч напрыканцы лета ў народзе называлі не толькі Рабінавай, але і Вераб'інай. Існавала павер'е, што ў гэты час усе вераб'і раптоўна знікаюць з палёў і злятаюцца ў адно месца, дзе чорт мерае іх агромністай меркай. Тых, хто не ўваходзіць у мерку, адпускае на волю памнажацца. А тыя, хто ў мерцы, ссыпае чарцям у пекла і забівае. З вераб'ём звязваецца і варажба. У фальклорных тэкстах гэтая птушка сімвалізуе



*Ліштва з выявай галубоў (Бярэзінскі р-н., Мінская вобл.)*

мужчынскі пачатак. Таму па вераб'ю дзяўчаты і варажылі пра замужжа. Яго кідалі ў запаленую печ, і калі той вылятаў, то лічылася, што і дзеўка хутка *«вылеціць»* замуж. Пашырана павер'е пра ператварэнні вераб'ёў у мышэй. Былі ўпэўнены: калі верабей уляціць у акно, то ў хаце з'явіцца нябожчык. Для таго, каб летам вераб'і не елі ў полі жыта, перад Новым Годам іх лавілі, пяклі, варылі або проста спальвалі ў печы.

Прыход вясны абвяшчаюць ***ластаўка***, ***жаўранак*** (*жаўрук*), ***зязюля***, ***удод***. Існавала ўпэўненасць: калі ўвесну ластаўка з'явіцца рана, то год будзе для ўсіх шчаслівы. Ластаўка была ўвасабленнем жаночага пачатку, лічылася ахоўніцай дома і свойскай жывёлы. У песнях ластаўка называецца ключніцай, таму што прыносіць з-за мора залатыя ключы якімі адмыкае лета і замыкае зіму. На Віцебшчыне, калі бачылі першую ластаўку, то абціралі твар пяском ці зямлёй з-пад сваіх ног, і кідалі яе назад праз галаву. Гэта рабілася для таго, каб твар быў без рабаціння і не абпальваўся сонцам. Некалі на Навагрудчыне ўсёй вёскай дарылі бохан хлеба таму, хто першы ўбачыць або пачуе жаваранка. Такі чалавек на працягу цэлага года нібыта мог прадбачыць тое, што можа здарыцца ў вёсцы. Шмат дзе ў вёсках з прылётам жаваранкаў пачыналі ворыва і сяўбу.



*Маляваны дыван з лебедзямі (Пружанскі р-н., Брэсцкая вобл.)*

Прыкладна ў сярэдзіне кастрычніка на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца ***снягіры***, якія ў народзе называлі *гілі* або *божыя пташкі*. У паданні снягір выступае ў якасці своеасаблівага Праметэя, які даставіў на зямлю агонь. Калі ён нёс полымя, то апёк шыйку і грудку, таму яны сталі чырвонымі. Падчас некаторых абрадаў, у тым ліку веснавых, нароўні з фігуркамі другіх птушак выпякаюць і фігуркі снягіроў. А вось сінічка часта выступае як прадвесніца бяды і нават смерці.

Паводле паданняў, царом птушак некалі быў ***удод***, яму нават падпарадкоўваўся арол. Але потым удод захацеў стаць птушыным богам. Бог пакараў яго за гэта і толькі пакінуў на галаве чуб у якасці кароны. Існавала прыкмета: крык удода можа азначаць мароз або дождж. Таксама верылі, што на дождж увечары спяваюць і дразды.

Шмат птушак задзейнічана ў любоўнай магіі. Лічылася, што калі здабыць сэрца і костачку з грудкі ***голуба*** і імі дакрануцца да абранай асобы, то яна ўспыхне агнём кахання. А калі насіць на жываце галаву ***ястраба*** або мець пры сабе сэрца ластаўкі, то тады ўсе будуць цябе любіць.



*Кафля XVIII ст. з выявай птушкі (г.п. Друя, Браслаўскі р-н., Віцебская вобл.)*

Уласцівасці птушкі і гадаў прыпісваліся і ***кажану***. У народных уяўленнях ён фігуруе як абярэг ад *«дурнога вока»*. Выкарыстоўвалі яго і ў любоўнай магіі. Дзеля гэтага яго жыўцом закопвалі ў мурашнік, а затым з абгрызенага шкілета даставалі дзве костачкі ў выглядзе кручка і вілкі. Верылі, калі зачапіць такім кручком дзяўчыну, яна адразу закахаецца, калі ж яна надакучыць, дастаткова адпіхнуць яе вілкай, і яна разлюбіць.

На Віцебшчыне лічылася, каб вылечыць ліхаманку, трэба насіць пад пазухай загорнутага ў анучку жывога кажана, а затым пад вечар выпусціць. Нібыта прыняўшы на сябе ліхаманку, ён аднясе яе далёка ад чалавека.

# Глава 3
# САКРАЛІЗАВАНЫЯ НАСЯКОМЫЯ

Насякомыя прысутнічаюць ва ўсіх асноўных жанрах традыцыйнай народнай культуры — у паданнях, казках, павер'ях, песнях, замовах, рытуалах, варожбах, гульнях. Паходжанне некаторых насякомых звязваюць нават з дзейнасцю Грамавержца — Перуна (Іллі Прарока). Розныя віды насякомых суадносяцца з рознымі часткамі касмічнай прасторы. Напрыклад, з верхняй зонай Космасу звязваюць божую кароўку, з сярэдняй часткай — пчалу, а з ніжняй — жамяру. Нават некаторыя жукі атрымалі назвы *алень*, *конік*, *кабылка* і г.д. Кузнечыка называлі *Божым конікам*, а яго стракатанне параўноўвалі з іржаннем каня.

Сярод насякомых асаблівай увагай карысталася ***пчала***. Паводле павер'яў, гэта божае стварэнне, дачка бога Ярылы. На Случчыне да гэтага часу лічаць, што пчолы водзяцца толькі ў добрых людзей, а злых не любяць і што джаляць толькі грэшнікаў. Легенда распавядае, што пчолы з'явіліся са слёз прыгожай дзевы, якая сядзела на камяні пасярод сіняга мора. Яе слёзы расчулілі Спаса, які ішоў па моры, і Ён ператварыў іх у пчол, а з яго слядоў утварылася пчаліная матка. У замовах пчалу завуць «*дзявіца-пчаліца*», а ў валачобных і калядных песнях пчаліная матка атаясамліваецца з Прачыстай — папярэдніцай нейкага язычніцкага жаночага боства. У міфалагічных уяўленнях пчолы часта суадносяцца з зоркамі, каплямі дажджу, іскрамі агню.

З пчоламі звязваецца шэраг прадказанняў. Калі пчала выходзіць з вулля пасля Звеставання, то будзе ўраджайнае лета, а калі раней — то дрэннае. Калі пчала позна ўвечары вяртаецца ў вулей, то трэба чакаць дажджу, а калі на заходзе сонца яна ўжо ў вуллі, то будзе добрае надвор'е. Паводле паданняў, у пчалы быў брат — павук. Калі памірала іх маці, прыляцела сарока, спачатку да пчалы, а потым да павука, і паведаміла сумную вестку. Пчала адразу кінула працу і палящела да маці. Павук жа не перапыніў свайго занятку. За гэта маці пракляла яго. Таму ён вечна будзе ткаць павуцінне і ніколі не скончыць.

Часта ***павук*** асацыіруецца з удаўцом. З павуком звязваецца шэраг прыкмет. Калі ён у хаце спусціўся па павуцінні, то чакалі гасцей. Пры выбары месца для новага дому спачатку ставілі на зямлю пусты збан і чакалі, калі павук сатчэ там павуцінне, і толькі тады гэта месца прызнавалі ўдалым. Лічылася, што павук прыносіць у дом дабрабыт.

Адсюль з'явіўся звычай рабіць саламяныя ўпрыгажэнні — павукі. Іх звычайна вешалі напярэдадні Калядаў і Вялікадня над сталом. Такую традыцыю палешукі тлумачаць тым, што *«павук свет снаваў»*. У такім тлумачэнні мы бачым павука як дэміурга, які абавязаны сваім прадзеннем і ткацтвам ствараць Сусвет.



*Выявы пчол на вышыўцы*

У некаторых рэгіёнах Палесся павука, які жыве ў доме, таксама, як і хатняга вужа, называлі *гаспадаром*. Лічылася, што такога павука нельга чапаць і выкідваць, таму што ён прыносіць у дом багацце і дабрабыт. Былі таксама ўпэўнены, што павук выратоўвае ад ліхаманкі. На Смаленшчыне жывога павука садзілі ў шкарлупіну грэцкага арэха, завязвалі ў анучку і насілі на шыі ў якасці амулету.

Пчале ў беларускай міфалогіі проціпастаўлены ***чмель***, дзе яны выступаюць як мужчынскі і жаночы пачатак. Так, у адной з казак гаворыцца, як чмель хоча ўвесну ажаніцца з пчалой, а тая адкладае вяселле на восень, калі чмель выгаладаецца і памрэ.

***Шэршань*** таксама ў беларускім фальклоры ўвасабляе мужчынскую сімволіку. Прыкладам, у адной вясельнай песні з гомельскага Палесся нявеста пасля першай шлюбнай ночы расказвае свой сон:

*«Прыляцел, мамко, шэрсень,*
*Да й утыкнуў жало,*
*Да й утыкнуў жало,*
*Сэрцэ мае задрыжало,*
*Дзеўку не за пуп, да за чэраво*
*Укусіў па сераду».*

З'яўленне шэршняў тлумачыцца тым, што Бог стварыў пчол для дабрабыту чалавека, а зайздросны чорт стаў надакучаць Богу і выпрошваць у яго хаця б некалькі пчол. Бог раззлаваўся, схапіў трэць

насякомых і кінуў іх на чорта. Ад моцнага ўдару пчолы сталі буйнейшымі, чорнымі і атрымалі здольнасць кусацца — ператварыліся ў шэршняў. Таму шэршань, перш чым укусіць чалавека, стараецца ўдарыць яго ў твар. Ёсць павер'і, што восы і шэршні — гэта заклятыя чорнымі чараўнікамі пчолы.



*Борць на могілкавым дрэве (Столінскі р-н., Брэсцкая вобл.)*

З вобразам душы звязвалі ***жука***. Лічылі, што калі чалавек спіць, то жучок-душа вылазіць у яго з роту, лазіць па дрэве, а калі вяртаецца назад, то чалавек імгненна прачынаецца. У жука на Купалле можа ператварацца ведзьма.

Сярод жукоў найбольшая ўвага заўсёды надавалася ***божай кароўцы***. Яе яшчэ звалі *Багоўка*, *Памётка*, *Клемка*, *Ядзерка*, *Петрык*, *Ведрык*. Паводле фальклору, божая кароўка выконвала ролю або пасланца да Бога, або ролю жонкі Грымотніка. У апошнім выпадку яна была пакарана сваім мужам — абпалена агнём за здраду і саслана на зямлю, дзе вельмі сумавала па сваіх нябесных дзетках. Вобраз гэтага насякомага як маці дзяцей і матыў абпаленасці багоўкі — яе чырвонай афарбоўкі, прасочваецца ў дзіцячых закліках. Прыкладам, на Вілейшчыне дзеці спявалі:

*«Барбуха, барбуха, гарэлая бруха!*
*Ці пень ці калода? Якая заўтра пагода?*
*Як дош, дык сядзі, як пагода — ляці!».*

У той жа час гэты жучок ускосна звязваўся і са светам мёртвых, увасабляў душы памерлай скаціны, якая пасвіцца на тым свеце. Па палёце божай кароўкі варажылі пра надвор'е і пра асабісты лёс.

З вобразам душы памерлага чалавека звязваўся ***матылёк***. Яго двайное нараджэнне, спачатку вусень, а потым і сам матыль, надавала гэтаму насякомаму вялікую таямнічасць. Уяўленні пра матыля

як пра душу памерлага нарадзіла павер'е, што ён з'яўляецца прадвеснікам смерці. Прыкладам, палешукі кажуць: «*Як богато бабочек леціць у хату, то будзе дрэнно — нехто памрэ*». Верылі, што матылькамі маглі стаць душы ведзьмакоў, і тады яны прыносяць шкоду людзям, нават могуць нападаць на спячых і душыць іх.

Некаторыя прыкметы і павер'і звязаны з першымі веснавымі матылямі. Палешукі лічаць, што калі ўвесну з'явіцца шмат чырвоных і жоўтых матылёў, то будзе сухое лета і шмат мёда, а мноства белых матылькоў прагназуе дажджлівае лета і шмат малака ў кароў. У вёсцы Рубель Столінскага раёна нават папярэджваюць дзяцей: «*Не бярыце, дзеці, бабку, карова не дасі малачка*». А на Віцебшчыне па палёце матыля варожаць пра ўраджай льну: чым вышэй лётаюць першыя вясновыя матылькі, тым вышэй вырасце лён.



*Герб г. Клімавічы, Магілёўшчына*

Душу ўяўлялі і ў вобразе мухі. ***Муха*** магла сімвалізаваць усе віды душ: спячыя, памерлыя і яшчэ не народжаныя. Мухі, што раіліся над зямлёй, лічыліся душамі памерлых, якіх выпусцілі на прасушку. У Палессі былі ўпэўнены, што колькі мух зімуе ў хаце, столькі і душ у сям'і, і калі забіць адну муху, то адной душой стане меней: хто-небудзь з хатніх памрэ. Разам з тым верылі, што ў муху можа ператварыцца ведзьма, якая адбірае малако ў кароў. Беларусы Віцебшчыны лічылі, што ведзьма, каб адабраць малако ў чужых кароў, у выглядзе мухі сядае на цадзілку. А даведацца, што гэта ведзьма, можна па яе вяртлявых рухах. Калі такую муху злавіць, завязаць у цадзілку і павесіць над печчу, то вядзьмарка памрэ ў страшных пакутах.



*Герб г. Ігумень (Чэрвень), Міншчына*

З мухамі звязаны розныя магічныя практыкі і павер'і. Так, калі муха, якая пасядзела на гадзюцы, а пасля сядзе на чалавека, то ў таго распухне і будзе балець гэтае месца. Бачыць у сне муху — да блізкай смерці. А каб летам у хаце не «*віслі*» мухі, на Каляды забаранялася вывешваць бялізну. Вялікая колькасць мух прадказвала ўраджай агародніны. Шырока былі распаўсюджаны дзеянні з выгнаннем мух. На паўночным усходзе Беларусі ў час дажынак таньчылі магічны танец «***мяцеліца***», які імітаваў сабой высылку мух на нябёсы за снегам. Было і рытуальнае пахаванне мух. Для гэтага рабілі нават маленькія труны з каранеплодаў рэпы, морквы, бурака і ў цішыні закопвалі іх дзе-небудзь за вёскай.



*Стылізаванае павуцінне і павук з ільняных нітак (твор дэкаратыўнага мастацтва)*

Сюжэт папулярнай народнай песні «*Камар з дуба зваліўся*» пацвярджае суаднесенасць гэтага насякомага з міфалагічным Сусветным дрэвам — дубам, да каранёў якога ён падае, паламаўшы тры рабры. Мужчынская сімволіка ***камара*** таксама праяўляецца ў песнях, перадусім эратычна-вясельных, дзе жартаўліва апавядаецца пра жаніцьбу камара і мухі:

*«Да камар муху й вядзе*
*У гіцкую берлу кладзе.*
*— Ох, ты ж, камару-камарусеньку,*
*Ведзе ж мяне памалюсеньку,*
*Бо я муха старая,*
*У мяне дзірка малая».*

Таксама верылі, што ў абліччы гэтага насякомага можа быць чыясьці душа. З гэтымі вераваннямі цесна звязаны казачны матыў пра тое, як камар-піскун і муха-драмуха пераносяць душу памерлага чалавека на той свет.

Міфалагічным сімвалам мучыцеля з'яўляецца ***авадзень***. Стварэнне авадня прыпісваюць чорту, які зрабіў яго з пяску. Лічыцца, што авадзень мае галаву з гліны. Падчас дажджу яна намакае і цягне яго ўніз. Таму авадні не лётаюць падчас дажджу. Дзякуючы чорту, з'явіліся і розныя мошкі. Так, нячысцік узяў жменю пяску, шыбануў

яе ўгору і сказаў: «*Ляцеце*». З вераванняў пра мошак паходзіць шэраг прыкмет: калі мошкі «таўкуць мак», то гэта на дождж; калі снуюць на заходзе сонца, то раніцай будзе добрае надвор'е. Вялікая колькасць мошак сведчыць пра высокі ўраджай ільну.

Сімвалам плоднасці і працавітасці лічацца ***мурашы***. У беларускіх казках менавіта яны дапамагаюць герою прыгнаць у стайню ведзьміных коней, змалаціць збожжа. З дапамогай мурашоў таксама вызначаюць месца пад новую хату. Для гэтага на ноч пакідаюць перакулены гаршчок з мёдам. Калі раніцай каля яго апынуцца мурашы, то на гэтым месцы будуюць дом. А для пабудовы хлява, каб добра вялася скаціна, стараліся выкарыстаць дрэва, каля якога знаходзіўся мурашнік. У народнай медыцыне на мурашах настойвалі гарэлку і выкарыстоўвалі для лячэння гематом і рэўматызму. У былой Магілёўскай губерні, каб вылечыць ад шаленства, з мурашніка выбіралі яйкі, клалі ў бутэльку і чакалі пакуль з іх выведуцца зялёныя мурашы. Потым сушылі, пераціралі, змешвалі з вадой і ўлівалі ў рот хвораму.

На Юр'я, каб распазнаць ведзьму, пасярод вясковай вуліцы рассыпалі мурашыныя кучы. Лічылася, што праз такую вуліцу ведзьма не зможа прайсці, пойдзе ў абыход і такім чынам выявіць сябе. Мурашы фігуруюць і ў рыбацкай магіі. Так, на Браслаўшчыне вуду выразалі з дрэва, якое расце ў мурашніку і нібыта тады будзе лавіцца шмат рыбы. Таксама перад першай лоўляй рыбацкую сець «акурвалі» падпаленым мурашнікам. І яго ж разбуралі, каб выклікаць дождж.

З даждджом звязаны таксама ***кляшчы***. Паводле казкі з тэрыторыі былога Гомельскага павету, клешч разам з мухай і камаром выступаюць пасланцамі з таго свету. Яны бяруць за валасы чалавека, забітага паваленым дрэвам, і адносяць яго ў царства памерлых.

Не засталіся без увагі і ***тараканы*** або ***прусакі***. На працягу апошніх стагоддзяў у народзе іх часта атаясамлівалі з іншаземцамі, прычым называлі не толькі *прусак*, але і *шваб*, *цыган*, *маскаль*, *жыдочак*. Часта народныя павер'і кажуць, што тараканы сведчаць пра ўдачу, а чорныя — увогуле лічацца сімвалам багацця.

Калі ж тараканы самі пакідалі дом, то гэта быў знак бяды. Іх трэба было выганяць з пэўнымі рытуаламі. Дзеля гэтага тараканаў садзілі ў стары лапаць і правозілі пры дапамозе матузка праз парог дома або адносілі на ростані ці за тры мяжы і там выкідвалі. У Лунінецкім раёне прусакоў і клапоў выганялі наступным чынам: абыходзілі хату і білі па ёй альховымі галінкамі, якія былі сарваныя ў час першага кукавання зязюлі. У некаторых вёсках пасля таго, як гаспадыня па-

бывала на пахаванні і вярнулася дадому, яна станавілася каля печы і пальцам малявала на ёй крыж. Пры гэтым казала: «*Усім людзям на здароўе, а прусам смерць!*» Клапоў выводзілі звычайна ў Вялікі чацвер, часам на Сёмуху ці Купалле. Трэба было да ўзыходу сонца тры разы перакінуць праз хату кавалак лёду.

Да нячыстых істот адносяцца ***блохі***, або ***кузуркі***. Паводле паданняў, блыха паходзіць з зямлі (пяску). Яна мае адносіны да трох стыхій: зямлі, агню і вады. Існавала забарона забіваць блыху, інакш яна можа адпомсціць чалавеку. Выводзілі блох рытуальнымі сродкамі. Напачатку вясны, падчас першага ворыва, першага грому, першага кукавання зязюлі, першага спеву салаўя і падобнае, вымяталі смецце з блохамі за парог хаты, а потым яго спальвалі і выкідвалі на дарогу ці ў раку. Гэта павінна была рабіць на досвітку аголеная дзяўчына. Такім чынам яна набліжалася да прыродных стыхій і заручалася іх магічнай падтрымкай. Абярэгамі ад блох служылі пяро бусла, палын, мята, папараць. Таксама пасыпалі дом зямлёй, якую бралі ў сябе з-пад пяткі пры першым удары грому альбо пры першым ворыве. На Гарадзеншчыне, каб у хаце не заводзіліся кузуркі, араты пасля выхаду першы дзень у поле і вяртання дахаты, абтрасаў перад парогам пясок з лапцяў. На Віцебшчыне блох выганялі на Дабравешчанне. Гаспадар здымаў з сябе кашулю, вымятаў ёю хату, выкідваў смецце на двор, а са двара захопліваў снег ці лёд і раскідваў іх па падлозе. Пасля такіх дзеянняў клаўся спаць. У ваколіцах Мінска ў Чысты чацвер казурак выганяла дзяўчынка 3–4 гадоў, якую распраналі і прымушалі вымесці падлогу. Пазбаўляліся ад блох і на Купалле, тады жанчыны здымалі з сябе кашулі і круцілі іх над вогнішчам.

Да нячыстых насякомых адносяцца ***вошы***. Паводле паданняў, яны ўтварыліся з пылу, попелу, праху, агню і пасланы чалавеку Богам, каб ён не лайдачыў, а шукаў паразітаў. Верылі, што вошы павінны быць ва ўсіх жывых людзей, і што іх няма толькі ў нябожчыкаў. Таму, калі чалавек шукае на сабе вошай, ён займаецца карысным і богаўгодным справай. Так, на Віцебшчыне была завядзёнка шукаць вошай у знак гасціннасці ў вандроўных старцаў — божых людзей. У некаторых рэгіёнах Беларусі для выклікання дажджу жабак ці вошаў нанізвалі на нітцы і падвешвалі на плот, дрэва, кусты або над калодзежам і аблівалі вадой. Пры гэтым казалі: «*Як гэтыя блохі і лягушкі павіслі, хай так і хмары вісяць*».

Некаторых насякомых выкарыстоўвалі ў народнай медыцыне. Іх разам з хлебам і напоямі давалі хвораму на жаўтуху або ліхаманку. Гарэлку, настоеную на блохах, клапах ці змеях, давалі п'яніцам ад запою.

# Глава 4
# КУЛЬТ ДРЭЎ

Ушанаванне дрэва звязана з культам абагаўлення прыроды. У народзе здаўна лічылі, што дрэвы могуць хадзіць, размаўляць,ператварацца ў чалавека і наадварот. На Гомельшчыне ў адным з паданняў расказваецца, што дубы — гэта заклятыя старым чараўнікам моцныя і прыгожыя хлопцы-волаты. Верылі, што ў дрэва пасяляецца душа чалавека і, калі дрэва сякуць, то з яго цячэ кроў і чуюцца стогны. Напрыклад, у Парычах Светлагорскага раёна занатавана паданне пра тое, як няверная жонка ператварылася ў бярозу, яе палюбоўнік — у асіну, а муж — у высокі і магутны дуб. У беларускіх паданнях часта фігуруе *«стоярусавае дрэва»*, якое вырастае на лясных перакрыжаваннях і можа ператварацца ў чалавека.

Вельмі ўважліва ставіліся да выбару дрэў пры будаўніцтве дамоў, гаспадарак і храмаў. Забаранялася выкарыстоўваць вываратні, дрэвы, паваленыя навальніцай. З сухога дрэва будавалі толькі гумны і свіраны, каб не заводзіліся мышы, а сена і збожжа захоўвалася ад вільгаці. У некаторых раёнах паваленае навальніцай дрэва называлі *«блудным дрэвам»* і лічылі, што, калі чалавек пераступіць праз яго, то абавязкова заблудзіцца.

Спрадвеку ўшаноўваліся дрэвы незвычайнай формы: зрослыя і скручаныя паміж сабой, з вялікімі нарастамі, са скразным дуплом, а таксама бортныя дрэвы. Многія з такіх дрэў, асабліва з адтулінамі, лічыліся лекавымі. Звычайна хворага тры разы працягвалі праз адтуліну ў ствале, а потым ягонае адзенне спальвалі і апраналі новае. Здаўна ў народнай медыцыне выкарыстоўвалі кару многіх дрэў, часцей за ўсё — дуба.

Пра ахвяраванні дрэвам і гаям гавораць такія пісьмовыя крыніцы, як «Аповесць мінулых часоў», «Слова пра Фаміну нядзелю», творы Кірылы Тураўскага і інш.

Шырока бытуюць паданні пра з'яўленне на некаторых дрэвах цудатворных абразоў, часцей за ўсё іх знаходзяць на ***дубе***, ***сасне***, ***ліпе***, грушы. Так, на дубе такія абразы нібыта аб'явіліся ў Міколках Узденскага раёна, Косцевічах Ваўкавыскага; на соснах — у Крупейках Лоеўскага, Сорагах Слуцкага, Залессі Смаргонскага, Чарнякова Бярозаўскага раёнаў, каля Шклова; на ліпе — у Пустынках Мсціслаўскага, Конкавічах Петрыкаўскага, Крыўках Шаркаўшчынскага раёнаў; на грушы — у Жыровічах Слонімскага раёна і г.д. Існуе шмат паданняў і пра скарбы, закапаныя пад сакральнымі дрэвамі.



*Святы дуб каля царквы, вёска Міколкі (Уздзенскі р-н., Мінская вобл). Рэканструкцыя В. Сташчанюка*

З глыбокай старажытнасці нашы продкі найбольш шанавалі ***дуб***, які лічыўся сімвалам вечнага жыцця. У Прусіі гэта было дрэва Пяркунаса, ва Усходняй Еўропе — Перуна. У сярэдзіне X ст. Канстанцін VII Парфірародны (Багранародны) апісаў язычніцкае пакланенне дубу на востраве Хорціца. Ён зазначыў, што русы прыносяць у ахвяру дубу жывых пеўняў, кавалкі хлеба, мяса і ўсё, што маюць іншае. А вакол дрэва ўтыкаюць стрэлы.

Паводле навуковых вызначэнняў, да гэтага ж часу адносяцца і знойдзеныя на суседняй тэрыторыі Украіны ў рэчышчах Дняпра і Дзясны дубы з устаўленымі ў іх сківіцамі дзікоў. Дуб, знойдзены пры расчыстцы Дняпра ў 1975 годзе, быў з каранямі. Агульная яго вышыня 9,6 м, дыяметр 0,65 м. На вышыні шасці метраў перад раздваеннем ствала было ўстаўлена дзевяць сківіц дзіка, па тры ў кожным радзе. Клыкі моцна ўраслі ў дрэва. Па плошчы яны ўтваралі квадрат 33 × 34 см. Некалі дуб рос на беразе і доўгія часы выконваў ролю паклоннага аб'екту.

Ушанаванне дубоў фіксуецца на працягу ўсяго II тысячагоддзя. Напрыклад, у мемуарнай літаратуры XVIII ст. згадваецца, што ў Панарскім лесе каля Вільні народ збіраўся каля сакральнага дуба, каб

спраўляць язычніцкія абрады. Стоячы перад дубам на каленях, людзі адбівалі яму паклоны і спальвалі ахвяры. Але потым езуіты знішчылі гэты дуб. Паклонны дуб быў і ў басейне ракі Поня (Барысаўскі павет), дзе ў дупле знайшлі металічныя ідальчыкі. Яшчэ ў пачатку XX ст. у губернскім Мінску было вядома паклоннае месца — капішча на беразе Свіслачы. Тут ляжаў камень Дзед і каля яго рос Святы дуб. На яго галінкі вешалі ручнікі, а жалуды лічыліся свяшчэннымі.

Паміж вёскамі Замошша і Царкавішча Ушацкага раёна, ва ўрочышчы Якубаўка, яшчэ ў пачатку XX ст. стаяў вельмі стары дуб. З-пад яго выцякала крыніца. Сюды людзі хадзілі лячыць вочы і складалі ахвяры ў дупло, хто што мог. У 1923 годзе чырвонаармейцы спалілі дуб, але амаль да нашага часу людзі працягвалі хадзіць на гэта месцы і складаць дары пню. Больш за ўсё дубу насілі грошы.

Каля вёскі Жукавец Бярэзінскага раёна, ва ўрочышчы Жоластава, на беразе Беразіны некалі рос Святы дуб. Потым ад яго застаўся толькі пень. Яшчэ не так даўно паляўнічыя клалі на яго ахвяры: калі забівалі лася, дзіка ці казулю, то клалі печань і сэрца жывёлы, а калі птушку — то некалькі пёраў.



*Святы дуб з убітымі ў дрэва сківіцамі дзіка, знойдзены на беразе ракі Дзясны на Чарнігаўшчыне*

Каля вёскі Старое Раматова ў Маларыцкім раёне ёсць Цар-Дуб або Патрыярх. У сярэдзіне XX ст. да яго абавязкова ехала кожнае вяселле, што адбывалася ў наваколлі. Дуб вянчаў маладых. Калі вяселле набліжалася да ляснога дуба, то сват саскокваў з брычкі, падыходзіў да дуба і казаў:

«Бацюхна! Патрыярх наш! Цар лясоў нашых! Благаславі маладых на жыццё добрае і доўгае, якое ты сам пражыў. Каб над іхнімі галовамі толькі мірныя вятры пралягалі, ды адно з жыватворнымі дажджамі!»

Маладыя кланяліся дубу, а за імі ўся дружына. Потым на палянцы таньчылі першы вясельны танец.

Яшчэ і ў нашы дні на некаторыя старыя дубы вешаюць ручнікі, стужкі, абразы. Напрыклад, так робяць у вёсках Прынта Вілейскага і Лесіна Талачынскага раёнаў.

Захавалася шмат павер'яў, звязаных з ахоўнай магіяй. Лічылася, каб не хварэць увесь год, трэба, пачуўшы першы вясновы гром, патрэсці дубовае дрэва, або пацерціся аб яго. Верылі, што нованароджаны хлопчык будзе моцным і здаровым, калі ягоную пупавіну павітуха абрэжа на дубовай дошцы.

Са святым дубам паміж вёскамі Серкавіцы і Янава Талачынскага раёна звязана павер'е, нібыта ў таго, хто дакранецца да кары дуба, ніколі не будуць балець зубы.

У некаторых раёнах пры набліжэнні засухі ў лесе высрубалі дуб, запрагалі ў яго хлопца, і той дубам абворваў вёску. Затым з гэтага дуба рабілі крыж і ставілі каля паселішча.



*Дуб-асілак, вёска Сітцы (Докшыцкі р-н., Віцебская вобл.)*

Многія паклонныя дубы мелі свае імёны. Прыкладам, *Дэвайціс* каля Смаргоні, *Мінтус* каля Рашэтнікаў Рэчыцкага, *Целяшоў Дуб* каля Люсіна Ганцавіцкага, *Цар-Дуб* каля Старога Раматова Маларыцкага, *Цар-Дуб* і *Царыца-Дуб* каля Аўцюкоў Калінкавіцкага, *Дуб-Волат* каля Сітцаў Докшыцкага раёна і іншыя.

У беларускім фальклоры дуб выступае ў якасці Сусветнага дрэва, каля каранёў якога знаходзіцца Змей, а таксама воўна, у шатах — рытуальны куфар і жывыя стварэнні: заяц, качка, яйка і ў ім смерць Кашча. Паводле вераванняў, Змей можа хавацца ад бога на-

вальніцы ў дупле, і таму ў дуб часта б'е Пярун.

Калі дуб асацыіруецца з мужчынскім пачаткам, то з жаночым пачаткам звязваецца ***сасна***. У песнях яна часта выступае ў якасці Сусветнага дрэва. У пісьмовых крыніцах XVII ст. адна з соснаў на Падзвінні называецца Марына Сасна. Шэраг дрэў вядомы пад назвамі Святая Сасна, гэта ў вёсках Ніўкі Лагойскага, Шаршуны Мінскага, Стралкі Верхнядзвінскага раёнаў і г.д. Каля знакамітага Сцёп-каменя пры вытоках Віліі на тэрыторыі Докшыцкага раёна расце сасна Куліна, якая лічыцца зачараванай жонкай міфічнага Сцяпана,ператворанага некалі Богам у камень. На Княжым востраве сярод балота паблізу вёскі Нарач Вілейскага раёна расце Княжая Сасна. Паводле падання, у дрэва ператварылася ад гора княгіня, сасланая на востраў сваім мужам. Святымі лічыліся сосны каля вёсак Старыца Капыльскага, Цвермы Лідскага, Старыя Гумны і Старыя Пышачы Крупскага раёнаў. Яшчэ на памяці людзей многім з гэтых дрэў насілі ахвяры: лён, палатно, ручнікі, стужкі, грошы.



*Дуб Якуб каля вёскі Казлы (Нясвіжскі р-н., Мінская вобл.)*

З сасновых паленцаў раскладалі вогнішчы для прыгатавання такой рытуальнай ежы, як вясельнай і хрэсьбіннай. Павер'я сцвярджаюць: сасновыя галінкі аберагалі ад грому. На Палессі падчас святкавання Вялікадня вакол царквы ўторквалі сасновыя галінкі, а потым забіралі і клалі на дахі дамоў. На Вадохрышча галінкамі сасны ўпрыгожвалі палонку на лёдзе, а потым таксама забіралі дахаты і ўторквалі ў сцены хаты або ў хлеў, каб зберагчыся ад навальніцы.

У міфалагічных уяўленнях сасна з аднаго боку лічыцца гарантам жыцця і касмічнага парадку, а з другога асацыіруецца са смерцю. З яе, як з дрэва, якое амаль не гніе, беларусы рабілі труны. Прыкладам у песнях спяваецца: «*прыбіты ножкі да сасновай дошкі*». Гэта гаворыць пра тое, што нябожчык ужо ніколі не вернецца да сваякоў. У

некаторых мясцінах Беларусі з сасны рабілі і пахавальныя кладкі. Гэта быў цэлы рытуал. Гаспадар хаты, дзе памерла жанчына, запрашаў людзей якія з возам накіроўваліся ў лес. Там яны выбіралі сасну са смалістым стрыжнем, счэсвалі яе з аднаго боку і везлі ў прызначанае месца — на балаціну ці ручай. Клалі плоскай часцінай дагары, пазначалі дату смерці і выразалі серп, а калі нябожчыца была маленькай дзяўчынкай, то боцікі. Са смерцю звязваецца і ядловец.

Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што ў старажытнасці каля соснаў выконваліся шлюбныя абрады. Яго адгалоскі бачаць у казцы «Кот і ліса», дзе расказваецца пра лісу, якая з'яўляецца ў лесе з катом-жаніхом, і яны тройчы абыходзяць разам вакол высокай сасны.

Сімвалам дабрабыту і жаноцкасці лічылася ***ліпа***. Яна ж у фальклоры выступае парай да мужчынскіх дрэў дуба і явара. Прыкладам, у адной з песен старая жанчына гаворыць, што на магілках «*...расце на сыну зялёны явар, на нявестцы — бела ліпка*». У казцы «Піліпок» захаваўся міф пра паходжанне людзей ад ліпы. Дзед прынёс дадому ліпавы цурбалак, бабка паклала яго ў калыску і пры калыханні прыгаворвала: «*Пі, ліпка!*» Праз некаторы час з цурбалка вырас хлопчык Піліпка.

У лячэбна-медыцынскіх практыках ліпа замяняла дуб. Вядомы назвы паклонных ліп: Трохгранная ліпа, Святая ліпа. Ліпы вылечвалі ад розных хваробаў. Хворы пралазіў, або яго прасоўвалі праз адтуліну. Пасля гэтага трэба было разарваць тую частку адзення, якая дакраналася да хворага месца, кінуць каля дрэва і адразу апрануць новае адзенне.

Жаночы пачатак па народных уяўленнях сімвалізуе і ***бяроза***. Яна лічыцца дрэвам-ахоўнікам, дапамагае ад хваробаў. Культ бярозы звязаны з земляробчай вясновай абраднасцю, у тым ліку з сёмушна-троіцкім святкаваннем. Галінкі бярозы шырока выкарыстоўваліся ў такіх абрадах, як «*ваджэнне куста*», «*парыць старых*». Каб абараніць жывёлу ад злых духаў, на рогі кароў навязвалі бярозавыя вяночкі.

Бярозам яшчэ нядаўна насілі ахвяры. У вёсцы Вуглы Вухвішчанскія Полацкага раёна на бярозу, што расла побач з крыніцай, вешалі лён, воўну, стужкі. У лесе пры дарозе з вёскі Заазер'е ў вёску Мажаны Бялыніцкага раёна некалі расла цудатворная бяроза. Да яе звярталіся жанчыны, якія не маглі зацяжарыць. Яны пралазілі праз «вілку», якую ўтвараў раздвоены ствол, здымалі старое адзенне і пакідалі яго на галінках дрэва. Пасля гэтага пераапраналіся ў новую вопратку. Кару і галінкі бярозы, што зраслася з дубам, выкарыстоўвалі ў любоўнай магіі і ад бясплоддзя.

Разам з тым бярозу лічылі дрэвам-пасярэднікам паміж светамі жывых і памерлых. Гэта адбілася ў тым, што мерку з хворага чалавека адносілі пад дрэва і там закопвалі. У народзе верылі, што бяроза, як і рабіна, з'яўляецца помслівым дрэвам. Некаторыя былічкі распавядаюць пра русалак, якія на Русальным тыдні качаюцца на бярозах або вешаюць на яе галіны калыскі са сваімі голымі дзецьмі.

Як варыянт Сусветнага дрэва выступала ***яблыня***. У архаічнай іерархіі дрэў яблыня суадносіцца з маці. Яблыня з яблыкамі асацы-



*Лекавая сасан ў вёсцы Старыя Пышачы (Крупскі р-н., Мінская вобл.). З левага боку — Л. Дучыц, з правага — І. Клімковіч*



*Святая сасна, вёска Цвермы (Лідскі р-н, Гродзенская вобл.)*

іруецца з бацькамі і дзецьмі. Яблыкі давалі маладым, каб у іх нараджалася шмат дзяцей. У першую шлюбную ноч адзін яблык клалі пад пярыну, а другі разломлівалі напалам, і кожны з маладых з'ядаў палову. Каб дзеці былі здаровыя і прыгожыя, цяжарная павінна была патрымацца за яблыню ці паглядзець на яе галінкі ўзімку або на самі яблыкі ўлетку. З той самай мэтай павітуха на хрэсьбінах раздавала ўсім па яблыку, а ваду пасля купання немаўляткі вылівалі пад салодкую яблыню. Калі нараджалася дзяўчынка, закопвалі пад яблыню так званае «дзіцячае месца», каб вырасла такая ж прыгожая і пладавітая. У некаторых мясцінах нованароджанаму клалі ў рот печаны яблык, каб ён не вырас п'яніцай. Перад тым, як набраць ваду з крыніцы, ракі або возера, туды ў якасці ахвяры кідалі яблык. З гэтым дрэвам як з Дрэвам Жыцця мае сувязь казачная чарадзейная яблынька і яе гаючыя маладзільныя яблычкі, якія вяртаюць людзям сілу, маладосць і каханне. Таксама ў казках гэтае дрэва дапамагае працавітым і руплівым дзяўчынам паспяхова выйсці замуж.

***Груша*** звязвалася з дабрабытам, а таксама як з верхнім, так і з ніжнім светам. Яе выкарыстоўвалі для атрымання «жывога агню». Калі карову вялі на злучку, то падганялі яе палкай, якая перад гэтым пабывала на грушы. На Палессі, калі нявеста ехала да вянца, то на ўсіх перакрыжаваннях раскідвалі сушаныя грушы, а маці яшчэ абсыпала

імі жаніха дзеля багацця маладых. Каб зацяжарыць, маладзіца з'ядала грушу, якая даўжэй за іншыя павісіць на дрэве. Грушавы напітак давалі парадзісе. Галінкі грушы ўторквалі ў вясельны каравай.

Каравай упрыгожвалі таксама ягадамі ***рабіны*** і ***каліны***, якія лічыліся сімвалам прыгажосці, дзявоцтва і чысціні. Паходжанне рабіны тлумачылася тым, што яна з'явілася ад крывавых слёз Евы, выгнанай з раю. Верылі, быццам пры дапамозе рабіны можна распазнаць чарадзеяў. У беларускіх баладах пашыраны сюжэт: нявестка, заклятая сваёй свякрухай, ператвараецца ў каліну, якую сын, згодна з матчыным наказам, бярэцца сячы. Але з каліны капае кроў, і яна расказвае пра сваю няшчасную долю. Як дрэва-пасярэднік каліна выступае і ў замовах, дзе расказваецца, што дзякуючы гэтай расліне, чалавек можа пазбыцца «скулы-рожы», «сіняга агню», шаленства і ўсіх тых хвароб, якія звязаны з чырвоным колерам.

У народных вераваннях пэўнае месца адводзілася ***асіне***. З аднаго боку гэта праклятае дрэва, якое звязваецца з хтанічнымі персанажамі. Нібыта пры стварэнні свету яна нічога не рабіла і за гэта была пакарана. Кіёчкі з асіны, забітыя ў зямлю вастрыём уверх, часта фігуруюць у паданнях пра ваўкалакаў. Менавіта праз іх чараўніку трэба кульнуцца, каб абярнуцца ваўком. З асіны рабілі труну для самагубцаў, а пры пахаванні чараўніка ў ягоную магілу ўбівалі асінавы кол і ставілі асінавы крыж. Бывалі выпадкі, калі на вогнішчы з асінавых дроў спальвалі трупы ведзьмакоў і тапельцаў, каб такім спосабам выклікаць дождж.

З другога боку лічылася, што асіна ўцягвае ўсё нячыстае, дрэннае і з'яўляецца ўніверсальным абярэгам. Асінавымі галінкамі адпужвалі ведзьмакоў, іх уторквалі на палях. З асіны рабілі дзіцячыя калыскі і качалкі. Калі ў двары зна-



*Сакральная хвоя з адтулінай у камлі каля г.п. Крупкі (Мінская вобл.)*

ходзілі падкінутае кімсьці яйка, то яго падымалі з дапамогай асінавых палачак, а потым спальвалі за межамі двара на агні з асінавых галінак.

Месцам знаходжання нячыстых душ лічыўся ***тополь***. Шмат дзе верылі, што на Купалле ведзьмы збіраюцца на шабаш да вялікага тополя. Верылі, што гэта дрэва нельга садзіць каля жытла, таму што яно нібыта шкодзіць людзям: «*Тополь не сажаюць, бо выцягвае з людзей жызнь*». Верылі, што «*тополь як перарасце хату, так сам галоўны ў сям'і гаспадар памрэ*». На Гомельшчыне падчас пахавання цела жанчыны пакрывалі галінкамі бярозы, а цела мужчыны — галінкамі тополя. Каб пазбавіцца ад ліхаманкі ў драўніну тополя забівалі валасы, пазногці або кавалак адзення хворага.

Сакральным дрэвам быў ***ясень***. Паводле адной з беларускіх легендаў, Бог выгнаў з раю Адама, Еву і іх спакусніка чорта. У чорта ён біў маланкай, але патрапіў у ясень. Дрэва загарэлася і такім чынам людзі атрымалі агонь. Лічылася, што з дапамогай ясеневых галінак знахар падпарадкоўваў сабе змей на адлегласці некалькіх крокаў. На Віцебшчыне верылі: каб адагнаць градавую хмару, трэба памахаць ясеневым кіем, якім дагэтуль разнімалі змяю і жабу. Ясеневы сок, які выдзяляе дрэва ўвесну, паводле народных уяўленняў, смяротны для змей. Напярэдадні Купалля галінкі ясеня як абярэгі ўторквалі ва ўсе шчыліны хаты — ад нячыстай сілы.

Шчаслівым дрэвам быў ***клён*** або явар. У валачобных песнях явар апісваецца як Сусветнае дрэва, якое знаходзіцца ў цэнтры гаспадарчага двара, куды завіталі валачобнікі:

> ***«У нашага пана да на падвор'і***
> ***А стаіць явар зелянюсенькі,***
> ***А на ім сокал яснюсенькі...»***

Лічылася, што клён прыносіць шчасце, таму на Гомельшчыне і Брэстчыне яго часта садзілі каля дома. Па ўсёй тэрыторыі Беларусі на Сёмуху дамы і двары ў вёсках прыбіраюць кляновымі галінкамі або ставяць каля дзвярэй і вокнаў маладыя ссечаныя дрэўцы. Верылі, што ў гэты час душы памерлых сваякоў заходзяць у дом і хаваюцца ў галінках клёна. На Купалле было заведзена, каб хлопцы плялі вянкі з кляновых лістоў, а дзяўчаты — з палявых кветак. На кляновых лістах пяклі хлеб. Пры вырошчванні ільну галінкі клёна ўтыкалі на полі.

У старажытнасці было шмат святых гаёў. Там адбываліся розныя абрадавыя дзеянні, хавалі памерлых, над магіламі насыпалі курганы. Асаблівай пашанай карысталіся дубравы. Падрабязнае апісанне

такой сакральнай дубравы палабскіх славян ёсць у храніста Гельмольда ў яго « Славянскай хроніцы». Аўтар у 1155 годзе разам з хрысціянскімі місіянерамі прымаў удзел у знішчэнні такога паганскага аб'екту. Ён пісаў:



*Паклонная бяроза і камень, з-пад якога выцякае святая крыніца, вёска Брады (Пружанскі р-н., Брэсцкая вобл.)*



*Янкаў Ясень, вёска Лысая Гара (Мінскі р-н., Мінская вобл.)*



*Святая сасна на прошчы каля вёскі Будча (Ганцавіцкі р-н., Брэсцкая вобл.)*

«Іх (дубы) атачаў дворык, абнесены драўлянай агароджай... Тут быў святар (жрэц), і свае святкаванні, і розныя абрады ахвярапрынашэнняў. Сюды меў звычку збірацца ўвесь народ з князем і жрацом на суд. Уваход у дворык дазваляўся толькі жрацу і жадаючым прынесці ахвяру або тым, каму пагражала смяротная небяспека...»

У часы распаўсюджвання хрысціянства на месцах былых капішчаў, у тым ліку святых гаёў, узводзілі храмы. Да нашага часу дайшлі назвы *Залатая Дубрава*, *Дубовы Гай*, *Княжая Дубрава*, *Святая Дубрава*, *П'яны Лес*. Дубраву каля Турава называлі Тураўская Пушча. Паводле падання, тут быў Святы Гай тураўскіх князёў. У Наваградку каля Фарнага касцёла месціўся Дубовы Гай Міндоўга. На беразе Заходняй Дзвіны існаваў Ліпавы Гай, дзе выклікалі дух вайдэлоткі Паяты.

Сакральнасцю вылучаюцца і некаторыя лясы. Пра гэта сведчаць іх назвы *Божы Дар*, *Княжы Бор*, *Залаты Бор*...

Пра паважлівыя адносіны да лесу гавораць

шматлікія архаічныя звычаі. Напрыклад, у 1950-я гг. у Дубровенскім раёне на Падняпроўі лесарубы, калі абсякалі галіны са спілаванай старой елкі, знайшлі на вершаліне жалезныя абцугі са званочкам. Старыя людзі патлумачылі, што гэта *«лясны бог»*. Яны расказалі, што некалі існаваў такі звычай: у маладым лесе выбіралі самую прыгожую елачку і навязвалі на яе званочак, які павінен быў заўсёды заставацца ў лесе. Лічылася, што ён прынясе шчасце таму, хто яго знойдзе. І ў падзяку за гэта шчаслівец павінен высадзіць хаця б адну елачку і начапіць на яе знойдзены званочак.

## Глава 5
## КУЛЬТАВЫЯ РАСЛІНЫ

З глыбокай сівізны стагоддзяў вядома, што такія расліны, як травы (зёлкі) і кветкі валодаюць не толькі лекавымі здольнасцямі, але і магічнымі. Іх выкарыстоўвалі падчас разнастайных абрадаў і рытуалаў, імі карысталіся як абярэгамі і амулетамі, упрыгожвалі капішчы і свяцілішчы.

Прычым заўсёды ўлічвалі, што для кожнай зёлкі ёсць свой час, калі яна актывізуецца або мае найвялікшую гаючую сілу. Так, залацiста-жоўтыя кветкі прымулы, што ў народзе завуцца ***ключыкамі***, зацвітаюць у канцы красавіка — пачатку мая і сваімі абрысамі сапраўды нагадваюць звязку ключоў. У гэты час, калі беларусы святкуюць Юр'я, зямля прачынаецца ад зімовага сну і таму невыпадкова, што ключыкі служаць сімвалам адамкнутай зямлі. У той жа час, паводле старажытнага міфа, зямля таму застаецца замкнёнай, што Юр'ева маці згубіла ключы, як у вясновай юраўскай песні:

*«Юр'ева матка пагнала цялятка,*
*У лес пайшла, у лес пайшла,*
*Залатыя ключы панясла, панясла.*
*Юр'ева матка, вярніся, вярніся,*
*Бо ключы нашліся, нашліся,*
*Залатыя ключы нашліся, нашліся».*

Пры дапамозе гэтай зёлкі гатавалі некаторыя лекі і прываротнае зелле, яе выкарыстоўвалі ў варожбах.

Збіраць травы і кветкі пачыналі ўжо на Сёмуху, падчас Русальнага тыдня. Такой кветкай была, да прыкладу, ***валошка***, або ***васілёк***, якую заўсёды стараліся пасадзіць у агародзе ці садзе. Сіні колер звязвае валошку з ніжнім ярусам светабудовы і мае адносіны да замагільнага



*Металічныя прышыўныя бляшкі для галаўнога ўбору з выявай знака плоднасці. З пахавання XIII—XIV стст. каля вёскі Малявічы (Вілейскі р-н., Мінская вобл.)*

света і смерці. Некаторыя навукоўцы параўноўваюць этымалагічную назву «валошка» і «васілёк» з Вялесам (Воласам). На Сёмуху (або Зелянец) з гэтых кветак сплятали вянкі і захоўвалі іх у хаце. Валошкі выкарыстоўвалі ў пахавальнай абраднасці: іх клалі ў труну, крапілі імі лаўку, дзе ляжаў памерлы, потым ягоную магілу.

Назва кветак паходзіць ад хлопчыка Васілька, якога русалка на Русальным тыдні заманіла ў поле і заказытала, пасля чаго ён ператварыўся ў гэтую расліну. На Гомельшчыне падчас абраду провадаў русалак выбіралі дзяўчыну, якая выконвала ролю русалкі, ускладалі ёй на галаў вянок з валошак і спявалі «Васілька»:

*«Ой, Васіль жа мой, васілёчак,*
*Васілёчак, васілёчак!*
*Бярозавы мой цвэточак,*
*Мой цвэточак, мой цвэточак!*
*Часам цебэ я садзіла,*
*Другім часам палівала,*
*Трэцім часам сырывала!*
*Сарву цьвяток, саўю вянок,*
*Завіўшы вянок, пайду ў танок».*

Але самымі лекавымі і магічнымі зёлкамі лічыліся купальскія травы, сабраныя падчас летняга сонцастаяння — найвышэйшага росквіту жыватворных сіл зямлі. Травы збіралі звычайна на Яна — другі дзень Купалля. Гэты дзень так і называлі *Ян-Траўнік*. Збор траў павінен быў адбывацца ў першай палове дня, да полудня. Казалі: *«покуль дзень прыбывае, каб і сіла прыбывала»*.

У некаторых раёнах Беларусі травы пачыналі збіраць яшчэ ўначы. Лічылі, што менавіта ў гэту пару расліны наталяюцца большай вільгаццю і карыснымі рэчывамі, якія могуць паступова губляцца з надыходам сонца. Найлепшым месцам збору былі нелюдзімыя месцы, дзе *«не чуваць крыку пеўня»*. Травы і кветкі ў гэты дзень збіралі не толькі знахаркі, зельнікі і чараўнікі, але і ўсе жанчыны. Зёлкі асвячалі ў храме, засушвалі і карысталіся імі на працягу года. З кветак

плялі вяночкі для варажбы на здароўе і дабрабыт людзей і хатняй жывёлы.

Некаторыя з іх, як ***багатку*** (дзьмухавец) уторквалі ў шчыліну сцяны ў сенях па чарзе ўсе сямейнікі: бацька, маці, дзеці па старшынстве. На раніцу глядзелі, чыя кветка распушылася, а чыя не. У апошнім выпадку трэба было чакаць няўдачы або хваробы.



*Ручнік з выявай кветак у чырвоным куце, вёска Курадава (Пінскі р-н, Брэсцкая вобл.)*

Назва такой зёлкі, як ***святаяннік*** (зверабой) гаворыць сама за сябе, яе збіралі менавіта напярэдадні свята Яна. Прычым трэба было паспець апярэдзіць лятучых ведзьмаў, якія таксама палявалі на гэтую лекавую зёлку і маглі пазбавіць яе гаючай моцы. Святаяннік, або *святаянскае зелле* ці *расанка*, дзякуючы чырвонаму колеру адвараў з яго і мазяў, што выклікала «*крывавыя*» асацыяцыі, выкарыстоўваўся пры малакроўі, матачным і другім крывацёку, ад гемарою, каб зажывіць раны, апёкі і да т.п. Ужываўся святаяннік і як магічны абярэг ад нячыстай сілы, «*урокаў*», ліхіх чараўнікоў, ім падкурвалі хаты і гаспадарчыя пабудовы.



*Вышыўка кветак на жаночай кашулі, вёска Горы (Горацкі р-н., Магілёўская вобл.)*

***Трыпутнік*** выкарыстоўваўся на Купалле для дзявочай варажбы на су-

джанага. Дзеля гэтага дзяўчына павінна была голая з расплеценай касой апоўначы пайсці на перакрыжаванне дарог (ростані), стаць на калені, і, не датыкаючыся рукамі да зямлі, толькі зубамі вырваць зёлку, потым нікому нічога не кажучы, прыйсці да дому, легчы ў ложак. Тады, паводле прыкметы, павінен прысніцца жаніх.

Сама назва травы гаворыць пра тое, што мае сувязь з матывам трох дарожак, шырока вядомым у фальклоры. Трыпутнік — гэта ваяр, які застаўся адзін з усяго войска і апынуўся на раздарожжы трох дарог, адна з якіх была выбіта золатам, другая серабром, трэцяя *«следам вытаптаная, слёзкамі вылітая»*. Ваяр выбірае апошнюю і разумее, што яна не прынясе яму радасці: жонка хутчэй за ўсё ўзятая ў палон або страчаная, нездарма ж дарога палітая слязьмі. Тады ён просіць шаблю зняць ягоную галаву з плячэй, зялёную лістоту шапацець над ім, шэрую зязюлю куваць па ім. На тым месцы, дзе ён памірае, вырастае гаючая трава, якая дапамагае людзям суцішыць боль і вылечыць іх раны.

У шэраг купальскіх траў уваходзілі і такія расліны, як ***баркун*** (*доннік*) і ***тоя*** (*рагулькі, казялкі*), якія ў спалучэнні адна з адной лічыліся моцным абярэгам ад нячыстай сілы. Баркун, які расце каля закінутых або недаробленых будынкаў і на ростанях, якія заўсёды лічацца небяспечным месцам, выконвае сваю місію — зберагаць і абараняць людзей ад ліха і небяспекі.

Раней ужо прыгадвалася як лятучы цмок набывае аблічча прыгожага хлопца і ў такім выглядзе заляцаецца да дзяўчыны ці кабеты, пасля чаго тая пачынае марнець і неўзабаве памірае. Сюжэты другіх паданняў распавядаюць, што такім міфічным палюбоўнікам можа быць і чорт. Абярэгам ад падобных заляцанняў лічыліся асвечаныя баркун і тоя. Так, на Палессе апавядаюць пра тое, як аднойчы да дзяўчыны, што пасвіла статак, прычапіўся пад відам хлопца чорт і пачаў «гуляць» з ёю. Неўзабаве дзяўчына пачала сохнуць і, калі б



*Дыван з раслінным арнаментам (горад Ганцавічы, Брэсцкая вобл.)*



*Слуцкія паясы XVIII ст. з раслінным узорам*

не расказала пра ўсё бацькам, магла б і памерці ў хуткім часе. Тады бацькі ўплялі ёй у касу асвечаныя зёлкі. Зразумеўшы, што да дзяўчыны не падступіцца, нячысцік сышоў назаўсёды, але перад гэтым злосна прамовіў: «*Каб не баркун да тоя, то была б дзеўка моя!*».

Адна з купальскіх песень распавядае пра паходжанне сіне-жоўтых кветак, якія ў народзе завуцца ***браткі***, ***брат-сястрыца***, ***Іван ды Мар'я***, ці ***кветка плачу***. Па волі злога лёсу адбыўся інцэстны шлюб паміж братам і сястрой. Даведаўшыся пра сваё кроўнае сваяцтва, маладыя муж і жонка жахнуліся недапушчальнага граху і ператварыліся ў кветку:

*«Пойдзем сястра ў поле,*
*Рассемся травою:*
*З цябе будзе сіні цвет, з мяне — жоўты.*
*Будуць дзеўкі краскі рваць*
*І брата з сястрою памінаць:*
*Гэта тая травіца,*
*Што брацейка з сястрыцай».*

Даследчыкі лічаць, што падчас купалаўскіх містэрый на ўзроўні святарскіх традыцый адбываўся сакральны шлюб паміж двума боствамі — Агню і Вады або Сонца і Месяца. Паводле індаеўрапейскіх міфаў, менавіта Сонца і Месяц з'яўляюцца тымі сакральнымі блізнятамі — братам і сястрой, ад шлюбнай сувязі якіх зарадзіўся ўвесь свет і жыццё ў ім.

Старадаўнія беларусы таксама верылі, што на Купалле, у пераломны час дзеяння супрацьлеглых пачаткаў прыроды (самая шчодрая раса і самае спякотнае сонца), час зараджэння жыцця і гармоніі, Сонца бярэцца шлюбам з Месяцам. Сімвалам гэтага сакральнага

шлюбу і была кветка, дзе жоўты колер сімвалізаваў агонь і жаніха, а сіні — ваду і нявесту. Пазней, са зменай рэлігіі, боскі інцэст — час першастварэння, быў дыскрэдытаваны. Гэта і прывяло да з'яўлення розных фальклорных сюжэтаў пра грахоўнае зямное каханне брата і сястры.

Апроч рэальна існуючых траў у беларускім фальклоры ёсць і міфічныя. Гэта ***папараць-кветка***, ***разрыў-трава***, ***сон-трава***...

Паводле народных павер'яў, папараць можа квітнець адзін раз на год, і менавіта ў Купальскую ноч, калі здараюцца самыя неверагодныя рэчы. Вогненная папараць-кветка лічылася падарункам самога бога Ярылы, яе называлі яшчэ *агонь-кветка*, ці *цар-кветка*. Квітнее папараць некалькі імгненняў, але хто ў гэты час знаходзіць кветку і зрывае яе, набывае містычныя магчымасці. Такі шчаслівчык навучыцца разумець мову звяроў, птушак і раслін, даведаецца пра ўсе таямніцы, зможа зачароўваць людзей і нават зможа рабіцца нябачным. Папараць-кветку шукаюць не толькі людзі, за ёй палююць розныя чарадзеі, лясныя духі і нячысцікі.

Існуе павер'е, як толькі чалавек пабачыць такую кветку, ён павінен тут жа сарваць яе, схаваць пад пахі або пад скуру на парэзанай далоні і з усяе моцы бегчы з лесу прочкі. Нячыстая сіла будзе злавацца, крычаць і клікаць таго чалавека па імені, але ні ў якім разе нельга азірацца, інакш можна развітацца як са знаходкай, так і з жыццём. Паводле другога павер'я, калі чалавек змог завалодаць кветкай, яму адчыняцца ўсе схаваныя і зачараваныя скарбы. Самы папулярны сюжэт у беларусаў, калі ў абутак хлопца-пастушка, які згубіў у лесе свой статак, выпадкова трапляе чароўная папараць-кветка, пасля чаго хлопец набывае сакральныя веды і



*Папараць-кветка (фотакалаж)*



*Пошук папараць-кветкі (мастак В. Славук)*

здольнасці: ён даведваецца куды знікла скаціна, дзе знаходзяцца заклятыя скарбы... Але ўжо ў хаце, як толькі пастушок пераабуваецца і кветка выпадае з лапця, ён усё забывае і губляе свае магічныя здольнасці.

Вельмі часта ў беларускіх паданнях гаворыцца пра тое, што схаваныя скарбы знаходзяцца пад замком і таму недасягальны. А такая купальская зёлка, як *разрыў-трава*, адмыкае любыя замкі і дапамагае здабыць падобны скарб. Пра чарадзейную здольнасць травы ведаюць прарочыя птушкі — дзяцел, сарока, сава, сойка... Таму шукальніку скарбаў, які палюе на разрыў-траву, трэба знайсці гняздо такой птушкі, замазаць яго глінаю, каб птушка не здолела патрапіць туды і разаслаць абрус пад дрэвам, дзе знаходзіцца гняздо. Самому трэба схавацца і чакаць на птушку, якая, каб вызваліць птушанят, паляціць шукаць чароўную зёлку. Праз некаторы час птушка прынясе траву і прыкладзе яе да гнязда, гліна адваліцца, і разам з ёю на абрус упадзе разрыў-трава.

Верылі, што існуе міфічная расліна ***сон-трава***, якой чараўнікі маглі наслаць сон на ўсё жывое і потым ужо здзяйсняць свае справы. Прыкладам, у адным з паданняў распавядаецца пра злодзеяў, якія з дапамогай разрыў- і сон-травы выкралі цудадзейную карону старога валадара Рыдана.

Авалодаць звышнатуральнымі ведамі і магчымасцямі дапамагала нашым продкам і міфічная зёлка ***жабер-трава***. Пра яе распавёў Ян Баршчэўскі ў сваёй кнізе «Шляхціч Завальня». А знайсці гэтую траву можна ва ўладаннях Фарона — аднаго з цыганскіх духаў — на дне глыбокага возера сярод камянёў і водарасцяў. Кажуць, што ў ясны сонечны дзень жабер-трава свеціцца пад вадой, быццам самая яркая зорка ўначы. А каб авалодаць чароўнымі ведамі і дарам прадбачання, трэба менавіта ў гэты момант сарваць кветку і прыкласці да скроні. Перад цудадзейнай раслінай бяссільны нават агонь, таму ёю можна патушыць пажар.



*Збор купальскіх кветак дзяўчатамі*

Легендарныя ***кветкі-цары*** ўтварыліся з затанулых у возеры жыхароў горада Свіцязь. Некалі на месцы возера знаходзіўся прыгожы горад. Але ў краіне пачалася вайна, рускае войска білася з ліцвінскім, якое ўзначальваў князь Міндоўг. Яму на дапамогу прыйшоў князь Мірскі, што кіраваў горадам Свіцязь. Але перамога была на баку рускіх, якія рушылі на горад і сталі пагражаць яму. Жыхары Свіцязя, каб не патрапіць у палон да ворагаў, пачалі маліць Бога пра тое, каб ён ператварыў іх горад у возера, а саміх — у вадзяныя кветкі. Так і сталася. І цяпер кожную вясну на возеры зацвітаюць кветкі-цары.

Магічныя зёлкі-кветкі ***барвінак (барлінак, барлінец)*** і ***рута*** выкарыстоўваліся для пляцення шлюбнага вянку маладой, які аздабляўся яшчэ іншымі выбранымі кветкамі: мятай, лілеяй, ружай, калінай, белым кменам, міртамі. Але менавіта да барвінку і руты, як да сакральных раслін, ставіліся вельмі паважліва, лічылі іх абярэгам і добразычлівым сімвалам.

Апроч гэтага барвінак як вечназялёная расліна выкарыстоўваўся пры варожбах на лёс чалавека, працяг ягонага жыцця. Так, калі ў хаце хто-небудзь цяжка хварэў, у гаршчок, напоўнены вадой, сыпалі лісце барвінку і ставілі пад ложак хворага. Верылі, калі лісце пажоўкне і ападзе на дно, то хворы неўзабаве памрэ, а калі застанецца зялёным і будзе плаваць на паверхні — паправіцца.

Рута ж была той кветкай, без якой шлюбны вянок быў не толькі непрэстыжным, але і ўвогуле немагчымым. У вясельнай песні спяваецца, як руту для вянку здабываюць усе родзічы нявесты:

*«Ой, вілі, вілі, да не давілі:*
*Руты мала стала.*
*Мамачка ідзець, рутачку нясець*
*Вянок давіваць».*

Лічылася, што паху эфірных рэчываў руты баяцца нават змеі, таму каб засцерагчыся ад самага страшнага міфічная змея — Васіліска, трэба абвешацца маладымі парасткамі гэтай травы. Разам з тым руту выкарыстоўвалі як лекі пры сардэчных, жаночых і нервовых хваробах. Затое ў вялікай колькасці рута магла выклікаць раздражненне скуры і ўвогуле прывесці да атручвання. Нездарма ж гэтая зёлка дала назву слову «*атрута*».

# Раздзел V
# ВЕРА Ў ІСНАВАННЕ ДУХАЎ

## Глава 1
## ДУХІ ДОМА І ГАСПАДАРЧЫХ ПАБУДОЎ

Жыхары нашых вёсак дагэтуль вераць у тое, што кожны дом і кожная сям'я мае хатняга духа — ***хатніка*** — гаспадара і апекуна, які забяспечвае нармальнае жыццё сям'і, здароўе людзей і плоднасць жывёл. *Хатнік*, або *дамавік*, — гэта памерлы продак, галоўны ў родзе і ягоны гаспадар. У народзе яго так і называлі: *гаспадар*. І хаця сама назва гэтага міфалагічнага персанажа распаўсюдзілася даволі позна, вобраз, звязаны з культам продкаў, пачаў фармавацца яшчэ ў часы язычніцтва.

Хатнік мае выяву старэнькага дзядка з сівой барадой і сівымі кудлатымі валасамі, апранутага ў белую кашулю, падперазаную лыкам. Улетку і ўзімку ён ходзіць босы, без шапкі, надзявае яе толькі перад смерцю гаспадара, што падкрэслівае ягоную далучанасць да іншасвету.

Звычайна хатніка ўяўлялі ў вобразе гаспадара дома, які тут жыў некалі і памёр. Таму падчас восеньскіх Дзядоў, каб улагодзіць хатніка і заручыцца ягонай падтрымкай, яго заўсёды запрашаюць на супольную рытуальную вячэру, а ў звычайныя дні прыносяць ахвяраванні ў выглядзе кавалкаў хлеба з соллю, пакінутых уначы на стале.

Вобраз хатніка ўзыходзіць да духа хатняга агню. Пра гэта сведчыць ягонае месцазнаходжанне — запечны кут, падпечча, пячны слуп. Народная прымаўка кажа: «*Вылез, як чура з пячуры*». Дух хатняга агню *Сопуха* з'яўляецца адным з самых старажытных персанажаў беларускай міфалогіі. Сярод азначэнняў слова «*сопуха*» ёсць і такія, як «*цёплы дух ад печы*», «*аддушына ў печы*», «*сапець — дыхаць полымем*».

У некаторых рэгіёнах Беларусі хатніка называлі *падпечнікам* і ўяўлялі яго ў выглядзе пачварнай сабакі з чырвонай галавой і вогненнымі бліскучымі вачыма. Толькі замест пярэдніх лап у яго былі чалавечыя рукі, а замест задніх — чалавечыя ногі.

Жыве хатнік толькі ў печцы і выходзіць адтуль пераважна ўначы або, калі нікога не бывае дома. Часам ён можа з'явіцца непаслухмяным дзецям і напалохаць іх, аднак нічога кепскага ім не робіць.



*Валасень (мастак В. Славук)*

Затое ўначы ён карае злачынных і несумленных людзей: з'яўляецца перад імі ў жахлівых выявах, бегае па сцяне дома, лётае над галовамі. На такіх людзей беларусы звычайна казалі: «*Каб табе Падпечка прысніўся!*».



*Падпечнік (мастак Б. Забірохін)*

Дамавога духа, які жыве ў падпеччы ці ў запечку маглі называць яшчэ і *пячурнікам*. Такі хатнік нагадваў сваёй выявай звычайнага ката, які ходзіць на задніх лапах. Яго паважалі і шанавалі: гаспадыня на ноч выстаўляла яму на пячы рэшткі вячэры або малако. Калі гэтага не зрабіць, пячурнік ад суму і крыўды будзе выць і крычаць кашэчым голасам у коміне некалькі начэй запар.

У выпадку сяброўства і згоды пячурніка з насельнікамі хаты ён можа папярэдзіць пра нечаканую бяду, якая набліжаецца да іх. Тады хатнік пачынае перасоўваць мэблю, скідваць і разбіваць посуд.

Часам хатнік мог паўстаць у выглядзе тоўстай хатняй змяі ці вужа. Гэта тлумачыцца вераваннямі нашых продкаў, што душа памерлага можа ператварыцца ў змяю. Таму раней у шмат якіх беларускіх вёсках існаваў звычай трымаць пад печчу або пад парогам вужоў і карміць іх малаком. Калі ж вуж жыў у хляве, ён выступаў своеасаблівым даільшчыкам кароў, і гаспадары дома былі нават рады гэтаму, таму што лічылі такога вужа ахоўнікам і апекуном хатняй жывёлы. Яго ні ў якім разе нельга было забіваць, бо гэта пагражала смерцю гаспадара або гаспадыні. На Палессі і цяпер называюць вужа дамавіком, стараюцца яго не крыўдзіць.

Вобраз хатніка ў выглядзе змяі стаў крыніцай для ўзнікнення такога міфалагічнага персанажа, як ***клетнік***. Гэты незвычайны дамавік жыў у клеці (істопцы) і быў таксама падобны да вялізнага вужа, але

меў вогненную прыроду: «*увесь нібыта залаты, гарыць як агонь*». А крылы такога хатніка рабілі яго падобным на лятучага цмока. Калі ў небе бачылі палёт метэора, звычайна казалі: «*Клетнік паляцеў*». Гэты незвычайны дамавік быў карысны для свайго гаспадара тым, што, лётаючы ў паветры, бачыў усе схаваныя ў зямлі скарбы, таму час ад часу прыносіў іх у хату.

Але, каб у гаспадара з'явіўся такі памочнік, яго трэба было вывесці штучна. Працэс вырошчвання клетніка складаны. Спачатку гаспадар хаты павінен быў некалькі тыдняў выношваць у сябе пад пахай яйка сямігадовага чорнага пеўня. Пасля таго, як з яйка вылуплівалася маленькае вужаня, яго было неабходна штодзень карміць несалёнай яешняй. У адваротным выпадку клетнік мог адпомсціць пажарам хаты.

Поруч з дамавіком мужчынскага роду беларусы вераць і ў жаночыя іпастасі гэтага духа — ***Дамавуху***, якую яшчэ завуць *Дамахай* ці *Дамавіхай*. Яе лічылі жонкай або дачкой хатніка, часам — самастойнай постаццю, міфічнай гаспадыняй дому. Уяўлялі ў выглядзе тоўстай, невялікай «*бы дзежачка*», сярэдніх гадоў кабеты. У Дамахі такія ж схільнасці і заняткі, як у дбайнай гаспадыні-сялянкі. Яна працавітая і гаспадарлівая, прадзе, тчэ, вышывае, падтрымлівае парадак у хаце, даглядае маленькіх дзяцей, лечыць іх цудадзейнымі зёлкамі. Дамавуха вельмі не любіць неахайных і лянівых гаспадынь і ўсё робіць для таго, каб у такіх хатах адбываліся сваркі і бойкі.



*Клетнік падсілкоўваецца яешняй (мастак М. Новак)*

Апроч хаты ў сялянскую гаспадарку ўваходзілі двор і ўсе пабудовы — лазня, гумно, ёўня, хлеў, пуня, якія таксама мелі асабістых духаў-ахоўнікаў. Прыкладам, сядзібны дух-апякун двара ці падворка — ***Дваравы***.

У кожнага гаспадара быў «*свой*» падобны дух, ён ахоўваў гаспадарку і хатнюю жывёлу ад чужых небяспечных духаў кшталту *палявога* і *падмежніка*. У Дваравога магла быць жонка — ***Дваравіца*** і дзеці. У адной з замоў гаворыцца:

«Цар-хазяюшка, дваравы! Царыца-хазяюшка дваравіца! І дарую я цябе хлебам і соллю, і нізкім паклонам, а што сам ем, п'ю, цем цябе дару. А ты, хазяюшка-бацюшка і хазяюшка-матушка, мяне берагі і скацінку блюдзі!».



*Лазнік (мастак Б. Забірохін)*

У жыцці селяніна лазня займала вельмі важнае месца. Там не толькі мыліся і парыліся, знахары ў ёй лячылі людзей ад прастуды, звіхаў і другіх хвароб, часам там нараджаліся дзеці. Разам з тым лазня ў адрозненні ад хаты асэнсоўвалася як «*нячыстае*», неасвечанае месца, якое знаходзіцца на мяжы прасторы, засвоенай чалавекам, а таму з'яўляецца ідэальным прытулкам для нячыстай сілы. Гаспадаром лазні лічыўся ***Лазнік***, ці ***Баннік***. Верылі, што ён найбольш злосны сярод астатніх сядзібных духаў і мог з'яўляцца людзям або ў выглядзе агромністага мужыка басанож з жалезнымі рукамі, або маленькага дзядка з вялікай сівой барадой. Ягонае месца ў лазні за печкай ці пад палком.

Менавіта ў лазні адбываліся розныя абрадавыя дзеянні. Тут чаравалі, варажылі, праводзілі абрады ініцыяцыі ў чараўнікі, гулялі ў карты, выклікалі нячысцікаў. Так, на Каляды дзяўчыны хадзілі ў лазню, каб паваражыць на жаніха. Рабілася гэта наступным чынам: тая, што варажыла, паднімала спадніцу і прасоўвала заднюю частку цела ў прыадчыненыя дзверы лазні. Верылі, што Лазнік павінен дакрануцца да яе сваёю лапай. Калі лапа была голая і з кіпцюрамі, гэта азначала, што яе замужняе жыццё будзе бедным, а свякруха лютая. Калі Лазнік дакрануўся да дзяўчыны калматай лапай, яна была ўпэўненая, што шлюб будзе шчаслівым, а муж багатым.

Лазнік можа пакараць калецтвам або нават смерцю тых, хто мыецца ў лазні пасля апоўначы ці заходу сонца, таму што сам у гэты час любіць мыцца і парыцца. Калі хто-небудзь з людзей затрымаецца ў лазні пасля апоўначы, Лазнік пачынае палохаць яго ненатуральным храпам, крыкам, шоргатам. Не любіць Лазнік, калі п'юць і сварацца ў лазні, тады ён пачынае кідаць гарачыя камяні з печкі, каб забіць небаракаў, а можа і прывязаць каго да да лаўкі і біць бя-



*Лазнік (мастак В. Славук)*

розавым венікам, пакуль не здзярэ скуру. Калі жанчына нараджала ў лазні, яе асцерагаліся пакідаць там адну з немаўлём, бо Лазнік можа загубіць іх абодвух або падмяніць дзіця на цурбалак. Калі гэтага духа не запрасіць у новую лазню, дык старую ён можа спаліць ці разбурыць. А калі будавалі новую лазню, то, каб залагодзіць Лазніка, прыносілі ахвяру — закопвалі пад ганкам новага будынка чорную курыцу і пакідалі нячысціку ваду і венік, каб той мог памыцца.

Існуе шмат уяўленняў пра духаў тых гаспадарчых пабудоў, дзе апрабляўся і захоўваўся ўраджай. Так, распаўсюджаны павер'і пра ахоўніка гумна — вялікай будыніны для складання і абмалоту збожжа. Міфічным духам гэтага месца з'яўляецца ***Гуменнік***, або ***Падавінны***. Ён жыве ў гумне пад асеццю або за авіннай печчу і дапамагае гаспадару сушыць і малаціць сабраны ўраджай хлебных злакавых раслін. Гэта дабрадушны дзядок невялікага росту, апрануты ў чорную куртку з каўпаком на галаве. Лічылася, што пакуль ураджай не сабраны, і гумно стаіць пустое, Гуменнік жыве ў жытнёвым полі, таму яго часта блыталі з Палевікам. Існуе і жаночы адпаведнік Гуменніка — ***Гуменніха***. Яна прыходзіць па начах на гумны, дзе начуюць жанчыны падчас жніва, і палохае іх, грукаючы арэхавым кустом па сценах будынка.



*Асетнік (мастак Б. Забірохін)*

Больш за іншыя сядзібныя духі распавядаюць пра ***Ёўніка*** або ***Асетніка***, які жыве на пячы ў ёўні (асеці, авіне) — месцы, дзе сушыцца хлеб у снапах. Першапачаткова гэта былі яміны з насцілам, дзе распальвалі агонь для сушкі снапоў, пазней сталі ўзводзіць спецыяльныя будынкі з ачагом ці печчу. Некалі авін быў месцам ушанавання агню, пра што кажа і крыніца: *«молятся огневи под овином...»*. З гэтага можна зрабіць выснову, што Ёўнік мае вогненнае па-

ходжанне і таму не баіцца простага агню, пажар у ёўні з-за неасцярожнасці людзей мала турбуе яго. Падчас пажару ён выходзіць са свайго жытла і спакойна назірае за ім, а пасля таго, як згарыць ёўня, ён так жа ж спакойна залазіць у печ на абгарэлае бервяно і жыве тут, пакуль не адбудуецца новая ёўня, куды адразу і перасяляецца. Але калі ў ёўню ўдарыць маланка, Асетнік гіне ад нечаканага грамавога ўдару. Мякінны пыл, які асядае на ім падчас абмалоту і прасушкі снапоў, лёгка ўспыхвае, і Ёўнік хутка згарае, ад яго не застаецца нават пылінкі.



*Еўнік (мастак В. Славук)*

Звычайна гэты дух нябачны, але калі робіцца бачным у паўзмроку асеці, то ўяўляе з сябе чалавекападобную масу, дзе сажа, пыльнае павуцінне і наліплая мякіна не даюць магчымасці разгледзець ягоныя формы, «*толькі вочы гараць як вугалі*». Ёўнік вельмі працавіты і дапамагае гаспадарам, па начах ён замятае гумно, вее зерне, надае яму «*спорню*», а часам нават сам малоціць. Але ён не любіць старонніх наведвальнікаў, калі яны раптам з'яўляюцца ў асеці, ён пільна сочыць за імі, каб нечакана нагнаць дыму, зачадзіць паветра і нават спаліць разам з дабром, што захоўваецца тут. Часам гаспадары выкарыстоўвалі ёўню як лазню, тады і ёўнік быў рады, таму што мог змыць з сябе сажу і пыл.

У гаспадарчай пабудове, дзе захоўваюць сена — пуні, таксама ёсць свой дух-ахоўнік ***Пуннік***. Ён не такі брудны, як Ёўнік, хаця і на ім хапае пылу і трухі ад сена. З выгляду гэта чалавекападобная істота, праўда, больш падобная на ахапак дробнага забруджанага сена. Але заўважыць яго можна толькі ў выпадку наяўнасці ў пуні сена. Калі ж пуня пустая, Пуннік незаўважна сядзіць на крокввах або бэльках і назірае за гульнямі моладзі і валтузнёй катоў, калі тыя ловяць

мышэй. Вельмі любіць гэтая істота пужаць прахожых і дзяцей, тады ён ненатуральна хрыпіць і ахае, свішча або жаласліва енчыць праз шматлікія шчыліны і адтуліны ў пуні. Пуннік апроч сядзібнай пуні можа знаходзіцца і ў лугавой, і ў лясной пабудове такога кшталту, пры ўмове, што яна будзе мецц страху і кроквы. У адваротным выпадку ён можа змарнець ад любой макрэчы і дажджу. Як і Еўнік, Пуннік вельмі баіцца знішчальных удараў грому і маланкі, тады ён ператвараецца проста ў пыл.

Сядзібны дух, які апякуецца ў асноўным коньмі і каровамі і жыве ў хляве, завецца ***Хлеўнік,*** або ***Хляўнік***. Але гэтага духа не заўсёды ўспрымаюць станоўча. Згодна з павер'ямі, ён больш псуе скаціну, чым песціць яе. Сцвярджаюць, што ўначы ён ездзіць на конях з аднаго канца вёскі ў другі, або можа ўвогуле праехаць вёрстаў пяць па полі. Пасля гэтага коні хутка худнеюць, слабеюць і, калі своечасова не пазбавіць жывёл ад Хлеўніка, яны могуць увогуле акалець. Тады ад такога Хлеўніка стараюцца пазбавіцца як мага найхутчэй. Лічыцца, што гэты дух баіцца сарокі, ён не любіць, калі яна садзіцца на хлеў і пачынае сакатаць, тады Хлеўнік упадае ў шал і сыходзіць з хлява.

Другія кажуць, што ў выпадку добрых адносінаў з гаспадарамі Хлеўнік наадварот песціць і дагледае кожную скаціну, а коням нават заплятае грывы і хвасты, сваім улюбёнцам ён падкладае болей корму, не дазваляе крыўдзіць адных жывёлін другім. Апроч коней і кароў Хлеўнік зрэдку займаецца авечкамі, але ніколі свіннямі і казамі. Калі сяляне ўзгадвалі гэтага духа, яны не называлі ягонага імя і, калі заходзілі ў хлеў, намагаліся не глядзець на задні кут, бэльку ці жэрдку, дзе звычайна знаходзіцца Хлеўнік.

Падчас стасункаў з жывёламі гэты дух застаецца нябачным і толькі зрэдку з'яўляецца ў вобразе скурчанага, зморшчанага, худога чалавека. Яго параўноўваюць са шкілетам хлопчыка, якога змясцілі ў скуру дарослага чалавека. Жыве Хлеўнік столькі ж, колькі і Хатнік, аднак раней за яго старэе, таму што жыве ў брудным хляве і шмат церпіць ад паразітаў, што дастаюцца яму ад жывёл.

Часам казалі, што функцыі Хлеўніка выконвае драпежная ***ласка***, якая, паводле павер'яў, прабіраецца ўначы ў хлеў, заязджае і мучыць як коней, так і кароў, злізваючы салёны пот з гэтых жывёл. Таму гэтага звярка называлі яшчэ «*дамавік*» або «*яздун*». Каб засцерагчыся ад ласкі і шкадлівага Хлеўніка, у хляве вешалі забітую сароку. Абаронай ад Хлеўніка і ласкі лічыўся і вуж-даільшчык, які жыў у хляве, ласаваўся малаком кароў, якіх і ахоўваў.

У некаторых раёнах Беларусі заменай Хлеўніка з'яўляецца ***Хохлік***, якому прыпісваюцца адмоўныя рысы першага. Лічыцца, што гэты

персанаж вельмі недобразычлівы да коней, на якіх ён таксама скача ўначы і даводзіць іх да знясілення.

Апроч пералічаных духаў-апекуноў свойскай жывёлы, у беларускай міфалогіі існуюць і такія, як ***Баган***, ***Вазіла*** і ***Кумяльган***. Для першага з іх сяляне аддзялялі ў хлявах асобнае месца з яслямі і сенам, верылі, што гэты дух пасяляецца тут у любімага гаспадара і ахоўвае



*Вазіла (мастак У. Аржавіцын)*



*Баган (невядомы мастак)*

скаціну ад розных няшчасцяў, а самае галоўнае — дапамагае жывёле нарадзіцца. Да прыкладу, калі карова ацялілася, казалі: «*Баган нарадзіў цяля*», і наадварот, калі авечка акалела ад родаў — «*Баган задушыў авечку*».

***Вазіла***, або *Вісуснік* ці *Канькач*, таксама жыў пераважна ў хлявах і з'яўляўся апекуном коней. Ён меў падвойную прыроду — чалавечую і конскую, але найчасцей уяўляўся ў чалавечым абліччы і адзенні, толькі з конскімі вушамі і капытамі. Сяляне былі ўпэўнены, што ў кожнага гаспадара ёсць свой Вазіла, які ўсяляк даглядае коней, суправаджае іх разам з пастухамі ў начное, падкідвае ім у ежу нейкую лекавую расліну, ад якой яны робяцца больш дужымі.

Падвойная прырода была яшчэ ў аднаго міфалагічнага персанажа, які меў адносіны да коней. Гэта ***Кумяльган***. У адрозненне ад Вазілы у яго было чалавечае тулава, рукі і ногі, толькі пакрытыя поўсцю, а вось галава была конскаю і капыты на руках і нагах. Прычым ён мог перасоўвацца, як чалавек, так і конь, мог мяняць сваё аблічча, рабіцца падобным да коней таго ці іншага гаспадара. Ён адносіўся да ліхіх духаў, і замест таго, каб даглядаць коней, імкнуўся ўсяляк іх мучыць і псаваць. Да прыкладу, ён мог загнаць каня да смерці, падмяшаць яму ў сена якую атрутную расліну, або выкрасці каня ці жарабя ў начным і аддаць на з'ядзенне драпежнікам. Калі параўнаць вераванні адносна Вазілы і Кумяльгана, можна ўбачыць у іх адбітак архаічных індаеўрапейскіх блізнячых міфаў, дзе вельмі часта праходзіць тэма апазіцыі і канфлікту братоў-блізнятаў. Узгадаем ведыйскіх Ашвінаў, старагрэцкіх Дыяскураў і Кентаўраў.



*Вазіла (невядомы мастак)*

Старажытная міфічная істота ***Чур*** была некалі вядомай па ўсёй Беларусі. Гэта таксама хатні апекун. Кожны дом, кожная сям'я мае свайго Чура, ахоўніка хатняга агню, які ахоўвае ад дэманаў змроку. Гэты персанаж карыстаецца асаблівай павагай, нават лічыцца родавым богам, родапачынальнікам, які пасля смерці аберагае і ахоўвае свой род ад усялякай нячыстай сілы. Існуе другая форма слова «чур» — ***шчур***, якая паходзіць ад слова пра-шчур — родапачынальнік, продак. Ад імя гэтага бога пайшло шмат прымавак, закляццяў і зваротаў. Да прыкладу, калі хто-небудзь хоча абараніцца, кажа: «*Чур мяне!*», а ў выразе «*Чур маё!*» старажытны бог з'яўляецца абаронцам правоў і ўласнасці. Відаць таму некаторыя навукоўцы лічаць, што некалі гэты міфічны персанаж быў ахоўнікам родавых зямельных уладанняў і межаў, якія акрэслівалі тыя самыя ўладанні.

## Глава 2
## ДУХІ ЛЁСУ, АПЕКУНЫ І ПРАЦІЎНІКІ СЯМ'І

Продкі верылі, што ў кожнага чалавека маецца свая ***Доля***, яна з'яўляецца персаніфікацыяй шчасця, удачы і лёсу, якія дарыць людзям боства. Больш за тое, у індаеўрапейскай культуры Доля і Бог першапачаткова былі сінонімамі і азначалі такія паняцці, як тэрмін жыцця, здароўе, багацце і ўвогуле тыя падзеі, якія павінны адбыцца ў жыцці кожнага чалавека. Нават беларускія словы «*бажба*» і «*далібог*» пацвярджаюць гэта. А дзеяслоў «*надзяляць*» увогуле з'явіўся ад самога паняцця і тэрміна «*доля*». Беларусы верылі, што Доляй «*надзяляе*» чалавека або маці пры яго нараджэнні, або бабка павітуха, або кум з кумою. У беларускім фальклоры як «*давальнік*» Долі часта выступае сам Бог:

> *«Усякаму дзераўцу Бог лісточкі даў,*
> *А мне, маладзенькай, Бог долі не даў».*

Часта Доляй называюць толькі шчаслівы лёс, а гаротны — ***Нядоляй*** або *Ліхой Доляй*, *Бядою*, *Злыдняй* ці *Злыднямі*. У беларускіх праклёнах можна пачуць зычанні Ліхой Долі: «*Хай яму горкая доля, як ён мяне напалохаў!*» Нядолю можна наклікаць, калі праклясці свайго дзіцёнка ў нядобры час або заўчасна галасіць пра тое, што ў яго будзе нешчаслівы лёс. Доля можа пакінуць чалавека, калі ён грашыць ці не выконвае дадзеных раней запаветаў. Доля памірае разам са сваім

гаспадаром, і шмат хто верыць, што яна сядзіць на ягонай магіле або наведвае дамы ягоных сваякоў. Долю памерлага, якая прыйшла ў дом родзіча, можна спытаць пра будучае: «*На дабро ці на ліха*?» Калі яна адкажа «*Ху*!», — здарыцца няшчасце. Долю памерлага продка можна выклікаць з магілы, калі пераскочыць праз яе крыж-накрыж, але трэба памятаць, што замест Долі можа з'явіцца і Нядоля, а яна прыносіць адны няшчасці.

Часта Доля прымае выгляд двайніка таго чалавека, чый лёс яна ажыццяўляе, і яе выгляд мяняецца ад таго, каму яна належыць. Таксама верылі, што Доля шчаслівага чалавека мае грунтоўны і дагледжаны выгляд жанчыны будзь якога веку, апранутай у прыстойнае адзенне. І наадварот, Доля бедняка выглядае неахайна, абы-як апранутай кабетай.

У чарадзейных казках Доля можа прымаць і зоаморфны выгляд. Прыкладам, у адной казцы пра беднага і багатага братоў іх долі прымаюць выгляд ката, сабакі і каровы, якія ўсяляк дапамагаюць сваім гаспадарам разбагацець. А калі багацей бачыць, што ягоны брат робіцца больш багацейшым, ён, каб завалодаць ягонай Доляй, хітрасцю прымушае яго зарэзаць залатаносную кароўку, а пасля з'есці яе сэрца. Але яго план не спрацоўвае, таму што сэрца з'ядаюць сыны бедняка, і робяцца на ўсё жыццё шчаслівымі і багатымі.

Беднасць і багацце чалавека залежаць ад працавітасці ягонай Долі. Працавітая Доля селяніна працуе разам з ім, вяжа ў полі снапы, нават крадзе для яго зерне з суседніх палёў. Кепская Доля толькі адпачывае і гуляе. Беднасць чалавека тлумачыцца лянотай ягонай Долі — часта ў былічках і казках такая Доля ляжыць пад грушай або п'е гарэлку. Калі ў чалавека лянівая Доля, ён павінен расшукаць яе і пабіць, тады яна пачне працаваць і дапамагаць свайму гаспадару. Таксама лічыцца, што чалавек бедны таму, што займаецца не сваёй справай, не ведае, дзе знаходзіцца ягоная Доля. Каб жыць шчасліва і ў дастатку, чалавек павінен знайсці сваю Долю і спытаць у яе, у чым ягонае пакліканне, у якой справе ён атрымае ўдачу. Калі ён паслухаецца парадаў сваёй Долі, то знойдзе сваё шчасце.

Падобныя на Нядолю такія варожыя духі, як ***Злыдня*** і ***Злыдні***. Першая ўяўлялася ў выглядзе нябачнай жанчыны без языка, вачэй і вушэй, лічылася, што раней яна была змяёй. Злыдні ж маюць выгляд малых гарбатых стварэнняў з аблезлай поўсцю ў вялізных ботах і шапках. Яны з'яўляюцца ў хаце гуртом і хаваюцца ў падпечча. Калі гэтыя нячысцікі нападаюць на хату, яны зазіраюць ва ўсе гаршчкі, падсыпаюць туды пяску, псуюць у дзяжы хлеб, крадуць у курэй яйкі, а ў малако наліваюць вады. Тады на сям'ю надыходзіць беднасць і

галеча. Злыдні асацыіраваліся з лыжкамі. Так, на Лепельшчыне верылі, што нельга падымаць згубленую кім-небудзь лыжку або класці на стол лішнюю, тады ў хаце абавязкова з'явяцца гэтыя варожыя духі. Пазбавіцца ад Нядолі ці Злыдняў вельмі цяжка, але магчыма. Дзеля гэтага трэба хітрасцю заманіць іх у мех і потым кінуць яго ў балота. Злыдней можна звязаць і пакінуць на дарозе, і тады яны пяройдуць да таго, хто іх вызваліць.

Існуюць міфічныя персанажы, якія з'яўляюцца апекунамі шлюбу і дабрабыту маладой сям'і. У першую чаргу гэта ***Любмел***, які лічыцца



*Злыдні (мастак В. Славук)*

богам шлюбу (аналаг старажытнагрэцкага Гіменэя). Вобраз гэтага боства сустракаецца ў вясельных песнях:

*«Прыгожая ты, красачка,*
*Уселася з Любмелам.*
*Бадай жа ён табе, матачка,*
*Даў долю з тваім мілым».*

На Віцебшчыне ў гонар гэтага боства падчас вяселля ладзілі адмысловы абрад. Дзеля гэтага на ролю Любмела абіралі прыгожага 10-гадовага хлопчыка, апраналі яго ў белую кашулю, абувалі чырвоныя боты ці чаравікі, а на галаву надзявалі вянок з чырвоных кветак. Падчас таго як маладыя рыхтаваліся да першай шлюбнай ночы, такі Любмел разуваў жаніха, а ў абутак нявесты клаў грошы, яны лічыліся дарам боства і абяцалі сямейнае каханне. Калі ж маладыя не ладзілі паміж сабою, тады казалі: «*Любмелевы грошы згубілі*».

Верылі, што пра тую сям'ю, якая нядаўна пабралася шлюбам, клапацілася ***Бордзя***. Апякунку бачылі ў абліччы мілавіднай усмешлівай жанчыны з доўгімі светлымі валасамі. Калі сям'я жыла шчаслівa і багата, пра яе казалі: «*Разбордзілася, як за Бордзяю*», а калі шлюб адбыўся не па каханні: «*Гэ, бо не ад Бордзі*».

Дапамагаюць Бордзе ў апякунстве маладой сям'і яе служкі ***Гарнік*** і ***Паветнік***, якіх ёй падараваў яе прыхільнік — грамаўнік Пярун. Гарнік з'яўляецца старэйшым службовым духам Бордзі, вельмі аддана ёй служыць, часта разам з ёю прысутнічае на вяселлі. Паветнік жа мае выгляд вялізнай шасцікрылай птушкі і жыве ў павеці, дзе складаюць дровы. Ён мае статус малодшага служкі Бордзі і робіць толькі тое, што яму даручае Гарнік. Калі гаспадар не займаўся гаспадаркаю, лайдачыў, гэта азначала, што ён правініўся перад Бордзяю. Тады Паветнік па даручэнні Гарніка з'яўляўся перад ім у выглядзе хлопчыка і пагражаў разбурэннем гаспадаркі.

На думку навукоўцаў, раней у беларусаў існавала яшчэ адно боства шлюбу. Гэта ***Сулука***. Менавіта ёй, а не хрысціянскім персанажам, адводзіцца ў вясельных песнях сакральная функцыя «*салучаць*» маладых падчас вянчання:

*«Ехалі панічы страляючы,*
*Толькі адзін Аляксейка не страляець.*
*Быць яму, быць яму ў божым дому,*
*Дзе сам Бог суды судзіць,*
*Прачыста матушка перасуджваець,*
*Сын Божы вянец дзержыць,*
*Святая Сулука салучаіць».*

Існуе і такі міфічны персанаж, як ***Цярэшка***, які таксама мае адносіны да шлюбных пар, а дакладней да іх падбору. Пра гэта сведчыць старажытная беларуская гульня «*Жаніцьба Цярэшкі*», якая адбывалася ў калядную ноч і першапачаткова мела на мэце дашлюбнае знаёмства моладзі. Сутнасць абраду — згуляць жартаўлівае вяселле з імітацыяй вясельных абрадаў.

У спрошчаных варыянтах гэтая гульня захавалася да нашых дзён, цяпер яе можна назіраць дзе-нідзе на Віцебшчыне і Міншчыне. Цярэшка ў язычніцкія часы выступаў своеасаблівым ахоўнікам сям'і і дапамагаў маладым у каханні. У песнях на заручынах спяваецца: «*Цярэшка, цярэшухна, мой мілы пацешухна*» або «*Цярэшка, Цярэшачка! // К маей хаці сцежачка. // Бітая, топтаная, // Я ў мамкі каханая...*». Існуе шмат тэкстаў, дзе гаворыцца: «*Цярэшка валочыцца, // Бо жаніцца хочацца...*» Разам з тым вядома, што Цярэшка — імя казачнай драўлянай лялькі, якая ажывае на радасць бяздзетным бацькам. Такая акалічнасць гаворыць пра тое, што дадзены персанаж апекаваўся дзетараджэннем у сям'і і быў настолькі шануемы, што меў драўляную выяву — ідала.



*Паветнік (мастак В. Славук)*

Апроч добрых духаў, якія апякуюцца шчаслівым жыццём маладой сям'і, існаваў і злосны ***Яркун*** — вораг сямейнага жыцця. Паводле падання, раней ён сябраваў з Бордзяю і таксама апекаваўся сямейнікамі, але потым пасварыўся з ёю і назло ёй пачаў пераследаваць мужоў і жонак, чыніць паміж імі сваркі, уносіць усялякі разлад. Дарэчы, слова «*яркун*» азначае «*раўнівец*», ад чаго і пайшло выслоўе: «*Загрыз жонку сваю, як той Яркун*».

## Глава 3
# ДУХІ ПРЫРОДНЫХ АБШАРАЎ

Сваіх міфічных гаспадароў маюць не толькі дамы і гаспадарчыя пабудовы, але і разнастайныя прыродныя прасторы.

***Лясун*** або *Лесавік*, *Лешы*, *Лясны Дзед*, *Дабрахот*, *Дабрахожы* — адзін з найбольш значных персанажаў такога кшталту. Для продкаў ён быў увасабленнем лесу, прычым кожны лясны масіў меў свайго Лесавіка, які апекаваўся ўсімі звярамі і птушкамі ў сваім гаспадарстве. У народзе кажуць, што *«ён — звярыны пастух і вечна варагуе з паляўнічымі, усяляк адводзіць іх убок ад дзічыны і дапамагае заблукаць»*.

Лесавік — пярэварацень, ён мяняецца ў росце і набывае разнастайнае аблічча. Калі ён у лесе, то роўны самаму высокаму дрэву, калі ён знаходзіцца ў лузе ці полі, то робіцца роўны з травой і былінкай. А часам хаваецца пад травінку, кветку ці лісток дрэва, можа схавацца ў дупло і пад карані вывернутага бурай дрэва. Наогул, Лясун заўсёды прыстасоўваецца да навакольнага асяроддзя.

Нягледзячы на гэтыя пераўтварэнні, найчасцей ён паўстае ў вобразе старога з белым, як бяроста, ніколі не загарэлым тварам, з вялізнымі нерухомымі вачыма, якія ніколі не закрываюцца. Апроч таго, правае крысо ягонага жупана заўсёды захінае левае, і гэта не так, як заведзена звычайна ў мужыкоў, левы лапаць апрануты на



*Лясун (мастак Б. Забірохін)*

правую нагу, а правы на левую. А калі ён сядае, то заўсёды закідвае левую нагу на правую. Другія кажуць, што Лесавік мае сплюшчаны, рабром наперад, доўгі твар, доўгую — клінам — бараду, адно вока і адну левую нагу пятою наперад. Нягледзячы на тое, што гэты нячысцік бывае часам вельмі небяспечны для чалавека (можа прымусіць доўга блукаць па лесе, напалохаць, пазбавіць яго паляўнічай здабычы), ён можа і дапамагаць людзям. Таму, хто ставіцца з павагай да ляснога гаспадара, Лясны Дзед дапамагае знайсці згубленую скаціну, паказвае дарогу да борцей, ягадных і грыбных мясцін, падказвае месцазнаходжанне скарбаў і можа нават надаць знахарскія здольнасці.

Разнавіднасцю Лесавіка ў беларускай міфалогіі з'яўляецца яшчэ адзін лясны дух — ***Гаюн*** або ***Гаёвы Дзед***. Яго ўяўлялі ў выглядзе мядзведзя, што ходзіць выпрастаўшыся, як чалавек. Ён таксама, як і Лясун, пільна ахоўвае лес і ўважліва сочыць, каб ніхто не парушыў некранутага хараства гэтых уладанняў. Асабліва падазрона ён ставіцца да няпрошаных дрывасекаў. У былыя часы ніводзін чалавек не мог без дазволу Гаюна нарыхтаваць дрэва на будоўлю сваёй хаты. А каб атрымаць дазвол, трэба было надвячоркам у пэўным месцы ў лесе пакінуць на пяньку пачастунак Гаёваму Дзеду. Калі нараніцу гасцінец знікаў, гэта азначала, што лясны дух даў сваю згоду на высечку. У адваротным выпадку, трэба было пачакаць або шукаць іншае месца. Калі ж дрэва ў лесе пачыналі сячы без ведама Гаюна, а потым выкарыстоўвалі яго на будоўлю хаты, то лічылася, што яна не будзе даўгавечная і трывалая.



*Гаёвы Дзед і гаёўкі (мастак В. Славук)*



*Лесавая — жонка Лесуна (мастак Б. Забірохін)*

У Гаёвага Дзеда ёсць унучкі — ***Гаёўкі*** — міфічныя насельніцы лясоў і гаёў. З выгляду гэта звычайныя прыгожыя дзяўчыны з русымі косамі, толькі ўзімку яны пакрываюцца густой белай поўсцю, якая па вясне спадае. Гаёўкі любяць усё жывое і лечаць хворых звяроў і птушак. Але яны вельмі гарэзлівыя і непаслухмяныя, таму Гаюн забараняе выходзіць ім за межы лесу. Гаёўкі ведаюць, дзе квітнее Папараць-кветка, прыходзяць палюбавацца на яе цвіценне. Таму, хто шукае гэтую кветку шчасця, варта толькі неўпрыкмет высачыць гэтых гарэз.

Апроч Лесавіка і Гаюна продкі вылучалі ў асобную катэгорыю духаў і ***Пушчавіка***. Ён лічыўся гаспадаром пушчы — агромністага некранутага рукой чалавека лесу. Уяўляўся веліканам ростам з самае высокае дрэва, што дапамагала яму далёка бачыць наваколле. Затое з-за сваёй непаваротлівасці ён кепска бачыў, што ў яго рабілася пад нагамі, а гэта давала магчымасць схавацца, а потым незаўважна збегчы чалавеку, які заблукаў у пушчы. У адрозненне ад Лесуна, Пушчавік робіць адно толькі ліха, не шкадуе ні



*Пушчавік (мастак Б. Забірохін)*

старых, ні дзяцей, ні жанчын, ні знямоглых, ні нават свойскіх жывёл, якія заблукалі ў лесе. А робіць ён так таму, што помсціць людзям за тое, што тыя ўвесь час высякаюць лес, а яму даводзіцца сыходзіць усё далей і далей у самыя непраходныя *«пушчы-драмушчы»*.

У кожным вадаёме — рацэ, возеры, запрудзе, віру жыве свой гаспадар, якога звычайна называюць ***Вадзянік***, ***Вадзяны Дзед***, ***Амутнік***, ***Вірнік***, ***Ціхоня***. Апошні атрымаў такую назву з-за таго, што жыве ў асноўным у стаячых азёрах ці ставах. Апроч гэтага Вадзянік можа жыць на старых апусцелых вадзяных млынах ці шлюзах. Гэтая міфічная постаць нярэдка мела аблічча тапельца, аблепленага рачнымі водарасцямі.



*Вадзянік (мастак В. Славук)*

Але найчасцей ён меў выгляд глыбокага старога, з доўгай лапацістай барадою, з такімі ж доўгімі валасамі на галаве ў форме кліна, з расплывістым тварам, азызлым чэравам і непрапарцыйнымі нагамі, на якіх між пальцаў былі перапонкі. У забалочаных азёрах і ставах Вадзянік уяўляўся ўжо як гарбаты і барадаты стары з нагамі і хвастом, падобнымі да каровіных.

Убачыць яго можна было апоўдні або пасля заходу сонца апоўначы, а таксама пры святле месяца на беразе, камяні ці мосце, паблізу глыбокіх мясцін, на вадзяных колах. Пры гэтым ён высоўваўся з вады па пояс і палохаў прахожых: шлёпаў рукамі па вадзе, ляпаў у далоні, дзіка рагатаў, іржаў як кабыла або бляяў як баран.

Але асабліва небяспечным ён быў падчас або напярэдадні вялікіх свят: у Троіцкую суботу, калі квітнела жыта і душы памерлых знаходзіліся на зямлі, на Купалле ці Ілію. У гэты час Вадзянік праяўляў найбольшую актыўнасць: тапіў чаўны, ламаў вадзяныя млыны. Таму

ў такія дні, а таксама перад навальніцай забаранялася купацца. Калі тапельцаў доўга не было, Вадзянік высоўваўся з вады і крычаў: «*Рот есць, да некага есць*». Лічылася, што пасля гэтага нехта абавязкова патопіцца.



*Баламуцень (мастак В. Славук)*

Тым не менш, Вадзяны Дзед заўсёды спрыяў тым, хто займаўся рыбнай лоўляй. Толькі рыбакам дзеля гэтай падтрымкі трэба было абавязкова адрачыся ад сваіх родных і прынесці нячысціку ахвяру ў выглядзе жывой душы.

Немалымі паслугамі Вадзяніка карысталіся млынары, яны ў якасці ахвяры кідалі ў плаціну млына жывую курыцу або клалі пад першы лёд сцягно свінні. Гэтаксама нярэдка заключалі хаўрус з Вадзяніком пчаляры, за добрыя рої з пчоламі яны плацілі тым, што прыносілі нячысціку ў падарунак якога-небудзь хворага або знямоглага каня, якога адвозілі ў чоўне на сярэдзіну вадаёма і патаплялі.

Вадзяны, які праяўляў асаблівую цікавасць да зямных жанчын і ўсяляк заваблівау іх да сябе, называўся ў народзе ***Баламуцень***. Ён лічыўся халасцяком, але час ад часу набліжаўся да тых мясцін, дзе жанчыны купаліся або мылі бялізну. Калі ён падыходзіў да сваёй абранніцы і напускаў на яе чары, кабета або дзяўчына паслухмяна ішла за нячысцікам і зусім не бачыла ягонай пачварнасці: азызлага твару, на якім амаль не было відаць вачэй, гусіную скуру, кароценькія, тоненькія і крывенькія ножкі, вялізны жывот. Тым не менш верылі, што Баламуцень ніколі не бярэ жанчын назаўсёды, пабавіўшыся з імі, ён адпускае іх дадому, пасля чаго яны набываюць здольнасць не тануць.

Апроч мужчынскіх вадзяных персанажаў у беларускай міфалогіі існуе шмат жаночых. Гэта ***Вадзяніцы***, ***Азярніцы***, ***Свіцязянкі***, якія водзяцца пераважна ў азёрах і рэках, і такія, як ***Сарэны***, ***Яваркі*** і ***Ядзеркі***,

асяродкам пражывання якіх з'яўляецца мора. Усе яны, нягледзячы на розныя найменні і вадаёмы свайго пражывання, вельмі падобныя па сваіх характарыстыках і розняцца толькі дэталямі.

Больш за ўсё аповядаў пра ***Русалак***, якіх у народзе называюць таксама *Вадзяніцамі*, *Купалкамі*, *Каўкамі*, *Казыткамі*. Гэта душы дзяўчынак, якія былі праклятымі сваімі бацькамі яшчэ ў матчыным чэраве ці былі загубленыя сваімі маткамі неўзабаве пасля нараджэння ў вадзе, альбо маладыя тапельніцы, што скончылі жыццё самагубствам. Русалкі заўсёды паўстаюць дарослымі дзяўчатамі, з доўгімі распушчанымі русымі валасамі і з целам зямлістага колеру, пакрытым не скураю, а нечым цвёрдым, накшталт пазногцяў. Таксама казалі: «*Кожная дзеўка, што памрэ ў Русальным тыжні, на том свеце жыве Русалкаю, а ходзіць з вянком на галаве голая, штоб відно было, што яна яшчэ не саграшыла*».

Лічыцца, што Русалкі жывуць на дне вадаёмаў, але толькі з восені да Русальнага тыдня. У першыя дні Сёмухі яны выходзяць з вады і селяцца на дрэвах, асабліва на бярозах, гойдаюцца на іх гнуткіх галінках і заманьваюць падарожных да сябе. А калі хто здуру падыдзе да іх блізка, то заказычуць яго да смерці. Ад жудасных Русальчыных позіркаў можна назаўсёды скасавурыцца. Асабліва часта нападаюць Русалкі на маладых мужчын, бо бачаць у іх сваіх былых каханых, якія пры жыцці здрадзілі ім, таму помсцяць за гэта.



*Русалкі (мастак Б. Забірохін)*

На думку продкаў, самы лепшы сродак засцерагчыся ад гэтых духаў — паказаць ім што-небудзь сталёвае. Тады яны, нібыта змяя ад медуніцы (трава з моцным пахам), адразу ўцякаюць. Пакуль Русалкі не выйдуць з вады, лічыцца небяспечным купацца, таму што можа

прычапіцца якая-небудзь хвароба, або Вадзяніцы зацягнуць да сябе ў глыбіню і ўтопяць. Падчас Русальнага тыдня Русалкі могуць бавіцца і ў жыце або ў гаросе, таму дзяцей палохаюць імі, каб туды не хадзілі. Верылі, што падчас святкавання Сёмухі — самы разгул Русалак, нельга было і працаваць: гарадзіць плот, рабіць барану, бо ўгневаныя Русалкі перанясуць сваю злосць на кароў і коней.



*Лознік (мастак В. Славук)*

Існуе яшчэ адзін дух вады, вельмі падобны да Русалкі, але ў адрозненне ад яе, увесь час трымае на руках маленькае дзіцё, якое, каб не плакала, калыша на назе. Гэта ***Расамаха***. У такога нячысціка ператваралася тая жанчына, якая забіла сваё дзіцё і потым утапілася. Убачыць яе можна каля вады на *«бабровай хатцы»*, дзе яна расчэсвае свае доўгія валасы шчупаковым грабянцом. Імем Расамахі з-за яе ўвесь час раскудлачаных валасоў і неахайнага выгляду сталі потым называць неакуратных жанчын.

Балота таксама лічылася месцам жыхарства нячыстай сілы. Адным з самых пачварных нячысцікаў, якія вадзіліся ў балоце, быў ***Балотнік***. Ён бачыўся страшэнным бязвокім таўстуном, да якога абы як наліпла багавінне і вадзяная жамяра. У адрозненне ад другіх нячысцікаў, ён не можа мяняць сваё аблічча і таму спакойна чакае сваю ахвяру, якую зазывае да сябе рознымі галасамі птушак і жывёл.

Дапамагаюць Балотніку заманіць да сябе ахвяру ***Лознікі***, якія жывуць у густых кустах пераплеценага лазняку. Больш дзеля забавы, чым са злосці яны заблытваюць у куст лазы небараку і прымушаюць яго праваліцца ў прыхаванае вадзяное акенца ў багне.

Нячысцік, які жыве ў тарфяным балоце, не пакрытым расліннасцю, завецца ***Багнік***. Ён бруднейшы за Балотніка і ніколі не выходзіць на паверхню балота, нават тады, калі ахвяра патрапіла ў багну і тоне ў брудзе, таму што ўпэўнены, што яна нікуды ад яго не падзенецца. Пра ягонае знаходжанне ў балоце можна здагадацца па бурбалках над паверхняй багны і дробненькіх агеньчыках, што свецяцца ўначы. Ён, як і Балотнік, баіцца асушэння балота, калі вычэрпваюць багністую гразь на паліў градаў ці ўгнаенне. Калі вада сыходзіць падчас засушлівага лета, нячысцік не можа выбрацца з балота, і ягонае жытло робіцца ягонай магілаю.



*Аржавень (мастак В. Славук)*

Багністыя мясціны, якія нібыта пакрытыя іржой, маюць сваім гаспадаром ***Аржавеня***. Нават узімку ён не можа схаваць свайго жытла, яго выдаюць брудныя бурыя плямы з-пад снегу і лёду. Выглядам ён падобны на ўсіх балотных нячысцікаў, толькі ў адрозненне ад іх мае яшчэ больш тоўсты жывот і тонкія, быццам сцябліна хвашчу, ногі. У дадатак да ўсяго ён увесь час адрыгае і кашляе, чым выклікае агіду не толькі ў жывых істот, а і ў астатніх нячысцікаў.

У некаторых рэгіёнах Беларусі нячысцік, які жыве ў іржавым балоце, а таму багатым на жалезную руду, меў выгляд агромністага волата на імя ***Жалезны Чалавек***. Лічылася, што ён ахоўвае свае ўладанні — балота і навакольны лес. Ім часта палохалі дзяцей: «*не йдзі ў лес, бо там у болоці такі зелезны чоловек ходзіць да ўхопіць цебе*».

Яшчэ адна істота, якой пужалі маленькіх і непаслухмяных дзяцей, якая нібыта жыве за лесам пасярод балота ў нары пад карчом, называецца ***Хапун***. Гэта быў невялічкі скурчаны дзядок з доўгай сівой барадою і з вялікай, большай за яго самога, торбаю. У гэтую



*Хапун (мастак В. Славук)*

торбу ён саджаў капрызлівых дзяцей, якіх выглядаў, лётаючы ў паветры. Ніхто таго нячысціка ніколі не бачыў, бо ён нябачны, і нікому са схопленых ім дзяцей не ўдалося яшчэ ўцячы ад яго. Верылі, што калі тыя дзеці вырастаюць, яны таксама робяцца Хапунамі.

Апроч мужчынскіх міфалагічных персанажаў, якія насяляюць балотныя нетры, асабліва вылучаецца жаночы. Гэтая істота мела раскудлачаныя валасы, вялікія адвіслыя грудзі і імя ***Лойма***. Яна, як і

Хапун, таксама хапала дзяцей. Толькі яе ахвярамі рабіліся звычайныя немаўляты, якіх яна выкрадала ў няўважлівых матак і падмяняла іх сваімі ўласнымі чарцянятамі, брыдкімі і непрыгожымі. Такое падменнае дзіця раілі пакласці пры заходзе сонца на парозе і біць асінавымі дубцамі, пакуль чарціха не прыйдзе па яго. Тады яна вяртала назад чалавечае дзіця і дакарала кабету: «*Я тваё так пеленгавала, а ты маё б'еш*».

Пра міфалагічных духаў поля захавалася не менш павер'яў. ***Палявік***, або ***Палявы***, апякун палёў і лугоў, часам атаясамліваўся з працаўніком-хлебаробам. Выглядаў як сівы стары ў доўгай свіце, лапцях і з кіем у руках.

Паводле некаторых меркаванняў, ён заўсёды спрыяе дбайным працаўнікам. Так, у адным паданні расказваецца пра тое, як Палявік сустрэў двух галодных падарожных, якія папрасілі ў яго хлеба. Тады апякун поля загадаў паказаць ім свае рукі. Апынулася, што ў аднаго з падарожных рукі былі шурпатыя і з мазалямі, а ў другога — гладкія і далікатныя. Вось гэтаму апошняму Палявік і адмовіў у просьбе, а першаму дазволіў узяць хлеба столькі, колькі той зможа ўнесці. У другіх выпадках Палявік набывае аблічча пачварнага прывіду, выступае злосным помслівым дэманам, які знішчае палявую гаспадарку селяніна. Тады ён разбурае загарадкі, заманьвае скаціну ў шкоду, наганяе на яе ваднёў і сляпнёў або проста дзеля забавы прыгінае да зямлі збожжа і траву, скручвае і псуе расліны, адганяе дождж. Можа і падманам залагодзіць чалавека ласкаю, а потым знянацку наслаць на яго сонцапёк і забіць на месцы.



*Лойма (невядомы мастак)*

Падобным на злоснага Палявіка, якім продкі палохалі дзяцей, каб тыя не таптала жыта, з'яўляецца дух жытняга поля — ***Русавы Дзед***. Гэта босы стары, з доўгімі валасамі і барадой, апрануты ў доў-

гую кашулю, падперазаную перавяслам. Ён цікуе за адзінокімі людзьмі, якія выпадкова зайшлі ў жыта, і потым душыць іх.

Вельмі падобная на гэтага духа па сваіх варожых адносінах да людзей дэманічная істота ***Русаўка***, або ***Жалезная Баба***. Яна з'яўляецца разнавіднасцю Русалкі, якая, выходзячы з вады на Русальным тыдні, пасяляецца на ніве і сцеражэ жытняе поле, каб дзеці, што збіраюць кветкі, не атрасалі пылок з каласоў, калі *«жыта красуе»*. Яе ўяўлялі нізкарослай кудлатай старой з жалезнымі вялікімі грудзямі, якімі яна душыла непаслухмяных дзяцей або выпадковых прахожых. Пра яе казалі, што яна хапае жалезным круком дзяцей, якія асмельваюцца заходзіць адны не толькі ў палі, але і агароды, каб паласавацца бобам, гарохам, макам і ўвогуле гароднінай, кідае іх у сваю жалезную ступку, таўчэ і есць.



*Палявік (мастак Б. Забірохін)*

Апроч злосных і варожых духаў поля існуе шэраг добразычлівых, якія спрыяюць багатаму ўраджаю жыта і клапоцяцца пра дабрабыт сялянскай гаспадаркі. Гэта ў першую чаргу ***Бялун*** — сівы дзед, які нібыта жыве ў жыце каля дарогі: *«Ён, кажуць, паказваецца бедняку, што ідзе па дарозе, і просіць яго ўцерці яму нос, з каторага цякуць возгры; калі той згадзіцца да ўтрэць, то Бялун высыпе яму золата із сваёй торбы»*.

Такога персанажа як ***Жыцень*** некалі лічылі боствам восені, дзякуючы якому выспявала збажына і агародніна. Верылі, што ў яго тры вокі, адно з якіх на патыліцы. Таму ён заўсёды бачыць, ці добра прыбраны ўраджай на нівах. Калі ён знаходзіць шмат каласкоў, пакінутых нядбайнымі гаспадарамі, дык падыходзіць да іх і грозіць пальцам, што азначае неўраджай у будучым. Перад беражлівым і старанным гаспадаром Жыцень можа з'явіцца ў абліччы жабрака,

папярэджваючы яго такім чынам пра галодны і неўраджайны год, і дае таму такім чынам магчымасць падрыхтавацца да небяспекі.

У аснове такіх міфалагічных вобразаў, як ***Спарыш*** і ***Спешка-Спарышка***, знаходзяцца язычніцкія ўяўленні беларусаў пра продкаў, ад якіх залежаў дабрабыт земляроба. Першы вобраз абагаўляўся і мог набываць як чалавечыя абрысы, так і звярыныя, якія ў народнай традыцыі лічыліся душамі памерлых. Да яго звярталіся са словамі падзякі-малітвы:



*Жыцень (мастак В. Славук)*

*«Дзякуй, Спарышачнік,*
*Што па полю хадзіў,*
*Што па полю гуляў,*
*Маладых жней прыганяў».*

Спешка-Спарышка таксама была ўвасабленнем спору ў земляробчай працы і абрадах. Яна была апякункай жніва, якую смаленскія беларусы бачылі ў вобразе чалавека і звярталіся да яе з просьбай:

*«Спешка-Сапуришка. Оббеги кругом постатю, помоги мне жати и приходи ко мне полудновать со своей краюшкой».*

## Глава 4
## ДУХІ ХВАРОБ

Паводле народных вераванняў, чалавек хварэе не проста так, хваробы насылаюць на яго асаблівыя дэманы і розная нячыстая сіла — чэрці, ведзьмакі, людзі з ліхім вокам. Дэманаў хваробы ўяўлялі сабе па-рознаму: у абліччы жанчыны ў белай, чырвонай або чорнай вопратцы; прыгожай дзяўчыны з даўгімі валасамі; пачварнай бабы з кашчавымі рукамі, ашчэранымі зубамі і агністымі вачыма. Часам тыя дэманы маглі мець выгляд жывёл: сабакі, коткі, начной птушкі, мухі або матылька.

Да прыкладу, ***Воспа***, або ***цётка Воспіца***, ***Ліхая***, ***Рабуха***, ***Шчарбачка*** — гэта злосная агідная жанчына з пухірамі замест вачэй і адным моцным зубам, які тырчыць вонкі. Яна пырскае сваёю атрутнаю слінаю ў выбраную ахвяру, з-за чаго на твары ў той застаюцца сляды гэтай хваробы. Пра такога чалавека ў насмешку казалі, што на яго твары чэрці гарох малацілі ці ячменныя крупы дралі. Часам Воспіцу бачылі ў абліччы падарожнай кабеты, якая разносіць па свеце хваробу, але яна аберагае тыя хаты, дзе ёй далі прытулак.

Такая хвароба як ***Халера*** уяўлялася ў самых розных вобразах. З аднаго боку гэта была прыгажуня, якая час ад часу махала на вёску з-за могільніка чырвонай ці чорнай хусткай, ад чаго людзі *«мруць як мухі»*. З другога боку яе бачылі жахлівай жанчынай з доўгімі светлымі валасамі і бліскучымі вачыма, якая ўвесну, нібыта сеючы, вымае з невычэрпнага кошыка зерне хваробы, перамешвае яго з агародным насеннем і раскідвае паўсюль на вялікую адлегласць. У другіх выпадках гэтая хвароба выступала ў выглядзе хударлявай жанчыны, апранутай ва ўсё чорнае; або кабецінай на каровіных нагах, якая перасоўваецца на тройцы вараных коней і нюхае тытунь. І дзе

яна з'явіцца, там народ пачынае адразу паміраць. Некаторыя бачылі хваробу худым мужыком, што ходзіць уначы па хатах і атручвае ежу ці пітво, якія пакінулі непрыкрытымі.

А бывала і так, што Халера прымала выгляд беднай вандроўнай жабрачкі, якая прасіла каго-небудзь з вяскоўцаў падвезці яе да вёскі, а калі тыя гэта рабілі, яна пачынала *«касіць старых і малых»*. Таму, каб яна не прабралася ў вёску, на перакрыжаванні дарог раскладалі ахоўны агонь, здабыты трэннем дрэва аб дрэва. Вельмі дзейсным сродкам супраць хваробы лічыліся ручнікі-абыдзённікі, якія трэба было напрасці і выткаць за адну ноч ці за адзін дзень, потым закапаць па баках вёскі і на тым месцы паставіць крыж. Існавала і такое павер'е: быццам таго, хто першы захварэў на Халеру, трэба было абавязкова пахаваць жыўцом, і тады разам з ім «пахаваецца» сама хвароба.



*Воспа (мастак В. Славук)*

На Беласточчыне Халеру называлі ***Марай***, якая ўяўлялася ў выглядзе бязважкай кашчавай кабеты з кароткімі нагамі, ухутанай у белае адзенне. Лічылася, што Мара любіць душыць сонных людзей уначы, перашкаджаючы ім дыхаць, прычым яна час ад часу адпускае ахвяру, каб нацешыцца яшчэ большымі яе пакутамі пасля перадыху. Адзіны сродак пазбавіцца ад Мары — згадаць, што пакуты адбываюцца ў сне, а не наяве. Тады пакутнік прачынаецца, і Мара знікае. Але, як гавораць, дадумацца да гэтага могуць толькі састарэлыя людзі, да якіх, дарэчы, Мара чапляецца вельмі зрэдку. Каб адагнаць хваробу ад людзей, купляюць не гандлюючыся, новы гладыш і ўночы палююць на Мару, спрабуючы загнаць яе ў збан. Ёсць і другі спосаб: трэба запрасіць Мару на снеданне і пакласці на парозе крыж-накрыж мятлу і сякеру.

Больш за ўсё апаведаў і паданняў прысвечана ***Ліхаманкам*** — дэманічным постацям хваробы, якіх уяўлялі ў выглядзе 7, 9, 12, 33, 40 і нават 77 сясцёр. Звычайна Ліхаманкі жывуць у рэках і балотах, але час ад часу лётаюць па паветры ў выглядзе мушак або парушынак і трапляюць у ежу. Хто яе пакаштуе, той захварэе на ліхаманку. А бывае, што ў абліччы маладых і спакуслівых жанчын або, наадварот, ліхіх, хударлявых і пачварных старых яны ходзяць па начах, грукаюцца ў вокны, клічуць людзей на імя — хто адгукнецца, да таго яны і чапляюцца і прыносяць страшэнныя пакуты.

Кожная з сясцёр мае сваё імя па тым уздзеянні, якое яна аказвае на чалавека. Сярод іх ***смяротная***, якая выклікае смерць; ***нутраная*** паражае вантробы; ***павярхоўная*** выклікае скураныя хваробы; ***касцявая*** суправаджаецца ламотаю ў касцях; ***пудовая*** з'яўляецца ад перапуду; існуюць ***веснавая*** (*сонная*, *гарачая*, *мокрая*, *губастая*, *пякучая*, *ліхучая*, *жоўтачка*) і ***восеньская*** (*сцюдзяная*, *вадзяная*, *сінючая*); ***гарохавая*** праяўляецца падчас цвіцення гароху; ***асінавая*** сядзіць на асіне і трасе яе; ***агнявая***; ***лёдавая*** і г.д. Этнографамі зафіксаваны таксама назвы *Трасца*, *Хіндзя*, *Хондзя*, *Незбудзь*, *Фыбра*, *Цётка*, *Шуня*, *Варагуша*, *Ірадава дачка*... Апошняя назва пайшла ад падання, паводле якога, ліхаманкі лічацца дочкамі цара Ірада, якія праваліліся пад зямлю за грэх свайго бацькі, заклятага Богам за смерць Яна Хрысціцеля. З тых часоў яны служаць Д'яблу, які насылае іх на людскія пакуты.

Каб засцерагчыся ад Ліхаманак, дэманаў намагаліся падмануць. Так, у хаце зачынялі вокны і дзверы, а на паркане пра хворага пісалі вугалем: «*Яго няма дома, паехаў*». Думалі, што якая-небудзь з сясцёр-Ліхаманак прачытае гэты надпіс, паверыць і абыдзе хату бокам. Ад хвароб ратаваліся і абворваннем паселішча, або стварэннем ахоўнага *магічнага кола*, праз якое хвароба нібыта не асмеліцца пераступіць.

Таксама, каб пазбавіцца ад хваробы, прыносілі ёй своеасаблівую ахвяру ў выглядзе варанага яйка ад чорнай курыцы. Яго, паводле колькасці ліхаманак, дзялілі на 33 або 77 частак і кідалі на раздарожжы ці ў балота, прыгаворваючы: «*Ёсць тутыцька вас 77, наце вам вячэру ўсем!*». Потым трэба было збегчы ад гэтага месца, не азіраючыся. Лічылася, што сёстры-Ліхаманкі накінуцца на прынесеную ахвяру, кожная атрымае сваю долю і не будзе параследаваць людзей. Каб не захварэць на ліхаманку, насілі з сабой у якасці абярэгаў і вялікоднае яйка, і галаву змяі, і жывога кажана, і пярсцёнак з цвіка ад труны...

Ліхаманку так баяліся, што не асмельваліся нават сварыцца на яе і ўсяляк улагоджвалі, пакланяліся ёй. Так, на Дзяды «*Трасцухну-матухну*» нават клікалі на вячэру, каб ушанаваць і не наклікаць яе гнеў. Пра яе казалі: «*Няхай яна здаровенькая і вясёленькая ходзіць*».

Дэман хваробы ***Чума***, або ***Мор*** ці ***Чорная Немач*** таксама ўяўлялася ў выглядзе жанчыны, толькі яна была ўзброена вогненнымі стрэламі, а складкі яе белага адзення шырока разгортваліся і закры-



*Мара (мастак В. Славук)*

валі ззянне месяца. Яна перасоўвалася па паветры ў выглядзе цёмнай птушкі, найчасцей пугача ці савы, і, набліжаючыся да вёскі, вызначала сабе ахвяру — чалавека, які ішоў па дарозе. Дэман пачынаў стагнаць і клікаць падарожнага па імені, каб той азірнуўся назад. Але гэтага ні ў якім разе нельга было рабіць, трэба, не азіраючыся чытаць малітву і рухацца наперад. Іначай Чума праткне сваёю стралой небараку, чорная атрута патрапіць у кроў, і чалавека напаткае смерць. Лічылася, што дэман не пераносіць крыку пеўня і брэху сабакі, таму, калі ў вёску прыходзіла эпідэмія чумы, там не было чутно ні таго, ні другога.



*Ліхаманкі апаноўваюць (мастак Б. Забірохін)*

А такая пошасць і эпідэмія, якая ахоплівала людзей і жывёл, у выніку чаго наступала павальная смерць, таксама мела розныя дэманічныя аблiччы і называлася ***Паморак***. Яна выступала як у зааморфных вобразах ката ці сабакі, так і антрапаморфных: старой і худой жанчыны; або маладзіцы, у якой вуж смокча грудзі; або старога аднавокага дзеда з калматаю барадою і г.д.

Верылі, што ў чалавечым абліччы Паморак, як і ўзгаданая вышэй Халера, усяляк намагаўся патрапіць у незаразныя яшчэ паселішчы, выкарыстоўваючы іх жыхароў. Тады ён прасіў падвезці яго на возе ці пераправіць на лодцы праз раку. Калі хто-небудзь выконваў такую просьбу, то Паморак нікога не шкадуючы лютаваў у чарговай вёсцы. Калі ж вясковец здагадваўся, з кім ён мае справу, ён падманным шляхам заводзіў дэмана ў балота, дзе і тапіў яго, або скідваў у вогнішча, распаленае ад трэння двух асінавых калоў. Такія вогнішчы гарэлі дзень і ноч па ўсіх канцах вёскі і ахоўвалі яе ад Паморка. Апроч таго, той агонь давалі ва ўсе хаты, дзе ён не пераводзіўся на працягу года.

Час ад часу, калі хвароба асабліва жорстка касіла ўсіх без разбору, ёй прыносілі ахвяру: закопвалі жывым у зямлю каго-небудзь з людзей, найчасцей гэта была сірата. Калі ж высвятлялі, што вінаваты ў эпідэміі ўжо памерлы і пахаваны чалавек, то, каб пазбавіцца ад пошасці, раскопвалі ягоную магілу, адсякалі нябожчыку галаву, клалі яе паміж ног і зноў закопвалі. Такія выпадкі выяўлены археолагамі ў курганных пахаваннях XI–XII стст.

Дэман, які ўсяляўся ў чалавека, «*кідаў яго на зямлю*» і прыносіў яму невыносныя пакуты, называўся ў нашых продкаў ***Радзімец***. Так азначалі дзіцячыя паралюшы, якія суправаджаліся эпілептычнымі прыпадкамі, прычым яны лічыліся даволі распаўсюджанаю з'явай. Каб пазбавіцца ад такога злоснага дэмана, напалохаць яго, дзіця клалі пад ночвы і білі над ім гаршчок або «*забівалі*» Радзімца у зямлю тым нажом, які дагэтуль быў уторкнуты над галавою хворага на падучую.

Таксама выкарыстоўвалі падман: хворага на радзімец дзіцёнка выносілі за акно. Лічылася, што, пачуўшы дзіцячы крык за акном, дэман пойдзе шукаць дзіця, а пакуль ён будзе выходзіць за дзверы, дзіцёнка трэба хутчэй занесці назад і зачыніць акно. Радзімец тады пойдзе шукаць хворага ў двары, потым пойдзе па другіх хатах, пакуль не знойдзе сабе другога дзіцёнка.


*Паморак (мастак А. Навіцкі)*

Злосны дэман эпілепсіі таксама патрабаваў ахвяр. Калі дзіця пакутавала на канвульсіі, ягоная маці павінна была разрэзаць сабе мезенец на левай руцэ і атрыманай крывёю абмазаць вусны і зубы хворага. Або, калі ў хворага пачынаўся прыступ, над ім трымалі маладую курыцу і забівалі яе, як толькі прыступ заканчваўся. Тады цёплай крывёю ку-

рыцы мазалі хвораму грудзі, рот і зубы і чакалі, пакуль той прыйдзе ў сябе. У другіх выпадках выкарыстоўвалі кроў ката, крата ці пеўня.

Часам персаніфікацыя эпілепсіі мела назву ***Кадук***, ад лацінскай назвы *cadicus — «падучы»*. Хворыя на эпілепсію лічыліся апантанымі нячыстай сілай, што пранікала ў нутро чалавека, ад чаго ў таго пачыналіся сутаргі і канвульсіі, ён скрыгатаў зубамі і страчваў прытомнасць. Сваім выглядам Кадук нагадваў капу сена ці кучу моху, якія могуць напалохаць чалавека сваім неспадзяваным рухам. З-за таго, што на эпілепсію цярпелі ў асноўным нованароджаныя немаўляты, замацавалася народнае павер'е, згодна з якім Кадук з'ядае жывых маленькіх дзяцей, што вядзе да знішчэння сямейнага жыцця і працягу роду. Вера ў гэтага дэмана хваробы была пашырана ў сярэднявечнай Беларусі ва ўсіх сацыяльных пластах грамадства. Больш за тое, гэта было нават зафіксавана ў звычаёвым праве, паводле якога кароль Рэчы Паспалітай «*па праву Кадука*» забіраў у свае ўладанні тыя маёнткі, гаспадары якіх згубілі сваіх спадкаемцаў з-за гэтай хваробы. Сляды тых вераванняў захаваліся ў беларускім праклёне: «*Вазьмі яго Кадук!*»

Калі ж дзіцёнак ніяк не мог уначы заснуць, а па незразумелай прычыне напружана і доўга крычаў, лічылася, што дзіцячым цельцам завалодаў дэман хваробы на імя ***Крыксы***.

> «Крыксы — гэто такая хвароба, калі дзіця без жоднае прычыны, так сабе з добрага раю крычыць аж пукаецца. Іншае так крычыць, што накрычыць сабе пуп ці кілу».

Верылі, што нячысцік жыве ў хаце і хаваецца за печчу, пад парогам, па кутах хаты або адразу за яе дзвярыма — у куратніку ці на сметніку. Іншымі словамі, адносіцца да ліхіх хатніх духаў. Згодна з запісамі этнографаў XIX ст., «*крыкса — ена махонькая і не відаць, як праскоціць*».

Паводле другіх характарыстык, гэта нешта дакучлівае, якое «*нападае*» на дзіця і якое трэба выгнаць, аддаць, выкурыць, адправіць у лес і г.д. Так, Крыксы можна было адаслаць у куратнік, аддаць курам, як тое, што ім належыць: «*Засылаю вас, крыксы, дзе куры сядзяць, не крычаць*». А можна было адправіць да пацукоў ці мышэй: «*З-пад печы крысы, забярыце майго дзіцяці крыксы*». А каб працэс выгнання-аддавання адбываўся хутчэй, трэба было задобрыць небяспечнага дэмана. Дзеля гэтага хлеб-соль загортвалі ў белую анучку, перавязвалі чырвонай ніткай, усім гэтым гладзілі дзіцячую галоўку і падкідалі з паклонам пад печчу:

«Крыксы-крыксы, дарую я вас хлебам-соллю, белай рубашачкай, красным паясочкам — даруйце майму дзіцяці добрае здароўе і сон».

Міфічныя істоты, якія таксама перашкаджалі малым дзецям спаць і дакучалі ім, былі вельмі падобныя да Крыксаў і называліся ***Начніцамі***. У іх ператвараюцца пасля сваёй смерці тыя жанчыны, якія былі праклятымі людзьмі пры жыцці і з-за гэтага не мелі дзяцей. Уначы Начніца залазіць у калыску ці пад яе, пачынае казытаць і шчыпаць немаўлятку, ад чаго тое не спіць і крычыць. Апроч таго яна корміць дзіця сваімі грудзьмі, дзе замест малака атрута, пасля чаго дзіцёнак хварэе, «*мэнчыцца, а як не дагадаюцца чым лячыць, то і ўмірае*». Каб пазбавіцца ад Начніцы, трэба з брудных ануч нарабіць лялек, паставіць іх на кожным акне па дзве-тры і сказаць: «*Глядзіце, лялечкі, каб мой маленькі спаў!*». Пасля гэтага Начніцы знікнуць.

Варожага духа, які насылае на людзей вар'яцтва, пазбаўляе свядомасці і ператварае ў розных жывёл, у народзе называлі ***Лядашчык*** (*Лядашчік*, *Шэўрадзь*, *Псуцень*). Бачыўся ён у выглядзе крылатай і аднавокай пачвары, поўнасцю пакрытай рудымі валасамі. Паводле вераванняў, гэты нячысцік вельмі не любіць жанчын і больш за ўсё шкодзіць менавіта ім за тое, што яны нараджаюць дзяцей. Таму Лядашчык імкнуўся патрапіць у цела і душу дзіцёнка, каб сапсаваць яго, зрабіць капрызлівым. Нездарма такія словы, як «*ледачы*» або «*лядашчы*» у розных мясцінах Беларусі азначае або «разбэшчаны», або «дрэнны і непаслухмяны». Дзякуючы старажытным уяўленням



*Лялькі-ліхаманкі-трасавіцы ў звязцы (народныя лялькі)*

пра гэтага дэмана, у беларускай мове захаваліся выслоўі кшталту: «*З лядашчыкам спазнаўся, з розуму спаўся*», ці «*лядашчыкава вока*», што азначала дрэннае вока.

Персаніфікавалася і набывала дэманічныя якасці і такая небяспечная хвароба, як ***Каўтун***. У чалавека, які пакутаваў на яе, былі збітыя і зблытаныя ў адзін ком валасы, апроч гэтага, ён адчуваў рэўматычны боль, сутаргі і ламоту ў касцях. Цярпелі на каўтун у асноўным палешукі, якія жылі сярод балот, дзе быў своеасаблівы вільготны клімат, адсутнічала належная гігіена, і ўсё гэта ў спалучэнні з цяжкай працай. Да хваробы адносіліся як да жывой істоты і верылі, што са зрэзанага Каўтуна крапае кроў, ён можа перамяшчацца па целе і, як і ўсё жывое, мае свой тэрмін існавання. Знахар, які браўся лячыць Каўтун, чытаў над хворым замову, дзе хваробу выганялі паслядоўна з галавы, вачэй, броваў, рук, ног, крывяносных жыл і адпраўлялі «*на цёмныя лясы, на мхі, на балоты, туды, дзе сабакі не брэшуць, пеўні не крычаць, званы не званяць*». Разам з тым, каб залагодзіць хваробу, да яе звярталіся з кампліментамі: «*Каўтуночак-галубочак*», «*Каўтун — добры чалавек*», «*Каўтун-каўтуніца, брат і сястрыца па садочку хадзілі, вяночкі звівалі*». Продкі лічылі, што Каўтун бывае мужчынскага роду, калі валасы звіваюцца ў космы, і жаночы — у выглядзе шапкі. А ў некаторых замовах супраць гэтай хваробы вылучаецца нават сацыяльная іерархія: «*Старшы каўтун, унімай сваіх слуг!*».

Дух, які носіцца ў паветры або круціцца ў віхры і насылае на людзей асаблівую хваробу, называюцца аднолькава — ***Падвей***. У народзе кажуць: «*Наляціць віхор на чалавека — і скруціць яму галаву набок, адніме мову, а то скурчыць руку ці нагу*». Выратавацца ад яго можна было толькі тады, калі пакажаш дэману кукіш, верылі, што Падвей гэтага не любіць і праімчыцца бокам, не закрануўшы чалавека.

## Глава 5
## НАПАЎЛЮДЗІ-НАПАЎДЭМАНЫ

Беларуская міфалогія багата на шматлікія паданні і павер'і пра тых людзей, якія добраахвотна або прымусова атрымалі магічныя веды і ўступілі ў кантакт з нячыстай сілай. Пры дапамозе апошняй яны атрымалі здольнасць уплываць на прыроду, стыхіі, атмасферныя з'явы, ураджай, здароўе, пладнасць людзей і жывёл. Гэта ваўкалакі і другія пярэваратні, ведзьмакі і вядзьмаркі, чараўнікі і чараўніцы, знахары і знахаркі. Свае таленты яны могуць выкарыстоўваць

як на карысць, так і на шкоду звычайным людзям. Аднак за гэтыя звышнатуральныя здольнасці яны часцяком расплачваюцца асабістай душой і пасля смерці на тым свеце не маюць супакою.

Перш за ўсё гэта ***вядзьмарка***, або ***ведзьма*** — *«тая, што валодае веданнем, ведаўствам»* (ад старажытнаславянскага дзеяслова *ведаць*). У народзе вядзьмаркай называлі жанчыну, якая нібыта мела звышпрыродныя здольнасці, найчасцей — шкоднасныя. Таксама верылі, што ведзьмы бываюць *народжаныя*, якія ведаўство атрымалі ў спадчыну, і *навучаныя* — яны па асабістым жаданні склалі дамову з нячысцікам. Пры гэтым народжаная вядзьмарка ведае больш і можа як шкодзіць, так і дапамагаць людзям, а навучаная робіць толькі ліха і не можа выправіць шкоду, зробленую нават ёй самой.

Ведзьмай ад нараджэння рабілася дачка вядзьмаркі або дзяўчынка, народжаная па-за шлюбам у другім ці трэцім пакаленні — тая, чые маці і бабка таксама былі пазашлюбнымі дзецьмі. Навучанымі вядзьмаркамі робяцца тыя жанчыны, што добраахвотна паступілі на вучэнне да старой ведзьмы. Перад тым, як прыняць новую вучаніцу, старая вядзьмарка рабіла ёй іспыт: жанчыны бралі па кавалку хлеба або тварагу, ішлі ў патаемнае месца, дзе кожная клала свой кавалак на белую анучу. Праз некаторы час да хлеба, які належаў старой, прыпаўзалі змеі, жабы, яшчаркі, мышы і раздзіралі яго на дробныя кавалкі. Хлеб звычайнай жанчыны пры гэтым ніхто не кранаў. Тады старая ведзьма казала: *«Як раздзіраюць мой хлеб, так будуць раздзіраць маю душу пасля смерці. А твой хлеб пакуль цэлы, як і твая душа»*. Калі вучаніца палохалася такой пасмяротнай долі, яна магла адмовіцца ад навучання, а калі яе гэта не пужала, старая пачынала вучобу.

Але ж канчаткова жанчына робіцца ведзьмай толькі тады, калі пазнаёміцца з Чортам. Той або ўсяляўся ў яе, або служыў ёй, або быў яе сужыцелем. Чорт абавязкова складаў дамову з ведзьмай, згодна з якой душа ведзьмы пасля яе смерці дастаецца нячысціку. Таксама лічылася, што вядзьмаркай можа стаць звычайная жанчына, калі ведзьма, якая памірае, перадасць ёй свае веды праз якую-небудзь рэч, на якую былі нашаптаны пэўныя замовы. Гэта мог быць, прыкладам, венік або клубок нітак.

Верылі, што вядзьмарка вылучаецца асаблівымі паводзінамі і выглядам. Найчасцей у яе аблічча назіраліся пэўныя адзнакі пачварнасці: два шэрагі зубоў, гарбатасць, кульгавасць, хударлявасць і кашчавасць, кручкаваты нос, лішнія пальцы або іх адсутнасць, мог быць нават невялічкі хвост і другія адхіленні і калецтвы, якія выклікалі ў людзей прымхі і забабоны. Вядзьмаркі маглі перакідвацца ў іншыя

істоты, найчасцей у жаб-рапух, птушак, кабыл, чорных котак. У выглядзе жаб або вужоў яны высмоктвалі ў кароў малако, ад чаго ўдой памяншаўся або ўвогуле знікаў.

Тых вядзьмарак, якія займаліся адбіраннем малака ў кароў, паўсюдна называлі «*малочнымі ведзьмамі*». Уяўлялася, што такія жанчыны да ўсходу сонца бяруць хустку або ручнік і цягаюць яго па роснай траве па чужых межах і нівах, пры гэтым прамаўляючы: «*Няхай з вады малако будзе*». Потым у сябе дома жанчыны падвешваюць тую хустку, набраклую ад расы, да столі і падстаўляюць збанок, куды сцякае ўжо не вада, а сапраўднае малако. Затое ў кароў, якія потым пасвяцца на гэтых нівах, малако знікае або яго робіцца зусім мала. Таксама верылі, што апроч малака, ведзьмы, лётаючы ў паветры, збіваюць расу з травы, адбіраюць у зёлак іх лекавую сілу, робяць заломы ў жыце, выкрадаюць спор у жытнёвых каласоў і г.д. Надпрыродныя і шкодныя здольнасці вядзьмарак узмацняюцца ў поўню, наваль-



*Вядзьмарка (невядомы мастак)*

нічныя ночы, а таксама напярэдадні вялікіх свят, асабліва на Купалле, небяспечны яны і на Юр'я, Вялікдзень, Сёмуху, Раство.

У народзе верылі, што гаспадыняй усіх вядзьмарак з'яўляецца ***Баба Яга*** або ***Ягіня***.

> «Баба Яга ўсіх ведзьмаў цётка. Яна страшна, чорна, старая, раскудлачаная, у яе заміж ног жалезныя таўкачы, то яна як ідзе лесам, то лес ломіць і дарогу сабе цярэбіць тымі таўкачамі».

Правобразам вядзьмарак, на думку навукоўцаў, сталі жрыцы Вялікай Багіні, якія ў глыбокай старажытнасці спавядалі яе культ і выконвалі пэўныя абрады. Пасля змены рэлігій на патрыярхальныя накірункі, гэты вобраз быў дэманізаваны і выціснуты на ўзбочыну жыцця. Сыходзячы з гэтага меркавання, мужчыны былі менш за жанчын схільнымі да вядзьмарства. Тым не менш, у народзе былі перакананы, што ведзьмакамі рабіліся прадстаўнікі такіх прафесій, як кавалі, млынары, леснікі, ганчары, пастухі, канавалы, даўнейшыя войты.

Валодалі надпрыроднымі здольнасцямі і так званыя ***чараўнікі, чарадзеі*** і ***чараўніцы***. Яны маглі быць прыналежнымі да абодвух палоў, гэта залежала ад той мясцовасці, дзе больш верылі ў чарадзейныя здольнасці мужчын ці жанчын. Знешні выгляд такога чалавека, таксама, як і ведзьмы, адрозніваўся ад звычайных людзей сваімі фізічнымі хібамі. Назва «*чараўнікі*» адлюстроўвае іх галоўную функцыю — чараваць і паходзіць ад старaславянскага *чаръ*, якое, у сваю чаргу, бярэ пачатак ад індаеўрапейскага дзеяслова *kuer* — «*рабіць*». Нездарма ж, калі ў некага раптоўна псавалася здароўе, або пачыналі кепска ісці справы, пра яго казалі: «*яму нароблена*». Іншымі словамі, чараўнікі маглі, як і ведзьмы, наводзіць на людзей і скаціну хваробы і псоту, што прыводзіла часам да смерці. Рабілі яны гэта шматлікімі сродкамі: маглі «*пусціць па ветру*» замову на шкоду, падкласці пад парог дома або пад печ замоўленыя рэчы — валасы, косткі, зблытаныя ніткі, яечнае шкарлупінне, здохлых жывёлін. Пасля гэтага ў такім доме здараліся разнастайныя няшчасці.

Маглі чараўнікі наслаць на людзей і злых духаў, ад чаго тыя рабіліся вар'ятамі, ператварыць іх часова або назаўсёды ў розных жывёл. Калі чараўніка не запрасіць на вяселле, ён мог сапсаваць яго, пасварыць нявесту з жаніхом, наслаць на маладую бясплоднасць, а маладога пазбавіць мужчынскай сілы.

На Беларусі распаўсюджаны паданні пра акамянелыя вяселлі з-за праклёну чараўніка. Так, каля вёскі Дзярэчын Зэльвенскага раёна знаходзіцца сем валуноў, якія ў народзе называюць Акамяне-

лым вяселлем. Быццам вяселле вярталася з вянчання ў храме і сустрэла чарадзея, з якім не павіталася як трэба. Ён пакрыўдзіўся і прakляў усіх у вясельнай працэсіі, пасля чаго яны акамянелі.

Цесна звязаны чараўнікі і з атмасфернымі з'явамі, яны насылаюць і адганяюць градавыя хмары, дажджы, выклікаюць сонечныя і месячныя зацьменні, вятры і віхуры, засуху і спёку. Чараўнік або чараўніца з'яўляюцца гаспадарамі над усімі жывёламі, асабліва над ваўкамі і змеямі. Яны могуць пакараць змяю за тое, што тая ўкусіла чалавека або скаціну, прымушаюць змей ахоўваць дом. Калі хто-небудзь з людзей крыўдзіць чараўніка, той, помсцячы, насылае на яго ці на ўсю вёску паўзуноў. Але калі крыўдзіцель папросіць прабачэння, прымушае змей пакінуць гэтае месца. Таксама чараўнік насылае на дом свайго ворага мышэй, прусакоў, клапоў, а потым, калі яго папросяць, выводзіць іх.

Як і ведзьмаў, чараўнікоў некалі спальвалі на вогнішчах. Сыходзячы з дакументаў XVII–XVIII стст., абвінавачванні ў чараўніцтве былі даволі частымі. Так, у архівах Земскага суда за 1615 год была знойдзена справа пра чарадзейства, дзе паведамлялася, што ў вёсцы Мігуны Браслаўскага павету спалілі жывымі за чараўніцтва трох чалавек. А полацкі мешчанін Васіль Брыкун быў абвінавачаны судом у тым, што *«даваў чары ў піве і гарэлцы»*. Быццам ён у поўдзень пачаставаў півам нейкага Пятра Дземідовіча, а ўвечары таго ледзь не *«парвала»*, і *«павінны былі людзі Брыкуну кланяцца, каб адчараваў»*. Згодна з яшчэ адной судовай справай, ісцец абвінаваціў нейкага чарадзея Кузьму ў тым, што той даў жонцы скаржніка кавалак мяса, ад чаго яна ссохла і памерла.

Паводле народных вераванняў, смерць чараўніка цягнецца доўга і пакутліва, таму што за ягонай душой прыходзяць чэрці. А яшчэ чарадзей не можа хутка памерці, не перадаўшы сваіх ведаў і падуладнай яму нячыстай сілы другому чалавеку. Дзеля гэтага ён павінен незаўважна перадаць свайму паслядоўніку нейкую зачараваную рэч. Каб палегчыць смяротныя пакуты чараўніка, дах ягонага дома разбіралі або рабілі там адтуліну. Смерць і пахаванне чарадзея суправаджаліся рознай непагаддзю. Пасля смерці чараўнік мог зрабіцца хадзячым нябожчыкам або вупырам. Ён мог падымацца з магілы і шкодзіць людзям, свойскай жывёле, гаспадарцы, заляцець у свой дом вогненным змеем.

Але чараўнікі здольны рабіць і добрыя справы. Як і знахары, яны лечаць людзей і скаціну, якіх дагэтуль сапсавалі самі або другія чараўнікі, пераводзяць хваробы або псоту з людзей на жывёл. Чараўнікі варожаць і прадказваюць будучыню, знаходзяць зніклыя рэчы,

указваюць на рабаўніка, які скраў тую ці іншую рэч. Чараўнік загадзя ведае, з якой просьбай прыйшоў да яго чалавек, прадбачыць падзеі, якія адбываюцца далёка ад яго.

Уяўленне пра чарадзеяў прыйшло з глыбокай даўніны, калі існавала вера ва ўсёмагутнасць тыхчасовых святароў — *вешчуноў*. Ім, як і пазнейшым чараўнікам, прыпісваліся здольнасць кіравання надвор'ем, правядзенне абрадаў варажбы, прадказанне будучыні, валоданне лекарскім талентам. Як сведчыць летапіс, полацкага князя



*Спальванне вядзьмарак (гравюра XVIII ст.)*

Усяслава Чарадзея, якога ў былінах называюць Вольхам Усяславічам, маці нарадзіла ад чаравання, і вешчуны навязалі яму на галаў чароўны вузел — *наўз*, што дало яму магчымасць ператварацца потым у розных жывёл.

Людзей, якія выкарыстоўваюць свае магічныя веды толькі дзеля лекавання чалавека і жывёлы, аховы ад вядзьмарства, адгону градавых хмар, прадказання лёсу, у народзе называлі *знахарамі*. У адрозненне ад чараўнікоў і вядзьмарак яны карыстаюцца не паслугамі нячысцікаў, а толькі сілай замоў, раслін, вады і другіх рэчаў са звышнатуральнымі якасцямі. Знахар лячыў усе хваробы скаціны і людзей, але асноўным ягоным заняткам было абясшкоджванне хваробы, атрыманай у выніку чараўніцтва, псоты, уроку, нагавору і г.д. Вельмі часта знахар спецыялізаваўся на лекаванні якой-небудзь адной хваробы, да прыкладу, зубнога болю, кепскага сну дзіцяці, змяінага ўкусу... Калі такі чалавек выкарыстоўваў для лекавання сілу траў або іх адвары і настоі, яго называлі «*траўнікам*» або «*траўніцай*». Калі

ён пры гэтым нагаворваў на ваду ці іншыя рэчы нейкія замовы, яго называлі «*шаптуном*», жанчыну — адпаведна «*шаптухай*», або казалі: яна «*бабіць*».

Знахара, які знаходзіў скрадзеныя ці зніклыя рэчы, а таксама ўказваў на рабаўніка, ахоўваў жывёлу ад псавання, прыпыняў яе падзеж, прадказваў будучыню, варожачы на бабах ці вадзе або зорках, прыварожваў дзяўчынам жаніхоў, ахоўваў на вяселлі маладых ад псоты, мог размаўляць з памерлымі, бачыць «той свет» — называўся *варажбітам*.



*Варажбітка (невядомы мастак)*

Хаця знахарства лічылася традыцыйна жаночым заняткам, ім займаліся і мужчыны, асабліва халасцякі. Часам такія веды прыпісваліся іншародцам: рускія лічылі знахарамі беларусаў, украінцы, наадварот, — рускіх, беларусы — цыганоў. У адрозненне ад чараўнікоў і вядзьмарак, чые веды маглі быць як прыроджанымі, так і прыдбанымі, знахарскае майстэрства заўсёды набывалася. Звычайна больш дасведчаны знахар перадае свае веды таму, хто толькі пачынае, і ў гэтым знахарства блізкае да рамяства. Яму можа навучыцца кожны чалавек, але вельмі часта яно перадаецца «па крыві», у спадчыну ад маці да дачкі, унучцы, праўнучцы і г.д., абавязкова ад старэйшага да маладзейшага. Часта падкрэслівалася, што звышнатуральныя веды могуць перадавацца ад судакранання з нейкім боствам, тагасветам або ягонымі прадстаўнікамі, кантакту з вандроўнымі старцамі, жабракамі, пасля таго, як чалавек патрапіць у буру ці віхор, з'есць мяса змяі і г.д.

У народзе былі ўпэўнены, што чараўнікі, чараўніцы, ведзьмы, ведзьмакі і некаторыя людзі могуць час ад часу ператварацца ў адушаўлёныя і неадушаўлёныя прадметы, а потым зноў вяртаць сабе чалавечы выгляд. Такія людзі называліся ***пярэваратнямі***. Лічылася, што імі робяцца або паводле ўласнай волі, або прымусам, у выніку псоты, чараўніцтва, уздзеяння нячыстай сілы, закляцця. Такая вера замацавана ў старажытных архіўных крыніцах, судовых актах пра «*ведаўскія працэсы*», рукапісных замоў XVI–XVII стст. Так, пра ведзьму беларусы казалі, што яна можа і сябе, і другога чалавека «*пя-*

*рэвярнуць усім, што толькі ё на свеце: і ў жывое, і нежывое, нават каменем і калодкай, і кветкай — усім, чым толькі падумаць можна».* Вельмі часта ведзьмы ператвараюцца ў жывёл, птушак, насякомых, каб у такім выглядзе незаўважна шкодзіць або помсціць людзям, пакараць крыўдзіцеля, дасягнуць сваёй мэты. Шмат дзе ў быліčках маці-ведзьма ў выглядзе свінні, сабакі ці ваўчыцы пераследуе свайго сына, каб не пусціць на спатканне да ягонай дзяўчыны, якую яна ўзненавідзела.

Пярэваратнем магло стаць і немаўля, якога ў «*нядобры час*» праклялі бацькі, пасля чаго яно ператвараецца ў палена або цурбалак і ў такім выглядзе на доўгі час застаецца ў люльцы. А вярнуць сабе ранейшае аблічча яно зможа толькі тады, калі знойдзе шлюбнага партнёра. У чарадзейных казках схільнасць да пераварочвання праяўляюць не толькі міфічныя героі — Баба Яга, чароўны стары, памерлая маці, вешчая птушка, але таксама звычайны сын бедняка, багатыр, салдат. Апошніх міфічныя персанажы навучаюць мастацтву ператварэння, каб узнагародзіць за нейкую паслугу. Цмок і Вогненны Змей таксама маюць схільнасць ператварацца ў прыгожых юнакоў ці памерлых мужоў і ў такім выглядзе кахацца з зямнымі жанчынамі.

Адзін з самых папулярных пярэваратняў у нашай міфалогіі ***ваўкалак*** — чалавек, які з дапамогай чараўніцтва здатны пераварочвацца на пэўны час ваўком сам або яго ператвараюць у гэтага звера недабразычліўцы. Але ў любым выпадку такі чалавек у воўчым абліччы заўсёды захоўвае розум. Кожнае міфічнае пераўтварэнне — гэта пераход з чалавечага свету ў іншы, нечалавечы, калі мяжа паміж чалавекам і зверам настолькі незаўважаная, што ён быццам і чалавек, і жывёла адначасова. Часцей за ўсё ваўкалак мае выгляд звычайнага ваўка, і толькі па некаторым асаблівасцям можна разгледзець у ім пярэваратня. Так, паводле народных вераванняў, ён заўсёды бегае не ў зграі, а адзін і пры гэтым адкідае чалавечы цень, а суглобы на задніх



*Ваўкалака*
*(мастак Б. Забірохін)*

лапах такога стварэння павернуты наперад, як у чалавека, а не назад, як у ваўка.

Лічыцца, што ў ваўкалакаў абарочваюцца вядзьмаркі і чараўнікі, каб прынесці ліха і шкоду людзям. Ператвараюцца яны рознымі спосабамі. Адзін з іх — кулянне праз два, тры або пяць нажоў, якія ўторкнуты ў зямлю вастрыём наверх. Каб зноў вярнуць сабе чалавечы выгляд, чараўнік павінен кульнуцца праз тыя ж нажы ў адваротным парадку. Калі за час ягонай адсутнасці хто-небудзь забярэ нажы, то чараўнік так і застанецца ў воўчай скуры. Ператварыцца ў ваўка вядзьмак можа і па-другому: куляннем праз плот або скрыжаванне, праз асінавы пень, калі пралезе праз хамут або калі пераступіць цераз пакладзены пад парогам пояс ведзьмы. Чалавек можа зрабіцца ваўкалакам і не па сваёй волі, а па ліхой задуме чараўніка, які насылае варажбу па ветры або вылівае пад ногі чалавеку адвар з ліпавага лыка.



*Ваўкалака ( мастак В. Славук)*

Уяўленні пра заняткі і паводзіны ваўкалакаў неадназначныя. Паводле адных павер'яў, чалавек, гвалтам ператвораны ў ваўкалака, адчувае страх і роспач, ён не нападае ні на людзей, ні на скаціну і небяспечны толькі для таго, хто ператварыў яго ў ваўка. Другія лічаць, што ваўкалака прыслугоўвае сапраўдным ваўкам і абавязаны па іх загадах нападаць на скаціну, а здабычу прыносіць сваім гаспадарам. Ваўкалака не можа есці сырое мяса, імкнецца падсмажыць яго на вуголлях, якія застаюцца ад вогнішчаў чалавека. У асноўным ён сілкуецца карэньчыкамі і ляснымі ягадамі, крадзе хлеб у пастухоў, касцоў і жней.

Былі ўпэўнены, што ліхі чараўнік здатны ператварыць у ваўкоў увесь вясельны поезд. Дзеля гэтага ён кладзе нагавораны пояс пад парог, праз які пераступаюць маладыя з гасцямі. Пасля гэтага ўсе,

хто пераступіў парог, умомант ператвараюцца ў ваўкоў і застаюцца ў такім выглядзе, пакуль не стлее пояс. Вярнуць такім людзям чалавечае аблічча можа і знахар, які здагадаецца, што гэта пярэваратні, і з дапамогай замоў выратуе іх. Даведацца пра тое, што ўдзельнікі вяселля ператварыліся ў ваўкоў, можна па белых і чырвоных ручніках ці стужках, якія застаюцца павязанымі паверх воўчай поўсці ў перавернутых сватоў і маладых.

Таксама верылі, што ў ваўкалакаў ператвараюцца злыдні або тыя, хто нарадзіўся ў «ліхую гадзіну», а таксама дзеці бацькоў, якія парушылі рытуальныя табу. Маюцца на ўвазе тыя, хто працаваў на свята або зачалі дзіцёнка тады, калі шлюбныя адносіны былі забаронены. Такі чалавек міжволі ўначы ператвараецца ў ваўка і накідваецца на людзей. Вось як пра гэта расказваюць палешукі:

> «Бывае, калі жонка паспіць з мужам перад Вялікаднем, то дзіцё ваўкалакам нараджаецца. Такія ваўкі ўжо ў лесе не жывуць, яны бадзяюцца па вёсцы. Але калі хто пакліча такога пярэваратня па імені, то ён зноў ператвараецца ў чалавека».

На думку навукоўцаў, падобныя легенды пра ваўкалакаў з'яўляюцца водгукам рытуальных абрадаў ініцыяцыі маладых хлопцаў. Асноўнай задачай абраду было авалоданне майстэрствам паляўнічага і воіна — якасцямі татэмнага першапродка і сакральнага звера — воўка. Практыка такіх абрадаў была настолькі пашырана сярод славян, што нават Герадот апісваў штогадовае пераўтварэнне племені неўраў, якое некалі жыло на тэрыторыі сучаснай Беларусі, на некалькі дзён у ваўкоў. Гэта адбывалася звычайна ў перыяд зімовага сонцавароту, калі падчас ініцыяцыі мужчыны племені разам з язычніцкім святаром утваралі воінскае братства і апраналі на сябе воўчыя скуры, што сімвалізавала іх пераварочванне ў ваўкоў. Так яны кантактавалі са сваім звярыным продкам, у якога прасілі сілы і мудрасці.



*Воін у скуры ваўка*

Прыкладам знакамітага ваўкалака ў нашай гісторыі і культуры быў згаданы вышэй славуты по-

лацкі князь Усяслаў Чарадзей. Гістарычныя крыніцы кажуць, што ён падтрымліваў язычніцкія культавыя звычаі, таму верылі, што князь мог прымаць выгляд ваўка і ў такім выглядзе бегаць па непраходным лясам, пераадольваць у адно імгненне неверагодныя адлегласці.

## Глава 6
## ЧОРТ

Самы загадкавы з усіх міфалагічных персанажаў — гэта *Чорт*. У народных аповедах ён выступае як самастойны вобраз, які не мае нічога агульнага ні з Д'яблам, ні з Сатаной — вобразамі, што прыйшлі ў нашу культуру з біблейскіх тэкстаў. Тым не менш, пасля прыняцця хрысціянства гэты персанаж быў істотна дапоўнены адпаведнымі ўяўленнямі пра Д'ябла.

Згодна з тапанімічнымі паданнямі, Чорт — дэміург, творца зямнога рэльефу або дух некаторых прасторавых сфер, гаспадар дзікіх цяжкадаступных мясцін. У беларускіх легендах Чорт або Д'ябал разам з Богам паўстае як адзін са стваральнікаў некаторых элементаў ландшафту, нязручных для чалавека. Больш за ўсё з Чортам звязваюць паходжанне балот. Доказам таму шматлікія тапанімічныя назвы кшталту *Чортава Балота*, *Чортава Вока*, *Чортава Вакно*, *Чортава Сцежка* і г.д. Каля балот з такімі назвамі часта можна сустрэць камяні-следавікі, якія таксама маюць дачыненне да Чорта і называюцца *Чортаў След*, *Чортаў Камень*, *Чортава Ступень*. Вядома, што ў вельмі архаічных легендах Чорт выступае ў якасці старажытнага язычніцкага боства, якога баяліся і ўшаноўвалі, але з часам са зменай рэлігіі ён набыў адмоўныя рысы.

Пра гэтыя метамарфозы і гаворыцца ў адным з беларускіх паданняў, дзе распавядаецца, як Бог убачыў на моры аграмадны стоўп вады, а ў ім «*жывога волата, які паварочваецца, але не можа ўстаць*». Калі Бог дапамог таму волату вылезці на бераг, то «*з'явіўся такі прыгажун*», што ягонаму хараству здзівіўся сам Бог. Пасля таго, як Творца «*паставіў яго начальнікам над усімі анёламі*», той «*пачаў намаўляць анёлам непаслушэнства Богу*», пачаў казаць, што нічога дзіўнага, апроч стварэння чалавека, Бог не зрабіў, і што «*такога ж чалавека, яшчэ лепшага*» анёлы могуць стварыць самі. Далей у паданні гаворыцца, што знайшліся такія анёлы, якія паверылі волату і вырашылі не слухацца Творцы, самі паспрабавалі зрабіць чалавека.

«Пайшлі і давай муціць азярцы і рэкі; напрацаваліся, што аж счарнелі як вугаль. Доўга яны муцілі рэкі і азёры, з'явіліся рознага роду насякомыя і паўзуны, але чалавека зрабіць не змаглі».

Але тут з'явіўся Бог і вырашыў:

«Раз яны змуцілі воды,ператварылі іх у балоты, дык ім і назначана жыць у іх. З той пары і да сённяшняга часу чорныя жывуць у балотах, месцах, якія яны самі стварылі. З цягам часу гэтым чорным сталі даваць розныя імёны: чорт, д'ябал, шайтан, нячысцік...»



Чорт (сярэднявечная гравюра)

Таксама шырока вядомы сюжэт пра тое, як скінутыя з неба анёлы ператварыліся ў розных чарцей. Падчас падзення на зямлю ў анёлаў выраслі кіпцюры, рогі, хвасты, а цела пакрывалася поўсцю. Тыя, хто патрапіў у ваду, зрабіліся вадзянікамі, хто ў лес — лесунамі, хто на дамы людзей — дамавікамі. «*Вось чаму іх завуць па-рознаму, а ўсе яны бесы аднолькавыя*». Паводле другіх беларускіх павер'яў, чорт нараджаецца з пляўка чалавека, калі той плюнуў на зямлю і не расцёр гэтае месца нагой.

Чорту прыпісваецца стварэнне «*нячыстых*» жывёл, насякомых і раслін: ваўка, «*гадаў*», яшчарак, пацукоў, мышэй, кажаноў, воранаў, сарок, мух, тытуню, атрутных грыбоў. Лічыцца, што нячысцік прыдумаў гарэлку і другія хмельныя напоі, а таксама іґральныя карты.

У адрозненне ад другіх міфалагічных персанажаў, па глыбокім народным перакананні, чорт заўсёды робіць адно ліха і прынцыпова не здатны дапамагчы чалавеку. Так і кажуць, што ўлюбёны занятак усіх чарцей — рабіць усялякую шкоду людзям: уводзіць іх у п'янства, сварыць паміж сабою, даводзіць да самазабойства, падбухторваць да ўсялякіх злачынстваў. І ўсё гэта дзеля таго, каб зрабіць грэшнікаў падуладнымі чартоўскай волі і атрымаць іх душы. У гэтым чарцям дапамагаюць вядзьмаркі і чараўнікі, з якімі яны супрацоўнічаюць разам і ўдзельнічаюць у начных шабасах, дзе і плануюць свае ліхія справы. У народзе кажуць:

«Чорт, каб толькі ўзяць душу, усё даць можа чалавеку: здароўе, доўгае жыццё, шчасце, заступніцтва, дастатак, талент — адным словам, усё, чаго толькі чалавек жадаць і прагнуць можа».

Вельмі часта, паводле народных павер'яў, хцівыя людзі, каб дасягнуць жадаемага, заключалі дамову з Чортам. Такія дамовы складаліся з дапамогай чараўнікоў па адной схеме, дзе агаворваўся тэрмін, на працягу якога Чорт будзе служыць чалавеку, а затым прыйдзе па ягоную душу, усё гэта падпісвалася крывёю хціўца. Дамова заключалася ў лесе або ў лазні, на ростанях, пад мостам, у пустой карчме. Каб атрымаць душу чалавека, Чорт мог пайсці на хітрасць і падман. Прыкладам, угаворваў вандроўнага чалавека: «*прадай мне тое, чаго дома не ведаеш*», і даваў мех золата. Той прымаў грошы, падпісваў дамову, а дома даведваўся, што жонка нарадзіла сына, якога неасцярожны бацька прадаў Чорту.

Каб здзейсніць ліха і шкоду, чарты пільнуюць людзей часцей за ўсё на дарогах і ростанях, дзе пад выглядам звычайных вандроўнікаў ці салдат, якія вяртаюцца са службы дадому, чапляюцца да чалавека, упрошваюць яго выпіць, а потым заводзяць у непраходную пушчу ці ў балота. Калі чалавек своечасова пераженгнаецца або ўспомніць пра Бога, Чорт пакіне яго ў спакоі, у адваротным выпадку няшчаснага чакае смерць. Асабліва любяць чэрці п'яных. Напускаюць на іх туман і заводзяць у балота. Тут садзяць іх на купіну і, калі п'яны — музыка, прымушаюць іграць, а самі скачуць. Ці пераконваюць п'яных, што яны ў лазні. Тыя распранаюцца і лезуць у багну, а зімою ў гурбы, дзе і замярзаюць. Часта Чорт выяўляе асаблівую любоў да музыкі і танцаў, з'яўляецца там, дзе весяліцца і таньчыць моладзь, вучыцца сам або навучае чалавека граць на музычных інструментах.

У народных паданнях Чорт часта апісваецца як гараджанін, пан ці паніч, шляхціц, апрануты ў капялюш і «пінжак з гузікамі», абапіраецца на элегантную кавеньку. Ён можа з'явіцца ў выглядзе немца або француза ў парыку з коскай ззаду, і ў фраку. Тады ягоную дэманічную прыроду можа заўважыць толькі па незвычайных нагах — яны або занадта тонкія, або крывыя і без пятак, або наогул маюць выгляд птушыных лап. Часта Чорт мае адну нагу са звычайнай ступнёй, а другую — у выглядзе конскага капыта, таму ён заўсёды кульгае.

У палескіх былічках мужык пазнае Чорта ў зухаватым фурмане: «*у пана адна нага — коньскі капыт, а другая — курачая нага*». Некаторыя сцвярджаюць, што Чорт выглядае спераду як звычайны чалавек, але ззаду ў яго адкрытая спіна, так што бачны ўсе вантробы:

«Выглядаў мужчынаю такім, як салдат. Спераду салдат у гузіках, а ззаду кішкі вісяць. Все тэ трэбухі вісяць. А спераду такі герой сядзіць, а задам павернецца — усё гола. Ногі йе, да такія, проста каравячыя ногі».

Згодна з некаторымі павер'ямі, чэрці ў выглядзе прыгожых хлопцаў з'яўляюцца на дзявочыя вясковыя вячоркі, дзе іх выкрываюць па звярыным нагам. Чорт можа з'явіцца ўначы да ўдавы, якая моцна сумуе па памерламу мужу.



*Чорт (мастак В. Славук)*

«Няможна думаці ніколі ўночы ані аб умерлым, ані аб каханку дзеўцы, ані хлопцу аб дзяўчыне, каторую любіць, бо ўночы Чорт у тае асобы постаці будзе прыходзіць».

Таксама Чорт мае здольнасць як самы лепшы пярэварацень прымаць выгляд будзь якога чалавека, жывёлы, насякомага, атмасферных з'яў, можа з'явіцца ў выглядзе віхра і снежнай завірухі, вогненнага шара, радзей — капны сена, абгарэлага пня, кола. Больш за ўсё яму падабаецца пераварочвацца ў казла, барана, каня, сабаку, свінню, кажана, ваўка, зайца.

Як і ўсе нячысцікі, чэрці актывізуюцца ўначы, а дакладней, апоўначы. Верылі, што ўдзень Чорт не мае ўлады над чалавекам і можа яму шкодзіць толькі з вечара да таго часу, пакуль не закрычыць певень. Тады нячысцікі знікаюць да наступнай апоўначы. У той жа час іх актыўнасць павялічваецца восенню і ўзімку, а ўвесну і ўлетку яны, хоць і працягваюць шкодзіць людзям, але збольшага хаваюцца ад свайго ворага — грымотніка Перуна, які намагаецца забіць іх сваімі грамавымі стрэламі. З іншага пункту гледжання, Чорт мяняе асяродак свайго знаходжання ў залежнасці ад вегетатыўных цыклаў расліннасці.

«Чарты пастаянна сядзяць у вадзе і балоце. Калі асвячаюць ваду, яны пераходзяць на вярбу, па асвячэнні вярбы пераходзяць у зелле, а адтуль зноў у ваду. Такі пераход адбываецца спрэс».

Нягледзячы на ўсе тыя негатыўныя рысы, якія прыпісвае Чорту хрысціянскае светаўспрыманне, у народных аповедах захаваліся і станоўчыя рысы гэтага персанажа. Па некаторых беларускіх павер'ях, Чорт запрашае на сваё вяселле беднага чалавека і шчодра адорвае яго золатам, а самы галоўны з чарцей — Люцыфер — карае свайго падначаленага чорта за тое, што той скраў у жабрака апошнюю скарынку хлеба, і прымушае яго прыслугоўваць таму чалавеку на працягу трох гадоў, покуль той не разбагацее. Чорт можа выступаць і ў ролі ахоўніка справядлівасці: ён карае карчмара за тое, што той аблічвае наведвальнікаў і не далівае ім напояў, можа давесці да смерці суддзю, які за хабар вынес незаконны прысуд беднай удаве. Прысутнасць Чорта лічылася неабходнай пры варожбах, калі яго спецыяльна прасілі з'явіцца і прадказаць будучае. Сустракаюцца такія народныя павер'і, дзе Чорт перадае людзям сакрэты пэўнага прафесійнага майстэрства. Лічыцца, што чэрці першыя вынайшлі кола млына і касу, навучылі людзей граць на музычных інструментах, адкрылі чалавеку якасці лекавых траў.

Даследчыкі старажытных вераванняў прааналізавалі багаты фальклорны матэрыял, звязаны з гэтым міфічным героем, і прыйшлі да высновы, што ў архаічныя часы персанаж Чорта з'яўляўся балцкім боствам. Гэтае бостава таксама апекавалася памерлымі і свойскай жывёлай, было звязана з язычніцкімі святарамі (жрацамі) і музыкамі, варожбамі і прадказаннем будучыні, з лесам і звярамі, плоднасцю і земляробствам, грала важную ролю ў сферы эротыкі. Гэтае боства лічылася хтанічным і было адначасова звязана як са стваральнай сілай зямлі і вады, так і разбуральнай, якая забірае жыццё.

У розных індаеўрапейскіх міфалогіях такому Чорту адпавядаюць славянскі Вялес (Волас), германскі Одзін і яго крэўны брат Локі, старажытнаіндыйскі бог справядлівасці і пакаральнік вінаватых Варуна, кельцкі бог багацця і дастатку Езус, старажытнагрэчаскі ўладар мёртвых Аід, пасрэднік паміж тым і гэтым светам Гермес, бог жывёлы, палёў і лясоў Пан...

# Раздзел VI
# НАРОДНЫЯ ВЕРАВАННІ Ў КАЛЯНДАРНАЙ АБРАДНАСЦІ

## Глава 1
## НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Каляндар — сістэма ўяўленняў пра час і святы, падлікаў і рэгламентацыі гадавых прамежкаў, якая заснавана на перыядычнасці з'яў прыроды, бачных рухаў нябесных свяцілаў. Уяўленні пра каляндар звязаны з уяўленнямі пра хаос і космас, пабудову свету. Зараджэнне календара пачалося яшчэ ў часы палеаліту, калі чалавек стаў заўважаць заканамернасці змен у прыродзе: кругазварот сонца, фазы месяца, рух зорак. Светлы час сутак атаясамліваўся з жыццём, цёмны — са сном і смерцю. З цягам часу сталі вылучаць дні сонцастаяння і раўнадзенства. У многіх народаў яшчэ з эпохі бронзы і ранняга жалезнага веку вядомы гліняныя гаршчкі-каляндары, пазначаныя 12 сімваламі па колькасці месяцаў у годзе.

Каляндарным цыклам падпарадкоўвалася ўся гаспадарчая дзейнасць. Самымі старажытнымі мерамі часу быў час па звароце месяца. Сляды месячнага календара выразна захаваліся ў беларускіх звычаях і прыкметах. Пазней з'явіўся сонечны каляндар, які фіксаваў гадавы рух сонца, а затым і сонечна-месячны каляндар.

У XV ст. ужо былі друкаваныя календары. Іх складалі духоўныя асобы на падставе працэсаў сонцастаяння і раўнадзенства. Асноўныя каляндарныя абрады былі прымеркаваны да чатырох астранамічных пунктаў сонца: раўнадзенства — з 21 на 22 сакавіка і з 22 на 23 верасня, сонцавароты — з 21 на 22 снежня і з 21 на 22 чэрвеня. Тысячагадовы сімбіёз язычніцтва і хрысціянства паўплываў на асаблівасці каляндарных абрадаў.

Усе сферы матэрыяльнай і духоўнай культуры звязаны з паходжаннем і развіццём календара. Генэзіс каляндарных уяўленняў уз-

дзейнічаў на развіццё выяўленчага мастацтва, вусна-паэтычнай творчасці, абраднасці і захоўванне традыцый. Каляндар — яскравы прыклад адзінства чалавека з сусветам.

Народны каляндар беларусаў галоўным чынам быў звязаны са зменай фаз або квадраў месяца. Кожная з квадраў успрымалася як спрыяльная або неспрыяльная для гаспадарчых прац. У народным календары захаваліся і элементы сонечнага календара — старадаўні падзел года адпаведна зімоваму (на Каляды) і летняму (на Купалле) сонцастаянню. Рэлікты такога падзелу можна ўбачыць у своеасаблівым звычаі на Піншчыне. Там яшчэ сто гадоў таму на працягу ўсіх Калядаў збіралі лепшыя агаркі ад свечак і захоўвалі іх да Купалля. Падчас купальскіх свят ішлі на поле, засеянае ільном і малявалі імі вакол сябе кола. Верылі, што такім чынам змогуць убачыць, як выходзяць з зямлі і прасушваюцца на сонцы скарбы.

Існаваў падзел на шчаслівыя і нешчаслівыя дні. Шчаслівымі днямі лічыліся аўторак і чацвер, нешчаслівымі — панядзелак і пятніца. Увогуле кожны дзень тыдня быў надзелены пэўнай сімволікай.

***Панядзелак*** лічыўся мужчынскім днём. У гэты дзень не саджалі курыцу на яйкі, бо верылі, што выведуцца адны пеўнікі. З панядзелка пачыналі многія справы. Існуе нават прыказка: «*У панядзелак свет снаваўся*».

***Аўторак*** таксама быў мужчынскім днём. Верылі: калі пасватацца ў аўторак, тады не атрымаеш «ад варот паварот». У гэты дзень звычайна пачыналі сеяць яравыя культуры. Верылі, што чалавек, які нарадзіўся ў аўторак, пражыве доўгае і шчаслівае жыццё. Разам з тым папярэджвалі: не пазычай ніколі грошай у аўторак, потым усё жыццё іх будзе замала. На другім пасляведікодным тыдні менавіта ў аўторак ладзіцца Радаўніца — дзень ушанавання продкаў. Гэта дзевяты дзень пасля Вялікадня, які лічыцца адным з ключавых у сістэме памінання памерлых.

***Серада*** была жаночым днём. У сераду забаранялася пачынаць сяўбу, прасці, купаць дзяцей, збірацца ў дарогу. У народзе існавала перакананне: калі на гэты дзень прыйдзецца маладзік, можна смела закладаць хату або печ. На Палессі, каб засцерагчы пасевы ад граду, ушаноўвалі Градавую сераду.

У ***чацвер*** — мужчынскі дзень — пачыналі будаўніцтва, жніво, спраўлялі зажынкі, а таксама запрашалі на вяселле. Некаторыя чараўнікі былі ўпэўнены, што прысушкі (любоўныя нагаворы) лепш за ўсё рабіць у чацвер. Чацвер на масленічным тыдні лічыўся днём Воласа, або Уласія, — бога-ахоўніка хатняй жывёлы. Вылучалі і Чысты чацвер перад Вялікаднем.



*Каляндарныя знакі на гліняным посудзе (вёска Каменка на Дняпры, Украіна)*



*Драўляны стрыжань-каляндар*

Месцамі ў нашай краіне ў першы чацвер пасля Вялікадня, так званы Наўскі чацвер, або Стары Вялікдзень, у многіх раёнах ішлі на могілкі. Напрыклад, так было ў вёсках Здудзічы Светлагорскага і Казімірава Асіповіцкага раёнаў. Пасля галашэнняў і жалобных песень адбывалася трапеза, а яе рэшткі пакідалі на магілах. Потым моладзь таньчыла і вадзіла карагод.

***Пятніца*** таксама жаночы дзень і цесна звязаны з напаўхрысціянскай Параскевай Пятніцай. А яна ў сваю чаргу з'яўляецца займенніцай паганскай багіні Мокашы — апякункі жанчын, ахоўніцы зямлі і шчаслівага шлюбу. Відаць, культ гэтага боства быў некалі пашыраны ў беларусаў, таму што вера ў Параскеву Пятніцу распаўсюдзілася па ўсёй краіне і звязана са шматлікімі прымхамі і забабонамі. Так, жанчынам забаранялася мыцца самім у пятніцу і мыць сваіх дзяцей, іначай нібыта на іх нападзе *«сушэц»*.

Здаўна перад Дзядамі ў пятніцу адзначалі Бабы — ушанаванне памерлых па жаноцкай лініі.

Пра тое, што Параскева Пятніца пераняла функцыі Мокашы, сведчыць яе цесная сувязь з вадой. Існуе мноства легенд, што абразы гэтай святой знаходзяць каля ручаёў і крыніц, вада з якіх набывае потым гаючыя якасці. У Беларусі зафіксавана больш за дваццаць крыніц пад назвамі *Пяцінская*, *Пяцінка* ці да таго падобныя.



*Падвеска XIII ст. з дванаццацю кропкамі*

Жаночым днём была і ***субота***.

Яна звязваецца з культам продкаў. Таму чалавек, які нарадзіўся ў суботу, можа бачыць духаў сваіх продкаў. У народнай медыцыне гэта адзіны дзень калі можна лячыць п'яніцу.

***Нядзеля*** лічылася спрыяльнай для мужчынскіх спраў. У гэты дзень першы раз выганялі скаціну ў поле, рабілі засеўкі, закладалі новую хату, а жанчынам забаранялася прасці, ткаць, вязаць. Верылі, што людзі, якія нарадзіліся ў нядзелю, непадуладны сурокам і навядзенню шкоды. Стараліся, каб маці з дзіцем першы раз у гэты дзень выйшла з хаты. У першую нядзелю пасля Вялікадня, так званую Праведную нядзелю або Фаміну нядзелю, таксама хадзілі на могілкі, прыкладам, як у вёсцы Пустаборы Зэльвенскага раёна.

Календаром лічыўся драўляны коўш, знойдзены ў сярэдзіне XX ст. у падвале адной з цэркваў Гродна. Такі коўш-карац служыў посудам для напояў на святочных застоллях і на братчынах, якія ладзіліся падчас язычніцкіх абрадаў. Пасля рэстаўрацыі пад верхнім краем каўша праявілася выява з дванаццаці акенцаў, якія чаргуюцца з арнаментальнымі палоскамі. У кожным акенцы маецца графічны малюнак. Выявы ўключаюць таксама 12 вобразаў сонца, размешчаных на дзевяці малюнках, 5 вобразаў жывёл — на чатырох малюнках, 4 вобразы людзей — на трох, 3 вобразы птушак на трох і 7 сімвалічных вобразаў на сямі малюнках. Унутраная паверхня каўша месціць выявы раслінных кампазіцый. Дадзены коўш з'яўляецца сакральным календаром, які створаны на тэрыторыі Беларусі не пазней за XIV ст., найверагодней — у перыяд з IX па XII стст.

Лічба 12, якая спрэс пашырана ў беларускім народным календары, з'яўляецца асаблівай і вельмі шырока прадстаўлена ў павер'ях. Так, яшчэ ў пачатку XX ст. галаву нявесты ўпрыгожвалі вянком, да якога падвешвалі 12 стужак. Часта ў паданнях фігуруе такая самая колькасць братоў, сыноў, жаніхоў, разбойнікаў і інш. Гэтая лічба часта згадваецца ў паданнях і павер'ях пра культавыя камяні. Напрыклад, каб узяць скарб з-пад каменя, трэба ахвяраваць валуну 12 вераб'іных ці курыных галоў. На некаторых вялікіх камянях нібіта маглі адначасна таньчыць 12 пар.

## Глава 2
## ЗІМА

Зіма — пара года, калі прырода памірае або засынае, а зямля адпачывае. У беларускай міфалогіі Зіма з'яўляецца персаніфікаванай жаночай парай Дзеду Марозу. Яна ўяўлялася ў абліччы старой сівой бабы, якая заўсёды запрашае дзеда ў госці. Калі ён не ідзе, то Зіма плача так, што цякуць халодныя слёзы. Дзед Мароз, або Ледзяны Дзед, быў увасабленнем зімовага холаду. Беларусы малявалі

яго сівым дзедам з сінім ці чырвоным носам, апранутым у падшываную світку.

У той жа час верылі, што сцюжу прыносіць Зюзя — стары нізкага росту, з чырвоным носам, у белым футры, без шапкі, босы і з жалезнай булавой. Каб спыніць марознае надвор'е, нібыта трэба пералічыць 9 або 12 знаёмых лысых дзядоў.

Асноўнае зімовае свята — ***Каляды***, або *Рыжтваныя* ці *Рожтваныя святкі*. Нашы продкі бачылі гэта свята як нараджэнне Сонца і лічылі яго астранамічным пачаткам года. Тэрмін «*Каляды*» паходзіць ад лацінскага слова calendae (календы), што азначае першы дзень месяца. Свята адзначаецца з 25 снежня па 7 студзеня па старым стылі. Раней Каляды супадалі з сустрэчай Новага Года. Вечары гэтых двух тыдняў называліся Святымі або Крывымі вечарамі.



*Каляды на Міншчыне (Заслаўе)*

Слова «*каляда*» ужывалася ў двух значэннях: назва свята і назва такіх прадуктаў са свініны, як кілбаса, сала, кумпякі, прыгатаваных да свята. Часам і саму свінню называлі «*калядой*». Калядам папярэднічала ачышчэнне жылля і сядзібы, мыццё ў лазні, тры куцці, якія сімвалізавалі ўшанаванне продкаў. Гэта посная, багатая і вадзяная куцця. Такая страва была традыцыйнай абрадавай ежай, яе гатавалі з цэльных зярнят. Куццю ставілі на абрус, пад які клалі сена.

Першую куццю — посную — варылі 24 снежня ўвечары. Потым крыху зерня пшаніцы ці ячменю насыпалі курам у абруч ад бочкі Так рабілі, каб куры не разыходзіліся, а былі паблізу дома. Само святкаванне пачыналася 25 снежня. На святочную вячэру пяклі бліны, варылі верашчаку са свініны і елі іншыя стравы са свініны, якія лічыліся сімвалам урадлівасці. Увечары, перад Новым Годам, спраўлялі другую Куццю — багатую ці шчодрую. Трэцюю Куццю адзначалі перад Вадохрышчам. У гэтыя дні стараліся і скаціну карміць значна лепш. На Куццю, асабліва на першую, гаспадар з гаршчком куцці тры разы звонку абыходзіў хату. Калі пачыналі есці куццю, то гаспадар з гаспадыняй выходзілі на двор і клікалі на вячэру Мароз, каб ён не вымаразіў азімыя. Пры гэтым казалі:



*Калядоўшчыкі, пачатак XX ст.*

*«Мароз, Мароз! Хадзі куццю есць,*
*І іржа і бель, хадзіце цяпер!*
*Улетку к нам не бывайце,*
*Хлеба нашага не ўбівайце,*
*А ў махавым балоце прабывайце!»*

З Калядамі звязана мноства прыкмет, звычаяў і варожбаў, у якіх шмат увагі надавалася будучаму ўраджаю, лёсу чалавека. Так, з-пад абруса, дзе стаяла куцця, выцягвалі саломінку і па ёй глядзелі, які будзе ўраджай ільну. Каб зберагчы гаспадарку ад нячысцікаў, на Каляды гаспадар ставіў мелам крыжы на дзвярах дома і хлява. Бывала, што замест крыжа малявалі кароў, качак або каня з вершнікам. Дзяўчаты варажылі на мужа, а старэйшыя людзі — на ўраджай і прыплод скаціны. Калі на небе было шмат зорак, то спадзяваліся на вялікі прыплод жывёлы і ўраджай грыбоў. Іней на дрэвах абяцаў багаты ўраджай садавіны.

Па вёсках хадзілі калядоўшчыкі з песнямі і пажаданнямі гаспадарам добрага ўраджаю ў наступаючым годзе, нагадвалі пра набліжэнне надыходу сонечнага цяпла. Раней у калядаваннях удзель-



*Маска казы*

нічалі адны мужчыны, якія пераапраналіся ў казу, мядзведзя, кабылу, жураўля, другіх жывёл і птушак. Маскі ўвасаблялі звышнатуральныя сілы. Асаблівая ўвага надавалася вобразу казы, якая сімвалізавала дух ураджаю. Безумоўна, каза (казёл) — рэлікт нейкай міфічнай істоты, на думку навукоўцаў — Велеса. За віншаванні калядоўшчыкі атрымлівалі ад гаспадароў пачастункі. Адмова калядоўшчыкам у падарунках азначала, што гаспадар асуджае сваю сям'ю на голад. На Палессі некаторыя гаспадары не пускалі ў дом калядоўшчыкаў з зоркай, якія славілі Хрыста, бо гэта не адпавядала традыцыям продкаў.

На Каляды існавала шмат розных забаў. Абавязковымі былі гульні з арэхамі, якія спецыяльна назапашвалі да гэтага свята. Да Калядаў прымеркавана гульня «***Яшчур***», якая вылучаецца шлюбнаэратычным зместам, і дзе фігуруе міфічная істота, адпаведнік Змея — Яшчар ці Яшчур. Выконвалася гульня моладдзю шлюбнага ўзросту. На ролю Яшчура выбіралі самага прыгожага хлопца, садзілі яго ў сярэдзіну, а дзяўчаты вадзілі карагод і спявалі:



*Міфічны Змей-Яшчур*

*«Сядзіць, сядзіць Яшчур*
*У залатым крэсле,*
*На арэхавым кусце,*
*Арэшкі лушчыць,*
*Вочкі плюшчыць,*
*Жаніцца хоча.*
*Вазьмі сабе панну*
*Якую хочаш,*
*Якую любіш».*

Хлопец называў імёны дзяўчат, пасля чаго яны па чарзе кідалі яму свае вяночкі і садзіліся побач з ім. Вянок з'яўляецца сімвалам дзявочай цнатлівасці, таму навукоўцы прыйшлі да высновы, што Яшчар, або Змей, мог быць татэмным продкам славян, і гэтая гульня захавала рысы старажытнага абраду дзявочай ініцыяцыі і рытуальнага шлюбу дзяўчат.

На паўночнай Міншчыне і на Віцебшчыне падчас святкавання Калядаў была распаўсюджана абрадава-гульнявая дзея «***Жаніцьба Цярэшкі***». Яе часта ладзілі ў карчме. Выбраныя бацька і маці жартам падбіралі пары маладых. Кожная з такіх пар павінна была ўзяцца за рукі і круціцца на месцы ў адзін і ў другі бок, што сімвалізавала шлюб. Потым «*пажэненыя* « па чарзе лавілі адзін аднаго. Гульня завяршалася застоллем.



*Калядная гульня «Жаніцьба Цярэшкі» (Лепельскі р-н, Віцебская вобл.)*

На Міншчыне была распаўсюджана гульня пад назвай «***Пячы ката***», якая з'яўлялася рэліктам колішняга ахвярапрынашэння гэтай жывёлы. З цеста пяклі крэндзель у выглядзе ката і падвешвалі яго да столі ў хаце. «*Кот*» раскачваўся, а прысутныя лавілі яго. Потым крэндзель разразалі і дзялілі паміж сабою. Кожны з'ядаў сваю долю. У Бярэзінскім раёне галаву і тулава ката рабілі з цеста, вушы і ногі з сала, а хвост з каўбасы. У Гайне на Лагойшчыне такая гульня праводзілася ў першы дзень Калядаў. Усе неслі з сабой каў-

басы, бліны, гарэлку, а дзяўчаты спецыяльна выпякалі для гэтага «*катоў*», прычым кожная свайго, якіх потым усіх разам падвешвалі да столі. Падчас ігрышча гаспадыня давала каманду хлопцам, і тыя спрытна намагаліся адкусіць кавалак ад якога-небудзь крэндзеля. Дзяўчына, чый «*кот*» быў надкусаны, павязвала хлопца сваім поясам. Даволі часта такія пары і ў сапраўдным жыцці злучалі свой лёс.



*Пірог «Печаны кот», які падвешаны да столі*



*Абрад «Пячы ката», вёска Чыжаха (Бярэзінскі р-н., Мінская вобл.)*

Шырока бытавала і гульня ў ***«нябожчыка»***. Выбранага «*нябожчыка*» абсыпалі мукою і ўдзельнікі гульні пачыналі па ім галасіць. Гэтыя дзеянні з'яўляюцца рэліктам думак і старажытных уяўленняў пра пераадоленне смерці.

У некаторых вёсках Бярэзінскага раёна на Міншчыне спраўлялі абрад, які называўся ***«каляду на дуба цягнуць»***. З саломы і старых рэчаў выраблялі Каляду — своеасаблівую лялька і садзілі яе на барану, пакрытую саломай. Паміж ног ставілі куццю. Барану цягнулі да вызначанага дуба, а Ляльку вешалі на галінкі дрэва. Затым на дуб уцягвалі куццю, а каля ягоных каранёў распальвалі вогнішча. Вакол дрэва і вогнішча вадзілі карагоды і спявалі песні.

З дахрысціянскіх часоў верылі ў цудадзейную моц вады пераходнага часу — калі сонца паварочвала на лета. Асабліва дзейснай лічылася вада ўзятая з трох вадаёмаў, а лепш з сямі. Да некаторых сак-

ральных крыніц у гэты дзень збіралася па некалькі тысяч паломнікаў. Так адбывалася, прыкладам, у вёсках Гамарня Быхаўскага і Марцьянавічы Круглянскага раёнаў на Магілёўшчыне. Ваду з такіх крыніц захоўвалі ў доме, давалі хворым, апырсквалі скаціну, садовыя дрэвы, гаспадарчыя пабудовы, нябожчыкаў. Каб ачысціцца ад грахоў, некаторыя нават купаліся ў палонцы да ўзыходу сонца. У гэты дзень пяклі крыжыкі з цеста і з'ядалі іх. Крыж у язычніцкія часы сімвалізаваў сонца і жыццё.

На большай тэрыторыі Беларусі Калядныя дні завяршала ***Вадохрышча***, або ***Хрышчэнн***е. Звычайна яно супадала з самымі халоднымі днямі зімы. З гэтага часу ўжо ішоў паварот на лета. Цяпер католікі адзначаюць Вадохрышча 6 студзеня, якое называюць святам Трох Каралёў, а праваслаўныя — 19 студзеня. Напярэдадні адзначалі трэцюю куццю. Перад гэтым на багаты ўраджай па чатырох баках хаты раскідвалі жытнёвае зерне. Усе тры куцці рабілі ў адным гаршчку і з аднолькавай колькасці круп. На Палессі палілі вогнішчы і скакалі праз агонь з мэтай абароны ад хвароб і сурокаў. На Вадохрышча варажылі на гаспадарчыя справы. Падкідвалі жменю гароху і лавілі яго шапкамі ці фартухамі, а потым па злоўленых гарошынах разлічвалі прыплод ягнят.

Палешукі на працягу ўсіх калядных дзён у хаце мялі венікам, якім парыліся ў лазні перад святам. Напрыканцы Калядаў яго раскідвалі на пруткі, якія ўторквалі вакол хаты на снезе, утвараючы кола — сімвалічнае сонца.

Нават у наш час 2 лютага ў католікаў і 15 лютага ў праваслаўных адзначаюць ***Грамніцы***. Гэта старажытнае свята, як мяркуюць, паходзіць ад язычніцкага бога Грымотніка (Перуна). Беларусы верылі, што менавіта на Грамніцы можна пачуць першы перадвеснавы гром і ўбачыць ма-



*Грамніцы: маляванне крыжа на маціцы (мастак М. Андрыёлі)*

ланку. Гаварылі, што гэта Пярун зганяе з зямлі розных нячысцікаў. Была і другая версія паходжання гэтых грымотаў. Лічылі, што свята Грамніцы атрымала сваю назву ў гонар жонкі Перуна — Грамаўніцы або Перуніцы. У той жа час сполах бліскавіцы на перадвеснавым небе ўспрымаўся, як праява Боскага Полымя. Таму падчас святкавання Грамніцаў запальвалася мноства вогнішчаў як зямное адлюстраванне Нябеснага Агню. Каля іх адбываліся ачышчальныя рытуалы і другія магічныя дзеянні, якія павінны былі садзейнічаць плоднасці людзей і жывёл, іх абароне ад варожых сіл.

Пазней свята агню перайшло ва ўшанаванне ***Грамнічнай Свечкі***, якое захавалася да нашага часу. Такія свечкі былі адлюстраваннем Жывога Агню, Перуновай моцы і рабіліся пераважна мужчынамі. Воск для іх рыхтаваўся загадзя. Грамнічныя свечкі — моцны сродак народнай магіі. Па старажытных уяўленнях, такая свечка пазбаўляе сілы чары ведзьмакоў і адганяе нячысцікаў. З іх дапамогай можна адвесці маланку і навальніцу ад хаты, вёскі ці поля. Альбо наадварот — заклікаць падчас сухменю дождж з грымотамі. Такая свечка дапамагала і падчас важных гаспадарчых прац: пры выгане свойскай жывёлы, першым ворыве, зборы ўраджаю і нарыхтоўцы зерня. Яе бралі з сабой, калі ішлі сватацца, або калі бабка-павітуха прымала нованароджанага, выкарыстоўвалі пры памінанні продкаў: на трацінь, саракавіны, гадавіну, на Дзяды, Радаўніцу і Задушны дзень, давалі паміраючаму чалавеку, каб той без перашкод мог сысці да прадзедаў. Свечкай абкурвалі дом памерлага, каб душа яго супакоілася. Воск ад яе давалі хворым як лекі. Пасля Грамніцаў сяляне пачыналі рыхтавацца да веснавых работ. Таму падчас святкаванняў маці выпякалі дочкам своеасаблівыя сярпы з цеста, а сынам — косы.

Зіму завяршала ***Масленіца***, або ***Масленка***, Запусты, Сырніца, Сырны тыдзень. Яна адзначалася за восем тыдняў да Вялікадня. У адрозненне ад іншых каляндарных святаў гэтае свята ніколі не ўспрымалася царквой. Царква заўжды лічыла яго д'ябальскім днём. Масленіца спалучае шмат абрадаў і дзеянняў, накіраваных на забеспячэнне сям'і, грамады, ураджаю і плоднасці жывёлы. У гэты дзень таксама палілі вогнішчы, на іх спальвалі старыя рэчы. На Піншчыне скакалі праз такія вогнішчы і спявалі песні. Потым вадзілі карагоды і адганялі зіму тым, што стукалі качаргой аб плот. Многія даследчыкі мяркуюць, што гэта свята мае адносіны да язычніцкага бога Вялеса.

З Масленкай звязаны абрад ***Калодка***, калі хлопцам і дзяўчатам шлюбнага ўзросту, якія не спяшаліся пабрацца шлюбам, прывязвалі да ног драўляны цурбалак — калодку. Каб ад яе пазбавіцца, яны павінны былі адкупіцца.

На Падзвінні ў некаторых вёсках праводзілі масленічныя ***пахаванні*** лялек ***Дзеда*** і ***Бабы***. У першы дзень выраблялі пудзіла Дзеда ў чалавечы рост з падкрэсленымі мужчынскімі атрыбутамі і на саначках вазілі яго па вёсцы. Пры гэтым збіралі на пачастунак, а затым у хаце пудзіла клалі на лаве ў кут. Прыходзілі жанчыны, аплаквалі Дзеда і падкрэслівалі, што ён жыў сто гадоў і ўсім быў дзедам. Іншымі словамі, такі ўмоўны Дзед сімвалізаваў нейкага агульнага продка. Дзеда часта на-



*Маслянічнае пудзіла, вёска Тонеж (Лельчыцкі р-н., Гомельская вобл.)*



*Спальванне пудзіла зімы на Масленіцу, вёска Тонеж (Лельчыцкі р-н., Гомельская вобл.)*



*Абрад «Пахаванне Дзеда», вёска Кісялі (Гарадоцкі р-н., Віцебская вобл.)*

зывалі *Сідар* або *Сідорка*. Потым пудзіла зноў клалі ў сані і за імі па вёсцы ішла працэсія з галашэннямі. Напрыканцы абраду Дзеда цягнулі ў хлеў і закопвалі. Даследчыкі лічаць імя Сідар адным з варыянтаў кадзіравання нейкага боства зімы.

У канцы масленічнага тыдня рабілі ляльку Баба. Яе пудзіла таксама аплаквалі, неслі на вуліцу, здымалі адзенне і разбуралі. Абрады знішчэння пудзіла зімы ў розных мясцовасцях Беларусі адрозніваліся. Ляльку маглі спаліць, патапіць, а маглі закапаць у снег. Такія дзеянні азначалі магічныя спробы выклікаць да жыцця сілы ажыўлення прыроды.

Нядзеля першага тыдня пасля Масленкі называлася ***Зборніца***, або ***Зборная нядзеля***. Гэты дзень лічыўся пачаткам збору да выезду ў поле. Напярэдадні была ***Зборная субота***, калі памiналі продкаў.

## Глава 3
## ВЯСНА. ПАЧАТАК ГАСПАДАРЧАГА ГОДА

Вясну сустракалі ўрачыста, бо ад яе залежаў дабрабыт селяніна. У розных раёнах Беларусі гэта адбывалася ў розныя дні. Гукаць вясну пачыналі з прылёту птушак, асабліва буслоў. Гукалі на Саракі і на Дабравешчанне або Звеставанне.

***Саракі***, ***Саракавік*** — прысвятак народнага календара, які адзначаўся 22 сакавіка. Астранамічна ён звязаны з днём веснавога раўнадзенства. У народзе казалі: «*дзень з ноччу мераецца*». Раней лічылі, што Саракі пачынаюць год. З гэтага моманту пачынаўся час панавання натуральнага жывога агню — Сонца. Старажытныя беларусы надавалі ў гэты дзень лічбе 40 сакральны сэнс. Яшчэ не так даўно ў гэты дзень паўсюдна пяклі 40 булачак, ламалі 40 дошчачак, а каб у

хаце быў лад і дабрабыт, 40 разоў перакідвалі палку праз яе дах. Таксама пяклі печыва ў выглядзе птушак, падкідвалі іх угору, кідалі ў агонь, ваду, закопвалі ў зямлю, пакідалі на дарозе, на падваконні. Такія дзеянні сімвалізавалі ахвярапрынашэнне продкам і былі звязаны з магіяй заклікання (гукання) вясны. З гэтага часу пачынаўся шасцімесячны час прысутнасці на зямлі птушак і змей, якія суадносіліся з містычнымі продкамі. Пра гэта сцвярджае і павер'е, што на Саракі на зямлю з цёплых краёў вылятаюць 40 выраяў птушак.

Спрошчаную магічную абраднасць і далёкія ад хрысціянства рытуалы мае свята ***Дабравешчання***. У наш час гэты свята католікі адзначаюць 25 сакавіка, а праваслаўныя 7 красавіка. Зрэшты, з Дабравешчання заўсёды пачынаўся земляробчы год. У многіх месцах раскладалі вогнішчы і вадзілі вакол іх карагоды. На Навагрдчыне жанчыны падымаліся вельмі рана, каб *«развязаць саху»*. Дабравешчанне лічыцца таксама святам прылёту птушак. Сапраўдны прыход вясны і канчатковая перамога яе над зімою і халадамі атаясамліваўся з прылётам буслоў.

У гэты дзень з цеста выпякалі фігуркі гэтых птушак з раскрытымі крыламі. Дзяўчаты і дзеці забіраліся з імі на ўзвышшы, дахі або дрэвы і крычалі заклічкі, звернутыя да птушак. З Дабравешчаннем звязаны разнастайныя прыкметы. Напрыклад, у Кобрынскім раёне смецце, якое вымяталі ў гэты дзень, спальвалі на дарозе або ў полі. Згодна з павер'ямі, калі яго не знішчыць, будзе шмат пустазелля. На свята асцерагаліся часаць валасы, *«бо куры будуць расчэсваць улетку грады»*. На Дабравешчанне забаранялася рабіць новую або рамантаваць старую агароджу ці пачынаць ворыва. Казалі, што да гэтага дня *«няможна чапаць маткі-зямлі»*. Продкі верылі: падобныя дзеянні могуць выклікаць засуху і бясплоднасць на сялянскай ніве.

З прыходам Дабравешчання паўсюдна пачыналі ***гукаць вясну***. Прычым займаліся гэтым у асноўным дзяўчаты. У некаторых месцах яны ішлі за вёску, дзяліліся на дзве групы і кожная з іх займала асобны ўзгорак. Па чарзе групы дзяўчат спявалі так званыя вяснянкі — песні, дзе заклікалі вясну, вадзілі карагоды. У Салігорскім раёне яшчэ не так даўно карагоды вадзілі каля кожнага двара. У Мсціславе моладзь збіралася на Дзявочай Гары, там спявалі і спраўлялі веснавыя абрады пад назвай *«сеяць проса»* і *« таптаць лён»*. У некаторых раёнах на ўзвышшах, берагах рэк і азёр палілі вогнішчы ў гонар сонца. Па вадзе пускалі запаленае кола, якое сімвалізавала сонца.

У Барысаўскім павеце вясну атаясамлівалі з міфічнай істотай — *Вясноўкай*. Прыгожую і працавітую дзяўчыну ўпрыгожвалі кветкамі, саджалі на барану, якую хлопцы з песнямі цягалі па ўсіх палях.



*Гуканне вясны (Мінскі раён)*

Амаль да нашых дзён дайшло архаічнае свята ***Камаедзіца***, якое адзначалася 24–25 сакавіка і было прысвечана веснавому абуджэнню мядзведзя. Увогуле, вобраз мядзведзя яскрава праходзіць праз усе жанры народнай культуры. Цікава адзначыць, што 25 сакавіка старажытныя грэкі праводзілі ўрачыстыя дзеянні ў гонар багіні Артэміды, увесь комплекс якіх меў назву «*comoedia*».

Яшчэ ў сярэдзіне XX ст. Камаедзіцу святкавалі ў наваколлях Бягомля Докшыцкага, вёсцы Лошніца Барысаўскага раёнаў, некаторых вёсках на Брэстчыне. Напрыклад, жыхары Лошніцы апоўдні запрашалі адзін аднаго ў госці, гатавалі ячную крупу з мёдам, гарохавую кашу, яе яшчэ называлі *камы*, кісель. Пасля абеду апраналіся ў вывернутыя мехам наверх кажухі і пачыналі жартам удаваць з сябе мядзведзяў: перакід-



*Рытуальнае печыва, якое выпякалі на «Гуканне вясны» (веска Тонеж, Лельчыцкі р-н., Гомельская вобл.)*

ваццa з боку на бок, хадзіць на карачках. І ўсё гэта рабілася дзеля таго, каб мядзведзь лёгка ўстаў са сваёй зімовай бярлогі!

24–25 сакавіка як вынік купальскіх ініцыяцый дзяўчат пачыналіся роды. Адсюль і ўзнікла павер'е, што дзяцей прыносяць буслы, бо яны пачынаюць прылятаць у гэтыя дні. Да нараджэння «*купальскіх*» пазашлюбных дзяцей грамадства ставілася спакойна, бо гэта было асвечана рэлігіяй продкаў.



*Гуканне вясны.*
*Рытуальнае печыва (Мінскі раён)*

Самым галоўным веснавым святам быў ***Вялікдзень***, або *Велікадне*, *Вельканоц*, *Вяліканне*, *Пасха*. Яму папярэднічала *Вербная нядзеля* (*Вербніца*) — дзень, прысвечаны культу расліннасці. У хрысціянскія часы на Вялікдзень у храмах сталі асвячаць вярбу. У пачатку XIX ст. на Гарадзеншчыне ў адной з вёсак для асвячэння ў царкву прывозілі нават вялізную вярбу з каранямі. Пасля службы людзі абломвалі з яе галінкі і забіралі з сабой дахаты. Згодна з народнымі звычаямі, каб аберагчыся ад ліхаманкі, трэба было з'есці 9 вербных шышачак. У гэты дзень гаспадар сімвалічна біў усіх хатніх свянцонай вярбой і заклікаў Вялікдзень. Таксама асвечанымі галінкамі вярбы тройчы білі па хатняй жывёле, уторквалі іх у зямлю.

Апошні чацвер перад Вялікаднем завецца *Чысты чацвер*. У гэты дзень абавязкова трэба было памыцца ў лазні, каб потым не пакутаваць ад хвароб. А каровам абліць вымя вадой, узятай перад узыходам сонца з месца зліцця двух ручаёў. У Шацку Пухавіцкага раёна да ўзыходу сонца хадзілі на крыніцу за вадой. Лічылася, што менавіта ў гэты час вада валодае асаблівай лекавай сілай ад хвароб вачэй. На Палессі ў гэты дзень ладзілі памінальную вячэру.

Вялікдзень — гэта святкаванне надыходу і панавання сонца, абуджэння прыроды, пачатак палявой працы. У хрысціянскія часы свята прымеркавалася да ўваскрашэння ўкрыжаванага Хрыста. Але ў народным жыцці гэта свята мае адметныя адценні і каларыт. Дзень правядзення Вялікадня залежыць ад месячнага календара, таму гэта рухомае свята, да якога прывязаны і другія рухомыя святы.



*Саракі. Рытуальнае печыва ў выглядзе птушкі (Мінскі р-н., Мінская вобл.)*



*Саракі, рытуальныя булачкі ў выглядзе птушак (Міншчына)*



*Рытуальнае печыва «галёпа» або «бусліная лапка», якое традыцыйна выпякалі на Дабравешчанне ў Мінскім раёне*

Сімвалам свята былі фарбаваныя яйкі, пераважна ў чырвоны колер. «*Свята Вялічка — з красным яічкам*», — гавораць у народзе. Такому яйку надавалася магічная сіла: яго апускалі ў ваду, каб ёй потым памыцца і быць прыгожым увесь год, з ім выганялі першы раз на пашу жывёлу, каб засцерагчыся ад злых чараў ведзьмакоў, закопвалі ў першую баразну ці на ўскрайку нівы, каб тая добра радзіла. Шкарлупінне ад яек прымешвалі ў ежу хатнім птушкам і жывёлам.

Шырока вядома традыцыя адорваць адзін аднаго велікоднымі святочнымі яйкамі. А дзеці падчас Велікоднага тыдня гулялі ў так званую гульню «*біткі*» ці «*выбіткі*», варыянты якой розніліся ў залежнасці ад рэгіёнаў нашай краіны. Звычайна дзеці па чарзе скочвалі свае фарбаваныя яйкі з горкі ў яміну. Той, чыё яйка было пабіта, аддаваў яго свайму пераможцу. А ў некаторых вёсках Асіповіцкага раёна Магілёўшчыны на зямлі рабілі пяць ямак і паміж імі качалі яйкі. У залежнасці ад таго, у якую ямку яны патрапяць, варажылі пра жыццёвы лёс.

У Велікодную ноч на вуліцах і каля храма палілі вогнішчы, на іх

спальвалі старыя рэчы, асабліва лапці, кажухі, шапкі. Лічылі, што гэтага часу пачынаюць спяваць птушкі. Верылі, што велікодныя стравы маюць магічную сілу. Так, дзеля добрага ўраджаю косткі з велікоднага стала і фарбаваныя яйкі закопвалі ў полі.

Жыхары вёсак цэнтральных і паўднёвых раёнаў Беларусі менавіта на Вялікдзень ішлі на могілкі памінаць памерлых продкаў. Прыкладам, так рабілі ў вёсках Веляцічы і Любча Барысаўскага, Шабуні Пухавіцкага, Юркавічы Лагойскага раёнаў. На Вялікдзень хадзілі да прыродных сакральных святынь — крыніц і камянёў, на прошчы.



*Рытуальныя стравы на Вялікдзень*

Так, у вёсцы Кудзінавічы Капыльскага раёна перш, чым ісці на магілы блізкіх, і сёння падыходзяць да Святога каменя з барэльефным крыжам і з ямкай, дзе збіраецца дажджавая вада. Вадой з ямкі прамываюць вочы і моляцца. Яшчэ не так даўно ў вёсцы Гостбішчы Уздзенскага раёна ішлі да каменя з Божым слядком і неслі яму грошы, кветкі. У вёсцы Юхнаўка Мінскага раёна паклонны камень павівалі ручнікамі.

У гэты дзень вясковыя двары з віншавальнымі песнямі і музыкай абыходзілі ***валачобнікі***. Такіх хадакоў называюць яшчэ *галыкальнікамі*, *валоўнікамі*, *лалоўнікамі*, *лалыншчыкамі*, *кукольнікамі*. Раней звычайна гэта былі гурты мужчын па 10–20 чалавек, зрэдку замужнія жанчыны, але ні ў якім разе не дзяўчаты. Лічылі, што абыход валачобнікамі двароў прыносіць пладавітасць жывёле, ураджайнасць на палях, засцярогу падвор'я ад розных прыродных стыхій.

Паводле некаторых меркаванняў, слова «*валачобнікі*» паходзіць ад слова «*волхв*» (*волочьбник, волочебник*), іншымі словамі — язычніцкі святар, служка культу Вялеса. Пасля ўвядзення хрысціянства гэтыя служкі пахаваліся ў лясах і арганізаваліся ў дружыны. Валачобніцтва як велікодны абрад характэрна толькі для этнічных беларускіх зямель, што яскрава падкрэслівае нацыянальную адметнасць нашай культурнай спадчыны.

Раней на Вялікдзень быў распаўсюджаны звычай аблівання вадой, што звязана са старажытным вераваннем у сілу вясновай вады. Але царква забараняла такі абрад як язычніцкі. У гэты дзень рабілі абходы ворыўных палёў. У многіх вёсках яшчэ ў XIX ст. прасілі папа ці дз'яка пакачацца па зямлі. Калі тыя адмаўляліся, іх валілі і качалі прымусова. Лічылася, што такія дзеянні неабходны для перасцярогі ад засухі, і каб снапы хлеба былі цяжкімі ад мноства саспелага зерня.

Пасля велікодных свят многія пятніцы лічыліся святымі. У Лукомлі Чашніцкага раёна ў другую Пятніцу пасля Вялікадня яшчэ ў канцы XIX ст. збіралася да трох тысяч паломнікаў, яны ўшаноўвалі камень-следавік і крыніцу-ручай. Крыніцы ахвяравалі грошы, ручнікі, хусткі... На Дзесятую Пятніцу (Дзесятуху) хадзілі да Гарадокскай крыніцы паблізу Віцебска і да крыніц у вёсках Палыкавічы каля Магілёва, Лемніца Талачынскага, Копысь Аршанскага, Крупейкі Лоеўскага раёнаў. У Адзіннаццатую Пятніцу збіраліся на багамолле да крыніцы каля вёскі Кутня Чавускага раёна і каля горада Дуброўна на беразе Дняпра.

На Дзевяты дзень пасля Вялікадня, у аўторак наступнага тыдня, адзначаецца ***Радаўніца***. Яе яшчэ называюць *Радуніца*, *Радовы дзень*, *Радуніцкія Дзяды*, *Радавішныя Дзяды*, *Радушныя Дзяды*, *Вялікдзень мёртвых*, *Провады*, *Гробкі*, *Радуга*, *Радульніца*, *Наўскі Вялікдзень*, *Гаеўскі Вялікдзень*.

Радуніца традыцыйна адзначаецца найбольш на ўсходзе беларускіх зямель. Там да сённяшняга часу захаваліся вельмі архаічныя язычніцкія абрады, накіраваныя на тое, каб задобрыць духаў продкаў, заслужыць іх спрыянне ў жыцці і гаспадарцы. Напярэдадні свята гатуюць шмат страў: смажанае мяса, грэцкія бліны, тварог, пірог з яблыкамі і інш. Раніцай на магілах сцелюць абрусы, а потым у абед робяць памінальную трапезу-трызну. Звычай засцілаць магілы абрусамі старыя людзі тлумачаць тым, што ў гэты дзень неабходна закрыць вочы продкам. Раней у вёсцы Рудні Барталамееўскай Чачэрскага раёна магільныя пагоркі дарослых засцілалі абрусамі, а дзяцей — ручнікамі. І ў наш час дзе-нідзе качаюць па магілах сваякоў яйкі, паліваюць іх гарэлкай ці мядовай сытай, узгадваюць нябожчыкаў, галосяць. Пасля гэтага рэшткі памінальных страў пакідаюць на магілах, асабліва фарбаваныя яйкі.

Некалі ў памяць кожнага памерлага ў гэты дзень на могілках палілі вогнішчы. Праз такія вогнішчы скакала моладзь, на іх пяклі яешню. У пачатку XX ст. на Чэрвеншчыне і Дзісненшчыне перад тым, як ісці на магілы сваіх блізкіх, заходзілі на курганы і на іх вяр-

шыні закопвалі пятку пафарбаванага яйка, а таксама пакідалі крыху ежы. У некаторых мясцінах на Радаўніцу хадзілі да сакральных дубоў. Ім ахвяравалі памінальныя стравы, а на галінках вешалі ручнікі. Паводле міфалагічных уяўленняў, верхняя частка дуба лічылася светам вечнасці, а карані — зонай продкаў, царствам смерці.

Вельмі архаічны радуніцкі звычай яшчэ не так даўно існаваў у вёсцы Глыбочыцы Чачэрскага раёна. Раніцай дзеці і хлопцы ішлі на могілкі (*кладаўё*), залазілі на вербы і з галінак рабілі свішчыкі — маленькія дудачкі без адтулін. Потым пачыналі свістаць. Згодна з архаічнымі ўяўленнямі нашых продкаў, рытуальны свіст цесна звязаны з іншасветам.



*Радуніца на могілках, вёска Будзішча (Чачэрскі р-н., Гомельская вобл.)*

Значным вясеннім святам было ***Юр'е***, або ***Ягор'е***, *Юрай*, *Георгі*. Зараз католікі адзначаюць яго 23 красавіка, праваслаўныя 6 траўня. У многіх раёнах гэты дзень лічыцца другім Вялікаднем, а таксама святам пастухоў. Як вядома, Святы Юр'я замяніў язычніцкага Ярылу. Верылі, што ён адмыкае зямлю:

Уяўлялі, што Юр'я ездзіць на белым кані і замыкае пашчы дзікім звярам. Менавіта ў гэты дзень у многіх месцах першы раз выганяюць свойскую жывёлу ў поле. Прычым ва ўсе часы стараліся выгнаць яе яшчэ да ўзыходу сонца — на цудадзейную расу, якая павінна была забяспечыць вялікі дастатак малака. Пры гэтым спявалі:



*Частаванне пастухоў на Юр'я (вёска. Новае Палессе, Лельчыцкі р-н., Гомельская вобл.)*



*Рытуальнае печыва ў выглядзе свойскай жывёлы, якое выпякалі гаспадыні на Юр'я (вёска Новае Палессе, Лельчыцкі р-н., Гомельская вобл.)*

*«Юры, уставай,*
*Адмыкай зямлю,*
*Выпускай расу*
*На цёплае лета.*
*На буйное жыта».*

Жывёлу выганялі галінкай вярбы, асвечанай у вербную нядзелю. На парозе хлява сцялілі кажух воўнай наверх і закручвалі ў яго кавалак хлеба. Вакол статка абносілі яешню.

Гаспадар у гэты дзень пераапранаўся ў чыстую бялізну і святочную світу, абуваў новыя лапці з белымі анучамі, вешаў праз плячо торбу і клаў у яе акрайчык хлеба, соль і крыжык з хлеба, выпечаны на хрэсцы — у сераду на чацвёртым тыдні вялікага посту, тры невялікія каменьчыкі, нож, замок, бязмен, сякеру, курынае яйка і грамнічную свечку. З непакрытай галавой ён ішоў да хлява і выпускаў усю хатнюю скаціну. Потым са страхі хлява выцягваў тры пучкі саломы, чэрпаў у калодзежы поўнае вядро вады і абыходзіў з ім па сонцу вакол статка. Затым перакідваў праз статак камень і абліваў скаціну. Такія дзеянні паўтараліся тры разы.

Потым гаспадар каля варот закопваў у зямлю замок, бязмен, сякеру і яйка, разводзіў на гэтым месцы невялікае вогнішча і кідаў у яго выцягнутую са страхі салому. Калі ўсё гэта было здзейснена, гаспадар перадаваў торбу пастуху, і той праз агонь выганяў скаціну на вуліцу і далей у поле і лес.

На поўначы Беларусі ў гэты дзень гаспадар браў міску ячменю, наверх клаў некалькі яек, ставіў абразок і запальваў свечку. З такой

міскай у левай руцэ і з касой у правай ён, а за ім уся сям'я, ішлі да хлявоў і выганялі скаціну. Гаспадар хрысціўся і тры разы супраць сонца абыходзіў жывёлу, і пасля гэтага яе гналі ў поле. Таксама на Юр'я гаспадар з хлебам павінен быў абыйсці поле, памаліцца пра ўраджай і пакінуць там бохан хлеба. На Палессі дзеля гэтага нават пяклі спецыяльныя маленькія хлябцы (*юркі*).

У гэты дзень фарбавалі яйкі ў зялёны колер, з цеста пяклі фігуркі кароў, коней і другіх жывёл, прыносілі іх у поле для агульнага застолля, якое ладзілі ў гонар пастухоў. Пастухам раздавалі падарункі.

Святы Юрай быў і абаронцам нявест. Таму дзяўчаты ў гэты дзень апраналіся асабліва святочна. У заходніх раёнах Беларусі дзяўчаты пяклі вялізны каравай і ў суправаджэнні хлопцаў неслі яго над галовамі. Яны заходзілі ў хаты з пажаданнямі хутчэйшай жаніцьбы для хлопцаў, а для дзяўчат — замужжа. У Жыткавіцкім раёне на Юр'я існаваў абрад абыходу ўсіх двароў вёскі і жытняй нівы з рытуальным караваем і з граблямі. У многіх месцах падчас абыходу палеткаў пакідалі там кавалкі палатна з загорнутым у яго хлебам. Юр'я адзначалі і ў гарадах. У XIX ст. у Брэсце святкаванне ладзілася ў гарадскім парку, там на высокім кургане вадзілі карагоды і таньчылі.

На гэта свята таксама ўшаноўвалі крыніцы і камяні. У вёсцы Чыжаха Бярэзінскага раёна хадзілі да крыніцы Крыжык і вешалі каля яе на крыж і на суседнія дрэвы ручнікі. У вёсцы Ажурайці паблізу Лынтупаў на Пастаўшчыне яшчэ ў сярэдзіне XX ст. раніцай чатыры дзяўчыны ўзлазілі на вялікі камень і так гучна спявалі юр'еўскія песні, каб чуваць было ў суседніх вёсках. У Мінкавічах Старадарожскага раёна ў пачатку XX ст. моладзь збіралася да Сіняга каменя і там вадзілі карагоды. У некаторых месцах у гэты дзень хадзілі і на могілкі, напрыклад у Гарадоцкім, Маладзечанскім і Смалявіцкім раёнах.

У вёсцы Ахонава Дзятлаўскага раёна на Гарадзеншчыне напярэдадні Юр'я (5 мая па праваслаўным календары) яшчэ і сёння ідуць да крыжоў на ўскрайках вёскі, якія прыбіраюць да Вялікадня. Уперадзе, узяўшыся за рукі, радамі ідуць жанчыны з абрадавымі песнямі, следам дзяўчаты і хлопцы. Усе становяцца паўколам каля крыжа, хрысцяцца і просяць паспрыяць ураджаю, прыплоду скаціны. Затым усе такім жа чынам ідуць да другога крыжа. Пасля гэтага наведваюцца да маладзіц, якія бралі шлюб на працягу апошняга года. Жыхары вёсак Крыўск і Лужкі Шаркаўшчынскага раёна раней хадзілі ў гэты дзень да святой ліпы на раздарожжы.

На ўсходзе Беларусі і ў некаторых іншых раёнах яшчэ да нашага часу адбываецца вельмі архаічны абрад ***Ваджэння і пахавання***



*Абрад «Ваджэнне Куста» (Любанскі р-н., Мінская вобл.)*

***стралы*** з выхадам у азімае жыта. Такія рытуальныя дзеянні асабліва характэрны для некаторых вёсак Веткаўскага і Чачэрскага раёнаў Гомельскай вобласці. Жанчыны водзяць карагоды, качаюцца па жыце і закопваюць ляльку ці нейкую рэч кшталту пярсцёнка ці грэбня. Гэты вельмі архаічны абрад засцерагальнай магіі, які скіраваны на максімальную ўрадлівасць і абарону ад грамавых стрэл і пажараў, здзяйсняўся некалі на грунце чалавечых ахвярапрынашэнняў. Сёння такую ахвяру замяняюць сімвалічнымі прадметамі.

22 траўня святкавалі вясновага ***Міколу***, які пераняў рысы старажытнага бога Вялеса. У сялян гэта было апошняе веснавое свята, з якога паўсюдна на Беларусі пачыналі пасяўную. У народзе казалі: «*Прыйшоў Мікола — сей, не пытай ні ў кога*». На Міколу гулялі сваё свята конюхі або «*канюшкі*». З гэтага дня першы раз на начлег выганялі коней і валоў. Каб мясцовыя ведзьмакі не зрабілі жывёле шкоду, яе ўначы акурвалі зёлкамі, сабранымі на Купалле. А каб на скаціну не напалі ваўкі і не скралі злодзеі, па спінах жывёл качалі яйкі. На наступны дзень такое яйка аддавалі жабракам.

Завяршаўся вясенні час святкаваннем цэлага цыкла вясенніх свят і прысвяткаў, вядомых пад агульнаю назвай — ***Тройца***, якая адзначалася на пяцідзесяты дзень пасля Вялікадня. Гэтае свята яшчэ называюць у народзе ***Сёмуха*** ці ***Сёмік*** — ад таго, што яно святкуецца на сёмым тыдні пасля Пасхі. Але апроч гэтага ў народнай лексіцы за-

хаваліся і другія назвы гэтых дзён — ***Зялёныя святкі***, ***Зелянец***, ***Граная нядзеля***, ***Калечальны*** або ***Русальны Тыдзень***. Усе яны паходзяць з часоў язычніцтва і звязаны з уяўленнямі нашых далёкіх продкаў пра прыроду ўвогуле і акаляючы іх свет. У народзе так і кажуць: «*Зелянец — вясне канец*». На самой справе ў гэтыя дні вясна ўступала свае правы лету, адкуль і пайшла назва Граная нядзеля — мяжа паміж вясною і летам. Свята прыпадае на час, калі распускаюцца асноўныя культавыя дрэвы і першы раз закуе зязюля. У язычніцкія часы ў гэты час прыносілі ахвяраванні і ўслаўлялі духаў і бостваў расліннасці.

Амаль да нашага часу на цэнтральным і заходнім Палессі захаваўся абрад ваджэння ***Куста***, які прыпадае на траецкі тыдзень. Моладзь дашлюбнага ўзросту выбірала са свайго асяродку прыгожую дзяўчыну, якой надавалася роля Куста. Яе ўпрыгожвалі галінкамі клёну, ліпы, бярозкі і потым абыходзілі з ёю двары ў сваёй вёсцы. Пры гэтым спявалі аграрныя, велічальныя і заклінальныя песні.

Напярэдадні Сёмухі, у суботу, ладзіліся ***Траецкія Дзяды*** і ***Бабы***. Бярозавымі венікамі абмяталі магілы, потым іх упрыгожвалі зелянінай. Веніку ў гэтым магічным дзеянні надавалася роля абуджэння продкаў. У Веткаўскім раёне ў гэты дзень на ростанях сыпалі зерне і казалі: «*Нябесныя пціцы, сабірайце і (*такую-та*) душу памінайце*». Галінкамі бярозы, клёну, ясеню, граба, каліны, рабіны і другіх дрэў упрыгожвалі вароты, хаты, храмы, а на падлозе слалі аер. Гэты звычай называюць у народзе «*вешаць май*». Потым засохлыя галінкі здымалі і спальвалі на купальскім вогнішчы.



*«Апрануты радзіцель» напярэдадні Сёмухі, вёска Здудзічы (Светлагорскі р-н, Гомельская вобл.)*

Гэтае вясновае свята лічылася жаночым. Маладыя жанчыны і дзяўчаты ішлі ў лес завіваць вяночкі і куміцца. Вяночкі таксама завівалі з галінак бяроз або з пахучых раслін: аеру, любісты, палыну і варажылі на жаніхоў. У некаторых месцах Беларусі колькасць вянкоў адпавядала колькасці кавалераў, што заляцаліся да дзяўчат і маладзіц. У другіх раёнах плялі вянкі адпаведна колькасці членаў сям'і, але кожны вянок адпавядаў

пэўнаму чалавеку. Вянкі развешвалі ў лесе на бярозках і пакідалі там на ўвесь тыдзень. Вакол кожнай бярозкі вадзілі карагоды, спявалі песні. Калі ладзілі абрад кумавання, то завівалі вяршыні дзвюх бярозак, пераплятаі іх паміж сабою. Затым дзяўчаты і маладзіцы разбіваліся па парах і тройчы праходзілі пад своеасаблівай аркай, абдымаліся і цалаваліся ў гонар сяброўскіх адносін. Пасля абраду кумавання раскладалі вогнішчы, пяклі яешню, частаваліся блінамі, гарэлкаю і другімі стравамі. Калі з'яўляліся мужчыны, то жанчыны зрывалі з іх шапкі і кідалі ў вогнішча.

На працягу першых дзён свята ўшаноўвалі культавыя крыніцы і камяні. Прыкладам, у першы дзень Тройцы ішлі да крыніц у вёсках Крынічка (Пупелічы) Барысаўскага, Горкі-Мірагошч Чэрыкаўскага, Годзічава-Дзікалаўка Гомельскага, Вуглы Вухвішчанскія Полацкага раёнаў. Ушаноўвалі крыніцы і камяні побач з імі каля вёсак Брады Пружанскага і Заазер'е Акцябрскага раёнаў. На другі дзень свята ішлі да крыніц паблізу вёсак Горна-Ізбішча Лагойскага, Любонічы Кіраўскага, Лашавічы Свіслацкага, Байкі Чавускага раёнаў. На трэці дзень пакланяліся крыніцам ў мястэчку Любча на Наваградчыне і ў Крупейках Лоеўскага раёна...

У першы дзень Сёмухі сяляне нясуць у царкву пахучыя кветкі і расліны, якія асвячаюць, а потым захоўваюць у сябе цэлы год. У аўторак святкавалі ***«коньскі Вялікдзень»***. У гэты дзень не працавалі на конях, а ў стайнях запальвалі свечкі *«за іх здароўе»*. У сераду ў некаторых раёнах Беларусі праводзілі абрады ўшанавання агню. У гэты дзень, які называлі яшчэ *Градавай серадой*, катэгарычна забаранялася працаваць, трэба было маліцца багам, каб град і навальніца ўлетку не нарабілі шкоды на сялянскіх нівах. У чацвер ладзілі абрады выклікання дажджу, каб не было засухі летам. На Гомельшчыне маладыя людзі аблівалі адзін аднаго вадою і называлі гэты звычай *«абліваха»*. У нядзелю хадзілі ў лес развіваць завітыя бярозкі і глядзець свае вяночкі, якія потым неслі да ракі і пускалі на ваду. Калі вяночак засох ці тануў у вадзе, гэта прадказвала няшчасце. І наадварот, чый вяночак быў зялёны і плыў па вадзе, таму павінна было спрыяць у справах і каханні.

У многіх месцах наступны тыдзень лічыўся часам кароткачасовай прысутнасці на зямлі русалак і называўся ***Русальным тыднем***. Асабліва вылучалі чацвер. Ён лічыўся днём самага інтэнсіўнага праяўлення русалак. У гэты дзень яны выходзілі з вады, прасушваліся, гулялі ў лугах, лясах, палях, каля рэк і азёр. Увогуле, русалкі ў народнай міфалогіі ўвасаблялі архаічны дух расліннасці. Час іх актыўнаўсці суаднесены з асноўнымі перыядамі вегетацыі раслін.



*«Провады русалак» (Любанскі р-н., Мінская вобл.)*

У часы суіснавання язычніцтва і хрысціянства архаічны вобраз русалкі паступова страціў вегетатыўную семантыку і набыў абрысы хтанічнай істоты ў жаночым абліччы. Сярод абрадаў Русальнага тыдня найбольш вядомы ***абрад провадаў русалкі***, які звычайна спраўлялі ў панядзелак пасля траецкіх дзён. У абрадзе ролю русалкі выконвала адна з дзяўчат, якую сяброўкі ўпрыгожвалі вяночкам, вадзілі вакол яе карагоды, спявалі. Пагуляўшы з русалкаю, дзяўчаты адводзілі яе ў жыта або на скрыжаванне дарог, на вясковыя могілкі і пакінуўшы там, уцякалі назад у вёску.

## Глава 4
## ЛЕТА

Лета пачыналася з **Купалля**, якое прымеркавана да летняга сонцавароту — 22–23 чэрвеня. Каталікі яго адзначаюць менавіта ў гэты час, а праваслаўныя ў ноч з 6 на 7 ліпеня.

Напярэдадні вечар завяршалі культавымі спевамі веснавых песень. Лічылася, што ў Купальскую ноч як сіметрычную Каляднай раскрываюцца нябёсы, і духі тагасвету з'яўляюцца ў свеце жывых. Гэта час найвышэйшага росквіту прыроды, залатая пара ўсяго жы-



*Падрыхтоўка купальскага вогнішча, вёскаВязынка (Мінскі р-н., Мінская вобл.)*

вога. Царква не змагла адвучыць людзей ад гэтага язычніцкага свята і з цягам часу прымеркавала да яго хрысціянскую урачыстасць у гонар Іаана Хрысціцеля — Святога Яна. У летапісах Купалле характарызуецца так:

«Сходятся народи — мужи и жены и девицы на нощное плещевание и бесчинный говор, на бесовские песни и плясание и на богомерзкие дела. И бывает отрокам осквернение и девкам разтление...»

Насамрэч нашы далёкія продкі святкаванне Купалля разглядалі як касмічны шлюб паміж Бацькам-Небам і Маці-Зямлёй. Іншымі словамі, гэта час злучэння супрацьлеглых пачаткаў Прыроды — вогненнага сонца і вады, у выніку такога эратычнага акту нараджалася жыццё на зямлі. Зразумела, што ў гэты пераломны момант, каб захаваць зямную гармонію і плоднасць, людзі павінны былі паўтараць тыя сакральныя зносіны, прыклад якіх давалі боствы. Таму падчас ігрышчаў на Купалле была дазволена поўная сексуальная свабода. Невыпадкова саюзы, заключаныя на Купалле, лічыліся непарушнымі, нават калі адбываліся без дазволу бацькоў і родзічаў.



*Падрыхтоўка да купальскага вогнішча (Міншчына)*

Мяркуюць таксама, што святкаванне Купалля ўзнікла яшчэ ў палеаліце і было элементам ініцыяцыі дзяўчат. Пра гэта гавораць шмат купальскіх песняў з тэкстамі пра страту дзяўчынаю свайго вянку — сімвала дзявоцкасці, і пра нараджэнне пазашлюбнага дзіцяці:

*«А на гарэ агонь гарыць,*
*А ў Манечкі жывот баліць.*
*— Ай, Ванечка, ратуй, ратуй,*
*Калысачку гатуй, гатуй!*
*Калысачку зыблівую*
*Дзіцятачку крыклівату».*

Праз дзевяць месяцаў — 25 сакавіка, на наступны год у маладых жанчын пачыналіся першыя роды. Дарэчы, да пазашлюбнага дзіцёнка грамада ставілася ў тыя часы як да раўнапраўнага.



*Карагод вакол купальскага вогнішча (Мінскі р-н., Мінская вобл.)*

Галоўнае абрадавае дзеянне на Купалле — распальванне пасля заходу сонца вогнішчаў і скокі праз іх. Такімі дзеяннямі дасягаліся дзве мэты. Па-першае, верылі, чым вышэй скачуць праз вогнішча, тым вышэй уродзіцца хлеб і лён. Па-другое, гэтыя скокі адганяюць нячыстую сілу, якая асабліва небяспечная ў купальскую ноч. А хто не хацеў скакаць праз агонь, таго падазравалі ў сувязі з нячысцікам. Яшчэ на вогнішчах спальвалі старыя рэчы і знятыя з хворых дзяцей кашулі, каб разам з імі згарэлі і хваробы, праз агонь для абароны ад эпідэмій праганялі скаціну.

Палешукі дагэтуль рытуальныя купальскія вогнішчы распальваюць старажытным чынам — трэннем аднаго кавалка дрэва аб другі і ў выніку здабываюць «*жывы агонь*». Вогнішчы звычайна распальваюць на беразе ракі або возера, а ў іх цэнтры ставяць высокую жардзіну, якая сімвалізуе Сусветнае Дрэва. Да жардзіны прымацоўваюць смаляное кола ці бочку — сімвалы сонца. Потым бочку або кола скочвалі з узвышша. Лічылі, што такія рытуальныя дзеянні дапамагаюць сонцу быць больш яркім і даваць больш цяпла для багатага ўраджаю.

Другая важная частка святкавання Купалля звязана з вадой. У гэтую ноч дзяўчаты і хлопцы «*гралі ў ваду*»: аблівалі адзін аднаго вадой. Былі ўпэўнены, што хлопец ажэніцца менавіта з той дзяўчынай, якую яму ўдасца абліць. Згодна з павер'ямі, на світанку пасля купальскай ночы сонца нібыта «*купаецца*», а вада ў крыніцах і рэках робіцца лекавай і цудадзейнай. Таму існавала завядзёнка з узыходам сонца праводзіць рытуальнае абмыванне або купанне. Таксама хадзілі на «*янаўскаю расу*»: «*На самога Яна ідуць рана перад сходам сонця па поле, дзе качаюцца ў росі*». Такой расе прыпісваліся асаблівыя магічныя ўласцівасці. Гаспадыні, якія змаглі сабраць расу, выкарыстоўвалі яе для павялічэння надояў малака. На Тураўшчыне яшчэ ў 1920-я гг. жанчыны перад узыходам сонца бралі дзяцей і ішлі на аўсянае



*Скокі праз купальскае вогнішча (Міншчына)*

поле. Каб з цела выйшла любая хвароба, яны голымі качаліся па аўсу.

Прынята было таксама рабіць ляльку, якую ў некаторых месцах называлі ***Купалай***. Гэту ляльку з песнямі і скокамі неслі да ракі і тапілі. Даследчыкі лічаць, што Купала — займеннік нейкага старажытнага боства ўрадлівасці, імя якога катэгарычна забаранілі ў часы хрысціянізацыі. Гэтым боствам магла быць багіня Мара, прыходу якой чакалі падчас летняга сонцавароту і хацелі заручыцца яе падтрымкай, але ў той жа час яе вельмі баяліся. Пазней гэтае боства сталі параўноўваць з нячыстай сілай — ведзьмай, таму напрыканцы купальскіх абрадавых дзеянняў яе імкнуліся знішчыць. Дзеля гэтага ляльку ведзьмы, якую рабілі зануч і саломы, спальвалі на вогнішчы.

Палешукі замест лялькі прымацоўвалі на шост чэрап каня ці каровы, або проста пук саломы. У вёсцы Сіманавічы Драгічынскага раёна кожны з прысутных кідаў у падвешаны чэрап камянямі або біў кіямі, каб хутчэй збіць яго ў агонь. Таксама ў вогнішчы кідалі косткі кароў, коней, авечак. Усё гэта сімвалізавала пахаванне ведзьмы. У некаторых месцах Усходняга Палесся скакалі не праз вогнішча, а праз кучу пяску, абкладзеную крапівой. Верылі, што крапіва замест агню выконвае ачышчальную функцыю. У вёсцы Альсевічы Баранавіцкага раёна бралі барану, неслі яе ў канец сяла, упрыгожвалі кветкамі, вянкамі, а потым палілі.

На світанку пасля купальскай ночы жанчыны і дзяўчаты ішлі на луг збіраць кветкі і зёлкі, якія менавіта ў гэты дзень набываюць асаблівую гаючую сілу. Прычым расліны збіралі так, каб іх была няцотная колькасць, з іх вілі вяночкі, якія потым уторквалі ў сцены паміж бярвёнамі і пры гэтым загадвалі на лёс кожнага з сям'і. Таксама іх выкарыстоўвалі на працягу года як лекавы сродак, а дзяўчаты клалі іх пад падушку, каб убачыць у сне нарачонага. Паўсюдна існавала павер'е пра тое, што ў купальскую ноч — адзіную ноч на год — квітнее папараць, і хто паспее схапіць такую кветку, таму стане зразумелай мова птушак і звяроў, адкрыюцца скарбы.

Паводле шматлікіх этнаграфічных апісанняў XIX ст., у розных кутках Беларусі Купалле святкавалі па-рознаму. Так, жыхары Петрыкава на Гомельшчыне святкавалі Купалле на Лысай Гары. Шост, абвіты зелянінай, сюды несла так званая Купальніца — выбраная сярод астатніх самая прыгожая дзяўчына, якая з галавы да ног была абвешаная зелянінай, а на галаве яшчэ быў і вянок. Яна ўмацоўвала ў ямцы шост, а другія дзяўчаты кідалі вакол яго свае вяночкі. Як толькі заходзіла сонца, Купальніца з завязанымі вачыма садзілася ў ямку. Карагод моладзі кружыўся вакол шаста з рознымі прыпеўкамі.

Купальніца падымала вянкі і раздавала дзяўчатам. Калі трапляўся вянок са свежых кветак, то гэта азначала шчасце і багацце ў шлюбе, а калі з сухіх і падвялых — няшчымніцу і гаротнае жыццё. Па заканчэнні варожбаў запальвалі вогнішча, дзе згараў і шост, і зяляніна.

Да нашага часу захавалася традыцыя хадзіць да мясцовых сакральных прыродных аб'ектаў. Купальскую ноч шмат людзей праводзіць каля Святога возера ў лесе паблізу вёскі Шапялевічы Круглянскага раёна на Магілёўшчыне. На наступны дзень тут адбываецца водасвяцце, збіраецца шмат людзей з усяго наваколля. Паломнікі акунаюцца ў возеры, з навакольных дубочкаў зрываюць галінкі, мачаюць іх у ваду і потым дома кладуць за абразы.



*Выраб купальскай лялькі «Купалкі» (Мінскі р-н., Мінская вобл.)*

Купальскія вогнішчы і ў наш час запальваюць на сакральных узгорках. Гэта Вясёлая Гара каля вёскі Каптаруны Пастаўскага, гара Горад каля вёскі Замасточча Докшыцкага, Святаянская Гара каля вёскі Смаляры Барысаўскага, Дзявочая Гара каля вёскі Дуброва Маладзечанскага раёнаў і г.д. Вогнішчы ладзяць і на высокіх гарадзішчах: Грэск Слуцкага, Маскавічы і Пусташкі Браслаўскага, Латыгава Верхнядзвінскага раёнаў, і нават на курганных могільніках, як у вёсцы Старына Ушацкага раёна. Святаянскімі лічацца крыніцы каля вёсак Чарневічы, Бабруйшчына Глыбоцкага, Любча Барысаўскага, Кракотка Слонімскага раёнаў і іншых.

На Купалле і цяпер пакланяюцца сакральным валунам каля вёсак Крамянец Лагойскага, Клінавая Шаркаўшчынскага, Мікулкі Пастаўскага, Воўкаўшчына Мёрскага раёнаў. У вёсцы Суша Лепельскага раёна на выспе сярод балота некалі ляжаў камень, які лічыўся лекавым. Калі дзеці кепска спалі ўначы, капрызілі, на Купалле іх насілі да гэтага каменя.

Каля вёскі Гародня на беразе Бярэзіны Дняпроўскай у сярэдзіне XIX ст. у купальскую ноч збіраліся да каменя, які ляжаў на ўзвышшы, абкапаным канаўкай. На працягу ўсёй ночы таньчылі і спявалі. Паводле тагачасных этнаграфічных запісаў, старажылы ўспаміналі, што «*на гэтым месцы раней адбывалася служэнне паганскім балванам*». У 1930-я гг. непадалёк ад вёскі Перуноў Мост на Чэрвеншчыне на выспе сярод балота ляжаў вялізны валун. Сюды на Купалле з усяго наваколля, больш як за 10 км, па патаемных сцежках сыходзілася моладзь і ладзіла гулянку на ўсю ноч.

У святочную ноч збіраліся да многіх Чортавых і Перуновых камянёў. Так, у пачатку XX ст. каля вёскі Стары Пагост Мёрскага раёна моладзь скакала праз Чортаў камень. Не так даўно хадзілі да Чортавага каменя і на ўзвышшы Груд сярод Пеннага балота каля вёскі Лапухова ў Слонімскім раёне. Паводле аднаго з паданняў, тут была вёска, якую спаліў Змей.

Шмат паданняў гаворыць, што менавіта ў Купальскую ноч выходзяць з зямлі зачараваныя скарбы. Пра Замкавую Гару ў Віцебску расказвалі, нібыта ў нетрах гары жыла заклятая царэўна. У белым адзенні, асветленая агнём, яна сядзела на залатым троне, а каля ног ляжалі горы золата і дыяментаў. Напярэдадні Купалля царэўна выходзіла з гары і рассыпала вакол сябе дыяменты. Але як толькі да іх дакранапася рука чалавека, яны парахнелі.



*Варажба на суджанага*
*(Валожынскі р-н, Мінская вобл.)*

Да перыяду летняга сонцастаяння адносіцца свята ***Пятра і Паўла***. Паводле каталіцкага абраду, яно адзначаецца 29 чэр-

веня, а ў праваслаўных свята называецца ***Пятро***, або ***Пятроўка***, і ладзіцца 12 ліпеня.

На думку даследчыкаў, гэты дзень замяніў нейкае язычніцкае свята. Пацверджаннем ёсць звычай, які існаваў яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. на тэрыторыі сучаснага Докшыцкага раёна, на водападзеле Нёманскай і Дняпроўскай водных сістэм. На могілках каля вёскі Гняздзілава рэзалі казла, а на гары варылі піва. У гэты ж дзень рэзалі казлоў і на гары каля вёскі Верацейкі. Там жа пяклі мяса, елі самі і яшчэ прадавалі на кірмашы. У фальклоры Святы Пятро надзяляецца рысамі і клопатамі селяніна-земляроба: «*Святы Пятро жытцо спяліць*», «*жыта родзіць*», «*сярпы востра*», налівае «*жытцу ядро*».



*Збор купальскіх зёлак*
*(Любанскі р-н, Мінская вобл.)*

У легендах гэты святы паказаны як божы служка, які ходзіць па зямлі ў выглядзе жабрака і карае сквапных і глухіх да чужога гора людзей, ён таксама можа «*наладзіць надвор'е*», разагнаць аблокі. Гэты вобраз сведчыць, што ў часы язычніцтва Святому Пятру адпавядала другое боства, якое спрыяла і дапамагала земляробу ў яго штодзённых справах.

2 жніўня беларусы адзначаюць свята ў гонар Святога Іллі, якое ў народзе называлі ***Ілля***, або ***Ільлюк***. Беларуская міфалогія надзяляе гэтага святога функцыямі Перуна — бога навальніцы, гаспадара грому, маланкі і дажджу. Вядома, Пярун быў антаганістам і праціўнікам другога язычніцкага бога — Вялеса. Яшчэ не так даўно падчас пажару ад маланкі людзі станавіліся тварам да агню з абразом Святога Мікалая, займенніка Вялеса. Таксама гэты абраз клалі на накрыўку ад дзяжы і падчас моцнага граду выносілі яе на двор, каб супыніць непагадзь.

Ільін дзень лічыўся каляндарнай мяжой сезонаў. З гэтага дня пачыналіся першыя прыкметы восені, ночы рабіліся больш золкімі, а

дні карацейшымі, ападала лісце, сохла трава, халадала вада ў рэках, змяняліся паводзіны звяроў, птушак, насякомых. Сяляне гаварылі: «*Прыйшоў Ілля, то і лета няма*» або «*На Ілю да абеда лета, а па абедзе восень*».

У той жа час усе тыя змены, якія сведчаць пра набліжэнне восені, згодна з народнымі вераваннямі адбываюцца па волі ліхіх духаў і розных нячысцікаў. Таму мноства легенд і паданняў распавядаюць пра тое, як Святы Ілля ўступае ў барацьбу з усёй гэтай нечысцю. Пасля Іллі забаранялася купацца ў рэках і азёрах. Лічылі, што з гэтага часу чэрці хаваюцца ад стрэл прарока Іллі ў ваду і могуць зацягнуць чалавека на дно, каб забраць ягоную душу.

На Іллю былі распаўсюджаны калектыўныя трапезы, або *братчыны*. Яны суправаджаліся ахвярным забіваннем жывёл — быка, цяляці, барана і прыгатаваннем піва. Цудадзейныя якасці прыпісваліся косткам з'едзенай жывёлы, асабліва гэта дапамагала ў паляўнічай справе.

## Глава 5
## ВОСЕНЬ І ЗБОР УРАДЖАЮ

Ужніўні наступае час збору ўраджаю і ўгасання прыроды. Жніўеньскія Спасы, або Іспасы, — старажытныя святы, звязаныя з выспяваннем пладоў і культам урадлівасці. Гэта цэлы комплекс архаічнага ўшанавання дароў прыроды. Хутчэй за ўсё ў язычніцкай рэлігіі Спас увасабляў у сабе не толькі Дух ураджаю, а цалкам верагодна, што ўзначальваў цэлы пантэон Духаў поля, лесу, лугу і г.д. У замовах, абрадавых песнях, маленнях і прашэннях нашы продкі звярталіся непасрэдна да гэтага міфічнага персанажа: «...*Святы Спас, спасі нас, спасі нашу душачку!*» Сённяшнія Спасаўскія сияткі ў беларускім народным календары складаюцца з трох частак, якія адзначаюць па новым стылі 14, 19, 28/29 жніўня.

На ***Першы Спас***, або ***Мядовы Спас***, ***Макавей*** паўсюдна ходзяць да культавых крыніц, нясуць туды гародніну, мак, мёд і ўсё гэта асвячаюць там. Зрубы крыніц упрыгожваюць зелянінай, кветкамі і ручнікамі. Прыкладам, шматтысячнае паломніцтва штогод спрадвеку адбывалася да Сіняга калодзежа, або Сіняга ключа, што паблізу вёскі Кліны ў Слаўгарадскім раёне. Некалі каля гэтай крыніцы, якая ўяўляе з сябе невялікае азярцо, скідвалі старое адзенне і апраналі новае. Паломнікі і ў наш час стараюцца тройчы прайсці па ледзяной вадзе туды і назад. Падчас гэтага свята і цяпер шмат людзей збіра-



*Макавей, вёска Рудня Барталамееўская*
*(Чачэрскі р-н, Гомельская вобл. Фота 1990-х гг.)*

еццa да Святога калодзежа ў лесе каля вёскі Дарасіно Любанскага раёна. На Макавей раней хадзілі да крыніц і каля вёсак Карытніца Бялыніцкага, Рудня Чэрвенскага, Прудзінкі Верхнядзвінскага раёнаў і іншых.

Спрадвеку нашы продкі надавалі вялікае значэнне маку. На Першы Спас жанчыны гатавалі з новага хлеба праснакі, варэнікі, пірагі з макам. А ўсё таму, што ў традыцыйнай абраднасці мак успрымаўся як ахоўны сродак ад ведзьмакоў і дэманічных істот. Асвечаны мак захоўвалі, як і святую ваду, на працягу ўсяго года. На Тураўшчыне і Гомельшчыне на Макавея макам абсявалі гаспадарчыя пабудовы і хату *«ад нябожчыкаў»*. Гомельскія сяляне пяклі пірагі з асвечаным макам і морквaю, лічылі, што *«на Макавея трэба ўволю наесціся маку»*.

***Другі Спас***, або ***Вялікі***, ***Сярэдні***, ***Яблычны***, — асноўнае і галоўнае спасаўскае свята ў нашага народа. У гэты дзень катэгарычна забаранялася працаваць. Асвячаюць каля крыніц (цяпер і ў царквах) яблыкі, грушы, мёд, насеннае жыта. І толькі пасля асвячэння дазвалялася есці яблыкі і грушы, якія да гэтага часу забаранялі ўжываць. Такое табу асабліва тычылася жанчын. Верылі, што ў жанчыны, якая пакаштуе раней тэрміну яблыкі або грушы, будуць паміраць дзеці. Пра гэта гаворыць і шырока вядомае паданне. Быццам, калі жан-

чына, у якой памерлі дзеці, будзе есці да Яблычнага Спаса садавіну, то на тым свеце ў Спасаў дзень яе дзеткам Бог не дасць *«райскіх яблычак»*, і спашлецца на тое, што ягонае яблычка з'ела маці. А калі жанчына ўсё-такі дапусціла такі грэх, ёй забаранялі есці садавіну на працягу 40 дзён пасля Спаса.

Ад Першага да Другога Спаса пчаляры вымалі з вуллёў запоўненыя рамы з сотамі, частавалі спасаўскім мёдам сваіх знаёмых, сяброў і ўсіх тых, хто заходзіў на свята да іх у двор. Былі ўпэўнены: калі пчаляр не пачастуе суседніх дзетак мёдам, то ў яго *«прападуць пчолы»*. Паводле павер'я, толькі шчодрага пчаляра і ў будучым годзе *«Бог надзеліць»* багатым медазборам і добрымі пчоламі.

На Другі Спас яшчэ і ў наш час ідуць да крыніц у вёсках Ліпск, Маргавіца і Старая Вілейка Докшыцкага, Майск Бялыніцкага раёнаў. Шмат дзе, асабліва на Палессі, у гэты дзень ходзяць на могілкі і кладуць на магілы сваіх родзічаў яблыкі.



*Яблычны Спас, яблыкі на магілах продкаў (Салігорскі р-н., Гомельская вобл.)*

***Трэці** Спас*, або ***Малы***, ***Хлебны***, ***Арэхавы***, вызначае заканчэнне асноўных уборачных работ. Па ўсёй Беларусі асвячалі насеннае зерне для пасеву азімых культур. Дзеці збіралі ў лесе грыбы, арэхі, ягады. Палешукі на Хлебны Спас свяцілі разам з жытам пахучыя зёлкі, якія збіралі на лузе і каля рэк, ад чаго свята называюць яшчэ ***Зельнаю***. У гэты час таксама наведвалі прыродныя сакральныя мясціны, дзе адбываюцца маленні. Прыкладам, і ў наш час на Трэці Спас ідуць да крыніцы каля вёскі Карытнае Асіповіцкага раёна, збіраюцца на ўз-

горках каля вёсак Будча Ганцавіцкага, Вярховічы і Доўбізна Камянецкага раёнаў.

Жнівень атрымаў сваю назву пераважна ад таго, што ў гэты час прыступаюць да ўборкі жыта, а ўвесь комплекс работ называецца ў нашай мове ***жніво***. Спрадвеку пачатак жніва, як і яго заканчэнне, суправаджаліся земляробчымі абрадамі, якія падзяляюцца на тры часткі: *Агледзіны* і *Пакрыванне поля*, *Зажынкі* і *Дажынкі*.



*Жніво (гравюра XIX ст.)*

Абрад ***Агледзін*** на пачатку жніва вядомы ва ўсёй Беларусі. Звычайна сам гаспадар абыходзіў вакол поля, зрываў у розных месцах па каласку, вызначаў на смак і цвёрдасць зярняты, прыглядаўся: ці не зрабіла дзе ведзьма заломы. Потым ён маліўся духам поля і нябесным багам за выспеўшае збожжа, прасіў у іх дазволу на пачатак жніва. Яшчэ ў пачатку XX ст. у сялян Віцебскай і Мінскай губерняў бытаваў абрад ***Пакрывання поля***. Ён заключаўся ў тым, што зранку, да ўсходу сонца, на поле выпраўлялася маладзіца, якая нядаўна выйшла замуж, а з ёю некалькі дзяўчат. Яна нажынала адзін снапок жыта, абмотвала яго кавалкам новага палатна або ручніком, наміткаю і потым падкідала ўверх, прыгаворваючы:

*«Пакрыла ніўку*
*На добрую спажыўку,*
*Парадзі, Божа,*
*Наша збожжа!»*

Абрад ***Зажынак*** пачынаўся ў суботу надвячоркам ці ў нядзелю. Перад гэтым прыбіралі на двары і ў хаце, стол засцілалі белым абрусам, клалі на яго хлеб і соль. Зажынаць ніву ішлі ўтраіх: гаспадыня з дочкамі або нявесткамі. Усе апраналіся ў белае адзенне. Бралі з сабой на ніву хлеб, соль, сыр, грамнічную свечку. Зажынальніца рытуальна віталася з нівай.

Першую зжатую жменю житнёвых сцяблінак яна скручвала і пападпяразвала. Потым нажаўшы сноп, ставіла яго і казала: *«Стаўлю*

*сноп на сто коп, на тысячу мерак!»* Першы сноп лічыўся сімвалам жыватворнай сілы.

Падчас жніва вельмі прымхліва ставіліся да сярпа, які лічыўся магічнай прыладай працы, дзе ўвасаблялася частка жыццёвай сілы самой жняі. Жнеям забаранялася перадаваць серп з рук у рукі, утыкаць яго ў зямлю. На працягу ўсяго жніва асцерагаліся заносіць серп у дом, каб не наклікаць дождж.

Старадаўняя абрадавая урачыстасць ***Дажынкі*** — свята ў гонар заканчэння жніва і ў гонар апошняга снапа. Яго пачыналі на ніве. Да ўзыходу сонца маладзіца ў суправаджэнні дзяўчат нажынала невялікі сноп, з якім у абдымках качаліся па полі, куляліся праз яго. Таксама сплялі дажынкавы вянок і ўплялі туды буйнейшае калоссе. Каб заручыцца падтрымкай палявых духаў і забяспечыць ураджай на наступны год, рабілі *«завіванне барады»*, ці абрад пад назвай *«на бараду Богу»*: пакідалі нязжатымі некалькі каласкоў і звязвалі іх уверсе стужкай ці жытняй саломай.

Дзякуючы такой «барадзе» дзяўчаты варажылі падчас дажынак на будучых мужоў. Яны садзіліся вакол «барады» колам і глядзелі, да каго і хто выпаўзе адтуль. Калі прыпаўзе чарвячок, ды яшчэ «касматы» — чакай багатага мужа, калі ж маленькая казурка — муж будзе бедны, а калі выбежыць павучок, то ісці дзяўчыне замуж за ўдаўца.



*Дажынкі ў Шчучынскім р-не. (Гродзенская вобл.)*

Дажынкавы сноп аздаблялі і ўсяляк упрыгожвалі. У некаторых мясцінах да снапа прыраблялі рукі, апраналі ў белую кашулю, ягоную вяршыню аздаблялі вянком або пакрывалі наміткай, надзявалі кічку, а бывала проста накрывалі ручніком. Потым сноп урачыста неслі ў хату гаспадара і на час святочнай вячэры ставілі на покуці, а пасля адносілі ў гумно. Часта такі сноп называлі Жытняй Бабай. На Капыльшчыне апошні сноп заносілі яшчэ ў хату да хворых, да цяжарных жанчын і да маладзіц, якія сёлета выйшлі замуж. Тыя ў падзяку павінны былі прапанаваць хлеб і гарэлку. На Дажынкі гатавалі абрадавыя стравы — густую кашу, бліны, масла, сыр, гарэлку. Асаблівая ж увага надавалася дажынкавым песням.

У верасні святкавалі ***Багач***, або ***Багатнік***, ***Святок***, — свята ўраджаю, якое прыпадае на дзень восеньскага сонечнага раўнадзенства (22–23 верасня). Увогуле Багачом вяскоўцы называлі лубку, запоўненую зернем «*з новага хлеба*», у якім стаяла свечка. Жыта для Багача прыносілі па жменьцы ад кожнага гаспадара, воск на свечку таксама збіралі з усёй вёскі. Усёй грамадой, якая ўрачыста несла лубку з жытам і запаленай свечкай, абыходзілі ўсе двары паселішча і вакол статка сялянскай жывёлы. Пасля абраду абыходу вёскі і маленняў лубку адносілі ў якую-небудзь хату і ставілі ў чырвоны кут да наступнага Багачоўскага свята, але кожны год у новага гаспадара. Верылі,



*Багач у Вязанцы (інсцэніроўка)*

што Багач прыносіць вёсцы і асабліва таму гаспадару, у якога ён стаіць, багацце і шчасце. У хаце, дзе Багач заставаўся на год, ладзілі рытуальнае застолле. Жыхары Віленшчыны падчас Багачоўскага свята выпякалі з новага ўраджаю вялікі каравай. На Багач праводзіліся разнастайныя кірмашы.

Навукоўцы лічаць, што свята Багач у мінулым заключала ў сабе, з аднаго боку, ушанаванне і ахвярапрынашэнні Дажбогу, а з другога — маленні да Бога-Сонца. Дажбога ўслаўлялі за дастатак і багацце на гаспадарчых падворках, а боства Сонца прасілі абараніць родавае паселішча, сабраны ўраджай і здароўе людзей ад усялякіх няшчасцяў. У ахвяру Дажбогу прыносілі жывёлу. Рэшткі такога звычаю захаваліся і ў наш час у Заходняй Беларусі, дзе спецыяльна да Багача рэжуць барана ці авечку. А калі нейкі гаспадар не выканае ці забудзецца на традыцыю, вераць, што яго барана «*воўк зарэжа*».

У паўночна-заходніх раёнах Беларусі ў гэтыя дні адзначалі свята ўраджаю пад назвай ***Навіна***. Свята мела сямейны пачатак, на яго збіраўся ўвесь род. У гэты час забівалі ахвярную жывёлу: барана, вепрука або цялё. На стол трэба было зварыць і прыгатаваць стравы з усяго, што вырасла за лета. Усё, што стаяла на стале і што каштавалі першы раз: ягаду, садавіну, гародніну, таксама называлі *Навіной*. Ушанаванне Навіны павінна было спрыяць здароўю людзей. На Мядзельшчыне казалі: «*Навіна ў рот, // Здароўе ў жывот*».

Шмат павер'яў і прыкмет звязана з часам адлёту птушак у вырай і запаўзаннем змей на зімоўку. У народзе гэты час называлі ***Здзвіжанне*** або ***Звіжанне***, ***Узвіжанне***. Паводле міфаў, гадзюкі, як і птушкі, маюць свой асабісты вырай. На Здзвіжанне яны збіраюцца ў адно месца і потым паўзуць на зіму ў вырай, а на чале змяінага шэсця выступае цар вужоў у залатой кароне. Згодна з народнымі ўяўленнямі, да гэтага часу ўсё ў прыродзе павінна быць «*здвінута*», а ўраджай звезены з поля. Нават гаспадары, калі хочуць, каб у іх атрымаліся моцныя засоленыя агуркі, павінны колькі разоў перасунуць бочку, дзе яны



*Узвіжанне, змяіны кароль склікае сваіх падапечных на зімоўку (мастак В. Славук)*

соляцца. Напярэдадні зімовых халадоў сама зямля нібыта «*зачыняецца*» да наступнай вясны. І сонца на Узвіжанне «*гуляе, прыгае, дзвіжацца*».

У хрысціянскім календары гэты дзень звязваецца з ушанаваннем крыжа Гасподня. У каталікаў яно адзначаецца 14 верасня, ў праваслаўных 27. Зразумела, што хрысціянскае свята замяніла сабой нейкае язычніцкае, якое завяршалася шасцімесячным знаходжаннем на зямлі некаторых відаў птушак і змей.

Ушанаванне каменных крыжоў у гэты дзень адбывалася на Тураўшчыне. Тысячы паломнікаў ішлі ў вёску Пагост, дзе ў малой царкве на могілках стаяў каменны крыж пад назвай «Каменная Божая Маці» або «Чэсны Крыж». На крыж вешалі палотны, клалі грошы. Потым вакол царквы ладзілі кірмаш . Ён вызначаўся тым, што мясцовыя жыхары не мелі права нічога прадаваць, а толькі куплялі.

Многія даследчыкі атаясамліваюць святочныя ўрачыстасці гэтага перыяду са старажытным абрадам ушанавання коміна або пасвета — прыладаў для асвятлення сялянскай хаты. Гэты абрад, які адбываўся напрыканцы верасня, сімвалізаваў першае пасля летняга перапынку запальванне лучыны і меў назву ***Жаніцьба коміна***. Комін нібыта *жаніўся* з хатай, з печчу або нават з жаночай працай доўгімі зімовымі вечарамі. Такі абрад з’яўляецца рэліктам старажытнага культу хат-



*Жаніцьба коміна ў хатцы-музеі, г. Гомель (інсцэніроўка)*

няга агню. А сам комін суадносіцца з Сусветным дрэвам-слупом як цэнтральнай воссю хаты.

Увосень народны каляндар вылучае ў другой палове верасня або ў пачатку кастрычніка перыяд ад некалькіх дзён да двух тыдняў. Гэты час стаіць цёплае надвор'е і завецца ў народзе ***Бабіна Лета***. Назва пайшла ад кароткага «бабінага века». У гэтыя дні праводзілася варажба на шчаслівую бабку-павітуху.

На 14 кастрычніка прыпадае свята ***Пакровы*** (Пакравы). Этымалогія назвы паходзіць ад слоў «пакрываць», «пакрыць». У народзе казалі: «*святы Пакроў пакрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам*». Гэта азначае адміранне прыроды напярэдадні зімовых халадоў. Таму прыпыняліся ўсе палявыя работы. Зямля павінна адпачыць да наступнага лета і чапаць яе пасля Пакравоў ні ў якім разе нельга. На Віцебшчыне падчас свята пяклі пакроўскія пірагі і абыходзілі з імі гаспадарчыя будынкі, дакраналіся пірагом да кожнай страхі. Лічылі, што пасля гэтага моцныя вятры і буры не змогуць разбурыць стрэхі, якія тут рабілі з жытняй саломы.

Яшчэ і цяпер на Пакравы, як і тысячу гадоў таму, ходзяць на пакланенне ўзгоркам, камяням, крыніцам і могілкам. На Пакравы шмат людзей збіраецца на могілках каля вёскі Веляцічы Барысаўскага раёна. Некалі гэтае месца ўяўляла сабой выспу сярод балота, куды вяла грэбля. Перад выспай быў святы калодзеж, дзе ў гэты дзень асвячалі ваду, якая пасля асвячэння лічылася гаючай: дапамагала ад хвароб вачэй. Каля калодзежа праводзіліся кірмашы. Калі паломнікі ішлі да могілак, то кідалі ў балота драўляныя кладкі з выявамі слядоў чалавека і хатняй жывёлы, а таксама вачэй і рук чалавека. Гэта азначала своеасаблівае ахвяраванне іншасвету з мэтай атрымання здароўя.

Вылучалі таксама пэўныя дні перад Пакравамі і пасля іх. Напрыклад, у пятніцу перад святам ішлі на крыніцу каля вёскі Жаробычы ў Шумілінскім і каля вёскі Жукава ў Гарадоцкім раёнах. У трэцюю пятніцу пасля Пакравоў каля Бягомля ў Докшыцкім раёне на могілках палілі вогнішчы. На дзевяты дзень пасля свята вялікі кірмаш праходзіў у вёсцы Янчына Барысаўскага раёна. У савецкія часы ўлады змагаліся з такімі кірмашамі, іх нават разганяла міліцыя.

Восенню адзначаюцца самыя галоўныя дні беларускага народнага календара, звязаныя з памінаннем продкаў — ***Дзяды***. Іх яшчэ называюць *Восеньскія*, або *Дзмітраўскія Дзяды*; *Вялікія Асяніны*, *Тоўстая Вячэра*, *Хаўтуры*.

У некаторых раёнах Беларусі напярэдадні Дзядоў адзначалі яшчэ памінальны дзень *Бабы*. У вераваннях нашых прашчураў Дзядамі і



*Дзяды (памінкі) на Смаленскіх могілках (малюнак 1881 г.)*

Бабамі называлі душы памерлых продкаў. Верылі, што ў такія дні яны прыходзяць у свае хаты на памінальную вячэру. Прычым робяць так «чыстыя» душы, тыя, хто памёр сваёй смерцю. Грэшныя ж душы могуць толькі зазірнуць праз акно хаты. У розных рэгіёнах Беларусі Дзяды адзначалі па-рознаму. Прыкладам, на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў новай хаце Дзяды не спраўлялі, пакуль у ёй хто-небудзь не памрэ. Палешукі асобна паміналі мужчын у пятніцу вечарам, а жанчын у суботу вечарам. У некаторых раёнах у гэтыя дні хадзілі на могілкі, ставілі на магілах цырамкі, каменныя пліты, драўляныя калоды, абкладалі магілы дзірваном і камянямі.

У цэнтры абраду была вячэра з галоўнай памінальнай стравай — куццёй. Увогуле, колькасць страў у розных месцах Беларусі была рознай і вар'іравалася ад сямі да дванаццаці. Сярод такіх страў былі: гарох з макавым малаком, крупнік з грыбамі ці рыбай, кіслая капуста з ялавічынай, верашчака з кілбас і бліны. На стол ставілі таксама «*дзедаўскую*» чарку, міску і лыжку, куды кожны адліваў напоі і адкладаў ежу. Падчас вячэры не зачынялі комін, не замыкалі дзверы, не карысталіся нажом, гаварылі толькі пра продкаў. У канцы вячэры гаспадар казаў: «*Святыя дзяды, вы сюды прыляцелі, пілі, елі, ляціце цяпер да сябе*».

Прыкладам, на Міншчыне ў пачатку XX ст. Дзяды адзначалі так: на стале павінна было быць 9 страў, у склад якіх уваходзілі галовы

парасяці, барана і пеўня. З кожнага блюда гаспадар з'ядаў першыя тры лыжкі, або выліваў іх пад стол ці за акно — для душ. Напрыканцы абеду ён павінен быў з'есці адну з трох галоў, а астатнія аднесці на могілкі і аддаць хлопчыкам, якія спецыяльна для гэтага там збіраліся. Рэшткі вячэры нанач пакідаліся на стале. У хаце, дзе ладзіліся Дзяды, на свой ложак не клаліся, яго вызвалялі для душ памерлых. А для сябе качаргой падцягвалі пасцель на сярэдзіну пакоя. Апроч таго, на кожнае акно ставілі кілішак гарэлкі і кавалак хлеба.

На тэрыторыі Докшыцкага раёна і ў басейне ракі Дзісны Дзяды называліся Стаўроўскімі. Падчас памінальнай вячэры ўся сям'я тройчы на каленях поўзала вакол стала і пры гэтым паўтаралі: «*Шаўры, гаўры, сам прыбывай дзе к нам!*» Потым сядалі за стол.

Каля Бягомля ў Докшыцкім раёне перад вячэрай мыліся ў лазні, а калі сыходзілі адтуль, адлівалі вады і пакідалі венік для душ памерлых. Пасля заходу сонца накіроўваліся на магілу памерлага, везлі з сабой дзёран, венік і дровы. Разводзілі вогнішча і пры ягонам святле абкладалі магілу дзірваном, абмяталі вакол. Венік пакідалі на магіле. Апоўначы ўсе сыходзілі, а запаленыя вогнішчы пакідалі. На наступны дзень апоўдні зноў ішлі на могілкі «будзіць» памерлых. Пасля гэтага вярталіся дадому, дзе адбывалася застолле. Напрыканцы перакідваліся качанамі капусты, спявалі, ладзілі ігрышчы.



*Дзяды. «Ахвярная вячэра на Стаўры» (мастак С. Багенскі)*

# Глава 6
# МАЛАДЗІК

Першабытная міфалогія звярталася да месяца часцей, чым да сонца. Народны каляндар, які адзначаў дынаміку прыродных працэсаў і гаспадарчай дзейнасці на працягу года, быў звязаны з месяцам. Поўны цыкл росту і старэння Месяца складае каля 28 сутак, дакладней 27 дзён, 7 гадзін і 43 хвіліны. Ён дзеліцца на чатыры фазы, або квадры: *маладзік*, *поўня*, *сход*, *ветах*.

Значная ўвага надавалася першай квадры месяца. Яна цягнецца 7–8 сутак і лічылася спрыяльнай для варажбы. Паміж ветахам і маладзіком ёсць перыяд, калі месяц не бачны на небе працягам аднаго ці двух дзён. На малады месяц — маладзік — заўсёды чакалі змены надвор'я.

Згодна з павер'ямі, пасля смерці душы праведнікаў адыходзяць спачатку на Месяц, каб потым узняцца яшчэ вышэй. У квадрах месяца бачылі перыяды ягонага жыцця: дзяцінства, сталасць, старасць, смерць, а затым уваскрашэнне і нараджэнне зноў.

У старажытным календары балтаў і славян тыдзень налічваў дзевяць дзён. Адпаведна і месяц складаўся з 27 дзён. Таму лічба 9 замацавалася ў нашым фальклоры як сакральная. Яна часта фігуруе ў казках, замовах, легендах, дзе мы сустракаем такую колькасць багатыроў, разбойнікаў, сыноў, дзяўчат, манахаў і інш. Гэтая лічба ў фальклоры таксама звязана з дзевяццю месяцамі жаночай цяжарнасці.

Месяц у фальклоры выступае сімвалічна як жаніх, а ягоная нявеста — Сонца, якія ствараюць ідэальную «*нябесную сям'ю*». Так, у калядных песнях гаворыцца: «*Ясны месяц — сам гаспадар, красна сонца — жана яго*». У сярэдзіне XIX ст. этнографы на Валожыншчыне зафіксавалі цікавы звычай: як толькі пачынаў праяўляцца на небе месяц, сяляне выходзілі на двор і віталі яго: «*Малады маладзічок, вялікі князь, віншуй нас, дай нам здароўя, спосаб і раду да жыцця, сабе на прыбытак, а нам на спасенне!*»

Месячны каляндар адлюстраваны ў шматлікіх амулетах, знойдзеных на тэрыторыі нашай краіны. Так, у пачатку II тысячагоддзя на тэрыторыі Беларусі былі шырока распаўсюджаны падвескі ў выглядзе шырокарогага месячыка. Іх насілі або нанізвалі разам з каралямі, а таксама прымацоўвалі ў якасці скроневых упрыгажэнняў. Сустракаліся і манетападобныя падвескі з выявай галавы быка. Вядома, што бык у народнай культуры зрабіўся аналагам начнога

святіла, дзякуючы падабенству рагоў з паўмесяцам. Такая асацыяцыя бярэ свой пачатак з часоў палеаліту.

Верылі, што час, калі месяц павялічваецца, спрыяе пачатку ўсіх спраў. У маладзіковы перыяд сяляне зачыналі сяўбу, касьбу або жніво, прышчэплівалі дрэўцы, а таксама ставілі борці. Але гэтага нельга было рабіць на сход маладзіка, бо нічога добрага з такога не атрымаецца. Лекавыя травы таксама збіралі ў першай палове месяца, інакш яны маглі б толькі зашкодзіць. Тым не менш, у многіх мясцінах лічылася, што лепш пачынаць справы *«пад поўню»*, калі пройдзе першая квадра.

Гэты час быў спрыяльным для заканчэння палявых работ і назапашвання багацця. На сход месяца раілі лячыць розныя хваробы, верылі: добра загойваюцца нават старыя раны. Ветах успрымаўся як лепшы час для знішчэння шкодных насякомых.

З маладзіком звязаны шматлікія прыкметы і павер'і. Калі рогі ў Месяца прыўзнятыя ўгару і завостраныя, то летам цэлы месяц будзе стаяць цёплае надвор'е, а зімой будуць маразы. Калі ніжні рог святлейшы за верхні, то тыдзень будзе ісці дождж.

Фаза маладога месяца паўплывала і на лекавую магію. Так, да *Месяца-Ясенчыка* звярталіся пры розных хваробах, асабліва зубных. Невыпадкова і тое, што яшчэ ў ня-



*Амулеты XI ст. ў выглядзе Месяца*

даўнія часы ішлі паломнікі да многіх сакральных прыродных аб'ектаў менавіта на маладзік або ў маладзіковыя нядзелі. Так было ў вёсках Крупцы каля Мінска, Ракаве Валожынскага, Васькаўцы Мазырскага раёнаў, ва ўрочышчы Падліпкі каля Любчы на Наваградчыне і іншых. У наш час царква намагаецца перанесці такія паломніцтвы на другія святы, але многія старыя трымаюцца спрадвечных традыцый сваіх продкаў і ўшаноўваюць прыродныя святыні на маладзік.

Да нашага часу дайшла традыцыя пакланення на Маладзік Божаму, або Святому, каменю каля вёскі Ператок Любанскага раёна. Падчас ушанавання паломнікі праз адтуліны каменя праліваюць ваду, пасля чаго яна лічыцца цудадзейнай. Шчыра вераць, што камень можа пазбавіць ад хвароб, паспрыяць у шлюбе. На валун кладуць грошы, цукеркі, садавіну і гародніну, а на суседнія дрэвы вешаюць ручнікі і стужкі.

На маладзік яшчэ ў 1930-я гг. хадзілі на Прошчу каля вёскі Пярэжыр Пухавіцкага раёна. Там стаяла невялічкая цэркаўка, а каля яе камень Мар'я вышынёй каля метра. Побач знаходзіўся яшчэ адзін камень з паглыбленнем — ахвярны. На аддаленні ляжаў трэці камень — Дзям'ян. Каменю Мар'я складалі падарункі або, як казалі ў народзе, абракаліся. Прыносілі сала, хлеб, яйкі, грошы, палотны,



*Ушанаванне каменя на Маладзіковую нядзелю,*
*вёска Ператок (Любанскі р-н., Мінская вобл.)*



*Шчыткавіцкая прошча,*
*вёска Шчыткавічы (Старадарожскі р-н., Мінская вобл.)*

ручнікі, хусткі. Потым тройчы на каленях абыходзілі вакол храма і падыходзілі да стода, цалавалі яго і прасілі дапамогі: пазбавіць ад хвароб, даць нарачонага, паспрыяць добраму ўраджаю. У Маладзіковыя нядзелі хадзілі на пакланенне каменю Божая Ножка, які знаходзіўся на Вызнянскай прошчы, што непадалёк ад вёскі Чырвоная Слабада (былая Вызна) Салігорскага раёна. Тут, паводле падання, спачатку адной, а потым і другой жанчыне аб'явілася Божая Маці і прасіла, каб каля каменя, дзе яна сядзела, зрабілі прошчу.

Менавіта ў маладзіковую нядзелю хадзілі на Куніцкую або Крывіцкую Прошчу каля вёскі Крывічы Салігорскага раёна. У сярэдзіне XIX ст. тут на ўзгорку стаяла драўляная царква, а побач капліца без дзвярэй і з адным акенцам. У капліцы была копія цудадзейнага абраза, які знаходзіўся ў храме, і з якім, хутчэй за ўсё, было звязана пакланенне гэтаму месцу. Тут маюцца сляды курганных пахаванняў, а побач знаходзіцца могільнік з каменнымі і высокімі драўлянымі крыжамі.

У Старадарожскім раёне на Шчыткавіцкую Прошчу цяпер ходзяць на Радаўніцу, але яшчэ сто гадоў таму хадзілі ў Маладзіковыя

ндзелі. Пра гэтую прошчу пісалі многія даследчыкі. У 1920-я гг. сюды ў кожную маладзіковую нядзелю прыязджаў святар і праводзіў службы. Раней тут была паклонная сасна, а з ямкі каля яе бралі пясок як лекавы сродак ад хвароб вачэй і ад жаночых хвароб.

У вёсцы Заазер'е Акцябрскага раёна на Рудабельскай прошчы, што побач са Святым возерам і крыніцай (калодзежам) ляжаў некалі Святы камень, да якога на маладзік і другія святы адбываліся вялікія паломніцтвы. У 1868 годзе хрысціянскія святары папрасілі паліцыю разбіць камень. Калі камень быў разбіты, то веруючыя сабралі яго з дробных кавалкаў і склалі наноў. Камень стаў карыстацца яшчэ большай папулярнасцю. Тады над ім пабудавалі каплічку, і царква стала апекавацца язычніцкай святыняй. Але ў канцы 1930-х гг. камсамольцы і камуністы ўшчэнт знішчылі гэты народны помнік. Сёння святыня адраджаецца.

Менавіта ў сённяшнім пакланенні прыродным сакральным аб'ектам можна назіраць спалучэнне язычніцкай формы ўшанавання маладога месяца і хрысціянскага культу Божай Маці, якія, у сваю чаргу, з'яўляецца трансфармацыяй старажытнага жаночага боства.

# Раздзел VII
# МАГІЧНЫЯ ПРАКТЫКІ

## Глава 1
## АБЯРЭГІ

Абярэгі або амулеты, апатрапеі, талісманы, кудмені — гэта рэчы, якія лічацца магічнымі, а таксама азначаюць дзеянні і абрады, што маюць мэту абараніць чалавека і розныя аб'екты ад небяспекі. Функцыямі абярэгаў валодаюць замовы, абрадавыя песні, гульні.

Вялікае значэнне заўсёды надавалася ***амулетам***. Амулеты не маглі быць рэчамі гандлю. Пры іх вырабе вытрымліваліся пэўныя сакральныя дзеянні.

Яшчэ з часоў палеаліту ў якасці амулетаў насілі прасвідраваныя зубы, кіпцюры і дробныя косткі жывёл. Іх падвешвалі на сухажыллях і матузках. Часта іх прышывалі на адзенне. На гарадзішчы часоў ранняга жалезнага веку каля вёскі Івань, што побач са Слуцкам, знойдзены амулет з фалангі лапы мядзведзя. Амулеты з іклаў мядзведзя выяўлены на гарадзішчах вёсак Зазоны Браслаўскага, Гарані Смаргонскага, Лабеншчына і Вязынка Мінскага раёнаў. Нашэнне такога тыпу амулетаў трымалася вельмі доўга, што пацвярджае пахаванне XI ст. каля вёскі Веравоз Глыбоцкага раёна. У познесярэднявечным могільніку каля вёскі Куклі Шчучынскага раёна знайшлі акаваную бронзай іклу нейкай жывёліны, якая была падвешана на скураным раменьчыку каля пояса пахаванага.

Амулеты выраблялі таксама з косці і металу. На паселішчы эпохі неаліту і бронзы каля вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна знойдзена вытачаная з рогу мініяцюрная галава мужчыны, на якой зроблена адтуліна для падвешвання. У пахаваннях пачатку II тысячагоддзя знаходзяць амулеты ў выглядзе знакаў сонца, месяца, сякеры, лыжачкі, коніка, ключыка, ножыка і іншыя. Сярод частых знаходак —

ножыкі ў скураных вышываных футаралах. Паводле этнаграфічных дадзеных, яшчэ нядаўна ў нашых вёсках нож як абярэг клалі на парог або ўтыкалі ў аконныя рамы для абароны ад хвароб.

У часы распаўсюджвання хрысціянства з'явіліся сімбіёзныя язычніцка-хрысціянскія падвескі, так званыя ***змеевікі***. З аднаго боку яны маюць выяву чалавечай галавы, абкружанай змеямі, а з другога — Хрыста, Божай Маці ці святых. Таксама на змеевікі наносіліся надпісы заклінальнага характару.



*Касцяныя амулеты (іклы жывёл).*
*Ранні жалезны век і ранняе Сярэднявечча*

У курганных пахаваннях канца I — пачатку II тысячагоддзяў часта сустракаюцца ***сярпы***. Гэта прылада працы ў народнай культуры лічыцца сімвалам ураджаю і дабрабыту. Але, як і ўсе вострыя прадметы, серп адпалохвае нячыстую сілу. У парным пахаванні XI ст. каля вёскі Багрынава Талачынскага раёна серп ляжаў непадалёк ад пахаваных і, мяркуючы па адбітках на ім тканіны, ён некалі быў шчыльна ў яе загорнуты. Зафіксаваны звычай пакладання сярпоў у магілы на Палессі ў XIX ст. Знаходзяць сярпы і на язычніцкіх свяцілішчах. З сярпом звязаны шэраг магічных дзеянняў. Жнеі, калі выпраўляліся на працу, ставілі дугой сярпы. Пад гэтай дугой тройчы прапаўзала дзіця, якому не споўнілася сем гадоў. Лічылася, што пасля гэтага ў жней не будуць балець спіны.

Абярэгамі служылі і грабеньчыкі. У курганных пахаваннях касцяныя грабеньчыкі былі пакладзены побач з нябожчыкам, а ў жаночых пахаваннях яны часам падвешаны на ланцужку да пояса, або як упрыгажэнне да засцежкі на плячы.

Сімвалам аховы ад нячыстай сілы быў ***замок***. Падчас першага выгану жывёлы ў поле на Юр'я замок выконваў функцыю абярэга ад

ваўкоў. Гаспадары кідалі яго пад дзверы хлява, а пастухі насілі ў кішэнях. Калі жывёла гублялася, то знахар замыкаў замок і чытаў над ім замовы. Калі ў сям'і памірала дзіця, то павітуха, каб спыніць дзіцячую смяротнасць, клала ў труну замок, а ключ ад яго кідала ў калодзеж.



*Абярэг у выглядзе касцяной рыбкі. Эпоха неаліту і ранняй бронзы. Стаянка каля вёскі Асавец (Бешанковіцкі р-н., Віцебская вобл.)*

Ролю абярэга выконваў вільчак або канёк, які прыкрываў тарцы двухсхільнай страхі. Звычайна ён меў арніталагічныя, зоаморфныя або раслінныя матывы. У Кобрынскім павеце магічнымі якасцямі валодала вяроўка вісельніка, яна нібыта прыносіла шчасце і багацце.

Вялікае значэнне народ заўсёды надаваў ***Перуновым стрэлам*** — каменным сякерам, звязаным з культам Перуна. Іх называлі яшчэ *Грамавыя* або *Крамянёвыя стрэлы*, *Стрэлы Перуна*, *Пярункі*, *Грамніцы*, *Чортавы пальцы*, *Чортавы пазуркі* і інш. З'яўленне каменных сякер звязвалі з навальніцай. У многіх мясцінах лічылі, што гэтымі стрэламі Пярун б'е чорта, які хаваецца ад яго дзе-небудзь на зямлі. Расказвалі таксама, што Пярун мае дзесяць такіх каменных кулек, па адной на кожным пальцы, а адзінаццатую трымае ў далоні, і толькі дванаццатая ляціць на зямлю і глыбока ўваходзіць у глебу. Верылі, што праз дзесяць, сем або дванаццаць гадоў такія стрэлы выходзяць на паверхню.

Да нядаўняга часу знаходкі Пярунак лічылася вялікіх шчасцем, але пра гэта стараліся не расказваць. Паводле павер'яў, Перуновы стрэлы ахоўваюць таксама ад маланкі і пажару, валодаюць сілай урадлівасці. Іх захоўвалі каля парога, у куфрах, каб ведзьма не адняла малако ў кароў — уторква і ў вароты хлява, а ў гумне — у адтуліну слупа. На беразе ракі Гайна на Лагойшчыне быў знойдзены каменны клін, які з нейкай ахоўнай мэтай быў уладкаваны на ліпе.



*Каменныя сякеры са Старадарожскага р-на. (Мінская вобл.)*



*Абярэг-падвеска XIII ст. ў выглядзе фігуркі чалавека, знойдзеная ў ваколіцах Полацка*



*Амулет VIII–IX ст. у выглядзе касцяной качкі*



*Абярэг-конік, XI—XII стст.*

У 1920-я гг. навукоўцы падчас экспедыцый зафіксавалі, што амаль у кожнай вёсцы Беларусі старыя жанчыны захоўвалі каменныя кліны і сякеры. Аддаць іх яны не згаджаліся ні за якія грошы. Сякеркі перадавалі ў спадчыну як абярэг і лекавы сродак ад усіх хвароб. У вёсцы Юр'ева Смалявіцкага раёна расказалі пра аднаго селяніна, які ў 1905 годзе пайшоў на руска-японскую вайну, і сваяк падараваў яму ў якасці амулета ад куль маленькі клін з чорнага каменя. Чалавек вярнуўся з вайны жывым і здаровым, а калі яго сын ішоў ужо на Першую сусветную вайну, то бацька перадаў яму сваю Пярунку. Той таксама вярнуўся здаровым.

Каменныя сякеры захоўвалі нават у храмах. Асаблівай магічнай сілай валодала каменная сякерка з прасвідраванай адтулінай. У народзе яе называлі «*курыным богам*» і падвешвалі ў хлявах для абароны кур ад розных напасцяў. Калі праз такую адтуліну пралівалі ваду, яна лічылася лекавай. Пярункі ў якасці амулетаў насілі пад пахай ці фартухам. Вядомы знаходкі каменных сякерак і ў курганных пахаваннях.

Абярэгамі былі і ***кавалачкі апрацаванага крэмню***. Вада, настоеная на гэтым камяні, лічылася лекавай. Крамянёвыя ўстаўкі рабіліся і ў пярсцёнках, тады яны абераглі ад злодзеяў. Вялікая ўвага надавалася таксама ўстаўкам з паўкаштоўных камянёў — бур-

штыну і сердаліку. Пярсцёнак увогуле лічыўся вельмі дзейсным абярэгам. Ён атаясамліваўся з магічным колам, якое засцерагала ад несвоечасовага выйсця душы. Таму ў некаторых вёсках нябожчыку падчас пахавання здымалі пярсцёнак, каб не перашкаджаў адыходу душы. Жалезны пярсцёнак, зроблены з падковы, насілі на мезенцы пры падучай хваробе. У XIX ст. на Палессі верылі: калі пярсцёнак, зроблены з ласінага капыта, тройчы апусціць у раку Случ, ён абароніць ад заразы і чараў.



*«Курыны Бог» (рэканструкцыя)*

У некаторых пахаваннях XI–XII стст. знойдзены ***пярсцёнкі***, падвешаныя да пояса. Напрыклад, у пахаванні маладой жанчыны каля вёскі Зябкі Глыбоцкага раёна да пояса на матузку быў прымацаваны вялікі мужчынскі пярсцёнак. У тыя ж стагоддзі на паясах насілі скураныя, шаўковыя, ваўняныя, ільняныя торбачкі ў форме кісетаў. Падчас раскопак курганаў у падобных торбачках знаходзяць такія амулеты, як бронзавыя пярсцёнкі, падвескі-лунніцы, пацеркі, жалуды. Так, у курганным пахаванні каля вёскі Каласы Рагачоўскага раёна ў скураным мяшэчку каля пояса знайшлі бронзавы пярсцёнак, пяць падвесак-месячыкаў і шкляны бісер. Такога кшталту торбачкі з абярэгамі насілі яшчэ ў часы позняга Сярэднявечча. Народныя павер'і кажуць, каб



*Абярэгі-падвескі акруглай формы, XIII ст.*

жанчыне быць заўжды маладой і прыгожай, трэба насіць з сабою жолуд.

Абярэгамі служылі знойдзеныя вялікія ***косткі*** мамантаў і другіх выкапнёвых жывёлін. Яны падаваліся нашым продкам рэшткамі волатаў, якія сышлі ў зямлю. Лічылася, што такія косткі прыносяць шчасце і поспех у гаспадарцы. Напрыклад, напрыканцы XIX ст. у былым Чавускім павеце ў балоце, дзе рака Бася ўпадае ў Проню, знайшлі шкілет маманта. Частка ягонага біўня патрапіла ў мінскі музей, а астатняе ў якасці сакральнага сродку расцягнулі сяляне.

Шмат розных павер'яў звязана з косткамі, што заставаліся ад велікоднага стала. На Юр'я іх закопвалі па баках поля, на Радаўніцу ў некаторых мясцінах уторквалі ў магілы сваякоў.

Якасцямі абярэга валодала ***велікоднае яйка*** — праваднік магічнай, гаючай, ачышчальнай і ахоўнай сілы. На Юр'я, каб карова была здаровай, па яе поўсці качалі чырвоным яйкам. Яйкам вадзілі і дзецям па галаве, каб тыя былі разумнымі. Перад пасевам яйка клалі ў зерне або першую баразну, падкідалі ўверх, калі засявалі лён. Лічылася, што пажар можна патушыць, калі з яйкам тройчы аббегчы яго. Шалупінне з такіх яек клалі на саламяныя стрэхі хат і другіх пабудоў, каб іх не кранала бура.



*Вышыўка-абярэг на рукаве кашулі, вёска Оса (Кобрынскі р-н., Брэсцкая вобл.)*

Згодна з павер'ямі, валодалі магічнымі здольнасцямі знойдзеныя гліняныя або каменныя (шыферныя) ***праселкі***. Імі расціралі хворае месца і называлі ў народзе *залатнік*, *памочнік*. Функцыю абярэгаў выконвалі і знойдзеныя старыя манеты. Іх хавалі пад падушкай, каля печы, прышывалі да адзення, выкарыстоўвалі ў якасці падвесак-амулетаў.

Абярэгамі да нашага часу лічацца многія ***сакральныя валуны***, асабліва на ўскрайках вёсак, на паклонных узгорках, каля крыніц і нават у храмах. Многія з іх былі пакладзены ў падмуркі жылых пабудоў і нават храмаў. Але, як

сцвярджаюць паданні, будаўнікам часта даводзілася вяртаць іх на першапачатковае месца, бо з імі пачыналі здарацца няшчасці.

Як абярэгу вялікая роля са старажытнасці надавалася ***арнаменту***: на посудзе, адзенні (вышыўка), у разьбе па дрэву, чаканцы. Арнамент уяўляе з сябе выяву, утвораную рытмічным паўтарэннем аднаго і таго ж ці чаргаваннем некалькіх малюнкаў. Многія элементы арнаменту паходзяць з часоў палеаліту. Геаметрычны арнамент спалучае колы, квадраты, ромбы, зігзагі, хвалістыя лініі, крыжы, васьміпраменныя зоркі і інш. У раслінным арнаменце фігуруюць схематычныя дрэўцы, кветкі, лісточкі, галінкі і парасткі. Ёсць антрапаморфныя і зааморфныя матывы арнаменту.



*Гліняныя грузікі з ахоўнымі арнаментамі*

Абярэгамі ад драпежных птушак служылі пудзілы. Прыкладам, каб вароны не кралі куранят, у хляве вешалі забітую сароку.

У абярэгах значная ўвага надавалася ***лічбам***. Каб папярэдзіць зубны боль, на шыі ці на руцэ насілі чырвоны матузок, завязаны на 27 вузельчыкаў. Гэты матузок рабіў старэйшы ці самы малы з дзяцей у сям'і. Дзіцёнку трэба было зрабіць дзевяць вузельчыкаў на адным дыханні. Лік вёўся тройчы — ад дзевяці да аднаго. Такія лічбы звязаныя яшчэ і з месячным календаром.

Каб пазбавіць ведзьму сілы, калі тая наважыцца зайсці ў чыю-небудзь хату, гаспадыня прала ніткі своеасаблівым чынам і потым завязвала шэсць вузельчыкаў. Першыя два завязвалі на парозе хаты, два другія на ганку, астатнія каля варот.



*Вільчак-абярэг, мястэчка Расна (Дрыбінскі р-н., Магілёўская вобл.)*



*Калекцыя абярэгаў, вёска Вялікі Паўсвіж (Лепельскі р-н., Віцебская вобл.)*

Важнае месца займаюць рытуальныя практыкі-абярэгі, звязаныя з абаронай ад граду.

Дзеля гэтага на Юр'я абыходзілі палеткі і закопвалі косткі з велікоднага стала.

Абярэгамі служылі і ***элементы касцюма***, у першую чаргу шапка і пояс. Так, надзетая шапка гарантавала ахову ад небяспекі. А на Юр'я, каб рос добры ўраджай, гаспадар, абыходзячы нівы, падымаў шапку. Калі мужчыны размахвалі шапкамі, верылі, што так яны «адганяюць» хмары. У шапку з уколатай туды іголкай не можа пацэліць стралок і г.д.

Пояс ахоўвае цела ад хваробаў і няшчасцяў. Важнейшая яго функцыя — замацаваць мяжу паміж бачным і нябачным. Апяразванне адным поясам маладых перад шлюбам сімвалізавала моцны саюз, устанаўленне сваяцкіх адносінаў паміж роднымі жаніха і нявесты.

Да вясельнага стала маладую вялі за пояс. Пры ўваходзе ў хату жаніха нявестка клала пояс на печ, каб задобрыць духаў хаты і продкаў. У

шэрагу другіх звычаяў таксама прысутнічае рытуальнае апаясванне.

Былі свае спецыфічныя абярэгі нават у рабаўнікоў. Так, у 1871 годзе на Лідчыне, у карчме вёскі Вавёрка, паліцыя затрымала чатырох падазроных з мехам. Калі праверылі мех, там аказалася дзве чалавечыя рукі. Гаспадар меха прызнаўся, што яны з сябрамі на могілках маёнтка Ішчална ўначы вырылі труп пахаванага напярэдадні селяніна. Знялі з яго адзенне і адрэзалі рукі, каб з чалавечага тлушчу зрабіць свечку. А з ёю ўжо можна паспяхова ісці рабаваць. Газета «Литовские Епархиальные ведомости» зазначала, што старажытнае павер'е, звязанае са свечкай, зробленай на аснове тлушча нябожчыка, а таксама з рукой нябожчыка было ў тыя часы даволі пашырана. Існавала ўпэўненасць: дастаткова абнесці такую свечку або руку вакол дома, які хочаш абрабаваць, і ўсё жывое ў ім засне мёртвым сном.

## Глава 2
## АХВЯРАПРЫНАШЭННІ

Ахвярапрынашэнне з глыбокай старажытнасці займае вельмі важнае месца ў ідэалогіі і абрадах. У аснове гэтай практыкі ляжыць вера ў сілы прыроды. Ахвяры прызначаліся вадзе, зямлі, агню, а пазней і антрапаморфным багам. Ім давалі падарункі і ўзамен чакалі цудаў. З ахвярапрынашэннямі звязаны і старажытны абрад *«братчына»* — агульнае святочнае застолле ў гонар багоў. Пазней братчыны нават сталі падзяляцца на жывёлагадоўчыя, пчалярскія, паляўнічыя і іншыя.

На старажытных паселішчах археолагі выяўляюць ямы са слядамі ахвярапрынашэнняў, там знаходзяць перапаленыя косткі жывёл, зрэдку чалавека, сакральныя рэчы, воты, біты гліняны посуд.

Сляды ***ахвярапрынашэнняў вадзе*** зафіксаваны ў тарфяных балотах. Так, у балоце каля вёскі Капланавічы Нясвіжскага раёна напачатку 1960-х гг. было знойдзена драўлянае рала часоў ранняга жалезнага веку. Падобныя знаходкі гэтага часу добра вядомы на тэрыторыі Еўропы — у Германіі, Даніі, Швецыі, на Украіне. Такі факт навукоўцы тлумачаць звычаем прынясення ахвяраў вадаёмам з просьбай пра ўраджай. Адсюль невыпадковы і паданні пра затопленыя залатыя карэты, скарбы, зброю, залаты і сярэбраны посуд.

Прыносілі ў ахвяру і людзей. Знаходкі мумій са слядамі гвалтоўнай смерці выяўлены ў балотах на тэрыторыі Заходняй Еўропы і суседняй з Беларуссю Пскоўскай вобласці Расіі. Адгалоскам чалаве-



*Ахвяраванні святым крыніцам, паклонная крыніца ва ўрочышчы Шальціня (Зімнік), Браслаўскі р-н., Віцебская вобл.*

чых ахвярапрынашэнняў могуць быць паданні пра Паненскія, Дзявочыя і Мар'іны горы. У вёсцы Любонічы Кіраўскага раёна расказваюць, што ў балоце нібыта ўтапілася дзяўчына Люба. Ёсць і назвы балот кшталту Бабіна, Мар'іна, Паненскае, Бажніца, Дзядок, Балваны і інш. Вядомы і ахвярныя скарбы розных часоў, якія прызначаліся багам. У якасці ахвяраванняў знаходзяць таксама скульптурныя выявы багоў.

Да нашых дзён шырока захаваўся звычай ахвярапрынашэння крыніцам і калодзежам. Туды з просьбай пра ўраджай і дождж кідаюць часткі абрадавай ежы, мак, хлеб-соль і інш. У канцы XIX ст. каля Гродна этнографы зафіксавалі такі звычай: калі маладая прыязджала ў дом мужа і ўпершыню ішла да калодзежа, то ў якасці ахвяры павінна была пакласці каля яго кавалак вясельнага пірага, сыр і грошы.

Па ўсёй Беларусі захаваўся звычай кідаць манеты ў крыніцы як плату за лекавую ваду, звычайна ад хвароб вачэй. Часта грошы, асабліва папяровыя, кладуць у дупло дрэва. Прыкладам, ва ўрочышчы Якубаўка каля вёскі Царкавішча Ушацкага раёна на Віцебшчыне рос дуб, з-пад якога выцякала крыніца. Людзі хадзілі да яе лячыць вочы і плату за гэта клалі ў дупло дуба. У 1923 годзе чырвонаармейцы, змагаючыся з рэлігіяй, спалілі дуб, але веруючыя амаль да нашых дзён хадзілі на гэта месца і складалі ахвяраванні на абгарэлы пень. Апроч грошай, дрэвам ахвяравалі хлеб і ручнікі. У наш час як рэлікт такіх

ахвярапрынашэнняў існуе звычай прывязваць да галінак стужкі або нават абвязваць ствол дрэва. Стужкі вешаюць нават на дрэвы і кусты, што растуць побач з паклоннымі камянямі і крыніцамі.

Асабліва распаўсюджана ахвяраванне крыніцам. У Палыкавічах каля Магілёва яшчэ сто гадоў таму ў 8-ю, 9-ю (асабліва), 10-ю і 11-ю пятніцы пасля Вялікадня збіралася шмат людзей, часам да дзесяці тысяч паломнікаў. Падчас асвячэння вады ў каплічцы стаялі два мужчыны і падхоплівалі кавалкі палатна, якія кідалі туды жанчыны. За палотны давалі аплаткі і маленькія нацельныя крыжыкі. Крыжыкі паломніцы адразу ж ахвяравалі крыніцы. Тут жа прадаваліся зробленыя з воску часткі чалавечага цела, фігуркі авечак, коней, кароў. Іх куплялі і адразу кідалі ў крыніцу. Туды ж кідалі і манеты, пацеркі, завушніцы, пярсцёнкі. У Любчы Барысаўскага раёна яшчэ не так даўно крыніцы ахвяравалі хусткі.

Ахвяры кідалі і ў рэкі. У сярэдзіне XIX ст., калі плытагоны праплывалі па Віліі і набліжаліся да парогаў пад назвай «Прывітальня» каля Жодзішак у Смаргонскім раёне, то кідалі ў раку хлеб-соль і казалі: «*Вітаю цябе хлебам-соллю! Хлеб-соль вазьмі, а мяне прапусці!*». Ахвяры ў рэкі кідалі стоячы на каленях.

Яшчэ ў канцы XIX ст. у Лукомлі Чашніцкага раёна ў апошнюю пятніцу перад святам Пятра і Паўла збіраліся багамольцы з Лепельскага і Барысаўскага паветаў на пакланенне абразу Святой Параскевы-Пятніцы ў Магдаліна-Марыінскай царкве. Потым адбываўся хрэсны ход на бераг ракі Лукомкі. Многія жанчыны скідвалі абутак, уваходзілі ў ваду і стаялі так да заканчэння свята. Многія ахвяравалі вадзе хусткі, ручнікі, кашулі.

Менавіта старажытныя абрады ахвярапрынашэння воднай стыхіі (а ў пракаветныя часы яны былі больш маштабныя і ўрачыстыя) далі пачатак вельмі пашыраным у нас паданням пра затопленыя залатыя ці сярэбраныя лодкі. Прыкладам, у горадзе Дзісна Мёрскага раёна расказваюць, нібыта насупраць вострава каля левага берага Заходняй Дзвіны ляжыць лодка з золатам.



*Ахвярапрынашэнні каменю Вялеса, вёска Крыжоўка (Мінскі р-н., Мінская вобл. Інсцэніроўка)*

Да нашых дзён дайшоў звычай насіць ***ахвяраванні камяням***. Так, яшчэ напачатку XX ст. на мінскім капішчы каменю Дзед насілі мёд, малако, віно, ручнікі. Нават у наш час ежу, грошы, ручнікі і кветкі ахвяруюць камяням у вёсках Сорагі Слуцкага, Таль Любанскага, Кудзінавічы Капыльскага раёнаў і іншых. У весцы Сітнікі Лепельскага раёна пакланяліся зусім невялічкаму валуну каля балаціны. Адрывалі нітку ад хусткі, кашулі ці іншага адзення і клалі на камень. У многіх месцах і сёння кладуць на камяні першыя ягады і грыбы. Прыкладам, у вёсках Юхнаўка Докшыцкага, Еляшоўка і Лужкі Чашніцкага раёнах.

Існуе шмат паданняў пра з'яўленне цудадзейных абразоў на дрэве, камяні, у крыніцы. Потым на тых месцах, дзе знаходзіліся гэтыя сакральныя прыродныя аб'екты, будавалі храмы і прыносілі ўжо ***ахвяраванні ў царкву***. Так было ў вёсках Сорагі Слуцкага, Чарнякова Бярозаўскага і Камайск Докшыцкага раёнаў, і іншых. І сёння працягваюць складаць ахвяры паклонным валунам, якія перанеслі ў храмы ў вёсках Каладзішчы Мінскага, Лукава Маларыцкага, Камайск Докшыцкага раёнаў.



*Касцяныя грабеньчыкі ў курганных пахаваннях XI ст. як ахвярапрынашэнне нябожчыкам*

Паводле археалагічных і этнаграфічных дадзеных, прасочваюцца ***ахвяраванні нябожчыкам***. Так, у Атвержычах Столінскага раёна ў пахаваннях па абраду трупаспалення I ст. н.э. знойдзены рэшткі драўлянай скрынкі, дзе ляжалі ўпрыгажэнні з металічных трубачак, ланцужкоў, трапецападобных падвесак і шкляныя пацеркі.

У адным з курганоў XI ст. каля вёскі Сенніца побач з Мінскам каля ног пахаванай жанчыны была пакладзена ваўняная сукенка цёмна-бардовага колеру, шчыльна

загорнутая ў кару дрэва. У курганах XI — пачатку XII стст. каля вёсак Укля Браслаўскага, Перавоз Глыбоцкага, Рыбакі Ушацкага раёнаў каля ног нябожчыц у якасці ахвяравання былі пакладзены бронзавыя арнаментаваныя бранзалеты са стылізаванымі змяінымі галоўкамі.

На Рагачоўшчыне ў нагах дзяўчынкі знайшлі загорнутыя ў бяросту восем скроневых кольцаў. На Смаленшчыне ў адным з курганоў выявілі скрынку, дзе былі дзве бразготкі, пятнаццаць лясных арэхаў, медны бранзалет, чатыры пярсцёнкі і круглы камяк збітай воўны.

У якасці ахвяраванняў у курганах пачатку II тысячагоддзя зафіксаваны драўляныя вёдры, а таксама косткі хатніх жывёл і птушак. На паўночным захадзе Беларусі вядома шмат пахаванняў воінаў разам з канямі. Бывала, што ў старажытнасці разам з нябожчыкам спальвалі і каня, а часам проста клалі побач скульптурныя выявы жывёл. Каля Полацка ў кургане знайшлі мініяцюрную касцяную галоўку каня, а




*Драўляныя вёдры курганных пахаванняў XI ст. як ахвярапрынашэнне нябожчыкам*



*Ахвяраванні нябожчыкам на Вялікдзень, вёска Баравая (Лунінецкі р-н., Брэсцкая вобл.)*

ў Докшыцкім раёне і на Смаленшчыне — касцяныя выявы галоў барана.

Рэлікт старажытных ахвяраванняў нябожчыку, калі разам з ім на той свет адпраўлялі розныя рэчы, дажыў амаль да нашых дзён. Так, у канцы XIX — пачатку XX стст. у Пінскім павеце пры пахаванні нябожчыка яму ў труну клалі адну пару бялізны, люльку з тытунём, бутэльку са спіртным напоем, ножык, свечку, грэбень, замок і іншыя рэчы. Таксама і сёння дзе-нідзе ў Беларусі мы можам сустрэць падобны звычай. Цікавы выпадак ахвяраванняў нябожчыку існаваў у канцы XIX ст. у Слуцку. Штогод жанчыны на свае грошы куплялі шаўковую сукенку і пераапраналі ў яе мошчы Святой Сафіі Алелькі-Радзівіл.

Да нашых дзён захаваўся старажытны звычай ***ахвярапрынашэнняў пры будаўніцтве***. З сівой даўніны існуе павер'е, што без ахвяры будынак будзе нетрывалым або разваліцца падчас будаўніцтва. У якасці адпаведнай ахвяры выступалі курыца або певень, або толькі іх галовы, таксама галава каня, барана, кавалкі хлеба, поўсць, зерне, шматкі святарскай рызы. У вёсцы Рудня на ўсход ад Лагойска пад каменным падмуркам будынка знайшлі бітыя жорны і косткі жывёл, у весцы Багданава на Вілейшчыне пры разборцы падмуркаў старога лямуса — статуэтку.



*Будаўнічая ахвяра пад зруб пры ўзвядзенні хаты*

Пад першы вянок зруба пры пачатку будаўніцтва часта клалі каменныя сякеркі, выкапнёвыя косткі дагістарычных жывёлін. На парозе новай стайні закопвалі бярозавае палена, каб вяліся коні. Часта пры закладцы печы адсякалі галаву пеўню і клалі пад вуглавы камень.

У шчыліны хаты як ахвяру дамавіку запіхвалі вычасаныя чалавечыя валасы або састрыжаныя пазногці. Асабліва ў час будаўніцтва ўлагоджвалі цесляра, інакш ён мог закласці сурок на галаву гаспадара або галовы ягоных сямейнікаў. Будаўнічую ахвяру прыносілі і пры закладванні калодзежа, калі яго дно выкладалі камянямі. Пры будаўніцтве вадзянога млына вадзяніку ахвяравалі жывога пеўня.

Яшчэ ў часы Сярэднявечча пры будаўніцтве замкаў, кляштараў і храмаў па ўсёй Еўропе здараліся чалавечыя ахвярапрынашэнні. Адсюль робіцца зразумелым паданне пра Белую Даму ў Гальшанах: нібыта падчас узвядзення мясцовага францысканскага кляштара будынак пачаў развальвацца. Тады ўспомнілі звычай прадзедаў і вырашылі прынесці ў ахвяру жанчыну, якая першай прынясе абед на будоўлю для свайго мужа. Не пашэнціла маладому цесляру, ягоная прыгожая жонка першай з'явілася там, прынесла палудзень свайму гаспадару. Менавіта яе замуравалі ў сцяну. Прайшлі стагоддзі, разбурыўся Гальшанскі замак, колькі разоў перабудоўваўся касцёл, а кляштар стаіць непарушна. Кажуць, што душа маладой жанчыны трымае яго.



*Абракальны крыж-ідал, на які навешаныя ахвярныя палотны і ручнікі ад пошасці і хвароб, вёска Хваенск (Жыткавіцкі р-н., Гомельская вобл.)*

Для атрымання добрага ўраджаю ў многіх раёнах Усходняй Беларусі на агульныя ахвяраванні рабілі ***«брацкую свячу»***. Пры заканчэнні жніва на полі пакідалі крышку нязжатых каласоў і клалі хлеб-соль. Каб задобрыць поле, раскідалі старую салому. На іржышчы пакідалі трохі каласоў — ахвяру мышам, каб тыя не елі хлеб у сховішчах. Напачатку ворыва таксама ў ахвяру зямлі закопвалі яйкі.

Рэліктам ахвярапрынашэнняў можна лічыць ***адорванне рытуальнай ежай калядоўшчыкаў і валачобнікаў*** за іх віншавальныя песні. Дары гэтыя потым спажываліся разам з гаспадаром, а часткова дзяліліся паміж удзельнікамі абраду.

Яшчэ не так даўно шырока бытавала ***ахвярапрынашэнне падчас якой-небудзь пошасці***. Прыкладам, каля Турава, каб спыніць эпідэмію, на Бабруйкавай Гары жывымі закопвалі чорнага пеўня, чорнага мядзведзя і чорнага бабра. У адной з вёсак Гарадоцкага раёна ў сярэдзіне XX ст. падчас падзяжу скаціны закапалі чорнага пеўня і шчупака. Былі і чалавечыя ахвяраванні. Так, паводле іншай версіі, на ўзгаданай вышэй Бабруйкавай Гары закапалі не жывёл, а нямога чалавека. У іншых раёнах Беларусі на піку эпідэміі халеры, каб супыніць яе, жывым закопвалі першага хворага. Калі эпідэмія ўсё-такі пашыралася, то закопвалі і другіх хворых, а таксама старых. У 1831 годзе ў Наваградскім павеце падчас такой эпідэміі сяляне збіраліся прынесці ў ахвяру нават святара. Ён папрасіў даць яму час, каб падрыхтавацца да смерці. Тады на могілкі заманілі хворую старую, спіхнулі яе ў магілу і разам з труной памерлага засыпалі зямлёй.

Пазней пры эпідэміях, засухах, войнах нашы продкі сталі шырока выкарыстоўваць другі дзейсны сродак. На працягу аднаго дня ці ночы ўсімі аднавяскоўцамі ***вырабляўся ручнік-абыдзённік***. Яго абносілі вакол паселішча і ў якасці ахвяры вешалі на прыдарожны крыж або неслі ў храм. Тканне абыдзённага палатна звязвалася з ідэяй абнаўлення свету і вяртання яму першапачатковай чысціні. Таксама пры пажары, каб спыніць агонь, кідалі ў яго бохан хлеба ці збанок з малаком.

## Глава 3
## АБРАДЫ АХОЎНАЙ МАГІІ

Самым яскравым і распаўсюджаным абрадам ахоўнай магіі з'яўляецца ***абворванне***. Яшчэ ў канцы XIX ст. ён праводзіўся ў многіх вёсках амаль кожную вясну, а ў час эпідэміі і засухі практыкаваўся яшчэ і ў канцы XX ст. Мэта абраду — правядзенне ўначы ўзаранай паласы вакол вёскі, так званага магічнага кола. Рабілі гэта для абароны ад нячыстай сілы.

Рытуальна чыстыя жанчыны — дзяўчаты або ўдовы ці салдаткі ўпрагаліся ў плуг і абворвалі вёску. Прычым колькасць удзельніц вар'іравалася ў межах такіх сакральных лічбаў, як тры, дзевяць або дванаццаць. Таксама і самі абворванні падзяляліся на папераджальныя і рытуальна-ачышчальныя. Першыя праводзіліся моўчкі. Пры ачышчальных абрадах за аратымі ішлі з косамі, сярпамі, качэргамі, якімі моцна грымелі, пры гэтым плясалі і крычалі. Калі падчас працэсіі сустракалі мужчыну або якую-небудзь жывёліну — ката, сабаку,

авечку, карову, то маглі і забіць. У некаторых вёсках на беларуска-расійскай мяжы замест абворвання магічнае кола рабілі іншым чынам. Вёску на качарзе аб'язджала старая дзеўка ў суправаджэнні іншых старых дзеў і жанчын з васковымі свечкамі ў руках, пры гэтым яны спявалі духоўныя вершы, а адна з удзельніц працэсіі падганяла сідзячую на качарзе кастылём. Абрад адбываўся глыбокай ноччу.

Звычайна ў абрадзе абворвання ўдзельнічалі дзяўчаты і жанчыны, але былі выпадкі, калі гэта рабілі два браты-блізняты. Тады яны абворвалі вёску на блізнятах-валах або быках. Гэта яскравыя адгалоскі блізнячага культу, які некалі шырока бытаваў на нашых землях. Яшчэ ў 1865 годзе у адной з вёсак на Гарадзеншчыне падчас халеры абрад абворвання праводзілі менавіта на валах-блізнятах. На захадзе Беларусі вядомы выпадкі, калі блізнят-братоў замянялі равеснікамі-цёзкамі з аднолькавым колерам валасоў.

У Рэчыцкім павеце Мінскай губерніі ў 1892–1893 гг. лютавала халера. Медыкі змагаліся як маглі, але людзі ім не давяралі і вінавацілі дактароў, нібыта яны труцяць людзей. Падчас пошасці ў гэтым рэгіёне шырока звярталіся да магічных дзеянняў. Так, у вёсцы Броннае Рэчыцкага раёна былі зарыты жывымі кот і шчупак. А ўначы аголеныя дзяўчаты-падлеткі абворвалі плугам вёску. Калі гэтыя дзеянні не дапамаглі, жанчыны ўсёй вёскі за адну ноч напралі нітак, выткалі палатно і загарнулі ў яго дубовы крыж. Наступную ноч яны з малітвамі і архаічнымі спевамі насілі крыж вакол вёскі. Таксама абходзілі вакол вёскі з ніткай, спрадзенай за адну ноч. Апроч гэтага, які-небудзь стары з крыжам на плячах абыходзіў усе двары. Каля кожнага гумна яго сустракала гаспадыня і частавала гарэлкай. Па дарогах раскідвалі розныя рэчы, каб другія забралі разам з імі і пошасць.

Шырока практыкаваліся магічныя абрады, звязаныя з аховай скаціны. У пачатку XX ст. у вёсцы Пацава Слабада Кіраўскага раёна падчас эпідэміі жывёлы хлопцы і дзяўчаты сахой правялі баразну вакол вёскі і на месцы яе злучэння паставілі драўляны крыж. На Брагіншчыне, каб абараніць жывёлу ад хвароб і другіх напасцяў, у варот каля хлява клалі хлеб, свянцоную соль і замок, куды прасоўвалі пояс. У шэрагу выпадкаў на дарозе або на мосце, ростанях слалі абыдзённае палатно і праганялі праз яго скаціну.

Калі на Юр'я скаціну першы раз выганялі з хлява ў поле, яе сцябалі асвечанай вярбой. Пры гэтым часта абкурвалі святаянскай травой, а каля парога хлява закопвалі або проста клалі яйка. Перад парогам клалі кажух воўнай наверх і закручвалі ў яго лусту хлеба. У полі пастухі абносілі вакол статка яешню і пры гэтым прамаўлялі за-

кляцці ад ваўкоў. Спецыяльна для пастухоў рабіўся пачастунак, які з'яўляўся адгалоскам ахвяраванняў у гонар паганскага бога — абаронцы жывёлы, функцыі якога перайшлі пазней да Святога Юр'я. Сяляне верылі, што воўк забірае са статку тую жывёлу, на якую яму даў дазвол гэты святы. Вясной, у дзень Святога Мікалая, вакол коней абыходзілі з яйкам у руцэ, якім перад гэтым гладзілі па крыжы. На Ягор'я, Тройцу або на Пятра і Паўла пастухі плялі вяночкі і надзявалі іх каровам на рогі. За гэта хлопцам гаспадары давалі падарунак, а вянок потым здымалі з галавы каровы і кідалі ў хлеў як абярэг. У некаторыя святы існаваў звычай рытуальнага смажання быка. Напрыклад, у другой палове XIX ст. каля маёнтка Відзы-Лаўчынскія Браслаўскага раёна людзі на Тройцу збіраліся ў лесе, а іх памешчык прысылаў туды смажанага быка і некалькі вёдзер гарэлкі. Ладзілі святочнае застолле. У гонар быка там жа адбываўся яшчэ і вялікі кірмаш.

На многіх вясковых святынях маліліся аднachасова за людзей і за скаціну. Асабліва ў Дзевятую пятніцу пасля Вялікадня шмат людзей збіралася на крыніцы каля вёскі Палыкавічы побач з Магілёвам. Тут у гэты дзень дзячкі запаўнялі спісы *«за здароўе»*, *«за ўпакой»* і *«за скацінку»*. Многія жанчыны са дна крыніцы-ручая збіралі каменьчыкі і потым дома выпарвалі імі гарлачыкі. Гэта рабілася для таго, каб да жывёлы не прыставала ніякае ліха, і каб каровы давалі больш малака. У вёсцы Веляцічы Барысаўскага раёна старажылы ўзгадвалі такі звычай: калі людзі ішлі ў цэркаўку на выспе сярод балота пакланіцца цудадзейнаму абразу, то кідалі ў балаціну дошчачкі з выразанымі на іх абрысамі частак чалавечага цела і хатняй жывёлы. Каб абараніць жывёлу ад пошасці, пакланяліся дубу, які рос на Аўгініным кургане пры ўпадзенні ракі Сцвігі ў Прыпяць.



*Абрад ахоўнай магіі «абкочванне каня яйкам на Юр'я», вёска Новае Палессе (Лельчыцкі р-н., Гомельская вобл.)*

Яшчэ ў 1930-я гг. скаціну *«лячыў»* камень Волас, які і сёння ляжыць у лесе на ўзгорку каля вёскі Крыжоўка Мінскага раёна. Побач на дрэвы вешалі чарапы, рогі і хвасты жывёл, а таксама ручнікі. У сярэдзіне XX ст. у вёсцы Кудзінавічы Капыльскага раёна, калі

хварэла карова, то на Святы камень на вясковых могілках клалі масла або сыр, а калі свіння, то кавалачкі сала або каўбасы. Сёння на Вялікдзень туды прыносяць кавалкі велікоднага пірага і яйкі.

Культ хатняй жывёлы адбіўся нават на майстэрстве вырабу абразоў. Так, у вёсцы Забелы Слуцкага раёна ў царкве некалі быў абраз Божай Маці, напісаны на валовай скуры. Паводле архіўных дадзеных, у 1920-я гг. у вёсцы Ясень Асіповіцкага раёна ў аднаго селяніна меўся абраз з выявай «*бога ў выглядзе рагатай жывёліны*». Гэты факт сведчыць пра адгалоскі культу язычніцкага бога Вялеса — абаронца свойскай жывёлы. Ёсць паведамленні што такія абразы ставілі нават у хлявах. Яшчэ не так даўно вялікай папулярнасцю карыстаўся і Святы Уласій, які таксама лічыўся апекуном жывёлы і займеннікам Вялеса. Захавалася некалькі сакральных валуноў з назвамі Волас, Воласень. Адзін з іх ляжаў некалі на беразе возера Ветчанскага каля вёскі Вялікія Дольцы на Ушаччыне.

Дзейсным сродкам ахоўнай магіі лічыўся ***выраб абыдзённіка***. Гэта рытуальны ручнік, вытканы за адну ноч падчас крызіснай сітуацыі: эпідэміі, засухі, градабою і г.д. Такія абыдзённікі ткалі яшчэ ў часы калектывізацыі, гады Другой сусветнай вайны. Рабілі гэта або ўсёй вёскай, або родам ці сям'ёй. Ручнік абносілі вакол вёскі ці праносілі па ўсім вуліцах. Падчас шэсця абыдзённік трымалі над галавой усе разам, або адзін чалавек нёс складзены выраб наперадзе працэсіі, або палатно цягнулі па зямлі. Пасля абыдзённік ахвяравалі камяням, крыніцам, дрэвам, а ў часы хрысціянства вешалі на крыж, заносілі ў храм або спальвалі. Такі звычай, напрыклад, захаваўся і сёння ў вёсцы Папшычы Глыбоцкага раёна.

Вядомы шэраг іншых ахоўных абрадаў. Да нашых дзён дайшлі так званыя ***абходныя абрады*** — рытуальнае хаджэнне пераапранутых людзей па хатах з віншаваннямі і пажаданнямі на Каляды і Вялікдзень. Абрадавыя пераапрананні зафіксаваны ва ўсіх народаў.

Таксама шырока распаўсюджаны ***абрады абсыпання*** і ***аблівання***. Прыкладам, каб абараніцца ад нячыстай сілы і выклікаць урадлівасць, абсыпалі зернем маладых падчас вяселля, труну з нябожчыкам пры вынасе яе з хаты, а макам — хаты і гаспадарчыя пабудовы і г.д. З ахоўнай магіяй звязаны і абрад аблівання. Так, вядомы Вялікодныя абліванні і абліванні маладых каля калодзежа. Шырока практыкавалася абліванне жывёлы і пастуха пры першым выгане ў поле. Аблівалі карову пасля ацёлу. Пры гэтым з вядром вады і запаленай грамнічнай свечкай ішлі ў хлеў. Тройчы абыходзілі вакол каровы з цялём, выстрыгалі на іх ілбах крыху поўсці і спальвалі на свечцы, і толькі потым аблівалі жывёлу.

Для ахоўнай магіі характэрны ***абрад пераварочвання***, якому наш народ прыпісваў вялікую магічную сілу. Міску, у якой неслі гарачыя вуголлі за трунoй нябожчыка, потым перакульвалі ўверх дном на ягонай магіле. Каб падмануць хваробу, хворага дзіцёнка пераварочвалі ў ложку нагамі да ўзгалоўя, апраналі на яго вывернутую кашулю рукавамі на ногі. Калі ў дзіцяці балеў жывоцік, таксама выварочвалі кашулю, шапачку і ў такім выглядзе тройчы пераносілі праз дарогу.

На Віцебшчыне падчас вяселля пры сустрэчы сына з нявесткай бацька быў у звычайным касцюме, а маці ў вывернутым наверх поўсцю кажуху і такой жа вывернутай мужчынскай зімовай шапцы. На Піншчыне маці жаніха таксама сустракала маладых у вывернутым кажушку. У руках яна трымала соль, гарэлку і мёд, чым потым і частавала маладых.

Каб пазбавіцца ад непажаданага спадарожніка, выварочвалі адзенне ці шапку, апраналі іх зноў і ў такім выглядзе працягвалі шлях. Каб не заблукаць у лесе, таксама апраналіся ў вывернутае адзенне. У былым Чэрыкаўскім павеце на Магілёўшчыне, калі адначасова сеялі на дзвюх палях, то адзін з сялян перамотваў анучу на нагах ніжняй часткай наверх. Гэта рабілася для таго, каб сусед «не пераматаў» увесь ураджай на сваё поле. На Палессі яшчэ і цяпер пры провадах хлопца ў армію пераварочваюць вілы вастрыём уверх, каб здаровым вярнуўся дадому.

Шырока быў распаўсюджаны ***абрад акурвання***. Ён меў ачышчальны характар і практыкаваўся як у паўсядзённым жыцці, так і ў каляндарных абрадах. Вытокі гэтых дзеянняў ідуць ад акурвання дымам рытуальных вогнішчаў на язычніцкіх капішчах. З прыходам хрысціянства падобны абрад стаў здзяйсняцца ў храмах, калі святары пры дапамозе кадзіла акурваюць сваіх прыхаджан. Акурвалі звычайна зёлкамі, сабранымі на Купалле ці Юр'я, або дымам ад спаленага абыдзённіка. Хворага на ліхаманку акурвалі некалькімі падпаленымі пёрамі маладой курыцы, якая яшчэ не знесла ніводнага яйка. У вёсцы Буды на Рагачоўшчыне некалі, каб пазбавіцца ад пошасці, прарылі тунель праз курганны насып. Потым там развялі вогнішча і прагналі праз яго статак. Трэба зазначыць, што падрыхтоўка да такога абраду заўсёды праходзіла ва ўмовах таямнічасці і з выкананнем пэўных рытуалаў. У некаторых выпадках для акурвання падпальвалі мох, які бралі з трох магіл або смецце з трох двароў. Працэдура павінна была праводзіцца таксама тройчы: на ўсходзе сонца, апоўдні і на заходзе.

***Качанне або калыханне на арэлях*** таксама адносілася да магічных дзеянняў. Падчас рытуальнага качання імкнуліся раскачацца як мага

вышэй. Дзяўчыну павінен быў гойдаць малады чалавек, пажадана яе нарачоны. Разам з тым, гушкацца разам дзяўчыне і хлопцу лічылася непрыстойным. Скакалі таксама на дошцы, пакладзенай на палена. Качанне ў складзе веснавой абраднасці стымулявала паспяховы рост збожжа. Шырока было распаўсюджана качанне па юр'еўскай і купальскай расе, падчас першага грому. Верылі, што качанне сімвалічна ўзнаўляе акт стварэння Сусвету, наладжвае сувязь між небам і зямлёй.

З ахоўнай магіяй звязаны ***рытуальныя агаленні чалавека***. Асабліва шмат іх у каляндарных абрадах, сельскагаспадарчай магіі і народнай медыцыне. Звычайна абрады з агаленнем адбываліся ў цёмны час сутак і не прадугледжвалі шырокае кола ўдзельнікаў. Больш пашыранай была жаночая галізна, прыкладам, на Купалле, калі жанчыны каталіся па траве і збіралі расу. Лічылася, што гэта садзейнічае плоднасці зямлі. Агаленне шырока практыкавалася пры абворванні вёскі, пры пасеве гароднiны, вывядзенні хатніх насякомых, падчас адгону градавой хмары. На Віцебшчыне пасля пасеву ільну распраналіся і каталіся па зямлі. На Смаленшчыне мужык галышом на кані аб'язджаў канаплянае поле. Аголеныя ці прыкрытыя толькі абрусам жанчыны, трымаючы ў руках абраз, абыходзілі пажар.



*Рытуальнае качанне на арэлях на Саракі (Мінскі р-н., Мінская вобл.)*

Магічнае значэнне мела ***біццё посуду***. Яно практыкавалася пры розных момантах жыцця: на радзінах, вяселлях, пахаваннях. Лічылася, што такія дзеянні садзейнічаюць пераходу ў іншы стан, адраджэнню, а таксама абараняюць ад ліхіх сіл. У Крэве на Смаргон-

шчыне ў канцы XIX ст. зафіксавалі цікавы звычай. Калі маладыя пад'язджалі да дому жаніха, то тыя, хто іх сустракаў, ставілі на шулы варотаў гаршчкі з попелам. Як толькі вяселле ўязджала на падворак, гаршчкі разбівалі каламі, і коні кідаліся прэч. Так паўталі некалькі разоў. У вёсцы Аніскавічы на Брэстчыне падчас хрэсьбін парадзісе на талерку сыпалі грошы, а затым тую талерку білі і на ёй таньчылі. Шырока распаўсюджаны звычай разбіваць гаршчок з бабінай кашай на хрэсьбінах і потым есці кашу на чарапках. Біты гліняны посуд зафіксаваны на вяршынях і ў раўках курганоў пачатку II тысячагоддзя. Гэта ў вёсках Маяк Бабруйскага, Сухая Гара і Селішча Лагойскага раёнаў і іншых. З этнаграфічных апісанняў вядома, што падчас пахавання якая-небудзь з жанчын, родных памерлага ці памерлай, кідала ўслед за труной зерне. Так рабілі для таго, каб памерлы не пакінуў жывых без хлеба. Потым гаршчок з-пад зерня разбівалі аб рог дома.

Разнавіднасцю ахоўнай магіі з'яўляецца ***праміванне або працягванне праз адтуліну***. Так, некалі хворых дзяцей працягвалі праз вянок з купальскіх траў. Распаўсюджаным сродкам лекавання розных хвароб да нашага часу лічыцца працягванне хворага праз адтуліну ў святым дрэве. У канцы XIX ст. каля вёскі Міластава Бярэзінскага раёна стаялі тры лекавыя ліпы. Хворых тут працягвалі праз адтуліны ў дрэвах. Пасля чаго старое адзенне здымалі і апраналі новае. Былі ўпэўнены, што дрэва разам са старой вопраткай забярэ і хваробу. Падобныя культавыя дрэвы вядомы каля вёсак Старыя Гумны Крупскага і Заазер'е Бялыніцкага раёнаў. Каля вёскі Горка Дзятлаўскага раёна на схіле гары знаходзіцца камлыга, якая некалі расшчапілася на тры часткі і ўтварыла праход. Каб вылекавацца, праз расколіну ў камяні пралазяць тройчы. Прычым такія дзеянні звычайна робяць у пэўныя каляндарныя святы.

У Лукомлі Чашніцкага і Клінах Слаўгарадскага раёнаў з магічнай мэтай у пэўныя дні пераходзілі крыніцы. У Клінах такі абрад існуе і сёння, ён ладзіцца на праваслаўнае свята Макавей (14 жніўня). Увогуле, згодна з народнымі вераваннямі, вада з крыніц валодае магічнай сілай у пэўныя дні. Прыкладам, за такой вадой хадзілі на Яна ў вёсках Чарневічы і Бабруйшчына Глыбоцкага, Клінавая Шаркаўшчынскага, Кракотка Слонімскага раёнаў; на Юр'я — у Віцебску і Горцы Дзятлаўскага раёна; на Міколу — у вёсках Міколка Уздзенскага, Шацк Пухавіцкага, Гронаў Чэрыкаўскага раёнаў; на Пятра і Паўла — Барок Барысаўскага, Прошыка Крупскага раёнаў і г.д.

Вада, пралітая праз адтуліну ў камяні, таксама лічылася цудадзейнай. Каля вёсак Ператок і Дубнікі Любанскага раёна яшчэ і



*Рытуальны пераход крыніцы на Макавей, вёска Кліны (Слаўгарадскі р-н., Магілёўская вобл.)*

сёння ліюць ваду на камень, і пасля таго, як яна працячэ праз дзірачкі, якімі пранізаны валун, лічыцца лекавай. Каменю ахвяруюць грошы, садавіну, цукеркі, печыва. Дзяцей, каб не хварэлі, тройчы абводзяць вакол каменя або садзяць ці кладуць на яго. Асабліва дзейсным і карысным лічыцца прыходзіць сюды ў маладзіковую нядзелю. Мясцовыя жыхары ўпэўнены: менавіта ў гэты час камень валодае найбольшай магічнай сілай. Вышэй мы казалі, што вялікай папулярнасцю ў лекавай магіі карысталіся каменныя сякеры з прасвідраванымі адтулінамі. Вада, пралітая праз такую адтуліну, лічылася лекавай. Хворыя жанчыны праз адтуліны выціскалі грудное малако. Карову пры грудзіне таксама даілі такім чынам.

Дзеля добрага ўраджаю магічным лічыўся ***карагод***. На Гомельшчыне, асабліва ў Чачэрскім і Веткаўскім раёнах, увесну калодзежы ўпрыгожвалі ручнікамі і абрусамі, а потым вакол вадзілі карагоды. Да магіі плоднасці маюць дачыненне карагоды на Юр'я.

Самым распаўсюджаным абрадам ахоўнай магіі да нашага часу з'яўляецца ***абрад выклікання дажджу***. Для яго характэрна велізарная колькасць дзеянняў і магічных забаронаў. Дождж як нябесны дар звязваецца з ідэяй урадлівасці і багацця. Продкі спачатку лічылі, што дождж пасылае Пярун, а пазней гэтую функцыю прыпісвалі Святому Іллю, займенніку Перуна. Некалі самым дзейсным сродкам выклікання дажджу лічылася абворванне. Абворвалі вёску, храм,

калодзеж, пераворвалі высахлае рэчышча ракі. Звычайна ў пераворванні ракі ўдзельнічала 12 чалавек. Як правіла, гэта былі рытуальна чыстыя асобы: падлеткі, удовы, старыя жанчыны. Нават сёння абрады абворвання для выклікання дажджу памятаюць старажылы многіх вёсак Беларусі. Яшчэ не так даўно ў Докшыцкім раёне, каб выклікаць дождж, дзве дзяўчыны ўпрагаліся ў саху, а трэцяя вяла іх.



*Карагод «Перапёлачка»,*
*вёска Тонеж (Лельчыцкі р-н., Гомельская вобл.)*

Для спынення засухі таксама ткалі абыдзённыя ручнікі і рабілі ***аброчны драўляны крыж***. Дзейсным сродкам лічылася абліванне пераапранутага падчас абрадавай працэсіі або цяжарнай жанчыны, пастуха, святара. Палешукі Брэсцкага Палесся, каб своечасова пайшоў дождж і паспрыяў будучаму ўраджаю, на Купалле праводзілі абрад «куста». У гэты дзень, калі дзяўчына, якая выконвала ролю «куста», ішла па вёсцы, яе каля кожнага дома хлопцы аблівалі вадой. Напрыканцы абходу галінкі ад куста — своеасаблівага касцюма з зялёніны, які быў на дзяўчыне, кідалі ў раку, а вянок з яе галавы вешалі над калодзежам.

Каб пайшоў дождж, таксама забівалі жабу або вужа, чарвяка, смаўжа, мядзведку, рака і рытуальна валачылі іх па зямлі, потым сімвалічна хавалі каля калодзежа або іх скуркі вывешвалі на дрэва ці браму. Таксама выконвалі рытуальнае валачэнне абыдзённай на-

міткі, выкопвалі ямкі на дарозе. У некаторых вёсках да хтанічных жывёл, што адказваюць за водны баланс, адносілі і ката, якога дзеля выклікання дажджу падвешвалі жывога ўніз галавой на дрэве ці паркане. Насякомых на старым лапці вывозілі за вёску, разбуралі палкай мурашнік, і калі мурашы распаўзаліся, верылі, што так яны выклікаюць кроплі дажджу. Праводзілі рытуальныя дзеянні над магіламі тапельцаў і вісельнікаў, якіх лічылі прычынай засухі. Іх палівалі вадой. Зцягвалі з могілак і тапілі ў вадаёмах паваленыя крыжы.

Захавалася шмат архаічных рытуалаў, звязаных з калодзежам. У іх яшчэ адчуваецца лагічная схема першабытнага мыслення. Паводле старажытных уяўленняў, калодзеж — гэта канал сувязі з іншасветам. Таму туды падчас засухі кідалі абыдзённікі, грошы, скрадзеныя ў іншаверцаў гаршчкі, ежу: боршч, хлеб, соль, сала, мак, цыбулю, часнык. У некаторых месцах ваду з сямі калодзежаў неслі на поле і там разлівалі яе. Ваду ў калодзежы білі або раскопвалі старыя калодзежы. Удовы з абразом і хлебам-соллю тройчы абыходзілі вакол самага старога калодзежа. У Ліпску Докшыцкага раёна найбольш дзейсным сродкам лічылася кіданне маку ў дзевяць калодзежаў. Менавіта каля калодзежаў галасілі па тапельцах. Напрыклад, яшчэ нядаўна пры такіх момантах на Мазыршчыне аплаквалі міфічнага тапельца Макарку. Пры гэтым жанчыны калацілі ваду ў калодзежы палкамі і галасілі: «*Макарка ўтапіўся! Макарка, сыночак, вылезь з вады, разлі слёзы па святой зямлі!*»



*Абрад «выкліканне дажджу», вёска Крамянец (Лагойскі р-н, Мінская вобл.)*

Прасіць дажджу хадзілі і да святых камянёў. Так рабілі ў вёсках Крамянец Лагойскага, Каптаруны Пастаўскага, Сорагі Слуцкага, Піраток Любанскага раёнаў. Да сёняшняга дня ў вёсцы Крамянец Лагойскага раёна захаваўся вельмі архаічны абрад выклікання дажджу. Ён адбываецца каля каменя пад назвай Дажбогаў або Святы, Даждьбогаў Камень. Каменю ахвяруюць грошы, кветкі, цукеркі хусткі, ручнікі. Калі ў вёсцы вырашаюць, што патрэбен дождж,

то хто-небудзь са старых жанчын ідзе па хатах і збірае 9 або 12 удоў. Жанчыны высякаюць калкі ў рост чалавека і падсоўваюць іх пад Дажбогаў камень. Такім чынам яго прыўздымаюць. Пры гэтым кажуць: «*Божанька, дапамажы, дожджык прынясі*».

На трэці дзень чакаюць дажджу. Калкі пад каменем пакідаюць да таго часу, пакуль не пойдзе дождж. У вёсцы Свярынава Стаўбцоўскага раёна з просьбай паслаць дождж маліліся каля крыніцы-ручая. У Крупскім раёне для выклікання дажджу жанчыны ішлі да рэчкі і купаліся галышом.

Існавалі абрады і для спынення дажджу. Дзеля гэтага з дому ў двор выкідвалі хлебную лапату, качаргу, венік або тыя рэчы, якія асацыіраваліся з агнём. У Крамянцы на Лагойшчыне, каб спыніць дождж, зрушвалі ўзгаданы вышэй Святы камень.

# Глава 4
# РЭЛІКТАВЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ

Да нашага часу трымаецца вера ў тое, што каб засцерагчы жытло і гаспадарку ад ***перуновых стрэл***, над уваходам хаты або на каньку трэба прымацаваць ці вырэзаць разеткі з выявай знака Перуна.

Са звычаем шанавання агню звязаны абрад «***Жаніцьба коміна***». Вясной пасля Радаўніцы ён адзначаў пераход ад зімовых прац да палявых, а ўвосень — першае запальванне лучыны. У гэтыя дні ў каганец падлівалі гарэлку, кідалі сала, масла. Гэта рытуал ахвярапрынашэння агню.

Сімволіка агню шырока выкарыстоўвалася ў вясельнай і пахавальнай абраднасці. Яшчэ ў канцы XIX ст. на Палессі падчас вяселля шырока бытаваў звычай ***распальвання вогнішча*** пасярод вуліцы ў той момант, калі маладую везлі да царквы. Як патрабавала традыцыя, нявеста павінна была праскочыць праз агонь. Згодна з павер'ямі палешукоў, калі нявеста грэшная, то агонь абавязкова абпаліць яе. У некаторых палескіх вёсках дзейнічалі па-другому: як толькі вяселле ўязджала ў двор, у варотах пачыналі паліць стары саламяны сноп. Такі агонь павінен быў засцерагчы маладых ад ведзьмакоў.

Пры пахаваннях таксама выкарыстоўвалі агонь, яго разводзілі ў магільных ямах. Следам за дамавінай у гаршчку неслі гарачыя вуголлі, якія бралі з печы ў хаце памерлага. Гаршчок з вугаллямі пераварочвалі і ставілі на магілу. Рэліктамі культу агню з'яўляюцца Купальскія вогнішчы і вогнішчы, якія на Вялікдзень раскладалі вакол

храма і на вуліцах. Хрысціянскія святары стагоддзямі змагаліся з такімі звычкамі, але яны захаваліся да нашых дзён.

Яшчэ не так даўно вялікае значэнне надавалася «***жывому агню***». У вёсцы Даманавічы каля Князь-возера (Жыценскага або Чырвонага возера) на Палессі ў 1920-я гг. зафіксавалі цікавы звычай. На дваццаць пяты дзень пасля Вялікадня — у Русальчыну сераду — здабывалі жывы агонь. Раней дзеянне адбывалася ў лесе раз на тры гады, потым гэта сталі рабіць штогод у вёсцы. Перад абрадам усе старыя агні тушылі. Выбраныя дагэтуль грамадой пяць паважаных вяскоўцаў бралі камель сухога ясеневага дрэва даўжынёй з сажань і рассякалі яго ўздоўж на пяць калкоў. Адзін з іх прымацоўвалі да пня. Наверсе рабілі ямку і ў яе ставілі другі кол. Потым пачыналі верхнім калом церці па ніжняму. Гэта рабілі два чалавекі, а калі тыя стамляліся, ім на змену прыходзілі другія. Унізе такога прыстасавання клалі сухую траву і бярозавую кару. З цягам часу дрэва пачынала курэць. Удалае здабыванне агню лічылася адзнакай урадлівага года. Кожная сям'я запальвала ясеневую лучыну ад рассечанага кала і несла да дому, дзе разводзілі новы агонь.



*Здабыванне жывога агню на Палессі (рэканструкцыя акадэміка Б. Рыбакова па дадзеных археолага А. Ляўданскага)*

З культам агню і з культам продкаў звязаны вельмі архаічны абрад «***Свяча***», або Братчына, Канун, галоўным сакральным аб'ектам якога з'яўляецца калектыўная свечка. Важнай адзнакай гэтага абраду з'яўлялася тое, што кожны ўдзельнік «Свячы» ахвяраваў на яе воск і збожжа. З прыходам хрысціянства да свечкі сталі далучаць яшчэ і абраз. Таму пазнейшая «Свяча» стала яскрава спалучаць дахрысціянскія ўяўленні і рытуальныя дзеянні з народным культам святых. Абрад адбываўся ў розныя поры года і ў многіх выпадках быў прымеркаваны да пэўнага святога — ахоўніка вёскі.

Гэты абрад месцамі яшчэ існуе на ўсходзе беларускай этнічнай тэрыторыі. Ён складаўся з сукання вялікай свечкі, калектыўнага малення і агульнага застолля ў складчыну. Напрыклад, у Краснапольскім раёне зробленую свячу ставілі пад абразом у севалку з аўсом ці жытам. Потым гэта зерне выкарыстоўвалі падчас сяўбы. Запрашалі святара, які служыў малебен і акрапляў святой вадой усю гаспадарку. Потым папа праводзілі і толькі тады склікалі за стол. Абрад адпраўляўся цэлай вёскай ці асобнымі групамі людзей: удовамі, дзяўчатамі, халасцякамі, старцамі і іншымі. Свяча штогод пераносілася з хаты ў хату і так, пакуль не абыходзіла ўсю вёску. Вытокі такой з'явы ў старажытным язычніцкім звычаі: братчыне — святочным застоллі яе сяброў з элементамі ахвярапрынашэння.

Васковая свяча ў гэтым абрадзе мае антрапаморфную форму. Бывалі выпадкі, калі зверху прымацоўвалі дадатковыя свечкі, якія нагадваюць рукі. Свячу апраналі ў спецыяльна пашытае адзенне, абвязвалі стужкамі. Стужкі, што пабылі на свячы, лічыліся гаючымі, імі потым перавязвалі хворыя месцы на целе. У некаторых вёсках са свячой хадзілі па дварах, і кожны гаспадар прымацоўваў да яе свой кавалак воску, а калі яна набірала вагу да аднаго-двух пудоў, то яе ахвяравалі ў царкву. Але перад гэтым верхавіну свячы зразалі, а потым ад яе пачыналі нарошчваць новую свечку. У вёсцы Наркі Чэрыкаўскага раёна свячу і цяпер носяць хрэсным ходам з той хаты, дзе яна стаяла год, на крыніцу. Гэта адбываецца на другі дзень пасля свята Пятра і Паўла — 13 ліпеня. Потым свячу вяртаюць у вёску і перадаюць на год у другую хату.

У розныя поры года нашы продкі ладзілі так званае ***Свята Піва***, падчас якога ўсёй грамадой варылі традыцыйны сакральны напой з соладу, вады і хмелю. Півам, як і другімі алкагольнымі напоямі, адзначалі пачатак ворыва і збор ураджаю, хрэсьбіны і памінальныя дні, пэўныя дні хрысціянскіх святых — ахоўнікаў вёскі і шматлікія каляндарныя святы. Піва таксама варылі, каб засцерагчыся ад пошасці, пры пераходзе ў новы дом і г.д. Прычым працэс прыгатавання піва быў абумоўлены рознымі правіламі, у залежнасці ад таго, дзеля якой мэты яго варылі. Звычайна гэта давяралі вельмі паважаным людзям. Невыкананне пэўных умоў варкі і піцця піва магло прынесці няшчасце, хваробы, псоту маладых на вяселлі. Месца прыгатавання таксама мела сакральны характар. Піва варылі на гары, беразе ракі, каля маста, храма, могілак. Падчас варкі спявалі абрадавыя песні.

Вядома, што ў савецкія часы ўлады ўсяляк змагаліся са Святам Піва. Так, у 1957 годзе падчас святкаваня Піва ў вёсцы Стараселле

Бялыніцкага раёна міліцыянты разагналі ўсіх удзельнікаў, а траіх арыштавалі, суд прызначыў ім год турэмнага зняволення. Пасля такога гвалту ў многіх вёсках старадаўні абрад пачынаў знікаць.

У вёсцы Кукарава Бярэзінскага раёна яшчэ на памяці старажылаў такі звычай: калі іх хлопцы ішлі на Свята Піва ў суседнюю вёску Пагост, то мераліся сілай — па чарзе неслі на руках мясцовы камень Пястун. Перамагаў той, хто на большую адлегласць пранясе камень. Калі вярталіся ў сваю вёску, паўтаралі спаборніцтва і вярталі камень на месца.

Рэліктавым звычаем нашай культуры з'яўляецца рытуальнае змаганне паміж двумя родавымі, тэрытарыяльнымі або сацыяльна-ўзроставымі групамі людзей. Гэта так званыя ***рытуальныя бойкі***. Карані такога змагання вельмі архаічныя і бяруць пачатак са старажытных міфаў, дзе ягоныя героі-супернікі заўсёды змагаюцца паміж сабой. Архетыпам падобнай бойкі выступае першапаядынак бога Грымотніка са змеепадобным праціўнікам. Большасць народных паданняў распавядае, што б'юцца супернікі звычайна на мосце, які сімвалізуе памежную зону паміж тым і гэтым светам. Так, у беларускіх казках



*Рытуальныя бойкі*

герой сустракаецца са Змеем на Калінавым мосце. Паводле міфалагічных уяўленняў, бойкі характэрны і для волатаў — першанасельнікаў нашай зямлі. Яны б'юцца камянямі, каменнымі сякерамі, выдранымі з коранем дубамі, жорнамі. Бойкі адбываюцца праз раку ці балота. Адно з паданняў сцвярджае, што ў вёсцы Каменка Смалявіцкага раёна багатыры гарадзішча Замак біліся з багатырамі Юзэфаўскага замка праз балота, па якім цячэ рака Усяжа.

Шэраг паданняў расказвае пра бойкі вясельных працэсій, якія выпадкова сустракаюцца і не жадаюць саступаць адзін аднаму да-

рогу. Часта распавядаюць і пра двубоі жаніхоў. Пра курганны могільнік каля вёскі Мялешкавічы Мазырскага раёна занатавана паданне, паводле якога адна пара маладых ехала ад вянца, а другая пад вянец. Калі яны сустрэліся, то ніхто не хацеў саступаць дарогу. Завязалася бойка, і абедзве пары маладых былі забітыя. Нібыта мясцовыя курганы гэта і ёсць магілы маладых.

У некаторых паданнях пра сакральныя камяні прысутнічае матыў бойкі двух правадыроў перад бітвай. У вёсцы Дулебы Бярэзінскага раёна пра камяні пад назвай Кумар і Гуд некалі расказвалі, што ў гэтай мясцовасці жыў мірны народ дулы. Аднойчы правадыр гэтага роду Кумар раніцай выйшаў з хаты і ўбачыў на зямлі сляды ад колаў. Праз нейкі час адбылося нашэсце другога народу, якім кіраваў Гуд. Апошні выклікаў Кумара на двубой і адсёк яму галаву. У тую ж хвіліну абодва правадыры скамянелі. У вёсцы Сяменчыцы Стаўбцоўскага раёна адно з паданняў пра Чортаў Камень гаворыць, што некалі каля яго біліся два военачальнікі, а суддзі сядзелі на камяні. Пра камень Вор каля вёскі Суткава Смаргонскага раёна расказвалі, што на ім былі бітыя 12 хлопчыкаў для таго, каб памяталі пра мяжу паміж землямі памешчыка Букатага і манастырскай.

Рытуальныя бойкі ў значнай ступені былі прымеркаваны да каляндарных святаў. У 1870-я гг. у наваколлі Бягомля Докшыцкага раёна падчас восеньскага памінання продкаў у сялянскіх хатах пасля традыцыйнага застолля пачыналі жартам біцца качанамі і храпкамі капусты. Пасля гэтага спявалі песні і ладзілі танцы з маскарадамі. У сярэдзіне XX ст. на Ільінскім свяце ў лесе каля крыніцы паблізу вёскі Стайкі Ушацкага раёна дзяўчаты вадзілі карагоды, а хлопцы мераліся сілай і біліся каламі.

Таксама вядома, што на Радаўніцу, дзе-нідзе ў Беларусі, пасля абеду паміж хлопчыкамі ладзіліся рытуальныя бойкі. Падобныя бойкі адбываліся і на масленіцу — памежны час пераходу ад зімы да вясны. Сёняшняя гульня ў снежкі на гэта свята з'яўляецца рэліктам старадаўняй рытуальнай бойкі.

У час вясенне-летніх гулянняў існавала пэўнае супрацьстаянне дзяўчат і хлопцаў, жанчын і мужчын. Напрыклад, Тройцу дзяўчаты і жанчыны святкавалі звычайна дзе-небудзь на ўзгорку за вёскай, а калі туды з'яўляліся мужчыны, то з іх зрывалі шапкі і маглі нават кінуць іх у вогнішча. Паколькі бойкі ў значнай ступені прымеркаваны да каляндарных свят, то адсюль невыпадковым з'яўляецца тое, што на Бабруйшчыне такія святы разам з кірмашамі ў народзе атрымалі назву *Чупрыннікі* — ад таго, што падчас бойкі адзін аднаго цягалі за чупрыны.

Вельмі архаічнай формай рытуальных дзеянняў з'яўляюцца ***танцы, скокі, карагоды***. Яны ўваходзілі ў склад большасці абрадаў і былі строга рэгламентаваны. Танец, скокі і карагод падчас абрадавага дзеяння нельга было спыняць, пакуль не канчалася песня, пад якую іх пачыналі. Карагоды характэрны найбольш для вясновых і летніх свят. Прыказка гаворыць: «*дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць!*» Заўсёды таньчылі пры знішчэнні абрадавых пудзіл, калі іх палілі ў агні ці тапілі ў вадзе. Танчылі і вакол купальскага вогнішча, і пасля першага выгану скаціны. На Палессі, калі садзілі капусту і цыбулю, жанчыны скакалі ўздоўж градак.



Выява магічных танцаў на бранзалетах-наручах XII—XIII ст.

Вялікая ўвага надавалася рытуальным скокам на вяселлі. Пасля таго, як каравай пасадзілі ў печ, родныя жаніха і нявесты скакалі з хлебнай лапатай, стукалі ёй аб пол і столь. Калі вымалі каравай, таксама скакалі. Танчылі і скакалі ў шлюбную ноч. На Палессі сваты скакалі па лавах і сталах, білі гаршчкі. Такімі разгульнымі паводзінамі яны «*дапамагалі поспеху справы*». На наступны дзень, калі

нявеста аказвалася «чэснай», то ўсе прысутныя білі посуд і скакалі на чарапках.

Царква ў павучаннях супраць язычніцтва яшчэ ў пачатку XX ст. ганьбіла скокі і карагоды, лічыла іх грахом і патрабавала за іх пакарання. Адсюль невыпадковыя і сюжэты легендаў, дзе паходжанне некаторых азёр і балот тлумачыцца тым, што Бог пакараў людзей за *«пацехі са скокамі»*, у выніку чаго храм, дом, палац або карчма праваліліся, а на іх месцы ўтварыліся возера ці балота. На Вілейшчыне расказвалі, што некалі каля дарогі з мястэчка Рэчкі ў фальварак Орпы стаяла карчма. Аднойчы на ўсяночную перад святой нядзеляй людзі замест храма пайшлі на гулянку ў карчму. Тады зямля паглынула будынак разам з людзьмі, і ўтварылася возера. Падобнае паданне ў 1920-я гг. зафіксавана і пра азярко каля вёскі Леснікі Лагойскага раёна. Гаварылі, што на месцы возера стаяў дом, дзе аднойчы ў суботу перад Вялікаднем сабралася моладзь і таньчыла да раніцы, замест таго, каб пайсці ў храм. За такі грэх будынак праваліўся, і з'явілася азярко.

Са своеасаблівых архаічных звычаяў пачыналася ворыва. У гэты дзень араты старанна мыўся, апранаў чыстую бялізну і кашулю, каб будучае збожжа было чыстым ад пустазелля. На Гарадзеншчыне



*Палатно «на смерць», вёска Хваенск*
*(Жыткавіцкі р-н, Гомельская вобл.)*



*Абрад «Пахаванне стралы», вёска Стаўбун (Веткаўскі р-н., Гомельская вобл.)*

яшчэ напачатку XX ст. перад валамі слалі велікодны абрус, а саміх валоў і саху крапілі вадохрышчанскай вадой. Таксама вакол валоў абносілі асвечаны хлеб і давалі яго з'есці. Араты з сабой у поле браў вялікі кавалак хлеба, які ляжаў там цэлы дзень, а ў вечары прыносіў яго дахаты. Потым такі хлеб аддавалі жабракам. На Віцебшчыне араты перад выхадам у поле павінен быў пабіць цешчу і цесця.

Да рэліктавых з'яў адносіцца ***рытуальны крадзеж***. Выкрадзенае ў рытуальных мэтах выступае як ахвяра іншасвету. Напярэдадні Новага году існаваў звычай красці не толькі рэчы, але нават скаціну, асабліва ў людзей, набліжаных да сферы «чужога»: чужынцаў, святароў, рамеснікаў. На наступны дзень крадзенае вярталі, а гаспадар у падзяку павінен быў пачаставаць «*злодзея*». Надзейным сродкам для вывядзення жамяры ў хаце лічылася зямля, якую скралі дзеці з першай вясенняй баразны.

Цікавы звычай рытуальнага крадзяжу на Уздзвіжанне існаваў у мястэчку Пагост каля Турава. Напярэдадні кірмашу моладзь дзівачыла ў начным — спальвалі шапкі на вогнішчах, абразалі цуглі на конях, кралі трубы, каб адпалохаць ваўкоў і інш. Тым, хто дзівачыў, на наступны дзень на кірмашы дазвалялася красці, асабліва шапкі.

Згодна з павер'ямі, шапка сімвалізуе самога чалавека, а яе адсутнасць набліжае яго да прадстаўнікоў тагасвету. Так што, скрадзеныя шапкі на свяце замянялі пастушкам спаленыя імі шапкі напярэдадні і выступалі як ахвяраванне таму свету.

З архаічных часоў шырока вядомы ***абрад перапякання*** дзіцяці. Раней ён праводзіўся даволі часта і над большасцю нованароджаных. Пазней такі абрад ладзіўся толькі над хворымі і слабымі ад нараджэння дзецьмі. Каб знішчыць хваробу, іх тройчы засоўвалі на



*Абрад «Перапяканне дзіцёнка» (малюнак-рэканструкцыя)*

хлебнай лапаце ў цёплую печ. У такіх вёсках Палесся, як Тонеж, Ста-долічы Лельчыцкага раёна і іншых да нашага часу захаваўся падобны звычай. Паводле этнаграфічных апісанняў XIX ст., бабка-знахарка да ўзыходу сонца прыносіла ваду з трох калодзежаў і замешвала ў ёй цеста. Потым на хлебнай лапаце засоўвала яго ў печ і пякла хлеб. Пасля таго, як гатовы хлеб быў выцягнуты з печы, яна клікала маці з хворым дзіцёнкам. Тая саджала на гэту ж хлебную

лапату сваё немаўля, абмывала яго вадой, якой дагэтуль абмазвалі хлеб і рабіла выгляд, што збіраецца пасадзіць яго ў печ. У гэты ж момант іншыя жанчыны адчынялі дзверы і здымалі дзіця з лапаты. Але

этнографы зафіксавалі шэраг выпадкаў, калі дзіця па-сапраўднаму на імгненне засоўвалі ў печ на лапаце і пры гэтым прамаўлялі замовы. Сэнс такога звычаю азначаў, што дзіцёнка вярталі ў чэрва маці, якое замяняла печ, каб ён нарадзіўся наноў моцным і здаровым.



Практычна ва ўсіх выпадках жыцця да нашых дзён выкарыстоўваюцца ***замовы*** — рытмічна створаныя моўныя формулы, якім надаецца сіла магічнага ўздзеяння. Замовамі валодалі не толькі знахары, але і простыя людзі. Рознага кшталту заклінанні выразалі на костках, драўляных вырабах. Напрыклад, шэраг замоў ад няшчасцяў і хвароб выразаны на костках жывёл, якія знойдзены пры археалагічных раскопках на гарадзішчы каля вёскі Маскавічы на Браслаўшчыне. Надпісы зроблены рунічным дэградзіраваным пісьмом поствікінгаўскага часу, і таму дакладна прачытаць іх цяжка, але падобныя заклінанні ёсць на драўляных стрыжнях і на надмагільных камянях у Скандынавіі.



*Рытуальная лялька зязюлі для абраду «Хрышчэнне і пахаванне зязюлі»*

Ёсць замовы-звароты, замовы-просьбы, замовы-пажаданні. І ў наш час некаторыя бабулькі моляць не Бога, а кажуць: «*Неба высокае! Сонца яснае! Дай мне здаровічка, сілачкі пераржыць гэта...*» На Падняпроўі некалі звярталіся да крыніцы з просьбай: «*Вадзіца, царыца, ачышчальніца наша! Бяжыш ты па мхам, па балотам, ачышчаеш карэнне, каменне — ачысці маё цела грэшнае ад усялякай сквернасці!*»

Найбольш распаўсюджаны шматлікія лекавыя замовы. Часам у замовах спасылаюцца на продкаў, якія забяспечваюць здароўе.

З пашырэннем хрысціянства форма замоў трохі памянялася, перад іх пачат-

кам з'явіўся малітоўны ўступ. Заканчваюцца замовы так званай «за-крэпкай» або «замком». Напрыклад, да адной з крыніц у Пухавіцкім раёне людзі звяртаюцца за агульнай дапамогай і ў такім выпадку прамаўляюць:

*«Крыніца, ты Таццяна!*
*Вада твая, Улляна,*
*Дапамажы мне з усіх чатырох старон,*
*З усходу, захаду, поўначы, поўдня!*
*Дапамажы мне на доўгія лета!*
*І дапамажы ўсёй нашай Беларусі!»*

# ПАСЛЯСЛОЎЕ

Далёка не кожная еўрапейская краіна захавала да сёння ў жывым побыце столькі легенд і паданняў, звычаяў і абрадаў, прымавак, прыказак і песень, як Беларусь. Старажытныя вераванні беларусаў праіснавалі многія тысячагоддзі і некаторыя з іх дайшлі да нашага часу. Архаічны светапогляд і рэлігійныя культы прынята абазначаць агульным тэрмінам «язычніцтва».

Гэта тэрмін багаслоўскага паходжання азначае ў асноўным ідалапаклонства або шматбожжа. Як правіла, навукоўцы пазбягаюць выкарыстоўваць тэрмін «язычніцтва» з-за нявызначанасці і разнастайнасці сэнсаў і аддаюць перавагу больш дакладным азначэнням. Прыкладам, такім, як політэізм, шаманізм, татэмізм, анімізм і г.д. Сёння царкоўнаславянскае слова «язычніцтва» ў навуковай літаратуры замяняецца тэрмінам «этнічная рэлігія». Для этнічнай рэлігіі старажытных беларусаў характэрна вера ў існаванне духаў, цудадзейную сілу, роднасць паміж людзьмі і пэўнымі відамі жывёл, раслін, культ продкаў і іншае. Чалавечы вобраз надаваўся не толькі бoствам і духам, але і ўсяму космасу.

Зямля нашымі продкамі ўяўлялася жывой істотай жаночага роду, якая апладняецца, зацяжарвае і дае новы ўраджай. Яна «адмыкаецца» ўвесну і «замыкаецца» ўвосень. Паводле міфалагічных уяўленняў нашых продкаў, узнікненне рэк і балот узыходзіць да часоў першастварэння, да якога спрычыніліся Бог, Чорт ці архаічны Волат — персанажы дахрысціянскага паходжання. Бог лічыўся стваральнікам усяго жывога, бацькам усіх астатніх бостваў. Чорт быў ліхім духам, які супрацьстаяў Богу. Волат — першапродак велізарных памераў і сілы.

Неба нашы прашчуры ўяўлялі, як аграмадную паўсферычную столь са срэбра, шкла ці ўвогуле лёду. Уваходам на неба лічылася тое месца, дзе ўзыходзіць сонца. А само сонца ўспрымалі за вялікае вогнішча, якое ўдзень саграваe неба, а месяц — за начное свяціла. Зоркі лічыліся дзецьмі Маці-Сонца і Бацькі-Месяца, або наадварот, Сонца выступала ў ролі жаніха, а Месяц — нявесты. Таксама думалі, што кожны чалавек мае сваю асобную зорку — духа-ахоўніка. Верылі, што з'яўленне маланкі, грому і дажджу залежыць ад барацьбы

двух боствaў: верхняга — Грымотніка (Перуна) і ніжняга, які бярэ выгляд Змея. Вецер быў прыстанкам духаў і дэманаў. З'яўленне расы на зямлі — вынік апладняючых дзеянняў бога Ярылы.

У міфах беларусаў стварэнне мужчыны папярэднічала стварэнню жанчыны. У вобразе мужчыны прасочваюцца сакральныя функцыі першатворцы. Жанчыне ж належыць галоўная роля ў захаванні традыцый ва ўсіх сферах жыцця. З сённяшніх аскепкаў старажытных міфаў ясна праглядаецца вера ў існаванне душы — пэўнай субстанцыі, якая знаходзіцца ў сярэдзіне чалавека і забяспечвае яму жыццё. Душу, яшчэ ва ўлонні маці, у чалавека ўкладае Бог. На працягу жыцця развіваецца і ягоная душа. Асноўнымі стадыямі чалавечага жыцця лічылася нараджэнне, вяселле і смерць.

Усе гэтыя моманты мелі парадак дзеянняў і былі прапісаны звычаямі продкаў. У светапоглядзе беларусаў нават не было пасляСмяротнага знікнення. Смерць успрымалася як пераход у іншы свет — краіну нябожчыкаў. У пахавальным абрадзе адлюстравалася цэласная сістэма ідэалагічных уяўленняў.

Напярэдадні прыняцця хрысціянства ў нашых продкаў склалася ўстойлівая рэлігійная сістэма, дзе за кожным боствам замацаваліся пэўныя функцыі. Мужчынскімі боствамі былі Пярун, Вялес, Дажбог, Ярыла і іншыя. Асабліва вылучаліся Пярун, Вялес і Ярыла. Пярун — бог грому і маланкі, прадстаўнік верхняга ўзроўню, а таксама апякун вайсковай справы. Вялес асацыіраваўся з ніжнім светам, быў богам памерлых і смерці, апроч гэтага ён адказваў за гаспадарку і дабрабыт, апекаваўся магіяй і чараўніцтвам. Ярыла быў богам урадлівасці, або сонечным боствам. Пасля прыняцця хрысціянства Перуна замяніў Святы Ілля, Вялеса — Святы Мікалай, а Ярылу — Святы Юр'я.

Сярод жаночых боствaў вылучаецца Мокаш — багіня зямлі і ўраджаю. Яна лічылася жонкай Перуна. У хрысціянскія часы яе замяніла Святая Параскева. Апроч Мокашы ў фальклоры згадваюцца такія жаночыя боствы, як Лада і Лёля, Маланка і Цёця. Мару, Марэну або Мажану — адзін з самых загадкавых персанажаў нашай міфалогіі, нярэдка адносілі да нячысцікаў. Тым не менш, яна магла быць рэліктам некалі адзінага старадаўняга жаночага боства — Вялікай Багіні, адказнай за жыццё і смерць на зямлі

На тэрыторыі Беларусі археолагамі выяўлены шматлікія сляды язычніцкіх свяцілішчаў (капішчаў, трэбішчаў) — месцаў маленняў і ахвярапрынашэнняў. Там месціліся рытуальныя вогнішчы ў гонар бога сонца (попельнікі), глінабітныя ахвярнікі, гарадзішчы-свяцілішчы з валамі і равамі. Калі памянялася рэлігія, на месцах свяцілі-

шчаў пачалі ўзводзіць хрысціянскія храмы, а ідалаў скідалі ў вадаёмы. Затое, такія ландшафтныя сакральныя аб'екты, як крыніцы, камяні, узвышшы і падобныя да іх, захаваліся да нашых дзён і з'яўляюцца месцам пакланення сілам прыроды.

Даглядалі старадаўнія капішчы і праводзілі рэлігійныя абрады на іх тагачасныя святары: жрацы, вайдалоты, вешчуны... Яны былі захавальнікамі сакральнага агню, сачылі за святамі, каляндарнымі і астранамічнымі зменамі, займаліся знахарствам і варожбамі. Потым святарскі статус захоўвалі вандроўныя старцы — жабракі або «божыя людзі», звычайна, ім давяралі больш, чым хрысціянскім святарам.

На працягу ўсёй гісторыі нашага народу існавала вера ў звышнатуральную роднасць з прыродай.

Элементамі сістэмы старажытных вераванняў і магічных рытуалаў былі жывёлы, асабліва конь, карова, авечка, воўк, мядзведзь. Значнае месца ў светаўспрыманні займаў вобраз змея.

Сімвалам верхняй прасторы (неба, сонца, ветру) з'яўляліся птушкі, у першую чаргу вобразы качкі і гускі, як творцаў Сусвету. Певень сімвалізаваў агульнае адраджэнне жыцця.



*Каменная баба, вёска Грабаўцы (Жабінкаўскі р-н)*

У духоўны свет беларусаў увайшлі і насякомыя. Паходжанне некаторых з іх тлумачылі дзейнасцю Грамаўніка (Перуна), а пчалу лічылі дачкой бога Ярылы. Спрадвеку ўшаноўваліся дрэвы, асабліва незвычайнай формы. Вялікай пашанай карысталіся дубравы. Абярэгамі і лекавымі лічыліся многія расліны.

Паўсюдна ў нашым краі існавала вера ў розных духаў. Сваіх міфічных гаспадароў мелі жытла і гаспадарчыя пабудовы, шматлікія

прыродныя прасторы. Існавалі нават духі хвароб. Трывала, з пакалення ў пакаленне, перадаваліся міфічныя ўяўленні пра ведзьмакоў, чараўнікоў і ваўкалакаў або пярэваратняў.

Вялікую ролю ў жыцці нашых прадзедаў адыгрывалі розныя абярэгі або амулеты і ахоўныя магічныя практыкі. Пры вырабе амулетаў вытрымліваліся пэўныя сакральныя дзеянні. Распаўсюджаным абрадам ахоўнай магіі было выкліканне дажджу. Гэты абрад захаваўся да нашага часу. З ім звязана велізарная колькасць магічных практык.



*Там, дзе неба сыходзіцца з зямлёю*
*(малюнак 1888 г.)*

Дахрысціянскія вытокі яскрава прасочваюцца ў ваджэнні карагодаў, замовах, правядзенні калядных, велікодных, сёмушных, купальскіх, спасаўскіх і іншых каляндарных свят. Увогуле, усе сферы матэрыяльнай і духоўнай культуры былі звязаны з развіццём календара — яскравага прыкладу адзінства чалавека з Сусветам. Генезіс каляндарных уяўленняў уздзейнічаў на развіццё выяўленчага

мастацтва, вуснапаэтычнай творчасці, абраднасці і захоўвання традыцый.

Падсумоўваючы вышэй сказанае, хочацца падкрэсліць, што для кожнага беларуса вельмі важна і неабходна вывучэнне сваёй уласнай этнічнай рэлігіі, створанай нашым народам цягам шматлікіх стагоддзяў. Таму што толькі нацыянальная міфалогія з'яўляецца тым пачаткам, які стварае аблічча кожнага этнасу, і якая, зрэшты, робіцца адной з самых галоўных крыніц разумення сябе.

Толькі той народ, які асэнсоўвае сябе ў часе, пачуваецца свядомым, а таму жыццяздольным, ён мае ў сваёй душы частку спрадвечнасці.

# БЕЛАРУСКІ ЯЗЫЧНІЦКІ ПАНТЭОН

## БОГІ

БОГ— у першасным значэнні «ўдача», «доля». Лічыцца творцам неба і зямлі.

БОГІ — Міфічныя персанажы, якія складаюць вышэйшы ўзровень рэлігійна-міфалагічнай сістэмы.

БЯЛУН (Белабог) — прабог, бацька Перуна. Зрэдку сыходзіць на зямлю ў выглядзе старога ў белым адзенні, з доўгай барадой і з кіем ў руцэ.

ВЯЛЕС ( Велес, Волас) — адзін з галоўных багоў язычніцкага пантэону ўсходніх славян, бог падземнага свету, ахоўнік багацця і хатняй жывёлы, апякун вешчуноў.

ГРАМАЎНІЦА — жонка Перуна.

ДАЖБОГ — бог сонца, сын Перуна і Грамаўніцы.

ЖЫЖАЛЬ — бог падземнага і зямнога агню.

ЖЫЦЕНЬ — бог восені. Спрыяе росту і выспяванню збажыны і гародніны. Продкі ўяўлялі яго худым чалавекам з ускудлачанымі валасамі і з трэцім вокам на патыліцы.

ЗЮЗЯ — бог зімы.

КОПША — валадар царства мёртвых.

ЛАДА — багіня кахання, апякунка шлюбу.

ЛЁЛЯ (Леля) — багіня вясны.

ЛЮБМЕЛ — бог шлюбу.

МАЖАНА(Паляндра) — багіня смерці.

МОКАШ — апякунка жанчын, былая жонка Перуна, якая здрадзіла яму з яго праціўнікам і за гэта была саслана на зямлю ў хтанічныя воды.

ПЯРУН (Грымотнік) — бог грому і маланкі, апякун воінаў. Свяшчэнным дрэвам Перуна быў дуб, а асноўным атрыбутам— каменная сякера.

СВЕТАВІТ — бог нябеснага святла і сонца.

СТРЫБОГ — бог ветру.

ЦЁЦЯ (Цюця) — багіня лета.

ЯРЫЛА — бог урадлівасці і сексуальнай сілы.

## ДУХІ І МІФІЧНЫЯ ІСТОТЫ

АРЖАВЕНЬ (Аржаваннік) — нячысцік, які жыве ў багне пакрытай іржой.

АСІЛКІ — міфічныя істоты незвычайнай сілы і антрапаморфнага аблічча, у асноўным «жыхары» гарадзішчаў.

БАБА-ЯГА (Ягіня) — зласлівая чараўніца, дэманічная істота, якая мае сілу толькі ўначы і толькі ў лесе.

БАЛАМУЦЕНЬ — дух вады, які заманьвае жанчын пад ваду, але потым адпускае.

БАЛОТНІК — пачварны нячысцік, які жыве ў балоце.

БОРДЗЯ — апякунка маладых.

БУРАЯ БАБА — жонка вупыра, бабуля без вушэй і носа, з лысай галавой на якой вялізны мухамор.

ВАДЗЯНІК — (вадзяны, вадзяны дзед, вірнік, амутнік, ціхоня) — дух вады, цар над вадой і рыбай. Уяўляўся ў выглядзе старога з зялёнымі валасамі, з доўгай барадой, перапонкамі паміж пальцамі на нагах.

ВАЛАСЕНЬ — хатні дух які ўначы пужае людзей. Уяўляўся невялікай істотай з цёмнай поўсцю, з сяміпалымі  далонямі і доўгімі пазногцямі.

ВЕДЗЬМА (вядзьмарка) — дэманічная істота жаночага роду якая жыве сярод людзей і вылучаецца выглядам і паводзінамі. Можа перакідвацца ў жабу, сароку, кабылу, чорную котку.

ВЕДЗЬМАК — дэманічная істота мужчынскага роду. Імі маглі стаць кавалі, млынары, леснікі, канавалы...

ВЕЦЕР — дух ветру, ўяўляўся пузатым пачварным чалавекам з доўгімі вуснамі.

ВОЛАТ — вялізны чалавек, персанаж беларускага дуалістычнага касмаганічнага міфа. Саманараджэнне волата адбываецца ў пачатковых водах.

ВОСПА (ліхая, рабая, гарбачка) — дух хваробы ў выглядзе старой жанчыны з адным зубам.

ВОХ (Ох) — маленькі барадаты чалавек, які жыве пад зямлёй, апякун падземных скарбаў. Можа дапамагаць людзям.

ВУПЫР — нябожчык, які чыніць шкоду людзям і свойскай жывёле. Мае чырвоны твар, распухлыя губы і тонкі язык-джала.

ГАЁЎКІ — унучкі ляснога духа Гаюна. Дапамагаюць яму сачыць за парадкам у лесе.

ГАРНІК — дабрадзейны дух, памочнік Бордзі (апякункі маладых).

ГАРЦУКІ — чорныя духі, падначаленыя Перуну. Возяць па небе грамавы жоран на якім ездзіць Пярун з вогненным лукам.

ГАЮН (Гаёвы дзед) — дух, які сочыць за парадкам у лесе, мае слугамі звяроў і птушак.

ГУМЕННІК — дух гумна ў выглядзе дзядка падперазанага саламяным перавеслам. Дапамагае сушыць і малаціць збожжа.

ДЗІКІЯ ЛЮДЗІ — міфічныя істоты, людзі, якія жылвуць ў чужых краях, за морамі.

ДЗЯДЫ — душы продкаў.

ЁЎНІК (асетнік) — сядзібны дух, сваяк хатніка і лазніка.

ЖАЛЕЗНАЯ БАБА — злая старая з жалезнымі грудзямі, міфічная насельніца палёў, агародаў, вадаёмаў.

ЖАЛЕЗНЫ ЧАЛАВЕК — ахоўнік балотаў з пакладамі самароднага жалеза.

ЗДАНІ (прывіды, пужалкі) — прывіды ў выглядзе людзей, жывёл, прадметаў, агнёў на сакральных мясцінах.

ЗЛЫДНІ — нячысцікі, якія насылаюць на чалавека няшчасці.

КАДУК — нячысцік, які з'ядае немаўлят. Даравноўваецца да чорта.

КАРАЧУН — дух хваробы, зла, смерці.

КАШЧЭЙ — злы вядун-варажбіт.

КІКІМАРЫ — істоты жаночага роду, якія жывуць на сядзібах.

КЛАДНІК (кладавік) — дух, які валодае скарбамі.

КЛЕТНІК — дух, звязаны з паветранай і вогненнай стыхіямі.

КУПАЛЬСКІ ДЗЯДОК — добры дух, які збірае кветкі. Калі пры сустрэчы з ім разасланць абрус, то ён кіне на яго чароўную кветку.

ЛАЗЬНІК — злы гаспадар лазні, карае тых , хто мыецца пасля поўначы.

ЛЕСАВІК (лясун, дабрахожы, лешы) — дух лесу.

ЛІХАМАНКА (трасца, хіндзя, шуня, ірадава дочка) — дэманалагічная постаць хваробы (воспы, халеры, чумы).

ЛОЙМА (чарціха) — злы дух у жаночым абліччы, жыве ў балотах.

ЛЮЦЫПАР — самы старшы, галоўны нячысцік.

МАРА (марня) — міфічная істота ў вобразе жанчыны, якая можа набываць аблічча розных жывёл.

МАРОЗ (Дзед Мароз, Ледзяны Дзед) — міфічная істота, якая ўвасабляла зімовы холад. Уяўляўся ў выглядзе старога з сінім ці чырвоным носам і доўгай барадой.

НАЎІ (наўцы) — душы памерлых у апошні год.

НАЧНІЦА — міфічная істота, ў якую ператвараецца пасля смерці жанчына, якая не мела дзяцей.

ПАДПЕЧНІК (дамавік, падпечка) — дух, які жыве пад печчу. Мае выгляд касматай пачварнай жывёлы з чырвонай галавой і вогненнымі бліскучымі вачыма.

ПАЛЯВІК (палявы) — міфічны апякун палёў і лугоў.

ПУННІК — нячысцік, які жыве ў пуні. Уяўляецца чалавекападобнай істотай, пакрыты павуціннем і смеццем ад сена.

ПЯКЕЛЬНІКІ — нячысцікі, якія ў пекле падтрымліваюць агонь.

РАСАМАХА — дух жанчыны, якая забіла сваё дзіця. Уяўлялі голай жанчынай з распушчанымі валасамі, якая трымае на руках дзіця.

РУСАЛКА (азярніца, вадзяніца, ядзерка, каўка, лескатуха) — душа тапельніцы-дзяўчыны. Уяўляецца дзяўчынай з доўгімі распушчанымі валасамі, у белай празрыстай сукенцы, на галаве з вяночкам з белых кветак.

СОПУХА — дух хатняга агменю.

СТРЫГА — злая чараўніца, якая турбуе цяжарных і падмяняе маткам дзяцей.

ХАЛЕРА — халодная прыгажуня, якая махае з-за могілак на вёску чырвонай ці чорнай хусткай.

ХАТНІК (дамавы, гаспадар) — дух хаты. Звязваецца з уўленнем аб апродках і дабрабыце.

ХЛЕЎНІК — сядзібны дух, які жыве ў хляве, назірае за скацінай.

ЦЯРЭШКА — міфічны персанаж, які займаецца падборам шлюбных пар.

ЧОРТ (шатан) — ліхі дух антрапаморфнага аблічча, які супрацьстаіць Богу.

ЧУМА — постаць хваробы ў выглядзе чорнай жанчыны, якая валодае вогненнымі стрэламі.

ЯШЧАР — міфічная істота, адпаведнік змея — антыпода Перуна.

# СЛОЎНІК

**АБВОРВАННЕ** — правядзенне вакол вёскі магічнай баразны, якая, паводле павер'яў, супыняла пашырэнне розных эпідэмій і няшчасцяў.

**АБРАД** (рытуал) — сукупнасць дзеянняў, замацаваных традыцыямі, якія сфарміраваліся на аснове ўзаемаадносін чалавека з прыродай, і з якімі атаясамліваюцца магічныя ўласцівасці. Вылучаюць абрады: земляробчыя (каляндарныя), сямейна-побытавыя, рэлігійныя.

**АБРАЗ** (ікона) — у хрысціянстве жывапісная або рэльефная выява боставў, святых як прадмет рэлігійнага пакланення.

**АБРАКАННЕ** — ахвяраванне культавым мясцінам самаробных рэчаў, у тым ліку прынашэнне ручнікоў, хустак, стужак.

**АБЫДЗЁННІК** — рытуальны ручнік, выраблены ў пэўнай крызіснай сітуацыі (пры эпідэміі, падчас засухі і інш.) за адзін дзень або адну ноч.

**АБЯРЭГ** — прадмет, выява, дзеянне, якім прыпісвалі магічную здольнасць засцерагаць ад няшчасцяў і злых духаў.

**АМБРОЗІЯ** (ад грэчаскага ἀμβροσία бессмяротнасць) — у міфалогіі старажытных грэкаў ежа багоў, якая падтрымлівала вечную маладосць і прыгажосць.

**АМУЛЕТ** (абярэг, талісман) (ад лацінскага *amuletum* той, які дае сілу) — невялікая рэч, якую людзі насілі на целе і якой прыпісвалі магічныя ўласцівасці засцерагаць ад злых духаў, няшчасцяў, хваробы, прыносіць поспех.

**АНІМІЗМ** (ад лацінскага *anima* душа) — вера ў існаванне антрапаморфных, зааморфных, аморфных душ, духаў і магчымасць кантакту з імі.

**АНТАГАНІСТ** (ад грэчаскага *ανταγωνισης* супернік) — той, хто дзейнічае супрацьлеглым чынам.

**АНТРАПАМАРФІЗМ** (ад грэчаскага *anthropos* чалавек + *morphe* форма) – надзяленне чалавечымі якасцямі прадметаў і з'яў нежывой прыроды, нябесных цел, жывёл, міфічных істот.

**АПАТРАПЕЙ** (ад грэчаскага *apotropaios* — адхіленне ліха) — магічны прадмет, якому ў старажытныя часы прыпісвалі якасці абярэга для людзей, жывёл, жытла ад небяспечных сіл.

**АРНАМЕНТ** (лацінскае *ornamentum* упрыгажэнне) — узор, утвораны рытмічным паўтарэннем аднаго і таго ж, або чаргаваннем пэўных

элементаў. Меў магічна-ахоўную, этнавызначальную, сацыяльную і эстэтычную функцыі.

**АРХАІКА** (ад грэчаскага *archaikos* стары, устарэлы) — ранні этап у гістарычным развіцці якой-небудзь з'явы.

**АСІЛКІ** — міфічныя істоты незвычайнай сілы і антрапаморфнага аблічча. Паводле паданняў, у асноўным жыхары гарадзішчаў.

**АХВЯРАПРЫНАШЭННЕ** — старажытны абрад прынясення дароў бостам, святым, разнастайным духам з мэтай іх улагоджвання, спрыяння ў асабістых справах.

**БАГАТЫР** (багатырка) — персанаж беларускіх паданняў і казак. У агульным значэнні — магутны чалавек.

**БАЙ** (Буй, Бой) — князь, міфічны першанасельнік Беларусі, родапачынальнік беларускага этнасу.

**БАЛТЫ** — тэрмін быў уведзены ў навуковую літаратуру ў 1845 годзе для пазначэння групы індаеўрапейскіх плямён (народаў), якія гавораць (або гаварыли раней) на балтыйскіх мовах і дыялектах. Фарміраванне балтаў адбывалася у эпоху неаліту. Арэал іх рассялення ахопліваў басейны Віслы, Нёмана, Заходняй Дзвіны, вярхоўяў Дняпра, Волгі і Акі. На тэрыторыі Беларусі з сярэдзіны 1-га тысячагоддзя нашай эры і да XIV стагоддзя адбывалася славянізацыя балтаў.

**БЕЛАПОЛЬ** — сын князя Бая.

**БЕЛЫ КОЛЕР** — колер, які мае асацыяцыю з жыццёвай сілай.

**БІБЛІЯ** (ад грэчаскага *biblia* кнігі) — збор старажытных тэкстаў, кананізаваны ў іудаізме і хрысціянстве ў якасці Свяшчэннага Пісання.

**БІНАРНАЯ АПАЗІЦЫЯ** — універсальны сродак рацыянальнага апісання свету, дзе адначасова разглядаюцца два супрацьлеглыя ўяўленні, адно з якіх сцверджвае пэўную якасць, а другое — адмаўляе.

**БРАТЧЫНА** — від застолля нашых продкаў, якое адбывалася ў складчыну ў вызначаны час, і дзе маглі вырашацца ўнутраныя пытанні вясковай або гарадской грамады.

**ВАДОХРЫШЧА** — зімовае свята народнага календара, дзень завяршэння Калядаў.

**ВАЙДЭЛОТЫ** (вайдэлоткі) — святары (святаркі) — прадказальнікі, якія ахоўвалі агонь «знiч».

**ВАЛАЧОБНІЦТВА** — старажытны беларускі абрад, што выконваўся падчас Вялікадня і які захаваў архаічна-міфалагічныя ўяўленні земляробчага характару. Назва паходзіць ад тэрміна «валачоба», што азначае «баранаванне». Удзельнікі абрада — валачобнікі — абыходзілі двары, спявалі песні і зычылі гаспадарам шчасця і багацця.

**ВАРАЖБА** — абрады і рытуалы, якія праводзіліся дзеля таго, каб прадказаць будучыню або неабходныя паводзіны чалавека з дапамогаю надпрыродных сіл.

**ВАЎКАЛАК** (ваўкалака) — чалавек, ператвораны ў ваўка.

**ВЕШЧУНЫ** (валхвы)– язычніцкія святары ў часы старажытнай Русі.

**ВОЛАТ** — персанаж вялікай сілы ў беларускай міфалогіі, першанасельнік беларускай прасторы.

**ВУПЫР** — нябожчык, які чыніць усялякую шкоду людзям і свойскай жывёле.

**ВЫРАЙ** (ад балта-славянскага *ur* мора) — у міфалогіі беларусаў старажытная назва раю і райскага Сусветнага дрэва, у вяршынях якога жывуць птушкі і душы памерлых.

**ВЯЛІКДЗЕНЬ** (Вяліканне, Вялічка, Вялікодня) — рухомае вясенняе свята ў гонар сонца, вады, надыходу земляробчага сезону. Залежыць ад луннага календара.

**ГАРАДЗІШЧА** (Гарадок, Гарадзец) — узгорак, на якім у старажытнасці існавала ўмацаванае паселішча, часта з адным або некалькімі насыпнымі валамі.

**ГОРАД** — у старажытнасці населенае месца, абгароджанае і ўмацаванае сцяной; у міфалагічнай свядомасці беларусаў суадносіцца з цэнтрам Сусвету.

**ДАБРАВЕШЧАННЕ** — у народным календары свята прылёту птушак.

**ДВУДУШНІКІ** — людзі, народжаныя з дзвюма душамі: чалавечай і дэманічнай.

**ДЗЯДЫ** — беларускі народны памінальны абрад, рытуальная вячэра ў памяць пра памерлых родзічаў.

**ДРЭВА ЖЫЦЦЯ** — міфапаэтычны вобраз, звязаны з канцэпцыяй жыцця: нараджэнне — развіццё — смерць.

**ДУША** — міфалагічнае ўяўленне пра жыццёвы пачатак чалавека. Атаясамліваецца з дыханнем.

**ДЭМАН** (стражытнагрэчаскае *daimon* боства) — у міфах зборнае вызначэнне надпрыродных стварэнняў, напаўбостваў або духаў, якія займаюць памежны стан сярод людзей і багоў.

**ДЭМАНІЧНАЕ** — незвычайнае, каварнае, злоснае, характэрнае дэману.

**ДЭМІУРГ** (ад грэчаскага *demiurgos* майстар, стваральнік) — міфалагічны персанаж, надзелены функцыямі стварэння касмічных аб'ектаў, прыроды.

**ЗАМОВЫ** — твор формульнага і рытмічнага характару, якому надавалася сіла магічнага ўздзеяння для дасягнення практычных мэтаў.

**ЗОАМАРФІЗМ** (ад грэчаскага *zoon* животное + *morphe* форма) — наданне людзям якасцяў жывёл. Вельмі часта выкарыстоўваецца для азначэння багоў у вобразах жывёл, а сакральных жывёл — як увасабленне сутнасці багоў.

**ЗНАХАР** (знахарка) — чалавек, надзелены звышнатуральнымі (магічнымі) здольнасцямі.

**ІДАЛЫ** (балваны, ёлупы, каменныя бабы, куміры, стоды) — каменныя, драўляныя або металічныя скульптурныя выявы язычніцкіх багоў. Кожны ідал увасабляў пэўнага бога.

**ІНДАЕЎРАПЕЙЦЫ** — народы-носьбіты індаеўрапейскіх моў (самай распаўсюджанай у свеце моўнай сям'і — звыш 2,5 млрд). Да індаеўрапейцаў адносіцца большая частка сучасных людзей. Роднасныя ім з'яўляюцца шматлікія старажытныя і сучасныя народы: армяне, балты, германцы, грэкі, дарды, ілірыйцы, індыйцы, іранцы, італікі, кельты, нурыстанцы, славяне, тахарцы, фракійцы, фрыгійцы, хеты.

**ІЛЬІН ДЗЕНЬ** — свята ў гонар бога Перуна.

**ІНЦЭСТ** (ад лацінскага *incestus* злачынны, грахоўны) — кровазмяшальны шлюб, інтымная сувязь найбліжэйшых сваякоў. У старажытнай міфалогіі часта сустракаецца як аснова сюжэтаў, звычайны лад жыцця багоў.

**ІНШАСВЕТ** (тагасвет, той свет) — свет памерлых, які звязаны з левым бокам і які месціцца на захадзе або поўначы — там, дзе сонца заходзіць ці дзе яго не бывае.

**КАЛЯДЫ** — народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання. Звязана з перыядам зімовага сонцастаяння і з першым павелічэннем самага кароткага дня ў годзе.

**КАЛЯНДАР** (ад лацінскага *calendarium*) — сістэма падліку працяглых прамежкаў часу, заснаваная на перыядычнасці бачных рухаў нябесных свяціл.

**КАМЕННЫЯ МАГІЛЫ** — сярэднявечныя магілы, якія маюць каменныя кладкі на паверхні. Сустракаюцца ў Панямонні, зрэдку на Віцебшчыне, у суседніх з Беларуссю раёнах Польшчы і Літвы. У народзе вядомы як *Паганскія Магілы*, *Старасвецкія Магілы*, *Яцвяжскія Магілы*, *Баярскае Кладбішча*, *Галодны Могільнік* і інш.

**КАМЕНЬ** — элемент прыроды, здольны расці, паводле народных уяўленняў. У замовах выступае як сімвалічны цэнтр сусвету, выкарыстоўваецца ў магічнай практыцы.

**КАПІШЧА** — тое, што і *свяцілішча*.

**КАРАВАЙ** — адзін з атрыбутаў беларускага вяселля, дэталёва распрацаваны абрад (выпяканне, перанос у клець, міжродавы падзел хлеба).

**КАРАГОД** — масавы фігурны магічны танец, які абараняў людзей і аб'екты ад злых сіл. Уяўляў сабой ланцуг узаемазвязаных удзельнікаў, якія рухаліся па коле або змеепадобна. З'яўляўся часткай гулянняў у каляндарныя святы на сакральных месцах.

**КАСМАГОНІЯ** (ад грэчаскага *κόσμος* свет, Сусвет + *γονή* нараджэнне) — веды пра ўзнікненне і развіццё Сусвету, яго частак.

**КАСМАЛОГІЯ** (ад грэчаскага *hosmos* свет, Сусвет + *logos* навука) — веды пра пабудову Сусвету як адзінага цэлага.

**КАШЧЭЙ** (Кашч) — вядун, варажбіт.

**КІКІМАРЫ** (вешчыцы) — юныя міфічныя істоты, якія паходзяць ад дзяўчат, загубленых да хрышчэння, або ад дачок, праклятых маткаю яшчэ ў чэраве.

**КІРМАШ** (польскае *kiermasz* ад нямецкага *Kirchmesse*; кермаш, фэст, ярмонка, ярмалка, зборніца, адправа, чупрыннік) — гандаль і гулянне на пэўным сакральным месцы ў пэўнае каляндарнае свята. Яму ўласцівы шматлікія павер'і і магічныя прадпісанні.

**КОСМАС** (ад грэчаскага *κόσμος* свет, Сусвет) — паняцце, якое аб'ядноўвае ўяўленні пра неба, зямлю і жыццё на ёй.

**КРЫВЕ-КРЫВЕЙТЭ** — найвышэйшы язычніцкі святар — спачатку прусаў, а потым усіх літоўскіх плямёнаў.

**КРЫЖ** — адзін з самых старажытных і важнейшых універсальных сімвалаў у міфалогіі, мастацтве і геральдыцы. Вядомы амаль ва ўсім свеце. Адлюстроўвае арыенціроўку ў прасторы, кропку перасячэння верху-нізу і правага-левага.

**КУЛЬТ** — форма і сродак пакланення і ўшанавання стыхійных прыродных сіл, сукупнасць знешніх праяўленняў рэлігійных вераванняў.

**КУПАЛЛЕ** (Купала, Ян, Іван) — старажытная абрадавая ўрачыстасць, прымеркаваная да летняга сонцастаяння (22–23 чэрвеня). Свята персаніфікавана ў вобразе міфічнай істоты Купалы. Пад рознымі назвамі вядома ў многіх народаў.

**КУРГАН** — насып з зямлі (месцамі і з камянёў) над магілай. Звычай хаваць нябожчыка такім чынам з'явіўся ў IV—III тысячагоддзях да н.э. Асноўная маса курганных могільнікаў на тэрыторыі Беларусі датуецца канцом I — пачаткам II тысячагоддзя. Ёсць курганы часоў позняга Сярэднявечча. У народзе распаўсюджаны назвы *Валатоўкі*, *Капцы*, *Французскія Магілы*, *Шведскія Магілы* і інш.

**ЛЕГЕНДА** (ад лацінскага *legenda* чытанне) — від казачнага празаічнага фальклору. Пісьмовае паданне пра пэўныя гістарычныя падзеі або асобы.

**ЛЮБІСТА** (любізнік) (*Levisticum officinale*) — шматгадовая травяністая расліна сямейства парасонавых, якая выкарыстоўвалася ў любоўнай магіі.

**МАГІЯ** (ад грэчаскага mageia — чараўніцтва, вядзьмарства) — сукупнасць абрадаў і рытуальных дзеянняў, звязаных з верай у звышнатуральную здольнасць чалавека ўздзейнічаць на людзей і з'явы прыроды. Узнікла ў першабытным грамадстве.

**МАГІЧНАЕ КОЛА** — магічнае рытуальнае дзеянне, якое складалася з правядзення вакол паселішча або сялібы баразны (абворванне) з мэтай адагнаць адтуль усё нядобрае; абыход або аб'езд пэўных рэчаў; вакол статка, каб уберагчы яго ад драпежнікаў; абнясенне полымя абразом, каб унікнуць пажару; каб спыніць пошасць ткалі ручнік-абыдзённік і абносілі вакол вёскі і г.д.

**МАКРАКОСМ** (ад грэчаскага *μακρος* вялікі + *κοσμος* свет) — знешні свет, уся прырода, Сусвет у супрацьпастаўленні да чалавека.

**МАТРЫЯРХАТ** (ад грэчаскага μήτηρ, μάτηρ маці + ἀρχή пачатак, улада) — эпоха ў развіцці першабытнаабшчыннага ладу, дзе дамінуючае становішча займалі жанчыны.

**МІКОЛА** — старажытнае свята народнага календара ў гонар заступніка земляробства.

**МІКРАКОСМ** (ад грэчаскага μικρός, малы + κόσμος свет) — чалавек як Сусвет у мініяцюры.

**МІФ** (ад грэчаскага *mythos* паданне) — сістэма архаічных уяўленняў пра свет.

**МІФАЛОГІЯ** (ад грэчаскага *μυθοζ* слова, паданне + *λογοζ* паняцце, навука) — сукупнасць міфаў, у якіх адлюстраваны ўяўленні пра паходжанне сусвету, з'яў прыроды, багоў і герояў.

**МІФЫ** (легенды) **АНТРАПАГАНІЧНЫЯ** — міфы пра паходжанне чалавека, першых людзей або першапродкаў.

**МІФЫ БЛІЗНЯЧЫЯ** — міфы, дзе галоўнымі дзеючымі асобамі з'яўляюцца блізняты, якія вельмі часта выконваюць ролю родапачынальнікаў або культурных герояў. Распаўсюджаны ў шматлікіх народаў свету.

**МІФЫ КАЛЯНДАРНЫЯ** — міфы, звязаныя з цыклам каляндарных абрадаў і аграрнай магіяй, арыентаванай на рэгулярную змену пор года, адраджэнне вясновай раслІннасці, забеспячэнне ўраджаю.

**МІФЫ МЕСЯЧНЫЯ І САЛЯРНЫЯ** — архаічныя міфы пра Месяц і Сонца, дзе яны выступаюць як блізнечная пара культурных герояў або брат і сястра, муж і жонка.

**МІФЫ** (легенды) **ЭТНАГАНІЧНЫЯ** — міфы пра з'яўленне родаў, плямёнаў, народаў і іх характэрныя адметнасці.

**МІФЫ** (легенды) **ЭТЫЯЛАГІЧНЫЯ** — міфы, якія тлумачаць з'яўленне розных прыродных і культурных аб'ектаў.

**НАРОДНАЯ ВЕРА** (народная рэлігія, двухвер'е) — культурная з'ява, рэлігійная сістэма, дзе язычніцкія вераванні і абрады захоўваюцца пад вонкавым слоем хрысціянства.

**НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА** — частка традыцыйнай культуры, дзе эмпірычныя веды пераплятаюцца з рэлігійна-магічнымі дзеяннямі і абрадамі.

**НЕАФІТ** (ад грэчаскага νεόφυτος нядаўна навернуты) — новы прыхільнік якой-небудзь рэлігіі.

**НЯБОЖЧЫК** — памерлы чалавек, увасабленне смерці. Паводле павер'яў, мог ператварацца ў жывёл і птушак, насякомых, дрэвы, выходзіць з магілы.

**ПАВЕР'І** (прымхі, забабоны) — народныя ўяўленні, заснаваныя на веры ў існаванне містычных сувязей паміж з'явамі навакольнага свету і лёсам чалавека.

**ПАДАННЕ** — вусны расказ пра гістарычных асоб, падзеі, якія перадаецца ад пакалення да пакалення.

**ПАКРОЎ** — па народным календары дзень завяршэння збору ўраджаю, заміранне прыроды.

**ПАСТУХ** (пастыр) — у міфапаэтычнай традыцыі ахоўнік, абаронец, патрыярх і інш.

**ПАТРЫЯРХАТ** (ад грэчаскага πατήρ бацька + ἄρχω уладарыць) — грамадства, у якім мужчыны з'яўляюцца «дамінантным элементам» у сямейным, гаспадарчым і грамадскім жыцці.

**ПЕРУНОВЫ СТРЭЛЫ** (грамавыя стрэлы) — старажытныя каменныя сякеры. Звязваюцца з культам Перуна. Былі сімвалам ахоўнай магіі, здароўя, плоднасці.

**ПОЛІТЭІЗМ** (ад грэчаскага *poly* многа + *theos* бог) — шматбожжа, вера ў некалькіх або многіх багоў.

**ПЯРЭВАРАЦЕНЬ** — чалавек, які, паводле народных уяўленняў, здольны ператварацца ў адушаўлёныя і неадушаўлёныя прадметы і зноў вяртаць свой ранейшы чалавечы выгляд.

**РЫТУАЛ** (ад лацінскага *ritualis* абрадавы) — сукупнасць абрадаў пэўнай рэлігіі ці культу, урачыстая цырымонія, від абрадавых дзеянняў.

**РЭГУЛЫ** (ад лацінскага *regula* — норма, правіла) — тое, што і менструацыя.

**РЭЛІГІЯ** (лацінскае *religio*) — светапогляд і светаадчуванне, спецыфічныя дзеянні, заснаваныя на веры ў існаванне Бога або багоў.

**САКРАЛЬНЫ** (ад лацінскага *sacrum* свяшчэнны) — той, што мае дачыненне да нечага боскага, надзвычайнага, містычнага, атаясамліваецца са святасцю; якасць, характэрная для паклонных аб'ектаў; адно з цэнтральных паняццяў архаічнай карціны свету.

**САЛЯРНАЯ СІМВОЛІКА** — сістэма знакаў, звязаных з пакланеннем сонцу (канцэнтрычныя колы, крыжападобныя фігуры, свастыка, шасціпялёсткавая разетка, кальцо з кропкай пасярэдзіне і інш.).

**СВАСТЫКА** — старажытны знак агню, сонца, сонечнай птушкі, роўнабаковы крыж з загнутымі Г-падобнымі канцамі «па сонцы» і «супраць сонца». Выяўлена ў археалагічных знаходках з часоў ранняга жалезнага веку да позняга Сярэднявечча.

**СВЕЧКА** (васковая свечка) — магічны сродак абароны ад нячыстай сілы, які выкарыстоўваўся ў розных абрадах яшчэ да прыняцця хрысціянства.

**СВЯЦІЛІШЧА** (капішча) — абазначэнне культавага месца, на якім былі ўстаноўлены ідалы (звычайна драўляныя ці каменныя, часам металічныя).

**СЁМУХА** — пяцідзесяты дзень пасля Вялікадня, старажытнае свята завяршэння палявых работ. Мае сувязь з культам продкаў.

**СІМВАЛ** (ад грэчаскага *symbolon*) — умоўны рэчавы апазнавальны знак для членаў пэўнай грамадскай групы.

**СІНІ КОЛЕР** — колер, які абагульнена прадстаўляе шэраг колераў цёмных таноў. Атрыбут хтанічнага і дэманічнага свету, прыкмета падземнага агню, скарбаў.

**СКАМАРОХІ** — народныя вандроўныя акцёры, рэпертуар якіх звязаны з фальклорам і традыцыйнымі абрадавымі дзеяннямі.

**СЛАВЯНЕ** — агульная назва групы народаў, якія цяпер жывуць на тэрыторыі шэрагу краін Усходняй Еўропы, ў тым ліку назва беларусаў, украінцаў, рускіх, палякаў.

Час з'яўлення славян дакладна невядомы. Некаторыя аўтары пішуць, што так званыя «склавіны» з візантыйскіх крыніц VI ст. — першыя славяне. Іншыя аспрэчваюць гэтую тэзу. Адна група навукоўцаў лічыць старажытных славян пра-этнасам, асобныя групы якога з цягам часу пасоўваліся (рассяляліся) ў розных геаграфічных кірунках. Але месца першапачатковага знаходжання пра-этнасу застаецца тэмай дыскусій. Другая група ставіцца да старажытных славян як да плямен (народаў) рознага этнічнага паходжання, якія жылі побач адзін другога і паступова

перайшлі на агульнае «койне» — славянскую мову (пра-мову). У кожным выпадку славянізацыя продкаў беларусаў адбывалася на працягу не менш чым васьмі стагоддзяў (VI—XIV) ў напрамку з паўднёвага захаду на паўночны ўсход.

**СЛЕДАВІК** (камень-следавік) — валун, на паверхні якога ёсць адбітак (прыродны ці штучны) у выглядзе слядоў чалавека (ступні ці далоні) або жывёлы.

**СМЕХ** — абавязковы элемент многіх паганскіх абрадаў, якому прыпісваецца магчымасць суправаджаць жыццё або выклікаць яго.

**СОМА** (санскрыцкае *soma*) — важны рытуальны напой у старажытных індаіранцаў, у больш позніх ведыйскіх культурах персаніфікуецца як боства.

**СТАРАЦ** (жабрак, падарожны чалавек, божы чалавек) — у светаўспрыманні беларусаў вястун іншасвету, надзелены мудрасцю і магічнымі здольнасцямі.

**СУСВЕТ** — увесь свет, створаны багамі з хаосу або сушы з акеану, бясконцы ў часе і прасторы, разнастайны па формах.

**СУСВЕТНАЕ ДРЭВА** — сімвал светабудовы, сусветная вось.

**ТАТЭМІЗМ** (ад англійскага *totem,* ад індзейскага *ататэм* яго род) — сістэма рытуалаў і табу, звязаная з верай у роднасць з пэўным відам жывёл, раслін, з'яў прыроды.

**ТРАДЫЦЫЯ** — сукупнасць звычаяў, абрадаў, норм паводзін, поглядаў, правіл, якія складаюцца гістарычна і перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

**ФАЛІЧНЫ КУЛЬТ** — пакланенне сілам плоднасці. Фарміраванне яго ідзе ад пачатковых працэсаў асэнсавання і ўсведамлення прыроды, чалавека.

**ФАЛЬКЛОР** (ад англійскага *folklore* народная мудрасць) — назва вуснай народнай творчасці. Уяўляе сабой мастацкую калектыўную дзейнасць народа.

**ФЕТЫШЫЗМ** (ад французскага *fétiche* талісман) — вера ў звышнатуральныя якасці прадметаў прыроднага і культурнага паходжання.

**ХАОС** (грэчаскае *chaos*) — першасны стан Сусвету, бясформенная сумесь матэрыі і прасторы ў супрацьлегласць парадку.

**ХТАНІЧНЫ** (ад грэчаскага chthon — зямля, глеба) — той, які належыць да падземнага свету (свету памерлых).

**ЧАРАЎНІК** (чарадзей, чараўніца, ведзьма) — чалавек, надзелены звышнатуральнымі (магічнымі) здольнасцямі і які нібыта мог уплываць на прыродныя з'явы.

**ЧОРНЫ КОЛЕР** — колер, шырока прадстаўлены ў магічных рытуалах, звязаных са смерцю. Сінонім нячыстага. Выкарыстоўваўся для абароны ад сіл іншасвету.

**ЧУЖЫНЕЦ** (іншаземец) — у народнай культуры суадносіцца з іншасветам.

**ЧЫРВОНЫ КОЛЕР** — колер, які сімвалізуе жыццё, здароўе, прыгажосць, багацце.

**ШАМАНСТВА** (шаманізм) — ранняя форма рэлігіі, магічная практыка зносін служыцеля культу з духамі падчас рытуалу, які прыводзіць чалавека ў стан экстазу. Вядома ў культуры ўсіх народаў. Дзеянні шаманаў звычайна суправаджаюцца спевамі і ўдарамі ў бубны.

**ЮР'Я** (Ягор'е) — старажытнае свята народнага календара ў гонар заступніка жывёлы.

**ЯЗЫЧНІЦТВА** (паганства) — агульны тэрмін для абазначэння старажытных вераванняў і культаў, якія існавалі да ўзнікнення монатэістычных рэлігій.

# ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ПАГЛЫБЛЕНАГА ВЫВУЧЭННЯ ТЭМЫ ЯЗЫЧНІЦТВА

(складальнік А.Я. Тарас. У спісе паказаныя толькі кнігі)


***На беларускай мове***

Бараг Л., Саламевіч І. **Сюжэты і матывы беларускіх народных казак: Сістэматычны паказальнік.** Мінск: «Навука і тэхніка», 1978. — 248 с.

Барташэвіч Г. **Магічнае слова: Вопыт даследавання светапогляднай і мастацкай асновы замоў**. Мінск: «Навука і тэхніка», 1990. — 128 с.

**Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік.** /Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш./ Мінск: «Навука і тэхніка», 2004. — 592 с.

**Беларускі фальклор: Энцыклапедыя.** Мінск: «Беларуская энцыклапедыя», 2006. Том 1 (765 с.), том 2 (828 с.).

**Беларускія народныя прыкметы і павер'і** / Уклад. У. Васілевіч/. Мінск. **Кніга 1. Зямля стаіць пасярод свету...** (1996); **Кніга 2. Жыцця адвечны лад; Кніга 3. Зямная дарога ў вырай** (2010).

Валодзіна Т. **Цела чалавека: Слова, міф, рытуал.** Мінск: «Тэхналогія», 2009. — 432 с.

Дудзюк З. **Вяртанне забытага міфа.** Мінск: «Беларусь», 2013. — 144 с.

Дучыц Л., Клімковіч І. **Сакральная геаграфія Беларусі.** Мінск: «Літаратура і мастацтва», 2011. — 384 с.

**Замовы.** /Уклад. У. Васілевіч, Л. Салавей/. Мінск: «Беларусь», 2009. — 520 с.

**Земляробчы каляндар: абрады і звычаі.** /Уклад. А. Гурскі, А. Ліс/. Мінск: «Навука і тэхніка», 1990. — 404 с.

Кавалёва Р. **Абрысы рытуальна-магічнай сферы беларускага фальклору (Зб. артыкулаў).** Мінск: «Бестпрынт», 2005. — 184 с.

Казакова І. **Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў.** Мінск: «Народная асвета». 1995. — 128 с.

Казакова І. **Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры.** Мінск: ВКП «БОФФ». 1997. — 120 с.

Карабанаў А., Вінакураў В., Дучыц Л., Зайкоўскі Э., Клімковіч І.

**Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі.** Мінск: «Беларуская навука», 2011. — 236 с.

Клімковіч І. **Калі адчыняюцца нябёсы (Міфалагічныя замалёўкі).** Мінск: «Мастацкая літаратура», 2012. — 110 с.

Коваль У. **Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы (Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі).** Гомель: /выдавецтва не паказана/, 1995. — 180 с.

Крук Я. **Сімволіка беларускай народнай культуры.** /2-е выд./ Мінск: «Беларусь», 2003. — 350 с.

Кухаронак Т. **Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў.** Мінск: «Ураджай», 2001. — 240 с.

Кухаронак Т. **Радзінныя звычаі і абрады беларусаў (Канец XIX–XX ст.).** Мінск: «Навука і тэхніка», 1993. — 124 с.

Лабачэўская В. **Повязь часоў — беларускі рушнік.** Мінск: «Беларусь», 2002. — 232 с.

**Легенды і паданні.** /Склад. М. Грынблат, А. Гурскі/. Мінск: «Навука і тэхніка», 1983. — 544 с.

Лобач У. **Міф. Прастора. Чалавек: Традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве.** Мінск: «Тэхналогія», 2013. — 504 с.

Ляўкоў Э. **Маўклівыя сведкі мінуўшчыны.** Мінск: «Навука і тэхніка», 1992. — 214 с.

**Міфалогія беларусаў: Энцыклапедычны слоўнік.** /Складальнікі І. Клімковіч, В. Аўтушка/ Мінск: «Беларусь», 2011. — 608 с.

**Народная медыцына: Рытуальна-магічная практыка.** /Уклад. Т. Валодзіна/ Мінск: «Беларуская навука», 2007. — 776 с.

Ненадавец А. **Каму пакланяліся продкі.** Мінск: «Навука і тэхніка», 1996. — 240 с.

Ненадавец А. **За смугою міфа.** Мінск: «Беларуская навука», 1999. — 254 с.

Нікольскі Н. **Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераннях беларускага сялянства.** Мінск, 1933. — 136 с. // АН БССР. Інстытут гісторыі імя М.Н. Пакроўскага. Працы секцыі этнаграфіі. Выпуск 3.

Новак В. **Міфалогія беларусаў (Вучэбны дапаможнік для студэнтаў).** Гомель: ГДУ, 2005. — 252 с.

Новак В. **Беларуская міфалогія: Хрэстаматыя.** Мінск: РІВШ, 2013. — 394 с.

**Паэзія беларускага земляробчага календара.** /Складальнік А. Ліс/. Мінск: «Ураджай», 1992. — 614 с.

Раманюк М. **Беларускія народныя крыжы.** Вільня: выд. Д. Раманюк, «Наша Ніва», 2000. — 224 с.

Сержпутоўскі А. **Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў.** Мінск: «Універсітэцкае», 1998. — 302 с.

Сівіцкі У. **Русальная традыцыя беларусаў: міфапаэтычная сістэма, тыпалагічныя паралелі.** Мінск: «Тэхналогія», 2006. — 188 с.

Сысоў У. **З крыніц спрадвечных.** Мінск: «Вышэйшая школа», 1997. — 416 с.

Сысоў У. **Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння.** Мінск: «Навука і тэхніка», 1995. — 182 с.

Фадзеева В. **Беларуская народная вышыўка.** Мінск: «Навука і тэхніка», 1991. — 200 с.

Шамак А. **Міфалогія беларусаў.** Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2013. — 256 с.

Швед І. **Космас і чалавек у дэндралагічным кодзе беларускага фальклора.** Брэст: ББДУ імя А.С. Пушкіна, 2006. — 130 с.

Шумскі К. **Традыцыйныя веды беларусаў аб раслінным, жывёльным свеце і надвор'і (XIX — пачатак XXI ст.) і іх экалагічная значнасць.** Мінск, 2009. — 126 с.

### *На русском языке*

Богданович А.Е. **Пережитки древнего миросозерцания у белорусов (Этнографический очерк).** М.: «Слава», «Форт-Профи», 2009. — 160 с. /репринт книги 1895 г./

Васильев М.А. **Язычество восточных славян накануне крещения Руси: Религиозно-мифологическое взаимодействие с иранским миром. Языческая реформа князя Владимира.** М.: «Индрик», 1999. — 328 с.

Велецкая Н. **Языческая символика славянских архаических ритуалов.** М.: «Наука», 1978. — 240 с.

Волошина Т.А., Астапов С.Н. **Языческая мифология славян.** Ростов-на-Дону: «Феникс», 1996. — 444 с.

Гальковский Н.М. **Борьба христианства с остатками язычества в Древней Руси.** Москва, 2000. Том 1 (376 с.). Том 2 (318 с.). / Факсимильное переиздание с оригинала: Москва — Харьков, 1913 — 1916 гг.

Гура А.В. **Символика животных в славянской народной традиции.** М.: «Индрик», 1997. — 912 с.

Гура А.В. **Брак и свадьба в славянской народной культуре: семантика и символика.** М.: «Индрик», 2012. — 936 с.

Журавлев А.Ф. **Домашний скот в поверьях и магии восточных славян (Этнографические и этнолингвистические очерки).** М.: «Индрик», 1994. — 256 с.

Завьялова М.В. **Балто-славянский заговорный текст: лингвистический анализ и модель мира.** М.: «Наука», 2006. — 564 с.

Левин И. **Двоеверие и народная религия в истории России.** М.: «Индрик», 2004. — 216 с.

Левкиевская Е.Е. **Славянский оберег: Семантика и структура.** М.: «Индрик», 2002. — 336 с.

Ловмянский X. **Религия славян и ее упадок (VI–XII вв.).** /Пер. с польск./ СПб.: «Академический проект», 2003. — 512 с.

Мандзяк А.С. **Боевая магия славян.** Минск: «Харвест», 2007. — 544 с.

Мансикка В.Й. **Религия восточных славян.** М.: ИМЛИ им. А.М. Горького РАН, 2005. — 368 с.

Можейко З.Я. **Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования.** Минск: «Наука и техника», 1985. — 248 с.

Никольский Н.М. **Происхождение и история белорусской свадебной обрядности.** Минск: АН БССР, 1956. — 276 с.

Рогалев А.Ф. **Скрытый смысл географических названий, легенд и преданий (на материале Беларуси).** Гомель: «Барк», 2012. — 208 с.

Русанова И. П. **Истоки славянского язычества. Культовые сооружения Центральной и Восточной Европы в I тыс. до н.э. — I тыс. н.э.** Черновцы: «Прут», 2002. — 172 с.

Русанова И.П., Тимощук Б.А. **Языческие святилища древних славян.** /2-е изд., исправ./ М.: «Ладога-100», 2007. — 304 с.

Рыбаков Б.А. **Язычество древних славян.** М.: «Наука», 1981. — 608 с.

Рыбаков Б.А. **Язычество Древней Руси.** М.: «Наука», 1987. — 786 с.

Святский Д.О. **Астрономия Древней Руси.** М.: «Русская панорама», 2007. — 664 с.

**Славянские древности: Этнолингвистический словарь.** /Под ред. Н.И. Толстого/ М.: Институт славяноведения РАН. Том 1 (А–Г), 1995; Том 2 (Д–К), 1999; Том 3 (К–П), 2004; Том 4 (П–С), 2009; Том 5 (С–Я), 2012.

Токарев С.А. **Ранние формы религии.** М.: Политиздат, 1990. — 622 с.

Топоров В.Н. **Мифология. Статьи для мифологических энциклопедий.** М.: «Языки славянских культур». Том 1 (А–О), 2011. — 600 с. Том 2 (П–Я), 2014. — 612 с.

Усачева В.В. **Магия слова и действия в народной культуре славян.** М.: Институт славяноведения, 2008. — 368 с.

Фаминцын А.С. **Божества древних славян.** СПб.: «Алетейя», 1995. — 400 с. / репринт книги 1884 г./

Шапарова Н.С. **Энциклопедия славянских праздников (Календарные поверья и обычаи славян).** М.: «АСТ», «Астрель», 2010. — 512 с.

Шарая О.М. **Ценностно-нормативная природа почитания предков.** Минск: «Тэхналогія», 2002. — 250 с.

# СОДЕРЖАНИЕ

*Прадмова: што такое язычніцтва?* .......... 3

*Уводзіны* .......... 7

**Раздзел I**

**СТАРАЖЫТНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ПРА СУСВЕТ**

*Глава 1.* Касмічныя стыхіі: зямля, вада, паветра, агонь .......... 9

*Глава 2.* Неба: сонца, месяц, зоркі .......... 19

*Глава 3.* Прыродныя з'явы: вецер, дождж, засуха, вясёлка, навальніца, гром, маланка, снег, лёд, раса .......... 26

*Глава 4.* Тагасвет: як уладкаваны, душа, яе шлях на той свет, наўі .......... 36

*Глава 5.* Сусветнае дрэва як сімвал трох прастор:верхняй, ярэдняй і ніжняй .......... 47

**Раздзел II**

**ПАГАНСКІЯ БОСТВЫ, МІФІЧНЫЯ ПЕРШАНАСЕЛЬНІКІ І ГЕРОІ**

*Глава 1.* Мужчынскія боствы: Бог, Светавіт, Трыглаў, Сварог, Дажбог, Пярун, Ярыла, Вялес .......... 54

*Глава 2.* Жаночыя боствы: Вялікая Багіня-Маці, Мокаш, Параскева Пятніца, Лада, Лёля, Цёця, Мара .......... 64

*Глава 3.* Міфічныя першанасельнікі Беларускай зямлі: Бай, волаты і валатоўны, асілкі .......... 73

*Глава 4.* Свяцілішчы і святары, жрацы, вайдэлоты .......... 82

*Глава 5.* Ідалы .......... 94

## Раздзел III
## ЧАЛАВЕК — АД НАРАДЖЭННЯ ДА СМЕРЦІ

*Глава 1.* Чалавек як мікракосм і частка прыроды ........................102
*Глава 2.* Мужчына і жанчына ........................................113
*Глава 3.* Цяжарнасць і нараджэнне ........................................120
*Глава 4.* Вясельныя абрады ........................................129
*Глава 5.* Смерць, нябожчык, пахавальны абрад ........................................139

## Раздзел IV
## ВЕРА Ў ЗВЫШНАТУРАЛЬНУЮ РОДНАСЦЬ З ПРЫРОДАЙ

*Глава 1.* Сакралізаваныя жывёлы........................................151
*Глава 2.* Сакралізаваныя птушкі ........................................165
*Глава 3.* Сакралізаваныя насякомыя ........................................176
*Глава 4.* Культ дрэў........................................183
*Глава 5.* Культавыя расліны ........................................195

## Раздзел V
## ВЕРА Ў ІСНАВАННЕ ДУХАЎ

*Глава 1.* Духі дома і гаспадарчых пабудоў ........................................204
*Глава 2.* Духі лёсу, апекуны і праціўнікі сям'і ........................................215
*Глава 3.* Духі прыродных абшараў........................................220
*Глава 4.* Духі хвароб ........................................232
*Глава 5.* Напаўлюдзі-напаўдэманы........................................240
*Глава 6.* Чорт ........................................250

## Раздзел VI
## НАРОДНЫЯ ВЕРАВАННІ Ў КАЛЯНДАРНАЙ АБРАДНАСЦІ

*Глава 1.* Народны каляндар ........................................256
*Глава 2.* Зіма........................................259

*Глава 3.* Вясна. Пачатак гаспадарчага года ....................................268
*Глава 4.* Лета......................................................................................281
*Глава 5.* Восень і збор ураджаю ..........................................................289
*Глава 6.* Маладзік.................................................................................300

**Раздзел VII**
**МАГІЧНЫЯ ПРАКТЫКІ**

*Глава 1.* Абярэгі ...................................................................................305
*Глава 2.* Ахвярапрынашэнні.....................................................................313
*Глава 3.* Абрады ахоўнай магіі ................................................................320
*Глава 4.* Рэліктавыя абрады і звычаі........................................................330

*Пасляслоўе*.................................................................................................341
*Беларускі язычніцкі пантэон* .......................................................................346
*Слоўнік*......................................................................................................350
*Літаратура для паглыбленага вывучэння тэмы язычніцтва* .........360

*Навукова-папулярнае выданне*

**ДУЧЫЦ Людміла, КЛІМКОВІЧ Ірына**
**ЯЗЫЧНІЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСАЎ**

Падпісана да друку 04.08.2014. Фармат $60 \times 90^1/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 23,0.
Ул.-выд. арк. 15,2. Тыраж 1500 асобнікаў. Заказ 2298.

ТАА «Харвест». Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 1/17 ад 16.08.2013.
Вул. Кульман, д. 1, корп. 3, пав. 4, к. 42, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

З часоў сівой старажытнасці на землях Беларусі панавала язычніцтва. Пасля X стагоддзя хрысціянства паступова яго выцесняла. Але перамагчы да канца не здолела. І сёння значная частка беларусаў пакланяецца святым камяням, дрэвам, крыніцам, верыць у здольнасці знахараў, вешчуноў і чараўнікоў, у моц абыдзённікаў і амулетаў, ужывае варажбу, замовы і праклёны, святкуе язычніцкія па сутнасці Дзяды і Радуніцу, Купалле і Каляды, Гуканне вясны, Ваджэнне куста, Пахаванне стралы.

Аўтары паказваюць язычніцтва нашых продкаў як сістэму міфалагічных уяўленняў аб сусвеце, рознастайных магічных рытуалаў і дзеянняў.



ISBN 978-985-18-3427-9

ЯЗЫЧНІЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСАЎ